

Ігар Кузьмініч

# НАВУЧАННЕ ПРАВАМ ЧАЛАВЕКА Ў ШКОЛЕ І ПА-ЗА ЁЙ

*Дапаможнік*

Ігар Кузьмініч

# НАВУЧАННЕ ПРАВАМ ЧАЛАВЕКА Ў ШКОЛЕ І ПА-ЗА ЁЙ

Рэдактар: Андрэй Дынько

Дызайн: Silverbee designers, М. Ульяшына

Кузьмініч, І. Р.

Навучанне правам чалавека ў школе і па-за ёй: Дапаможнік / І. Р. Кузьмініч. –

Варшава: Выд. «Агенцыя Каро», 2010. – 257 с.

ISBN: 978-92-9234-791-8

---

Дапаможнік «Навучанне правам чалавека ў школе і па-за ёй» змяшчае метадычныя парады для адукатараў грамадскіх аб'яднанняў, настаўнікаў сярэдніх школ і выкладчыкаў малодшых курсаў ВНУ, якія рыхтуюць і праводзяць заняткі і навучальныя праграмы па правах чалавека для моладзі. Асаблівасцю дапаможніка з'яўляецца каштоўнасна-практычны падыход да асвятлення правоў чалавека, а таксама заснаванасць прапанаваных у выданні заняткаў на інтэрактыўных стратэгіях навучання. Дапаможнік цесна звязаны з іншым адукацыйным рэсурсам, падрыхтаваным І. Кузьмінічам і В. Руднікам, – дапаможнікам «Адстойванне і пашырэнне правоў чалавека праз грамадскі ўдзел».

Дапаможнік «Навучанне правам чалавека ў школе і па-за ёй» распрацаваны ў межах супольнага праекту Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (АБСЕ БДІПЧ) і Еўрапейскай Камісіі. Погляды, выкладзеныя ў дапаможніку, належаць аўтару і неабавязкова адлюстроўваюць палітыку АБСЕ БДІПЧ і Еўрапейскага Саюза.

© Кузьмініч І. Р., АБСЕ БДІПЧ, 2010
Усе правы абароненыя.

# ЗМЕСТ


**УВОДЗІНЫ** 6

**ЯК КАРЫСТАЦЦА ДАПАМОЖНІКАМ** 9

**ЧАСТКА І. УВОДЗІНЫ Ў ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА** 11

1. Што такое правы чалавека (заняткі разлічаны на 45 хв.) 11
1.1. Што такое правы чалавека (заняткі разлічаны на 90 хв.) 17
2. Гісторыя правоў чалавека 21
3. Дакументы па правах чалавека 27
4. Міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека 34
5. Нацыянальныя механізмы абароны правоў чалавека 42
6. Абмежаванні правоў чалавека 52
7. Чалавек і дзяржава 59
8. Талерантнасць у грамадстве 63
9. Правы чалавека ў сучасным свеце 67

**ЧАСТКА ІІ. АСОБНЫЯ ПРАВЫ І СВАБОДЫ ЧАЛАВЕКА** 75

10. Права на жыццё 75
11. Фізічная і псіхічная недатыкальнасць 79
12. Свабода ад гвалту ў сям'і 85
13. Свабода слова 88
14. Свабодныя і справядлівыя выбары 95
15. Забарона на выкарыстанне абавязковай ці прымусовай працы 100
16. Права на чыстае і здаровае навакольнае асяроддзе 104
16.1. Дзейнасць па ахове навакольнага асяроддзя 108
17. Права на медыцынскае абслугоўванне 111
18. Права на адукацыю 118
19. Правы асоб з інваліднасцю 122

**ЧАСТКА ІІІ. УМОВЫ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА** 127

20. Актыўны грамадзянін 127
21. Дэмакратыя 131
22. Дэмакратыя ў школе. Школьнае самакіраванне 135

**ЧАСТКА IV. АПІСАННЕ МЕТАДАЎ ПРАЦЫ ПА НАВУЧАННІ ПРАВАМ ЧАЛАВЕКА** **140**
Агульная характарыстыка класіфікацыі метадаў

**1. АПІСАННЕ МЕТАДАЎ ДАПАМОЖНІКА**
1. Арганізацыя працы ў малых групах, працы ў парах, індывідуальнай працы
1.1. Праца малых груп 142
1.2. 1x2x4 142
1.3. Кожны па чарзе 142
1.4. Бура прапаноў 143

**2. СПОСАБЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ ПА ДАНЯСЕННІ ДАДАТКОВАЙ ІНФАРМАЦЫІ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА** **144**
2.1. Кожны вучыць кожнага 144
2.2. Кожны вучыць групу 144
2.3. Ажурная піла 145

**3. СПОСАБЫ АРГАНІЗАЦЫІ АБМЕРКАВАННЯЎ І ДЫСКУСІЙ** **146**
3.1. Дыскусія 146
3.2. Форум 146
3.3. Канцэнтрычныя колы 147
3.4. Чатыры крэслы 147
3.5. Займі пазіцыю 147
3.6. Кантынуум 148
3.7. Галерэя 148
3.8. Рэфлексійнае кола 149
3.9. Свабодны мікрафон 149
3.10. Оксфардскія дэбаты 149
3.11. PRES (аргументацыя ўласнай пазіцыі) 150
3.12. Акварыум 150

**4. СПОСАБЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ, НАКІРАВАНАЙ НА ФАРМАВАННЕ ЎМЕННЯЎ І НАВЫКАЎ, АБМЕРКАВАННЕ НОВАЙ ІНФАРМАЦЫІ І ЯЕ ЗАМАЦАВАННЕ** **152**
4.1. Аналіз казусаў 152
4.2. Разыгрыванне роляў і мадэляванне сітуацый 153
4.3. Калаж 153
4.4. Трыяда 153
4.5. Метад майстэрні 154

**МІЖНАРОДНЫЯ ДАКУМЕНТЫ І ІНШЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА** 155


Пададзеныя ніжэй дакументы можна знайсці на старонцы: http://hramadzianin.org

1. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека 155

2. Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах 159

3. Факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах 170

4. Рашэнне па Беларусі Камітэта ААН па правах чалавека. Паведамленне №1022/2001, *Вялічкін супраць Беларусі* 172

5. Рашэнне Камітэта ААН па правах чалавека. Паведамленне № 526/1993, *Майкл і Браян Хіл супраць Іспаніі* 176

6. Другі факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, скіраваны на скасаванне смяротнага пакарання 180

7. Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах 182

8. Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын 188

9. Канвенцыя супраць катавання ды іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжальных для годнасці формаў абыходжання ці пакарання 195

10. Канвенцыя аб правах дзіцяці (вытрымкі) 203

11. Канвенцыя аб правах асобаў з інваліднасцю (вытрымкі) 212

12. Дэкларацыя аб праве і абавязку асоб, груп ці грамадскіх органаў заахвочваць і абараняць усеагульна прызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды (Дэкларацыя ААН аб праваабаронцах) 221

13. Канвенцыя аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў і доступе да правасуддзя ў пытаннях аховы навакольнага асяроддзя (Орхуская канвенцыя), вытрымкі 225

14. Правы чалавека і ўсёабдымная канцэпцыя бяспекі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ). Абавязальніцтвы па АБСЕ 235

15. Заключны Акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Хельсінкі, 1975 г. (вытрымкі) 237

16. Выніковы дакумент Венскай сустрэчы Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (НБСЕ) 1989 г. ,трэцяя сустрэча ў рамках Хельсінкскай канферэнцыі (вытрымкі) 241

17. Дакумент Капенгагенскай сустрэчы ў рамках Канферэнцыі па чалавечым вымярэнні НБСЕ, 1990 г. (вытрымкі) 244

18. Канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод (Еўрапейская канвенцыя аб правах чалавека), Рым, 1950 г. (вытрымкі) 249

19. Рашэнне Еўрапейскага суда па правах чалавека па справе *Біціева і Х. супраць Расіі* 253

# УВОДЗІНЫ

## 1. Якая мэта дадзенага дапаможніка?

Правы чалавека — гэта паняцце, якое знаходзіцца ў працэсе станаўлення, у пастаянным развіцці. Тыя палажэнні, якія яшчэ дваццаць гадоў назад не разглядаліся як катэгорыя правоў чалавека, сёння такімі становяцца дзякуючы развіццю супольнасці, асобы, дзяржавы, эканомікі. Вялікае значэнне ў гэтым працэсе надаецца навучанню правам чалавека, якое ажыццяўляецца праз сістэму дзяржаўных навучальных устаноў, а таксама сіламі грамадзян-адукатараў, грамадскіх ініцыятываў і аб'яднанняў, зацікаўленых у тым, каб людзі ведалі свае правы, карысталіся імі і, пры патрэбе, баранілі.

Мэтай дапаможніка з'яўляецца метадычнае і зместавае забеспячэнне навучання правам чалавека. Адукатарам грамадскіх арганізацый, настаўнікам, выкладчыкам універсітэтаў і іншым зацікаўленым асобам прапануецца дадатковы адукацыйны рэсурс з апісаннем метадалогіі правядзення заняткаў, пабудаваных на аснове інтэрактыўных спосабаў арганізацыі навучання. Гэтыя заняткі маюць сфармаваць у маладых людзях дэмакратычныя каштоўнасці, замацаваць у іх свядомасці патрэбу ў актыўнай грамадскай пазіцыі, разуменне важнасці адстойвання правоў чалавека.

Аўтар не ставіў перад сабой мэту разгледзець усе пытанні і праблемы, звязаныя з правамі чалавека. Тэматыка заняткаў вызначалася патрэбамі навучальнай праграмы ў школе, спецкурса для малодшых курсаў вышэйшых навучальных устаноў, важнасцю з пункту гледжання разумення сутнасці правоў чалавека і ўзроўнем зацікаўленасці канкрэтнай тэмай з боку маладых людзей, які выяўляўся ў час апрабацыі заняткаў. Такія тэмы, як «Што такое правы чалавека», «Дакументы па правах чалавека», «Міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека», «Нацыянальныя механізмы абароны правоў чалавека», «Гісторыя правоў чалавека», «Абмежаванні правоў чалавека», «Чалавек і дзяржава» разам могуць складаць мінімальны ўводны курс па правах чалавека. Але дапаможнік не «прывязаны» да нейкай канкрэтнай праграмы курса ў межах фармальнай адукацыі: гэтым рэсурсам можна карыстацца пры падрыхтоўцы асобных тэмаў школьнай праграмы, спецкурса «Правы чалавека» у ВНУ, выхаваўчых мерапрыемстваў для студэнтаў і школьнікаў, семінараў і трэнінгаў у нефармальнай адукацыі.

## 2. Як паўстаў дапаможнік?

Падрыхтоўка дапаможніка адбывалася на працягу 2006—2007 г. Яго канцэпцыя, а таксама частка заняткаў былі апрабаваны на дзвюх летніх школах у Санкт-Пецярбургу ў 2006 г. разам з групай настаўнікаў і адукатараў грамадскіх аб'яднанняў, выкладчыкаў клінік «Права на кожны дзень / Street Law» і студэнтаў-юрыстаў гэтых клінік з усёй Беларусі. Пасля летніх школ большасць заняткаў, якія ўвайшлі ў дапаможнік, былі пратэставаныя на базе сярэдніх школ, ВНУ і грамадскіх аб'яднанняў з Мінска, Гродна, Брэста, Магілёва і Гомеля. На працягу апрабацыі гэтых заняткаў карэктаваліся канцэпцыя дапаможніка, тэматыка і структура асобных заняткаў.

Канчатковы варыянт дапаможніка з'явіўся пасля рэцэнзавання метадычных матэрыялаў групай экспертаў у галіне педагогікі, методыкі выкладання і права. Дапаможнік прайшоў дзве экспертныя ацэнкі (у 2008 і 2010 гадах), якія былі падрыхтаваныя Беларускім нацыянальным інстытутам адукацыі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь і дасланыя ў АБСЕ БДІПЧ Міністэрствам замежных спраў Беларусі.

## 3. У чым асаблівасць падыходу да навучання правам чалавека ў гэтым дапаможніку?

Дапаможнік адрозніваецца ад існуючых сёння матэрыялаў па правах чалавека падыходам да навучання правам чалавека, зместам, спосабамі арганізацыі навучальнай дзейнасці. Дапаможнік прапануе вырашаць праблемы правоў чалавека не столькі праз распаўсюджанне інфармацыі аб правах чалавека, колькі праз фармаванне сацыяльна—актыўнага грамадзяніна Беларусі, матываванага і здольнага на дзейнасць у сферы распаўсюджання і абароны правоў чалавека.

Сацыяльна-актыўная асоба, здольная адстойваць свае правы і свабоды, — паняцце не новае для беларускай традыцыі. Яно вядома яшчэ з часоў, калі славянскія плямёны заклалі на беларускіх землях традыцыі вечавога ладу, у аснове якога ляжала права землеўласнікаў браць на сябе адказнасць за рашэнні аб кіраванні, кантроль за ўладай князя і яго дружыны. Традыцыі сацыяльнай і палітычнай актыўнасці захоўваліся і ў наступныя перыяды гісторыі беларускага грамадства і атрымалі асаблівае развіццё ў часы Вялікага княства Літоўскага. У першую чаргу гэта было звязана з развіццём шляхецкіх прадстаўнічых органаў улады на мясцовым і агульназемскім узроўнях, гарадскога самакіравання, дзейнасці магістратаў і рамесных цэхаў, а таксама дзейнасці рэлігійных супольнасцяў і брацтваў у часы Рэфармацыі і Контррэфармацыі.

Страта беларускім народам сваёй дзяржаўнасці і разам з ёй кантролю над палітычнымі органамі ўлады ў канцы XVIII ст. распачало асаблівую практыку ўзаемаадносін беларусаў з дзяржавай. Яна стала нечым чужым, аддаленым, магутным і карным інструментам. Рэпрэсіўныя метады пабудовы «новага» савецкага грамадства толькі ўмацавалі ранейшыя стэрэатыпы ў дачыненні да ўлады і адпаведныя спосабы дзейнасці ў палітычнай сферы, такія як канфармізм, імкненне не супраціўляцца волі дзяржавы, а прыстасоўвацца да яе рашэнняў, не вылучацца, не ўмешвацца, не быць ініцыятыўным.

Беларуская супольнасць шукае сёння спосабы пабудовы новай традыцыі ўзаемаадносін паміж людзьмі ў грамадстве, у тым ліку і ўзаемаадносін з дзяржавай. Дапаможнік закліканы дапамагчы праз навучанне ствараць умовы для змяненняў згаданых стэрэатыпаў у свядомасці маладых людзей.

Дапаможнік робіць акцэнт на развіццё асобы, яе здольнасцяў да самастойнага аналізу сітуацыі, да аргументавання сваёй пазіцыі, да апісання, у асобных выпадках, канкрэтных спосабаў паводзін у тых альбо іншых сітуацыях, звязаных з правамі чалавека. Кожны з удзельнікаў заняткаў можа браць удзел у станаўленні правоў чалавека, а таксама рэальна адстойваць свае правы, правы іншых людзей у Беларусі і за яе межамі.

На ўсіх занятках разглядаюцца праблемныя сітуацыі, звязаныя з сучасным беларускім грамадствам. Напрыклад, абмеркаванне права на жыццё адбываецца праз дыскусію аб праблеме смяротнай кары, якая на сённяшні дзень захоўваецца ў беларускім заканадаўстве як выключная мера пакарання.

Акрамя стварэння ўмоў для фармавання стаўлення, на занятках дэманструюцца асобныя спосабы паводзін для адстойвання парушаных свабод і правоў чалавека. Для гэтага падчас раскрыцця асобных тэмаў па правах чалавека робіцца ўхіл на фармаванне практычных навыкаў выхаду з сітуацый, калі парушаюцца правы чалавека. Так, у занятках «Дакументы па правах чалавека», акрамя іншага, высвятляецца, дзе і як можна знайсці дакументы па правах чалавека. А ў занятках «Міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека» і «Нацыянальныя механізмы абароны правоў чалавека» акрамя іншага, разглядаецца парадак звароту да міжнародных і нацыянальных устаноў. На занятках, прысвечаных вучнёўскаму самакіраванню і праву на навакольнае асяроддзе, закранаюцца пытанні атрымання і распаўсюджання інфармацыі ў галіне правоў чалавека, дэманструюцца асобныя мадэлі грамадзянскага ўдзелу маладых людзей у адстойванні сваіх правоў і свабод.
Так, падчас асвятлення асобных тэмаў даюцца навыкі выкарыстання засвоеных ведаў праз сацыяльную дзейнасць. Увесь зместавы матэрыял накіраваны на перадачу такіх ведаў, навыкаў і падыходаў удзельнікаў навучальнага працэсу, якія б дапамаглі ім стаць актыўнымі і матываваць іх да праяўлення актыўнасці ў галіне абароны правоў чалавека.

Фармаванне падыходаў і навыкаў, каштоўнасцяў патрабуе адпаведнай арганізацыі працэсу навучання. Мы зыходзім з таго, што недэмакратычнымі, аўтарытарнымі метадамі правядзення заняткаў па правах чалавека немагчыма сфармаваць паважлівае стаўленне да іх. Калі мы разважаем пра павагу да асобы і годнае да яе стаўленне (не толькі з боку дзяржавы, але і ў дачыненнях паміж людзьмі), мы павінны гэтую павагу дэманстраваць і самім працэсам навучання. Таму вялікую ролю павінна адыгрываць атмасфера добразычлівасці, адкрытасці, магчымасці выказваць і адстойваць свой пункт гледжання, нават калі ён не адпавядае пункту гледжання настаўніка ці адукатара.

Якраз таму заняткі, прапанаваныя ў дапаможніку, грунтуюцца на метадах, якія дазваляюць арганізаваць такое ўзаемадзеянне ўдзельнікаў працэсу навучання, дзе настаўнік ці адукатар з'яўляецца арганізатарам гэтага працэсу і адным з яго ўдзельнікаў. Актыўныя і інтэрактыўныя метады навучання, з нашага пункту гледжання, найлепш адпавядаюць гэтай мэце.

Калі іншыя дапаможнікі, дэманструючы міжнародныя дакументы і механізмы абароны правоў чалавека, як правіла, арыентуюцца на апісанне дакументаў і механізмаў ААН, то ў нашым дапаможніку побач з гэтымі, ужо звычайнымі для беларускага чытача дакументамі і механізмамі, дэманструюцца дакументы і механізмы Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (далей — АБСЕ) і Рады Еўропы (Савета Еўропы). Беларусь з'яўляецца членам АБСЕ, а гэта азначае, што наша дзяржава ўзяла на сябе выкананне абавязальніцтваў па правах чалавека ў межах гэтай арганізацыі. Што тычыцца інстытутаў Рады Еўропы, то, нягледзячы на немагчымасць грамадзян Беларусі выкарыстоўваць Еўрапейскі суд па правах чалавека ў адстойванні сваіх правоў і свабод перад беларускай дзяржавай (у сувязі з тым, што наша краіна не ўваходзіць у Раду Еўропы), нашы грамадзяне могуць бараніць свае правы з дапамогай гэтага інстытуту ў выпадках, калі парушэнне правоў чалавека адбылося на тэрыторыі адной з краін Рады Еўропы.

## 4. У чым асаблівасць падыходу дапаможніка да канцэпцыі правоў чалавека?

Важнай адметнасцю дапаможніка з'яўляецца тое, што ён спалучае два асноўныя падыходы да канцэпцыі правоў чалавека — нарматывісцкі і каштоўнасны. Калі сутнасцю нарматывісцкага падыхода з'яўляецца забеспячэнне правоў чалавека праз прававую сістэму і выпраўленне парушаных правоў чалавека праз міжнародныя і ўнутраныя нормы права і адпаведныя механізмы, то каштоўнасны падыход да правоў чалавека засноўваецца на сістэме ўнутраных каштоўнасцей самой асобы, здольнай абараняць правы і свабоды. З нашага пункту гледжання, гэтыя падыходы ўзаемадапаўняльныя. Таму дапаможнік грунтуецца на змяшаным, каштоўнасна-нарматывісцкім падыходзе, дзе каштоўнасці адыгрываюць унутраныя, а нормы і механізмы — знешнія спосабы абароны правоў чалавека. Пры гэтым асаблівыя сувязі паміж унутранымі і знешнімі рэгулятарамі ствараюць механізм развіцця правоў чалавека.
Каштоўнасна-нарматывісцкі падыход звязаны з асаблівай стратэгіяй развіцця і пашырэння правоў чалавека ў свеце. Дадзеная стратэгія з'яўляецца лагічным працягам гісторыі станаўлення правоў чалавека і грунтуецца на закладзенай ў працэсе станаўлення, унутранай логіцы ўкаранення катэгорыі правоў чалавека зверху ўніз. Правы чалавека афармляюцца і пачынаюць развівацца на міжнародным узроўні і толькі пазней ўкараняюцца на ўзроўні прынцыпаў дзейнасці нацыянальных палітычных сістэм.

Пачынаючы з канца 80-х гадоў XX ст., на нацыянальным узроўні паўстаюць асаблівыя інстытуты , якія займаюцца ў межах дзяржаваў выключна дзейнасцю па абароне і распаўсюджанню правоў чалавека (амбудсмены, камісіі па правах чалавека і г. д.). Так, пасля прывядзення нацыянальнага заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі нормамі і ўкаранення асноўных прынцыпаў правоў чалавека ў нацыянальную прававую сістэму адбываецца інстытуцыяналізацыя механізмаў па абароне і распаўсюджанню правоў чалавека на нацыянальным узроўні.
На нашу думку, далейшае ўкараненне правоў чалавека ў межах асобнай дзяржавы павінна выходзіць за межы палітычнай сістэмы, укараняючы прынцыпы і каштоўнасці правоў чалавека ў нацыянальную культуру народа.

---

Над стварэннем гэтага выдання працавала сціжма людзей. Выказваем шчырую падзяку ўсім, хто браў актыўны ўдзел у працы. Асаблівая падзяка Вітаўту Рудніку, які быў і трэнерам на летніх школах, і экспертам па матэрыялах. Дзякуем Аркадзю Гутнікаву, віцэ-прэзідэнту Санкт-Пецярбургскага інстытута права імя П. П. Альдэнбургскага і дырэктару прававой клінікі пры гэтай навучальнай установе, роўна як усім супрацоўнікам інстытута і клінікі, якія дапамагалі ў падрыхтоўцы і правядзенні летніх школ. Дзякуй экспертам — Алене Карпіевіч, Святлане Пальчык, Юрыю Чавусаву — за каштоўныя заўвагі і працу над матэрыяламі.

Асобную падзяку выказваем усім тым, хто спрычыніўся да апрабацыі метадычных матэрыялаў — настаўнікам, выкладчыкам, студэнтам-юрыстам і адукатарам — Алесі Глухавай, Юліі Сухарукавай, Таццяне Дземядзюк, Алене Сярэдзіч, Таццяне Новік, Інзе Калеко, Аляксандру Сідаровічу, Ксеніі Няфагінай, Таццяне Пазднеевай, Марыне Бумінай, Галіне Крот, Наталлі Ленкавец, Анжаліцы Байко, Інзе Дуброўскай, Юліі Халмоўскай, Ігару Брэлю, Андрэю Пасынкаву, Вераніцы Калеевай, Віталю Болдузеву, Юліі Гарачанковай, Алене Цвярдовай, Алене Куравай, Алене Акулавай, Вользе Сідорчык, Ігару Лобачу, Сяргею Рабіновічу, Алене Вінчэўскай, Вользе Люцко, Кацярыне Буйко, Эме Александровіч, Людміле Кеўляк і іншым удзельнікам летніх школ у Санкт-Пецярбургу, перакладчыкам Раману Маладзяшыну і Джэймсу Дынглі, а таксама рэдактару Андрэю Дынько.

# ЯК КАРЫСТАЦЦА ДАПАМОЖНІКАМ

Выданне складаецца з уводзінаў, парадаў па карыстанні дапаможнікам, асноўнай часткі, у якую ўваходзяць заняткі па правах чалавека, апісання асобных метадаў працы і тэкстаў міжнародных дакументаў па правах чалавека (у тым ліку трох прыкладаў рашэнняў міжнародных органаў па абароне правоў чалавека). Заняткі аб’яднаныя ў тры групы. У першую сабраны заняткі, якія тлумачаць, што мы разумеем пад правамі чалавека, як адбывалася станаўленне правоў чалавека, дзе правы чалавека замацаваны, як яны рэалізуюцца, а таксама заняткі, якія раскрываюць асаблівасці нашага грамадства, нашага погляду на асобныя яго элементы, што тычацца катэгорыі правоў чалавека.

Другая частка аб’яднала заняткі, накіраваныя на разгляд асобных правоў і свабод чалавека, некаторых праблем, звязаных з правамі чалавека. Трэцюю частку складаюць заняткі, якія тычацца ўмоў, неабходных для забеспячэння правоў чалавека — тых інстытутаў і механізмаў, якія дазваляюць захаваць правы чалавека ад парушэння, дэманструюць элементы, без якіх захаванне правоў чалавека робіцца немагчымым.

Усе заняткі ўяўляюць сабой адзінства і звязаныя логікай выкладання матэрыялу. Разам з тым кожны з заняткаў уяўляе сабой асобны элемент, які не патрабуе спецыяльнага звароту да папярэдніх тэмаў. У дапаможніку для лепшага разумення зместу для настаўніка ці адукатара робяцца спасылкі на матэрыялы іншых тэмаў. У дадатковым матэрыяле ўтрымліваецца мінімум неабходнай інфармацыі для падрыхтоўкі настаўнікам ці адукатарам выкладання тэмы. Разам з тым даюцца спасылкі на крыніцы, дзе можна знайсці матэрыял, а таксама ўтрымліваецца шэраг найбольш важных дакументаў у галіне правоў чалавека, самастойна знайсці якія, як правіла, складана. Заняткі, змешчаныя ў дапаможніку, можна праводзіць як у выглядзе стандартных 45-хвілінных урокаў у школе (альбо двух урокаў па 45 хвілін), так і ў межах больш працяглых па часе пазакласных мерапрыемстваў ці трэнінгаў. Для гэтага ў выданні прадстаўлены розныя варыянты заняткаў па некаторых тэмах, разлічаных на больш працяглы час. Акрамя таго, асаблівая пабудова заняткаў дазваляе разбіваць іх на асобныя лагічныя блокі, якія можна перабудоўваць, выкарыстоўваючы іншыя, больш прымальныя з пункту гледжання настаўніка ці адукатара метады працы, прыстасаваныя да патрэб навучэнцаў.

Апісанне заняткаў па кожнай тэме пачынаецца з вызначэння чаканых вынікаў, што акрэсліваюць, якімі ведамі і ўменнямі авалодаюць удзельнікі, як яны будуць ставіцца да тых альбо іншых з’яваў, пра якія пойдзе гаворка ў час заняткаў. Далей прадстаўлены прыкладны план правядзення заняткаў з пазначэннем часу на тую альбо іншую яго часткі.

Кожная частка мае кароткае апісанне магчымага сцэнара яе правядзення з прапанаванымі пытаннямі для дыскусій, падагульнення працы і г. д. Як правіла, у кожнай частцы пазначаюцца метады, пры дапамозе якіх прапануецца правесці дадзеную частку заняткаў.

Асобным элементам апісання заняткаў з’яўляецца **Тлумачальная інфармацыя** (выдзеленая асобным колерам), якая павінна дапамагчы лепш зразумець сутнасць тых альбо іншых навучальных дзеянняў настаўніка ці адукатара. Тлумачальная інфармацыя вылучаецца асобным колерам і растлумачвае мэты навучальнай дзейнасці ці каментуе канкрэтную навучальную дзейнасць.

Да кожных заняткаў дададзена **Дадатковая інфармацыя** (выдзеленая асобным колерам) — тлумачэнне зместу матэрыялаў па правах чалавека, на якім грунтуюцца заняткі. Гэта зроблена для таго, каб настаўнік/адукатар лепш арыентаваўся ў тэматыцы, звязанай з рознымі аспектамі правоў чалавека.У дадатковай інфармацыі раскрываецца сутнасць канцэпцый у галіне правоў чалавека, нацыянальныя і міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека, факталагічны матэрыял, датычны тэмы, падаецца іншы змест па правах чалавека.

Для кожных заняткаў распрацаваны таксама раздатачны матэрыял, які настаўнік ці адукатар можа выкарыстоўваць у якасці яшчэ адной крыніцы атрымання новай інфармацыі, і з ім варта знаёміцца да пачатку заняткаў. Але асноўная мэта раздатачнага матэрыялу — дапамога вучням у авалоданні ведамі ў межах той альбо іншай тэмы.

Карыстальнікі дапаможніка могуць змяняць заняткі, выкарыстоўваючы іншыя метады працы, іншыя пытанні і прыклады для дыскусій, падагульненняў, а таксама — калі гэта неабходна для павышэння эфектыўнасці працы з групай, — праз перастаноўку месцамі асобных частак (блокаў) заняткаў. Варта аднак памятаць, што калі вы мяняеце метады і блокі заняткаў, можа змяніцца і час, неабходны для правядзення занятку, што можа патрабаваць унясення абавязковых зменаў у чаканыя вынікі, дадатковую інфармацыю і раздатачныя матэрыялы.

Заняткі ў дапаможніку будуюцца па пэўным алгарытме — перадачы новай інфармацыі і працы з ёю ў інтэрактыўных і актыўных стратэгіях. Любы інтэрактыўны метад складаецца з часткі дзейнасці ў межах метаду (абмеркаванне ў групе, самастойная праца, другая практычная дзейнасць і г. д.), абавязковай рэфлексіі таго, што было зроблена альбо што ўдалося, і прадстаўленні дадатковай інфармацыі адносна таго досведу, які быў атрыманы падчас дзейнасці альбо практычным замацаванні атрыманага і абмеркаванага досведу. Іншымі словамі, спачатку ўдзельнікі нешта робяць і ў выніку атрымліваюць досвед ці інфармацыю, пазней разбіраюць, што гэта за досвед ці што гэта за інфармацыя, як яна была атрымана і дзе можа быць выкарыстана, а пазней, на апошнім этапе — атрыманы досвед ці інфармацыя могуць быць дапоўнены дадатковай інфармацыяй альбо яшчэ адным практычным выкарыстаннем атрыманага папярэдне досведу ці інфармацыі.

У дапаможніку выкарыстоўваюцца казусы, выпадкі і пытанні, якія носяць супярэчлівы (кантраверсійны) характар — гэта значыць, яны не маюць правільных і няправільных адказаў. Напрыклад, смяротнае пакаранне. Па такіх пытаннях заўсёды можна прывесці аргументы як на карысць аднаго пункта гледжання (захавання смяротнага пакарання) так і на карысць другога (забароны смяротнага пакарання). Задача адукатара — не ў тым, каб знайсці правільны адказ на супярэчлівыя пытанні, а стварыць умовы, у якіх навучэнцы задумаюцца над гэтымі пытаннямі, паспрабуюць выпрацаваць і аргументаваць сваё стаўленне адносна дадзенай праблемы, паспрабуюць заняць аргументаваную пазіцыю ў дадзеным пытанні, а акрамя гэтага засвояць культуру дыскутавання і аргументавання сваёй пазіцыі, што з’яўляецца істотным для грамадзяніна ўменнем.

У дадатку да дапаможніка пададзена кароткае апісанне асобных метадаў, выкарыстаных ў прапанаваных занятках. Аўтар дапаможніка зыходзіў з таго, што настаўнік ці адукатар валодае неабходным арсеналам спосабаў арганізацыі навучальнага працэсу на аснове інтэрактыўных і актыўных стратэгій навучання. Менавіта таму ў апісанні заняткаў, як правіла, не ўтрымліваецца апісанне спосабаў падзелу на групы, «вывядзення з роляў», кантролю за атмасферай у групе і яе дынамікай.

Напрыканцы дапаможніка прыводзяцца поўныя тэксты і вытрымкі з асноўных міжнародных стандартаў па правах чалавека, а таксама рашэнні Камітэта па правах чалавека і рашэнне Еўрапейскага суда. Дадзеная частка рэкамендуецца ў якасці дадатковага чытання і дапаможнага матэрыялу на занятках.

Раім таксама звярнуцца да дапаможніка «Адстойванне і пашырэнне правоў чалавека праз грамадскі ўдзел», які разам з дадзеным дапаможнікам складае комплекс навучання правам чалавека. Гэтыя два дапаможнікі звязаны адзінай логікай заняткаў, структурай матэрыялаў і канцэпцыяй навучання правам чалавека праз практыку.

# ЧАСТКА І. УВОДЗІНЫ Ў ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## 1. ШТО ТАКОЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- асобныя прыкметы правоў чалавека;
- што такое правы чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- растлумачыць сутнасць правоў чалавека;
- вызначаць сітуацыі, якія маюць дачыненне да правоў чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да правоў чалавека як да сістэмы каштоўнасцяў, нормаў і механізмаў, якія накіраваны на абарону годнасці асобы ў яе дачыненнях з дзяржавай;
- да правоў чалавека як да сферы адносін асобы і дзяржавы.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі — 4 хв.
2. Знаёмства з тэмай і задачамі заняткаў — 1 хв.
3. Сутнасць і прыкметы правоў чалавека — 15 хв.
4. Прыкметы правоў чалавека. Разгляд казусаў — 20 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 5 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (4 хв.).**

Назавіце адзін-два прыклады парушэння правоў чалавека. Запытайце ў групы, ці лічыць яна гэтыя выпадкі парушэннем правоў чалавека. Папрасіце пракаментаваць адказы.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Асноўнай мэтай гэтай часткі з'яўляецца засяроджанне ўвагі навучэнцаў на паняцці правоў чалавека. Прыклады парушэння правоў чалавека можна ўзяць з дадатковай інфармацыі для настаўніка, раздатачных матэрыялаў для гэтага варыянта заняткаў, а таксама з варыянта, разлічанага на 90 хвілін. Галоўнае, каб у прыкладзе парушэння правоў чалавека дакладна дэманстраваліся адносіны паміж асобай і прадстаўніком дзяржавы.**

**2. Прадстаўце тэму і задачы заняткаў (1 хв.).**

**3. Разгледзьце сутнасць і прыкметы правоў чалавека (15 хв.).**

Раздайце выразаныя з раздатка 1.1. выказванні, якія характарызуюць правы чалавека. Знаёмства з выказваннямі адносна прыкмет правоў чалавека арганізуйце пры дапамозе метаду «Кожны вучыць кожнага».

Кожны ўдзельнік павінен атрымаць адно выказванне, пазнаёміцца з ім, а затым пазнаёміць са зместам свайго тэксту як мага большую частку ўдзельнікаў. Пры гэтым трэба старацца запомніць як мага больш той інфармацыі, якую будуць перадаваць іншыя ўдзельнікі.

У выпадках, калі ўдзельнікаў больш, чым выказванняў у раздатку 1.1., можна раздаць адны і тыя ж выказванні розным людзям альбо дапісаць новыя выказванні, для падрыхтоўкі якіх можна выкарыстаць дадатковую інфармацыю.

Пасля таго як удзельнікі на працягу 5—8 хвілін пазнаёмяцца з інфармацыяй, прапануйце ім узгадаць, што з таго, што яны пачулі аб правах чалавека, падалося ім найбольш важным. Адказы можна запісаць на ватмане ці дошцы.

Падагульніць знаёмства з прыкметамі правоў чалавека можна пры дапамозе наступных пытанняў:

- Якія з пачутых выказванняў аб правах чалавека былі вядомыя вам раней? Як вы іх разумееце?
- Якія з пачутых выказванняў аб правах чалавека былі для вас новымі? Як вы зразумелі іх сэнс?
- Назавіце і патлумачце найбольш важныя, з вашага пункту гледжання, прыкметы правоў чалавека.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Гэтая праца павінна дапамагчы навучэнцам добра зразумець прыкметы правоў чалавека і сэнс гэтага паняцця. У час падагульнення вынікаў абмеркавання раздатачнага матэрыялу настаўніку ці адукатару варта рабіць каментары і дапаўненні, грунтуючыся на дадатковай інфармацыі. Асаблівую ўвагу звярніце на асноўныя прыкметы правоў чалавека, а менавіта на іх гуманістычны характар, на атрыманне правоў чалавека ад нараджэння, на іх індывідуальны характар.**

**Падкрэсліце, што паняцце правы чалавека трэба разглядаць як сістэму каштоўнасцяў, нормаў і механізмаў, скіраваных на абарону годнасці асобы ў яе адносінах з дзяржавай. Больш падрабязна пра гэта напісана ў дадатковай інфармацыі да гэтых заняткаў і да заняткаў, разлічаных на 90 хвілін.**

**4. Пры дапамозе казусаў разгледзьце прыкметы правоў чалавека (20 хв.).**

Працяг абмеркавання прыкмет правоў чалавека арганізуйце пры дапамозе разгляду казусаў. Выкарыстайце для гэтага метад «Займі пазіцыю».

Пазнаёмце ўдзельнікаў з адным з выпадкаў і папрасіце заняць адну з наступных пазіцый:
- згодныя, што гэта парушэнне правоў чалавека;
- не згодныя, што гэта парушэнне правоў чалавека;
- не можам канчаткова вызначыцца.

**ВЫПАДАК 1**

Студэнтка не згодная з адзнакай, якую ёй паставіў на экзамене выкладчык, і хоча абскардзіць гэтую адзнаку. Навучальная ўстанова не задаволіла скаргу, спаслаўшыся на тое, што давярае кампетэнцыі выкладчыка ў ацэнцы ведаў студэнтаў па дадзеным прадмеце. Тады студэнтка звярнулася са скаргай у міністэрства адукацыі, але там яе скаргі не прынялі, спаслаўшыся на тое, што пакуль не прапісаны працэдуры разгляду падобных сітуацый.

**ВЫПАДАК 2**

Бацькі народжанага дзіцяці хочуць даць яму імя Чат у гонар таго, што пазнаёміліся праз чат (ад анг. «chat» — размаўляць, чат — спецыяльная праграма камунікацыі паміж людзьмі з дапамогай Інтэрнэту). Дзяржаўныя органы, якія займаюцца рэгістрацыяй нованароджаных і выдачай бацькам пасведчанняў аб нараджэнні дзяцей, адмовіліся рэгістраваць дзіця пад такім імем, патлумачыўшы гэта тым, што яны ніколі не чулі, каб у Беларусі так называлі дзіцё. Бацькам прапанавалі выбраць іншае імя.

**ВЫПАДАК 3**

Выпускніца юрыдычнага факультэта, якая па выніках навучання атрымала чырвоны дыплом, уладкоўваецца на працу ў міліцыю. Па выніках гутаркі яна атрымлівае адмову на той падставе, што праца ў міліцыі звязана з цяжкімі фізічнымі і псіхічнымі нагрузкамі, складаным графікам працы, начнымі дзяжурствамі, частымі камандзіроўкамі і г. д. На думку кіраўніцтва міліцыі, такія ўмовы працы могуць пашкодзіць здароўю маладой дзяўчыны.

Пасля таго як удзельнікі зоймуць тую альбо іншую пазіцыю, папрасіце некаторых з іх пракаментаваць свой выбар. Дапамагчы ў каментаванні могуць наступныя пытанні:
- Ці парушаны ў гэтым выпадку правы чалавека? Якія прыкметы паказваюць на тое, што гэта парушэнне правоў чалавека?
- Калі правы чалавека парушаны, то ў чым, з вашага пункту гледжання, гэтае парушэнне заключаецца?

Такім жа чынам арганізуйце абмеркаванне наступных выпадкаў.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Кожны з выпадкаў абмяркуйце такім чынам, каб кожны альбо большасць удзельнікаў мелі магчымасць выказацца і аргументаваць сваю пазіцыю. Праз абмеркаванне пазіцый і будзе абмяркоўвацца сам змест — прыкметы правоў чалавека.**

У першым выпадку сітуацыю можна разглядаць як парушэнне правоў чалавека. Гэтае парушэнне звязана з тым, што дзяржава (у дадзеным выпадку — міністэрства адукацыі) павінна мець эфектыўную сістэму абскарджання вынікаў экзаменавання, што звязана з правам чалавека на атрыманне адукацыі. Што тычыцца Беларусі, то на сёння сістэма абскарджання адзнакі існуе. Але ў дадзеным выпадку нас цікавяць адносіны паміж гіпатэтычным чалавекам і гіпатэтычнай дзяржавай. Праз дадзены выпадак мы хочам

абмеркаваць сутнасць адносінаў, у якіх гіпатэтычная дзяржава павінна забяспечыць існаванне эфектыўнай сістэмы абскарджання адзнакі. У выпадку, калі такой сістэмы няма — ёсць парушэнне. Іншымі словамі, парушэнне правоў чалавека звязана не з выстаўленнем адзнакі, якая не адпавядае, на думку вучня ўзроўню яго ведаў, а — немагчымасць абскарджання гэтай адзнакі і праверкі крытэраў, па якіх адзнака была выстаўлена і г. д. І нават наяўнасці механізма недастаткова — гэты механізм павінен быць дзеючы і эфектыўны. Для таго каб механізм быў дзеючы і эфектыўны, акрамя спецыяльных органаў якія займаюцца пытаннямі абскарджання адзнакі павінны быць усталяваны працэдуры правядзення абскарджання.

Другі выпадак з'яўляецца парушэннем правоў чалавека. Кожнае дзіця мае права на імя. Прычым бацькам дадзена права выбіраць сваім дзецям такія імёны, якія яны хочуць, а спецыяльныя дзяржаўныя органы ЗАГСа павінны толькі рэгістраваць імёны, нададзеныя бацькамі. Не можа быць зарэгістраванае імя толькі ў тым выпадку, калі яно мае абразлівую форму. Згодна з беларускім заканадаўствам няма ніякіх абавязковых спісаў ці нейкага афіцыйнага пераліку імёнаў, у адпаведнасці з якімі павінны называцца людзі. Дзяржава абавязана гарантаваць, у гэтым выпадку, права на выбар імя дзіцяці па жаданні бацькоў.

Трэці выпадак таксама з'яўляецца парушэннем правоў чалавека. Дзяўчыну не прынялі на працу не таму, што яна не адпавядала фармальным крытэрам (наадварот, яна атрымала юрыдычную адукацыю з адзнакай), а толькі праз тое, што яна дзяўчына. Тут — прыклад дыскрымінацыі па палавой прыкмеце.

Ва ўсіх трох выпадках адным з бакоў у гэтых канфліктных сітуацыях выступае чалавек, а з другога — прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады (прадстаўнік міністэрства адукацыі, прадстаўнік ЗАГС, прадстаўнік міліцыі).

**Тлумачальная інфармацыя**

**Абмеркаванне выпадкаў пры дапамозе метаду «Займі пазіцыю» можа прыводзіць да спрэчак паміж удзельнікамі і быць прычынай далейшых канфліктаў. Адразу пасля правядзення дадзенага абмеркавання неабходна «вывесці ўдзельнікаў з роляў». Зрабіць гэта можна, напрыклад, нагадаўшы, што ўдзельнікі, выказваючы свае меркаванні стварылі ўмовы для абмеркавання праблемы правоў чалавека і іх прыкмет, і папрасіць удзельнікаў падзякаваць адзін аднаму праз воплескі.**

**5. Падагульніце вынікі заняткаў (5 хв.).**

Падагульненне вынікаў заняткаў можна правесці з дапамогай наступных пытанняў:
- Якія з аргументаў, выказаных падчас абмеркавання выпадкаў, найлепш раскрывалі сутнасць правоў чалавека?
- Што такое правы чалавека?
- Чаму правы чалавека сталі падмуркам дэмакратычных дзяржаў?
- Ці змянілася ваша разуменне правоў чалавека? Якім чынам?

**Дадатковая інфармацыя**

## ПАНЯЦЦЕ І АСНОЎНЫЯ ПРЫКМЕТЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

**Правы чалавека – гэта сістэма каштоўнасцяў, нормаў і механізмаў, якія накіраваныя на абарону годнасці асобы ў яе адносінах з дзяржавай.**

Правы чалавека як самастойная катэгорыя пачалі афармляцца толькі ў другой палове саракавых гадоў XX ст. пасля заканчэння трагічнай для чалавецтва Другой сусветнай вайны. Разам з тым вытокі правоў чалавека некаторыя даследчыкі знаходзяць яшчэ ў рэлігійных вучэннях, якія вылучалі асобу як каштоўнасць, надзеленую годнасцю і вылучаную Богам з жывёльнага свету.

Правы чалавека даюцца кожнаму чалавеку ад нараджэння і вынікаюць з яго прыроды. Гэта значыць, што чалавек мае права на свабоду не таму, што нехта яму гэта дазваляе, а таму, што гэта сутнасць чалавека. Гэта тычыцца не толькі катэгорыі свабоды, але і ўсіх правоў і свабод (права на адукацыю, права на свабоду сходаў, на навакольнае асяроддзе і г. д.), якія замацаваны ў міжнародных актах і нацыянальным заканадаўстве. Чалавек мае права быць свабодным, права на адукацыю, права на жыццё і г. д. — таму што ён нарадзіўся чалавекам.

Прынята рабіць падзел паміж правамі і свабодамі чалавека. Як правіла, падзел грунтуецца на ролі дзяржавы: свабоды — гэта сфера адносін, у якую дзяржава не павінна ўмешвацца

(напрыклад, свабода слова ці перамяшчэння), а правы — гэта сфера адносін, якую дзяржава абавязваецца забяспечыць праз спецыяльныя механізмы рэалізацыі (напрыклад, права на адукацыю). Аднак падзел на правы і свабоды з'яўляецца хутчэй катэгорыяй тэарэтычнага характару, цікавай для даследчыкаў, а не практыкаў.

Паходжанне правоў чалавека, іх натуральная прырода цесна звязаныя з паняццем годнасці. Годнасць — гэта адна з цэнтральных катэгорый у паняцці правоў чалавека. Годнасць грунтуецца і вынікае з прыроды чалавека і належыць чалавеку ад нараджэння да смерці. Незалежна ад таго, добры чалавек ці дрэнны. Годнасць — гэта катэгорыя, якая адрознівае чалавека, таму да любога чалавека трэба ставіцца годна.

Сучасная канцэпцыя правоў чалавека надае гэтым правам індывідуальны характар. Гэта азначае, што правы чалавека разглядаюцца як правы, якія належаць асобам, індывідам, а не калектывам ці групам. Лічыцца, што правы чалавека не ахопліваюць, напрыклад, рэлігійныя ці расавыя меншасці ў цэлым, а належаць асобам, якіх можна аднесці да гэтых груп. Іншымі словамі, сёння ў якасці носьбіта правоў чалавека выступае асобны чалавек.

Катэгорыя правоў чалавека ў першую чаргу адлюстроўвае адносіны паміж чалавекам і дзяржаўнымі органамі. Фармальна грамадзяне і прадстаўнікі дзяржаўных органаў роўныя. Але дзяржава і яе органы надзелены асаблівай палітычнай уладай і маюць спецыяльныя паўнамоцтвы, дадзеныя заканадаўствам, якія дазваляюць часам абмяжоўваць некаторыя правы чалавека, а часам прыводзяць да парушэння правоў чалавека прадстаўнікамі дзяржавы. Аднак якраз правы чалавека абмяжоўваюць дзяржаўную ўладу і накладаюць на прадстаўнікоў дзяржавы абавязкі па гарантаванні і рэалізацыі правоў чалавека.
Такія спецыфічныя адносіны паміж асобай і дзяржавай, дзеля большай вобразнасці, некаторыя называюць «вертыкальным» характарам правоў чалавека («гарызантальныя» адносіны – гэта адносіны паміж дзьвума прыватнымі асобамі, а «вертыкальныя» – паміж чалавекам і прадстаўніком дзяржавы). Прыкладамі розніцы ў адносінах «вертыкальнага» і «гарызантальнага» характару з'яўляюцца:

1) просьба міліцыянера спыніцца, здзейсненая ім, напрыклад, у адносінах да прахожага на вуліцы («вертыкальныя» адносіны);
2) просьба спыніцца аднаго прахожага да другога («гарызантальныя» адносіны).

1. Незалежна ад таго, хочацца размаўляць з міліцыянерам ці не, прахожы абавязаны спыніцца па просьбе міліцыянта, калі той выконвае свае службовыя абавязкі. Зразумела, што такое затрыманне (а просьбу спыніцца можна разглядаць як затрыманне) міліцыянерам можа адбывацца толькі ў межах закона, які рэгламентуе яго дзеянні ў такой сітуацыі. У выпадку непадпарадкавання міліцыянер мае права затрымаць чалавека на тэрмін да трох гадзінаў, выклікаць нарад міліцыі, нават ужыць сілу.

2. Прахожы можа і не рэагаваць на просьбу спыніцца з боку іншага прахожага. У дадзеным выпадку абедзве асобы са сваёй волі могуць спыніцца, калі гэтага захочуць. Калі асоба, з якой чалавек хацеў размаўляць, не хоча з ім размаўляць — ніхто не можа супраць яго жадання спыняць такую асобу ці затрымліваць, і гэта права абаронена законам. Калі нехта супраць яго волі будзе кагосьці затрымліваць — такі чалавек можа прыцягнуць асобу, якая затрымлівае, да адказнасці, напрыклад праз суд.

Возьмем іншы прыклад — калі адзін чалавек у тралейбусе наступіў на нагу другому чалавеку. У гэтым выпадку людзі знаходзіліся ў фармальна роўных умовах (што не выключае наступстваў для асобы якая наступіла на нагу). Але ў дадзеным выпадку парушаны могуць быць, напрыклад правы, якія абараняюцца Грамадзянскім кодэксам, але не правы чалавека (хоць і тут ёсць аспекты правоў чалавека — гл. наступны параграф). Гэта азначае, што асоба, якой нанеслі матэрыяльную шкоду (напрыклад, пашкодзілі абутак), нанеслі шкоду здароўю (траўма нагі) і нанеслі маральную шкоду — згодна з заканадаўствам мае права праз суд атрымаць кампенсацыю, а адказчык можа нават быць прыцягнуты да больш суровай адказнасці. А вось калі міліцыянер наступіў затрыманай асобе на нагу з мэтай выклікаць боль — ён парушыў не толькі правы, якія абараняюцца крымінальным ці грамадзянскім заканадаўствам, але і правы чалавека. У такіх выпадках міліцыянер, прадстаўнік дзяржавы, і павінен несці адказнасць, а калі дзяржаўныя органы не асудзяць дзеянні міліцыянера, можна казаць яшчэ пра адно парушэнне правоў чалавека. Калі дзяржава належным чынам не рэагуе на парушэнне правоў чалавека прадстаўніком дзяржавы альбо свядома іх парушае — адказвае ўся дзяржава (напрыклад у Камітэце па правах чалавека і ў Еўрапейскім Судзе па правах чалавека), пры наяўнасці адпаведнай скаргі.

Варта адзначыць, што выпадак, калі адна асоба наступіць на нагу другой асобе, таксама можа зрабіцца праблемай правоў чалавека: напрыклад, калі асоба, якой пашкодзілі ў тралейбусе нагу, з нейкіх прычынаў не можа звярнуцца ў дзяржаўныя органы, дзе б разгледзелі гэты выпадак і вынеслі справядлівае рашэнне. Тады, пасля праходжання ўсіх прыступак нацыянальнай судовай сістэмы са скаргамі, асоба мае права звярнуцца ў міжнародныя органы, дзе адказчыкам будзе ўжо дзяржава, якая не прадставіла эфектыўных сродкаў прававой абароны.

Паходжанне правоў чалавека таксама звязана з прынцыпам чалавекалюбства, ці гуманізму, на якім павінны будавацца адносіны паміж людзьмі, адносіны паміж асобай і дзяржавай. Прынцыпы гуманізму азначаюць, што мерай усяго ў дзейнасці дзяржавы з'яўляюцца інтарэсы і патрэбы чалавека, што дзяржава мае абавязак ствараць камфортныя ўмовы для жыцця, развіцця і творчасці чалавека, што гэтыя ўмовы павінны быць годнымі для чалавека.

Адносіны паміж людзьмі, каштоўнасці, на падставе якіх людзі сябе паводзяць у штодзённым жыцці, з'яўляюцца істотным элементам правоў чалавека, паколькі служаць ўнутраным стрыжнем захавання правоў чалавека кожнай асобай: як простым грамадзянінам, так і дзяржаўным служачым.

Атрыманне правоў чалавека ад нараджэння, гуманістычныя каштоўнасці, годнасць, «вертыкальны» характар правоў чалавека, асаблівае стаўленне і каштоўнасці кожнага асобнага чалавека, якія закладаюцца з дзяцінства, можна разглядаць як прыкметы правоў чалавека.

**РАЗДАТАК № 1.1**

## ПРЫКМЕТЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Правы мае кожны чалавек ад нараджэння.

Кожная асоба мае правы чалавека, бо з’яўляецца чалавекам.

Правы чалавека ўзніклі для таго, каб абмежаваць уладу дзяржавы над чалавекам.

Правы чалавека існуюць для таго, каб паставіць перашкоду тыраніі дзяржавы над чалавекам.

Правы чалавека існуюць для таго, каб абараніць годнасць чалавека ад замахаў на яе з боку дзяржавы.

Правы чалавека існуюць для таго, каб улада ўсведамляла, што чалавек не з’яўляецца рабом дзяржавы.

Правы чалавека існуюць для таго, каб чалавек мог арганізаваць сваё жыццё ў дзяржаве ў адпаведнасці з разуменнем годнага існавання.

Правы чалавека належаць асобам, а не групам. Гэта значыць, напрыклад, што правы чалавека належаць асобе як прадстаўніку нацыянальнай меншасці, а не нацыянальным меншасцям у цэлым.

Правы чалавека ўсталёўваюць рамкі адносін паміж дзяржавай (яе прадстаўнікамі) і асобай.

Правы чалавека грунтуюцца на прынцыпах чалавекалюбства, узаемапавагі, шанавання годнасці іншай асобы.

Правы чалавека замацаваныя нацыянальнымі законамі.

Правы чалавека замацаваны ў міжнародных дакументах.

Асноўная адказнасць і абавязак абараняць і пашыраць правы чалавека ляжыць на дзяржаве.

Правы чалавека абараняюцца дзяржаўнымі органамі і судамі краіны.

Правы чалавека абараняюцца міжнароднымі органамі і структурамі ААН, АБСЕ, Рады Еўропы.

Правы чалавека абараняюцца ўнутраным перакананнем асобы, што парушаць правы чалавека нельга.

Правы чалавека абараняюцца актыўнымі дзеяннямі асоб і груп асоб па абароне і навучанні правам чалавека.

Ніхто не можа пазбавіць ці адабраць у чалавека яго правы.

Чалавек не можа адмовіцца ад сваіх правоў.

Здзяйсненне правоў і свабод чалавека не павінна парушаць правоў і свабод іншых людзей.

Некаторыя правы чалавека ў выключных сітуацыях могуць быць абмежаваны.

# 1.1. ШТО ТАКОЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА
(заняткі разлічаны на 90 хв.).

Адметнасцю гэтага варыянта заняткаў з’яўляецца не толькі выкарыстанне іншых метадаў працы, але і ўвядзенне новага зместавага блоку, прысвечанага нарматывісцкаму і каштоўнаснаму падыходам да разумення правоў чалавека.

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
  - асобныя прыкметы правоў чалавека;
  - што такое правы чалавека;
  - сутнасць каштоўнаснага і нарматывісцкага падыходаў да правоў чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
  - растлумачыць сутнасць правоў чалавека;
  - растлумачыць розніцу паміж каштоўнасным і нарматывісцкім падыходамі да правоў чалавека;
  - вызначаць сітуацыі, якія маюць дачыненне да правоў чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
  - да правоў чалавека як да сістэмы каштоўнасцяў, нормаў і механізмаў, накіраваных на абарону годнасці асобы ў яе дачыненнях з дзяржавай;
  - да правоў чалавека як да адносін асобы і дзяржавы;
  - да паняцця *правы чалавека* як да катэгорыі, якая знаходзіцца ў пастаянным станаўленні і развіцці.

**План заняткаў у фармаце 90 хв.:**

1. Факусаванне ўвагі — 4 хв.
2. Знаёмства з тэмай і задачамі заняткаў — 1 хв.
3. Сутнасць і прыкметы правоў чалавека. Праца над калажамі Правы чалавека — 50 хв.
4. Прэзентацыя і падагульненне вынікаў працы груп — 25 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 10 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (4 хв.).**

Прывядзіце прыклад парушэння правоў чалавека і прыклад, калі парушэнне правоў чалавека адсутнічае, хоць факт парушэння асабістых правоў існуе. Неабходныя прыклады можна знайсці ў дадатковай інфармацыі да занятку 1.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Асноўная мэта гэтай часткі — засяродзіць увагу навучэнцаў на паняцці правоў чалавека. Як правіла, навучэнцы вельмі павярхоўна разумеюць, што гэта такое. Яны могуць называць любыя парушэнні, як правіла, асабістых правоў, не толькі і не столькі дзяржавай, колькі іншымі грамадзянамі (тлумачэнне паняцця правы чалавека гл. ў тлумачальнай інфармацыі і раздататачных матэрыялах да заняткаў). Адказы можна запісаць, каб у канцы прапанаваць навучэнцам праверыць, ці адпавядаюць прапанаваныя ў пачатку заняткаў прыклады крытэрам правоў чалавека, што можна змяніць у прапанаваных прыкладах для таго, каб яны адпавядалі прыкметам правоў чалавека.**

**2. Прадстаўце тэму і задачы заняткаў (1 хв.).**

**3. Праз працу над калажамі «Правы чалавека» разгледзьце сутнасць і прыкметы правоў чалавека (50 хв.).**

Аб’яднайце ўдзельнікаў у 4 групы. Кожная група атрымлівае раздатачны матэрыял, які тлумачыць, што такое правы чалавека, а таксама нажніцы, клей, ватман, маркеры, часопісы ці газеты. Часопісы і газеты могуць быць любой скіраванасці, галоўнае, каб на іх старонках была вялікая колькасць фотаздымкаў, малюнкаў, на якіх адлюстравана дзейнасць людзей.

На працягу вызначанага часу групы павінны самастойна:

а) азнаёміцца з матэрыяламі па правах чалавека раздатка 1.1. і 1.2,

б) абмеркаваць канцэпцыю калажа (упэўніцеся, што ўдзельнікі разумеюць, што такое калаж), з дапамогай якога яны будуць дэманстраваць сваё бачанне паняцця правы чалавека;

в) падрыхтаваць калаж, у якім адлюстроўваецца паняцце *правы чалавека* (альбо праз прыклад парушэння правоў чалавека, альбо праз прыкметы паняцця *правы чалавека*, альбо праз адлюстраванне асобных правоў чалавека і г. д.).

**Тлумачальная інфармацыя**

Пад калажам мы разумеем спосаб адлюстравання свайго бачання і разумення чагосьці (у нашым выпадку — паняцця правы чалавека) пры дапамозе аплікацыі з фотаздымкаў, малюнкаў і іх частак, подпісаў да іх, якія аб'ядноўваюцца адной ідэяй, якую аўтары хочуць данесці да гледача.

Што тычыцца раздаткаў, то ў выпадку калі на адным з заняткаў настаўнік ужо выкарыстоўваў раздатак 1.1., можна не раздаваць гэты раздатак, а проста ўзгадаць з удзельнікамі асноўныя прыкметы правоў чалавека, адзначаныя ў дадзеным занятку. Гэта значыць, што ўдзельнікі будуць ствараць калаж на падставе ўзгаданых прыкмет правоў чалавека (занятак 1 і раздатак 1.1.) і раздатка 1.2.

**4. Прадстаўце вынікі працы груп (25 хв.).**

Кожная з груп вывешвае падрыхтаваныя калажы. Навучэнцы па чарзе падыходзяць да кожнага з іх. Прэзентацыю калажаў можна арганізаваць двума спосабамі:

а) прадстаўнікі іншых груп выказваюць свае меркаванні наконт таго, што адлюстравана на калажы, а пазней аўтары тлумачаць, што яны хацелі паказаць;
б) аўтары прадстаўляюць свой калаж, адказваюць на магчымыя пытанні і каментарыі.

**Тлумачальная інфармацыя**

Мэта гэтай часткі заняткаў — абмеркаваць асобныя прыкметы паняцця правы чалавека, вызначыць асобныя віды правоў чалавека, а таксама акрэсліць тое, што ўдзельнікі разумеюць пад гэтым паняццем. Абмеркаванне павінна адбывацца вакол прыкмет правоў чалавека, вылучаных удзельнікамі груп. Задача настаўніка — выкарыстоўваючы ўласны досвед і веды ў галіне правоў чалавека, а таксама пададзены ніжэй дадатковы матэрыял, арганізаваць абмеркаванне магчымых прыкмет правоў чалавека, паспрабаваць вылучыць гэтыя прыкметы праз разгляд і вытлумачэнне адлюстраваных у калажах выпадкаў парушэнняў правоў чалавека.

Часта ўдзельнікі адлюстроўваюць у калажах ілюстрацыі вядомых ім правоў чалавека, напрыклад, права на жыццё, на перамяшчэнне і г. д. Для настаўніка істотным з'яўляецца толькі вылучэнне нейкіх прыкмет, якія адрозніваюць правы чалавека ад іншых правоў. Такімі прыкметамі могуць быць як мінімум:
1) гуманістычны характар каштоўнасцяў, на якіх грунтуюцца адносіны паміж асобай і дзяржавай;
2) паходжанне правоў чалавека (дадзеныя ад нараджэння і вынікаюць з прыроды чалавека);
3) правы чалавека накіраваны на забеспячэнне годнасці асобы;
4) правы чалавека носяць індывідуальны характар;
5) правы чалавека абараняюць ад дыскрымінацыі;
6) правы чалавека – адносіны чалавека і дзяржавы.

Больш увагі надавайце каментарам удзельнікаў. Каментуйце калажы на падставе дадатковай інфармацыі для настаўніка. Звяртайце ўвагу не толькі на самі прыкметы правоў чалавека, але і на асаблівасці і адрозненні нарматывісцкага і каштоўнаснага падыходаў, а таксама на ролю ўзаемадзеяння гэтых падыходаў у мэтах развіцця правоў чалавека.

**5. Падагульніце вынікі заняткаў (10 хв.).**

Падагульненне вынікаў можна пабудаваць з дапамогай наступных пытанняў:
- Чым адрозніваліся калажы груп? Якія прыкметы паняцця правы чалавека былі асветлены калажамі найлепш? Якія з адлюстраваных прыкмет правоў чалавека можна назваць найбольш важнымі і чаму?
- Што такое правы чалавека? У якіх выпадках можна гаварыць аб парушэнні правоў чалавека?
- Чым каштоўнасны падыход да правоў чалавека розніцца ад нарматывіскага?
- Як змянілася ваша стаўленне да правоў чалавека, разуменне гэтага паняцця ў параўнанні з пачаткам заняткаў?

## НАРМАТЫВІСЦКІ І КАШТОЎНАСНЫ ПАДЫХОДЫ ДА ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

**Існуе некалькі асноўных падыходаў да разумення катэгорыі правоў чалавека. У дапаможніку разглядаюцца толькі два з іх: нарматывісцкі і каштоўнасны.**

Прыхільнікі нарматывісцкага падыходу вялікае значэнне ў абароне правоў чалавека надаюць знешнім механізмам і структурам: заканадаўству, дагаворам, міжнародным і нацыянальным палітычным інстытутам, напрыклад нацыянальнай судовай сістэме, органам правапарадку, міжнародным органам і міжнародным дакументам.

Прыхільнікі каштоўнаснага падыходу асноўны акцэнт робяць на ўнутраны свет чалавека, на яго каштоўнасці, стаўленні, свядомасць. На іх думку, каб прадухіліць магчымыя парушэнні правоў чалавека, неабходна стварыць эфектыўную сістэму ўкаранення каштоўнасцяў правоў чалавека з самага маленства. У гэтым выпадку любы чалавек ў грамадстве будзе носьбітам каштоўнасцяў, якія будуць спрыяць пабудове як міжасабовых адносінаў, так і адносінаў паміж асобай і дзяржавай на прынцыпах гуманізму і павагі да годнасці чалавека. Прадстаўнікі ўлады не будуць парушаць правы чалавека таму, што яны самі носьбіты вышэйакрэсленых каштоўнасцяў.

Правы чалавека — гэта сістэма каштоўнасцяў, нормаў і механізмаў, якія накіраваныя на абарону годнасці асобы ў яе адносінах з дзяржавай.

Каштоўнасны і нарматывісцкі падыходы ўзаемазвязаныя і ўзаемадапаўняльныя, складаюць механізм фармавання катэгорыі правоў чалавека. У параўнанні з нормамі, дагаворамі, механізмамі, якія патрабуюць спецыяльнай працэдуры прыняцця, і значыць, змены ў якіх адбываюцца даволі павольна, свядомасць чалавека мабільнейшая. Гэта азначае, што асоба можа ўсведамляць у якасці катэгорыі правоў чалавека не толькі тыя палажэнні, якія ўжо замацаваны ў нацыянальных і міжнародных дакументах, але і тыя, што да такой катэгорыі пакуль не належаць.

У гэтым выпадку такая асоба становіцца ініцыятарам разгляду канкрэтнага выпадку парушэння правоў і, дайшоўшы да міжнародных органаў, стварае ўмовы, калі гэтыя органы для разгляду пытанняў па правах чалавека вымушаны аналізаваць дадзеную сітуацыю праз прызму правоў чалавека. У выніку прыняцця рашэння ствараецца прэцэдэнт — рашэнне, на якое спасылаюцца пры разглядзе наступных падобных выпадкаў. Так, пaступова правы, якія не ўтрымліваліся ў дакументах па правах чалавека, становяцца часткай іх нормаў.

Аўтар лічыць важным для забеспячэння правоў чалавека існаванне прынцыпаў гуманізму, павагі да меркавання, спосабу жыцця і культурнай традыцыі ў адносінах паміж людзьмі. Разам з тым асаблівасці гістарычнага і культурнага развіцця краін Усходняй Еўропы, і ў прыватнасці Беларусі, прывялі да ўзвышэння ролі і значэння дзяржавы ва ўсіх сферах жыцця грамадства. З гэтай прычыны сёння ў Беларусі прыярытэт павінен аддавацца адносінам паміж асобай і прадстаўніком палітычнай улады, альбо вертыкальнаму характару правоў чалавека. Каштоўнасці і гарызантальныя адносіны паміж людзьмі аўтар разглядае як адзін з істотных кампанентаў правоў чалавека, якія носяць не проста дадатковы характар, але характар паўнавартаснай складовай часткі правоў чалавека, без якой немагчыма эфектыўнае яе існаванне. У дапаможніку каштоўнасці разглядаюцца як механізм, які забяспечвае існаванне, развіццё і пашырэнне правоў чалавека, але які ў той самы момант спалучаецца з прававой сістэмай, здольнай вонкавымі ўмовамі і рэальна, эфектыўна абмежаваць дзяржаву.

Ініцыятарамі адстойвання правоў чалавека, перагляду звязаных з гэтым паняццем нормаў, становяцца, як правіла, грамадска-актыўныя людзі, неабыякавыя да жыцця грамадства і сваёй краіны, якія праніkліся каштоўнасцямі правоў чалавека.

**РАЗДАТАК № 1.2**

**ПАНЯЦЦЕ *ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА***

Людзі па-рознаму разумеюць, што такое правы чалавека. Найчасцей можна пачуць пра два падыходы пра тое, што такое правы чалавека: *нарматывісцкі* і *каштоўнасны.*

**Нарматывісцкі падыход да разумення правоў чалавека**

Тэрмін нарматывісцкі падыход паходзіць ад слова норма — агульнаабавязковае правіла. У справе абароны правоў чалавека гэты падыход надае вялікую ўвагу дакументам, працэдурам і інстытутам (судам, камітэтам, дакументам, судовым рашэнням), пры дапамозе якіх можна абараніць правы асобы, яе чалавечую годнасць ад дыскрымінацыі з боку дзяржавы.

Напрыклад, згодна з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі нормамі, дзяржава абявязана прадставіць магчымасць вучыцца ў школе любому дзіцяці, незалежна ад колеру скуры, веравызнання, нацыянальнасці. Калі ж, напрыклад, паўстане сітуацыя, што ў школу не прымаюць цыганскую дзяўчынку, то суд гэтай дзяржавы павінен прымусіць тых, хто парушыў гэтую норму, прыняць дзяўчынку ў школу. А вось калі суд не прыме такога рашэння, то міжнародныя органы па правах чалавека (напрыклад, Камітэт па правах чалавека ААН) могуць прызнаць дадзены канкрэтны выпадак парушэннем правоў чалавека і абавязаць дзяржаву выправіць сітуацыю (тады дзяржава павінна прыняць дзяўчынку ў школу і прыняць такія заканадаўчыя захады, якія болей не дапусцяць паўтору падобнай сітуацыі, а ў некаторых выпадках, дадаткова, дзяржава абавязаная будзе выплаціць дзяўчынцы грашовую кампенсацыю).

Нарматывісцкі падыход прадугледжвае, што правы чалавека трэба запісваць у спецыяльных дакументах і ствараць органы, якія б сачылі за выкананнем гэтых дакументаў. Калі дзяржаўны служачы парушыць хоць адно з замацаваных у гэтых дакументах права, то спецыяльныя органы павінны дапамагчы выправіць парушэнне.

**Каштоўнасны падыход да разумення правоў чалавека**

Каштоўнасны падыход надае вялікую ўвагу ў справе абароны правоў чалавека думкам, меркаванням, вартасцям саміх людзей. Гэта значыць, што канкрэтныя паводзіны дзяржавы і людзей чалавек можа самастойна ацэньваць як правільныя ці няправільныя, сыходзячы з унутранай маральнай ацэнкі таго, якімі гэтыя паводзіны павінны быць, незалежна ад таго, замацаваны яны ў дакументах ці не.

Напрыклад, на міжнародным узроўні няма адназначнай забароны прымянення смяротнага пакарання (ёсць Другі факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, скіраваны на скасаванне смяротнага пакарання, які не мае абавязковай сілы). Аднак калі ў свеце будзе ўзмацняцца рух за адмену смяротнага пакарання і будзе адпаведная палітычная воля — такі абавязковы дакумент (напрыклад, канвенцыя) можа быць прыняты ў рамках ААН (у Еўропе, краіны, якія уваходзяць у Раду Еўропы,s адмянілі смяротнае пакаранне).

Каштоўнасны падыход гаворыць, што меркаванні адносна правоў чалавека трэба выхоўваць з маленства ў свядомасці кожнага асобнага чалавека. Гэты падыход лічыць, што змены спачатку адбываюцца ў меркаваннях чалавека пра нейкую сітуацыю, у яго свядомасці. А ўжо потым гэтыя змены могуць замацоўвацца ў прававых і міжнародных нормах. Каштоўнасці з'яўляюцца агульнаабавязковымі для пабудовы адносін у грамадстве не толькі паміж чалавекам і дзяржаўным служачым, але і паміж самімі грамадзянамі.

**Нарматывісцкі і каштоўнасны падыходы дапаўняюць адзін аднаго.**

**Правы чалавека** — гэта сістэма каштоўнасцяў, нормаў і механізмаў, якія накіраваныя на абарону годнасці асобы ў яе дачыненнях з дзяржавай.

# 2. ГІСТОРЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- асноўныя этапы ўзнікнення правоў чалавека;
- агульную логіку станаўлення правоў чалавека;
- асобныя правы, якія можна аднесці да катэгорыі правоў чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- называць прычыны станаўлення правоў чалавека;
- вытлумачваць сутнасць таго альбо іншага этапу станаўлення правоў чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да гісторыі станаўлення правоў чалавека як да працэсу выкліканага зменамі ў развіцці чалавечай супольнасці і які працягваецца да гэтага часу.

**План заняткаў:**

1. Знаёмства з тэмай і задачамі заняткаў — 1 хв.
2. Індывідуальная праца над вылучэннем асноўных правоў чалавека — 5 хв.
3. Прадстаўленне і падагульненне вынікаў індывідуальнай працы — 7 хв.
4. Гісторыя станаўлення правоў чалавека — 28 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 4 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Азнаёмце ўдзельнікаў з тэмай і задачамі заняткаў (1 хв.).**

**2. Праз індывідуальную працу вылучыце асноўныя правы чалавека (5 хв.).**
Папрасіце навучэнцаў уявіць, што яны знаходзяцца пад чыёйсьці абсалютнай уладай.
Яны не маюць права нічога рабіць самастойна, іх можна прадаваць, прымушаць працаваць, нават пазбавіць жыцця.

Прапануйце навучэнцам напісаць 2 асноўныя правы, якія маглі б забяспечыць ім нармальнае ў іх разуменні існаванне.

**Тлумачальная інфармацыя**

**У час тлумачэння задання зрабіце акцэнт на тое, што ўдзельнікі павінны ўсведамляць, што яны знаходзяцца пад неабмежаванай, абсалютнай уладай. Сама дзяржава, якую прапануецца ўявіць, — абстрактная (не існуе на самой справе), але для выканання задання, якое заключаецца ў вылучэнні найбольш істотых правоў, якія абараняюць асобу ад абсалютнай улады, трэба быць упэўненым, што ўдзельнікі надзяляюць гэтую абстрактную дзяржаву менавіта бязмежнай, абсалютнай уладай.**

У час выканання задання ўдзельнікі могуць назваць права на жыццё. Тады, калі, напрыклад, дзяржаве забараняецца адвольна, без віны караць смерцю, але само сабою права на жыццё не можа зводзіцца толькі да забароны караць смерцю. Больш падрабязную інфармацыю адносна дадзеных пытанняў можна знайсці ў дадатковай інфармацыі для настаўніка да заняткаў 1, 10 і 11. Можа быць названа таксама права на асабістую свабоду (гэта тая частка жыцця чалавека ў якую не можа умешвацца ніхто — ні чалавек, ні дзяржава). Можа быць згадана права на незалежны і справядлівы суд (для таго каб дзяржава не магла загадваць суду, як разглядаць кожную асобную справу) і г. д.

Калі ўдзельнікі называюць іншыя правы і свабоды, гэта не страшна — важна, каб яны здольныя былі патлумачыць, як названыя правы могуць абараняць асобу ад неабмежаванай улады. Навучэнцы могуць называць і такія правы і свабоды, якія з іх пункту гледжання з'яўляюцца істотнымі, але зараз не замацаваны ў міжнародных нормах. Альбо такія, што на думку настаўніка ніколі не будуць часткай правоў чалавека. Напрыклад, права на добрую ежу, права на утрыманне свайго цела ў чысціні. У гэтым занятку не так важна, называюць удзельнікі рэальныя правы (замацаваныя ў дакументах) ці называюць неіснуючыя. Важна прааналізаваць прычыны, па якіх названыя імі правы былі б важнымі, а таксама — якія правы ў названай сітуацыі поўнага падпарадкавання ўладзе ў першую чаргу маглі б дапамагчы асобе.

**3. Прадстаўце і падагульніце вынікі індывідуальнай працы (7 хв.).**
Пасля таго, як удзельнікі выканаюць заданне, папрасіце іх агучыць вынікі працы.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Запісвайце іх на ватмане ці дошцы. Прэзентацыю зрабіце такім чынам, што за адзін раз кожны ўдзельнік можа назваць толькі адно права, якое яшчэ не было названае іншымі. Удзельнікі, як правіла, называюць вельмі падобныя правы. Не хвалюйцеся — гэта само па сабе можа стаць ілюстрацыяй да гісторыі станаўлення правоў чалавека, калі першапачаткова замацоўваюцца найбольш істотныя з пункту гледжання фізічнага выжывання і асноўных гарантый правы, а пазней іх кола пашыраецца.**

Падагульненне прэзентацыі праводзіцца па наступных пытаннях:
- Чаму вы вылучылі менавіта гэтыя правы?
- Якія з прапанаваных іншымі групамі правоў з'яўляюцца найбольш істотнымі, на вашу думку?
- Якія з гэтых правоў, з вашага пункту гледжання, былі замацаваныя раней за іншыя? Чаму?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Настаўніку варта не проста выслухаць прэзентацыі, а высветліць, чаму менавіта гэтыя правы і свабоды вучні лічаць найбольш істотнымі.**

**4. Азнаёмце з гісторыяй станаўлення правоў чалавека (28 хв.).**
Знаёмства з гісторыяй станаўлення правоў чалавека можна правесці ў тры стадыі: самастойнае азнаямленне з раздатачным матэрыялам 2.1., падагульненне раздатачнага матэрыялу і дадатковыя тлумачэнні настаўніка ці адукатара, якія могуць грунтавацца на дадатковым матэрыяле да гэтых заняткаў.

Раздайце ўдзельнікам раздатак 2.1., папрасіце іх пазнаёміцца са зместам і вылучыць самае істотнае па кожным з азначаных этапаў станаўлення правоў чалавека. Падсумуйце інфармацыю, якая ўтрымлівалася ў раздатку, а пасля гэтага папрасіце ўдзельнікаў у выглядзе дыскусіі самастойна вызначыць асноўныя этапы станаўлення правоў чалавека. Затым самі патлумачце асноўныя моманты гісторыі станаўлення правоў чалавека. Выкарыстайце для гэтага раздатачны і дадатковы матэрыялы.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Мэтай дадзенай часткі з'яўляецца перадача новай інфармацыі аб правах чалавека, якую неабходна спалучыць з папярэднімі вынікамі працы ўдзельнікаў. Гэта азначае, што калі навучэнцы назвалі нейкія асобныя правы і свабоды, якія адпавядаюць аднаму з этапаў станаўлення правоў чалавека, то неабходна паспрабаваць звязаць адзначаныя правы і свабоды і абмеркаваць, напрыклад, пытанне: чаму гэтае канкрэтнае права ўзнікае менавіта ў гэты перыяд часу?**

**5. Падагульніце заняткі (4 хв.).**
Падагульніць заняткі можна з дапамогай наступных пытанняў:
- Якія этапы станаўлення правоў чалавека можна вылучыць? Якія асаблівасці гэтых этапаў?
- Чаму пачала развівацца ідэя абароны правоў чалавека ад дзяржавы? Па якіх прычынах ідэя правоў чалавека перайшла з нацыянальнага на міжнародны ўзровень?
- Якія пакаленні правоў прынята вылучаць? Ці могуць некаторыя з іх лічыцца найбольш істотнымі? Калі «так» – то якія?

**Дадатковая інфармацыя**

## ГІСТОРЫЯ СТАНАЎЛЕННЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Вытокі правоў чалавека, як правіла, звязваюць са станаўленнем розных філасофскіх, этычных, рэлігійных вучэнняў, пачынаючы ад старажытнасці.
Гэтыя вучэнні, з аднаго боку, надавалі асаблівую ролю і асаблівае значэнне паняццю *чалавек*, развівалі гэтае паняцце, а з другога боку, выкрышталізоўвалі падставовыя, універсальныя правілы арганізацыі супольнага жыцця з іншымі людзьмі, замацоўвалі гэтыя правілы і стваралі механізмы па іх выкарыстанні. Напрыклад, так званае залатое правіла «не рабі іншаму так, як ты не хочаш, каб рабілі табе», якое легла ў аснову арганізацыі жыцця чалавецтва — выпрацоўвалася рознымі народамі ў розных умовах. Гэтае правіла азначае, што ў адносінах з іншымі людзьмі твая свабода, твае жаданні, твая дзейнасць заўсёды абмяжоўваецца свабодай, жаданнямі і дзейнасцю іншых людзей. Гэтае залатое правіла ляжыць у аснове сусветных рэлігій — хрысціянства, будызму, даасізму, канфуцыянства, юдаізму, ісламу. Калі чалавеку лягчэй усведамляць як каштоўнасць сябе, то гэтае правіла заклікае чалавека разглядаць як каштоўнасць і іншых.

З самага пачатку станаўленне перадумоў фармавання правоў чалавека звязвалася, з аднаго боку, з філасофскай ці рэлігійнай распрацоўкай месца і ролі асобы ў грамадстве і свеце, з распрацоўкай паняцця чалавек як асобы, як нейкай адзінкі, адарванай ад супольнасці, як асаблівай каштоўнасці, а з другога боку — з паступовым афармленнем асобных правоў і свабод чалавека, іх замацаваннем у заканадаўстве. Фармаванне перадумоў правоў чалавека можна прасачыць ужо ў грэчаскай палітычнай філасофіі, вучэнні стоікаў, юдаізме і хрысціянстве.

Чалавек пачынае разглядацца як каштоўнасць сам сабою альбо ад таго, што ён роўны з багамі, альбо ад таго, што ён — створаны па «вобразе і падабенстве» Бога, што ён мае асаблівыя адносіны з Богам і г. д. Істотна, што ў гэтых падыходах чалавек пачынае паступова набываць рысы каштоўнасці сам па сабе, а гэта азначае, што і ў адносінах з іншымі людзьмі, і ў адносінах з грамадскімі і палітычнымі інстытутамі чалавек паступова пачынае разглядацца як каштоўнасць.

З другога боку, для таго каб абараніць гэтую каштоўнасць, у законах пачынаюць замацоўваць асаблівыя правы і свабоды асобы. Так, ужо ў Старажытнай Грэцыі існавалі некаторыя правы грамадзян, якія гарантаваліся дзяржавай, падобныя да тых правоў, якія ўтрымліваюцца ў міжнародных дакументах па правах чалавека. Напрыклад, свабода слова ці роўнасць перад законам. Праўда, гэтымі правамі маглі карыстацца толькі дарослыя мужчыны, якія былі асабіста свабоднымі і з'яўляліся грамадзянамі. Іншаземцы, рабы, жанчыны і дзеці не мелі гэтых правоў. Чалавекам грэкі прызнавалі толькі грамадзяніна.

У перыяд Сярэднявечча Фама Аквінскі развіў распрацаваныя грэчаскімі і рымскімі стоікамі ідэю правоў, якія атрымлівае асоба ад нараджэння. Гэтая канцэпцыя азначала, што Бог надае асобе асаблівыя правы, якія не могуць парушацца дзяржавай, у законах, якія ствараюцца чалавекам. У выпадку, калі натуральныя правы, дадзеныя ад нараджэння, будуць прыходзіць у супярэчнасць з тымі законамі, якія ўсталёўваюць людзі, — чалавек мае права не падпарадкоўвацца ім, паколькі гэтыя законы — несправядлівыя.

Асабліва хутка ў гэты час адбываецца заканадаўчае афармленне асобных правоў. Сярод найбольш вядомых законаў, якія замацоўвалі правы і свабоды, побач з англійскімі законамі «Магна Карта» («Вялікая Хартыя вольнасцяў») можна назваць законы, прынятыя на землях Беларусі: Ягайлы 1387 г., Казіміра 1447 г., Аляксандра 1492 г., дзе ўтрымліваліся такія правы феадалаў, як права на справядлівы суд, на абарону годнасці і маёмасці, на ўдзел у палітычных органах улады, свабодны выезд за мяжу і г. д.

Асаблівае месца ў шэрагу законаў, якія гарантавалі правы і свабоды розным слаям насельніцтва, займае Статут ВКЛ 1529 г., які некаторымі даследчыкамі разглядаецца як першая ў свеце канстытуцыя. Сярод прагрэсіўных нормаў гэтага закона: вяршэнства права (усе, у тым ліку вялікія князі і каралі павінны падпарадкоўвацца законам), права не толькі шляхты, але і простых «паспалітых» людзей удзельнічаць у выбарах вялікага князя, адзінства права (усе саслоўі павінны былі кіравацца толькі нормамі статута), хоць адзінства права і разглядалася скрозь прызму феадальнага права. Гэта значыць, што ў залежнасці ад саслоўя, да якога належаў чалавек, яму даваліся асаблівыя правы і асаблівыя абавязкі. Як і ў папярэдні, антычны перыяд, правы гарантаваліся не ўсяму насельніцтву, а толькі яго некаторай частцы, хоць кола людзей, якія атрымалі прававыя гарантыі ад дзяржавы, у перыяд Сярэднявечча пашыралася.

Найноўшая гісторыя правоў чалавека звязана з працамі Джона Лока (XVII ст.) і французскіх Асветнікаў (XVIII ст.). Менавіта гэтымі дзеячамі былі распрацаваны тэарэтычныя абгрунтаванні ўзнікнення натуральных правоў. Натуральныя правы перадаюцца кожнай асобе ад нараджэння і вынікаюць з прыроды чалавека. Пачынаюць адрозніваецца натуральнае права, дадзенае чалавеку прыродай, і законы, якія ўсталёўваюцца дзяржавай для таго, каб абараніць гэтыя натуральныя правы. Прапануецца ідэя заключэння дамовы паміж людзьмі з мэтай пабудаваць дзяржаву (як палітычную сістэму), якая б гарантавала правы і інтарэсы людзей.

Вынікам развіцця натуральна-прававой і дагаворнай канцэпцый сталі французская «Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна» 1789 г. Падставовыя палажэнні гэтага дакумента: людзі нараджаюцца свабоднымі і застаюцца роўнымі ў правах (арт. 1), роўнасць разумеецца як аднолькавая адказнасць перад законам і доступ да кіравання, роўны ўдзел у стварэнні законаў (арт. 6), чалавек лічыцца невінаватым, пакуль не даказана адваротнае (арт. 9), кожны можа выказваць свае думкі і меркаванні і распаўсюджваць іх (арт. 10 — 11) і г. д. Некаторыя з гэтых палажэнняў раней прысутнічалі ў феадальным заканадаўстве, але зараз гарантыі распаўсюджваліся на ўсіх, а не толькі на частку грамадства. Гэтымі палажэннямі гарантавалася, што кожны чалавек незалежна ад веры і сацыяльнага

паходжання атрымлівае права ўдзельнічаць у палітычнай уладзе і ва ўсталяванні заканадаўства. На працягу XIX — пачатку XX ст. гэтыя ідэі паступова ўкараняюцца ў заканадаўчыя сістэмы розных еўрапейскіх краін у выніку прававых і палітычных рэформаў, рэвалюцый, войнаў. Прававая абарона асобы ў межах асобных дзяржаў, як правіла, распаўсюджваецца на ўсё насельніцтва.

Паваротным пунктам у станаўленні правоў чалавека стала Другая сусветная вайна і яе вынікі. Злачынствы супраць чалавецтва і знішчальная ідэалогія выклікалі страх у міжнароднай супольнасці і прывялі да ўзнікнення тэарэтычных канцэпцый і механізмаў абароны правоў чалавека. Статут ААН і Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека сталі першымі крокамі па ўвядзенні катэгорыі правоў чалавека ў палітычную рэчаіснасць. У гэтых дакументах правы чалавека фігуруюць ужо не проста як пералік маральных ідэалаў, але ў якасці прынцыпаў міжнароднай палітыкі і новага сусветнага ладу.

Упершыню правы чалавека былі замацаваны ў палажэннях Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (1948 г.) а пазней былі канкрэтызаваны ў Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах (1966) і дадатковых пратаколах, а таксама ў Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (1966). Гэтыя дакументы ўпершыню стварылі міжнародную сістэму нормаў у галіне правоў чалавека, якая на міжнародным узроўні атрымала магчымасць адсочваць парушэнні дзяржавамі правоў чалавека і ўказваць дзяржавам на неабходнасць выпраўлення падобных парушэнняў. Для выканання гэтых палажэнняў былі створаны спецыяльныя органы ААН (напрыклад, Камітэт па правах чалавека).

Наступны этап развіцця правоў чалавека — гэта Еўрапейская канвенцыя абароны правоў чалавека і асноўных свабод 1950 г. і Еўрапейскі суд па правах чалавека. У адрозненне ад сістэмы абароны правоў чалавека ААН, гэтая сістэма мае рэальныя механізмы прымусу дзяржаў-членаў да выканання ўзятых на сябе абавязальніцтваў. У дачыненні да дзяржаў, якія адмовяцца выконваць рашэнні Еўрапейскага суда па правах чалавека, якія абавязваюць выправіць тыя альбо іншыя сітуацыі, звязаныя з парушэннямі правоў чалавека, могуць быць ужытыя міжнародныя палітычныя санкцыі.

Такім чынам, пачынаючы з сярэдзіны XX ст. большы ўхіл быў зроблены ў бок рэалізацыі нарматывісцкага падыходу да абароны правоў чалавека, што было выклікана, верагодна, гатоўнасцю і жаданнем саміх палітычных эліт. Сістэма міжнароднай абароны правоў чалавека ўключае ў сябе цэлы шэраг спецыяльных органаў. Гэта нядаўна створаная (замест Камісіі па правах чалавека) Рада ААН па правах чалавека, камітэты, якія адказваюць за выкананне адпаведных дамоваў, спецыяльныя рэпарцёры па асобных тэмах і краінах, а таксама судовыя (напрыклад, Еўрапейскі суд па правах чалавека) і квазісудовыя органы (напрыклад, Камітэт па правах чалавека), якія разглядаюць скаргі прыватных асоб супраць дзяржаў — парушальніц правоў чалавека, а таксама скаргі дзяржаў супраць іншых дзяржаў.

Што тычыцца грамадзян Беларусі, то на сённяшні дзень мы маем права падаваць індывідуальныя скаргі на парушэнне правоў чалавека з боку нашай дзяржавы ў Камітэт ААН па правах чалавека (на парушэнне палажэнняў Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах) і ў Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (на парушэнне палажэнняў Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын). Хоць Еўрапейская сістэма абароны правоў чалавека (Еўрапейскі суд па правах чалавека) і разглядаецца як найбольш эфектыўная, мы не маем права падаваць туды скаргі, бо Беларусь пакуль не з'яўляецца членам Рады Еўропы. Але мы можам звяртацца ў гэтую сістэму, калі нашы правы парушаны іншымі дзяржавамі, напрыклад падчас знаходжання на тэрыторыі іншай еўрапейскай краіны.

Грамадзяне Беларусі могуць выкарыстоўваць і АБСЕ для выказвання сваіх заўваг да выканання Беларуссю абавязальніцтваў па АБСЕ, аднак у АБСЕ не існуе працэдуры падачы скаргаў (толькі інстытут рэгулярных справаздачных канферэнцый па правах чалавека і іншыя інстытуты — гл. заняткі 4, 5).

У навуковай літаратуры існуе паняцце *пакаленні правоў чалавека*. Гэтае паняцце грунтуецца на ніжэй пададзенай схеме вытлумачэння гісторыі станаўлення правоў чалавека, якія паступова замацоўваліся на нацыянальным, а пазней і міжнародным узроўнях.

Першым пакаленнем прынята лічыць грамадзянскія і палітычныя правы. Першапачаткова асоба спрабавала абараніць сябе, сваё жыццё, замацаваць свае падставовыя правы і

свабоды, без якіх чалавек не можа адчуваць сябе не толькі годна, але і ў бяспецы, а таксама ўсталяваць кантроль над дзяржавай праз палітычныя правы.

Другое пакаленне — сацыяльныя, эканамічныя, а таксама культурныя правы — з’явіліся ў XIX — пачатку XX ст. Узнікненне гэтых правоў было выклікана імкненнем людзей пабудаваць справядлівейшае ў сацыяльным сэнсе грамадства, грамадства, якое б давала магчымасць роўных стартавых магчымасцяў незалежна ад сацыяльнай прыналежнасці і маёмаснага стану асобы.

Трэцяе пакаленне правоў чалавека звязваюць з афармленнем у другой палове XX ст. новых правоў чалавека, якім раней надавалася меншая ўвага, напрыклад права на чыстае асяроддзе. Неабходнасць афармлення гэтых правоў вынікае з развіцця самой філасофіі правоў чалавека, развіцця паняцця *годнасці* і *годнага існавання*, а таксама з узнікненнем новых навакольных умоў для жыцця чалавека.

## ГІСТОРЫЯ СТАНАЎЛЕННЯ ПАНЯЦЦЯ *ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА*

У глыбокай старажытнасці, у час фармавання цывілізацый Усходу, у пазнейшы антычны перыяд узніклі ідэі, якія папярэднічалі станаўленню правоў чалавека і былі звязаны з развіццём рэлігійных і філасофска-этычных вучэнняў. З самага пачатку ўзнікнення гэтых ідэй можна прасачыць як мінімум два накірункі: развіццё паняццяў асобы, чалавека як каштоўнасцяў грамадства і паступовае замацаванне ў законах асобных правоў чалавека. Аднак асаблівасцю таго часу з’яўляецца абмежаванае кола асоб, якія маглі карыстацца гарантаванымі дзяржавай правамі.

Перыяд Сярэднявечча звязаны з далейшым развіццём двух вышэйпазначаных накірункаў: паняцця *чалавек* як Боскага стварэння ў рэлігійных вучэннях і далейшай распрацоўкі прававых нормаў, якія распаўсюджваюцца ў гэты перыяд хоць і на большую, але ўсё ж толькі на частку грамадства (феадалаў і часткова мяшчанаў).

Ідэя правоў чалавека атрымлівае новы штуршок развіцця ў перыяд Новага часу (XVII — XVIII стст.), калі распрацоўваюцца натуральна-прававая тэорыя ўзнікнення дзяржавы і канцэпцыя дагавору паміж людзьмі, у выніку якога паўстае дзяржава. Наступствам развіцця гэтых ідэяў стала змяненне самога падыходу да ролі і значэння чалавека. У канцы XVIII — пачатку XX ст. у выніку барацьбы, войнаў і рэвалюцый адбываецца распрацоўка, юрыдычнае афармленне і заканадаўчае замацаванне асноўных палітычных, грамадзянскіх, сацыяльна-культурных правоў у нацыянальным заканадаўстве асобных еўрапейскіх дзяржаў. У адрозненне ад папярэдніх перыядаў гэтыя правы гарантаваліся кожнаму, хто знаходзіцца на тэрыторыі асобнай дзяржавы.

Канцэптуальнае афармленне правы чалавека атрымалі пасля асэнсавання вынікаў Другой сусветнай вайны. Менавіта ў гэты час узнікаюць міжнародныя дакументы, якія замацоўваюць асноўныя правы чалавека, паўстаюць міжнародныя структуры па абароне правоў чалавека (Камітэт ААН па правах чалавека, Камісія па правах чалавека, Еўрапейскі суд па правах чалавека), фармуецца міжнародная судовая практыка ў галіне правоў чалавека і, нарэшце, адбываецца навуковае афармленне асобных канцэпцый правоў чалавека. Асаблівасцю гэтага перыяду з’яўляецца міжнародны характар дакументаў, прызнанне правоў чалавека фактарам, які ўплывае на міжнародную палітыку.

Станаўленне правоў чалавека, з аднаго боку, звязана з тым, што першапачаткова толькі невялікая частка насельніцтва (арыстакратыя) на нацыянальным узроўні паступова пачала замацоўваць найбольш істотныя правы для таго каб абараніцца ад дзяржавы і яе кіраўніка. Гэта такія правы як абарона свайго жыцця, магчымасць самастойна распараджацца сваёй маёмасцю і нават права самастойна, без папярэдняй згоды кіраўніка дзяржавы, выдаваць сваіх дачок замуж і іншыя.

Паступова дадзеныя палажэнні распаўсюджваліся не толькі на вярхушку грамадства, але і пашыраліся – спачатку на служылых феадалаў (служылі ў войску), пазней на гараджан-уласнікаў, пазней на наёмных работнікаў, пакуль не распаўсюдзіліся на ўсе катэгорыі насельніцтва.

Акрамя такога пашырэння правоў чалавека па групах асобаў, паступова пашыралася і кола правоў, якія дзяржава абавязвалася гарантаваць. Акрамя найбольш істотных правоў і гарантый гэта былі палітычныя, а пазней эканамічныя, культурныя, рэлігійныя і іншыя правы і свабоды.

З другога боку, толькі ў пачатку XX ст. на міжнародным узроўні першапачаткова былі замацаваны ўніверсальныя правы ў палітычнай сферы, а затым — у сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферах. Этапы развіцця правоў чалавека на міжнародным узроўні ў некаторых крыніцах называюць трыма пакаленнямі правоў чалавека: 1-е — палітычныя і грамадзянскія, 2-е — сацыяльныя, эканамічныя і культурныя і 3-е — станаўленне новай катэгорыі калектыўных правоў (напрыклад экалагічных), у другой палове XX ст.

# 3. ДАКУМЕНТЫ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- асноўныя міжнародныя дакументы па правах чалавека, іх віды, назвы і агульны змест;
- асноўныя правы чалавека, замацаваныя ў міжнародных актах і нацыянальным заканадаўстве Беларусі;
- прычыны, чаму неабходна, каб нацыянальнае заканадаўства адпавядала міжнародным нормам па правах чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- знаходзіць неабходныя міжнародныя дакументы па правах чалавека;
- суадносіць нормы міжнароднага права з нацыянальным заканадаўствам;
- спасылацца на асобныя міжнародныя дакументы і Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь для аргументацыі ці адстойвання сваёй пазіцыі па праблемах правоў чалавека;

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да дакументаў, у якіх утрымліваюцца нормы па правах чалавека, як да знешніх інстытутаў, якія абараняюць асобу ад самавольства дзяржавы;
- да замацавання асобных правоў чалавека ў міжнародных дакументах як да важнага элемента абароны правоў чалавека;
- да спасылак падчас судовых разбіральніцтваў на міжнародныя дакументы як важнага спосабу ўкаранення і пашырэння правоў чалавека на нацыянальным узроўні.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне, прадстаўленне тэмы і чаканых вынікаў заняткаў — 4 хв.
2. Суаднясенне нормаў нацыянальнага і міжнароднага заканадаўства. Самастойная праца з дакументамі — 23 хв.
3. Прэзентацыя працы груп. Агульнае абмеркаванне і вытлумачэнне розніцы паміж відамі дакументаў — 15 хв.
4. Падагульненне — 3 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў і прадстаўце тэму і чаканыя вынікі (4 хв.).**

Для факусавання ўвагі навучэнцаў можна задаць наступныя пытанні:

- Ці варта замацоўваць у дакументах, напрыклад, правы і абавязкі абітурыентаў, якія паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, а таксама правы і абавязкі прыёмных камісій падчас цэнтралізаванага тэставання? Патлумачце свой адказ.
- Для чаго ў дакументах замацоўваюцца правы і абавязкі тых, хто паступае, і тых, хто праводзіць тэставанне?

**Тлумачальная інфармацыя**

Параўнанне прававых нормаў, якія рэгламентуюць тэставанне, з міжнароднымі дакументамі па правах чалавека мае на мэце наблізіць сферу міжнародных дакументаў да ведаў, інтарэсаў і патрэб моладзі. Падабенства прававых нормаў, якія акрэсліваюць правы і абавязкі абітурыентаў і прыёмных камісій, і міжнародных дакументаў заключаецца ў іх форме выражэння. Падабенства палажэнняў нацыянальнага заканадаўства і міжнародных нормаў палягае ў нарматыўным характары адных і другіх. Іншымі словамі, і нацыянальныя і міжнародныя дакументы ўтрымліваюць нормы паводзін, у гэтых дакументах азначаецца, што можна і чаго нельга рабіць, прадугледжваюцца механізмы для выпраўлення парушэнняў. Самі нормы і механізмы іх рэалізацыі і абароны могуць быць рознымі, але яны маюць аднолькавы прынцып дзейнасці.

Прапанаваныя пытанні дазволяць навучэнцам сканцэнтравацца на правах і абавязках асоб, якія дзейнічаюць у сваіх інтарэсах (абітурыенты), і структур, асноўная мэта якіх – кантроль за захаваннем правіл і палажэнняў па правядзенню тэставання (камісія па правядзенні цэнтралізаванага тэставання).

Замацаванне гэтых правоў і абавязкаў неабходна для таго, каб дакладна ведаць правілы правядзення тэставання і на роўных і справядлівых умовах удзельнічаць у ім. А ў выпадку, калі, на думку абітурыента, будуць парушаны яго правы, ён будзе здольны на падставе дадзеных дакументаў адстаяць свае правы і інтарэсы.

Такое вытлумачэнне з'яўляецца блізкім для навучэнцаў і простым для іх успрымання. Адносіны абітурыента і камісіі можна супаставіць і параўнаць з адносінамі паміж асобай і дзяржаўнымі органамі. Правілы тэставання разам з апісаннем правоў і абавязкаў камісіі і абітурыента, механізмаў вырашэння спрэчных пытанняў паміж імі можна супаставіць і параўнаць з нормамі міжнародных дакументаў па правах чалавека, толькі тут апісваюцца правы і свабоды чалавека і механізмы іх абароны.

Пасля вытлумачэння гэтых палажэнняў прадстаўце тэму і чаканыя вынікі заняткаў.

**2. Праз самастойную працу з дакументамі параўнайце нормы нацыянальнага і міжнароднага заканадаўства (23 хв.).**

Аб’яднайце ўдзельнікаў у пяць роўных па колькасці навучэнцаў груп. Кожная група атрымае два раздаткі. У якасці першага раздатка кожная група атрымае раздатак 3.1 (вытрымкі з Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь). У якасці другога раздатка кожная з пяці групаў атрымае адзін з наступных раздаткаў: Дэкларацыю правоў чалавека, Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Еўрапейскую канвенцыю аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, вытрымкі з дакументаў АБСЕ (раздатак 3.2). Для таго каб праца ў групе была плённая і эфектыўная, пажадана кожнаму з удзельнікаў даць асобны раздатак ці асобную Канстытуцыю і міжнародны дакумент.

Папрасіце кожную групу суаднесці нормы Канстытуцыі з нормамі міжнароднага акта, які яна атрымала, і на ватмане коратка запісаць тыя агульныя палажэнні, якія ўтрымліваюцца ў атрыманых дакументах.

Папрасіце групы адказаць на наступнае пытанне:
- Што супольнае і што асаблівае можна вылучыць у дакументах, якія параўноўваюцца? Чаму?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Для эканоміі часу і для большай зручнасці ў арганізацыі працы пажадана загадзя вызначыць раздзелы ці падраздзелы, якія неабходна параўнаць. У Канстытуцыі Беларусі рэкамендуецца вылучыць раздзел II «Асоба, грамадства, дзяржава» (раздатак 3.1); у Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах — частку III ; у Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах — частку III ; у Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод — раздзел I; поўны тэкст Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, вытрымкі з дакументаў АБСЕ (раздатак 3.2). Толькі Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і дакументы АБСЕ прыкладзеныя да заняткаў у якасці раздатачных матэрыялаў, а іншыя міжнародныя дакументы знаходзяцца ў канцы метадычнага дапаможніка. Настаўнік ці адукатар можа сам выбраць часткі дакументаў, пазначаныя вышэй, у якасці раздаткаў.**

**Трэба памятаць, што Еўрапейская канвенцыя ў Беларусі не дзейнічае, але, паколькі гэта адзін з найбольш важных на сённяшні дзень дакументаў па правах чалавека, у сувязі з тым, што беларусы ўсё часцей выязджаюць за межы сваёй дзяржавы і правы чалавека на тэрыторыі краінаў, якія далучыліся да гэтага дакумента, абараняюцца Еўрапейскай канвенцыяй, а таксама ў сувязі з тым, што не выключаецца далучэнне да гэтага дакумента нашай краіны ў будучыні, варта разглядаць і яго. Важна, каб настаўнік і адукатар памяталі гэта і тлумачылі навучэнцам.**

**Асноўная мэта гэтай часткі заключаецца не столькі ў тым, каб групы знайшлі і занатавалі ўсе палажэнні, якія ўтрымліваюцца ў Канстытуцыі і міжнародных дакументах, колькі ў тым, каб яны пазнаёміліся са зместам палажэнняў Канстытуцыі і міжнародных дакументаў.**

У выпадку, калі часу на правядзенне заняткаў больш, чым 45 хвілін, можна ўскладніць заданне. Пасля падзелу на групы і раздачы матэрыялаў даць заданне кожнаму ў групе самастойна знайсці нормы, якія супадаюць і якія не супадаюць, і толькі пасля таго як удзельнікі груп дадуць рады заданню — даць ім наступнае заданне: абмеркаваць вынікі індывідуальнай працы і падрыхтаваць агульную прэзентацыю групы на ватманах. Гэта дазволіць удзельнікам глыбей прапрацаваць змест.

**3. Прадстаўце працу груп (15 хв.).**

Прэзентацыя вынікаў працы груп. Групы па чарзе прадстаўляюць вынікі сваёй працы на плакатах. Прэзентацыя групы не можа перавышаць 2 хвіліны.

Пасля прэзентацый варта задаць наступныя пытанні групам:
- На абарону якіх правоў накіраваны (той ці іншы) міжнародны дакумент? Прывядзіце прыклады такіх правоў. Што абавязваецца рабіць дзяржава ў інтарэсах чалавека?
- Што агульнае можна вылучыць ва ўсіх разгледжаных міжнародных дакументах?
- Ці трэба спасылацца на міжнародныя дакументы, калі значная частка іх палажэнняў і так утрымліваецца ў нацыянальным заканадаўстве, напрыклад у Канстытуцыі? Патлумачце свой адказ.
- Дзе і як можна знайсці дадзеныя дакументы, калі яны вам спатрэбяцца?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Паколькі найбольш істотным у гэтай працы з'яўляецца знаёмства са зместам міжнародных дакументаў, у час падагульнення прэзентацыі варта рабіць акцэнт на змест міжнароднага дакумента, з якім працавала група.**

**Істотнымі з'яўляюцца і два апошнія пытанні. Што тычыцца неабходнасці спасылацца на міжнародныя дакументы, то на сённяшні дзень вялікае значэнне мае і судовая практыка Еўрапейскага суда па правах чалавека, і рашэнні, якія прымаюцца Камітэтам ААН па правах чалавека. Міжнародная, асабліва заходнееўрапейская практыка, лічыць важным ва ўсіх справах, якія тычацца правоў чалавека, рабіць спасылкі не толькі на нормы нацыянальнага заканадаўства, але і на міжнародныя дакументы, у тым ліку і на Усеагульную дэкларацыю. Такія спасылкі правазнаўцы лічаць патрэбнымі для таго, каб гэтыя нормы станавіліся часткай судовай практыкі ў краінах. Праз спасылкі на гэтыя нормы ў судовых рашэннях узвышаецца роля і значэнне саміх міжнародных дакументаў. Паступова палажэнні міжнародных дакументаў павінны ўкараняцца ў нацыянальную судовую практыку, і, што самае важнае, прынцыпы і каштоўнасці, замацаваныя ў гэтых міжнародных дакументах, паступова ўкараняюцца ў прававой культуры.**

Адказы на апошняе пытанне патрэбныя для таго, каб навучэнцы ўсвядомілі, дзе і як яны могуць знайсці міжнародныя дакументы, калі ім трэба будзе аргументаваць сваю пазіцыю. Самыя простыя і агульныя адказы на гэтыя пытанні: у бібліятэцы, у школе, праз электронныя прававыя базы (якія ёсць у бібліятэках, а таксама, магчыма, у фірмах і ўстановах, дзе працуюць бацькі навучэнцаў), праз старонкі ў Інтэрнэце, напрыклад:
http://un.by/hrw/
http://www.un.org/ru/rights/index.shtml
http://www1.umn.edu/humanrts/russian/instree/Rlist.html і іншыя. Варта назваць некалькі месцаў, дзе можна знайсці гэтыя міжнародныя дакументы, і сказаць як (падказаць, якую назву закласці ў пошукавую старонку Інтэрнэту і г. д.).

Абапіраючыся на вынікі прэзентацый груп, арганізуйце абагульненне вынікаў, асаблівую ўвагу надаючы зместу міжнародных дакументаў, вытлумачваючы асаблівасці гэтых міжнародных дакументаў і розніцу паміж іх відамі.

**4. Падагульніце заняткі (3 хв.).**

Для падсумавання можна задаць наступныя пытанні:
- З якімі відамі міжнародных дакументаў мы пазнаёміліся на занятках? Назавіце прыклады.
- Чым розняцца паміж сабой гэтыя дакументы?
- Для чаго існуюць міжнародныя дакументы па правах чалавека?
- Як звязаныя паміж сабой міжнародныя і нацыянальныя дакументы па правах чалавека?

**Дадатковая інфармацыя**

## ВІДЫ І АСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ І МІЖНАРОДНЫХ ДАКУМЕНТАЎ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Нацыянальнае заканадаўства — гэта сістэма прававых норм, якая ўтрымліваецца ў Канстытуцыі, законах і падзаконных актах (указах, пастановах, рашэннях і г. д. розных дзяржаўных органаў), якія дзейнічаюць на тэрыторыі нейкай краіны. Асаблівасцю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца тое, што яна не мае прамога дзеяння. Гэта азначае, што ў судзе спасылка патрабуецца на нейкую норму закона, які дзейнічае ў нашай краіне, а не на норму Канстытуцыі. У большасці еўрапейскіх краін склалася іншая практыка: грамадзянін можа бараніць свае правы таксама на падставе нормаў Канстытуцыі. Паколькі Канстытуцыя з'яўляецца найвышэйшым законам у нашай краіне, грамадзяне маюць права і павінны дабівацца выканання на тэрыторыі Беларусі ўсіх палажэнняў Канстытуцыі. У тых выпадках, калі палажэнні нейкага закона ці падзаконнага акта звужаюць, скажаюць ці іначай змяняюць палажэнні Канстытуцыі, трэба выкарыстоўваць усе законныя спосабы для выпраўлення гэтых палажэнняў, а значыць, і абароны правоў.

Міжнародныя дакументы па правах чалавека — гэта дакументы, прынятыя ў рамках нейкай міжнароднай арганізацыі, членамі якой з'яўляюцца асобныя краіны. Міжнародныя дакументы, у якіх утрымліваюцца палажэнні па правах чалавека, маюць розныя назвы. У залежнасці ад назвы дакумента можна вызначыць асаблівую абавязковую сілу, якая прымушае дзяржавы, што падпісалі канкрэтны міжнародны дакумент, выконваць яго. Сярод відаў міжнародных дакументаў па правах чалавека можна вылучыць наступныя: дэкларацыя, канвенцыя, пакт, хартыя.

Дэкларацыя (ад лац. заява, абвяшчэнне) вылучаецца дэкларатыўным характарам нормаў, якія ў ёй утрымліваюцца. Гэта значыць, што дэкларацыя не носіць абавязковага характару.

Нормы, якія ўтрымліваюцца ў ёй, носяць рэкамендацыйны характар. Дадзеныя дакументы маюць вялікую маральна-палітычную сілу і ў сувязі з выкананнем ці невыкананнем палажэнняў дэкларацый — вызначаюць характар і пазіцыі палітычнай улады асобнай дзяржавы. Дэкларацыі ўступаюць у сілу адразу пасля падпісання афіцыйнымі прадстаўнікамі дзяржавы.

На сёння адсутнічае дакладнае тэарэтычнае абгрунтаванне размежавання міжнародных дакументаў. Аднак згодна з існуючай міжнароднай практыкай канвенцыі (ад лац. дамова, пагадненне) — гэта пагадненні па нейкім спецыяльным пытанні ці па аднароднай праблеме, а пакты (лац. дамова) — гэта дамовы, якія ахопліваюць розныя групы праблем. У адрозненне ад дэкларацый, канвенцыі і пакты ўступаюць у сілу не адразу пасля іх прыняцця, а толькі пасля іх ратыфікацыі, абумоўленай колькасцю дзяржаў. Ратыфікацыя ўяўляе сабой ухваленне вызначанага міжнароднага дакумента вышэйшым заканадаўчым органам краіны, пасля чаго ён становіцца часткай унутранага права і, як правіла, мае прыярытэт у адносінах да законаў дадзенай дзяржавы. Дзяржавы-ўдзельніцы, якія падпісалі і ратыфікавалі канвенцыю ці пакт, ускладаюць на сябе абавязальніцтвы, якія ўтрымліваюцца ў гэтых дакументах, і абавязаны іх дакладна выконваць. За невыкананне палажэнняў канвенцый і пактаў могуць прадугледжвацца міжнародныя пакаранні ў адносінах да дзяржавы-парушальніцы (санкцыі). Як правіла, для назірання за выкананнем дадзеных пагадненняў ствараюцца адпаведныя камітэты. Напрыклад, Камітэт ААН па правах чалавека быў створаны як адзін з механізмаў рэалізацыі Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Тэрмін *хартыя* (ад старажытнагрэчаскага «папера, грамата») вядомы са старажытных часоў. У сённяшняй практыцы, як і раней, гэтым тэрмінам абазначаюць дакумент публічна-прававога і палітычнага характару, напрыклад Вялікая Хартыя вольнасцяў і г. д.).

У рамках АБСЕ таксама ёсць адпаведныя дакументы па правах чалавека, якія прымаюцца Міністэрскай Радай (рашэнні Міністэрскай Рады) і дакументы па выніках сустрэч на вышэйшым узроўні (яны і называюцца паводле той сталіцы, дзе адбывалася сустрэча — напрыклад, «Капенгагенскі дакумент», «Венскі дакумент» і г. д. – гл. прыклады ў дадатку).

## ВЫТРЫМКІ З РАЗДЗЕЛА II «АСОБА, ГРАМАДСТВА, ДЗЯРЖАВА» КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Арт. 21.** ... Кожны мае права на годны ўзровень жыцця, уключаючы дастатковае харчаванне, адзенне, жыллё і пастаяннае паляпшэнне неабходных для гэтага ўмоў. ...

**Арт. 22.** Усе роўныя перад законам і маюць права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў.

**Арт. 23.** Абмежаванне правоў і свабод асобы дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб...
Арт. 24. Кожны мае права на жыццё.
Дзяржава абараняе жыццё чалавека ад любых супрацьпраўных замахаў. ...

**Арт. 25.** Дзяржава забяспечвае свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы. ...
Асоба, узятая пад варту, мае права на судовую праверку законнасці яе затрымання або арышту.
Ніхто не павінен падвяргацца катаванням, жорсткаму, бесчалавечнаму або зневажальнаму для яго годнасці абыходжанню ці пакаранню, а таксама без яго згоды падвяргацца медыцынскім або іншым доследам.

**Арт. 26.** Ніхто не можа быць прызнаны вінаватым у злачынстве, калі яго віна не будзе ў прадугледжаным законам парадку доказана і ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу. Той, каго абвінавачваюць, не павінен даказваць сваю невінаватасць. ...

**Арт. 28.** Кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на тайну яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў, на яго гонар і годнасць.

**Арт. 29.** Недатыкальнасць жылля і іншых законных уладанняў грамадзян гарантуецца. Ніхто не мае права без законнай падставы ўвайсці ў жыллё і іншае законнае ўладанне грамадзяніна супраць яго волі.

**Арт. 30.** Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права свабодна перамяшчацца і выбіраць месца жыхарства ў межах Рэспублікі Беларусь, пакідаць яе і бесперашкодна вяртацца назад.

**Арт. 31.** Кожны мае права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, асабіста або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай...

**Арт. 33.** Кожнаму гарантуецца свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне...

**Арт. 34.** Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя. ...

**Арт. 35.** Свабода сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання, якія не парушаюць правапарадак і правы іншых грамадзян Рэспублікі Беларусь, гарантуецца дзяржавай. Парадак правядзення ўказаных мерапрыемстваў вызначаецца законам. ...

**Арт. 36.** Кожны мае права на свабоду аб'яднанняў. ...

**Арт. 37.** Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права ўдзельнічаць у вырашэнні дзяржаўных спраў як непасрэдна, так і праз свабодна выбраных прадстаўнікоў. ...

**Арт. 38.** Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права свабодна выбіраць і быць выбранымі ў дзяржаўныя органы на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога або ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні.

**Арт. 39.** Грамадзяне Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці са сваімі здольнасцямі, прафесійнай падрыхтоўкай маюць права роўнага доступу да любых пасад у дзяржаўных органах.

**Арт. 40.** Кожны мае права накіроўваць асабістыя або калектыўныя звароты ў дзяржаўныя органы. ...

**Арт. 41.** Гарантуецца права на працу ..., эта значыць права на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэбнасцей, а таксама на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы. ...
Грамадзяне маюць права на абарону сваіх эканамічных і сацыяльных інтарэсаў...
Прымусовая праца забараняецца, акрамя работы або службы, якая вызначаецца прыгаворам суда або ў адпаведнасці з законам аб надзвычайным і ваенным становішчы.

**Арт. 42.** Асобам, якія працуюць па найму, гарантуецца справядлівая доля ўзнагароджання ..., але не ніжэй за ўзровень, які забяспечвае ім і іх сем'ям свабоднае і годнае існаванне.
Жанчыны і мужчыны, дарослыя і непаўналетнія маюць права на роўнае ўзнагароджанне за працу роўнай вартасці.

**Арт. 43.** Працоўныя маюць права на адпачынак...

**Арт. 44.** Дзяржава гарантуе кожнаму права ўласнасці і садзейнічае яе набыццю. ...
Недатыкальнасць уласнасці, права яе атрымання ў спадчыну ахоўваюцца законам ...

**Арт. 45.** Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на ахову здароўя, уключаючы бясплатнае лячэнне ў дзяржаўных установах аховы здароўя.
Дзяржава стварае ўмовы даступнага для ўсіх грамадзян медыцынскага абслугоўвання. ...

**Арт. 46.** Кожны мае права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе і на пакрыццё шкоды, прычыненай парушэннем гэтага права. ...

**Арт. 48.** Грамадзяне маюць права на жыллё. ...
Ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены жылля.

**Арт. 49.** Кожны мае права на адукацыю.
Гарантуюцца даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі...

**Арт. 50.** Кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць...
Знявага нацыянальнай годнасці караецца згодна з законам.
Кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін. Дзяржава гарантуе ў адпаведнасці з законам свабоду выбару мовы выхавання і навучання.

**Арт. 51.** Кожны мае права на ўдзел у культурным жыцці...

**Арт. 53.** Кожны абавязаны паважаць годнасць, правы, свабоды, законныя інтарэсы іншых асоб.

**Ар. 59.** ... Дзяржаўныя органы, службовыя і іншыя асобы, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неабходныя меры для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод асобы. ...

**Арт. 60.** Кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом...

**Арт. 61.** Кожны мае права ў адпаведнасці з міжнародна-прававымі актамі, якія ратыфікаваны Рэспублікай Беларусь, звяртацца ў міжнародныя арганізацыі з мэтай абароны сваіх правоў і свабод, калі вычарпаны ўсе наяўныя ўнутрыдзяржаўныя сродкі прававой абароны. ...

**АБАВЯЗАЛЬНІЦТВЫ ПА АБСЕ**
**Вытрымкі з Выніковага дакумента венскай сустрэчы НБСЕ (АБСЕ) 1989 г. («Венскі дакумент»)**

Дзяржавы-ўдзельніцы ...
**(...)**
**(11)** (...) пацвярджаюць, што будуць шанаваць правы чалавека і асноўныя свабоды, уключна са свабодай думкі, сумлення, рэлігіі ці перакананняў, для ўсіх, без адрознення расы, полу, мовы і рэлігіі. Яны таксама пацвярджаюць усеагульнае значэнне правоў чалавека і асноўных свабод, шанаванне якіх — істотны фактар міру, справядлівасці і бяспекі, неабходных для забеспячэння развіцця сяброўскіх дачыненняў і супрацоўніцтва паміж імі, як і паміж усімі дзяржавамі.

**(12)** Яны выказваюць сваю рашучасць гарантаваць эфектыўнае ажыццяўленне правоў чалавека і асноўных свабод, якія вынікаюць з годнасці, уласцівай чалавечай асобе, і з’яўляюцца істотным фактарам для яе вольнага і поўнага развіцця. Яны прызнаюць, што грамадзянскія, палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя, культурныя ды іншыя правы і свабоды маюць першачарговае значэнне і мусяць рэалізоўвацца ўсімі належнымі спосабамі.

**(13)** У сувязі з гэтым яны будуць
**(13.1)** – удасканальваць свае законы, адміністрацыйныя правілы і палітыку ў сферы грамадзянскіх, палітычных, эканамічных, сацыяльных, культурных ды іншых правоў чалавека і асноўных свабод і ўжываць іх на практыцы, каб гарантаваць эфектыўнае ажыццяўленне гэтых правоў і свабод;
**(...)**
**(13.4)** – эфектыўна забяспечваць права асоб ведаць свае правы і абавязкі ў гэтай сферы і дзейнічаць у адпаведнасці з імі і з гэтай мэтай публікаваць і рабіць даступнымі ўсе законы, адміністрацыйныя правілы і працэдуры, якія адносяцца да правоў чалавека і асноўных свабод;

**(13.5)** – паважаць права сваіх грамадзян, паасобку ці супольна з іншымі, рабіць актыўны ўнёсак у развіццё і абарону правоў чалавека і асноўных свабод;

**(13.6)** – заахвочваць абмеркаванне ў школах і іншых адукацыйных установах пытанняў развіцця і абароны правоў чалавека і асноўных свабод;

**(13.7)** – забяспечваць у межах сваёй тэрыторыі кожнаму, хто належыць да іх юрысдыкцыі, правы чалавека і асноўныя свабоды без якогасьці адрознення, у тым ліку паводле расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага стану, нараджэння ці іншых абставінаў;

**(13.8)** – забяспечваць, каб ні асоба, якая ажыццяўляе, выказвае намер ці імкнецца ажыццявіць гэтыя правы і свабоды, ні хтосьці з членаў яе сям’і не сталіся ў выніку гэтага прадметам дыскрымінацыі ў якойсьці форме;

**(13.9)** – забяспечваць, каб эфектыўныя сродкі прававой абароны, а таксама поўная інфармацыя пра іх былі даступныя тым, хто заяўляе, што іх правы чалавека і асноўныя свабоды былі парушаныя; яны будуць, у прыватнасці, эфектыўна ўжываць наступныя сродкі прававой абароны (...).

# 4. МІЖНАРОДНЫЯ МЕХАНІЗМЫ АБАРОНЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

(заняткі разлічаны на 90 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- агульную інфармацыю пра асобныя міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека, распрацаваныя ў рамках ААН, АБСЕ, Рады Еўропы;
- сувязі паміж дакументамі па правах чалавека і механізмамі іх абароны.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- звязваць існуючыя міжнародныя дакументы ў галіне правоў чалавека і канкрэтныя механізмы іх рэалізацыі;
- тлумачыць агульны працэс дзейнасці механізмаў абароны правоў чалавека ААН, АБСЕ, Рады Еўропы.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да міжнародных механізмаў абароны правоў чалавека як да рэальных спосабаў абароны свабод, правоў і інтарэсаў асобы;
- да міжнародных механізмаў абароны правоў чалавека як да важнага элемента абароны правоў чалавека;
- да звароту ў міжнародныя органы абароны правоў чалавека як да спосабу ўкаранення і пашырэння правоў чалавека на нацыянальным і міжнародным узроўні.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне — 4 хв.
2. Прадстаўленне тэмы і чаканых вынікаў заняткаў — 1 хв.
3. Знаёмства з асобнымі механізмамі абароны правоў чалавека — 20 хв.
4. Прэзентацыя вынікаў працы груп — 15 хв.
5. Праца ў групах над асобнымі механізмамі абароны правоў чалавека — 30 хв.
6. Прэзентацыя вынікаў працы груп — 15 хв.
7. Падагульненне заняткаў — 5 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (4 хв.).**
Для факусавання ўвагі можна правесці аналогію паміж заканадаўствам краіны (грамадзянскім, адміністрацыйным, крымінальным і іншым правам) і існуючымі механізмамі абароны гэтых правоў (напрыклад, праз судовую сістэму ў дзяржаве з аднаго боку і міжнароднымі дакументамі па правах чалавека і міжнароднымі механізмамі іх абароны з другога). Дакументам, прынятым у межах ААН, адпавядаюць асаблівыя структуры, органы і ўстановы, якія сочаць за выкананнем гэтых дакументаў і ў межах сваёй кампетэнцыі ўказваюць на парушэнні з боку дзяржавы. Дакументам, прынятым у межах АБСЕ, адпавядаюць свае асаблівыя структуры і асаблівыя кампетэнцыі ў прыняцці рашэнняў, дакументам Рады Еўропы — свае. Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці ў дадатковай інфармацыі да гэтага занятку.

**2. Прадстаўце тэму і чаканыя вынікі заняткаў (1 хв.).**

**3. Азнаёмце ўдзельнікаў з асобнымі механізмамі абароны правоў чалавека (20 хв.).**
Аб'яднайце ўдзельнікаў у тры групы. Кожная група атрымае адзін з трох раздаткаў 4.1, 4.2, 4.3. Папрасіце групы азнаёміцца з раздаткам і абмеркаваць яго ў групе.

**4. Прэзентацыя вынікаў працы груп (15 хв.)**
Папрасіце групы зрабіць кароткія прэзентацыі міжнародных механізмаў абароны правоў чалавека, з якімі яны знаёміліся. Кожная прэзентацыя не можа быць даўжэйшая за 4 хвіліны.

**Тлумачальная інфармацыя**

Гэтыя заняткі можна пры неабходнасці падзяліць на два заняткі па 45 хвілін.

У гэтым выпадку трэба скараціць час прэзентацыі вынікаў працы груп з 15 хвілін і вылучыць некалькі хвілін для правядзення падсумавання. Падсумаванне можна правесці па наступных пытаннях:
- Для чаго існуюць міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека?
- Што могуць гэтыя міжнародныя механізмы даць чалавеку, правы якога парушыла дзяржава?
- Чым розняцца паміж сабой разгледжаныя намі міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека?

Настаўнік можа сказаць, што на наступным занятку ўдзельнікі ў сваіх групах паспрабуюць праілюстраваць шлях звароту ў міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека. У якасці хатняга задання настаўнік можа папрасіць ўдзельнікаў падумаць, як праз комікс можна праілюстраваць увесь матэрыял, з якім яны знаёміліся падчас занятку і які яны прэзентавалі.

**5. Праца ў групах над асобнымі механізмамі абароны правоў чалавека (30 хв.)**
Настаўнік можа папрасіць удзельнікаў узгадаць казку пра Шрэка: злы кароль загадвае выгнаць усіх казачных жыхароў са свайго каралеўства і казачныя істоты прыходзяць да Шрэка прасіць дапамогі абараніць свае правы.

Уявіце сабе, што Шрэк быў экспертам па міжнародных інстытутах абароны правоў чалавека і ён прапанаваў істотам звярнуцца да аднаго з разгледжаных намі механізмаў абароны правоў чалавека. Паколькі кароль тут — гэта прадстаўнік дзяржавы, у дадзеным выпадку мы маем прыклад парушэння правоў чалавека дзяржавай.

Настаўніку варта папрасіць удзельнікаў на падставе раздатка на ватмане намаляваць комікс, галоўным героем якога павінен быць Шрэк і нейкія казачныя героі ці прыдуманы герой, якому Шрэк як эксперт тлумачыць парадак звароту і сутнасць дзейнасці механізма абароны правоў чалавека, апісанага ў атрыманым раздатачным матэрыяле.

Звярніце ўвагу ўдзельнікаў групы на тое, што яны павінны пастарацца адлюстраваць у коміксе найбольш істотныя, з іх пункту гледжання, элементы міжнароднага механізма абароны правоў чалавека, з якім яны азнаёміліся.

**Тлумачальная інфармацыя**

Пад коміксам у гэтым заданні мы разумеем некалькі звязаных паміж сабой агульным сэнсам і агульным героем ці героямі карцінак з каментарамі дзеючых асоб.
Мэта задання — стварэнне ўмоў для творчага пераасэнсавання ўдзельнікамі апісанага ў раздатку канкрэтнага міжнароднага механізма абароны правоў чалавека. Творчае пераасэнсаванне азначае, што яны не проста азнаёмяцца з раздаткавым матэрыялам, а паспрабуюць прааналізаваць гэты матэрыял і выкласці яго ў форме звязаных паміж сабой малюнкаў. Да таго ж комікс прадугледжвае мінімум простай інфармацыі ў кожным з малюнкаў. Гэта азначае, што ўдзельнікі вымушаны будуць коратка, простай мовай, з дапамогай мастацкіх вобразаў патлумачыць, з чаго складаецца асобны механізм абароны правоў чалавека, як туды звяртацца, хто можа звяртацца, да якіх вынікаў прывядзе зварот і г. д. Удзельнікі больш поўна ўспрымуць інфармацыю аб міжнародных механізмах абароны правоў чалавека, калі творча перапрацуюць і ў даступнай форме паспрабуюць яе прадэманстраваць.

Будзьце ўважлівыя пры тлумачэнні задання, звяртайце ўвагу на атмасферу ў групе. Выбар у якасці героя комікса аднаго з удзельнікаў групы можа прывесці да канфлікту. Настаўнік ці адукатар можа сам прапанаваць групам у якасці аднаго з герояў, акрамя Шрэка, іншага (казачнага) героя, вядомага ўдзельнікам.

**6. Прадстаўце вынікі працы груп (15 хв.).**
Папрасіце групы па чарзе прадставіць падрыхтаваныя коміксы. Прэзентацыя кожнай групы не можа быць даўжэйшай за 3 хвіліны. Пасля кожнай з прэзентацый дайце час на пытанні і каментары адносна пачутай інфармацыі.

Звяртайце ўвагу на тое, наколькі поўна і зразумела будзе раскрыты канкрэтны міжнародны механізм абароны правоў чалавека ў малюнку, а таксама ў каментарах стваральнікаў комікса. Істотнейшым з'яўляецца прадстаўленне атрыманых групай ведаў. Нават у выпадку, калі будуць нейкія недапрацоўкі ці недакладнасці, іх заўсёды можна выправіць падчас падагульнення праз задаванне пытанняў групе альбо каментаванне комікса і адказаў удзельнікаў.

**7. Падагульніце заняткі (5 хв.).**
Падагульненне выкананага задання будзе адначасова з'яўляцца падагульненнем усіх заняткаў.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Першыя два пытанні задаюцца на падсумаванні занятку толькі ў тым выпадку, калі занятак не быў падзелены на два асобныя заняткі па 45 хвілін кожны і калі гэтыя пытанні ўжо не задаваліся ў канцы першых 45 хвілін.**

На гэтым этапе можна задаць наступныя пытанні:
- Для чаго існуюць міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека? Што могуць гэтыя міжнародныя механізмы даць чалавеку, правы якога парушыла дзяржава?
- Чым розняцца паміж сабой разгледжаныя намі міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека?
- Ці можам мы з вамі звяртацца ў міжнародныя структуры абароны правоў чалавека? Пры якіх умовах?
- Ці варта карыстацца міжнароднымі механізмамі абароны правоў чалавека? Патлумачце свой адказ.

**Тлумачальная інфармацыя**

**З мэтаю правільна пракаментаваць адказы ўдзельнікаў падчас падсумавання, гл. раздаткі да дадзенага занятка і Дадатковую інфармацыю. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на два апошнія пытанні.**

**Зварот у міжнародную сістэму абароны правоў чалавека (Камітэт па правах чалавека і Еўрапейскі суд па правах чалавека) патрабуе выканання асаблівых умоваў, і тут можна вылучыць і некалькі агульных правілаў.**

1) **Дзяржава павінна ратыфікаваць Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах у выпадку Камітэта і Еўрапейскую канвенцыю аб правах чалавека — у выпадку Еўрапейскага Суда і такім чынам прызнаць магчымасць адпаведнай міжнароднай структуры ўказваць на парушэнні замацаваных у дакументах палажэнняў.**
2) **Асоба павінна паспрабаваць вырашыць узніклую праблему парушэння правоў чалавека ў сваёй дзяржаве і атрымаць дакументы, што пацвярджаюць такія спробы (адказы ад дзяржавы на скаргі аб парушэнні), абавязкова прайшоўшы ўсе даступныя ў гэтай краіне судовыя і пазасудовыя інстанцыі ў спробе атрымаць эфектыўную абарону парушаных правоў.**
3) **Калі асоба так і не атрымала эфектыўнай абароны парушаных правоў, яна можа звяртацца ў міжнародныя структуры — трэба правільна падрыхтаваць дакументы для падачы ў міжнародную структуру, таму, як правіла, людзі, чые правы парушаны, звяртаюцца па дапамогу да юрыстаў ці да грамадскіх аб'яднанняў праваабарончай скіраванасці.**

**Дадатковая інфармацыя**

## АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ АБ АСОБНЫХ МІЖНАРОДНЫХ МЕХАНІЗМАХ АБАРОНЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Прыняцце нейкага дакумента па правах чалавека патрабуе ўсталявання асаблівай сістэмы нагляду за яго выкананнем. Гэта тычыцца як нацыянальнага заканадаўства, так і міжнародных арганізацый і дакументаў, якія прымаюцца на міжнародным узроўні.

У дзяржаве для выканання законаў і падзаконных актаў створана разгалінаваная сістэма органаў, структур і ўстаноў, якая складаецца з органаў пракуратуры, дзяржаўнага кантролю, міліцыі, іншых дзяржаўных органаў. Для вырашэння магчымых канфліктаў, якія могуць узнікаць падчас рэалізацыі нормаў нацыянальнага заканадаўства, ствараецца, напрыклад, адміністрацыйны шлях абароны правоў на падставе Закона «Аб зваротах грамадзян» ці праз судовую сістэму. Задача гэтых органаў заключаецца ў тым, што яны сочаць за адпаведным выкананнем заканадаўства і маюць адпаведныя механізмы рэагавання ў выпадку, калі выкрываюцца парушэнні. Напрыклад, могуць запатрабаваць дакументы, збіраць інфармацыю для праверкі дзейнасці той ці іншай службовай асобы і пры выкрыцці недакладнасцяў ці парушэнняў — абавязваць выправіць парушэнні альбо нават пакараць вінаватага ў такім парушэнні. Такую сістэму органаў, надзеленых канкрэтнай кампетэнцыяй у сферы нагляду за выкананнем нацыянальнага заканадаўства, можна назваць нацыянальным механізмам абароны правоў чалавека.

На міжнародным узроўні таксама існуюць механізмы кантролю за выкананнем прынятых дзяржавамі міжнародных дакументаў. Такія механізмы могуць складацца з асаблівых структур: камітэтаў, суда ці сустрэч і канферэнцый прадстаўнікоў дзяржаў. Кампетэнцыі гэтых органаў і структур па праверцы дзейнасці і санкцыях за парушэнне ці невыкананне нормаў канкрэтных міжнародных пагадненняў могуць быць рознымі. Кожны значны дакумент па правах чалавека, як правіла, мае свой асаблівы механізм кантролю і забеспячэння рэалізацыі. Паўнамоцтвы і дзейнасць структур і органаў кожнага асобнага механізма залежаць ад таго, якімі кампетэнцыямі надзялілі іх дзяржавы, што падпісалі гэтае канкрэтнае міжнароднае пагадненне (пакт, канвенцыю, дэкларацыю і г. д.).

Напрыклад, з мэтай рэалізацыі Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах і на падставе яго быў створаны Камітэт па правах чалавека ААН. Для рэалізацыі Еўрапейскай канвенцыі правоў чалавека быў створаны Еўрапейскі суд па правах чалавека. Для спрыяння рэалізацыі абавязальніцтваў, якія ўзялі на сябе дзяржавы ў галіне правоў чалавека і дэмакратыі, якія ўтрымліваюцца ў дакументах, прынятых Міністэрскай Радай АБСЕ, з часу Хельсінкскага заключнага акта (1975 г.) былі створаны Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (далей — БДІПЧ АБСЕ) і іншыя інстытуты АБСЕ.

Пададзеныя вышэй міжнародныя механізмы розняцца паміж сабой не толькі тымі структурамі (органамі), якія створаны ў мэтах рэалізацыі канкрэтных пагадненняў, але і сваімі кампетэнцыямі, спосабамі і мэтамі дзейнасці, наступствамі ў выніку прызнання парушэння міжнародных пагадненняў.

Камітэт па правах чалавека з'яўляецца толькі адным з механізмаў ААН у галіне абароны правоў чалавека. У межах ААН, акрамя ўзгаданага камітэта, трэба назваць нядаўна створаную (замест Камісіі ААН па правах чалавека) Раду па правах чалавека — асноўны форум ААН па правах чалавека, а таксама Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, Камітэт супраць катаванняў, Камітэт па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі, Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын і іншыя структуры ААН, створаныя для забеспячэння абароны правоў чалавека. Камітэт па правах чалавека адносіцца да так званых дагаворных органаў. Гэта значыць, органаў ААН, якія ўтвораны ў выніку дамоўленасці паміж шэрагам дзяржаў-членаў ААН у адпаведнасці з Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах.
Больш падрабязна даведацца пра Камітэт па правах чалавека ААН, а таксама пра Раду па правах чалавека ААН, Вярхоўнага камісара па правах чалавека ААН і функцыі іншых структур Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у галіне правоў чалавека можна на афіцыйных вэб-старонцы ААН http://www.un.org/ru/rights і http://un.by/hrw/ (інфармацыя пададзена па-руску).

Еўрапейскі суд па правах чалавека першапачаткова з'яўляўся адным з трох органаў, якія адказвалі за выкананне абавязальніцтваў згодна з Еўрапейскай канвенцыяй разам з Еўрапейскай камісіяй па правах чалавека і Камітэтам міністраў Рады Еўропы. З 1998 г. згодна з пратаколам № 11 толькі Суд адыгрывае цяпер такую ролю (камісія была скасаваная). У адрозненне ад рашэнняў Камітэта па правах чалавека ААН, рашэнні Еўрапейскага суда па правах чалавека абавязковыя для выканання краінамі-ўдзельніцамі Рады Еўропы. Падрабязнейшая інфармацыя аб Еўрапейскім судзе па правах чалавека ўтрымліваецца на старонцы: http://www.echr.coe.int/NR/rdonlyres/2F51D840-5A54-41BD-A47F-4F2A02131D31/0/RUS_QR.pdf (інфармацыя пададзена па-руску). Фармуляр скаргі ў Еўрапейскі суд і іншую важную інфармацыю па падачы скаргі (на рускай мове) можна знайсці на старонцы http://www.echr.coe.int/NR/rdonlyres/B2911BCC-D34F-4D5A-BD83-2307D78754D7/0/RUS_Po_Pack.pdf

У рамках АБСЕ асноўным інстытутам, які праводзіць маніторынг прынятых краінамі абавязальніцтваў (напрыклад, у галіне выбараў) з'яўляецца БДІПЧ АБСЕ. Акрамя БДІПЧ і іншых інстытутаў (Вярхоўны Камісар па нацыянальных меншасцях і Прадстаўнік АБСЕ па свабодзе СМІ) у межах АБСЕ адбываюцца рэгулярныя сустрэчы на найвышэйшым палітычным узроўні, нарады па выкананні абавязальніцтваў у галіне правоў чалавека (чалавечым вымярэнні). Таксама існуюць два асобныя механізмы — так званыя Венскі і Маскоўскі механізмы (гл. ніжэй). Дадатковую інфармацыю пра БДІПЧ можна знайсці на http://www.osce.org/publications/odihr/2009/02/13555_54_ru.pdf.

АБСЕ выпрацавала адмысловыя Венскі і Маскоўскі механізмы абароны правоў чалавека, якія разам утвараюць працэс нагляду за выкананнем дзяржавамі сваіх абавязальніцтваў у галіне абароны правоў чалавека (чалавечага вымярэння).

Венскі механізм дазваляе дзяржавам-удзельніцам уздымаць пытанні, звязаныя з захаваннем правоў чалавека асобнымі дзяржавамі ў межах абавязальніцтваў АБСЕ. Маскоўскі механізм дадаткова да Венскага дазваляе ствараць спецыяльныя місіі незалежных экспертаў і расследаваць паведамленні аб парушэннях абавязальніцтваў у галіне правоў чалавека (чалавечага вымярэння). Дадатковую інфармацыю па механізмах АБСЕ можна знайсці на старонках http://www.osce.org/documents/odihr/1989/12/1808_ru.pdf і http://www.osce.org/documents/odihr/1991/12/1809_ru.pdf

Механізмы абароны правоў чалавека АБСЕ маюць не толькі адрозны шлях і спосаб дзейнасці, але ставяць перад сабой іншыя ў параўнанні з вышэй разгледжанымі Камітэтам ААН па правах чалавека і Судом па правах чалавека мэты. Механізмы забеспячэння правоў чалавека (чалавечага вымярэння) АБСЕ істотна адрозніваюцца сферай дзейнасці і палітычнай скіраванасцю. Абавязальніцтвы ў межах АБСЕ ўяўляюць сабой нешта большае, чым простая дэкларацыя волі ці добрых намераў. Гэта палітычныя абяцанні выконваць пэўныя стандарты ў справе забеспячэння абароны правоў чалавека і дэмакратыі. Механізмы АБСЕ адрозніваюцца тым, што ўкараняюць прынцыпы правоў чалавека, ужыўляюць іх у палітычныя сістэмы дзяржаў-удзельніц АБСЕ. Гэтыя механізмы ў большай ступені накіраваны не на разгляд канкрэтных парушэнняў правоў чалавека, а на недапушчэнне такіх парушэнняў праз давядзенне да палітычных органаў дзяржаў-членаў АБСЕ фактаў парушэнняў правоў чалавека, праз абмеркаванне становішча ў галіне правоў чалавека (чалавечым вымярэнні) у асобных краінах-членах АБСЕ на найвышэйшым палітычным узроўні, праз прыняцце спецыяльных рашэнняў, дакументаў і абавязальніцтваў дзяржаў у галіне правоў чалавека, праз падбор экспертаў, здольных дапамагчы ў вырашэнні канкрэтных праблем у галіне правоў чалавека ў асобных дзяржавах, праз спрыянне ўкараненню прынцыпаў і падыходаў правоў чалавека ў нацыянальныя сістэмы дзяржаў-удзельніц АБСЕ. Такі падыход, заснаваны на бесперапынным працэсе сустрэч, абмеркаванняў і ўзгаднення пазіцый у сферы правоў чалавека на найвышэйшым узроўні прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц АБСЕ, з аднаго боку, сфармаваў эфектыўны спосаб садзейнічання рэфармаванню нацыянальнага заканадаўства ў адпаведнасці з крытэрамі правоў чалавека, прынятымі ў АБСЕ, а з другога — стварыў магчымасць для дзяржаў-удзельніц для аператыўнага і свабоднага абмеркавання пытанняў, звязаных з фактычным выкананнем абавязальніцтваў у галіне правоў чалавека. АБСЕ немагчыма ўявіць без удзелу грамадзянскай супольнасці, прадстаўнікі якой бяруць актыўны ўдзел у працы АБСЕ і маюць мажлівасць уплываць на рашэнні і палітыку АБСЕ.

Апісаныя вышэй тры міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека маюць істотныя адрозненні паміж сабой. Найбольш падобнымі па спосабах дзейнасці можна назваць Камітэт па правах чалавека ААН і Еўрапейскі суд па правах чалавека Рады Еўропы. Яны падобныя тым, што з'яўляюцца механізмамі, якія працуюць з разглядам канкрэтных выпадкаў парушэння правоў чалавека. Сам разгляд канкрэтных выпадкаў паказвае дзяржаве сферы жыцця чалавека і адносіны, у якія яна не можа ўмешвацца, а рашэнні па канкрэтных справах прымушаюць краіны змяняць заканадаўства і практыку, якія спрычыніліся да парушэнняў правоў чалавека. Разгляд канкрэтных выпадкаў праз фармаванне прэцэдэнтаў развівае катэгорыю правоў чалавека. Разам з тым Камітэт па правах чалавека ААН і Еўрапейкі суд па правах чалавека істотна адрозніваюцца паміж сабой. Некаторыя найбольш яркія адрозненні адзначаны ў раздатках 4.1 і 4.2.

Дзеля лепшага разумення дзеяння Камітэту па правах чалавека і Еўрапейскага суда па правах чалавека рэкамендуем прачытаць рашэнні гэтых органаў па канкрэтных справах (у дадатку да дапаможніка «Міжнародныя дакументы і іншыя матэрыялы па правах чалавека»). Напрыклад, паглядзіце рашэнні, дададзеныя пры канцы дапаможніка — Рашэнне Еўрапейскага суда па правах чалавека (справа Біціева і Х. супраць Расіі) і рашэнні Камітэта ААН па правах чалавека па справах *Майкл і Браян Хіл супраць Іспаніі* і *Вялічкін супраць Беларусі*.

**КАМІТЭТ ААН ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА**

Асноўнай структурай ААН, куды можна звярнуцца з індывідуальнай скаргай, з'яўляецца Камітэт ААН па правах чалавека. У склад Камітэта ўваходзяць 18 экспертаў.

**Падаць скаргу можа асоба, якая адпавядае ніжэй пададзеным крытэрыям (на падставе Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах).**

1) Асоба мусіць падпадаць пад юрысдыкцыю дзяржавы-ўдзельніцы Пакта і сцвярджаць, што яна стала ахвярай парушэння гэтай дзяржавай якогасьці права, акрэсленага ў Пакце.

2) Асоба павінна вычарпаць ўсе наяўныя ўнутрыдзяржаўныя прававыя сродкі і адправіць пісьмовае паведамленне на разгляд Камітэта.

3) Паведамленне (скарга) не павінна быць ананімнай.

4) Гэтая самая скарга не павінна разглядацца паводле іншай працэдуры міжнароднага разбіральніцтва ці ўрэгулявання.

**Парадак падачы скаргі:**
асоба, якая жадае падаць скаргу ў Камітэт па правах чалавека, павінна:

1) аформіць скаргу (правілы афармлення скаргі і саму скаргу можна знайсці ў Інтэрнэце: http://un.by/hr/complain/),

2) у скарзе павінна давацца спасылка на норму Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах,

3) да скаргі павінны быць прыкладзены ўсе дакументы і рашэнні, якія былі прыняты па дадзенай скарзе на нацыянальным узроўні (таму ўсе дакументы трэба збіраць падчас разгляду сваёй справы),

4) скарга павінна быць правільна аформлена (для гэтага можна выкарыстаць дапамогу альбо адваката, альбо прадстаўнікоў праваабарончых арганізацый),

5) скарга не была пададзеная ў іншы міжнародны орган на разгляд,

6) дакументы трэба выслаць на адрас: Human Rights Committee, UN Centre for Human Rights, Palais des Nations, 1211, Geneva, 10, Switzerland (Швейцарыя, Жэнева).

Калі скарга прызнана прымальнай, рашэнне выносіцца без правядзення слуханняў.

**Час разгляду скаргі:**
пададзеная скарга разглядаецца прыблізна ад 3 да 4 гадоў. Самыя неадкладныя справы могуць разглядацца значна раней, напрыклад, справа аб смяротным пакаранні.

**Вынікі разгляду справы:**
па выніках разгляду справы Камітэт афармляе рашэнне, якое накіроўваецца прадстаўнікам дзяржавы, што парушыла правы чалавека. Дзяржава павінна выправіць стан рэчаў і даць належную кампенсацыю ахвярам парушэння. Рашэнне Камітэта таксама афармляецца ў выглядзе справаздачы, якая накіроўваецца найвышэйшаму органу ААН — Генеральнай Асамблеі ААН, а гэта шкодзіць іміджу краіны-парушальніцы. Таму дзяржавы не зацікаўленыя і не жадаюць, каб пра іх размаўлялі як аб парушальніках на такім высокім міжнародным узроўні.

**РАЗДАТАК № 4.2.**

## ЕЎРАПЕЙСКІ СУД ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Грамадзяне Беларусі не маюць права падаваць у Еўрапейскі суд на парушэнні правоў чалавека Беларуссю, але маюць права падаваць такія скаргі, калі іх правы былі парушаны дзяржаўнымі органамі іншых еўрапейскіх дзяржаў падчас знаходжання на іх тэрыторыі.

Структуры Еўрапейскага суда па правах чалавека, куды асоба можа звярнуцца з індывідуальнай скаргай: індывідуальныя скаргі аб парушэнні правоў чалавека разглядаюцца ў спецыяльных Палатах, якія складаюцца з сямі суддзяў, альбо Вялікай палатай, якая складаецца з сямнаццаці суддзяў (найцяжэйшыя справы).

**Падаць скаргу можа асоба, якая адпавядае наступным крытэрам (на падставе артыкулаў 34 і 35 Еўрапейскай Канвенцыі).**

1) Калі правы чалавека парушыла дзяржава альбо некалькі еўрапейскіх дзяржаў, якія падпісалі і ратыфікавалі Еўрапейскую канвенцыю па абароне правоў чалавека і асноўных свабод 1950 г.

2) Асоба, якая лічыць сябе ахвярай парушэння правоў чалавека, вычарпала ўсе інстанцыі па абароне правоў чалавека ў нацыянальнай сістэме (як правіла, пад гэтымі сістэмамі разглядаюцца суды), і падае скаргу ў Еўрапейскі суд на працягу 6 месяцаў з даты вынясення нацыянальнымі органамі канчатковага рашэння па справе.

3) Скарга не з’яўляецца ананімнай і падаецца толькі ад асобы, правы і свабоды якой былі непасрэдна парушаны, альбо ад упаўнаважаных на такія дзеянні законных прадстаўнікоў гэтай асобы.

4) Скарга не была ўжо разгледжана Судом ці была пададзеная ў іншы міжнародны орган на разгляд.

**Парадак падачы скаргі:**

Асоба альбо група асоб ці арганізацыя, якая жадае падаць скаргу ў Еўрапейскі суд па правах чалавека, павінна:

1) правільна аформіць і падаць скаргу ў пісьмовай форме (пажадана выкарыстаць дапамогу адваката альбо прадстаўнікоў праваабарончых арганізацый),

2) падаць скаргу ў канцылярыю Еўрапейскага суда па правах чалавека, якая далей рыхтуе ўсе неабходныя дакументы для разгляду судом (адрас: Secretary-General of the Council of Europe, 67006, Strasbourg, Cedex, France (Францыя, Страсбург)

Калі скарга прызнана прымальнай, у судзе праходзяць слуханні, якія з’яўляюцца адкрытымі (у абсалютнай большасці спраў).

**Час разгляду скаргі:**

пададзеная скарга разглядаецца прыблізна ад 3 да 5 гадоў. Самыя неадкладныя справы могуць разглядацца раней.

**Вынікі разгляду справы:**

Суддзя, які прызначаецца для разгляду той альбо іншай справы, спачатку спрабуе ўрэгуляваць яе шляхам перамоў з дзяржаўнымі структурамі-парушальнікамі. Калі гэта не ўдаецца і бакі не знаходзяць паразумення, судом выносіцца рашэнне, якое з’яўляецца канчатковым і мае абавязковую сілу. Часта Суд абавязвае дзяржавы таксама выплачваць грашовыя кампенсацыі ахвярам парушэнняў правоў чалавека. Калі дзяржава не выканае рашэнне суда, то супраць яе могуць быць уведзены санкцыі (аж да выключэння краіны з Рады Еўропы).

**РАЗДАТАК № 4.3.**

**МЕХАНІЗМ АБАРОНЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА АБСЕ**

АБСЕ не ўсталявала суда ці іншага органа, які мог бы разглядаць скаргі асобных людзей, чые правы чалавека былі парушаны. АБСЕ ўзмацняе ўплыў міжнародных інстытутаў, напрыклад, Камітэта ААН па правах чалавека, Еўрапейскага суда па правах чалавека і заклікае ўсе дзяржавы выкарыстоўваць іх і выконваць міжнародныя нормы па правах чалавека. Адсутнасць механізма для разгляду індывідуальных скаргаў не выключае магчымасці рэагавання ў выпадку парушэнняў правоў чалавека. Хельсінкскі заключны акт (1975) і іншыя інструменты АБСЕ, прынятыя пазней, прадугледжваюць правядзенне рэгулярных нарадаў, зыходзячы з таго, што для рэалізацыі дамоўленасцяў патрабуецца пастаянны працэс. Такі падыход, заснаваны на бесперапынным працэсе, з часам дазволіў стварыць добрую сістэму палітычных сустрэч на ўзроўні найвышэйшага кіраўніцтва дзяржаў, на якіх абмяркоўваюцца пытанні, звязаныя з выкананнем абавязальніцтваў АБСЕ. Сюды ўваходзяць: а) канферэнцыі па разглядзе, якія праводзяцца да прыняцця новых дакументаў і заяваў; б) сустрэчы на найвышэйшым узроўні АБСЕ і паседжанні Рады міністраў, якія звычайна прымаюць новыя дакументы і заявы. Канферэнцыі па разглядзе папярэднічаюць сустрэчам на найвышэйшым узроўні АБСЕ і служаць для абмеркавання выканання дакументаў АБСЕ, рыхтуюць заключныя дакументы, якія затым прымаюцца на сустрэчах на найвышэйшым узроўні.

Па пытаннях правоў чалавека (чалавечым вымярэнні) праводзяцца адмысловыя нарады. Нарады па выкананні абавязальніцтваў па правах чалавека АБСЕ адбываюцца ў гады, калі не праводзяцца сустрэчы на найвышэйшым узроўні АБСЕ, і служаць у якасці месца для абмеркавання пытанняў, звязаных з правамі чалавека ў асобных краінах. Сустрэчы АБСЕ па пытаннях правоў чалавека адкрыты для актыўнага ўдзелу няўрадавых грамадскіх арганізацый. Моладзь такім чынам можа браць удзел у абмеркаванні правоў чалавека ў межах АБСЕ праз удзел у грамадскіх аб'яднаннях, якія дзейнічаюць у тым ліку і ў Беларусі.

АБСЕ таксама стварыла так званы механізм чалавечага вымярэння, а менавіта Венскі механізм (створаны ў 1989) і Маскоўскі механізм (1991). Венскі механізм дазваляе дзяржавам-удзельніцам узнімаць пытанні, звязаныя з выкананнем абавязальніцтваў у галіне правоў чалавека іншымі дзяржавамі-ўдзельніцамі АБСЕ. Маскоўскі механізм абапіраецца на Венскі механізм і дадаткова прадстаўляе магчымасць фармаваць спецыяльныя місіі незалежных экспертаў для аказання дапамогі ў рашэнні канкрэтных праблем, звязаных з пытаннямі правоў чалавека.

Гэта прадугледжвае права правядзення расследавання паведамленняў аб парушэннях правоў чалавека, прычым у выключных выпадках гэта можа рабіцца нават без згоды абвінавачанай дзяржавы. На практыцы механізм чалавечага вымярэння ўжываецца рэдка, паколькі АБСЕ стала пастаянна дзеючай арганізацыяй і ўзнікаючыя праблемы правоў чалавека вырашаюцца, як правіла, па выніках сустрэч.

АБСЕ таксама стварыла цэлы шэраг пастаянных інстытутаў для аказання дзяржавам-удзельніцам дапамогі ў выкананні сваіх абавязальніцтваў у галіне правоў чалавека (чалавечага вымярэння) АБСЕ:
**а) Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ АБСЕ).**
БДІПЧ праводзіць маніторынг, аналіз стану з правамі чалавека, аказвае экспертную дапамогу ў вырашэнні праблем у галіне правоў чалавека (чалавечым вымярэнні). Адна з самых заўважных роляў БДІПЧ — назіранне за выбарамі ў краінах АБСЕ.

**б) Вярхоўны камісар па пытаннях нацыянальных меншасцяў.**
У задачы Вярхоўнага камісара АБСЕ па пытаннях нацыянальных меншасцяў (гэты інстытут быў створаны ў Гаазе ў 1992) уваходзіць выяўленне і вырашэнне сітуацый, звязаных з этнічнай напружанасцю, якія маглі б ствараць пагрозу для міру, стабільнасці ці сяброўскіх адносін паміж краінамі-ўдзельніцамі АБСЕ. Дзейнічаючы незалежна ад усіх зацікаўленых бакоў, Вярхоўны камісар накіроўвае свае місіі на месцы і праводзіць палітыку прэвентыўнай дыпламатыі на раннім этапе ўзнікнення напружанасці. Вярхоўны камісар імкнецца не толькі атрымаць інфармацыю з першых рук, але і спрабуе спрыяць умацаванню дыялогу, даверу і супрацоўніцтва.

**в) Прадстаўнік па пытаннях свабоды сродкаў масавай інфармацыі (СМІ).**
Прадстаўнік АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ аказвае дзяржавам-удзельніцам дапамогу ў фармаванні свабодных, незалежных і плюралістычных СМІ як аднаго з асноватворных элементаў у нармальна функцыянуючай дэмакратыі. Прадстаўнік, офіс якога знаходзіцца ў Вене, сочыць за падзеямі ў галіне СМІ ва ўсіх дзяржавах-удзельніцах і адстойвае адпаведныя прынцыпы і абавязальніцтвы АБСЕ, спрыяючы такім чынам іх выкананню.

# 5. НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МЕХАНІЗМЫ АБАРОНЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- паняцце, прыкметы і віды нацыянальных механізмаў абароны правоў чалавека;
- агульныя прынцыпы арганізацыі і функцыянавання нацыянальных механізмаў абароны правоў чалавека;
- чым розняцца механізмы па абароне правоў чалавека: камісіі па правах чалавека ці амбудсмен, адміністрацыйныя механізмы, судовыя механізмы, праваахоўчыя механізмы (пракуратура) і грамадскія механізмы абароны правоў чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- аргументаваць сваю пазіцыю адносна неабходнасці і істотнасці нацыянальных механізмаў у справе абароны правоў чалавека на нацыянальным узроўні.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да нацыянальных механізмаў абароны правоў чалавека як да важных кампанентаў абароны правоў чалавека ў Беларусі.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі — 4 хв.
2. Знаёмства з тэмай і задачамі заняткаў — 1 хв.
3. Знаёмства з прынцыпамі працы нацыянальных органаў абароны правоў чалавека — 24 хв.
4. Абмеркаванне асаблівасцей асобных нацыянальных механізмаў абароны правоў чалавека ў Беларусі — 12 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 4 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Факусаванне ўвагі (4 хв.).**
Запытайце ва ўдзельнікаў, куды, у якія органы трэба звяртацца ў тым выпадку, калі вы лічыце, што нейкае права ў галіне адукацыі парушана? Напрыклад, калі вас адлічаюць са школы, а вы ўпэўненыя, што гэтым парушаюць вашы правы чалавека?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Дадзеная частка грунтуецца на агульных ведах удзельнікаў аб магчымасцях абароны сваіх правоў. Як правіла, удзельнікі могуць называць міліцыю, пракуратуру, суд.**

**Для настаўніка з'яўляецца істотным атрымаць хаця б адно меркаванне, а пазней дапоўніць і развіць яго, грунтуючыся на Дадатковай інфармацыі да дадзенага занятка.**

**Не варта зацягваць час факусавання, галоўнае, каб удзельнікі зразумелі, што ёсць некалькі асобных механізмаў абароны правоў. Гэтыя механізмы розняцца між сабой як мінімум працэдурай разгляду скаргі і вынікамі, якія наступаюць пасля разгляду справы.**

**Напрыклад, парушэнні ў галіне адукацыі можна абскардзіць, звярнуўшыся да дырэктара школы, у гарадскі ці раённы аддзел адукацыі, міністэрства адукацыі, ў пракуратуру. Таксама можна звярнуцца ў суд для абароны сваіх інтарэсаў. Можна звярнуцца да грамадскіх аб'яднанняў ці выступіць з артыкулам у мясцовай газеце, на тэлебачанні ці ў інтэрнэце. У кожным з такіх выпадкаў зваротаў можна чакаць асобных вынікаў.**

**2. Прадстаўце тэму і задачы заняткаў (1 хв.).**

**3. Знаёмства з прынцыпамі працы нацыянальных органаў абароны правоў чалавека (24 хв.).**
Знаёмства прапануецца правесці пры дапамозе метаду «Кожны вучыць групу». Для гэтага кожнаму з удзельнікаў трэба раздаць адзін з пяці раздаткаў 5.1., 5.2., 5.3., 5.4 альбо 5.5. Падчас раздачы звярніце ўвагу на тое, каб колькасць удзельнікаў з раздаткам 5.1. адпавядала колькасці ўдзельнікаў з раздаткам 5.2, 5.3, 5.4 і 5.5. Напрыклад, калі два чалавекі атрымалі раздатак 5.1, то адпаведна па два чалавекі павінны атрымаць раздаткі 5.2, 5.3, 5.4 і 5.5. Гэта неабходна для наступнага этапу знаёмства з матэрыяламі.

Дайце ўдзельнікам не менш як 8 хвілін на тое, каб яны азнаёміліся са сваімі раздаткамі і падрыхтаваліся да прэзентацыі матэрыялу іншым удзельнікам.

Пасля таго як удзельнікі самастойна азнаёмяцца кожны са сваім раздаткам, аб’яднайце ўдзельнікаў у пяцёркі. У кожную пяцёрку аб’ядноўваюцца па адным удзельніку з раздаткам 5.1, 5.2, 5.3, 5.4 і 5.5. Такім чынам, у кожнай з груп будзе па адным прадстаўніку з кожным асобным раздаткам. На працягу 16 хв. дайце магчымасць удзельнікам пяцёрак расказаць адзін аднаму пра свой асобны матэрыял.

**Тлумачальная інфармацыя**

**На правядзенне дадзенай часткі занятку адводзіцца 24 хвіліны. Настаўніку варта самастойна карэктаваць час знаёмства з матэрыялам і час працы ў пяцёрках. Складанасці могуць узнікнуць у час працы ўдзельнікаў у складзе пяцёрак. На тлумачэнне пяці раздаткаў даецца толькі 16 хвілін — крыху больш як па 3 хвіліны кожнаму. Разам з тым матэрыял раздаткаў пабудаваны па аднолькавай схеме і мае даволі шмат агульнай інфармацыі. Напрыклад, амаль ва ўсіх раздатках пазначана аднолькавая інфармацыя аб тым, як знайсці дзяржаўны орган ці арганізацыю, куды можна звярнуцца па дапамогу. Гэта павінна з аднаго боку паспрыяць запамінанню, а з другога — павінна дапамагчы скараціць час на прэзентацыі.**

**У выпадку, калі група ўдзельнікаў малая, альбо з мэтай даць больш часу ўдзельнікам на прэзентацыі сваіх раздаткаў у групах, настаўнік можа выбраць не пяць раздаткаў для азнаямлення, а толькі тры з пяці. Прапануем для гэтага раздаткі 5.2, 5.3 і 5.5. У гэтым выпадку пасля самастойнага азнаямлення з раздаткам удзельнікі будуць аб’ядноўвацца не ў пяцёркі, а ў тройкі і будуць мець значна больш часу для вытлумачэння свайго матэрыялу ў тройках. Інфармацыю з раздаткаў 5.1 і 5.4 можна патлумачыць удзельнікам у якасці дадатковай інфармацыі падчас наступнай часткі заняткаў. Наступная частка практыкавання будзе аднachасова і падсумаваннем (рэфлексіяй) зробленага падчас самастойнага знаёмства з матэрыялам і азнаямленні з гэтым матэрыялам іншых удзельнікаў у пяцёрках.**

### 4. Абмеркаванне асаблівасцей існавання асобных нацыянальных механізмаў абароны правоў чалавека ў Беларусі (12 хв.).

Падсумаваць самастойную працу і працу ў пяцёрках можна пры дапамозе наступных пытанняў.

- Куды можна звярнуцца ў выпадку парушэння правоў чалавека?
- Што трэба зрабіць для таго, каб звярнуцца ў механізмы абароны правоў чалавека, апісаныя ў раздатках?
- Які з пералічаных нацыянальных механізмаў з’яўляецца найбольш эфектыўным і чаму? Аргументуйце адказ.
- Назавіце слабыя бакі кожнага з нацыянальных механізмаў абароны правоў чалавека.
- Якіх вынікаў можна чакаць ад звароту ў гэтыя механізмы абароны правоў чалавека?
- У якія нацыянальныя механізмы абароны правоў чалавека можна параіць звярнуцца пры адлічэнні са школы — пытанне з пачатку заняткаў? Патлумачце сваю пазіцыю.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Дадзеная частка накіравана на засваенне новай для ўдзельнікаў інфармацыі аб нацыянальных механізмах абароны правоў чалавека. Гэтая частка павінна прадставіць матэрыял не толькі для разумення таго як дзейнічае механізм, як ім карыстацца і якіх вынікаў можна чакаць, але і аргументы адносна моцных і слабых бакоў асобных механізмаў па абароне правоў чалавека на нацыянальным узроўні.**

**Падчас дадзенага абмеркавання варта памятаць, што няма лепшых і горшых механізмаў абароны правоў чалавека. Пытанне фармулюецца такім чынам толькі для таго, каб стварыць умовы для дыскусіі сярод удзельнікаў. Кожны з разгледжаных механізмаў мае свае асаблівасці функцыянавання і прыняцця рашэння. Гэта азначае, што выбіраць асобны механізм абароны правоў чалавека трэба, сыходзячы з умоваў і асаблівасцей канкрэтнага выпадку.**

**Вельмі важным з’яўляецца апошняе пытанне падсумавання. Адказы на гэтае пытанне павінны надаць цэльнасць і закончанасць усяму занятку.**

### 5. Падагульненне заняткаў (4 хв.).

Для падсумавання занятку можна задаць наступныя пытанні:

- Якія нацыянальныя механізмы абароны правоў чалавека вы можаце назваць?
- На што трэба звяртаць увагу падчас таго, як вы выбіраеце, у які з дзяржаўных механізмаў варта звярнуцца?
- Як вы лічыце, ці патрэбны спецыяльны орган па абароне правоў чалавека — напрыклад, амбудсмен, у Беларусі? Патлумачце свой адказ.

## АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ АБ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕХАНІЗМАХ АБАРОНЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І ШЛЯХАХ АБСКАРДЖАННЯ ПАРУШАНЫХ ПРАВОЎ

Нацыянальны механізм абароны правоў чалавека ствараецца дзяржавай ці грамадствам на падставе нацыянальнага заканадаўства.

Стварэнне, існаванне і дзейнасць нацыянальнага механізма абароны правоў чалавека непасрэдна звязана, з аднаго боку, з гісторыяй станаўлення дзяржавы, а з другога боку, з гісторыяй станаўлення правоў чалавека. Дадатковую інфармацыю пра гісторыю развіцця правоў чалавека глядзі ў матэрыялах заняткаў «Гісторыя правоў чалавека» і «Дакументы па правах чалавека».

На нацыянальным узроўні таксама прымаюцца прававыя нормы і ствараюцца спецыяльныя органы (мясцовыя і вышэйшыя органы ўлады, органы суду, пракуратуры), якія сочаць за выкананнем дзеючага заканадаўства. Аднак у сферы абароны правоў чалавека працуюць не толькі (выканаўчыя) дзяржаўныя структуры — вялікая роля належыць грамадскім арганізацыям, а дадаткова таксама — сродкам масавай інфармацыі і дэпутатам мясцовых органаў улады і Нацыянальнага Схода. Усе гэтыя органы і структуры разам складаюць нацыянальны механізм абароны правоў чалавека.

Механізмы абароны правоў чалавека на нацыянальным узроўні — гэта сістэмы асаблівых дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый і аб’яднанняў грамадзян, якія на падставе заканадаўства маюць магчымасць, у межах сваёй кампетэнцыі, вырашаць праблемы, звязаныя з правамі чалавека.

Прававой базай для дзейнасці нацыянальных механізмаў абароны правоў чалавека з’яўляюцца міжнародныя нормы па правах чалавека, якія пасля спецыяльнай працэдуры падпісання і ратыфікацыі дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь як частка нацыянальнага заканадаўства. Прававой базай таксама з’яўляюцца нормы Канстытуцыі, законы і падзаконныя акты Рэспублікі Беларусь, якія гарантуюць захаванне палітычных, сацыяльных, эканамічных, культурных і іншых правоў чалавека на тэрыторыі нашай дзяржавы.

У залежнасці ад асаблівай кампетэнцыі, якой валодаюць тыя ці іншыя органы дзяржаўнай улады, арганізацыі ці аб’яднанні, умоўна можна вылучыць некалькі тыпаў механізмаў абароны правоў чалавека на нацыянальным узроўні.

1) *Адміністрацыйны механізм* абароны правоў чалавека. У гэты механізм уваходзяць выканаўчыя структуры дзяржаўных органаў, якія могуць прымаць абавязковыя для ўсіх рашэнні па шырокім коле пытанняў — гэта аддзелы, камітэты і ўпраўленні адміністрацыі раёна ў горадзе, гарадскога выканаўчага камітэта, абласнога выканаўчага камітэта, адпаведных міністэрстваў і, нарэшце, Урад Рэспублікі Беларусь; Дадатковую інфармацыю аб адміністрацыйных механізмах абароны правоў чалавека на нацыянальным узроўні можна паглядзець на сайтах дзяржаўных органаў улады. Найбольш поўная база дзяржаўных вышэйшых і мясцовых органаў улады на сайце: www.president.gov.by

2) *Праваахоўчы механізм* абароны правоў чалавека. Сюды ўваходзяць спецыялізаваныя структуры, надзеленыя асаблівай кампетэнцыяй — сачыць за дакладным і аднастайным выкананнем заканадаўства на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, пракурор горада/раёна, пракурор вобласці, генеральны пракурор. Ці органы міністэрства унутраных спраў: участковы, раённы аддзел міліцыі, упраўленне унутраных спраў гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне унутраных спраў абласнога выканаўчага камітэта, міністэрства унутраных спраў (МУС; але міліцыя не падаецца асобна ў раздатках для таго каб, з аднаго боку не перагружаць удзельнікаў колькасцю інфармацыі, а з другога, — болей сканцэнтравацца на пракуратуры, якая па сваёй кампетэнцыі павінна дапамагаць грамадзянам падчас парушэнняў у галіне правоў чалавека з боку розных дзяржаўных органаў, арганізацый і аб’яднанняў). Дадатковую інфармацыю аб працы са зваротамі грамадзян можна знайсці на сайце Пракуратуры Рэспублікі Беларусь: www.prokuratura.gov.by/main.aspx?guid=10141

3) *Судовы механізм* абароны. Сюды ўваходзяць раённы (гарадскі) суд, абласны суд, Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь. Дадатковую інфармацыю аб дзейнасці судовай сістэмы можна знайсці на сайце Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь: www.supcourt.by

4) *Грамадскі механізм*. Сюды ўваходзяць грамадскія аб'яднанні і сродкі масавай інфармацыі, якія спецыялізуюцца на праваабарончай адукацыйнай ці інфармацыйнай дзейнасці ў галіне правоў чалавека, мясцовыя і рэспубліканскія газеты, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт-сайты і г. д. Дадатковую інфармацыю аб механізмах абароны правоў чалавека праваабарончымі арганізацыямі можна знайсці на сайце праваабарончай арганізацыі»Беларускі Хельсінскі камітэт» http://www.belhelcom.org/ і на сайце www.spring96.org

5) У якасці асобнага механізма абароны правоў чалавека на нацыянальным узроўні вылучаюць інстытут *амбудсмена (абаронцы правоў чалавека)*, але на сённяшні дзень у нашай краіне інстытута амбудсмена няма. Падобныя функцыі мае *Камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па правах чалавека, міжнацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі*.

Дадатковую інфармацыю аб зваротах грамадзян у спецыяльныя камісіі ў тым ліку і Камісію па правах чалавека можна паглядзець на сайце: http://house.gov.by/index.php/,5487,,,,0,0,0.html

Асаблівасцю ўсіх вышэйпералічаных механізмаў з'яўляецца тое, што яны разглядаюць шырокае кола пытанняў. Гэта азначае, што, напрыклад, парламент займаецца прыняццем законаў у дзяржаве, але, акрамя гэтай сваёй дзейнасці, дэпутаты парламент а абавязаны разглядаць звароты грамадзян (сваіх выбаршчыкаў). Гарадскі выканаўчы камітэт займаецца, напрыклад, добраўпарадкаваннем горада, але акрамя гэтага абавязаны займацца пытаннямі абароны правоў чалавека. Пракуратура сочыць за правільнасцю прымянення ўсяго заканадаўства, у тым ліку і заканадаўства ў галіне правоў чалавека. Органы ўнутраных спраў (міліцыя) сочаць за правапарадкам, у тым ліку абавязаны не дапускаць парушэнняў у галіне правоў чалавека. Суды разглядаюць любыя адміністратыўныя, грамадзянскія, крымінальныя скаргі (шмат з якіх могуць тычыцца правоў чалавека). Але гэтыя органы не спецыялізуюцца выключна на праблемах правоў чалавека альбо не заўсёды могуць убачыць парушэнні правоў чалавека (нацыянальнае заканадаўства не вылучае правы чалавека ў якасці асобнай галіны права).

У мэтах паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека з канца XX ст. некаторыя дзяржавы пачалі ствараць спецыяльныя дзяржаўныя органы, якія сталі называць «амбудсмен па правах чалавека» (упаўнаважаны па правах чалавека). У адрозненне ад іншых дзяржаўных органаў, амбудсмен займаецца выключна праблемамі, звязанымі з правамі чалавека на тэрыторыі дзяржавы. Першым інстытут амбудсмена (у сучасным яго ўспрыняцці) ўзнік у скандынаўскіх краінах у другой палове XX ст. (хоць упершыню інстытут амбудсмена ўзнік ў Швецыі ўжо ў 1809 г.). У канцы XX ст. інстытут амбудсмена быў уведзены ў многіх развітых дзяржавах. Інстытут амбудсмена ёсць ва ўсіх нашых суседзяў: у краінах Балтыі, у Польшчы, Расіі, Украіне. Прычым зусім нядаўна, ў верасні 2009 г. у Расіі , акрамя амбудсмена па правах чалавека, была ўведзена пасада амбудсмена па правах дзіцяці, які будзе спецыялізавацца ў парушэннях правоў выключна дзяцей.

У большасці краін інстытут амбудсмена — дарадчы орган, які звяртае ўвагу дзяржаўных органаў улады і СМІ на парушэнні правоў чалавека. Амбудсмены могуць прымаць скаргі грамадзян на парушэнні іх правоў і дапамагаць адстаяць правы. Аднак амбудсмены звычайна не маюць магчымасці прымушаць дзяржаўныя органы выпраўляць парушэнні ў галіне правоў чалавека (іх паўнамоцтвы нельга параўноўваць з паўнамоцтвамі судоў альбо пракуратуры). У якасці прыклада паўнамоцтваў і працы інстытута Упаўнаважанага па правах чалавека Расійскай Федэрацыі глядзіце старонку http://ombudsman.gov.ru/institut/institut.shtml

У Рэспубліцы Беларусь няма спецыяльных органаў у выглядзе амбудсмена (спецыяльнага прадстаўніка па правах чалавека, альбо па правах асобнай катэгорыі — жанчын, дзяцей, уцекачоў ці іншых). Функцыі, якія нагадваюць у нечым функцыі амбудсмена, выконвае Камісія Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага Схода Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі. Гэтая Камісія складаецца з дэпутатаў парламента, якія займаюцца вырашэннем розных пытанняў, звязаных з правамі чалавека.

Усе пяць механізмаў адрозніваюцца адзін ад аднаго, прычым кожны з пяці адзначаных механізмаў мае асаблівую працэдуру звароту, разгляду пытанняў і прыняцця рашэнняў. Больш падрабязна пра асаблівасці вышэйазначаных механізмаў глядзі ў раздатках да дадзенага занятку.

Што да праблемы правоў чалавека ў адукацыі, асоба самастойна мае права выбраць той механізм, пры дапамозе якога будзе адстойваць свае правы ў гэтай сферы. Прычым можна

самастойна вырашаць, да якой ступені механізма хоча дайсці (напрыклад, падаць скаргу ў першую інстанцыю суда ці дайсці да Вярхоўнага Суда), і, калі хоча, то можа ў любы момант звярнуцца ў іншы механізм. Згодна з міжнароднымі дакументамі, дзяржава абавязана забяспечваць магчымасць атрымання адукацыі, але ўзровень (якасць) гэтага забеспячэння яна мае права вызначаць самастойна. У выпадках няякаснага навучання, парушэння правоў падчас аказання адукацыйных паслуг, асоба мае права на абарону сваіх правоў. Найбольш часта ўжыванымі афіцыйнымі спосабамі ці шляхамі абароны з'яўляюцца: судовы (у выпадку выключэння са школы — у суд першай інстанцыі), адміністрацыйны шлях (скарга ў раённы аддзел адукацыі ці адразу ў міністэрства адукацыі) і зварот у пракуратуру.

Зварот у любы з механізмаў абароны правоў чалавека можа адбывацца пры дапамозе вуснай ці пісьмовай скаргі ці заявы. Толькі падчас звароту ў суд да скаргі прадстаўляюцца дадатковыя асаблівыя патрабаванні, хоць у цэлым структура і сэнс асноўных частак скаргі захоўваецца. Скарга з'яўляецца асноўным інструментам, які «запускае» працу дзяржаўных механізмаў абароны правоў чалавека. Грамадскія аб'яднанні і сродкі масавай інфармацыі, як правіла, не патрабуюць нават скаргі ці заявы для таго каб пачаць дапамагаць чалавеку, чые правы парушаны (можна звярнуцца вусна альбо ў любой пісьмовай форме).
Пры ўсіх плюсах і мінусах больш эфектыўнай з'яўляецца пісьмовая форма звароту ў органы, паколькі менавіта гэтая форма дазваляе «запусціць» прававы механізм праверкі вашай скаргі і патрабуе пісьмовага адказу асобе, якая склала скаргу (на працягу максімум 30 дзён, у адпаведнасці з законам «Аб зваротах грамадзян»).

У заканадаўстве не акрэслена структура і неабходны мінімальны змест скаргі. Але практыкай выпрацавана агульнапрымальная форма скаргі.

**Кожная скарга павінна складацца з наступных частак.**
1. Каму (асоба, на імя якой падаецца скарга, пасада, ўстанова, куды падаецца скарга).
2. Ад каго (поўнае прозвішча, імя і імя па бацьку, кантактны адрас і, па магчымасці, тэлефон для кантактаў).
3. Назва. Скарга/Заява.
4. Вытлумачэнне сутнасці справы.
5. Вытлумачэнне таго, якія законныя правы былі парушаны.
6. Вашы патрабаванні.
7. Дата напісання скаргі.
8. Пастаўце свой подпіс ці подпісы ўсіх, хто згодны з вашай скаргай (у выпадку, калі скарга падаецца ад некалькіх асоб, варта, каб яны таксама пазначылі свае кантактныя звесткі).
9. У выпадках, калі да скаргі прыкладаюцца нейкія іншыя дакументы, напрыклад, копіі рахункаў, спісаў пацярпелых, сведкаў ці іншае, у канцы скаргі (пад подпісам) можна пазначыць яшчэ адзін пункт: «Дадаткі», дзе трэба пералічыць назвы усіх дакументаў, якія вы далучаеце да скаргі. Дадаткі павінны дапамагчы ў прыняцці рашэння па вашым пытанні. Заўсёды прыкладайце толькі копіі дакументаў, каб не згубіць арыгінал.

Для таго каб эфектыўна выкарыстоўваць скаргі, варта ведаць агульныя правілы яе падачы. Скарга павінна быць зарэгістравана ў адмысловым журнале для ўваходных дакументаў. Такая рэгістрацыя будзе гарантыяй, што скаргу вымушаны будуць разгледзець, нават калі гэта будзе не даспадобы адміністрацыі. Згодна з Законам «Аб зваротах грамадзян», асобе, якая падала скаргу, будзе дадзены адказ у пісьмовай форме. У выпадку, калі не атрыманы адказ, і будзе вызначана, што ён не быў падрыхтаваны, асоба здольная даказаць, што сапраўды падавала скаргу, дзякуючы запісу ў журнале. Скаргу можна аднесці асабіста і папрасіць пры вас зарэгістраваць яе альбо сакратара, альбо ў аддзеле дакументазвароту, канцылярыі ці іншай структуры, якая рэгіструе ўваходзячыя дакументы. Скаргу можна даслаць поштай, заказным лістом з паведамленнем. У гэтым выпадку на руках заявіцеля застанецца доказ таго, што ён падаваў скаргу. Заявіцель мае права таксама папрасіць зарэгістраваць копію скаргі і паставіць на яе пячатку арганізацыі ці подпіс рэгіструючай асобы.

Паколькі Рэспубліка Беларусь падпісала і ратыфікавала міжнародныя дакументы па правах чалавека, то яна ўзяла на сябе абавязальніцтвы па рэалізацыі тых палажэнняў, якія ўтрымліваюцца ў гэтых міжнародных дакументах. Гэта азначае, што ўсе нормы нацыянальнага заканадаўства павінны адпавядаць міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека. Нацыянальнае заканадаўства Беларусі павінна будавацца ў адпаведнасці з прынцыпамі правоў чалавека, што мусіць быць дадатковай гарантыяй для выкарыстання нацыянальных органаў як механізмаў абароны правоў чалавека.

## ІНСТЫТУТ АМБУДСМЭНА, КАМІСІЯ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДА ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА, НАЦЫЯНАЛЬНЫХ АДНОСІНАХ І СРОДКАХ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

**Амбудсмен** — гэта асаблівая дзяржаўная пасада. Амбудсмен вылучаецца між усіх- нацыянальных механізмаў абароны правоў чалавека тым, што займаецца *выключна* пытаннямі абароны правоў чалавека і распаўсюджання ідэяў правоў чалавека на нацыянальным узроўні. Але амбудсмен у Рэспубліцы Беларусь пакуль адсутнічае. Некаторыя функцыі, звязаныя з абаронай і распаўсюджаннем ідэяў правоў чалавека, выконвае камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі. У адрозненне ад амбудсмена, Камісія не спецыялізуецца толькі на правах чалавека і не мае такіх шырокіх паўнамоцтваў, якія звычайна маюць інстытуты амбудсмена. Звяртацца па пытаннях правоў чалавека можна не толькі да дэпутатаў спецыяльнай Камісіі, але і да іншых дэпутатаў (напрыклад, да дэпутатаў, абраных у вашай акрузе).
Вырашыўшы выкарыстоўваць гэты механізм, трэба мець на ўвазе яго асаблівасці, у прыватнасці пералічаныя ніжэй.

1. Звярнуцца да дэпутатаў (у тым ліку тых, якія ўваходзяць у камісію) можна, напісаўшы ліст ці скаргу, у якой выкласці сутнасць справы і просьбу аб дапамозе.

2. Дэпутаты маюць свае асаблівыя працэдуры разгляду справы. Пасля паступлення ліста дэпутаты павінны правесці спецыяльную праверку ўсіх фактаў, выкладзеных у скарзе. Прычым любыя службовыя асобы, дзяржаўныя органы і арганізацыі абавязаны прадстаўляць усе неабходныя дакументы ці даваць тлумачэнні па справе, якую разбірае дэпутат парламента.

3. Дэпутаты не могуць канчаткова вырашыць вашу праблему, але яны могуць дапамагчы атрымаць ад дзяржаўных органаў неабходную інфармацыю і могуць пракантраляваць, як будзе вырашана ваша праблема.

4. Дэпутаты, згодна з заканадаўствам, з’яўляюцца незалежнымі ад любой дзяржаўнай структуры і могуць дапамагчы ў кансультаванні ці атрыманні дадатковых дакументаў, якія будуць падавацца ў суд, у пракуратуру, у дзяржаўныя органы, таму няма ніякай неабходнасці абскарджваць іх працу.

5. Маладыя людзі да 18-гадовага ўзросту могуць самастойна, ад свайго імя звяртацца да дэпутатаў парламента, дэпутатаў іншых узроўняў.

6. Парламент і Камісія па правах чалавека знаходзяцца ў Мінску. Знайсці адрас і тэлефон камісіі можна праз тэлефонную даведку, запытаўшы ў бацькоў ці настаўнікаў альбо ў інтэрнэце праз пошукавыя сайты.

**РАЗДАТАК № 5.2.**

## АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ МЕХАНІЗМ АБАРОНЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Вышэйстаячы начальнік мае права адмяняць рашэнні сваіх падначаленых, а таксама накладаць на іх спагнанні (пакаранні). Гэта па сутнасці і ёсць адміністрацыйны механізм абароны правоў чалавека. Дадзеная асаблівасць дазваляе звяртацца да вышэйстаячага начальніка (часта — прадстаўніка ўлады) які, магчыма, парушыў нейкія правы чалавека, і патрабаваць выправіць парушэнне і пакараць вінаватых.
Вырашыўшы выкарыстоўваць адміністрацыйны механізм, трэба мець на ўвазе яго асаблівасці, у прыватнасці пералічаныя ніжэй.

1. Звярнуцца да дзяржаўных служачых можна ў форме вуснай ці пісьмовай скаргі. Лепш звярнуцца ў пісьмовай форме, тады гарантавана органы дзяржаўнай улады мусяць адказаць вам пісьмова на працягу трыццаці дзён.

2. Адміністрацыйны механізм абароны правоў чалавека мае свае асаблівыя працэдуры разгляду справы. Дзяржаўны служачы пасля паступлення скаргі павінен правесці спецыяльную праверку ўсіх фактаў, выкладзеных у скарзе. Прычым ніжэйстаячыя службовыя асобы, дзяржаўныя органы і арганізацыі абавязаны прадстаўляць усе неабходныя дакументы ці даваць тлумачэнні па справе, якую разбірае службовая асоба.

3. Адміністрацыйны механізм мае асаблівую сілу рашэнняў. Дзяржаўны служачы як начальнік парушальніка можа абавязаць яго выправіць сітуацыю. Акрамя гэтага, такі парушальнік можа быць прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці.

4. Дзяржаўныя органы маюць складаную іерархічную структуру. Напрыклад, у дзяржаўную структуру, адказную за адукацыю, уваходзяць дырэктар навучальнай установы, аддзел адукацыі выканаўчага камітэта населенага пункта, аддзел адукацыі абласнога выканаўчага камітэта, міністэрства адукацыі. Гэта азначае, што, калі мы лічым, што ёсць парушэнне правоў чалавека ў школе, мы будзем спачатку адрасаваць свой зварот дырэктару школы і, калі будзем незадаволеныя ім, можам яго аспрэчыць у гарадскім аддзеле адукацыі, а рашэнне гарадскога аддзела — у аддзеле адукацыі абласнога выканаўчага камітэта. І так да міністра адукацыі. У выпадку, калі мы не задаволены рашэннем міністра адукацыі па справе правоў чалавека, мы можам звярнуцца ў іншыя механізмы абароны правоў чалавека, напрыклад, у суд.

5. Асаблівасцю адміністратыўнага механізма з’яўляецца тое, што маладыя людзі да 18 гадоў не могуць самастойна, ад свайго імя звяртацца ў дзяржаўныя органы. Гэта могуць рабіць толькі іх бацькі ці законныя прадстаўнікі. Зварот з адміністрацыйнай скаргай бясплатны.

6. Знайсці органы дзяржаўнай улады ў вашым населеным пункце можна праз тэлефонную даведку, запытаўшы ў бацькоў ці настаўнікаў альбо ў інтэрнэце праз пошукавыя сайты.

## ПРАВААХОЎНЫ МЕХАНІЗМ АБАРОНЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА (ПРАКУРАТУРА)

Праваахоўны механізм уключае ў сябе асаблівыя дзяржаўныя органы пракуратуры, якія пільнуюць, каб усе выконвалі заканадаўства, у тым ліку і заканадаўства па правах чалавека. Вырашыўшы выкарыстоўваць гэты механізм, трэба мець на ўвазе яго асаблівасці, у прыватнасці пералічаныя ніжэй.

1. Звярнуцца ў пракуратуру можна ў форме вуснай ці пісьмовай скаргі. Лепш звярнуцца ў пісьмовай форме, тады гарантавана органы пракуратуры вам адкажуць пісьмова на працягу трыццаці дзён.

2. Праваахоўны механізм абароны правоў чалавека мае свае асаблівыя працэдуры разгляду справы. Пракуратура пасля паступлення скаргі павінна правесці спецыяльную праверку ўсіх фактаў, выкладзеных у скарзе. Прычым любыя службовыя асобы, дзяржаўныя органы і арганізацыі абавязаны прадстаўляць усе неабходныя дакументы ці даваць тлумачэнні па справе, якую разбірае пракуратура.

3. Праваахоўны механізм мае асаблівую сілу рашэнняў. Пракуратура можа абавязаць парушальніка выправіць сітуацыю, а таксама можа распачаць крымінальны пераслед асоб, што парушылі заканадаўства.

4. Пракуратура мае іерархічную структуру, у якую ўваходзяць раённы ці гарадскі пракурор, абласны пракурор і генеральны пракурор. Гэта азначае, што, калі мы будзем незадаволены рашэннем, якое прыняў раённы ці гарадскі пракурор, мы можам яго аспрэчыць у абласнога, а рашэнне абласнога — у генеральнага пракурора. У выпадку, калі мы незадаволены рашэннем генеральнага пракурора па справе, мы можам звярнуцца ў іншыя механізмы абароны правоў чалавека, напрыклад, у суд.

5. Асаблівасцю праваахоўнага механізма з'яўляецца тое, што маладыя людзі да 18 гадоў не могуць самастойна, ад свайго імя звяртацца ў суд. Гэта могуць рабіць толькі іх бацькі ці законныя прадстаўнікі. Выключэннем з'яўляецца паведамленне пра злачынства.

6. Знайсці раённага ці гарадскога пракурора ў вашым населеным пункце можна праз тэлефонную даведку, запытаўшы ў бацькоў ці настаўнікаў альбо ў інтэрнэце праз пошукавыя сайты.

**РАЗДАТАК № 5.4.**

## СУДОВЫ МЕХАНІЗМ АБАРОНЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Судовы механізм уключае ў сябе асаблівыя дзяржаўныя органы суда, якія на падставе права і спецыяльных судовых працэдур разглядаюць разнастайныя спрэчкі, у тым ліку і спрэчкі па правах чалавека. Іншымі словамі, суд займаецца рознымі праблемамі, але сярод іх займаецца і правамі чалавека.
Вырашыўшы выкарыстоўваць гэты механізм, трэба мець на ўвазе яго асаблівасці, у прыватнасці пералічаныя ніжэй.

1. Звярнуцца ў суд можна толькі ў спецыяльнай пісьмовай форме іскавай заявы і, як правіла, платна.

2. Судовы механізм абароны правоў чалавека мае свае асаблівыя працэдуры разгляду справы. Суд разглядае справы на спецыяльных судовых пасяджэннях у адпаведнасці з асаблівай працэдурай. Для разгляду іскавай заявы суд можа выклікаць службовыя асобы, запатрабаваць дакументы па справе з дзяржаўных органаў.

3. Судовы механізм мае асаблівую сілу рашэнняў. Так, рашэнне судовых органаў можа прымусіць парушальніка выправіць сітуацыю. Суд можа пакараць вінаватых і кампенсаваць нам матэрыяльныя і маральныя страты.

4. Суд мае іерархічную структуру. У судовы механізм ўваходзяць раённы суд, абласны суд і Вярхоўны суд. Гэта азначае, што, калі мы будзем незадаволены рашэннем, якое прыняў раённы суд, мы можам яго аспрэчыць у абласным, а рашэнне абласнога — у Вярхоўным судзе. У выпадку, калі мы незадаволены рашэннем Вярхоўнага суда па справе правоў чалавека, мы можам звярнуцца ў міжнародныя інстанцыі, напрыклад, у Камітэт па правах чалавека Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

5. Асаблівасцю судовага механізма з’яўляецца тое, што маладыя людзі да 18 гадоў не могуць самастойна, ад свайго імя звяртацца ў суд. Гэта могуць рабіць толькі іх бацькі ці законныя прадстаўнікі. Выключэннем з’яўляецца паведамленне пра злачынства.

6. Знайсці раённы суд у вашым населеным пункце можна праз тэлефонную даведку, запытаўшы ў бацькоў ці настаўнікаў альбо ў інтэрнэце праз пошукавыя сайты.

## ГРАМАДСКІ МЕХАНІЗМ АБАРОНЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА — ПРАВААБАРОНЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ (СМІ)

Грамадскія аб'яднанні — гэта структуры, створаныя самімі грамадзянамі для вырашэння праблем, якія ўзнікаюць у грамадстве. Грамадскія аб'яднанні могуць займацца абаронай правоў чалавека і пашырэннем ідэі правоў чалавека (праваабарончыя арганізацыі), але яны не могуць прымушаць дзяржаўныя органы ўлады падпарадкоўвацца іх рашэнням.
Сродкі масавай інфармацыі (СМІ) — гэта спецыяльныя структуры, якія збіраюць і распаўсюджваюць інфармацыю. Сюды ўваходзяць: газеты, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт-рэсурсы і г. д. СМІ не могуць змусіць дзяржаўныя органы да выканання нейкіх дзеянняў, але крытычныя артыкулы могуць стаць прычынай разбору канкрэтных выпадкаў парушэння правоў чалавека.

1. Звярнуцца ў грамадскія аб'яднанні, якія займаюцца абаронай правоў чалавека, ці ў сродкі масавай інфармацыі можна ў такой форме, якую самастойна выбірае асоба. Гэта значыць, што, як правіла, у арганізацыях, газетах, на радыё ці тэлебачанні не трэба запаўняць спецыяльныя паперы, каб зацікавіць вашым выпадкам парушэння правоў чалавека.

2. Роля і функцыя грамадскіх аб'яднанняў і сродкаў масавай інфармацыі ў тым, каб звярнуць увагу грамадскасці і ўладаў на праблемы правоў чалавека і прапанаваць спосабы вырашэння гэтых праблем. Аднак яны не могуць самі вырашыць такія праблемы, бо такія праблемы найчасцей звязаныя з рашэннямі дзяржаўных органаў, а тыя не абавязаны выконваць рэкамендацый грамадскіх аб'яднанняў. Таму найлепш звяртацца да гэтых структураў для атрымання дапамогі ў тым, каб падрыхтаваць зварот ці скаргу ў нейкія дзяржаўныя органы. Грамадскія аб'яднанні могуць спецыялізавацца на аказанні падобных бясплатных паслуг альбо на распаўсюджанні інфармацыі ў газетах ці інтэрнэце.

3. У выпадку звароту да грамадскіх аб'яднанняў ці сродкаў масавай інфармацыі мы можам разлічваць на арганізацыйную і інфармацыйную падтрымку ў вырашэнні нашай праблемы.

4. Грамадскія аб'яднанні могуць дапамагчы ў падрыхтоўцы дакументаў, якія будуць падавацца ў суд, у пракуратуру, у дзяржаўныя органы, таму іх структура не мае прынцыповага значэння. У выпадку, калі нейкае грамадскае аб'яднанне нам не дапамагло, мы заўсёды маем права звярнуцца да іншага грамадскага аб'яднання альбо да іншага механізма абароны правоў чалавека.

5. Маладыя людзі да 18 гадоў могуць самастойна, ад свайго імя звяртацца па дапамогу ў грамадскія арганізацыі і ў сродкі масавай інфармацыі. У некаторых выпадках гэтыя арганізацыі могуць папрасіць паразмаўляць па вашым выпадку з бацькамі ці законнымі прадстаўнікамі.

6. Знайсці грамадскае аб'яднанне ці газету у вашым населеным пункце можна праз тэлефонную даведку, запытаўшы ў бацькоў ці настаўнікаў альбо ў інтэрнэце праз пошукавыя сайты.

# 6. АБМЕЖАВАННІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА
(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**
- **У выніку занятkаў вучні будуць ведаць:**
- у якіх міжнародных і нацыянальных нормах утрымліваюцца палажэнні адносна магчымасці абмежавання правоў і свабод, умоў іх абмежавання;
- якія правы чалавека, у якіх абставінах і кім могуць быць абмежаваны;
- якія правы чалавека ніколі не могуць быць абмежаваны згодна з міжнароднымі нормамі і нацыянальным заканадаўствам Беларусі.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- акрэсліваць, якія абмежаванні правоў чалавека на сённяшні дзень лічацца дапушчальнымі і чаму;
- вызначаць, ці правамерна было абмежаванне правоў чалавека ў канкрэтнай сітуацыі.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да абсалютных правоў і свабод чалавека, якія не падлягаюць абмежаванням, як да мінімальных гарантый правоў чалавека, у любых, нават надзвычайных сітуацыях.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне, разгляд прыкладаў абмежавання правоў чалавека, прадстаўленне тэмы і задач заняткаў — 4 хв.
2. Знаёмства з катэгорыяй абмежавання правоў чалавека — 17 хв.
3. Абмеркаванне канкрэтнага выпадку абмежавання правоў чалавека — 21 хв.
4. Падагульненне — 3 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў, а таксама паведаміце тэму і задачы заняткаў (4 хв.).**

Уявіце сабе наступную сітуацыю. У выніку прагнозу буйной паводкі, якая можа раптам наступіць ў адным з раёнаў, мясцовыя ўлады прымаюць рашэнне пра неадкладную эвакуацыю школьнай моладзі ў бяспечныя раёны, дзе яны без бацькоў будуць размешчаны ў спецыяльных інтэрнатах без права пакідаць іх часовы прытулак.

Задайце затым наступныя пытанні:
- Як вы лічыце, ці можна ў дадзеным выпадку абмежаваць права моладзі на сям’ю, права на атрыманне адукацыі, права на свабоду перамяшчэння, іншыя правы і свабоды? Патлумачце сваю пазіцыю.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Настаўніку варта стымуляваць удзельнікаў для таго. каб атрымаць як мінімум два аргументаваныя адказы:**
**1) чаму ўлады маюць права, з пункту гледжання удзельнікаў, абмяжоўваць правы чалавека ў дадзеным выпадку і**
**2) чаму ўлады не маюць права абмяжоўваць правы чалавека ў дадзеным выпадку.**

**Калі ўдзельнікі агучаць толькі адзін з пунктаў гледжання, настаўніку варта самастойна, каротка, але аргументавана прадэманстраваць другі пункт гледжання.**

Гэтая гіпатэтычная сітуацыя звязана з тым, што ўлады згодна з заканадаўствам маюць права абмяжоўваць азначаныя правы грамадзян. Але гаворка павінна весціся не адносна таго, могуць ці не могуць, але *чаму і ў якіх выпадках* яны могуць абмяжоўваць істотныя правы дзіцяці і правы чалавека і якія цяжкасці, звязаныя з такімі абмежаваннямі могуць узнікнуць. Варта звярнуць увагу на тое, што ў нашым выпадку:
1) улады абмяжоўваюць маладых людзей у праве выбару месца жыхарства,
2) абмяжоўваюць свабоду перамяшчэння,
3) абмяжоўваюць права на выхаванне ў сям’і.
Гл. дадатковую інфармацыю.

**2. Азнаёмце ўдзельнікаў з катэгорыяй абмежавання правоў чалавека (17 хв.).**

Аб’яднайце ўдзельнікаў у 5 роўных груп. Удзельнікам кожнай групы дайце адзін з раздаткаў: 6.1, 6.2, 6.3, 6.4, 6.5. Працаваць у групах будзе зручней, калі раздатак будзе ў кожнага з удзельнікаў.

Пасля азнаямлення са зместам матэрыялу дайце час групе абмеркаваць прачытанае: пра што ў ім была гаворка, як можна пераказаць прачытаны тэкст тым, хто не знаёміўся з ім.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Гэтая частка накіравана на стварэнне ўмоў для самастойнага азнаямлення навучэнцаў са зместам асобных артыкулаў, якія тычацца абмежавання правоў чалавека і абсалютных правоў, якія не могуць быць абмежаваныя.**

**Гэты варыянт самастойнага знаёмства дапаможа ашчаджаць час, адведзены для знаёмства з новым матэрыялам, і можа быць асабліва карысным у выпадках, калі настаўнік жадае больш часу выкарыстаць для абмеркавання ці працы па іншых частках заняткаў.**

### 3. Абмяркуйце канкрэтны выпадак абмежавання правоў чалавека (21 хв.).

Агучце навучэнцам інфармацыю пра наступны выпадак.

**ВЫПАДАК 1**

Міліцыя затрымала асобу, якая падазраецца ў тэрарыстычнай дзейнасці. Паводле інфармацыі, якую мае міліцыя, гэтая асоба можа ведаць, дзе ў горадзе падкладзена бомба. Да выбуху, у выніку якога можа загінуць некалькі дзесяткаў чалавек, застаецца некалькі гадзін.

Як вы лічыце, ці можа міліцыя ўжыць катаванні ў адносінах да гэтага чалавека, каб даведацца, дзе бомба? Патлумачце сваю пазіцыю.

Пасля азнаямлення з выпадкам упэўніцеся, што навучэнцы аднолькава зразумелі найбольш істотныя ў гэтай сітуацыі факты.

Аб’яднайце ўдзельнікаў у тройкі. Адзін з удзельнікаў кожнай тройкі будзе выпрацоўваць тры аргументы з пункту гледжання асобы, якая выступае за ўжыванне катаванняў у дадзеным выпадку; другі — тры аргументы з пункту гледжання асобы, якая выступае супраць выкарыстання катаванняў ў гэтым выпадку; трэці ўдзельнік выступае ў ролі асобы, якая будзе ацэньваць прыведзеныя аргументы, прычым трэці павінен падрыхтаваць па два пытанні першым двум удзельнікам для высвятлення іх пазіцый адносна абмежавання правоў чалавека (катавання) ў гэтым выпадку.

Пасля дыскусіі выведзіце ўдзельнікаў з роляў, а затым абмяркуйце наступныя пытанні:
- Да якіх рашэнняў прыйшлі асобы, якія ацэньвалі аргументы бакоў у кожнай з троек?
- Якія аргументы супрацьлеглага боку ў час абмеркавання падаліся вам найбольш моцнымі?
- Пры якіх умовах дапускаецца абмежаванне правоў чалавека? Чаму?
- Якія з правоў чалавека згодна з міжнароднымі і нацыянальнымі нормамі не могуць быць абмежаваны? Чаму менавіта гэтыя правы чалавека нельга абмяжоўваць ні ў якім выпадку?
- Прывядзіце прыклады правоў чалавека, якія могуць быць абмежаваны ў Беларусі.
- Калі б гэты выпадак разглядаўся ў сапраўдным судзе, да якога рашэння прыйшлі б суддзі? Патлумачце сваю пазіцыю.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Дадзеную частку занятку можна праводзіць на прыкладзе агучанага падчас факусавання выпадку з абмежаваннем правоў школьнай моладзі ці на падставе выпадку з катаваннем. Калі настаўнік хоча засяродзіцца на разглядзе выпадку абмежавання правоў дзяцей, яму трэба замест азнаямлення вучняў з новым выпадкам папрасіць удзельнікаў узгадаць асноўныя факты выпадку, які яны разглядалі ў пачатку занятку. Далейшы разгляд выпадку адбываецца па падобным сцэнары. Гл. дадатковую інфармацыю.**

У гэтай частцы неабходна на аснове нормаў нацыянальнага заканадаўства і міжнародных нормаў, з якімі ўдзельнікі знаёміліся самастойна, прыйсці да аднастайнага і больш поўнага разумення зместу заняткаў.

### 4. Падагульніце занятак (3 хв.).

Пастаўце наступныя пытанні:
- Чаму адны правы чалавека можна абмяжоўваць, а іншыя — не?
- Як вы мяркуеце, ці павялічацца ў будучым выпадкі абмежавання правоў чалавека?
- Ці ведаеце вы прыклады абмежавання правоў чалавека ў Беларусі?
- З якой прычыны розныя дзяржавы абмяжоўваюць нейкія правы чалавека? Прывядзіце прыклады. Ці лічыце вы гэтыя абмежаванні справядлівымі?

## АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ АБ АБМЕЖАВАННІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Асноўная мэта дзяржавы заключаецца ў арганізацыі добрых і справядлівых умоў жыцця людзей. Для гэтага дзяржава ўсталёўвае правілы, якія ў мэтах захавання бяспекі, здароўя, правоў і свабод іншых асоб вызначаюць разумныя абмежаванні правоў і свабод людзей. У сваю чаргу, гарантыі правоў чалавека забяспечваюць разумнасць і прапарцыйнасць любых абмежаванняў правоў і інтарэсаў людзей. У сувязі з гэтым паўстае заканамернае пытанне — што разумець пад «разумнымі» абмежаваннямі і да якой ступені ўлада можа абмяжоўваць правы грамадзян.

Згодна з арт. 23 Канстытуцыі Беларусі абмежаванне законам правоў і свабод магчымае толькі «...ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб». Такая ж магчымасць, але з істотнымі агаворкамі ў частцы правоў і свабод, якія не падлягаюць ніякім абмежаванням, прадугледжана для выпадкаў надзвычайнага становішча.

Артыкул 63 Канстытуцыі Беларусі прадугледжвае пералік правоў і свабод, якія не падлягаюць абмежаванню нават у выпадках увядзення надзвычайнага становішча, які адрозніваецца ад пераліку абсалютных правоў, замацаванага ў п. 1 і 2 арт. 4 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. У Канстытуцыі Беларусі да абсалютных правоў, якія не падлягаюць абмежаванням, аднесены: права на жыццё (арт. 24), свабода ад катаванняў (ч. 3 арт. 25), права на судовае разбіральніцтва і прызнанне віны толькі праз суд (арт. 26), права на свабоду веравызнання (арт. 31). Аднак адсутнічае, напрыклад, замацаванае міжнароднымі нормамі абсалютнае права на свабоду ад рабскай працы.

Рост міжнароднага тэрарызму вымушае міжнародную супольнасць і нацыянальныя органы ўлады прымаць адэкватныя меры па барацьбе з ім. Гэтым у некаторых дзяржавах тлумачыцца неабходнасць абмежаваць асобныя правы і свабоды чалавека на сваёй тэрыторыі. Адным з першых прыкладаў такіх паводзін дзяржаўных органаў з’яўляецца прыняцце па выніках тэрарыстычнага акту 11 верасня 2001 г. Кангрэсам ЗША закона, які атрымаў назву Patriot Act (Акт пра патрыятызм). Гэты дакумент прадугледжвае магчымасць абмежавання шэрагу правоў і свабод грамадзян (напрыклад, пашырэнне паўнамоцтваў спецслужбаў у справе праслухоўвання і запісу тэлефонных размоў, кантролю за электроннай поштай, доступу да банкаўскіх рахункаў, павелічэння тэрміну затрымання падазраваных у тэрарызме іншаземцаў без прад’яўлення абвінавачання і інш.). Падобныя прававыя захады, якія выклікалі шмат крытыкі з боку праваабарончых арганізацый, былі прынятыя і ў Вялікабрытаніі.

Непрадуманыя абмежаванні могуць прывесці да неапраўданага прыцяснення правоў і інтарэсаў людзей. Сапраўды, час ад часу могуць узнікаць сітуацыі, калі дзяржава стаіць перад неабходнасцю ўвядзення абмежаванняў пэўных правоў чалавека. Большасць правоў чалавека ў пэўных, апраўданых абставінамі выпадках (прыродная катастрофа, ваеннае або надзвычайнае становішча) можа падпадаць пад абмежаванні. У гэтых выпадках абмежаванні дапускаюцца толькі на падставе заканадаўства, павінны мець часовы характар, быць адэкватнымі сітуацыі і быць адменены так хутка, як гэта магчыма. Выкарыстанне такіх мераў павінна суправаджацца абмеркаваннем аргументаў, якія павінна прадставіць дзяржава для ўвядзення абмежаванняў. Прычынай для абмежавання правоў чалавека можа стаць толькі сапраўды надзвычайная сітуацыя.

Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод дапускаюць пэўныя абмежаванні, якія тычацца асобных артыкулаў. Напрыклад, артыкул 6 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах дазваляе выкарыстанне смяротнага пакарання там, дзе гэта прадугледжана правам. Але да гэтага міжнароднага дакумента ёсць 2-і факультатыўны пратакол, дзе гаворыцца пра неабходнасць прыняцця ўсіх магчымых захадаў для скасавання смяротнай кары ў якасці меры пакарання.

Асаблівасць праблемы, звязанай з выпадкам, які разглядаецца на занятках, заключаецца ў тым, што катаваць чалавека няма права ні ў якім выпадку, згодна з міжнароднымі нормамі і беларускім заканадаўствам. Катаваць нельга нават у апісаным на занятках выпадку, нават пры ўмове, што міліцыя дакладна ведае, што гэты чалавек тэрарыст і мае патрэбную

інфармацыю. Усе асобы, якія будуць удзельнічаць у катаванні, павінны быць прыцягнуты да адказнасці і будуць прызнаны судом злачынцамі (таксама любая інфармацыя, атрыманая праз катаванне, не можа выкарыстоўвацца ў якасці доказаў падчас суда). Гэты выпадак пабудаваны на канфлікце каштоўнасцяў. Правы чалавека, замацаваныя ў міжнародных і нацыянальных нормах, прыходзяць у канфлікт з каштоўнасцю жыцця асоб, якім пагражае гібель у выніку тэрарыстычнага акту.

Катаванне – супрацьпраўнае дзеянне. Але да таго ж, ад болю чалавек можа прызнацца ў злачынстве, якога не ўчыняў, таму эфектыўнасць гэтага сродка пры расследаванні злачынстваў блізкая да нулю. Барацьба з тэрарызмам, якая вядзецца сусветнай супольнасцю, паставіла пад пагрозу некаторыя правы чалавека (напрыклад, свабоду ад катаванняў, права на справядлівае судовае разбіральніцтва і інш.). Аднак антытэрарыстычныя меры, якія прымаюцца з мэтай абараніць грамадства (асабліва дэмакратычнымі краінамі), не могуць ставіць пад пагрозу самую сутнасць існавання дэмакратыі — правы чалавека. Такія метады барацьбы з тэрарызмам могуць разбурыць палітычныя сістэмы дэмакратычных краін, што якраз і з’яўляецца мэтай тэрарыстаў.

Большасць дзяржаў свету ўзялі на сябе абавязак забараніць катаванні. Дакумент Капенгагенскай нарады Канферэнцыі па чалавечым вымярэнні Нарады па супрацоўніцтве і бяспецы ў Еўропе (НБСЕ) 1990 г. наконт гэтага кажа наступнае:
«(16 Дзяржавы-ўдзельніцы (...)
(16.3) падкрэсліваюць, што ніякія выключныя абставіны, нават стан вайны ці пагроза вайны, унутраная палітычная нестабільнасць ці любое іншае надзвычайнае становішча, не могуць служыць апраўданнем катаванняў.»

Што тычыцца выпадку абмежавання правоў школьнікаў у выніку пагрозы паводкі, то ўлады згодна з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі нормамі ў выпадку надзвычайных сітуацый маюць права абмяжоўваць правы грамадзян, звязаныя з адукацыяй, месцам пражывання, вымушаным перамяшчэннем, абмежаваннем права на свабоду перамяшчэння. Абмежаванні правоў чалавека абавязкова будуць насіць часовы характар — павінны быць дакладна вызначана, калі скончаецца тэрмін дзейнасці дадзеных абмежаванняў. Абмежаванні павінны насіць прапарцыйны характар і не парушаць дадатковых правоў чалавека: калі дзяцей перасялілі, ніхто не мае права ўтрымліваць іх прымусова. Бацькі дзяцей ад пачатку павінны ведаць, што адбываецца з дзецьмі і мець магчымасць у любы момант іх забраць. Дзецям павінны быць арганізаваныя належныя ўмовы пражывання і наладжаны адукацыйны працэс (калі перабыванне ў новым месцы зацягнецца).

На прыкладзе гэтага выпадку трэба паспрабаваць абмеркаваць саму магчымасць абмежавання правоў чалавека, а таксама вызначыць месца і значэнне абсалютных правоў, якія не падлягаюць абмежаванням ні ў якіх умовах.

Існуюць правы чалавека, якія ніколі, ні ў якіх абставінах не могуць быць абмежаваны. Гэта свабода ад катаванняў і свабода ад рабства і працы пад прымусам. Яны пералічаныя ў нацыянальным заканадаўстве большасці краін і ў міжнародных нормах па правах чалавека. Гэтыя правы дзяржава не можа абмежаваць, нягледзячы на любыя сітуацыі. Такое палажэнне стала вынікам асаблівага разумення годнасці асобы, якая заўсёды прыніжаецца з пункту гледжання правоў чалавека падчас выкарыстання катаванняў, рабскай ці прымусовай працы. Трэба памятаць, што толькі разам, толькі ў сістэме асабістыя, грамадзянскія і палітычныя правы складаюць эфектыўную абарону чалавеку і вырачэнне аднаго альбо некалькіх правоў будзе памяншаць альбо можа ўвогуле разбурыць сістэму абароны правоў і свабод чалавека.

У падсумаванне скажам, што міжнародныя нормы па правах чалавека і заканадаўства нават самых развітых і дэмакратычных краін прадугледжваюць магчымасць абмежавання правоў чалавека, але толькі ў дакладна акрэсленых выпадках, калі пад пагрозай знаходзіцца ўся ці значная частка супольнасці. Разам з тым, трэба памятаць, што абмежаванні правоў чалавека дапускаюцца толькі ў межах заканадаўства і заўсёды павінны насіць часовы характар. Акрамя гэтага міжнародная супольнасць вызначыла, што свабода ад рабства і свабода ад катаванняў ніколі і не пры якіх абставінах не могуць быць абмежаваны.

## РАЗДАТАК № 6.1.

**КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** (вытрымкі)

**Артыкул 21.**

Забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з’яўляецца найвышэйшай мэтай дзяржавы.

Кожны мае права на годны ўзровень жыцця, уключаючы дастатковае харчаванне, адзенне, жыллё і пастаяннае паляпшэнне неабходных для гэтага ўмоў.

Дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы.

**Артыкул 23.**

Абмежаванне правоў і свабод асобы дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб.

Ніхто не можа карыстацца перавагамі і прывілеямі, якія супярэчаць закону.

**Артыкул 63**.

Ажыццяўленне прадугледжаных гэтай Канстытуцыяй правоў і свабод асобы можа быць прыпынена толькі ва ўмовах надзвычайнага або ваеннага становішча ў парадку і межах, вызначаных Канстытуцыяй і законам.

Пры ажыццяўленні асобых мер у перыяд надзвычайнага становішча не могуць абмяжоўвацца правы, прадугледжаныя ў артыкуле 24, частцы трэцяй артыкула 25, артыкулах 26, 31 Канстытуцыі.

## РАЗДАТАК № 6.2.

**АРТЫКУЛ 4 МІЖНАРОДНАГА ПАКТА АБ ГРАМАДЗЯНСКІХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАВАХ**

1. У час надзвычайнай сітуацыі ў краіне, калі існаванне нацыі трапляе пад пагрозу і пра якую абвяшчаецца афіцыйна, дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта могуць прымаць захады ў адыход ад сваіх абавязальніцтваў у рамках дадзенага Пакта да той ступені, якая дакладна адпавядае вастрыні сітуацыі, пры ўмове, што такія захады не супярэчаць іншым абавязальніцтвам міжнароднага заканадаўства і не цягнуць за сабой дыскрымінацыі выключна на аснове расы, колеру, скуры, полу, мовы, рэлігіі ці сацыяльнага паходжання.
2. Гэтае палажэнне не можа быць падставай для якіхсьці адступленняў ад артыкулаў 6, 7, 8 (пункты 1 і 2), 11, 15, 16 і 18.
3. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта, якая выкарыстоўвае права на адступленне ад палажэнняў Пакта, мусіць неадкладна паінфармаваць астатнія дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта пра палажэнні, ад якіх яна адступіла, і пра прычыны, якія выклікалі такое рашэнне, праз пасярэдніцтва Генеральнага сакратара ААН. Праз таго ж пасярэдніка дзяржава павінна паведаміць дату, калі дзеянне адступленняў спыняецца.

Заўвага:

Арт. 6. Права на жыццё. Арт. 7 Свабода ад катаванняў. Арт. 8 Свабода ад рабства. Арт. 11 Ніхто не можа быць пазбаўлены волі толькі на той падставе, што ён не ў стане выканаць якоесці дамоўнае абавязальніцтва. Арт. 15. 1. Нікога нельга прызнаць вінаватым у крымінальным злачынстве на падставе якога-небудзь дзеяння ці бяздзеяння, якое не лічылася крымінальным злачынствам паводле нацыянальнага ці міжнароднага заканадаўства ў той час, калі яно ўчынялася. Арт. 16 Кожны чалавек, дзе б ён ні знаходзіўся, мае права на прызнанне яго правасуб’ектнасці. Арт. 18 Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення ці рэлігіі.

**РАЗДАТАК № 6.3.**

**ЕЎРАПЕЙСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ АБ АБАРОНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І АСНОЎНЫХ СВАБОД** (вытрымкі)

**Артыкул 15.** Адступленне ад выканання абавязальніцтваў у надзвычайных сітуацыях

1. У выпадку вайны ці іншых надзвычайных абставінаў, якія пагражаюць жыццю нацыі, кожны з Высокіх Дамоўных Бакоў можа прымаць меры ў адступленне ад яго абавязальніцтваў паводле дадзенай Канвенцыі толькі ў той ступені, у якой гэта абумоўлена надзвычайнасцю абставінаў, пры ўмове, што такія меры не супярэчаць іншым яго абавязкам паводле міжнароднага права.
2. Гэтае палажэнне не можа служыць падставай для якога-небудзь адступлення ад палажэнняў артыкула 2, за выключэннем выпадкаў гібелі людзей у выніку правамерных ваенных дзеянняў, ці ад палажэнняў артыкула 3, пункта 1 артыкула 4 і артыкула 7.
3. Кожны з Высокіх Дамоўных Бакоў, які выкарыстоўвае гэтае права адступлення, вычарпальным чынам інфармуе Генеральнага сакратара Рады Еўропы аб прынятых ім мерах і прычынах іх прыняцця. Ён таксама інфармуе Генеральнага сакратара Рады Еўропы пра дату спынення дзейнасці такіх мер і ўзнаўлення ажыццяўлення палажэнняў Канвенцыі ў поўнай меры.

Заўвага: Арт. 2 Права на жыццё; Арт. 3 Забарона катаванняў; пункт 1 Арт. 4 Ніхто не павінен утрымлівацца ў рабстве ці паднявольным стане, Арт. 7 Пакаранне можа выносіцца толькі на падставе заканадаўства.

**РАЗДАТАК № 6.4.**

**КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** (вытрымкі)

**Артыкул 24.**

Кожны мае права на жыццё. Дзяржава абараняе жыццё чалавека ад любых супрацьпраўных замахаў. Смяротная кара да яе адмены можа прымяняцца ў адпаведнасці з законам як выключная мера пакарання за асабліва цяжкія злачынствы і толькі згодна з прыгаворам суда.

**Артыкул 25.3.**

Ніхто не павінен падвяргацца катаванням, жорсткаму, бесчалавечнаму або зневажальнаму для яго годнасці абыходжанню ці пакаранню, а таксама без яго згоды падвяргацца медыцынскім або іншым доследам.

**Артыкул 26.**

Ніхто не можа быць прызнаны вінаватым у злачынстве, калі яго віна не будзе ў прадугледжаным законам парадку, даказана і ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу. Той, каго абвінавачваюць, не павінен даказваць сваю невінаватасць.

**Артыкул 31.**

Кожны мае права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, асабіста або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, выказваць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў.

**ВЫНІКОВЫ ДАКУМЕНТ ВЕНСКАЙ СУСТРЭЧЫ НАРАДЫ ПА БЯСПЕЦЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВЕ Ў ЕЎРОПЕ (НБСЕ) 1986 г. ,ТРЭЦЯЯ СУСТРЭЧА Ў РАМКАХ ХЕЛЬСІНКСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ**

**(23)** – Дзяржавы-ўдзельніцы будуць (...)

**(23.4)** – забараняць катаванні ды іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для чалавечай годнасці абыходжання і пакарання і прымаць эфектыўныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, судовыя ды іншыя меры па прадухіленні такой практыкі і пакаранні за яе;

**(23.5)** – разглядаць пытанне пра далучэнне да Канвенцыі супраць катаванняў ды іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжальных для годнасці формаў абыходжання ці пакарання, калі яны гэтага яшчэ не зрабілі;

**(23.6)** – абараняць асоб ад любой псіхіятрычнай ці іншай медыцынскай практыкі, якая парушае правы чалавека і асноўныя свабоды, і прымаць эфектыўныя меры па прадухіленні такой практыкі і пакарання за яе.

**ДАКУМЕНТ КАПЕНГАГЕНСКАЙ СУСТРЭЧЫ Ў РАМКАХ КАНФЕРЭНЦЫІ ПА ЧАЛАВЕЧЫМ ВЫМЯРЭННІ НБСЕ, 1990 г.**

**(16)** – Дзяржавы-ўдзельніцы

(...)

**(16.3)** – падкрэсліваюць, што ніякія выключныя абставіны, як то стан вайны ці пагроза вайны, унутраная палітычная нестабільнасць ці любое іншае надзвычайнае становішча, не могуць служыць апраўданнем катавання....

# 7. ЧАЛАВЕК І ДЗЯРЖАВА

(заняткі разлічаны на 90 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- агульную інфармацыю пра тое, што такое дзяржава;
- месца асобы ва ўзаемаадносінах з дзяржавай;
- ролю правоў чалавека ў дачыненнях асобы і дзяржавы.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- тлумачыць сутнасць узаемаадносін паміж чалавекам і дзяржавай.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да дзяржавы як да структуры, якая створана для забеспячэння рэалізацыі правоў і інтарэсаў людзей.

**План заняткаў у фармаце 45 хв.:**

1. Прадстаўленне тэмы і задач — 2 хв.
2. Што такое дзяржава: асацыяцыі ўдзельнікаў — 13 хв.
3. Што такое дзяржава: праца з тэкстамі — 20 хв.
4. Грамадзянін і яго ўзаемадачыненні з дзяржавай — 50 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 5 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Прадстаўце тэму і задачы заняткаў (2 хв.).**

**2. Праз асацыяцыі ўдзельнікаў разгледзьце прыкметы дзяржавы (13 хв.).**
Папрасіце ўдзельнікаў назваць свае асацыяцыі са словам дзяржава.
Запытайце, чаму менавіта такія асацыяцыі ў іх узнікаюць? Удакладняйце па ходу, што ўдзельнікі заняткаў разумеюць пад тымі альбо іншымі важнымі для разумення сутнасці дзяржавы паняццямі. Асацыяцыі можна запісаць на ватмане ці дошцы.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Праблема дачыненняў чалавека і дзяржавы, а таксама сутнасць дзяржавы — цэнтральныя моманты у разуменні правоў чалавека.**
**Важна, каб удзельнікі з самага пачатку засяродзілі сваю ўвагу на тых стэрэатыпах, якія вызначаюць стаўленне асобы да дзяржавы. Варта не проста назваць асацыяцыі, а пасля таго, як яны названыя, папрасіць удзельнікаў пракаментаваць, што яны разумеюць пад гэтымі асацыяцыямі і чаму. Звяртайце асаблівую ўвагу на тое, чаму ўдзельнікі звязваюць тую ці іншую асацыяцыю з дзяржавай.**

**Як правіла, удзельнікі называюць асацыяцыі, звязаныя з прымусам, сілавымі, знешнімі характарыстыкамі, альбо звязаныя з асобнымі дзяржаўнымі пасадамі ці органамі. Напрыклад, сіла, прыгнёт, прымус, войска, міліцыя альбо прэзідэнт, парламент і г. д. У выніку такіх асацыяцый у асоб замацоўваецца ўяўленне пра дзяржаву як пра нешта аддаленае ад людзей, нешта, што стаіць над чалавекам і можа навязваць яму сваю волю. Але гэта памылковы стэрэатып. Згодна з агульнапрынятай міжнароднай практыкай і беларускім заканадаўствам, менавіта народ з'яўляецца адзінай крыніцай улады.**

Але ў гэтай частцы заняткаў варта спыніцца толькі на азначэнні і тлумачэнні стэрэатыпаў адносна дзяржавы.

**3. Праз працу з тэкстам разгледзьце прыкметы дзяржавы (20 хв.).**
Аб'яднайце ўдзельнікаў у некалькі малых груп. Выдайце раздатачны матэрыял 7.1, каб удзельнікі ў групах абмеркавалі інфармацыю аб дзяржаве і ўладзе.
Папрасіце ўдзельнікаў адказаць на наступныя пытанні:
- Як вы зразумелі, што такое дзяржава? Якія дзяржаўныя інстытуты вы можаце назваць?
- Чаму чалавек мае права кантраляваць дзейнасць дзяржавы?
- У чым заключаецца прынцып падзелу ўлады?
- Якім чынам людзі ўплываюць на дзяржаву і дзяржаўную ўладу?
- Якую ролю ў дачыненнях асобы і дзяржавы граюць правы чалавека?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Асноўная задача гэтай часткі заключаецца ў вызначэнні прыроды дзяржавы і палітычнай улады. Удзельнікі павінны зразумець, што дзяржава і ўсе яе механізмы павінны дзейнічаць пад кантролем грамадства і ў інтарэсах людзей. Напрыклад, людзі стварылі дзяржаву для забеспячэння сваіх правоў і інтарэсаў, з гэтага вынікае магчымасць і неабходнасць кантролю над структурай, якую стварылі людзі.**

**Альбо асоба плаціць падаткі і такім чынам утрымлівае ўладу, а значыць, можа патрабаваць справаздачу аб тым, куды дзяржава выдаткавала гэтыя сродкі. Кантроль над дзяржавай чалавек ажыццяўляе як непасрэдна, праз удзел у рэферэндумах, абмеркаваннях законапраектаў, так і ўскосна — праз выбарныя органы ўлады.**

**4. Разгледзьце ўзаемадачыненні грамадзяніна з дзяржавай (50 хв.).**
Папрасіце ўдзельнікаў у тых жа групах намаляваць на ватманах сваё разуменне месца грамадзяніна ва ўзаемаадносінах з дзяржавай.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Мэтай дадзенай часткі занятка з'яўляецца разгляд месца і значэння грамадзяніна ў жыцці дзяржавы. Разглядаць гэтае месца ўдзельнікам прапануецца не на падставе іх стэрэатыпаў, але той дадатковай інфармацыі, з якой яны пазнаёміліся ў раздатку 7.1.**

**Асаблівасць гэтай часткі — стварэнне магчымасцяў для таго, каб удзельнікі творча перапрацавалі сваё стаўленне да дзяржавы не столькі на падставе сваіх стэрэатыпаў, колькі на падставе новага дадатковага матэрыялу.**

**Важна грунтоўна абмеркаваць адносіны паміж асобай і дзяржавай на падставе малюнкаў, зробленых удзельнікамі, суаднесці мастацкія вобразы са стэрэатыпамі, абмеркаваць прычыны ўзнікнення гэтых стэрэатыпаў.**

У час прэзентацыі вынікаў працы груп звяртайце ўвагу на тлумачэнні таго, чаму ўдзельнікі тым ці іншым чынам разумеюць сутнасць паняцця грамадзянін, яго ўзаемадачыненні з дзяржавай і на ролю правоў чалавека ў дачыненнях асобы і дзяржавы.

На гэтым этапе можна таксама падаць дадатковую інфармацыю, змешчаную ніжэй.

**5. Падагульніце занятак (5 хв.).**
Падсумаванне занятка можна правесці вакол наступных пытанняў.
- Ці змянілася ваша стаўленне да гэтага паняцця? Як вы цяпер разумееце сутнасць дзяржавы?
- Як вы разумееце выказванне Кастуся Каліноўскага «Не народ для ўрада, а ўрад для народа!»
- Чаму важныя правы чалавека ў дачыненнях асобы і дзяржавы?

**Дадатковая інфармацыя**

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ПРЫРОДЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ

Існуе некалькі падыходаў да вытлумачэння ролі і значэння чалавека (грамадзяніна) у станаўленні і жыцці дзяржавы. Спынімся тут на дзвюх супрацьлеглых канцэпцыях.

Найбольш распаўсюджанымі ў старажытнасці былі канцэпцыі Боскага паходжання дзяржавы. У адных выпадках кіраўнік дзяржавы разглядаўся як Бог (Старажытны Егіпет) ці пасярэднік паміж светам боскім і зямным (Старажытны Кітай), у другіх — вытлумачвалі, што Бог надзяляе асаблівай уладай кіраўніка дзяржавы (напрыклад, як у сярэднявечнай Еўропе). У кожным з прыведзеных выпадкаў гэта азначала, што асноўнай крыніцай улады з'яўляецца Бог. Бог стварае ўсё на свеце, у тым ліку надзяляе некаторых (абраных) людзей асаблівымі паўнамоцтвамі па кіраванні астатнімі.

Узнікненне канцэпцый боскага паходжання дзяржавы навукоўцы звязваюць з асаблівым шляхам фармавання эканамічных, грамадскіх і палітычных адносін. Гэты асаблівы шлях можна ўмоўна назваць «усходнім» шляхам узнікнення дзяржаўнасці, паколькі ён быў характэрны, як правіла, для першых старажытных дзяржаў, якія ўзніклі на тэрыторыі Азіі ці Паўночнай Афрыкі. Асноўная асаблівасць гэтага шляху ўзнікнення дзяржавы вынікае з прыродных умоў, якія патрабавалі сістэмы дастаўкі вады на палеткі, а значыць, вымагалі асаблівай арганізацыі людзей для падтрымання ірыгацыйных сістэм і вядзення сельскай гаспадаркі. У выніку ў Егіпце, Міжрэччы, Кітаі дзяржаўныя апараты ўзніклі для таго, каб арганізоўваць людзей для стварэння і падтрымання ў дзейнасці складаных інжынерных сельскагаспадарчых сістэм. Гэтыя дзяржаўныя органы прысвоілі сабе права ўласнасці на ірыгацыйныя сістэмы і на зямлю. У выніку былі сфармаваны асаблівыя адносіны паміж дзяржавай і асобай, дзе дзяржава, яе інтарэсы былі вышэйшымі за інтарэсы і патрэбы простых людзей, паколькі вядзенне сельскай гаспадаркі без інжынерных прыстасаванняў, якія знаходзіліся ва ўласнасці дзяржавы, было немагчымым. Перавага інтарэсаў дзяржаўнага апарату была афармлена адмысловымі палітычнымі і філасофскімі канцэпцыямі кіраўніка дзяржавы — Бога, абранніка Бога альбо пасярэдніка паміж Боскім светам і зямным.

Інтарэсы і жаданні Бога з'яўляюцца прыярытэтам для такой дзяржавы. Асоба не можа выступаць супраць такой боскай улады, бо гэтым яна выступае супраць волі Бога. Чалавек не можа патрабаваць ад такой дзяржавы нічога. Ён можа толькі прасіць. Толькі ад волі кіраўніка дзяржавы залежыць задавальненне альбо незадавальненне просьбаў насельніцтва. Роля простага чалавека ў фармаванні палітыкі такой дзяржавы з'яўляецца мінімальнай.

У Старажытнай Грэцыі склаліся іншыя ўмовы ўзнікнення дзяржавы. Асаблівасць вынікала з прыродных умоў і спосабу вядзення сельскай гаспадаркі, калі кожная асобная сям'я здольная была весці самастойную гаспадарку. У выніку спачатку ўзнікае прыватная ўласнасць на зямлю, а дзяржава ўзнікае ў выніку аб'яднання свабодных уласнікаў, якія, каб захаваць свае інтарэсы, ствараюць дзяржаву. Гэты асаблівы шлях узнікнення дзяржаўнасці прынцыпова адрозніваецца ад папярэдне разгледжанага і яго прынята называць «еўрапейскім». З узнікненнем натуральна-прававых тэорый, тэорыі грамадскай дамовы XVIII ст. — у якасці асноўнай крыніцы ўлады пачынаюць разглядаць кожнага чалавека. Гэтыя канцэпцыі зыходзілі з таго, што людзі на нейкім этапе свайго развіцця добраахвотна аб'ядналіся, каб разам стварыць дзяржаву для вырашэння тых пытанняў і праблем, якія не маглі вырашаць індывідуальна. У такой дзяржаве роля і значэнне чалавека з'яўляюцца вызначальнымі. І дзяржава, і яе палітыка цалкам залежаць ад волі і інтарэсаў большасці людзей з улікам меркавання меншасці. Кіраўнікі дзяржавы разглядаюцца толькі як асобы, часова надзеленыя народам нейкімі паўнамоцтвамі.

Спрэчка паміж дзвюма вышэй акрэсленымі пазіцыямі адносна таго, які са спосабаў арганізацыі жыцця людзей найбольш прымальны, пачалася ў старажытнасці і працягваецца да гэтага часу. На нашу думку, прыярытэт павінен аддавацца падыходу, які разглядае асобу як асноўную каштоўнасць і асноўную крыніцу ўлады, паколькі гэтая сістэма з'яўляецца больш эфектыўнай у стварэнні годных умоў для жыцця і творчага раскрыцця асобы ў межах нацыянальных культур.

Згодна з канцэпцыяй АБСЕ свабодная супольнасць, якая стварае магчымасці для ўдзелу ў грамадскім жыцці, з'яўляецца гарантыяй ад канфліктаў і нестабільнасці. Так, адным з прыкладаў можа быць факт, што прыцясненне альбо адлучэнне ад супольнасці асобных людзей ці некаторых груп па этнічных, рэлігійных і іншых прыкметах прыводзіць да росту нестабільнасці і напружання альбо нават да ўзброеных канфліктаў.

Шляхі і спосабы ўплыву людзей на дзейнасць дзяржаўных органаў вызначаюцца міжнароднымі актамі па правах чалавека, а таксама нацыянальным заканадаўствам. Напрыклад, Дакумент Капенгагенскай нарады па чалавечым вымярэнні НБСЕ (Капенгаген 1990 г.) утрымлівае абавязальніцтвы дзяржавы па арганізацыі і правядзенні выбараў, а таксама па стварэнні ўмоў для ўдзелу ў іх грамадзян і забеспячэнні іх свабоднага і свядомага волевыяўлення (гл. занятак 14). Аб формах і спосабах удзелу грамадскасці ў працэсе прыняцця дзяржавай рашэнняў па пытаннях навакольнага асяроддзя гаворыцца ў так званай Орхускай канвенцыі (заняткі 16.1).

Удзел у выбарах — гэта не адзіны законны спосаб удзелу грамадзян у дзейнасці дзяржаўных органаў. Грамадзяне могуць браць удзел у публічных абмеркаваннях законапраектаў, у мясцовых і рэспубліканскіх рэферэндумах, маюць права адклікаць дэпутатаў мясцовага савета ці парламента, права ініцыявання, склікання, удзелу ў дзейнасці Народных сходаў, удзелу ў дзейнасці мясцовых тэрытарыяльных самакіраванняў. Грамадзяне маюць права на арганізацыю і правядзенне масавых мерапрыемстваў (пікетаў, дэманстрацый); складанне зваротаў, скаргаў, заяваў службовым асобам розных узроўняў дзяржаўнай адміністрацыі, займацца праваабарончай і грамадскай дзейнасцю і г. д. Падрабязней аб гэтых і іншых спосабах і магчымасцях удзелу грамадзян у дзейнасці дзяржавы глядзі ў занятках: «Права на чыстае і здаровае навакольнае асяроддзе», «Права на медыцынскае абслугоўванне», «Свабодныя і справядлівыя выбары», «Актыўны грамадзянін», «Дэмакратыя», а таксама дапаможнік «Адстойванне і пашырэнне правоў чалавека праз грамадскі ўдзел».

Такім чынам, грамадзянін мае не толькі права ўдзельнічаць у жыцці краіны і дзейнасці дзяржаўных органаў, але і рэальныя, замацаваныя ў заканадаўстве механізмы такой дзейнасці. Правы чалавека з аднаго боку замацоўваюць права асобы на свабоду, а з другога — акрэсліваюць абавязкі дзяржавы па гарантаванні гэтай свабоды і ступень магчымых абмежаванняў правоў і свабод.

**АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЎЗАЕМАДАЧЫНЕННЯЎ ЧАЛАВЕКА І ДЗЯРЖАВЫ.**

Паняцце *дзяржава* можна разумець у шырокім і ў вузкім сэнсах. У шырокім сэнсе тэрмін *дзяржава* абазначае дзяржаўны апарат, войскі, эканоміку, прыроду, культуру, народ, які знаходзіцца на пэўнай тэрыторыі. У вузкім сэнсе дзяржава — гэта сістэма органаў улады. Іншымі словамі, дзяржава — гэта службовыя асобы і структуры, якія выконваюць акрэсленыя функцыі. Прапануем зыходзіць з вузкага разумення дзяржавы.

Пад дзяржаўнымі органамі трэба разумець вышэйшыя і мясцовыя органы ўлады, а таксама ўстановы, пры дапамозе якіх дзяржаўныя органы падтрымліваюць правапарадак і забяспечваюць абарону правоў і інтарэсаў грамадзян.

Гэта азначае, што прадстаўнікамі дзяржавы з’яўляюцца дырэктар дзяржаўнай школы, служачыя выканаўчага камітэта той пэўнай мясцовасці, дзе вы жывяце, старшыня абласнога выканаўчага камітэта, дэпутат мясцовага Савета ці парламента, прэзідэнт, міністр, міліцыянер, пракурор, суддзя, падатковы інспектар, пажарнік, афіцэр і г. д. Яны не могуць умешвацца ва ўсе сферы жыцця чалавека. Закон абмяжоўвае іх у тым, што яны могуць рабіць, і вызначае, што ім рабіць забаронена. Усе прадстаўнікі дзяржавы могуць дзейнічаць толькі ў тых межах, якія вызначаны законам.

Згодна з Канстытуцыяй Беларусі адзінай крыніцай улады і носьбітам суверэнітэту ў нашай краіне з’яўляецца народ. Гэта значыць, што дзяржава створана грамадзянамі і яны маюць права ўказваць дзяржаве, як трэба рабіць у тым ці іншым выпадку. Асноўная задача ўсіх прадстаўнікоў дзяржавы заключаецца ў тым, каб служыць інтарэсам і патрэбам грамадзян праз стварэнне ўмоў для годнага жыцця людзей.

Народ ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна, праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй. Заканадаўствам вызначана, што чалавек можа ўплываць на рашэнні дзяржавы рознымі шляхамі. Напрыклад, праз удзел у выбарах, праз удзел у дзейнасці палітычных партый ці грамадскіх аб’яднанняў, праз ініцыяванне рэферэндуму і выказванне свайго меркавання на ім, праз адкліканне дэпутата, які не дзейнічае ў інтарэсах людзей, якія яго абралі, праз збор і распаўсюджанне інфармацыі па пытаннях, якія чалавек лічыць важнымі, праз выказванні сваіх меркаванняў у сродках масавай інфармацыі, праз звароты ў суд і г. д.

Права чалавека ўдзельнічаць у дзейнасці дзяржаўных органаў вынікае з той прычыны, што людзі стварылі гэтую дзяржаву, а значыць, маюць права кантраляваць, каб дзяржава дзейнічала ў інтарэсах сваіх стваральнікаў. Акрамя таго, людзі плацяць падаткі, за кошт якіх дзяржаўныя органы могуць дзейнічаць, а гэта азначае, што грамадзяне маюць права ўдзельнічаць у вырашэнні таго, на што могуць быць выдаткаваныя іх грошы, патрабаваць справаздачы аб іх выкарыстанні. Правы грамадзян кантраляваць дзейнасць дзяржаўных органаў замацавана ў законах дзяржавы.

# 8. ТАЛЕРАНТНАСЦЬ У ГРАМАДСТВЕ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
  - што такое талерантнасць;
  - сутнасць і ролю талерантнасці ў жыцці грамадства;
  - як звязана талерантнасць і правы чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
  - дыскутаваць аб праблемах талерантнага / неталерантнага стаўлення беларускай супольнасці да нацыянальных, расавых, рэлігійных меншасцяў і проста іншасці;
  - аргументаваць сваё стаўленне адносна ролі талерантнасці ў міжасабовых адносінах і жыцці грамадства.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
  - да іншасці, разнастайнасці як да каштоўнасці, якая ўзбагачае грамадства, а не пагражае яму;
  - да талерантнасці не як да прыроджанай якасці беларусаў, а як да якасці, якую неабходна выхоўваць, у тым ліку праз навучанне.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне, прадстаўленне тэмы і задач заняткаў — 3 хв.
2. Акрэсленне паняцця *талерантнасць* — 5 хв.
3. Прычыны талерантных і неталерантных паводзін. Самастойная праца — 10 хв.
4. Сутнасць і прырода талерантнасці: дыскусія — 24 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 3 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў, прадстаўце тэму і задачы заняткаў (3 хв.).**
Папрасіце ўдзельнікаў назваць якасці, якія, з іх пункту гледжання, адпавядаюць беларускаму менталітэту, беларускай культуры.

**Тлумачальная інфармацыя**

Як правіла, сярод якасцяў, характэрных для беларусаў, удзельнікі называюць працавітасць, рахманасць, талерантнасць, памяркоўнасць. Гэта асноўныя стэрэатыпы, якія засвоены навучэнцамі з дзяцінства.

Пытанне талерантнасці на занятках трэба разглядаць такім чынам, каб удзельнікі разумелі, што, як правіла, уключэнне талерантнасці ў якасці рысы нацыянальнага характару з'яўляецца толькі стэрэатыпам. Часта ў адносінах беларусаў з іншымі культурнымі, этнічнымі, рэлігійнымі, расавымі групамі праяўляецца іх непрыняцце і неразуменне. Напрыклад, усе добра ставяцца да людзей з іншым колерам скуры, але паспрабуйце запытаць, ці згодны былі б яны, каб іх дзіця, сястра ці брат ажаніліся з афрыканцам ці з асобай мусульманскай веры, і ў выпадках, калі яны не згодны, папрасіце вытлумачыць прычыну нязгоды. Як правіла, рацыянальнага вытлумачэння не існуе. Часта ўсё зводзіцца да банальнага: «Яны іншыя і павінны жыць са сваімі». Як правіла, «сярэднестатыстычны» беларус лічыць прымальным і нармальным існаванне асаблівых інтарэсаў прадстаўнікоў іншых расавых, нацыянальных, этнічных, рэлігійных груп, але толькі ў тым выпадку, калі гэта не чапае яго асабіста.

Па-другое, талерантнасць у беларусаў прынята разглядаць амаль як прыроджаную, неад'емную рысу характару. Але насамрэч талерантнасць — гэта асаблівае стаўленне да прадстаўнікоў іншых нацыянальных, этнічных, культурных, расавых, рэлігійных і іншых груп, якое выпрацоўваецца практыкай узаемадачыненняў. Праявы талерантнасці — гэта не прыроджаныя схільнасці, характэрныя для беларусаў. Гэта каштоўнасці, выпрацаваныя традыцыяй узаемадачыненняў з прадстаўнікамі меншасцяў.

Не трэба знішчаць успрыманне талерантнасці як рысы нацыянальнага характару і даказваць, што гэта не нашая рыса. На занятках варта зрабіць спробу вываду паняцця *талерантнасць* з ірацыянальнага ўспрыняцця як характарыстыкі беларуса, у рацыянальнае — як каштоўнасці, якая закладаецца праз навучанне і неабходна для таго, каб існаваць у сучасным інфармацыйным і дынамічным свеце, дзе ўсё часцей адбываюцца непасрэдныя кантакты розных культур і традыцый.

Прадстаўце тэму і чаканыя вынікі заняткаў.

**2. Акрэсліце і абмяркуйце паняцце талерантнасць (5 хв.).**
Папрасіце ўдзельнікаў прывесці прыклады неталерантнага стаўлення ў іх асабістым атачэнні, у горадзе, у вёсцы, у Беларусі, якія ім вядомы. Абгаварыце прычыны неталерантных паводзін у грамадстве.

Пры дапамозе буры прапаноў папрасіце ўдзельнікаў акрэсліць адным словам тое, што яны разумеюць пад тэрмінам талерантнасць. Варыянты адказаў можна запісаць на ватман ці дошку. Пасля гэтага можна папрасіць удзельнікаў самастойна сфармуляваць, што такое талерантнасць.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Мэта гэтай часткі — выпрацоўка на аснове асабістага досведу ўдзельнікаў паняцця *талерантнасць*, якое ляжыць у аснове заняткаў.**
**Паняцці, якія будуць прапанаваныя ўдзельнікамі, варта абагульніць, пракаментаваць на падставе дадатковага матэрыялу да заняткаў. Запішыце ўзгоднены варыянт паняцця *талерантнасць*, які будзе ўжывацца далей на занятках.**

**3. Праз самастойную працу ўдзельнікаў, разгледзьце прычыны талерантных і нееталерантных паводзін (10 хв.).**

Аб’яднайце ўдзельнікаў у малыя групы (прыкладна па пяць асоб у кожнай). Папрасіце кожную групу выпрацаваць, напрыклад, у адносінах да мусульман:
а) дзве прычыны, чаму чалавек паводзіць сябе талерантна ў адносінах да тых, каго лічыць іншымі,
б) дзве прычыны, чаму чалавек паводзіць сябе неталерантна ў адносінах да тых, каго лічыць іншымі.

**4. Пры дапамозе дыскусіі абмяркуйце сутнасць і прыроду талерантнасці (18 хв.).**

Правесці абмеркаванне сутнасці і прыроды талерантнасці прапануецца пры дапамозе метаду «Акварыум». Для гэтага папрасіце выйсці аднаго прадстаўніка ад кожнай групы, якія працавалі над заданнем. Гэтыя асобы і будуць удзельнічаць у абмеркаванні тэмы, прапанаванай у выглядзе тэзы для дыскусіі. Папярэдзьце ўдзельнікаў, што падчас абмеркавання тэзы яны павінны выкарыстоўваць матэрыялы, напрацаваныя ў сваіх групах.

Усе астатнія ўдзельнікі павінны будуць звяртаць увагу на найлепшыя аргументы, прадстаўленыя ў абарону сваёй пазіцыі, а таксама на найлепшыя прыклады для яе пацвярджэння. Папярэдзьце ўдзельнікаў, што пры канцы абмеркавання будзеце высвятляць, хто з удзельнікаў дыскусіі прыводзіў найлепшыя аргументы і найлепшыя прыклады ў пацверджанне сваёй пазіцыі.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Гэтая частка і наступнае падагульненне абмеркавання з’яўляюцца цэнтральнымі ў ходзе заняткаў. Важна, каб удзельнікі дыскусіі і назіральнікі актыўна ўдзельнічалі ў працэсе абмеркавання праз аргументаванне сваёй пазіцыі, ацэньванне прыведзеных аргументаў і прыкладаў.**

Падрыхтаваныя ў папярэдняй частцы заняткаў прычыны талерантных і неталерантных паводзін павінны дапамагчы ўдзельнікам у фармуляванні аргументаў як за, так і супраць тэзы.

## ТЭЗА ДЛЯ АБМЕРКАВАННЯ

Беларусы — дастаткова талерантныя людзі, таму няма неабходнасці звяртаць увагу на праблемы нацыянальных, рэлігійных і іншых меншасцяў у краіне.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Вышэй прыведзеная тэза абсалютызуе стэрэатып беларусаў як талерантных людзей і стварае магчымасць для абмеркавання некалькіх наступных аспектаў, звязаных з талерантнасцю. 1) Ці сапраўды беларусы талерантныя, ці гэта проста стэрэатып. 2) Ці дастаткова талерантнасці самой сабою, для таго каб грамадства, дзе ёсць нацыянальныя, рэлігійныя і іншыя меншасці, існавала ў нармальных умовах, ці варта падтрымліваць талерантнасць і павагу да іншасці і меншасцяў, напрыклад, праз сістэму адукацыі?**

**Варта звяртаць на гэтыя два аспекты асаблівую ўвагу падчас правядзення і падагульнення дыскусіі. Падчас дыскусіі і яе падагульнення настаўніку ці адукатару варта таксама звяртаць асаблівую ўвагу на выказванні ўдзельнікаў і каментары да гэтых выказванняў. Трэба памятаць, што тэмай заняткаў з’яўляецца талерантнае стаўленне. Гэта азначае, што пры ўзнікненні негатыўных каментароў і прыкладаў варта разгледзець іх падрабязней праз прызму талерантнасці і павагі да іншасці.**

**Увага! Дадзены метад і пытанні, якія задаюцца ўдзельнікам, могуць прывесці да канфліктаў у групе. Таму перад тым, як перайсці да падагульнення дыскусіі, неабходна абавязкова вывесці ўдзельнікаў з роляў. Гэта можна зрабіць, напрыклад, папрасіўшы усіх удзельнікаў рухам рукі зняць умоўныя капелюшы тых асоб, якія займалі нейкую канкрэтную пазіцыю ў дадзеным практыкаванні, і скінуць гэтыя капелюшы на падлогу.**

У час падагульнення дыскусіі высветліце стаўленне да прапанаванай тэзы з боку ўдзельнікаў дыскусіі і назіральнікаў.
Пасля гэтага змястоўнае падагульненне можна правесці з дапамогай наступных пытанняў:
- Ці сапраўды беларусы талерантныя ў адносінах да меншасцяў? Патлумачце свой адказ.
- Ці школы, грамадскія арганізацыі і іншыя інстытуты павінны прыкладаць намаганні для таго, каб да правоў і інтарэсаў нацыянальных, расавых, рэлігійных і іншых меншасцяў ставіліся талерантна? Патлумачце свой адказ.
- Што трэба рабіць для таго, каб выхоўваць талерантнасць? Што вы асабіста можаце зрабіць для таго, каб вы і людзі вакол вас былі больш талерантнымі?

**5. Падагульніце заняткі (3 хв.).**
Выкарыстайце наступныя пытанні:
- Што вы разумееце пад словам талерантнасць?
- Як праяўляецца талерантнасць да іншых? Як і чаму праяўляецца неталерантнасць?
- Як талерантнасць звязана з правамі чалавека?

Дадатковая інфармацыя

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ТАЛЕРАНТНАСЦІ

Правы чалавека — гэта катэгорыя, якая знаходзіцца ў працэсе пастаяннага станаўлення і развіцця. У сувязі з гэтым існуе шмат палажэнняў правоў чалавека, якія змяняюцца пад уплывам знешніх фактараў і развіцця канцэпцыі правоў чалавека. Да такіх палажэнняў належыць і паняцце *талерантнасці*.

Паводле слоўніка, «талерантнасць» (ад лац. tolerantia — цярпенне) — цярпімасць да чужых поглядаў, паводзін, веравызнання (паводле http://slounik.org/93222.html ). Але ў кантэксце правоў чалавека пад талерантнасцю разумеюць не проста цярпімасць, якую можна акрэсліць як нейкую ўнутраную згоду ці кампраміс у стаўленні, напрыклад, да прадстаўніка іншай культурнай традыцыі, але як павагу да чужых поглядаў, паводзін, веравызнання.

Прынцыповая розніца ў дадзеных падыходах заключаецца ў тым, што чалавек не проста павінен дапускаць, што могуць існаваць погляды, традыцыі, культура, веравызнанні, адрозныя ад яго ўласных. Неабходна яшчэ з павагай ставіцца да гэтых поглядаў, традыцый і г. д. А таксама быць гатовым выступаць у іх абарону.

Адным з яскравых прыкладаў талерантных паводзін у сённяшняй Беларусі можна назваць сумеснае святкаванне каталіцкіх і праваслаўных святаў. Напрыклад, на Гродзеншчыне, дзе найбольш яўна выяўляюцца асаблівасці рэлігійных узаемадачыненняў каталіцкай і праваслаўнай царквы, змяшаныя каталіцкія і праваслаўныя вёскі з’яўляюцца хутчэй правілам, чым выключэннем, а ў гарадах распаўсюджанымі з’яўляюцца міжрэлігійныя шлюбы.

Найбольш яўна талерантнасць у паводзінах праваслаўных і каталікоў праяўляецца ў святкаванні Калядаў і Вялікадня. Гэтыя святы ў каталіцкай і праваслаўнай традыцыі, як правіла, адбываюцца ў розныя дні. Гэта вынікае з асаблівасцяў Юліянскага і Грыгарыянскага царкоўных календароў. Часцяком час свята каталіцкага прыпадае на час праваслаўнага паста ці наадварот. І запрашэнне суседам-каталіком праваслаўнага, таксама, як і праваслаўным — каталіка на сваё свята стала традыцыяй у многіх вёсках.

Супольнае святкаванне рэлігійных святаў, нават калі час гэтых святаў можа прыпадаць на час паста, дэманструе не проста прыманне самога факта іншай рэлігійнай традыцыі, а дэманструе яе разуменне. Гэты прыклад можна назваць прыкладам талерантных паводзін, сучаснага разумення талерантнасці, не проста як пасіўнай цярпімасці, а як актыўнага разумення, прыняцця і ўдзелу.

**Талерантнасць** — гэта катэгорыя, якая дапамагае асобе існаваць у грамадстве. Гэта каштоўнасць, якая выхоўваецца і засвойваецца асобай у выніку яе сацыяльнай практыкі. Талерантнасць не з’яўляецца якасцю, якая перадаецца чалавеку ад нараджэння. Гэта азначае, што талерантнасць трэба выхоўваць.

У гісторыі Беларусі часцей складваліся ўмовы, калі народ павінен быў нейкім чынам адаптавацца да пэўнай рэлігійнай, этнічнай, культурнай іншасці, з якой ён сутыкаўся. Так, на працягу ўсяго перыяду хрысціянства на Беларусі захоўвалася шматканфесійнасць.

Гэта не азначала, што канфлікты на рэлігійнай глебе ў нас адсутнічалі. Асабліва моцна міжканфесійныя адносіны абвастрыліся ў часы прыняцця каталіцтва ў якасці дзяржаўнай пануючай рэлігіі, што выклікала супрацьстаянне каталікоў і праваслаўных, увядзенне уніяцтва, перыяд Контррэфармацыі, перавод уніятаў у праваслаўе і г. д. Але ўсе гэтыя канфлікты вымушалі знаходзіць нейкае рашэнне. І такім рашэннем часам быў кампраміс, які замацоўваўся на заканадаўчым узроўні. Напрыклад, прывілеі XV ст. зраўнялі ў правах каталікоў і праваслаўных.

Але талерантнае стаўленне не варта разглядаць выключна ў сувязі з праблемамі ў міжканфесійных стасунках. Пачынаючы з XIV ст. на нашыя землі дзяржавай былі запрошаныя прадстаўнікі такіх рэлігійна-этнічных груп, як яўрэі і татары, колькасць якіх была даволі вялікай. Культура, традыцыі, мова, рэлігія прадстаўнікоў гэтых груп істотна розніліся. Тым не менш, былі выпрацаваны традыцыі талерантнага стаўлення, на якіх было заснавана сужыццё прадстаўнікоў розных народаў, культур і вызнанняў на беларускай зямлі.

Хоць не заўсёды гэтыя адносіны былі ідэальнымі. У нашай гісторыі мелі месца з'явы абмежавання правоў некаторых нацыянальных меншасцяў, паасобныя факты пагромаў і высяленні пэўных этнічных груп. Так, артыкул «Аб цыганах» Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. забараніў апошнім пражываць на землях княства і прадугледжваў штраф за іх укрывальніцтва. Можна прыгадаць і загад вялікага князя Аляксандра аб высяленні яўрэяў 1495 г. Але гэтыя меры насілі, як правіла, часовы характар, а кампраміс замацоўваўся заканадаўча. Ужо ў 1503 г. яўрэям зноў было дазволена сяліцца на беларускіх землях, а статутныя прапановы наконт высялення цыганоў мірна ўжываліся з гарантыямі апошнім «гаспадарскай ласкі», прадугледжанымі пастановай Гродзенскага сойма 1566–1567 гг. (паводле: http://niva.iig.pl/issue/2001/47/art_05.htm ).

Акрамя знешніх фактараў, такіх як шматканфесійнасць і шчыльныя кантакты з рознымі этнічнымі групамі, якія ў працэсе жыццядзейнасці фармавалі традыцыі талерантнага стаўлення да іншасці, на ўкараненне талерантнасці як рысы беларусаў істотна паўплывала дзейнасць адукацыйных устаноў, асабліва ў перыяд Рэфармацыі і Адраджэння. Гэта быў перыяд, калі на палітыка-прававым і філасофскім узроўнях талерантнасць разглядалася як адна з асноў арганізацыі грамадства.

Пытанне талерантнасці з'яўляецца надзвычай актуальным і ў наш час, які характарызуецца дынамікай сацыяльных пераменаў, глабалізацыяй, вальнейшым перамяшчэннем працоўнай сілы. Павялічваецца імавернасць таго, што ў хуткім часе звычайнай справай будзе тое, што побач з намі ў Беларусі будуць працаваць і жыць выхадцы з азіяцкіх, афрыканскіх, амерыканскіх краін, а беларусы, у сваю чаргу, будуць усё часцей выязджаць у краіны з культурай і традыцыямі, якія моцна розняцца ад нашых. Таму талерантнасць застаецца адным з галоўных прынцыпаў, якія дазваляюць выбудоўваць нармальныя ўмовы для развіцця грамадства пры захаванні павагі да правоў людзей, якія належаць да розных расавых, этнічных, рэлігійных і іншых меншасцяў. Ідэя талерантнасці важная і актуальная не толькі для Беларусі, але і для іншых краін і народаў. Так, напрыклад, сацыялагічнае даследаванне адной з вядучых газет Польшчы «Газеты выборчай» паказала, наколькі востра стаяць пытанні талерантнасці ў гэтай суседняй краіне. Даследаванне вылучалася тым, што пытанні рэспандэнтам задаваліся не наўпрост, а ў завуаляванай форме. Напрыклад, пытанне «Як вы ставіцеся да прадстаўнікоў іншых веравызнанняў?» фармулявалася наступным чынам: «Ці хацелі б вы мець начальнікам асобу пратэстанцкага веравызнання?»

Вынікі аказаліся такімі. Толькі 31% рэспандэнтаў выступілі супраць начальніка-асобы з інваліднасцю; толькі 41% быў згодны, каб начальнік быў атэістам ці належаў да Сведкаў Іеговы; на чорнаскурага начальніка пагадзіліся б толькі 45%, толькі для 16% прымальна, каб іх шэф быў нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі. Разам з тым акрэслілася станоўчае стаўленне рэспандэнтаў да кіраўніка-жанчыны. 90% пагадзіліся б мець кіраўніком жанчыну (паводле: http://www.gazetawyborcza.pl/1,82709,4628093.html ).

Цікава, ці дало б такое даследаванне ў Беларусі кардынальна іншыя вынікі? Можаце паспрабаваць правесці падобнае даследаванне сярод сваіх калег. Па дадатковыя матэрыялы па тэме талерантнасці (у тым ліку і адукацыйныя матэрыялы) раім звяртацца да інтэрнэт-рэсурса БДІПЧ АБСЕ, датычнай пытанняў талерантнасці і недыскрымінацыі http://tandis.odihr.pl/index.php?p=home&l=ru

# 9. ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
  - як уплываюць на развіццё адносін паміж чалавекам і дзяржавай такія з'явы, як глабалізацыя, універсалізм, культурная уніфікацыя, глабальнае пацяпленне, развіццё сродкаў камунікацыі і г. д.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
  - растлумачыць, як глабальныя працэсы, якія адбываюцца ў сучасным свеце, уплываюць на развіццё адносін паміж асобай і дзяржавай і на сітуацыю ў галіне правоў чалавека;
  - звязваць асобныя глабальныя працэсы і змяненні сучаснага свету з развіццём правоў чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
  - да правоў чалавека як да дынамічнай сістэмы каштоўнасцяў і механізмаў, якія змяняюцца пад уплывам як унутраных, так і знешніх фактараў жыццядзейнасці чалавека.

**План заняткаў у фармаце 45 хв.**

1. Факусаванне ўвагі і знаёмства з тэмай і чаканымі вынікамі — 3 хв.
2. Разгляд найбольш істотных працэсаў сучаснага свету і іх магчымага ўплыву на развіццё правоў чалавека — 18 хв.
3. Абмеркаванне магчымага ўплыву глабальных працэсаў на развіццё правоў чалавека — 20 хв.
4. Падагульненне заняткаў — 4 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (3 хв.).**
Папрасіце навучэнцаў назваць істотныя змяненні, працэсы, тэндэнцыі сучаснага свету, пра якія яны чулі.

Пасля гэтага абвясціце тэму і чаканыя вынікі дадзеных заняткаў.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Удзельнікі, як правіла, называюць глабальнае пацяпленне, змены ў клімаце, развіццё сістэм сувязі і г. д.**

**Для нас важна, каб удзельнікі проста засяродзілі сваю ўвагу на нейкіх глабальных працэсах, якія ўжо сёння ўплываюць на нашае жыццё, на асобу і яе ўзаемадачыненні з дзяржавай. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на сувязь гэтых працэсаў з правамі чалавека, на ўплыў гэтых працэсаў на катэгорыю правоў чалавека, на магчымае змяненне правоў чалавека, на змяненне стаўлення дзяржавы да чалавека і чалавека да дзяржавы.**

Не засяроджвайцеся на сутнасці адзначаных з'яваў. Разглядаць гэтыя працэсы падрабязней прапануецца праз самастойную працу і на падставе раздаткаў. Варта толькі засяродзіць увагу ўдзельнікаў на сусветным, глабальным характары працэсаў, якія разглядаюцца. Гэта азначае, што яны адбываюцца і аказваюць свой уплыў на ўсёй планеце, а не толькі на нейкай асобнай тэрыторыі ці ў нейкім рэгіёне.

**2. Разгледзьце найбольш істотныя праблемы сучаснага свету і іх магчымы ўплыў на развіццё правоў чалавека (18 хв.).**
Аб'яднайце ўдзельнікаў у пары і раздайце кожнай адзін з чатырох раздаткаў: 9.1, 9.2, 9.3, 9.4. Такам чынам, некалькі параў будуць мець падобныя раздаткі.

У парах удзельнікі павінны:
а) азнаёміцца з раздаткам і абмеркаваць яго,
б) прадумаць тры магчымыя змяненні:
  а) у сферы змянення міжнародных нормаў па правах чалавека;
  б) у сферы міжнародных механізмаў абароны правоў чалавека;
  в) у сферы змянення адносін паміж чалавекам і дзяржавай;
в) падабраць для кожнага са змяненняў (можна назваць гэта ўплывамі) прыклад.

Вынікі працы ў парах па дадзеных пытаннях будуць карыснымі ў час дыскусіі.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Вызначаючы магчымыя змяненні ці ўплывы на правы чалавека, удзельнікі могуць прыйсці да высновы, напрыклад, што могуць з'явіцца новыя міжнародныя дакументы, якія будуць адрозніваца ад тых, што цяпер існуюць альбо што з'явяцца новыя міжнародныяструктуры і г. д. Калі ўдзельнікі скажуць, што нічога не зменіцца, папрасіце іх патлумачыць такую пазіцыю. Важным з'яўляецца пытанне, ці застануцца сучасныя каштоўнасці правоў чалавека (талерантнасць, годнасць, роўнасць і г. д.) і надалей істотнымі вартасцямі для людзей.**

Звяртайце ўвагу навучэнцаў на змяненні канцэпцый правоў чалавека, змяненні самой прыроды адносін паміж асобай і дзяржавай (чалавек будзе атрымліваць усё большыя паўнамоцтвы па кантролі над дзяржавай альбо дзяржава пачне кантраляваць жыццё і дзейнасць асобы, правы чалавека ў выніку гэтых змяненняў будуць пашырацца ці, наадварот, звужацца? чаму?).

У якасці прыклада можна назваць, развіццё электронных камунікацый, якія, з аднаго боку, даюць магчымасць атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю фактычна бескантрольна, а з другога боку, ствараюць умовы для кантролю над месцазнаходжаннем асобы і валодання велізарным аб'ёмам інфармацыі (у тым ліку прыватнага характару) аб кожным асобным чалавеку. Альбо сучасныя біятэхналогіі і кланаванне, у тым ліку чалавека, якія з аднаго боку ствараюць магчымасць для пераадолення праблем здароўя, а з другога — ставяць шмат пытанняў прававога і каштоўнаснага характару, напрыклад аспекты права на асабістае жыццё. Як канцэпцыя правоў чалавека будзе ставіцца да гэтых новых з'яваў? Што яна будзе ўхваляць, а што не? Як будзе пад уплывам гэтых з'яваў змяняцца? Гэта пытанні, якія важна абмеркаваць падчас дыскусіі, а значыць, трэба, каб удзельнікі адпаведна падрыхтаваліся.

Па дадатковую інфармацыяй адносна дакументаў па правах чалавека, міжнародных механізмаў па правах чалавека і канцэпцый правоў чалавека прапануем звярнуцца да наступных заняткаў.
1. Што такое правы чалавека.
3. Дакументы па правах чалавека.
4. Міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека.
5. Нацыянальныя механізмы абароны правоў чалавека.

**3. Абмяркуйце магчымасці ўплыву глабальных працэсаў на развіццё правоў чалавека (20 хв.).**
Абмеркаванне падрыхтаваных у парах магчымых змяненняў правоў чалавека ў выніку глабальных працэсаў правядзіце пры дапамозе PRES-метаду. Вазьміце адзін з глабальных працэсаў, з якімі працавалі пары, і разбярыце яго і яго магчымы ўплыў на правы чалавека па PRES-формуле. Пасля гэтага прааналізуйце і абгаварыце аргументы і прыклады, якія называліся ўдзельнікамі. Аргументы і прыклады, якія ўжо гучалі, не павінны паўтарацца. Пункты гледжання варта не проста агучваць, але абмяркоўваць праз выказванне супрацьлеглых поглядаў, калі такія ёсць. Напрыклад, калі адна з параў выкажа меркаванне аб тым, што глабалізацыя эканамічнага жыцця прывядзе да панавання міжнародных карпарацый, што недэмакратычныя прынцыпы і дзейнасць міжнародных карпарацый будуць уплываць на замену дэмакратычных прынцыпаў як асновы правоў чалавека, будуць вымагаць замены гэтых дэмакратычных прынцыпаў, то неабходна даць слова іншаму ўдзельніку, які па PRES-формуле выкажа супрацьлеглае меркаванне адносна ролі глабалізацыі эканамічнага жыцця, міжнародных карпарацый і прынцыпаў, згодна з якімі яны дзейнічаюць. Дзеля гэтага можна спытаць у ўдзельнікаў ці ёсць нехта, хто мяркуе інача й.

Пасля агучвання ўсіх падрыхтаваных парамі меркаванняў правядзіце падагульненне з дапамогай наступных пытанняў:
- Якія глабальныя працэсы разглядаліся парамі? У чым сутнасць гэтых працэсаў?
- Як гэтыя працэсы могуць паўплываць на правы чалавека?
- Якія з пачутых пазіцый і аргументаў, на вашу думку, найбольш пераканаўчымі?

**4. Падагульніце заняткі (4 хв.).**
Для падагульнення заняткаў можна задаць наступныя пытанні:
- Да якіх зменаў прывядуць разгледжаныя глабальныя працэсы: да ўніфікацыі культурнай, рэлігійнай і іншай ідэнтычнасці ці да захавання культурных, рэлігійных асаблівасцяў (культурна-дыферэнцаванай самаідэнтычнасці)? Патлумачце свой адказ.
- У сувязі з некаторымі разгледжанымі тэндэнцыямі, роля і ўплыў правоў чалавека ў свеце будзе расці ці меншаць?

Тлумачальная інфармацыя

**Як падчас падагульнення абмеркавання магчымага ўплыву глабальных працэсаў на развіццё правоў чалавека, так і падчас агульнага падагульнення, актыўна выкарыстоўвайце для каменціравання дадатковыя матэрыялы і матэрыялы раздаткаў. Сёння цяжка сказаць з большай ці меншай верагоднасцю, як будуць развівацца правы чалавека, і які ўплыў на іх развіццё зробяць глабальныя працэсы. Для мэтаў заняткаў важна, што гэтыя пытанні будуць уздымацца і дыскутавацца. З аднаго боку, гэта створыць умовы для ўвязвання нейкіх знешніх, у дадзеным выпадку — глабальных працэсаў з працэсам развіцця правоў чалавека, а з другога — дасць магчымасць абмеркаваць магчымыя сцэнары развіцця канцэпцыі правоў чалавека. У выніку ўдзельнікі будуць разумець, што правы чалавека — гэта не статычная, закасцянелая, канчаткова сфармаваная сістэма, а наадварот, — адкрытая і дынамічная структура і канцэпцыя.**

Дадатковая інфармацыя

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ГЛАБАЛЬНЫХ ПРАЦЭСАЎ

Глабальнымі на сённяшні дзень, як правіла, называюцца працэсы, уплыў якіх мае сусветны характар і адчуваецца ў любой частцы свету. Глабальныя працэсы з’яўляюцца знешнімі аб’ектыўнымі фактарамі, пад уздзеяннем якіх змяняюцца эканамічныя, палітычныя, культурна-рэлігійныя, сацыяльныя адносіны. Змена гэтых аспектаў прыводзіць да рэальнага змянення адносін паміж чалавекам і дзяржавай і такім чынам уплывае на катэгорыю правоў чалавека, якая сталася істотным элементам існавання дзяржаў і грамадстваў. Дзяржава, жадаючы падкрэсліць сваю цывілізаванасць, дэкларуе асаблівае стаўленне да праблем правоў чалавека і іх абароны. Парушэнні правоў чалавека становяцца нават прычынай міратворчых ваенных аперацый пад эгідай міжнародных арганізацый, што таксама ў пэўным сэнсе з’яўляецца праявай глабалізацыі, бо яшчэ 20 гадоў таму такі падыход быў немагчымы.

Меркаванні адносна працэсаў глабалізацыі можна ўмоўна падзяліць на дзве часткі: адны лічаць, што працэсы глабалізацыі станоўча паўплываюць на адносіны паміж чалавекам і дзяржавай. Гэта значыць, што будзе адбывацца пастаянны рост ролі і значэння правоў чалавека ва ўнутранай і замежнай палітыцы дзяржаў. Іншыя трымаюцца думкі, што глабальныя працэсы прывядуць да пагаршэння сітуацыі ў галіне правоў чалавека. Гэта можа адбыцца альбо ў выніку змяншэння ролі і значэння дзяржавы разам з узвышэннем ролі і значэння буйных бізнес-карпарацый. Альбо ў выніку павелічэння ролі і значэння дзяржавы, што асабліва звязваецца з развіццём спосабаў кантролю за інфармацыяй.

Сярод магчымых небяспек глабальных працэсаў называюць магчымасць знікнення культурных і іншых асаблівасцяў, захаванне якіх сёння гарантуецца дакументамі ў галіне правоў чалавека. Другія кажуць пра тое, што дзякуючы тэхнічнаму і інфармацыйнаму развіццю асаблівасці не толькі не будуць сцёртыя, але і замацуюцца на новым узроўні.

Першая група меркаванняў прагназуе паступовую ўніфікацыю адносін, спосабаў паводзін, арганізацыі жыцця людзей ва ўсім свеце. Уніфікацыя азначае паступовае сціранне рэгіянальных, культурных, традыцыйных, рэлігійных, расавых і іншых асаблівасцяў на карысць адзіных, агульнапрынятых стандартаў. Прагназуецца, што гэта стане вынікам уніфікацыі эканамічных адносін і ўмоваў, глабалізацыі бізнесу, калі асноўная маса нацыянальных кампаній стане часткай транснацыянальных карпарацый. Для спрашчэння ўмоваў вядзення гаспадарчай дзейнасці, для эканамічнай эфектыўнасці і спрашчэння карыстання прадукцыяй прасцей рабіць прадукты ўніфікаванымі, такімі, каб іх можна было абслугоўваць у любым кутку свету. Эканамічная ўніфікацыя будзе спалучацца з уніфікацыяй іншых адносін у грамадстве. Прасцей будзе карыстацца адзінымі сродкамі сувязі, адзінымі сродкамі масавай інфармацыі. Усё гэта і будзе спрыяць сціранню асаблівасцяў і прыводзіць да ўсё большай аднастайнасці.

Другая група меркаванняў зыходзіць з таго, што людзі захаваюць свае рэгіянальныя, культурныя і іншыя адметнасці. Гэта будзе здзейснена дзякуючы таму, што інфармацыйныя і камунікатыўныя тэхналогіі дасягнуць такой ступені развіцця, калі знікнуць ўмовы для асіміляцыі (перайманне, засваенне чужой мовы і чужой культуры як сваіх). Ужо сёння, знаходзячыся ў Індыі, Беларусі альбо ў Паўднёвай Афрыцы, не выходзячы са свайго дома праз Інтэрнэт можна працаваць на міжнародныя карпарацыі і бізнес-структуры Аўстраліі, ЗША ці большасці іншых краін. Кітаец, які жыве ў Злучаных Штатах, можа пражыць там усё жыццё ў кітайскім раёне і зусім не ведаць англійскай мовы. Прычым яго традыцыі, спосаб і арганізацыя жыцця, нават культура харчавання могуць не розніцца ад тых, да якіх ён прызвычаіўся яшчэ ў Кітаі ў маленстве.

Дзякуючы сродкам сувязі і транспартным сродкам не будзе неабходнасці разрываць сувязі з людзьмі, якія знаходзяцца ад нас нават на дзесяткі тысяч кіламетраў. Глабалізацыя харчовай прамысловасці, глабалізацыя бізнесу можа таксама спрыяць захаванню асаблівасцей, а не уніфікацыі.

Праблема глабалізацыі абвастрыла пытанне ўспрыняцця правоў чалавека ў свеце. Пачалі вымалёўвацца 2 падыходы да правоў чалавека ў свеце — рэлятывізм, які кажа, што досвед чалавека рэлятыўны, г. зн. адносны і залежыць, напрыклад, ад таго, у якіх умовах і ў якім асяроддзі чалавек жыў і выхоўваўся, ад асаблівасцей культуры і рэлігіі, і ўніверсалізм, які кажа, што любы чалавек — гэта істота, якая мае аднолькавыя якасці і характарыстыкі незалежна ад таго, да якой культуры адносіцца ці дзе ён пражывае. Рэлятывізм падкрэслівае неабавязковы характар правоў чалавека, які залежыць ад абставінаў жыцця чалавека (залежыць ад традыцый, культуры, рэлігіі). Універсалізм наадварот, адстойвае ідэю прыроджанай годнасці кожнага чалавека і ўніверсальнасці правоў чалавека, незалежна, напрыклад, ад культуры і рэлігіі.

Акрамя праблем і пытанняў, звязаных з глабалізацыяй, існуюць іншыя, не менш істотныя праблемы, якія могуць паўплываць як на адносіны паміж чалавекам і дзяржавай у кожнай асобнай дзяржаве, так і на міжнародную сістэму і механізмы правоў чалавека, а таксама на ўзаемаадносіны паміж людзьмі.

Возьмем праблему глабальнага змянення клімату. Усё больш адчуваецца змяненне кліматычных асаблівасцяў. Сярэдняя тэмпература па планеце вырасла. Частка тэрыторый пад уздзеяннем тэмпературы ператвараецца ў паўпустыні ці пустыні. Паводле прагнозаў асобных аналітыкаў, калі сярэдняя тэмпература будзе расці і надалей такімі тэмпамі, то ўжо ў 2020 г. частка Іспаніі і Францыі можа ператварыцца ў пустыню. Усё часцей надвор’е ў розных кутках планеты робіцца непрадказальным і нават анамальным для канкрэтных мясцовасцяў. Больш частымі сталі розныя прыродныя катаклізмы.

Змяненне клімату, на думку асобных даследчыкаў, можа прывесці да магчымасці гаспадарчага выкарыстання значных паўночных тэрыторый, якія сёння не выкарыстоўваюцца (зона вечнай мерзлаты).
Пацяпленне клімату пры пагаршэнні ўмоў вядзення сельскай гаспадаркі ў шэрагу краін палепшыць гэтыя ўмовы ў іншых. Гэта азначае, што людзі, што жывуць у гэтых рэгіёнах, маюць рэальны шанец палепшыць умовы свайго існавання.

Разам з тым некаторыя даследчыкі лічаць, што глабальнае змяненне клімату можа пагражаць эканамічнай устойлівасці і нават існаванню чалавецтва. Эканамічнае развіццё і асабліва развіццё сельскай гаспадаркі можа не вытрымаць карэннай перамены клімату, што можа прывесці да ўзнікнення праблемы харчовага забеспячэння грамадства асобных рэгіёнаў планеты. Глабальнае пацяпленне можа прывесці да раставання ледавікоў і падняцця ўзроўню сусветнага акіяна, што можа паставіць пытанне аб існаванні чалавецтва ў цэлым.

Як будзе паводзіць сябе палітычная ўлада ці дзяржава ва ўмовах магчымай пагрозы знішчэння чалавецтва ці паступовага пагаршэння эканамічных умоў? Дзеля ратавання людзей карэнным чынам змяніць сваё стаўленне да чалавека, якое сёння павінна грунтавацца на прынцыпах правоў чалавека, і цалкам падпарадкуе яго сваёй уладзе? А можа, перадасць большыя паўнамоцтвы ў прыняцці рашэнняў чалавеку? Пытанняў застаецца шмат.

Асноўная мэта гэтых заняткаў — не даць адназначныя адказы на пастаўленыя пытанні, а прадэманстраваць залежнасць правоў чалавека ад усяго комплексу адносін на планеце. А таксама стварыць магчымасць для абмеркавання далейшых шляхоў развіцця канцэпцыі правоў чалавека.

**РАЗДАТАК № 9.1.**

## ПРАЦЭСЫ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ І АДНОСІНЫ ЧАЛАВЕКА І ДЗЯРЖАВЫ

Развіццё эканомікі, пашырэнне гандлю паміж рознымі краінамі, спецыялізацыя ў вытворчасці асобных відаў тавараў прыводзіць да пранікнення аднолькавых тавараў у любыя куткі свету. Сёння і ў Афрыцы і ў Амерыцы, у Еўропе і ў Аўстраліі людзі носяць падобную адзежу, слухаюць падобную музыку, глядзяць тыя самыя фільмы, ядуць падобную ежу. Гэта — праява глабалізацыі.

Некаторыя даследчыкі кажуць, што паступова фармуецца новая наднацыянальная глабальная культура, дзе чалавек не будзе сябе звязваць з нейкай нацыяй, этнічнай групай ці нейкай канкрэтнай дзяржавай і тэрыторыяй пражывання.

Другія лічаць, што глабальныя працэсы ствараюць умовы для таго, каб, наадварот, захоўваць сваю нацыянальную культуру. Бо для італьянца есці ў італьянскую ежу магчыма не толькі ў Італіі, але і ў любым кутку свету. Для амерыканца глядзець свае фільмы можна па ўсім свеце, для англічаніна — чытаць свае кнігі і г. д. Дзякуючы тэлефону і інтэрнэту мы можам, знаходзячыся за тысячы кіламетраў, быць у курсе ўсіх праблем у нас у хаце.

Працэсы глабалізацыі ўплываюць на развіццё катэгорыі правоў чалавека. Паняцце правы чалавека паўстала як сфера вылучэння нейкіх універсальных каштоўнасцяў, якія тычацца любога чалавека незалежна ад яго культуры. Але паступовае пашырэнне глабалізацыі прыводзіць да ўсё большага супраціўлення глабальным працэсам (як негатыўным, так і пазітыўным), якія адбываюцца ў эканоміцы, культуры і рэлігіі, і ў тым ліку — супраціўленне пашырэнню ідэі правоў чалавека ў свеце.

Ужо сёння цэлы шэраг дзяржаваў, пераважна ісламскага свету, выступае супраць ўніверсальнага характару правоў чалавека. Яны лічаць, што правы чалавека паўсталі ў выніку развіцця заходнееўрапейскай цывілізацыі, характэрны толькі краінам Заходняй Еўропы. Таму, з іх пункту гледжання, некаторыя палажэнні правоў чалавека супярэчаць культурным і рэлігійным асаблівасцям, напрыклад, ісламскіх народаў і не могуць разглядацца як абавязковыя для ўсіх. Так напрыклад, у некаторых культурных і рэлігійных традыцыях мужчыны не разумеюць і не хочуць ураўнання жанчын ў правах і свабодах з мужчынамі і г. д.

Якая з тэндэнцый: універсальнасць правоў чалавека ці спецыфіка культурных і рэлігійных фактараў, якія робяць правы чалавека закладнікамі тых рамак, у якіх знаходзіцца чалавек, пераможа ў будучым працэсе развіцця правоў чалавека?
Як будуць выглядаць у будучым правы чалавека ў сувязі з такім супрацьстаяннем?

## НАВУКОВЫ ПРАГРЭС І АДНОСІНЫ ЧАЛАВЕКА І ДЗЯРЖАВЫ

Навуковы прагрэс можа ўжо ў недалёкай будучыні прывесці да новай тэхнічнай рэвалюцыі. Ужо сёння ўсё часцей можна пачуць пра наступ тэхналогій і робататэхнікі, пра ўсё часцейшае выкарыстанне робатаў і камп'ютараў не толькі ў вытворчасці, на прадпрыемствах, але і ў галіне гандлю і абслугоўвання насельніцтва. Гэтая сітуацыя можа прывесці да прынцыповай змены ролі чалавека, калі чалавек не будзе цалкам запатрабаваны ў цыкле вытворчасці і абслугоўвання патрэб людзей. Роля чалавека застанецца значнай у галіне творчасці, тэхнічных інавацый, магчыма, мастацтве, у тых сферах, дзе робаты на сённяшні дзень не здольны канкураваць з людзьмі.

З другога боку, навуковы прагрэс вядзе да развіцця разнастайных біялагічных тэхналогій. Ужо сёння трансплантацыя органаў развіта на дастаткова высокім узроўні. У чым будзе заключацца роля дзяржавы, калі ДНК кожнага чалавека будзе вядомым і будзе магчымасць з самага маленства «праграмаваць дзяцей» ад асобных хваробаў ці змяняць іх гены такім чынам, каб гэта было карысна грамадству ці дзяржаве? Дзяржава зможа мець магчымасць «канструяваць» і «вырошчваць», праз умяшальніцтва ў ДНК, такіх грамадзян, якія былі б для яе карыснымі?

У будучыні можа змяніцца і роля чалавека ў адносінах з дзяржавай. Можа быць, чалавек будзе мець значна больш вольнага часу, які здолее выкарыстоўваць на ўладкаванне свайго жыцця і дабрабыту. Значыць, роля дзяржавы можа быць зведзена да сервіснага абслугоўвання патрэб чалавека, дзе асноўнай задачай дзяржавы будзе стварэнне максімальна камфортных умоў для раскрыцця патэнцыялу чалавека.

Але дзяржава мажліва будзе вызвалена ад неабходнасці дбаць пра чалавечы рэсурс, які часам разглядае як матэрыял для выканання дзяржаўных патрэб. Якім чынам можа змяніцца стаўленне да чалавека з боку дзяржавы ва ўмовах, калі дзяржава пачне разглядаць чалавека як непатрэбны цяжар?

Як навуковы прагрэс ў галіне робататэхнікі і біятэхналогіі можа паўплываць на далейшае развіццё адносінаў паміж асобай і дзяржавай?
Да якіх зменаў у галіне правоў чалавека гэтыя новыя з'явы могуць прывесці?

## РАЗВІЦЦЁ СРОДКАЎ ЭЛЕКТРОННЫХ І ТРАНСПАРТНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

Прыкметай нашага часу з'яўляецца мабільнасць. Мабільнасць азначае, што сродкі камунікацыі, а таксама транспартныя сродкі на сучасным этапе развіцця робяць магчымай камунікацыю практычна з любымі куткамі планеты. Практычна кожны чалавек, незалежна ад таго, дзе ён жыве, дзякуючы электронным камунікацыям і транспартным сувязям атрымаў магчымасць жыць, працаваць ці вучыцца ў любым кутку планеты, асабліва пры веданні моваў.

Асобныя даследчыкі лічаць, што развіццё сучасных камунікацый зблізжае свет, робіць яго больш адкрытым, адкрывае новыя магчымасці. Дзякуючы электронным і транспартным камунікацыям сёння малады чалавек, які жыве ў Оршы, Маладзечна, Брэсце ці Глыбокім можа навучацца дыстанцыйна ў Нью-Йоркскім універсітэце. Мабільнасць можа стварыць умовы, калі чалавек, нават доўгі час жывучы далёка ад сваёй культуры, можа пастаянна знаходзіцца ў яе атачэнні, дзякуючы Інтэрнэту, транспартным камунікацыям, спадарожнікаваму тэлебачанню і г. д.

Разам з тым некаторыя даследчыкі лічаць, што развіццё камунікацый не толькі стварае выгоды, але і забяспечвае унікальную магчымасць для дзяржавы ўсталяваць кантроль практычна над кожным чалавекам і практычна ў любую хвіліну на працягу сутак. Гэта можна рабіць праз адсочванне званкоў з мабільнага тэлефона, адсочванне інтэрнэт-трафіка персанальных камп'ютэраў, відэаназіранне на вуліцах і ў памяшканнях, над агульнымі інфармацыйнымі базамі персанальных дадзеных і г. д. А дзякуючы электронным сродкам масавай інфармацыі можна паспяхова ўплываць на фармаванне думкі вялікіх груп насельніцтва.

Невялікае ўзрастанне небяспекі тэрарыстычнай актыўнасці прывяло да абмежавання правоў і свабод грамадзян у шмат якіх дзяржавах, з магчымасцю праслухоўваць тэлефонныя размовы, з магчымасцю чытаць асабістую перапіску шырокага кола людзей, неабавязкова звязаных з тэрарыстычная дзейнасцю.

У некаторых краінах (напрыклад, Кітаі) ад правайдэраў інтэрнэту патрабуюць прадстаўляць інфармацыю, якая тычыцца асабістай перапіскі праз пошту. Ва ўсім свеце вядомы выпадак, калі ўлады Кітая дабіліся ад правайдэра электроннай пошты са Злучаных штатаў Yahoo! перадачы ўладам інфармацыі аб паштовай скрыні, з якой была разасланая па ўсім свеце ўрадавая інструкцыя, што забараняла ўзгадванне ў СМІ аб надыходзячай пятнаццатай гадавіне расстрэла студэнцкай дэманстрацыі на плошчы Цяньаньмэнь. У выніку грамадзянін Кітая Шы Тао, які выслаў гэтую інструкцыю, быў асуджаны на 10 гадоў зняволення.
Летам 2010 года кампанія Google была вымушана пагадзіцца з патрабаваннем уладаў Кітая аб цэнзуры пошукавых запытаў на сваім інтэрнэт-партале (напрыклад, у Кітаі заблакаваныя ключавыя словы, звязаныя з Тыбетам альбо студэнцкімі пратэстамі на плошчы Цяньаньмэнь).

- Як развіццё электронных сродкаў сувязі можа паўплываць на далейшае развіццё адносінаў паміж асобай і дзяржавай?

- Да якіх зменаў у галіне правоў чалавека гэтыя новыя з'явы могуць прывесці?

## ТЭХНАГЕННЫЯ ПРАБЛЕМЫ

У наш час усё часцей здараюцца катастрофы тэхнагеннага характару (аварыі на атамных электрастанцыях, «веерныя» адключэнні электрычнасці, калі ў ЗША ці Расіі адключалася на некалькі гадзін усё цэнтралізаванае энергазабеспячэнне ў буйных гарадах, разрывы газаправодаў і нафтаправодаў і г. д.). Гэта звязана як з працяглым тэрмінам эксплуатацыі тэхнічных прыстасаванняў, так і з пастаянным ростам попыту на энергарэсурсы, што выклікана ростам эканамічнай магутнасці асобных краін і рэгіёнаў.

Некаторыя даследчыкі лічаць, што тэхнагенныя праблемы могуць прывесці да глыбокага эканамічнага крызісу і нават паставіць пытанне аб існаванні чалавецтва. Так, у выніку тэхнагенных катастроф могуць быць выведзены з ужытку значныя сельскагаспадарчыя тэрыторыі. Аварыі кшталту чарнобыльскай могуць прывесці да фізічнага вынішчэння значнай колькасці людзей у асобных рэгіёнах.

З другога боку, тэхнагенныя катастрофы, як напрыклад, Чарнобыльская катастрофа мае доўгатэрміновае ўздзеянне як мінімум на насельніцтва Беларусі, часткі Украіны і часткі Расіі.

Да якіх вынікаў прывядзе працяглае ўздзеянне радыяцыі, не ведае ніхто, нават навукоўцы, якія займаюцца гэтай праблемай. Больш за тое, падобная аварыя можа паставіць пад пагрозу выжыванне чалавека на зямлі як гатунку.

Разам з тым, развіццё тэхнічных прыладаў дазваляе канструяваць прынцыпова новыя матэрыялы, выкарыстанне якіх, магчыма, не будзе патрабаваць такіх вялікіх, як сёння, выдаткаў энергіі, напрыклад, на ацяпленне жылля. Тэхнічнае развіццё можа прывесці да вырашэння шэрагу глабальных праблем (напрыклад, энергетычнай). Тэхнічны прагрэс таксама робіць магчымым далейшае развіццё чалавецтва.

Як развіццё тэхнікі і звязаныя з такім развіццём тэхнагенныя праблемы могуць паўплываць на далейшае развіццё адносінаў паміж асобай і дзяржавай?
Да якіх зменаў у галіне правоў чалавека гэтыя новыя з’явы могуць прывесці?

# ЧАСТКА II. АСОБНЫЯ ПРАВЫ І СВАБОДЫ ЧАЛАВЕКА

## 10. ПРАВА НА ЖЫЦЦЁ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- агульную інфармацыю аб паняцці права чалавека на жыццё;
- міжнародныя стандарты ў галіне права на жыццё.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- аргументаваць важнасць права на жыццё;
- растлумачыць сваю пазіцыю адносна магчымасці скасавання смяротнага пакарання ў Беларусі.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да права на жыццё як да падставовага права, без забеспячэння якога немагчыма абараняць ніякія іншыя правы і свабоды.

**План заняткаў у фармаце 45 хв.**

1. Факусаванне ўвагі — 6 хв.
2. Знаёмства з тэмай і задачамі заняткаў — 1 хв.
3. Абагульненне інфармацыі пра права на жыццё — 5 хв.
4. Падрыхтоўка да абмеркавання пытання смяротнага пакарання — 10 хв.
5. Абмеркаванне пытання смяротнага пакарання ў парах — 10 хв.
6. Агульная дыскусія па пытанні смяротнага пакарання — 10 хв.
7. Падагульненне заняткаў — 3 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (6 хв.).**

Для факусавання ўвагі ўдзельнікаў прапануецца зачытаць урывак з твора.

*Урывак з навукова-фантастычнага твора «Жыццё людзей» французскага пісьменніка Андрэ Маруа, у якой апісваюцца назіранні жыхароў планеты Уран за Зямлёй і яе жыхарамі. Прыводзіцца урывак з трактата акадэміка А.Е. 17.*

**УРЫВАК З ТВОРУ**

«Пры дапамозе звычайнага тэлескопа на паверхні малых планет і, у прыватнасці, на Зямлі, можна ўбачыць плямы. Толькі пасля вынаходніцтва супертэлескопа стала зразумела, што мы маем справу са скопішчам жывой матэрыі. Вядомыя назіральнікі, як напрыклад, Н.-33, сцвярджалі тады, што гэтыя скопішчы — зграі жывёлін, якія вядуць агульны спосаб жыцця. З дапамогай сучасных апаратаў удалося высветліць не толькі, што гэта індывідуумы, але і тое, што яны адрозніваюцца паміж сабою і робяць пэўныя рухі. Плямы, якія заўважыў Н.-33, насамрэч аказаліся велізарнымі гнёздамі. ...Мы далі ім назву — «чалавечыя мурашнікі».

У гэтых гарадах жывуць маленькія істоты — людзі. Гэта двухногія бяскрылыя сысуны з нязначным валасяным покрывам на целе, якое звычайна ахінаецца штучнымі матэрыяламі.

...Некаторыя даследчыкі ўзялі сабе за моду прыпісваць гэтым зямным лічынкам розум, які па сваёй прыродзе нібыта такі, як і ў нас, уранцаў.

Сапраўды, калі ўпершыню назіраеш за гэтым жэле і бачыш тысячы жывых цікавых сцэн: доўгія вуліцы, па іх ходзяць людзі, яны часам спыняюцца і, здаецца, нават разумеюць адзін аднаго, ... ці захапляешся працай будаўнікоў, — то ўсё гэта ўяўляецца такім прыгожым спектаклем, што сапраўды можа здацца, нібы людзі такі надзелены нейкім розумам. Аднак каб дасканала вывучыць псіхічныя здольнасці гэтых жывёлін, ...трэба эксперыментаваць і ствараць навуку толькі на аснове фактаў.

...Як толькі мы пачалі выкарыстоўваць промні, значна лягчэй стала праводзіць эксперыменты на далёкай адлегласці, бо дзякуючы прамяням мы атрымалі магчымасць падхопліваць целы, маніпуляваць імі і нават пераносіць з аднаго месца ў другое. Аднак людзі — істоты

вельмі маленькія, кволыя, і выпрабаванне на іх промняў — справа грубая і жорсткая. Таму спачатку некаторыя людзі гінулі ў час эксперыментаў. Спатрэбіліся звышдакладныя выпрамяняльныя прылады, каб дасягаць аб'екта назірання і абыходзіцца з ім з патрэбнай асцярожнасцю. У прыватнасці, калі мы пачалі пераносіць людзей з аднаго месца ў другое, то спачатку не ўлічвалі супраціўлення гэтых істот. Мы пераносілі іх занадта хутка праз паветраныя слаі, якімі акружана Зямля, і людзі задыхаліся. Мы былі вымушаныя стварыць такую ўстаноўку, у сярэдзіне якой шкодныя эфекты ад хуткасці перамяшчэння не ўспрымаліся...»

*Паводле http://knihi.com/zamlitra/marua/zyccio.html са скарачэннямі.*

Пасля прачытання тэксту можна задаць наступныя пытанні:
- Чаму апісаныя ў творы жыхары планеты Уран з такой непавагай ставяцца да жыцця людзей?
- Ці лічыце вы дапушчальным, каб да жыцця чалавека ставіліся так грэбліва, з такой непавагай? Чаму?
- Назавіце прычыны, па якіх жыццё чалавека варта абараняць.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Дадзеная частка павінна ў даволі жорсткай форме прадэманстраваць удзельнікам розніцу ў стаўленні да жыцця і лёгкасць, з якой можна ставіцца да жыцця чалавека, калі не разглядаць яго як істоту, якая мае адпаведныя годнасць і розум, прадэманстраваць, што калі чалавека не надзяляць гэтымі якасцямі, то ён становіцца просты рэччу, прыдатнай для чаго заўгодна, напрыклад, для навуковых эксперыментаў. Сітуацыя, апісаная ў творы, — фантастычная і не мае нічога супольнага з рэчаіснасцю, але пры атаясамленні кожным з удзельнікаў сябе з прадстаўніком чалавецтва, жыццё якога не мае ніякага значэння, неабходна звярнуць увагу на важнасць і каштоўнасць жыцця чалавека. Пры гэтым дэманструецца адна з прычынаў, па якой можна апраўдаць адбіранне жыцця ў іншага — ён не такі, як мы, ён іншы, ён забойца, ён крыважэрны, ён звер (амаль так, як ў гэтым творы).**

Гэтыя заняткі пабудаваны такім чынам, што першапачаткова ствараюцца ўмовы, калі ўдзельнікі сканцэнтруюць увагу на важнасці жыцця чалавека, а пазней павінны будуць разбіраць казус, звязаны з забойцам, істотнасць і важнасць жыцця якога для многіх не з'яўляецца бясспрэчнай катэгорыяй.

**2. Азнаёмце ўдзельнікаў з тэмай і чаканымі вынікамі заняткаў (1 хв.).**

**3. Абагульніце атрыманую ад удзельнікаў інфармацыю аб праве на жыццё (5 хв.).**
У некалькіх сказах абагульніце адказы на пытанні ўдзельнікаў. Засяродзьце ўвагу на тым, што дзяржава і міжнародная супольнасць усведамляюць важнасць жыцця чалавека і таму разглядаюць яго як каштоўнасць, якую варта абараняць нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі нормамі.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Выкажыце сваё ўласнае стаўленне да пытанняў, якія разглядаліся раней. Засяродзьце сваю ўвагу на паняцці жыццё. У дадатковай інфармацыі пададзена навуковае вызначэнне са слоўніка. Разам з тым лепш прывесці не навуковае, а сваё ўласнае вытлумачэнне простымі словамі. Можна задаць гэтае пытанне ўдзельнікам і абагульніць іх адказы.**

**4. Падрыхтуйце ўдзельнікаў да абмеркавання пытання смяротнага пакарання (10 хв.).**
Папрасіце ўдзельнікаў уявіць, што жыццё злачынцы, які асуджаны на смяротнае пакаранне за забойства чалавека, залежыць ад вашых аргументаў «за» і «супраць» яго пакарання. Аб'яднайце удзельнікаў у дзве групы. Добра было б, каб колькасць удзельнікаў адной групы адпавядала колькасці ўдзельнікаў другой групы. На працягу 4-х хвілін адна група будзе пісаць дзве прычыны, чаму варта пакараць злачынцу смерцю, другія — два аргументы, чаму караць смерцю не варта.

Не прадстаўляючы вынікі абмеркавання і выпрацаваныя аргументы, папрасіце ўдзельнікаў групы, якая пісала аргументы «за» пакаранне, за 4 хвіліны напісаць цяпер два аргументы «супраць», а тая група, якая, пісала 2 аргументы «супраць» пакарання, павінна напісаць два аргументы «за» пакаранне злачынцы.

З мэтай аптымізацыі працы групаў (у выпадку, калі ў класе шмат удзельнікаў і дзве групы атрымліваюцца большыя як па 10 чалавек, удзельнікаў можна аб'яднаць у меншыя па памерах групы. Але калі «за» будзе дзве групы, то «супраць» павінна быць таксама дзве групы, калі «за» тры групы, то і супраць тры групы, і г. д.

**5. Абмяркуйце пытанне смяротнага пакарання (10 хв.).**
Абмеркаванне пытання смяротнага пакарання правядзіце ў парах. Пры гэтым падзяліць удзельнікаў трэба такім чынам, каб у кожнай пары былі прадстаўнікі розных груп.

На працягу 10 хвілін папрасіце ўдзельнікаў агучыць меркаванні і аргументы «за» і «супраць» пакарання смерцю злачынцы, выпрацаваныя ў групах.

**6. Арганізуйце дыскусію па пытанні смяротнага пакарання (10 хв.).**
Папрасіце ўдзельнікаў заняць свае месцы. Падсумоўваючую дыскусію можна правесці па наступных пытаннях:
- Якія з пачутых вамі прычын немэтазгоднасці пакарання смерцю вы лічыце найбольш істотнымі? Чаму?
- Якія з пачутых вамі прычын мэтазгоднасці пакарання смерцю вы лічыце найбольш істотнымі? Чаму?
- Прывядзіце іншыя прыклады, не звязаныя са смяротным пакараннем, але якія тычацца права на жыццё.

Падчас адказаў на пытанні рабіце спасылкі на міжнародныя нормы, вылучаныя ў дадатковай інфармацыі

**Тлумачальная інфармацыя**

**Як правіла, удзельнікі называюць сярод іншых прычын — мэтазгоднасць пакарання смерцю асобы, якая адабрала жыцці невінаватых людзей. Самае галоўнае — паказаць, што, гаворачы аб праве на жыццё, мы павінны мець на ўвазе толькі тыя сітуацыі, калі дзяржава (службовыя асобы) адбіраюць у чалавека жыццё альбо калі дзяржава рэгламентуе пытанні, звязаныя з жыццём чалавека (напрыклад, смяротнае пакаранне, эўтаназія альбо аборты).**

**Асноўнай часткай дадзенага занятку з'яўляюцца трэцяя, чацвёртая і пятая, на якіх адбываецца непасрэдная праца ўдзельнікаў па абмеркаванні розных аспектаў права чалавека на жыццё. У сувязі з гэтым настаўніку варта надаць асаблівую ўвагу менавіта дадзеным часткам заняткаў.**

**7. Падагульніце заняткі (3 хв.).**
Выкарыстайце наступныя пытанні:
- Што такое жыццё? Ці важнае яно для чалавека і чаму?
- Ці з'яўляецца аборт спосабам пазбаўлення чалавека жыцця і парушэннем права чалавека на жыццё? Аргументуйце сваю пазіцыю.
- Ці варта ў Беларусі захоўваць смяротнае пакаранне? Аргументуйце сваю пазіцыю.

**Дадатковая інфармацыя**

## АБ ПРАБЛЕМЕ АБАРОНЫ ПРАВА НА ЖЫЦЦЁ

Навука дае наступнае азначэнне тэрміну жыццё: з пункту гледжання прыродазнаўства — гэта дынамічны стан арганізму, які засноўваецца на бесперапыннасці працэсаў абмену матэрыяй і энэргіяй са знешнім асяроддзем.
(http://be.wikipedia.org/wiki/%D0%96%D1%8B%D1%86%D1%86%D1%91)

Праблема пазбаўлення жыцця чалавека дзяржавай праз смяротнае пакаранне мае даўнюю гісторыю. Розныя краіны ў розныя перыяды часу спрабавалі адмяніць смяротнае пакаранне. Напрыклад, у Беларусі адмена смяротнага пакарання была звязана з заканчэннем Другой сусветнай вайны і абгрунтоўвалася неабходнасцю гуманнага стаўлення да людзей, якія прайшлі праз пекла вайны і захавалі свае жыцці. Але гэтая адмена насіла кароткатэрміновы характар і не паўплывала істотна на стаўленне грамадства і дзяржавы да праблемы пазбаўлення чалавека жыцця.

Прынцыпова стаўленне да праблемы захавання права на жыццё і адмены смяротнага пакарання змянілася ў другой палове XX ст. Развіццё канцэпцыі правоў чалавека, стварэнне міжнародных механізмаў абароны правоў чалавека, замацаванне падставовых правоў чалавека ў міжнародных дакументах і нацыянальным заканадаўстве асобных краін, фармаванне практыкі разгляду скаргаў на парушэнні правоў чалавека і тэарэтычнае абгрунтаванне правоў чалавека спрычыніліся да кардынальнага змянення стаўлення міжнароднай супольнасці да праблемы адабрання ў чалавека жыцця.

Ужо ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека гаварылася пра тое, што кожны чалавек мае права на жыццё (арт. 3). Істотны крок да адмены смяротнага пакарання адбыўся разам з прыняццем Выніковага дакумента Венскай сустрэчы НБСЕ 1989 г. У прыватнасці, адносна адмены смяротнага пакарання ў ім гаварылася:

(24) У тым, што тычыцца пытання аб смяротным пакаранні, дзяржавы-ўдзельніцы адзначаюць, што ў некаторых з іх смяротнае пакаранне было адменена. У дзяржавах-удзельніцах, дзе смяротнае пакаранне не адменена, смяротны прысуд можа быць вынесены толькі за самыя цяжкія злачынствы ў адпаведнасці з заканадаўствам, якое дзейнічала на момант здзяйснення злачынства… Гэтае пытанне будзе заставацца на разглядзе. У гэтым кантэксце дзяржавы-ўдзельніцы будуць супрацоўнічаць у межах адпаведных міжнародных арганізацый.

Другі Факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, прыняты ў 1989 г., прысвечаны менавіта разгляду дадзенага пытання і накіраваны на адме-ну смяротнага пакарання. У арт. 1 Другога факультатыўнага пратакола гаворыцца, што «ні адна асоба, якая знаходзіцца пад юрысдыкцыяй дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пратакола, не падвяргаецца смяротнаму пакаранню». У пункце 2 арт. 1 гаворыцца пра тое, што кожная дзяржава-ўдзельніца павінна прымаць усе неабходныя захады для адмены смяротнага пакарання. Для больш поўнага ўяўлення пра дадзены дакумент глядзі яго тэкст у дадатку да дапаможніка.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у арт. 24 заяўляе, што «кожны мае права на жыццё. Дзяржава абараняе жыццё чалавека ад любых супрацьпраўных замахаў…»Разам з тым згодна з заканадаўствам смяротнае пакаранне ў Беларусі захоўваецца як выключная мера пакарання. І хоць на сённяшні дзень смяротнае пакаранне выносіцца толькі за невялікую колькасць злачынстваў, а колькасць прысудаў аб смяротным пакаранні згодна са статыстыкай пастаянна змяншаецца, смяротнае пакаранне на нашай тэрыторыі не адменена. На сёння толькі дзве краіны АБСЕ — Беларусь і ЗША — выкарыстоўваюць смяротнае пакаранне. У іншых краінах смяротнае пакаранне альбо адменена цалкам, альбо абвешчаны мараторый на вынясенне такіх прысудаў. Гэта азначае, што ў заканадаўстве застаецца магчымасць смяротнага пакарання, але прысуды аб смяротным пакаранні не выносяцца, прысуды надалей выносяцца, але не выконваюцца, і злачынцы фактычна адбываюць пажыццёвае зняволенне. Адмена смяротнага пакарання — адна з умоў уваходжання краін у Раду Еўропы (такім чынам, калі Беларусь будзе ўступаць у Раду Еўропы, яна павінна будзе адмяніць смяротнае пакаранне).

Пытанне адмены смяротнага пакарання праходзіць складаны шлях ад дэкларацыі права на жыццё да тэарэтычнага пераасэнсавання ролі дзяржавы ў захаванні чалавечага жыцця і заканадаўчага замацавання міжнародных прынцыпаў у нацыянальных прававых сістэмах. У 1996 г. на рэферэндуме большасць грамадзян Беларусі выказалася за захаванне смяротнага пакарання, але цяпер усё часцей вядуцца размовы аб скасаванні пакарання смерцю ці ўвядзенні мараторыя на вынясенне смяротных прысудаў.

Смяротнае пакаранне не з’яўляецца адзінай праблемай, якая разглядаецца ў рамках права на жыццё. Таксама пытанні, звязаныя з дазволам альбо забаронай абортаў (штучным перарываннем цяжарнасці) і эўтаназіяй (спыненне жыцця чалавека, які пакутуе ад невылечнай хваробы, з фактычнага дазволу дзяржавы) таксама адносяцца да праблем права на жыццё. Першая праблема звязаная з некалькімі пытаннямі, напрыклад, што лічыць пачаткам жыцця — нараджэнне дзіцяці ці момант зачацця і ці дазваляць аборты ўвогуле і калі «так», то ў якіх сітуацыях.

Праблема эўтаназіі звязана з пытаннем, ці з’яўляецца забойствам (згодна з крымінальным кодэксам) пазбаўленне жыцця чалавека дактарамі праз падачу адпаведных сродкаў ці праз перарыванне падачы неабходных лекаў па просьбе хворага альбо яго блізкіх. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя» адназначна забараняе эўтаназію. У прыватнасці, у арт. 31 эўтаназія разглядаецца як «задавальненне просьбы пацыента аб перарыванні жыццядзейнасці яго арганізма і наступленні смерці праз нейкія дзеянні (ці бяздзеянне) з мэтай пазбаўлення ад невыносных пакутаў, выкліканых невылечным захворваннем. Медыцынскім і фармацэўтычным работнікам забараняецца ажыццяўленне эўтаназіі. Асоба, якая свядома штурхае другую асобу да эўтаназіі і (або) ажыццяўляе эўтаназію, нясе адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь». Аднак у некаторых краінах, як, напрыклад, у Нідэрландах і Бельгіі эўтаназія ўзаконеная. Эўтаназія істотна адрозніваецца ад смяротнага пакарання. Смяротнае пакаранне ўяўляе сабой фактычнае забойства чалавека дзяржавай. А эўтаназія — гэта забіранне жыцця чалавека па ўласным рашэнні самой асобы (напрыклад, з прычыны вельмі цяжкай хваробы і нязносных пакутаў) ці блізкай яму асобы, якое аднак, можа адбывацца з дазволу дзяржавы.

Сучасныя ўмовы могуць у бліжэйшай будучыні паставіць новыя пытанні перад канцэпцыяй правоў чалавека. У выніку могуць істотна змяніцца наша стаўленне да паняцця права чалавека на жыццё. Напрыклад, гэта можа адбыцца разам з узнікненнем і развіццём тэхналогіі кланавання чалавека. Найімаверней, гэта выклікі недалёкай будучыні, якія будуць патрабаваць новага пераасэнсавання ўсіх гуманітарных праблем.

# 11. ФІЗІЧНАЯ І ПСІХІЧНАЯ НЕДАТЫКАЛЬНАСЦЬ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- што такое фізічная недатыкальнасць;
- што такое псіхічная (маральная) недатыкальнасць;
- асобныя нормы міжнародных дакументаў і нацыянальнага заканадаўства, накіраваныя на абарону чалавека ад фізічнага і псіхічнага гвалту.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- звязваць пытанні фізічнай і псіхічнай недатыкальнасці з парушэннямі правоў чалавека;
- выказваць сваю пазіцыю па розных выпадках парушэнняў фізічнай і псіхічнай недатыкальнасці.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да правоў чалавека як да інстытута, які абараняе чалавека ад фізічнага і псіхічнага гвалту з боку дзяржавы;
- да ідэі адмаўлення ад фізічнага і псіхічнага гвалту як да аднаго з гуманістычных прынцыпаў пабудовы стасункаў паміж людзьмі.

**План заняткаў у фармаце 45 хв.**

1. Факусаванне ўвагі — 2 хв.
2. Знаёмства з тэмай і чаканымі вынікамі заняткаў — 1 хв.
3. Што такое фізічная і псіхічная недатыкальнасць — 15 хв.
4. Разгляд выпадкаў — 23 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 4 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (2 хв.).**

Пачніце заняткі з наступнай просьбы:

- Назавіце хоць адзін выпадак, калі вас пакаралі фізічна ці маральна.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Факусаванне не трэба зацягваць. Узнятая тэма выклікае цікавасць і, як правіла, выклікае жаданне выказацца. Галоўнае, каб удзельнікі засяродзіліся на самой тэме заняткаў. Да абмеркавання сітуацыі можна звярнуцца пры канцы, калі ўдзельнікі будуць лепш арыентавацца ў тэме.**

**Удзельнікі часцей за ўсё прыводзяць прыклады пакарання бацькамі ці законнымі прадстаўнікамі (паставілі ў кут, ударылі рукой ці інш.) Падобныя адносіны не разглядаюцца ў якасці катэгорыі правоў чалавека, бо адсутнічае прыкмета адносінаў між чалавекам і дзяржавай. У выпадку, калі падобныя дзеянні будуць здзейснены прадстаўніком міліцыі ці прадстаўніком іншых органаў улады (ці, напрыклад, настаўнікам) — будзе факт парушэння правоў чалавека.**

**Неабходна памятаць, што на дадзеным занятку разглядаецца толькі аспект правоў чалавека — выпадкі, калі катаванні і іншыя прыніжаючыя годнасць дзеянні ў адносінах да асобы прымяняе дзяржава. Справы, звязаныя з катаваннямі прыватных асоб іншымі прыватнымі асобамі (т.зв. «гарызантальны» ўзровень) разглядацца як крымінальныя злачынствы і не звязаныя з правамі чалавека.**

**Для таго каб мець магчымасць тлумачыць выказванні ўдзельнікаў звярніцеся да дадатковай інфармацыі дадзенага занятку.**

**2. Азнаёмце ўдзельнікаў з тэмай і чаканымі вынікамі заняткаў (1 хв.).**

**3. Разгледзьце паняцці фізічнай і псіхічнай недатыкальнасці (15 хв.).**

Раздайце раздатак 11.1. Пасля таго як удзельнікі пазнаёмяцца са зместам, можна задаць наступныя пытанні:

- Што такое фізічная недатыкальнасць? Што такое псіхічная і маральная недатыкальнасць?
- Якімі спосабамі можа парушацца фізічная, псіхічная і маральная недатыкальнасць?
- Што такое катаванні? Якія прыкметы катавання вынікаюць з азначэння?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Асноўная задача заняткаў заключаецца не ў тым, каб навучыцца разбіраць, ці нейкае дзеянне было катаваннем ці прыніжэннем чалавечай годнасці (з пункту гледжання правоў чалавека амаль усе дзеянні, якія парушаюць недатыкальнасць асобы, можна называць катаваннямі), а прадэманстраваць у працэсе дыскусіі складанасць самой праблемы. Тое, што сёння не разглядаецца ў якасці прыніжэння годнасці ці ў якасці катавання — заўтра можа такім лічыцца.**

**Трэба дакладна акрэсліць прыкметы катаванняў (акрэсленых у міжнародных дакументах – гл. Дадатковую інфармацыю і раздатак):**
**1. катаванне — любое дзеянне, якім любой асобе наносіцца боль ці фізічныя і маральныя пакуты ;**
**2. катаванні ўжываюцца ў наступных мэтах:**
**а) атрымаць пэўныя звесткі ці прызнанні аб гэтай ці трэцяй асобе;**
**б) пакараць асобу за дзеянне, якое яно ці трэцяя асоба ўчыніла ці ва ўчыненні якога падазраецца;**
**в) запалохаць яе ці трэцюю асобу;**
**г) прымусіць яе ці трэцюю асобу да нейкіх дзеянняў;**
**д) з любой іншай мэтай (з любой прычыны), заснаванай на дыскрымінацыі любога характару;**
**3) катаванні (боль ці пакуты) наносяцца прадстаўнікамі дзяржавы ці іншымі асобамі, якія выступаюць у афіцыйнай якасці, ці з іх падбухторвання, ці з іх ведама, ці з маўклівай згоды.**

**На гэтым этапе можна дадаткова патлумачыць розніцу паміж катаваннямі і выпадкамі прыніжэння годнасці, прывесці прыклады, грунтуючыся на дадатковай інфармацыі да заняткаў. Падагульненне варта правесці на аснове дадатковай інфармацыі, пададзенай для настаўніка з выкарыстаннем меркаванняў навучэнцаў.**

**4. Разгледзьце выпадкі псіхалагічнага і фізічнага ціску (23 хв.).**
Патлумачце навучэнцам, што пасля таго, як вы агучыце той альбо іншы казус, у іх будзе магчымасць заняць пазіцыю ў адпаведнасці з тым, як яны адкажуць на пытанні, прыведзеныя ў апісанні сітуацыі. Перад пачаткам практыкавання раздайце навучэнцам раздаткі з вытрымкамі з асобных артыкулаў заканадаўства (раздатак 11.2). На падставе гэтых артыкулаў навучэнцы павінны кваліфікаваць дзеянні настаўніцы і бацькоў, аргументаваць сваю пазіцыю.

**ВЫПАДАК**

Алесь — вучань 9 «А» класа. Звычайна паводзіць сябе з выклікам: не рэагуе на заўвагі настаўніцы, сістэматычна перашкаджае правядзенню ўрокаў. Аднойчы настаўніца не вытрымала і прымусіла яго стаць у кут тварам да сцяны і не азірацца. Так Алесь прастаяў увесь урок.

- Наколькі добра паводзіў сябе Алесь у адносінах да класа, да настаўніцы?
- Ці можна сказаць, што дзеянні настаўніцы прыніжалі годнасць Алеся?
- Ці можна дзеянні настаўніцы кваліфікаваць як катаванні? Аргументуйце адказ.

**ВЫПАДАК**

16-гадовая Вераніка са згоды бацькоў паехала адзначаць дзень нараджэння сваёй сяброўкі на яе лецішча. З вечарыны дахаты Вераніка паабяцала вярнуцца не пазней 24.00. Аднак аўтобус, на якім яна планавала вярнуцца дахаты, у гэты вечар не прыйшоў. Сувязь у месцы, дзе знаходзілася лецішча, адсутнічала. У выніку Вераніка не здолела папярэдзіць бацькоў, якія моцна хваляваліся за дачку і не спалі цэлую ноч. Раніцай Вераніку прывезлі бацькі сяброўкі, якія заехалі на лецішча. Бацька Веранікі быў такі злосны, што адзін раз ударыў яе далонню па твары, крычаў на дзяўчыну, ужываючы крыўдныя і зневажальныя словы.

- Наколькі добра паводзіла сябе Вераніка ў адносінах з бацькамі?
- Ці можна сказаць, што дзеянні бацькі прыніжалі годнасць Веранікі?
- Ці лічыце вы дзеянні бацькі Веранікі гвалтам, недапушчальным у дачыненні да дзяўчыны? Патлумачце сваю пазіцыю.
- Ці можна дзеянні бацькі Веранікі кваліфікаваць як катаванні? Аргументуйце адказ.

Разглядаючы два гэтыя выпадкі, настаўніку варта звяртаць увагу не толькі на паводзіны настаўніка ці бацькі, якія могуць асуджацца, але і на паводзіны Алесі і Веранікі. Наколькі іх паводзіны былі маральнымі?

Дзеці павінны ўсведамляць, што і яны нясуць адказнасць за свае паводзіны. Нармальныя ўзаемаадносіны з настаўнікамі і з бацькамі залежаць як ад дарослых, так і ад дзяцей. Аднак, зневажальныя дзеянні, якія праяўляюцца ў фізічным ці маральным гвалце, — недапушчальныя і павінны карацца згодна з заканадаўствам.

Для вытлумачэння зместу і працы з казусамі звяртайцеся да раздаткавага матэрыялу 11.1, 11.2, дадатковага матэрыялу да заняткаў і да тэксту Канвенцыі ААН супраць катавання, пададзенага ў канцы дапаможніка.

**5. Падагульніце заняткі (4 хв.).**
Для правядзення падагульнення выкарыстайце наступныя пытанні:
- Прывядзіце вядомыя вам прыклады парушэння фізічнай і псіхічнай недатыкальнасці.

- Ці існуюць выпадкі, калі, з вашага пункту гледжання, выкарыстанне фізічнага і псіхічнага гвалту з’яўляецца апраўданым і дапушчальным? Прывядзіце прыклады і аргументуйце сваю пазіцыю.
- Ці маюць прыклады гвалтоўных дзеянняў, разгледжаныя на занятках, характар фізічнага ці псіхічнага гвалту? Патлумачце сваю пазіцыю.
- Што маглі б зрабіць Алесь і яго бацькі, калі палічылі б, што настаўніца парушыла правы чалавека на фізічную і псіхічную недатыкальнасць?
- Якія з гвалтоўных дзеянняў — фізічныя ці псіхічныя — найбольш прыніжаюць годнасць асобы? Чаму?

**Дадатковая інфармацыя**

## АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ АБ ФІЗІЧНАЙ І ПСІХІЧНАЙ НЕДАТЫКАЛЬНАСЦІ І ПРАЯВАХ ІХ ПАРУШЭННЯ

Фізічная і псіхічная недатыкальнасць можа быць парушана катаваннямі ці бесчалавечным і прыніжальным для годнасці абыходжаннем. Пададзеныя ніжэй звесткі прыводзяцца не з мэтай навучыць настаўніка ці адукатара, як кваліфікаваць тыя ці іншыя дзеянні і не з мэтай дыскутаваць, якія з дадзеных дзеянняў з’яўляюцца больш ці менш небяспечнымі для чалавека. Гэтая інфармацыя з’яўляецца ілюстрацыяй падыходу міжнародных органаў па абароне правоў чалавека да катаванняў ці бесчалавечнага і прыніжаючага годнасць абыходжання ці пакарання. Усе гэтыя дзеянні з’яўляюцца несумяшчальнымі з паняццем годнасці і таму ў адпаведнасці з канцэпцыяй правоў чалавека небяспечнымі і забароненымі.

### Катаванне

Міжнароднае заканадаўства зыходзіць з таго, што выкарыстоўваць катаванні нельга ні ў якім выпадку, ні пры якіх умовах у дачыненні да каго б то ні было. У частцы 1 арт. 1 Канвенцыі ААН супраць катаванняў даецца паняцце *катавання* (перадапошні абзац раздатка 11.1).
У межах іншых міжнародных арганізацый таксама былі прыняты адпаведныя нормы, якія пакліканы абараніць чалавека ад катаванняў. Арт. 3 Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод забараняе катаванні (глядзі тэкст гэтага дакумента ў канцы дапаможніка). Дадзены артыкул абараняе адну з асноўных каштоўнасцяў дэмакратычнага грамадства. Нават у найбольш складаных умовах, такіх, як змаганне супраць тэрарызму ці арганізаванай злачыннасці, у адносінах да людзей, якія ўчынілі самыя цяжкія злачынствы, гэты артыкул не дазваляе аніякіх выключэнняў. Згодна з п. 2 арт. 15 Еўрапейскай канвенцыі 1950 г. адыход ад палажэнняў арт. 3 немагчымы нават у перыяд вайны ці надзвычайных абставінаў, якія пагражаюць жыццю нацыі. Не дазваляецца ніякіх адступленняў ад арт. 3.
Паколькі Еўрапейскі Суд па правах чалавека, на думку цэлага шэрагу даследчыкаў зрабіў найбольш грунтоўныя крокі ў вызначэнні паняцця *катавання*, *бесчалавечнага абыходжання і пакарання*, звернем больш пільную ўвагу менавіта на яго практыку і тлумачэнне арт. 3 Канвенцыі.

Еўрапейскі суд па правах чалавека ўпершыню разглядаў арт. 3 Еўрапейскай канвенцыі ў справе «Ірландыя супраць Злучанага Каралеўства». Падчас разгляду гэтай справы суд правёў размежаванне паміж паняццямі *катаванне* і *бесчалавечнае і прыніжальнае для годнасці абыходжанне*. На думку суда, розніца паміж гэтымі паняццямі заключаецца ў «рознай інтэнсіўнасці пакутаў». Катаванне з’яўляецца найбольш цяжкім відам жорсткага абыходжання.

У згаданай справе Суд падкрэсліў, што для таго, каб прызнаць дзеянні катаваннем, неабходна даказаць, што пацярпелы перанёс дастаткова моцныя пакуты. Ацэнка сілы пакутаў адносная і залежыць ад усіх абаставінаў справы. У першую чаргу — ад працягласці і цяжкасці фізічных і псіхічных наступстваў, а ў асобных выпадках — ад полу, узросту ці стану здароўя чалавека.

У час разгляду справы «Ірландыя супраць Злучанага Каралеўства» аналізаваліся прыёмы, якая выкарыстоўваліся праваахоўнымі органамі Брытаніі супраць падазраваных з Ірландскай рэспубліканскай арміі падчас допыту. Зняволеныя павінны былі стаяць доўгі час каля сцяны з завязанымі вачыма пад гучную музыку, ім не давалі спаць, харчаванне было абмежавана да мінімуму. Суд кваліфікаваў выкарыстанне такіх метадаў як бесчалавечнае абыходжанне, бо яны выклікалі значныя фізічныя і псіхічныя пакуты, але не дасягнулі той ступені інтэнсіўнасці, якую прадугледжвае «катаванне». Але сістэматычнае выкарыстанне жорсткага абыходжання можна кваліфікаваць як катаванне, нават калі яно не цягне за сабой

цяжкіх наступстваў, якія характэрныя для катавання. Сучасныя метады допыту могуць не выклікаць цяжкіх фізічных наступстваў,
але пры гэтым па ўздзеянні іх можна параўнаць з катаваннямі. Суд разглядае катаванне як дзеянне, якое прыносіць не толькі фізічны боль, але таксама і цяжкія маральныя і/ці псіхічныя пакуты, якія ўплываюць на свабоду выяўлення волі тых, каго дапытваюць ці змясцілі пад варту.

У якасці яшчэ аднаго прыкладу катаванняў можна прывесці справу грамадзяніна Турцыі (справа называлася «Аксой супраць Турцыі»), які падазраваўся ў тэрарыстычнай дзейнасці. У час допытаў яго падвешвалі над зямлёй за рукі, счэпленыя за спінай кайданкамі. У суд ён прадставіў медыцынскае сведчанне, згодна з якім на момант паступлення ў шпіталь ён пакутаваў ад двухбаковага пашкоджання плечавога сплячення, што выклікала часовы параліч абедзвюх рук. У гэтай справе Суд палічыў, што ў выпадках, калі здаровы чалавек узяты пад варту, у момант вызвалення мае цялесныя пашкоджанні, дзяржава абавязана даць праўдападобныя вытлумачэнні прычын пашкоджання. На думку Суда, падвешванне з сашчэпленымі за спіной рукамі магло быць учынена толькі мэтанакіравана і з мэтай атрымання прызнання ці інфармацыі. У гэтым выпадку Суд палічыў, што абыходжанне насіла настолькі сур’ёзны і жорсткі характар, што яго можна кваліфікаваць толькі як катаванне.

**Бесчалавечнае абыходжанне ці прыніжальныя для годнасці абыходжанне ці пакаранне**
Прыкладамі рашэнняў, вынесеных Судом па правах чалавека па бесчалавечным абыходжанні ці пакаранні, можна назваць наступныя (ніжэй прыведзеныя толькі некалькі з цэлага шэрагу падобных рашэнняў Суда).

Справа «Тамазі супраць Францыі» (1992 г.) датычыць вызвалення зняволенага са шматлікімі пабоямі. Суд зрабіў у дадзенай справе акцэнт на інтэнсіўнасці пакутаў, на шматлікасці пашкоджанняў і падкрэсліў, што арт. 3 абараняе фізічную недатыкальнасць асобы.

Справа «Хуртада супраць Швейцарыі» (1994 г.). Падчас арышту падазраваны доўгі час утрымліваўся ў кепскіх санітарных умовах і без медыцынскай дапамогі, хоць яна яму была патрэбна.Суд вырашыў, што ў дадзенай справе палажэнні Канвенцыі былі парушаны.

Трэці выпадак «Рыбіч супраць Аўстрыі» (1995 г.). Пацярпелы скардзіўся на тое, што падчас знаходжання пад следствам у выніку кепскага абыходжання атрымаў кровападцёк правай рукі. У дадзенай справе суд падкрэсліў, што ў адносінах да асобы, пазбаўленай волі, любое ўжыванне фізічнай сілы, якое не было выклікана яе ўласнымі паводзінамі, прыніжае чалавечую годнасць і з’яўляецца парушэннем арт. 3 Канвенцыі. Суд адзначыў, што складанасць правядзення расследавання і неаспрэчныя цяжкасці барацьбы са злачыннасцю не павінны весці да абмежавання абароны фізічнай недатыкальнасці. Суд кваліфікаваў гэтыя дзеянні як бесчалавечныя і прыніжальныя для годнасці.

Артыкул 3 Канвенцыі забараняе прыніжаючае годнасць абыходжанне ці пакаранне.
У гэтай катэгорыі можна прывесці прыклад справы «Тайрэр супраць Злучанага Каралеўства». Вынесенае ў судовым парадку і выкананае паліцэйскім служачым пакаранне ў выглядзе некалькіх udaраў палкай Камітэт па правах чалавека ААН і Суд па правах чалавека аднолькава кваліфікавалі як прыніжальнае для годнасці пакаранне. Суд падкрэсліў, што пакаранне палкай павінна разглядацца як замах на годнасць асобы і яе фізічную недатыкальнасць.

Краіны АБСЕ не толькі замацавалі норму, згодна з якой катаванні, а таксама жорсткае, бесчалавечнае і прыніжальнае для годнасці абыходжанне ці пакаранне лічацца недапушчальнымі, але і ўзялі на сябе абавязальніцвы па здзяйсненні канкрэтных крокаў па выкараненні такіх з’яваў. Гэтыя палітычныя абавязальніцтвы адлюстраваныя, напрыклад, у Стамбульскім дакуменце Сустрэчы на найвышэйшым узроўні (Стамбул, 1999 г.). У пункце 21 дадзенага дакумента, гаворыцца, што краіны, якія падпісалі дакумент, маюць намер выкараніць катаванні, а таксама жорсткія, бесчалавечныя і прыніжальныя для годнасці віды стаўлення праз удасканаленне нацыянальнага заканадаўства і працэдураў.
Нажаль, у беларускім Крымінальным кодэксе адсутнічае асобны артыкул з азначэннем «катаванняў».

Дадатковая інфармацыя падрыхтавана паводле інтэрнэт-парталу http\\evolutio.info

## ФІЗІЧНАЯ, ПСІХІЧНАЯ І МАРАЛЬНАЯ НЕДАТЫКАЛЬНАСЦЬ

**Асабістая свабода** — гэта асаблівая сфера жыцця чалавека, у якую дзяржава не можа ўмешвацца.

**Фізічная недатыкальнасць** — гэта права самастойна прымаць рашэнні адносна сябе. Гэта азначае, што прадстаўнікі дзяржавы не могуць фізічна ўздзейнічаць на асобу без яе на гэта згоды.

Псіхічная і маральная недатыкальнасць абараняюць ад розных відаў псіхічнага ўмяшальніцтва і ўздзеяння на асобу без яе згоды. Гэта азначае, што прадстаўнікі дзяржавы не могуць псіхічна і маральна ўздзейнічаць на чалавека без ягонай на гэта згоды, напрыклад: не мае права абражаць пачуцці іншага чалавека, запалохваць, прыніжаць ці ствараць умовы псіхалагічнага ціску на асобу, якія могуць выклікаць душэўныя перажыванні ці пакуты.

**Фізічная і псіхічная (маральная) недатыкальнасць можа парушацца:**
- праз катаванні, бесчалавечнае абыходжанне ці пакаранні, прыніжальныя для годнасці стаўленне ці пакаранні.

Вызначыць розніцу паміж катаваннем, бесчалавечным, прыніжальным для годнасці стаўленнем ці пакараннем часам вельмі складана, і для асобнага чалавека не заўсёды нават патрэбна (усе гэтыя дзеянні ў прынцыпе можна называць катаваннем). Але, напрыклад Еўрапейскі суд па правах чалавека ці Камітэт па правах чалавека такую розніцу будуць правозіць абавязкова, каб дакладна кваліфікаваць тып парушэння правоў чалавека. Усе гэтыя дзеянні накіраваны на парушэнне фізічнай ці маральнай недатыкальнасці асобы. Розніца заключаецца толькі ў ступені пакутаў: катаванне з'яўляецца найбольш цяжкім відам жорсткага стаўлення да чалавека з боку дзяржавы. Любое з гэтых парушэнняў з'яўляецца злачынствам супраць асобы і павінна быць пакарана.

**Частка 1 арт. 1. Канвенцыі ААН супраць катаванняў і іншых жорсткіх і бесчалавечных ці прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання** вызначае катаванне як «любое дзеянне, якім нейкай асобе наўмысна наносіцца моцны боль ці пакуты, фізічныя ці маральныя, каб атрымаць ад яе ці ад трэціх асоб звесткі ці прызнанні, пакараць яе за дзеянні, якія ўчыніла яна ці трэцяя асоба, ці ва ўчыненні якіх яна падазраецца, а таксама каб запалохаць ці прымусіць яе ці трэцюю асобу, ці з любой прычыны, заснаванай на дыскрымінацыі любога характару, калі такі боль ці пакуты наносяцца дзяржаўнай службовай асобай, іншай асобай, якая выступае ў афіцыйнай якасці, ці з іх падбухторвання, ці з іх ведама ці з іх маўклівай згоды…»

## УСЕАГУЛЬНАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА (ВЫТРЫМКІ)

**Артыкул 1.** Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны надзелены розумам і сумленнем і павінны ставіцца адзін да аднаго ў духу братэрства.

**Артыкул 3.** Кожны чалавек мае права на жыццё, на свабоду і на асабістую недатыкальнасць.

**Артыкул 5.** Нікога не павінны катаваць, ні з кім не павінны абыходзіцца і нікога не павінны караць жорстка, бесчалавечна або прыніжальна для годнасці.

## РАЗДАТАК № 11.2.

**КАНВЕНЦЫЯ ААН СУПРАЦЬ КАТАВАННЯЎ І ІНШЫХ ЖОРСТКІХ І БЕСЧАЛАВЕЧНЫХ ЦІ ПРЫНІЖАЮЧЫХ ГОДНАСЦЬ ВІДАЎ СТАЎЛЕННЯ І ПАКАРАННЯ** (вытрымкі)

**Арт. 2**

Частка 1. Кожная дзяржава-ўдзельніца прымае эфектыўныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, судовыя ці іншыя меры, каб прадухіліць выпадкі катавання на любой тэрыторыі пад яе юрысдыкцыяй.

Частка 2. Ніякія выключныя абставіны: ці гэта ваеннае становішча ў дзяржаве, ці пагроза вайны, унутраная палітычная нестабільнасць ці любое іншае надзвычайнае становішча не могуць служыць апраўданнем катавання.

Частка 3. Загад асобы, вышэйшай рангам, ці дзяржаўных улад не можа служыць апраўданнем катавання.

**ЕЎРАПЕЙСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА** (вытрымкі)

**Арт. 3. Забарона катавання**

Нікога не павінны катаваць, ні з кім не павінны абыходзіцца  і нікога не павінны караць бесчалавечна ці прыніжальна для годнасці.

**ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ПРАВАХ ДЗІЦЯЦІ»** (вытрымкі)

**Арт. 9.**

Права на недатыкальнасць асобы. Кожнае дзіця мае права на абарону сваёй асобы ад любых відаў … гвалту. (…)

**Арт. 27.**

Права на абарону гонару і годнасці. Кожнае дзіця мае права на абарону яго гонару і годнасці. Дысцыпліна і парадак у навучальна-выхаваўчых установах падтрымліваюцца метадамі, якія грунтуюцца на пачуццях узаемнай павагі і справядлівасці і выключаюць знявагу.

Замах на гонар і годнасць дзіцяці з боку асоб, якія абавязаны па роду сваёй дзейнасці ажыццяўляць выхаваўчыя і навучальныя функцыі, цягне адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** (вытрымкі)

**Арт. 3. Прынцыпы крымінальнага права і крымінальнай адказнасці**

(…) 7. Крымінальны кодэкс служыць забеспячэнню фізічнай, псіхічнай, матэрыяльнай, экалагічнай і іншай бяспекі чалавека. Асобе, якая ўчыніла злачынства, павінны быць прызначаны пакаранне ці іншая мера крымінальнай адказнасці, неабходныя і дастатковыя для яго выпраўлення. Пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці не маюць мэтай нанясенне фізічных пакутаў ці прыніжэння.

**Арт. 128. Злачынствы супраць бяспекі чалавецтва**

Дэпартацыя, незаконнае ўтрыманне ў няволі, зварот у рабства, масавае ці сістэматычнае здзяйсненне пакаранняў без суда, крадзеж людзей, за якім надыходзіць іх знікненне, катаванні ці акты жорсткасці, здзяйсняемыя ў сувязі з расавай, нацыянальнай, этнічнай прыналежнасцю, палітычнымі перакананнямі і веравызнаннем грамадзянскага насельніцтва караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дваццаці пяці гадоў ці пажыццёвым зняволеннем, ці смяротным пакараннем.

**Арт. 394. Прымус да дачы паказанняў**

(…) 3. Дзеянне, прадугледжанае часткай першай дадзенага артыкула, злучанае з прымяненнем катавання, караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў…

**КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** (вытрымкі)

**Арт. 11. Недатыкальнасць асобы**

(…) 3. Ніхто з удзельнікаў крымінальнга працэсу не павінен падвяргацца гвалту, іншаму жорсткаму ці прыніжаючаму чалавечую годнасць абыходжанню, а таксама без яго згоды падвяргацца медыцынскім і іншым доследам.

**КРЫМІНАЛЬНА-ВЫКАНАЎЧЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** (вытрымкі)

**Арт. 10. Асноўныя правы асуджаных**

(…) 2. Асуджаны мае права на ветлівае абыходжанне з боку супрацоўнікаў органа ці ўстановы, якая выконвае пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці. Асуджаны не павінен падвяргацца жорсткаму, бесчалавечнаму альбо прыніжаючаму годнасць абыходжанню. Меры прымусу да асуджанага могуць прымяняцца не іначай як на падставе закона.

# 12. СВАБОДА АД ГВАЛТУ Ў СЯМ'І

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- што гвалт у сям'і таксама можа быць парушэннем правоў чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- аргументаваць сваю пазіцыю па праблеме гвалту ў сям'і;
- адрозніваць выпадкі парушэння правоў чалавека ад парушэнняў правоў грамадзян.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да гвалту ў сям'і як да праблемы, на якую трэба рэагаваць.

**План заняткаў у фармаце 45 хв.**

1. Прадстаўленне тэмы і чаканых вынікаў заняткаў — 1 хв.
2. Факусаванне ўвагі — 6 хв.
3. Ці з'яўляецца гвалт у сям'і парушэннем правоў чалавека? Праца з выпадкам — 28 хв.
4. Падагульненне заняткаў — 10 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Прадстаўленне тэмы заняткаў (1 хв.).**

**2. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (6 хв.).**
Прачытайце ці раскажыце пра выпадак, на падставе якога будзе адбывацца далейшае абмеркаванне тэмы. Для гэтага можна раздаць таксама апісанне выпадку кожнаму з навучэнцаў і даць час самастойна азнаёміцца з ім.

**ВЫПАДАК**

Маладая жанчына звярнулася ў міліцыю для таго, каб скласці скаргу на паводзіны свайго мужа, які, па яе словах, пастаянна збівае яе. Пасля апошніх пабояў яна ўзяла заключэнне доктара аб атрыманых пашкоджаннях, а таксама пісьмовыя сведчанні сяброўкі, якая выпадкова бачыла сямейны канфлікт. Па словах маладой жанчыны, апошні выпадак быў выкліканы тым, што яна каля дзясятай гадзіны вечара вярнулася дахаты з дня нараджэння калегі. Муж збіў яе за тое, што яна, па яго словах, позна ходзіць невядома дзе і ў гэты вечар не прыгатавала вячэры і не даглядала іх пяцігадовай дачкі.

Міліцыянер, аднак, не захацеў прымаць заяву і патлумачыў гэта тым, што дбае пра тое, што будуць казаць пра жанчыну і яе сям'ю людзі, калі пойдуць пагалоскі пра справу. Міліцыянер параіў дзяўчыне наступным разам раней вяртацца дахаты, тады і муж яе не будзе біць.
У выніку жанчына вырашыла не падаваць скаргу.

Узгадніце разам з навучэнцамі галоўныя факты, апісаныя ў гэтым выпадку. Для чаго можна выкарыстаць наступныя пытанні:
- Што здарылася? Хто звярнуўся? Куды звярнуўся? Чаму звярнуўся?
- Ці прыняў міліцыянер скаргу? Чаму не прыняў? Што ў выніку размовы з міліцыянерам зрабіла жанчына?

**Тлумачальная інфармацыя**

**У гэтым выпадку ёсць два блокі інфармацыі, якія варта абмеркаваць на занятках. Першы блок фактаў звязаны з прававым бокам праблемы: пабоямі і адмовай у прыняцці заявы. Другі блок — з маральнымі і культурнымі праблемамі.**

**Найбольш істотнымі фактамі першага блоку з'яўляюцца: 1) маладая жанчына звярнулася па дапамогу ў міліцыю; 2) яна мае доказы пабояў (пісьмовыя сведчанні сведкі і медыцынскае заключэнне); 3) міліцыянер прысароміў жанчыну і адгаварыў падаваць скаргу; 4) у выніку дзеянняў міліцыянта жанчына адмовілася падаваць скаргу.**

**Найбольш істотнай інфармацыяй другога блоку з'яўляецца інфармацыя аб прычынах нанясення апошніх пабояў. Для нас гэта важна для абмеркавання стэрэатыпнага стаўлення да роляў, якія павінны выконваць мужчына і жанчына ў сям'і і да чаго вядуць такія стэрэатыпы. Але нягледзячы на прычыны, згодна з заканадаўствам біць іншага чалавека нельга. За такія дзеянні ўсталявана адказнасць па законе.**

**У гэтым сэнсе важнымі будуць наступныя факты: 1) муж, імаверна, лічыць, што мае права вызначаць, чым яго жонка можа займацца пасля працы і а якой гадзіне яна павінна вяртацца дахаты, 2) жонка ў гэты вечар не прыгатавала вячэры, што, на думку мужа, з'яўляецца абавязкам жонкі, 3) жонка ў гэты вечар не даглядала пяцігадовай дачкі, хоць гэта таксама яе абавязак як маці (паводле мужа).**

**Варта звярнуць асаблівую ўвагу на тое, што ў азначаным выпадку маюць месца адразу два розныя па сваёй прыродзе парушэнні правоў. Першае — гэта супрацьпраўныя дзеянні мужа маладой жанчыны, які збіў яе. Гэтыя дзеянні падлягаюць крымінальнай адказнасці і з'яўляюцца злачынствам.**

**Але парушэннем правоў з'яўляюцца і супрацьпраўныя дзеянні міліцыянера. Справа ў тым, што службовым абавязкам міліцыі згодна з заканадаўствам з'яўляецца абарона інтарэсаў грамадзян. Гэта азначае, што міліцыянер у гэтым выпадку быў абавязаны прыняць заяву жанчыны і распачаць такім чынам працэдуру абароны пацярпелай. Адгаворваючы яе, не прымаючы заявы, міліцыянт стварыў умовы для пакрыцця злачынных дзеянняў мужа пацярпелай.**

**Калі першае парушэнне трэба разглядаць як парушэнне правоў жанчыны прыватнай асобай, то дзеянні міліцыянера — гэта супрацьпраўная дзейнасць прадстаўніка дзяржаўных органаў.**

У разгледжаным выпадку толькі правапарушэнне, якое было ўчынена міліцыянерам, можна разглядаць як парушэнне правоў чалавека. Першае парушэнне будзе проста правапарушэннем, якое не мае прыкмет парушэння правоў чалавека. Больш падрабязна глядзі ў Агульным вытлумачэнні выпадку.

**3. Праз працу з выпадкам разбярыце пытанне гвалту ў сям'і (28 хв.).**
Аб'яднайце ўдзельнікаў у тры групы. У групах удзельнікі павінны адказаць на тры наступныя пытанні:
- Ці ёсць у дадзеным выпадку парушэнне правоў чалавека?
- Калі такое парушэнне ёсць, то ў чым яно выяўляецца?
- Выпрацуйце тры аргументы, якія пацвярджаюць вашу пазіцыю.

Патлумачце, што зараз удзельнікі будуць аргументаваць сваю пазіцыю, выказваючы аргументы «за» і «супраць».

**4. Падагульніце занятківа (10 хв.).**
Пасля прэзентацыі і абмеркавання выказаных навучэнцамі пазіцый правядзіце падагульненне вынікаў занятказ. Для гэтага можна задаць наступныя пытанні:
- Ці быў гэты выпадак рэалістычным?
- Наколькі часта гвалт сустракаецца ў сучасных сем'ях? Патлумачце сваё меркаванне.
- У чым прычына гвалтоўных дзеянняў і дыскрымінацыі ў сям'і?
- Ці трэба разглядаць гвалт у сям'і як парушэнне правоў чалавека? Чаму?
- Што рабіць у сітуацыі, калі вы становіцеся сведкамі праяваў гвалту ў сям'і?

**Дадатковая інфармацыя**

## АБ ПРАБЛЕМЕ АБАРОНЫ ПРАВА НА ЖЫЦЦЁ

Дадзены выпадак цікавы тым, што ён складаецца з дзвюх частак: першая — гвалтоўныя дзеянні ў сям'і, другая — дзейнасць міліцыянера па прыёме скаргі.

З аднаго боку, у межах сям'і няма адносін «вертыкальнага» характару (асоба – дзяржава), але разам з тым улада асобных прадстаўнікоў сям'і, часцей за ўсё бацькі ці мужа, можа насіць абсалютны характар. У гвалтоўных дзеяннях мужа ёсць парушэнне права, але на сённяшні дзень гэтыя дзеянні не разглядаюцца як парушэнне правоў чалавека. Разам з тым нормы аб правах чалавека вылучаюць жанчын і дзяцей у асобную групу, чые правы найбольш часта могуць парушацца і патрабуюць большай абароны. На міжнародным узроўні вылучаюцца дадатковыя абавязальніцтвы дзяржавы ў сферы забеспячэння правоў жанчыны і дзіцяці. Таму абавязкам міліцыянера як прадстаўніка дзяржаўнай улады было дапамагчы вырашыць праблему маладой жанчыны, а не адахвочваць яе ад падачы скаргі. Задача прадстаўніка ўлады — абарона правоў асобы, якая звяртаецца па дапамогу. Неаказанне такой дапамогі азначае, што ўлада не выканала сваіх абавязальніцтваў перад асобай, якая звярнулася па дапамогу і парушыла правы чалавека. Калі б пацярпелая прайшла ўсе адміністрацыйныя і судовыя інстанцыі і не атрымала дапамогі, то яна магла б падаваць скаргу ў міжнародныя інстанцыі па правах чалавека на сваю дзяржаву (напрыклад, скаргу ў Камітэт па правах чалавека на парушэнне арт. 2 п. 3 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах — адсутнасць дзейснага сродку прававой абароны).

Дзеля дакладнейшага канцэптуальнага разумення правоў чалавека мы прапануем у дадзеным выпадку ў якасці парушэння правоў чалавека разглядаць толькі дзеянні міліцыянта ў выпадку, калі вышэйшае начальства пакінула б скаргу пацярпелай на бяздзеянне міліцыянера без увагі. Але варта памятаць і пра адначасовую складанасць сітуацыі праз тое, што яна тычыцца жанчыны і дзіцяці, якія выдзяляюцца ў асобную групу, што патрабуе большай абароны.

Артыкул 5 Канвенцыі ААН аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын наўпрост указвае на неабходнасць:

а) змяніць сацыяльныя і культурныя мадэлі паводзін мужчын і жанчын з мэтай выкаранення перадузятага стаўлення і скасавання звычаяў і практык, якія заснаваны на ідэі непаўнавартасці ці вяршэнства аднаго з палоў або стэрэатыпнасці ў разуменні ролі мужчыны і жанчыны;

б) забяспечыць, каб сямейнае выхаванне ўключала ў сябе правільнае разуменне мацярынства як сацыяльнай функцыі і прызнанне агульнай адказнасці мужчыны і жанчыны за выхаванне сваіх дзяцей (гл. тэкст Канвенцыі ў канцы дапаможніка).

Згодна з факультатыўным пратаколам да Канвенцыі ААН аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын ( http://daccess-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/N99/774/75/PDF/N9977475.pdf?OpenElement) беларусы маюць права падаваць індывідуальную скаргу пры невыкананні палажэнняў вышэйзгаданай Канвенцыі.

Можна вылучыць як мінімум дзве прычыны, чаму трэба змяняць дыскрымінацыйныя ў адносінах да жанчыны стэрэатыпы сацыяльных роляў і спосабы паводзін. Па-першае, дыскрымінацыя жанчын парушае прынцыпы раўнапраўя і павагі чалавечай годнасці, перашкаджае ўдзелу жанчыны побач з мужчынам ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Па-другое, развіццё краіны залежыць ад максімальнага ўдзелу жанчын ва ўсіх сферах жыцця грамадства і дзяржаўнага апарату.

# 13. СВАБОДА СЛОВА
(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- паняцце свабода слова;
- складнікі, якія ўваходзяць у паняцце *свабода слова*;
- гарантыі міжнароднага і нацыянальнага заканадаўства па свабодзе слова;
- дапушчальныя прычыны абмежавання свабоды слова.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- суадносіць і параўноўваць гарантыі свабоды слова ў міжнародных актах і нацыянальным заканадаўстве, а таксама дапушчальныя абмежаванні;
- выказваць сваё меркаванне адносна неабходнасці забеспячэння свабоды слова і адносна дапушчальных абмежаванняў гэтай свабоды.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да свабоды слова як да аднаго з асноўных правоў чалавека, накіраванага на забеспячэнне дзейснага кантролю за ўладай;
- да дапушчальных абмежаванняў свабоды слова як да мінімальных і дакладна акрэсленых магчымасцяў, якія дазваляюць не парушаць правоў і свабод іншых людзей.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі — 3 хв.
2. Абвяшчэнне тэмы і чаканых вынікаў заняткаў — 1 хв.
3. Састаўныя элементы свабоды слова, дапушчальныя магчымасці абмежавання гэтай свабоды — 15 хв.
4. Абмеркаванне пытанняў, звязаных са свабодай слова — 22 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 4 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (3 хв.).**
Для факусавання ўвагі папрасіце ўдзельнікаў прывесці прыклад, калі яны выступалі перад аўдыторыяй і выказвалі свае асабістыя меркаванні. Для больш дэталёвага абмеркавання аднаго з прыведзеных прыкладаў можна задаць наступныя пытанні:
- Ці выказвалі вы тыя думкі, якіх сапраўды прытрымліваліся?
- Прывядзіце прыклады, калі нехта ці нешта не дазваляла вам выказаць сваё меркаванне.

**2. Абвясціце тэму і чаканыя вынікі заняткаў (1 хв.).**

**3. Разгледзьце складнікі свабоды слова і дапушчальныя магчымасці абмежавання гэтай свабоды (15 хв.).**
Аб’яднайце ўдзельнікаў у групы не большыя чым па пяць чалавек. Раздайце групам раздатак 13.1 (першай групе), 13.2 (другой групе), 13.3 (трэцяй групе). У выпадку, калі ўтвораных груп будзе больш за тры, кожнай наступнай групе (чацвёртай, пятай, шостай і г. д.) раздайце тыя самыя раздаткі 13.1 (чацвёртай групе), 13.2 (пятай групе), 13.3 (шостай групе). Групы на падставе міжнародных нормаў і нормаў Канстытуцыі павінны вылучыць з раздаткаў і абмеркаваць:
1) элементы, якія ўключаюцца ў паняцце свабода слова (прытрымлівацца свайго меркавання, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю),
2) агульнае і спецыфічнае ў міжнародных нормах і Канстытуцыі Беларусі па пытаннях, якія тычацца свабоды слова.

Аб’яднайце ўдзельнікаў у тройкі, дзе будзе па адным прадстаўніку з груп, якія працавалі з раздаткамі 13.1, 13.2 і 13.3. Дайце магчымасць удзельнікам у тройках вытлумачыць вынікі сваёй працы.

Падсумуйце вынікі працы ў групах. Паспрабуйце абагульніць вынікі працы, звяртаючы ўвагу на наступнае:
а) палажэнні, якія вызначаюцца рознымі актамі і вызначаюць свабоду слова,
б) дапушчальныя абмежаванні свабоды слова і ўмовы абмежавання,
в) параўнанне палажэнняў і дапушчальных абмежаванняў.

**4. Абмяркуйце пытанні, звязаныя са свабодай слова (22 хв.).**
Выкарыстайце для абмеркавання гэтага пытання метад «Форум». У розных месцах памяшкання вывесіце доўгія лісты паперы (напрыклад змацаваныя паміж сабой у выглядзе стужкі ватманы). Стужка павінна выглядаць, як старонка інтэрнэт-форуму. Кожны з удзельнікаў можа прыдумаць сабе нік (мянушку-подпіс) і падпісвацца ім. Пры адказе на пытанні ці каментары выказванняў кагосьці трэба спачатку ставіць свой нік, а пазней нік асобы, якой даецца адказ ці каментар. Для большай зручнасці можна побач з плакатам з пытаннем для абмеркавання павесіць яшчэ адну стужку, для таго каб адначасова па адным пытанні выказвалася не адна асоба, а дзве. Такім чынам мы задзейнічаем адначасова не чатырох чалавек, якія будуць адказваць на розныя пытанні, а восем чалавек.

На кожным са змацаваных ватманаў трэба напісаць па адной тэме для абмеркавання на форуме. Задача ўдзельнікаў — даваць свае ўласныя каментары і адказы на прапанаваныя тэмы. Удзельнікі могуць свабодна пераходзіць ад аднаго да другога форуму і запісваць столькі думак і меркаванняў, колькі лічаць патрэбным, але не павінны пры гэтым размаўляць ці ўголас каментаваць выказванні іншых. Задача настаўніка ці адукатара — у тым каб выконваць ролю мадэратара форуму, які павінен кантраляваць, каб накірункі дыскусіі не адыходзілі ад тэмы і каб не было абразлівых каментароў. Карэктаваць дыскусію можна праз задаванне пытанняў ці прадстаўленне новых аргументаў па тэме і заахвочванне ўдзельнікаў да спрэчак.

Асноўныя пытанні для абмеркавання:
- У горадзе (вёсцы), дзе мы пражываем, ёсць дастатковая колькасць розных крыніц інфармацыі, якія дазваляюць вам атрымліваць поўную і праўдзівую інфармацыю, якая вам патрэбна.
- У Інтэрнэце вы можаце прадстаўляць, распаўсюджваць інфармацыю, якую толькі захочаце.
- Абмяжоўваць свабоду слова неабходна пры дапамозе... (дадайце).

**Тлумачальная інфармацыя**

**Метад «Форум» з'яўляецца спосабам правядзення дыскусіі ў пісьмовай форме. Прычым сам спосаб абмеркавання, адносная ананімнасць павінны ствараць дадатковыя аспекты для абмеркавання падчас падагульнення. Гэта азначае, што падчас правядзення падсумавання можна звярнуць увагу ўдзельнікаў на тое, што як яны сябе адчувалі падчас правядзення форума, ці маглі яны свабодна выказваць свае меркаванні і чаму; як уплывала на свабоду выказвання сваёй думкі ананімнасць, хто ці што абмяжоўвала свабоду слова і г. д.**

**Праз дадзенае практыкаванне павінны быць абмеркаваны тры асноўныя кампаненты — складнікі права на свабоднае выказванне сваёй думкі: права на збор інфармацыі, права на атрыманне інфармацыі і права на распаўсюджанне інфармацыі, думак, меркаванняў, а таксама праблема абмежавання свабоды слова і межы такога абмежавання.**

**Настаўнік ці адукатар павінен уважліва сачыць за тым, каб «пісьмовая дыскусія» не выходзіла за рамкі гэтых аспектаў.**

Падагульненне правядзіце пры дапамозе наступных пытанняў:
- Якія з выказванняў адносна свабоды слова і неабходнасці яе абароны вам падаліся найбольш слушнымі і аргументаванымі? Чаму?
- Ці было штосьці, што вас стрымлівала ў выказванні сваіх меркаванняў ці думак? Ці абмяжоўваліся вашыя магчымасці выказваць сваё меркаванне? Ці напісалі б вы тое самае без ніка?
- Як вы сябе адчувалі б, калі б нехта забараніў вам выказаць тую ці іншую думку ці меркаванне ў час дыскусіі? Патлумачце сваю пазіцыю.

**5. Падагульніце заняткі (4 хв.).**
Падсумаванне можна правесці вакол наступных пытанняў:
- Чым забяспечваецца свабода слова?
- Хто адказны за захаванне свабоды слова? Якую ролю ў яе захаванні адыгрывае асоба? Дзяржава? Міжнародная супольнасць?
- Ці ёсць у Беларусі праблемы са свабодай слова? Патлумачце сваю пазіцыю.

## АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ АБ СВАБОДЗЕ СЛОВА

Свабода слова — складовая і асноўная частка свабоды выражэння, альбо права чалавека выказваць свае думкі. Звычайна свабода слова ў сучасным свеце заключаецца ў свабодным выяўленні сваіх меркаванняў як у вуснай, так і ў пісьмовай форме (у сродках масавай інфармацыі: на тэлебачанні, радыё, у газетах і г. д.)

Свабода слова — гэта катэгорыя правоў чалавека, сутнасць якой раскрываецца як у міжнародных, так і ў нацыянальных нормах, у прыватнасці ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Канвенцыі аб абароне правоў чалавека, дакументах АБСЕ, нацыянальным заканадаўстве Беларусі.

Пад свабодай слова прынята разумець права бесперашкодна прытрымлівацца сваіх уласных меркаванняў і права на свабоднае выказванне свайго меркавання. Прычым свабоднае выказванне свайго меркавання складаецца з права шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі спосабамі і формамі.
Міжнародныя нормы, а за імі і нацыянальнае заканадаўства адзначаюць дапушчальныя прычыны абмежавання свабоды слова. Але такое абмежаванне можа быць здзейснена толькі пры выкананні трох асаблівых умоў: абмежаванне павінна грунтавацца на заканадаўстве, павінна быць накіравана на захаванне важных для асобы, грамадства і дзяржавы мэтаў і павінна быць адэкватным для дасягнення гэтай мэты.

Даследчыкі правоў чалавека лічаць, што законы, якія абмяжоўваюць свабоду слова, павінны быць максімальна празрыстымі і дакладнымі ў фармулёўках, для таго каб не было магчымасці няправільна інтэрпрэтаваць асобныя палажэнні такога закона, што можа прывесці да незаконных і несправядлівых абмежаванняў свабоды слова.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у ч. 3 арт. 34 канкрэтызуе кола пытанняў, якія могуць разглядацца ў якасці апраўданых мэтаў абмежавання свабоды слова. Такімі мэтамі могуць быць: абарона гонару, годнасці, асабістага і сямейнага жыцця грамадзян і поўнага ажыццяўлення імі сваіх правоў.
Пытанне абмежавання свабоды слова рэгламентуецца таксама міжнароднымі нормамі, напрыклад, прыведзенымі ніжэй.

### МІЖНАРОДНЫ ПАКТ АБ ГРАМАДЗЯНСКІХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАВАХ

**Арт. 19**

(...)

3. Карыстанне правамі, пазначанымі ў пункце 2 гэтага артыкула, накладае асаблівыя абавязкі і адказнасць. Таму яно можа пэўным чынам абмяжоўвацца, але такія абмежаванні павінны быць усталяваныя законам і неабходнымі:
   (a) для павагі правоў і рэпутацыі іншых асоб;
   (b) для аховы нацыянальнай бяспекі ці грамадскага парадку (ordre public) ці здароўя насельніцтва і яго маральных звычаяў.

### ЕЎРАПЕЙСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ АБ АБАРОНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І АСНОЎНЫХ СВАБОД

**Арт. 10 Свабода выражэння думак**

2. Ажыццяўленне гэтых свабод, якое накладвае абавязкі і адказнасць, можа быць спалучана з такімі фармальнасцямі, умовамі, абмежаваннямі ці санкцыямі, якія прадугледжаныя законам і неабходныя ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, тэрытарыяльнай цэласнасці ці грамадскага парадку, для прадухілення беспарадкаў ці злачынстваў, для аховы здароўя ці маральнасці, для абароны рэпутацыі ці правоў іншых людзей, для прадухілення выдавання інфармацыі, атрыманай канфідэнцыйна, ці для забеспячэння аўтарытэту ці бесстароннасці правасуддзя.

### ДАКУМЕНТ КАПЕНГАГЕНСКАЙ СУСТРЭЧЫ Ў РАМКАХ КАНФЕРЭНЦЫІ ПА ЧАЛАВЕЧЫМ ВЫМЯРЭННІ НБСЕ, 1990 г.

(9) Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць, што:
(9.1) – кожны чалавек мае права на свабоду выражэння, уключна з правам на камунікацыю. Гэтае права ўключае свабоду прытрымлівацца ўласнага меркавання і

атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі без умяшання з боку дзяржаўных уладаў і незалежна ад дзяржаўных межаў.

Выкананне гэтага права можа падпадаць толькі пад такія абмежаванні, якія прадугледжаныя ў законе і адпавядаюць міжнародным стандартам. У прыватнасці, не накладваюцца ніякія абмежаванні на доступ да сродкаў для памнажэння дакументаў усіх відаў і на іх выкарыстанне, пры выкананні, тым не менш, правоў, што датычаць інтэлектуальнай уласнасці, уключна з аўтарскім правам.

Гістарычна лічыцца, што свабода слова ўзнікла як інструмент для забеспячэння інфармаванасці і падтрымання кампетэнтнасці дзяржаўных органаў улады. Так Прывілеі канца XV ст. ў Вялікім княстве Літоўскім гарантавалі панам-радзе, прадстаўнічаму органу вышэйшых саноўнікаў, а пазней паслам парламента — Сойма і мясцовых соймікаў права свабодна абмяркоўваць справы, якія тычыліся ВКЛ і службовых асоб дзяржаўных органаў.

Сёння, разам з узвышэннем ролі і значэння чалавека ў розных галінах, гэтае права становіцца асновай для развіцця самога чалавека, да павелічэння яго ролі ў вырашэнні розных праблем грамадства і дзяржавы, яго ўдзелу ў жыцці грамадства.

Свабода слова звязана з асаблівай культурай, у аснове якой ляжыць павага да іншага меркавання і пошук ісціны праз дыскусію, з пытаннямі пошуку праўды, самакіравання, самарэалізацыі асобы, натуральных правоў чалавека і іх абароны. Свабода слова азначае, што людзі павінны мець не проста магчымасць абмяркоўваць нейкія грамадскія і палітычныя пытанні, але выкарыстоўваць свабоду слова для прыняцця свядомых рашэнняў па арганізацыі жыцця сваёй супольнасці і дзяржавы.

У спалучэнні з дэмакратычнымі працэдурамі, якія забяспечваюць падсправаздачнасць ураду перад выбаршчыкамі, свабода слова становіцца адным з найважнейшых інструментаў абароны ўсіх правоў чалавека.

Свабоднае выказванне сваіх думак з’яўляецца натуральнай патрэбай, якая вынікае з прыроды чалавека, таму кожны мае права выказвацца, пісаць, распаўсюджваць свае ідэі. Абмежаваць гэтае натуральнае права чалавека можна толькі ў выпадках, калі асоба злоўжывае свабодай, а таксама ў акрэсленых законам выпадках.

Трэба адзначыць, што існуе розны падыход да вызначэння межаў крытыкі і выказвання ўласнага меркавання ў адносінах да простых людзей і, напрыклад, да палітыкаў. Асабліва добра дадзеная праблема асвятляецца ў рашэннях Еўрапейскага суда, прынятых паводле арт. 10 Еўрапейскай канвенцыі. Згодна з дадзенымі судовымі рашэннямі, палітыкі прызнаюцца Судом публічнымі асобамі, якія абралі сабе спецыяльнасць — палітыку, а гэта азначае, што павінны быць падрыхтаваны да больш пільнай увагі ў адносінах да сябе і сваёй дзейнасці. Гэта азначае, што згодна з Еўрапейскай канвенцыяй простым грамадзянам дазваляецца свабодна выказвацца адносна дзейнасці палітыкаў і гэтая крытыка не разглядаецца як абраза гонару і годнасці палітыка. Хоць такое права крытычнага меркавання мае большыя абмежаванні ў адносінах да простых грамадзян.

Ніжэй пададзены прыклад **рашэння Еўрапейскага суда (2005 г.) па справе** ***«Грынберг супраць Расіі»***, якая тычылася арт. 10 Канвенцыі аб правах чалавека.

Заяўнік, Ісаак Паўлавіч Грынберг — грамадзянін Расіі, які пражываў у г. Ульянаўску. 6 верасня 2002 г. газета «Губерния» надрукавала артыкул заяўніка пра генерала Шаманава, які быў абраны губернатарам Ульянаўскай вобласці. У артыкуле сцвярджалася, што генерал «вядзе сапраўдную вайну» супраць незалежнай прэсы і журналістаў. Артыкул таксама расказваў аб тым, што сп. Шаманаў падтрымліваў палкоўніка Буданава, які забіў 18-гадовую чачэнскую дзяўчыну. Артыкул заканчваўся словамі «ні сораму ні сумлення» («ни стыда ни совести»). 10 верасня 2002 г. сп. Шаманаў падаў іск у суд аб абароне гонару і годнасці супраць сп. Грынберга і заснавальніка газеты. Ён заявіў, што сцверджанне пра тое, што у яго няма «ні сораму ні сумлення» было хлуснёй, што нанесла страту яго рэпутацыі. У лістападзе раённы суд Ульянаўска прызнаў рацыю сп. Шаманава. Рашэнне было абскарджана, але зноў без поспеху — абласны суд Ульянаўска пацвердзіў рашэнне раённага суда. Заяўнік сцвярджаў, што ягонае права мець думку і інфармаваць аб ёй гарантаванае арт. 29 Канстытуцыі РФ і што суд не правёў абавязковага ў такіх выпадках падзелу паміж ацэначнымі меркаваннямі і фактычнымі звесткамі. Усе далейшыя звароты заяўніка былі таксама беспаспяховымі. Скарга ў Еўрапейскі суд была пададзеная 23 чэрвеня 2003 г. і была прызнаная прымальнай да разгляду 28 кастрычніка 2004 г.

Еўрапейскі суд адзінагалосна пастанавіў, што адбылося парушэнне Расіяй артыкула 10 Канвенцыі аб правах чалавека, і прысудзіў кампенсацыю Расіяй заяўніку ў памеры 120 еўра, а таксама маральнай шкоды (1000 еўра). Суд сцвердзіў, што расійскае заканадаўства аб абароне гонару і годнасці не праводзіла патрэбнага падзелу паміж ацэначнымі меркаваннямі і фактычнымі сцвярджэннямі (такім чынам, незалежна ад фактычнага зместу інфармацыі асоба павінна даказваць у расійскім судзе праўдзівасць інфармацыі, але суды не вывучаюць, ці з'яўляецца аспрэчванае сцвярджэнне ацэначным меркаваннем, праўдзівасць якога не падлягае доказванню). Суд нагадаў, што існаванне фактаў можна прадэманстраваць, у той час як справядлівасць ацэначных меркаванняў даказаць нельга. Патрабаванне даказаць праўдзівасць ацэначнага меркавання немагчыма выканаць і яно парушае свабоду думкі, якая з'яўляецца асноўнай часткай арт. 10. Суд сцвердзіў, што заяўнік быў прызнаны вінаватым расійскімі судамі за тое, што не змог прадэманстраваць у судзе, што генерал Шаманаў сапраўды не мае ні сораму ні сумлення, хаця даказаць гэта немагчыма. Суд дадаткова адзначыў, што сцвярджэнне зроблена ў рамках артыкула ў газеце, які закрануў важнае грамадскае пытанне — пытанне аб свабодзе СМІ ва Ульянаўскай вобласці. У артыкуле крытыкаваліся паводзіны губернатара вобласці, абранага ў выніку непасрэдных выбараў, іншымі словамі — прафесійнага палітыка, у адносінах да якога рамкі дапушчальнай крытыкі значна шырэйшыя, чым да прыватнай асобы. Суды Расіі не змаглі пераканаўча даказаць, што патрэба абароны рэпутацыі палітыка вышэйшая за права заяўніка на свабоду выражэння і агульнай зацікаўленасці ў прасоўванні гэтай свабоды, калі закранаецца пытанне грамадскай значнасці. Такім чынам, суд пастанавіў, што ўмяшальніцтва судоў Расіі не было неабходнае ў дэмакратычным грамадстве і, адпаведна, мела месца парушэнне арт. 10 Канвецыі.

Дадаткова па прыкладах спраў Еўрапейскага суда паводле артыкулу 10 Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека глядзіце: http://www.medialaw.ru/article10/6/1/1.htm

**РАЗДАТАК № 13.1.**

## ВЫТРЫМКІ З МІЖНАРОДНЫХ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ НОРМАЎ АБ СВАБОДЗЕ СЛОВА

### МІЖНАРОДНЫ ПАКТ АБ ГРАМАДЗЯНСКІХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАВАХ

**Арт. 19.**

1. Кожны чалавек мае права бесперашкодна прытрымлівацца сваіх меркаванняў.
2. Кожны чалавек мае права на свабоду выражэння; гэтае права ўключае свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць усякага кшталту інфармацыю ды ідэі, не зважаючы на дзяржаўныя межы, як вусна, так і на пісьме ці ў друку, у выглядзе мастацкіх твораў ці іншым спосабам на свой выбар.

### КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Арт. 33.**

Кожнаму гарантуецца свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне.
Ніхто не можа быць прымушаны да выказвання сваіх перакананняў або адмовы ад іх.
Манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадскімі аб'яднаннямі або асобнымі грамадзянамі, а таксама цэнзура не дапускаюцца.

**Арт. 34.**

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя.
Дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, службовыя асобы абавязаны даць грамадзяніну Рэспублікі Беларусь магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі, якія закранаюць яго правы і законныя інтарэсы.
Карыстанне інфармацыяй можа быць абмежавана заканадаўствам у мэтах абароны гонару, годнасці, асабістага і сямейнага жыцця грамадзян і поўнага ажыццяўлення імі сваіх правоў.

**РАЗДАТАК № 13.2.**

## ВЫТРЫМКІ З МІЖНАРОДНЫХ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ НОРМАЎ АБ СВАБОДЗЕ СЛОВА

### ЕЎРАПЕЙСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ АБ АБАРОНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І АСНОЎНЫХ СВАБОД

**Арт. 10. Свабода выражэння думак**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду выражэння думак. Гэтае права ўключае свабоду прытрымлівацца свайго меркавання і свабоду атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі без аніякага ўмяшання з боку органаў дзяржаўнай улады і не зважаючы на межы. Дадзены артыкул не перашкаджае дзяржавам ажыццяўляць ліцэнзаванне радыёвяшчальных, тэлевізійных ці кінематаграфічных прадпрыемстваў.

### КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Арт. 33.**

Кожнаму гарантуецца свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне.
Ніхто не можа быць прымушаны да выказвання сваіх перакананняў або адмовы ад іх.
Манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадскімі аб'яднаннямі або асобнымі грамадзянамі, а таксама цэнзура не дапускаюцца.

**Арт. 34.**

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя.
Дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, службовыя асобы абавязаны даць грамадзяніну Рэспублікі Беларусь магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі, якія закранаюць яго правы і законныя інтарэсы.
Карыстанне інфармацыяй можа быць абмежавана заканадаўствам у мэтах абароны гонару, годнасці, асабістага і сямейнага жыцця грамадзян і поўнага ажыццяўлення імі сваіх правоў.

## РАЗДАТАК № 13.3.

### ВЫТРЫМКІ З МІЖНАРОДНЫХ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ НОРМАЎ АБ СВАБОДЗЕ СЛОВА

### ДАКУМЕНТ КАПЕНГАГЕНСКАЙ СУСТРЭЧЫ Ў РАМКАХ КАНФЕРЭНЦЫІ ПА ЧАЛАВЕЧЫМ ВЫМЯРЭННІ НБСЕ, 1990 г.

**(9) Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць, што:**

**(9.1)** – кожны чалавек мае права на свабоду выражэння, уключна з правам на камунікацыю. Гэтае права ўключае свабоду прытрымліваццa ўласнага меркавання і атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі без умяшання з боку дзяржаўных уладаў і незалежна ад дзяржаўных межаў.

### КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Арт. 33.**

Кожнаму гарантуецца свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне.
Ніхто не можа быць прымушаны да выказвання сваіх перакананняў або адмовы ад іх.
Манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадскімі аб'яднаннямі або асобнымі грамадзянамі, а таксама цэнзура не дапускаюцца.

**Арт. 34.**

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя.
Дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, службовыя асобы абавязаны даць грамадзяніну Рэспублікі Беларусь магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі, якія закранаюць яго правы і законныя інтарэсы.
Карыстанне інфармацыяй можа быць абмежавана заканадаўствам у мэтах абароны гонару, годнасці, асабістага і сямейнага жыцця грамадзян і поўнага ажыццяўлення імі сваіх правоў.

# 14. СВАБОДНЫЯ І СПРАВЯДЛІВЫЯ ВЫБАРЫ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- асноўныя стандарты і прынцыпы свабодных і справядлівых выбараў;
- як сябе пав одзіць у час выбараў.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- аналізаваць працэс выбараў на падставе прынцыпаў свабодных і справядлівых выбараў;
- аргументаваць сваю пазіцыю адносна свабодных і справядлівых выбараў і прынцыпаў, на якіх яны грунтуюцца.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да свабодных і справядлівых выбараў як да аднаго з асноўных правоў чалавека.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі — 7 хв.
2. Абвяшчэнне тэмы і чаканых вынікаў заняткаў — 1 хв.
3. Абмеркаванне прынцыпаў свабодных і справядлівых выбараў — 32 хв.
4. Падагульненне заняткаў — 5 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (7 хв.).**
Папрасіце навучэнцаў узгадаць працэс выбараў, у якіх ім даводзілася ўдзельнічаць (напрыклад, у выбарах старасты класа). Папрасіце ўзгадаць, што адбываецца падчас выбараў, крок за крокам. Запішыце адказы на ватман ці дошку.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Гэтая частка заняткаў павінна не толькі засяродзіць увагу ўдзельнікаў на тэме, але і стварыць умовы для пазнейшага абмеркавання прынцыпаў справядлівых выбараў, якія будуць абмяркоўвацца ў наступных частках заняткаў. Менавіта з гэтай прычыны варта запісаць этапы правядзення выбараў.**

**Выбары ўключаюць у сябе не толькі само галасаванне, якое з'яўляецца толькі адным з этапаў працэсу выбараў. Працэс выбараў умоўна можна падзяліць на наступныя этапы:**

**1) абвяшчэнне выбараў, 2) вылучэнне кандыдатаў, 3) выбарчая кампанія (агітацыя — прэзентацыя праграм кандыдатаў, выступленні кандыдатаў і г. д.), 4) галасаванне, 5) падлік галасоў, 6) абвяшчэнне вынікаў выбараў, 7) разгляд пададзеных скаргаў. У тым выпадку, калі ўсе скаргі разгледжаны і абвешчаны вынікі выбараў, гэта азначае, што выбары адбыліся.**

Пасля запісу этапаў галасавання можна задаць наступныя пытанні:
- Для чаго праводзяцца выбары?
- Ці былі выбары, у якіх вы ўдзельнічалі, свабоднымі і справядлівымі? Чаму вы лічыце іх свабоднымі і справядлівымі?

**2. Прадстаўце тэму і чаканыя вынікі заняткаў (1 хв.).**

**3. Абмяркуйце прынцыпы свабодных і справядлівых выбараў (32 хв.).**
Аб'яднайце ўдзельнікаў у групы (не большыя за пяць чалавек). Кожнай групе раздайце раздатак 14.1. Папрасіце ўдзельнікаў на падставе міжнародных нормаў, вытрымкі з якіх прыведзеныя ў дадзеным раздатку, вылучыць і запісаць на картках прынцыпы, якія робяць выбары свабоднымі і справядлівымі. Кожны асобны прынцып павінен быць запісаны на адной асобнай картцы (напрыклад, аркушы А4).

Прэзентацыю прынцыпаў можна арганізаваць праз вывешванне картак на сцяне альбо раскладанне на падлозе ў выглядзе дывана.

Кожны ўдзельнік павінен прэзентаваць адзін прынцып. Для гэтага прадстаўнікі груп павінны ўзяць адну картку з асобным прынцыпам. Кожная група мае права прэзентаваць толькі адзін з прынцыпаў, далей прадстаўнік наступнай групы прэзентуе наступны прынцып. Важна, каб групы не проста называлі прынцыпы, а тлумачылі, як яны могуць паўплываць на тое, што выбары будуць свабоднымі і справядлівымі, і як адсутнасць гэтага прынцыпу можа прывесці да таго, што выбары не будуць свабоднымі і справядлівымі. Папрасіце ўдзельнікаў звяртаць

асаблівую ўвагу на гэты аспект падчас прэзентацыі прынцыпаў. Падсумоўвайце атрыманую інфармацыю і рабіце ўласныя каментары, абапіраючыся на дадатковую інфармацыю.

Калі ўсе прынцыпы будуць агучаныя, настаўнік ці адукатар можа арганізаваць дыскусію на падставе атрыманай інфармацыі. Дыскусію можна арганізаваць пры дапамозе метаду «Свабодны мікрафон». Выкарыстайце наступныя пытанні:
- Як выбары звязаны з правамі чалавека?
- Калі ў вашым класе/групе ёсць выбары, ці можна назваць іх свабоднымі і справядлівымі? Чаму?
- Ці, на вашу думку, можна назваць выбары ў Беларусі свабоднымі і справядлівымі? Патлумачце.
- Ці парушэнне толькі аднаго нейкага прынцыпу можа прывесці да таго, што выбары будуць несправядлівымі і несвабоднымі? Патлумачце сваю пазіцыю.

**4. Падагульніце занятк і (5 хв.).**
Падагульненне заняткаў можна правесці пры дапамозе наступных пытанняў:
- Чаму неабходна, каб выбары былі свабоднымі і справядлівымі?
- Што даюць людзям свабодныя і справядлівыя выбары?
- Ці хацелі б вы (нават калі не можаце па ўзросце, то гіпатэтычна) абрацца ў парламент ці мясцовыя органы ўлады? Чаму?

**Дадатковая інфармацыя**

### АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ ПА ПРЫНЦЫПАХ СВАБОДНЫХ І СПРАВЯДЛІВЫХ ВЫБАРАЎ

Выбары — гэта не толькі дзень галасавання. Выбары — гэта доўгатэрміновы працэс, які пачынаецца з абвяшчэння даты выбараў і стварэння выбарчых камісій. Далей адбываецца вылучэнне кандыдатаў, агітацыя, самі выбары, падлік галасоў, абвяшчэнне афіцыйных вынікаў выбараў.

Грамадзяне Беларусі маюць права браць удзел у выбарах (галасаваць), а таксама быць абранымі дэпутатамі мясцовых Саветаў ці ў беларускі парламент з 18 гадоў. Пры мясцовых органах улады могуць ствараюцца мясцовыя тэрытарыяльныя самакіраванні. У выбарах прадстаўнікоў гэтых самакіраванняў маюць права прымаць удзел усе, хто дасягнуў 16-гадовага ўзросту.

Выбары — гэта асаблівы спосаб фармавання дзяржаўных органаў улады, падчас якога грамадзяне прымаюць удзел не толькі ў галасаванні, але і ва ўсім працэсе.

У заўвагах агульнага парадку, зробленых Камітэтам па правах чалавека з мэтай тлумачэння арт. 25 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, якія тычыцца выбараў, падаецца больш дакладнае азначэнне сутнасці права чалавека абіраць органы ўлады і быць абраным:

1. Арт. 25 пакта прызнае і абараняе права кожнага грамадзяніна браць удзел у вядзенні дзяржаўных спраў, галасаваць і быць абраным і дапускацца да дзяржаўнай службы. Незалежна ад таго, якая ў краіне дзейнічае канстытуцыя ці якое кіраўніцтва ў ёй знаходзіцца ва ўладзе, згодна з палажэннямі пакта дзяржава абавязана прымаць такія заканадаўчыя і іншыя меры, якія неабходны для ажыццяўлення правоў, прызнаваных у дадзеным Пакце. Арт. 25 закладае падмурак дэмакратычнага кіравання, якое грунтуецца на згодзе народа і адпавядае прынцыпам пакта.

2. ... Арт. 25 тычыцца права асобных людзей браць удзел у працэсах, якія адносяцца да вядзення дзяржаўных спраў. Згодна з першым Факультатыўным пратаколам гэтыя правы разглядаюцца ў якасці правоў асобы, могуць служыць асновай для падачы паведамленняў. (...)
6. Грамадзяне бяруць удзел у вядзенні дзяржаўных спраў непасрэдна ў тым выпадку, калі яны ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы ў якасці членаў заканадаўчых органаў ці займаюць выканаўчыя пасады.

7. У тым выпадку, калі грамадзяне бяруць удзел у дзяржаўных справах праз пасярэдніцтва свабодна абраных прадстаўнікоў, з арт. 25 вынікае, што гэтыя прадстаўнікі фактычна ажыццяўляюць уладныя паўнамоцтвы і з’яўляюцца падсправаздачнымі ў межах выбарчага працэсу ў сувязі з ажыццяўленнем імі гэтых паўнамоцтваў. З гэтага артыкула таксама вынікае, што прадстаўнікі ажыццяўляюць толькі тыя паўнамоцтвы, якімі яны надзелены

ў адпаведнасці з палажэннямі канстытуцыі. Удзел у вядзенні дзяржаўных спраў праз свабодна абраных прадстаўнікоў ажыццяўляецца ў межах выбарчых працэдур, якія павінны быць усталяваны ў законах, што адпавядаюць пункту b) арт. 25 Міжнароднага пакта.

8. Акрамя таго, грамадзяне бяруць удзел у вядзенні дзяржаўных спраў у межах агульнанародных дыскусій і дыялогу са сваімі прадстаўнікамі ці шляхам ажыццяўлення свайго права на арганізацыю. Спрыяннем такому ўдзелу з'яўляецца права на свабоднае выражэнне свайго меркавання, на мірныя сходы і на свабоду асацыяцыі.
(...)
12. Права на свабоднае выражэнне свайго меркавання, мірныя сходы і на свабоду асацыяцыі з'яўляецца асноўнай умовай для эфектыўнага ажыццяўлення права голасу і павінна быць цалкам абаронена. (...)

19. (...) справядлівыя і свабодныя выбары павінны праводзіцца на перыядычнай аснове ў адпаведнасці з законам, які гарантуе сапраўднае ажыццяўленне права галасаваць і быць абраным. Выбаршчыкам павінна быць дадзена магчымасць самастойна фармаваць асабістую думку, свабодную ад гвалту ці пагрозы гвалту, прымусу, ці якогасьці умяшання.

20. Трэба стварыць незалежны орган для кантролю за ходам выбараў і для забеспячэння іх справядлівасці, бесстароннасці і адпаведнасці заканадаўству. Дзяржавам трэба прымаць меры, якія гарантуюць выкананне патрабаванняў аб таемным галасаванні падчас выбараў, уключаючы завочнае галасаванне, калі такая сістэма існуе. (...) Неабходна гарантаваць недатыкальнасць скрыняў для галасавання і забяспечыць падлік галасоў у прысутнасці кандыдатаў ці іх прадстаўнікоў. (...)

25. Для забеспячэння поўнага ажыццяўлення правоў, замацаваных у арт. 25, асаблівае значэнне мае свабодны абмен інфармацыяй і меркаваннямі па дзяржаўных і палітычных пытаннях паміж грамадзянамі, кандыдатамі і абранымі прадстаўнікамі народа. Гэта прадугледжвае свабоду прэсы і іншых сродкаў масавай інфармацыі, якая б магла каментаваць дзяржаўныя пытанні без кантролю ці абмежавання і інфармаваць пра іх грамадскасць. (...)

З поўным тэкстам дадзеных заўваг і патрабаванняў да выбараў, якія выстаўляюцца ў адпаведнасці з тлумачэннем арт. 25 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, можна азнаёміцца па электронным адрасе: http://www1.umn.edu/humanrts/russian/gencomm/Rhrcom25.html

Паколькі ў працэсе выбараў удзельнічае вялікая колькасць людзей (адны спаборнічаюць паміж сабой у якасці кандыдатаў, другія забяспечваюць магчымасць спаборніцтва і арганізуюць працэс галасавання і падліку галасоў, трэція галасуюць), то вельмі важным з'яўляецца кантроль за выбарамі, які дазваляе праверыць, ці былі гэтыя выбары сапраўды свабоднымі і справядлівымі. З гэтай мэтай існуюць спецыяльныя механізмы кантролю з боку грамадзян за працэсам выбараў. Назіранне праводзіцца з мэтай адсочвання адпаведнасці выбараў існуючым міжнародным і нацыянальным стандартам, якія не павінны супярэчыць міжнародным нормам.

Удзельнічаць у кантролі за выбарамі грамадзяне могуць, напрыклад, праз уваходжанне ў склад выбарчых камісій і дзейнасць у іх, а таксама праз інстытуты назірання. Назіранне за выбарамі можа ажыццяўляцца грамадзянамі Беларусі, замежнымі грамадзянамі і міжнароднымі арганізацыямі. Правы і паўнамоцтвы назіральнікаў прапісаны ў арт. 13 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Пры правядзенні выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі маюць права прысутнічаць назіральнікі — дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў, даверанныя асобы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, замежныя (міжнародныя) назіральнікі, а таксама прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі ў парадку, усталяваным Цэнтральнай выбарчай камісіяй.

Міжнародныя назіральнікі ад замежных дзяржаў і міжнародных арганізацый запрашаюцца ў Рэспубліку Беларусь Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Палатай прадстаўнікоў, Саветам Рэспублікі, Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай выбарчай камісіяй. Міжнародныя назіральнікі акрэдытуюцца Цэнтральнай выбарчай камісіяй. Тэрмін паўнамоцтваў міжнароднага назіральніка

пачынаецца з дня яго акрэдытацыі і заканчваецца ў дзень апублікавання вынікаў выбараў, рэферэндуму, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі.
У рэгіёне АБСЕ назіранне за выбарамі ажыццяўляе БДІПЧ АБСЕ і па выніках правядзення назірання прадстаўляе справаздачы. Справаздачы БДІПЧ АБСЕ па выніках назірання за выбарамі ў краінах АБСЕ можна знайсці на вэб-старонцы БДІПЧ http://www.osce.org/odihr-elections/14207.html

Дадатковы матэрыял па выбарах і адпаведных стандартах і прынцыпах можна знайсці на сайце БДІПЧ АБСЕ («Существующие обязательства по проведению демократических выборов в государствах-участниках ОБСЕ» http://www.osce.org/publications/odihr/2003/10/12345_127_ru.pdf )

**МІЖНАРОДНЫ ПАКТ АБ ГРАМАДЗЯНСКІХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАВАХ** (вытрымкі)

**Артыкул 25**

Кожны грамадзянін павінен мець права і магчымасць, не зважаючы на адрозненні, пазначаныя ў артыкуле 2, і без неабгрунтаваных абмежаванняў:

(a) браць удзел у дзяржаўных справах як непасрэдна, так і праз свабодна абраных прадстаўнікоў;
(b) галасаваць і быць абраным на справядлівых перыядычных выбарах, якія праводзяцца на аснове ўсеагульнага і роўнага выбарчага права, таямніцы галасавання, пры гарантаваным свабодным выяўленні волі выбарцаў;
(c) мець доступ да дзяржаўнай службы ў сваёй дзяржаве на агульных умовах роўнасці.

**ДАКУМЕНТ КАПЕНГАГЕНСКАЙ СУСТРЭЧЫ Ў РАМКАХ КАНФЕРЭНЦЫІ ПА ЧАЛАВЕЧЫМ ВЫМЯРЭННІ НБСЕ, 1990 г.** (вытрымкі)

(7) - Каб воля народа служыла асновай улады кіраўніцтва, дзяржавы-ўдзельніцы:
(7.1) - ладзяць свабодныя выбары з разумнай перыядычнасцю, як гэта прадугледжана законам;
(7.2) - дапускаюць, каб усе мандаты прынамсі ў адной палаце нацыянальнага заканадаўчага органа былі аб’ектам вольнай спаборнасці кандыдатаў на ўсенародных выбарах;
(7.3) – гарантуюць дарослым грамадзянам усеагульнае і роўнае выбарчае права;
(7.4) – забяспечваюць, каб галасаванне ладзілася таемна ці ўжывалася раўнацэнная працэдура вольнага галасавання і каб падлік галасоў і паведамленні аб выніках былі сумленнымі, а афіцыйныя вынікі публікаваліся;
(7.5) – паважаюць права грамадзян дамагацца палітычных ці дзяржаўных пасад у асабістай якасці ці ў якасці прадстаўнікоў палітычных партый ці арганізацый без дыскрымінацыі;
(7.6) – паважаюць права асоб і груп людзей ствараць ва ўмовах поўнай свабоды свае палітычныя партыі ці іншыя палітычныя арганізацыі і даюць такім палітычным партыям і арганізацыям неабходныя прававыя гарантыі, якія дазваляюць ім спаборнічаць адно з адным на аснове роўнасці перад законам і органамі ўлады;
(7.7) – забяспечваюць, каб закон і дзяржаўная палітыка дапускалі правядзенне палітычных кампаніяў у атмасферы свабоды і справядлівасці, дзе ніякія адміністрацыйныя дзеянні, гвалт ці запалохванне не ўтрымлівалі б партыі і кандыдатаў ад вольнага выяўлення сваіх поглядаў і ацэнак, а таксама не замінaлі б выбаршчыкам знаёміцца з імі і абмяркоўваць іх ці галасаваць свабодна, не баючыся пакарання;
(7.8) – забяспечваюць, каб не ўтвараліся якіясьці прававыя ці адміністрацыйныя бар’еры для доступу да сродкаў масавай інфармацыі на недыскрымінацыйнай аснове для ўсіх палітычных груповак і асобных грамадзян, якія хочуць узяць удзел у выбарчым працэсе;
(7.9) – забяспечваюць, каб кандыдаты, якія атрымалі неабходную колькасць галасоў, вызначаную законам, належным чынам уступалі на пасаду і маглі заставацца на пасадзе да заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў ці да іх перапынення іншым чынам, які рэгулюецца законам у адпаведнасці з дэмакратычнымі парламенцкімі і канстытуцыйнымі працэдурамі.
(8) - Дзяржавы-ўдзельніцы мяркуюць, што прысутнасць назіральнікаў, як замежных, так і нацыянальных, можа павысіць аўтарытэтнасць выбарчага працэсу для дзяржаў, дзе ладзяцца выбары. Таму яны запрашаюць назіральнікаў ад іншых дзяржаў-удзельніц АБСЕ і розных адпаведных прыватных установаў і арганізацый, якія гэтага захочуць, назіраць за ходаю іх нацыянальных выбараў у аб’ёме, які дазваляецца законам. Яны таксама будуць імкнуцца спрыяць такому самаму доступу да выбарчых працэсаў, што ладзяцца на ніжэйшым, чым агульнанацыянальны, узроўні. Такія назіральнікі будуць браць на сябе абавязак не ўмешвацца ў выбарчы працэс.

# 15. ЗАБАРОНА НА ВЫКАРЫСТАННЕ АБАВЯЗКОВАЙ ЦІ ПРЫМУСОВАЙ ПРАЦЫ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- паняцце *прымусовай ці абавязковай працы*;
- асобныя нормы міжнароднага заканадаўства, якія тычацца забароны на выкарыстанне абавязковай ці прымусовай працы (у тым ліку дзіцячай).

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- знаходзіць прыкметы прымусовай ці абавязковай працы;
- разважаць адносна магчымасці выкарыстання прымусовай ці абавязковай працы ў асобных выпадках і адносна небяспек, звязаных з такім выкарыстаннем.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да незаконнай прымусовай і абавязковай дзіцячай працы як да фактаў парушэння правоў чалавека.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі — 3 хв.
2. Прадстаўленне тэмы і чаканых вынікаў заняткаў — 1 хв.
3. Прымусовая ці абавязковая праца: сутнасць паняццяў — 8 хв.
4. Прыклады прымусовай ці абавязковай працы — 25 хв.
5. Падагульненне вынікаў заняткаў — 8 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (3 хв.).**
Запытайце ў навучэнцаў, ці працавалі яны ўжо. Калі так, то ў якім узросце яны ўладкаваліся працаваць (напрыклад, у час школьных канікул і г. д.).

Запытайце, працавалі яны па сваім жаданні ці пад прымусам? Калі іх прымусілі, чаму яны пагадзіліся працаваць? Хто і як іх прымусіў працаваць?

**2. Прадстаўце тэму і чаканыя вынікі заняткаў (1 хв.).**

**3. Разгледзьце паняцце *прымусовая ці абавязковая праца*, замацаваныя ў міжнародных дакументах (8 хв.).**
Падзяліце ўдзельнікаў заняткаў на тры роўныя групы. Кожнаму ўдзельніку групы раздайце раздатак 15.1. Дайце групам час пазнаёміцца з нормамі міжнароднага права, якія тычацца правоў дзіцяці і прымусовай працы, а таксама час падрыхтавацца да абмеркавання прачытанага матэрыялу і далейшай працы на яго аснове.

Пасля знаёмства з раздаткамі задайце навучэнцам наступныя пытанні:
- Якую працу можна назваць прымусовай ці абавязковай?
- Прывядзіце прыклад прымусовай ці абавязковай працы. Чаму вы лічыце, што дадзеная праца з’яўляецца прымусовай ці абавязковай?

**4. Разгледзьце прыклады прымусовай ці абавязковай працы (25 хв.).**
Пазнаёмце ўдзельнікаў з правіламі далейшай самастойнай працы. Кожная група павінна будзе на працягу 10 хвілін выбраць прыклад прымусовай ці абавязковай працы, звязаны з непаўналетнімі, абмеркаваць яго і падрыхтаваць прэзентацыю выбранага выпадку прымусовай ці абавязковай працы ў выглядзе статуі (удзельнікі груп павінны будуць праілюстраваць абраны імі выпадак, стварыўшы «статую», з удзелам усіх удзельнікаў групы (кожны ўдзельнік павінен быць нейкім элементам статуі). Статуя не можа рухацца, іншыя групы павінны зразумець і пазнаць прадстаўлены ім выпадак.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Прымусовай працай можна лічыць любую працу, на якую асоба добраахвотна не пагадзілася і за невыкананне якой вызначана нейкае пакаранне. Прычым нават той факт, што праца, якую выконвае асоба, аплачваецца, не сведчыць пра тое, што гэта праца не з’яўляецца прымусовай.**

**Прыкладам прымусовай працы можа быць любая праца ў школе ці ў іншых дзяржаўных установах, на якую асоба не дала сваю згоду. Пад катэгорыю прымусовай працы падпадаюць выпадкі, калі прадстаўнікі**

**дзяржавы прымушаюць непаўналетняга працаваць без яго/яе згоды і за адмову выконваць такую працу да яго/яе можа быць прыменена пакаранне.**

**Такім чынам асноўнымі прыметамі прымусовай працы з'яўляюцца:**
**1) адсутнасць згоды непаўналетняга выконваць нейкую працу;**
**2) за невыкананне гэтай працы вызначана пакаранне. Для выканання дадзенага задання істотным з'яўляецца не сам прыклад нейкай працы, а наяўнасць гэтых дзвюх прыкмет прымусовай працы.**

**У выпадку, калі ўдзельнікі не могуць самастойна назваць прыклады прымусовай працы, настаўніку варта патлумачыць дзве прыкметы прымусовай працы.**

**Больш падрабязную інфармацыю пра прымусовую працу глядзі ў дадатковай інфармацыі да дадзенага занятка.**

Кожная група па чарзе дэманструе сваю «статую». На прэзентацыю і абмеркаванне кожнай статуі адводзіцца 5 хвілін.

1) Група прэзентуе сваю «статую», а іншыя групы выказваюць меркаванні адносна таго, што гэта за выпадак прымусовай і абавязковай працы непаўналетніх.
2) Група, якая дэманстравала «статую», тлумачыць яе сэнс.
3) Усе тры групы абмяркоўваюць «статую» і выпадак, які яна прадстаўляла.
Для абмеркавання настаўнік можа задаць наступныя пытанні:
   - Ці можна разглядаць дадзены выпадак як прымусовую ці абавязковую працу непаўналетняга? Патлумачце свой адказ.
   - Што трэба было б змяніць для таго, каб дадзены выпадак выглядаў як прымусовая ці абавязковая праца?

Пасля падобнай прэзентацыі першай групы — другая і трэцяя па чарзе прэзентуюць сваю «статую» па той самай схеме і абмяркоўваюцца тыя самыя пытанні.

**5. Падагульніце вынікі заняткаў (8 хв.).**
Пасля прэзентацый «статуй» выведзіце ўдзельнікаў з роляў. Для агульнага абмеркавання прапануюцца наступныя пытанні:
- Ці можа быць прымусовая ці абавязковая праца карыснай? Чаму? Прывядзіце прыклады (настаўнік можа даць свае тлумачэнні з прыкладамі, якія тычацца «законных» выпадкаў прымусовай ці абавязковай працы на карысць грамадства).
- Чым небяспечна прымусовая ці абавязковая праца ў адносінах да непаўналетніх?
- Якія аспекты правоў чалавека парушае прымусовая праца?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Для таго каб даваць пісьмовыя каментары па дадзеных пытаннях, звярніцеся да Дадатковай інфармацыі, а таксама дакументаў: Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Канвенцыі аб правах дзяцей, Дакументаў АБСЕ, прыкладзеных да дапаможніка.**

**Дадатковая інфармацыя**

## ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА

Перш чым разглядаць пытанне прымусовай працы, варта акрэсліць сучаснае разуменне права на працу. У савецкі перыяд гісторыі Беларусі пад правам на працу разумелі права на атрыманне гарантаванай працы з яе аплатай не ніжэй за ўсталяваны дзяржавай мінімальны памер. Права на працу атрымала далейшае развіццё ў Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах 1966 г. Права на працу ў гэтым дакуменце разумеецца як права кожнага на справядлівыя і добрыя ўмовы працы, уключаючы ўзнагароджанне: справядлівую заработную плату і роўнае ўзнагароджанне за працу роўнай каштоўнасці без выключэнняў. Дадзенае права было канкрэтызавана Еўрапейскай сацыяльнай хартыяй 1996 г.

На сённяшні дзень права на працу згодна з беларускім заканадаўствам разглядаецца як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека: права на абранне прафесіі, роду заняткаў і працы ў адпаведнасці з пакліканнем, здольнасцямі і прафесійнай падрыхтоўкай, адукацыяй і з улікам грамадскіх патрэб, а таксама на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы (гл. арт. 41 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).
У тых нешматлікіх еўрапейскіх краінах, дзе права на працу сёння замацавана ў Канстытуцыі, напрыклад, Італіі, Балгарыі ды інш., гэтае права не мае дакладнага юрыдычнага зместу і азначае толькі абавязак дзяржавы дбаць пра стварэнне ўмоў для забеспячэння ўсіх ахвотных працоўнымі месцамі.

Прымусовай працай можна лічыць любую працу ці службу, на якую асоба добраахвотна не пагадзілася і за невыкананне якой вызначана нейкае пакаранне. Адрозніваюць «законную» і незаконную прымусовую ці абавязковую працу. «Законнай» прымусовай ці абавязковай працай ці службай з'яўляецца, напрыклад, тэрміновая вайсковая служба па прызыве, праца па рашэнні суда, праца, якую прымушаюць выконваць, напрыклад, у выніку стыхійных бедстваў (землятрус, ураган і г. д.) альбо вайны. Але «законная» прымусовая праца абавязкова мае некалькі вызначальных прыкмет.

1. Выкарыстанне прымусовай і абавязковай працы павінна быць абмежавана толькі некаторымі асаблівымі выпадкамі надзвычайнага характару, прапісанымі ў заканадаўстве.
2. Прыняць рашэнне аб абавязковай працы могуць толькі афіцыйныя органы (напрыклад, органы дзяржаўнай улады, суд).
3. Прымусовая праца павінна насіць выключна грамадскі характар (праца павінна быць накіравана на задавальненне патрэб ці вырашэнне праблем грамадскага характару, а не нейкай асобы ці камерцыйнай кампаніі).
4. Прымусовая і абавязковая праца аплачваецца.

«Законная» прымусовая і абавязковая праца часам неабходна для вырашэння складаных пытанняў, у якія можа трапляць супольнасць у выніку бедстваў ці войнаў. Разам з тым «законная» прымусовая праца можа быць небяспечнай для непаўналетніх, бо можа стаць перашкодай у іх фізічным, псіхічным, псіхалагічным развіцці. Незаконная прымусовая ці абавязковая праца можа быць небяспечная тым, што стварае ўмовы для перарастання ў рабства. Непаўналетні, які працуе пад прымусам, можа трапіць у рабскі стан. Рабства можна ўмоўна назваць крайняй формай незаконнай прымусовай ці абавязковай працы.

Паняцце *прымусовай ці абавязковай працы* разгледжана ў Канвенцыі ААН аб прымусовай працы.

### КАНВЕНЦЫЯ ААН АБ ПРЫМУСОВАЙ ПРАЦЫ

**Арт. 2**

1. Для мэтаў дадзенай Канвенцыі тэрмін *прымусовая ці абавязковая праца* азначае любую працу ці службу, што патрабуецца ад асобы пад пагрозай пакарання, для выканання якой гэтая асоба не прапанавала сваіх паслуг добраахвотна.
2. Аднак тэрмін *прымусовая ці абавязковая праца* не ўключае ў сябе: любую працу ці службу, якая патрабуецца паводле законаў аб абавязковай воінскай службе і ўжываную для працаў чыста ваеннага характару; любую працу ці службу, якая з'яўляецца часткай звычайных грамадзянскіх абавязкаў грамадзян...; любую працу ці службу, якая патрабуецца ад кагосьці ў выніку прысуда, пры ўмове, што праца будзе праводзіцца пад наглядам і кантролем дзяржаўных уладаў і што гэтая асоба не будзе перададзена прыватным асобам, кампаніям ці супольнасцям; любую працу ці службу, якая патрабуецца ва ўмовах надзвычайнага становішча, іншымі словамі, у выпадках вайны, пажару, паводкі..., якія могуць паставіць пад пагрозу жыццё ці нармальныя жыццёвыя ўмовы ўсяго ці часткі насельніцтва...

Асноўная міжнародная арганізацыя, якая змагаецца за правы працоўных, паляпшэнне ўмоў працы, спыненне прымусовай дзіцячай працы, абарону правоў чалавека ў аспекце права на працу і аб'яднанне — гэта Міжнародная арганізацыя працы (МАП) — частка ААН са штаб-кватэрай у Жэнэве, Швейцарыя. У рамках МАП былі прынятыя шматлікія канвенцыі, якія сталі падмуркам для гарантавання правоў чалавека ў сферы працы ў многіх краінах (базу дадзеных канвенцый МАП па-руску можна знайсці на старонцы http://www.ilo.org/ilolex/russian/docs/convdisp1.htm ). На сёння ў МАП уваходзяць 183 краіны свету, у тым ліку і Беларусь.

Міжнароднае заканадаўства акрэсліла прапановы па выкараненні прымусовай ці абавязковай працы. Канвенцыя Міжнароднай арганізацыі працы аб скасаванні прымусовай працы кажа у арт. 1, што кожны член Міжнароднай Арганізацыі працы, ратыфікаваўшы дадзеную Канвенцыю, абавязваецца скасаваць прымусовую ці абавязковую працу і не выкарыстоўваць яе:
- у якасці сродку палітычнага ўплыву ці выхавання, ці ў якасці меры пакарання за наяўнасць ці выражэнне палітычных поглядаў, ідэалагічных перакананняў;
- у якасці метаду мабілізацыі выкарыстання працоўнай сілы для патрэб эканамічнага развіцця;
- у якасці сродку падтрымання працоўнай дысцыпліны;
- у якасці сродку пакарання за ўдзел у забастоўках;
- у якасці меры дыскрымінацыі па прыкметах расавай, сацыяльнай і нацыянальнай прыналежнасці ці веравызнання.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь забараняе прымусовую працу, акрамя выпадкаў, калі работа ці паслуга, якую трэба выканаць, пацверджана судовым рашэннем або адпавядае закону аб надзвычайным ці ваенным становішчы.

## МІЖНАРОДНЫЯ ДАКУМЕНТЫ АБ ЗАБАРОНЕ ПРЫМУСОВАЙ ЦІ АБАВЯЗКОВАЙ ПРАЦЫ (вытрымкі)

### УСЕАГУЛЬНАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

**Артыкул 23. 1.**

Кожны чалавек мае права на ... свабодны выбар работы, на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы ....

**Артыкул 23. 3.**

Кожны, хто працуе, мае права на справядлівую і здавальняючую ўзнагароду, якая забяспечвае вартае чалавека існаванне для яго самога і яго сям'і ...

### МІЖНАРОДНЫ ПАКТ АБ ГРАМАДЗЯНСКІХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАВАХ

**Артыкул 8.**

3.
(a) Ні ад каго нельга патрабаваць выканання прымусовай ці абавязковай працы;
(b) у краінах, дзе пакараннем за злачынства можа прызначацца пазбаўленне волі, спалучанае з катаржнымі працамі, пункт 3 (a) не лічыцца перашкодай для выканання катаржных прац па прысудзе кампетэнтнага суда, які прызначыў такое пакаранне;
(c) у гэтым пункце пад тэрмін прымусовая ці абавязковая праца не падпадаюць:
  - (i) любая праца ці павіннасць, не згаданая ў падпункце (b), якую, як правіла, павінна выконваць асоба, якая адбывае зняволенне паводле законнага рашэння суда, ці асоба, умоўна вызваленая са зняволення;
  - (ii) любая служба вайсковага характару і — у краінах, дзе дапускуецца адмова ад вайсковай службы па пэўных матывах, — любая служба, якая прадугледжваецца заканадаўствам для асоб, якія адмаўляюцца ад вайсковай службы па такіх матываў;
  - (iii) любая служба, якой вымагаюць абставіны надзвычайнага становішча ці бедства, што пагражае жыццю ці дабрабыту супольнасці;
  - (iv) любая праца ці служба, якая ўваходзіць у звычайныя грамадскія абавязкі.

### КАНВЕНЦЫЯ ААН АБ ПРЫМУСОВАЙ ЦІ АБАВЯЗКОВАЙ ПРАЦЫ

**Арт. 2**

1. Для мэтаў дадзенай Канвенцыі тэрмін прымусовая ці абавязковая праца азначае любую працу ці службу, што патрабуецца ад асобы пад пагрозай пакарання, для выканання якой гэтая асоба не прапанавала сваіх паслуг добраахвотна (...)

### КАНВЕНЦЫЯ ААН АБ РАБСТВЕ

**Артыкул 5**

1. ... абавязковая ці прымусовая праца можа патрабавацца толькі для грамадскіх мэтаў.
2. ... У той ступені, у якой прымусовая праца існуе, гэтая праца павінна насіць выключны характар, павінна заўсёды адпаведным чынам узнагароджвацца і не павінна цягнуць за сабой выдаленне рабочых з іх звычайнага месца пражывання
3. Ва ўсіх выпадках адказнасць за любое прымяненне абавязковай ці прымусовай працы павінна быць ускладзена на кампетэнтныя органы ўлады адпаведнай тэрыторыі.

### КАНВЕНЦЫЯ АБ ПРАВАХ ДЗІЦЯЦІ

**Артыкул 32**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права дзіцяці на абарону ад эканамічнай эксплуатацыі і ад выканання любой працы, якая можа быць небяспечнай ці перашкаджаць яго адукацыі ці шкодзіць здароўю ці фізічнаму, псіхічнаму, духоўнаму, маральнаму ці сацыяльнаму развіццю.

# 16. ПРАВА НА ЧЫСТАЕ І ЗДАРОВАЕ НАВАКОЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
  - гарантыі міжнароднага і нацыянальнага заканадаўства на чыстае навакольнае асяроддзе;
  - агульную інфармацыю аб праблемах, звязаных з навакольным асяроддзем у Беларусі.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
  - выпрацоўваць і адстойваць сваю пазіцыю адносна праблем, звязаных са станам навакольнага асяроддзя ў Беларусі.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
  - да права на чыстае асяроддзе як да істотнага права чалавека.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі — 10 хв.
2. Прадстаўленне тэмы і чаканых вынікаў — 1 хв.
3. Дыскусія: права на чыстае навакольнае асяроддзе — 30 хв.
4. Падагульненне заняткаў — 4 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (10 хв.).**
Прапануйце ўдзельнікам вызначыць найбольш вострыя экалагічныя праблемы ў Беларусі ці ў вашай мясцовасці. Для гэтага аб’яднайце ўдзельнікаў у пары, кожная з якіх на працягу 4 хвілін павінна будзе напісаць 4 найбольш актуальныя праблемы, звязаныя са станам навакольнага асяроддзя.

У час прэзентацыі групы павінны называць па чарзе па адной з вызначаных імі праблем, а таксама тлумачыць свой выбар. Тыя праблемы, якія ўжо былі названы раней, агучваюцца толькі ў тым выпадку, калі маюцца іншыя аргументы адносна прычын, чаму ўдзельнікі лічаць іх актуальнымі.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Асноўная мэта гэтай часткі заняткаў заключаецца ў пагружэнні ўдзельнікаў у тэму праз узгадванне найбольш важных і цяжкіх праблем, звязаных са станам навакольнага асяроддзя. Атрыманую інфармацыю можна будзе выкарыстаць падчас правядзення наступных частак гэтых заняткаў.**

**2. Прадстаўце тэму і чаканыя вынікі (1 хв.).**

**3. Пры дапамозе дыскусіі абмяркуйце права на чыстае і здаровае навакольнае асяроддзе (30 хв.).**
Аб’яднайце ўдзельнікаў у тройкі. Кожнаму з удзельнікаў тройкі раздайце па адным раздатку: адзін удзельнік тройкі павінен атрымаць раздатак 16.1, другі ўдзельнік гэтай жа тройкі — раздатак 16.2, трэці — 16.3.

На працягу 10 хвілін удзельнікі ў тройках павінны самастойна азнаёміцца з раздаткамі і азнаёміць са зместам сваіх раздаткаў двух удзельнікаў тройкі. Патлумачце, што гэтая інфармацыя спатрэбіцца для дыскусіі, якая адбудзецца праз некалькі хвілін.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Метад працы ў тройках, калі кожны ўдзельнік па чарзе прадстаўляе сваю інфармацыю, можа прыводзіць да сітуацыі, калі не ўсім удзельнікам хопіць часу для прадстаўлення сваёй інфармацыі. Звярніце асаблівую ўвагу на працу троек, каб кожны меў магчымасць прадставіць сваю інфармацыю іншым.**

Арганізуйце дыскусію з дапамогай метаду «Чатыры крэслы». Для дыскусіі можна выкарыстаць наступныя выказванні:

- Вырашэнне праблем, звязаных са станам навакольнага асяроддзя ў Беларусі, залежыць толькі ад нас.
- Паколькі дзяржава мае спецыяльныя фінансавыя рэсурсы і спецыяльна падрыхтаваных людзей, станам навакольнага асяроддзя павінна займацца дзяржава. Наша задача — плаціць падаткі.

- Асноўнай задачай Беларусі з’яўляецца пабудова канкурэнтаздольнай на сусветным узроўні вытворчасці. Калі мы дасягнем узроўню эканамічнага дабрабыту заходнееўрапейскіх дзяржаў, тады і будзем думаць пра экалагічнасць вытворчасці і стан навакольнага асяроддзя.
- Міжнародныя дакументы па пытаннях навакольнага асяроддзя носяць, як правіла, рэкамендацыйны характар, бо праблемы, звязаныя са станам навакольнага асяроддзя, з’яўляюцца другаснымі ў параўнанні з іншымі праблемамі чалавецтва.

**5. Падагульніце заняткі (4 хв.).**
Падсумаванне можна зрабіць з дапамогай наступных пытанняў:
- Што вы разумееце пад правам на чыстае і здаровае навакольнае асяроддзе?
- Якія міжнародныя і нацыянальныя дакументы ўтрымліваюць гарантыі права на чыстае навакольнае асяроддзе?
- Назавіце прычыны забруджання навакольнага асяроддзя. Да чаго можа прывесці забруджанне навакольнага асяроддзя?
- Як звязаны праблемы навакольнага асяроддзя Беларусі з аналагічнымі праблемамі ў свеце?
- Што кожны з нас можа зрабіць для таго, каб палепшыць стан навакольнага асяроддзя?

Дадатковая інфармацыя

## АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПРАБЛЕМАХ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

Паняцце *навакольнае асяроддзе* ахоплівае элементы, якія вызначаюць умовы існавання чалавека. Гэтыя элементы ўмоўна можна падзяліць на аб’екты
а) жывёльнага і расліннага асяроддзя (флоры і фауны),
б) нежывога асяроддзя, ці гідрасферы (марскія і прэсныя вадаёмы), глебы, ці літасферы, паветра — атмасферы, калязямной касмічнай прасторы, і
в) аб’екты штучна створанага чалавекам асяроддзя ў выніку гаспадарчай дзейнасці.
У сукупнасці гэтыя сферы ствараюць умовы для жыцця і існавання чалавека. Стан навакольнага асяроддзя, такім чынам, можа ўплываць на існаванне самога чалавецтва.

У сукупнасці ўсе гэтыя тры сферы складаюць навакольнае асяроддзе і ўмоўна падзяляюцца на нацыянальную, рэгіянальную і глабальную.

Падчас заняткаў ёсць магчымасць размаўляць пра ўсе праблемы навакольнага асяроддзя, звязаныя з тэхнічным развіццём і ўсё большым умяшаннем чалавека ў сферы, якія не так даўно знаходзіліся пад уладай прыроднай стыхіі, напрыклад, выкарыстанне і ўплыў на паветраную і касмічную прастору.

Актыўная гаспадарчая дзейнасць чалавека істотна ўплывае на стан навакольнага асяроддзя. Менавіта з дзейнасцю чалавека звязваюць паступовае памяншэнне азонавага слою, глабальнае пацяпленне, катастрафічнае памяншэнне лясоў, забруджанне рэк, мораў, акіянаў, паветра.

Паколькі навакольнае асяроддзе і яго захаванне ў стане, дастатковым для жыцця чалавека, апынулася пад пагрозай, міжнародная супольнасць актывізавалася ў фармаванні міжнародных нормаў аховы навакольнага асяроддзя. Найбольш вядомым сёння міжнародным дакументам у дадзенай сферы можна назваць Рамачную канвенцыю ААН аб змяненні клімату, а таксама так званы Кіёцкі пратакол да гэтай канвенцыі. Кіёцкі пратакол — гэта не толькі экалагічнае, але і палітычнае пагадненне для развіцця міжнароднага супрацоўніцтва пад эгідай ААН па прадухіленні глабальнага змянення клімату, а таксама першы інструмент міжнароднага права, што прадугледжвае ўдзел прыватнага сектару ў выкананні міжнародных абавязальніцтваў. Такім чынам, Кіёцкі пратакол да рамачнай Канвенцыі ААН аб змяненні клімату можна назваць адным з найбольш істотных экалагічных дакументаў. Беларусь таксама падпісала дадзены пратакол. У адпаведнасці з гэтымі міжнароднымі дакументамі прамыслова развітыя краіны да 2012 г. павінны знізіць супольныя выкіды парніковых газаў, што выклікаюць глабальнае пацяпленне, у сярэднім на 5,2% у параўнанні з 1990 г. Доля супольных выкідаў прамыслова развітых краін, якія ратыфікавалі пратакол, складае 44,2% агульнага аб’ёму выкідаў парніковых газаў.

Больш поўную інфармацыю глядзі на старонцы http://www.un.org/russian/documen/convents/environment.htm дзе ўтрымліваюцца міжнародныя нормы па навакольным асяроддзі.

Варта памятаць, што для Беларусі асабліва важнай на сёння застаецца праблема забруджаных у выніку чарнобыльскай катастрофы земляў. Кожны з дадзеных аспектаў можа стаць (асобна альбо ў сукупнасці) зместам для абмеркавання на занятках.

**РАЗДАТАК № 16.1.**

**СТАКГОЛЬМСКАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ ААН АД 16 ЧЭРВЕНЯ 1972 г.** (вытрымкі)

1. Чалавек — гэта стварэнне і адначасова стваральнік свайго навакольнага асяроддзя. Цягам доўгай эвалюцыі чалавецтвам на нашай планеце была дасягнуты такі ўзровень, калі ў выніку паскоранага развіцця навукі і тэхнікі чалавек набыў здольнасць пераўтвараць шматлікімі спосабамі і ў нечуваных дагэтуль маштабах сваё навакольнае асяроддзе. Асяроддзе, што атачае чалавека, мае вырашальнае значэнне для ажыццяўлення асноўных правоў чалавека, уключна з правам на само жыццё.

2. Захаванне і паляпшэнне якасці навакольнага асяроддзя чалавека з'яўляецца абавязкам урадаў усіх краін.

3. Чалавек працягвае рабіць адкрыцці, вынаходзіць і дамагацца далейшага прагрэсу. У наш час здольнасць чалавека пераўтвараць навакольны свет пры разумным яго выкарыстанні можа павысіць якасць жыцця. Калі ж гэтая здольнасць будзе выкарыстоўвацца няправільна, яна можа прынесці несувымерную страту чалавецтву і асяроддзю, што яго акружае. Сёння ў многіх раёнах Зямлі можна напаткаць: небяспечныя ўзроўні забруджання вады, паветра, зямлі і жывых арганізмаў; вычарпанне прыродных рэсурсаў.

4. У краінах, якія развіваюцца, мільёны людзей працягваюць жыць ва ўмовах нястачы ежы і вопраткі, жытла і адукацыі, медыцынскага і санітарна-гігіенічнага абслугоўвання і перадусім на гэтыя мэты выдаткоўваюць свае сродкі, а не на навакольнае асяроддзе. У прамыслова развітых краінах праблемы навакольнага асяроддзя звязаныя галоўным чынам з развіццём прамысловасці і тэхнічнага развіцця.

5. Натуральны рост народанасельніцтва пастаянна вядзе да ўзнікнення праблем захавання навакольнага асяроддзя. Але самае каштоўнае на зямлі — людзі (...)

6. Надышоў такі момант у гісторыі, калі ахова навакольнага асяроддзя патрабуе рэгуляваць сваю дзейнасць ва ўсім свеце. Ад няведання ці абыякавага стаўлення мы можам нанесці велізарную і непапраўную страту зямному асяроддзю, ад якога залежаць нашы жыццё і дабрабыт (...)

7. Для дасягнення гэтай мэты ў галіне навакольнага асяроддзя патрабуецца прызнанне адказнасці з боку грамадзян і грамадстваў, прадпрыемстваў і ўстаноў на ўсіх узроўнях. Адказныя асобы ўсіх прафесіяў і заняткаў, а таксама рознага кшталту арганізацыі, выкарыстоўваючы свае магчымасці, мусяць стварыць навакольнае асяроддзе будучыні. Мясцовыя ўлады і нацыянальныя ўрады мусяць несці найбольшы цяжар адказнасці за правядзенне палітыкі ў галіне навакольнага асяроддзя (...)

**РАЗДАТАК № 16.2.**

**ЕЎРАПЕЙСКАЯ ХАРТЫЯ ПА НАВАКОЛЬНЫМ АСЯРОДДЗІ І ЗДАРОЎІ 1989 г.**

**Кожны чалавек мае права на:**

- навакольнае асяроддзе, якое ва ўсіх адносінах спрыяе максімальна дасягальнаму ўзроўню здароўя і дабрабыту;
- інфармацыю і атрыманне кансультацый пра стан навакольнага асяроддзя, а таксама адносна планаў, рашэнняў і мерапрыемстваў, якія могуць паўплываць як на навакольнае асяроддзе, так і на здароўе людзей;
- удзел у працэсе прыняцця рашэнняў.

Кожны чалавек абавязаны спрыяць ахове навакольнага асяроддзя ў інтарэсах свайго ўласнага здароўя і здароўя іншых людзей.

Усе слаі грамадства нясуць адказнасць за ахову навакольнага асяроддзя і здароўя людзей Гэтая дзейнасць паводле свайго характару міжсектаральная, і ў ёй задзейнічаны шматлікія сектары; пры гэтым адпаведныя абавязкі кожнага з іх мусяць быць дакладна вызначаныя. Кожны грамадскі орган і ўстанова на розных узроўнях у сваёй штодзённай працы мусяць супрацоўнічаць з іншымі сектарамі дзеля таго, каб вырашаць праблемы навакольнага асяроддзя і здароўя.

Кожны ўрад і грамадскі орган нясе адказнасць за ахову навакольнага асяроддзя ўмацаванне здароўя людзей у галіне сваёй юрысдыкцыі, а таксама за забеспячэнне таго, каб дзейнасць, што падпадае пад сферу ягонай юрысдыкцыі ці кантролю, не рабіла шкод здароўю людзей у іншых дзяржавах. Больш за тое, кожны з іх нясе агульную адказнасць за захаванне навакольнага асяроддзя ў глабальным маштабе.

Кожны грамадскі і прыватны орган мусіць ацэньваць і ладзіць свае мерапрыемствы такім чынам, каб забяспечыць абарону насельніцтва ад шкодных уздзеянняў фізічнага, хімічнага, біялагічнага, мікрабіялагічнага і сацыяльнага асяроддзяў. Кожны з гэтых органаў мусіць несці адказнасць за свае дзеянні.

Сродкі масавай інфармацыі адыгрываюць ключавую ролю ў развіцці свядомага стаўлення і пазітыўнага падыходу да пытанняў аховы здароўя і навакольнага асяроддзя. Яны маюць права на атрыманне дастатковай і дакладнай інфармацыі, і іх варта пабуджаць да актыўнага распаўсюджвання гэтай інфармацыі сярод насельніцтва.

Няўрадавыя арганізацыі таксама адыгрываюць важную ролю ў распаўсюджванні інфармацыі сярод грамадскасці і фармаванні свядомага стаўлення да праблем аховы здароўя і экалогіі і належнага на іх рэагавання.

**РАЗДАТАК № 16.3.**

**КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Артыкул 34.**

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя.

Дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, службовыя асобы абавязаны даць грамадзяніну Рэспублікі Беларусь магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі, якія закранаюць яго правы і законныя інтарэсы.

Карыстанне інфармацыяй можа быць абмежавана заканадаўствам у мэтах абароны гонару, годнасці, асабістага і сямейнага жыцця грамадзян і поўнага ажыццяўлення імі сваіх правоў.

**Артыкул 45.**

Права грамадзян Рэспублікі Беларусь на ахову здароўя забяспечваецца таксама ... мерамі па аздараўленні навакольнага асяроддзя...

**Артыкул 46.**

Кожны мае права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе і на пакрыццё шкоды, прычыненай парушэннем гэтага права.

Дзяржава ажыццяўляе кантроль за рацыянальным выкарыстаннем прыродных рэсурсаў у мэтах абароны і паляпшэння ўмоў жыцця, а таксама аховы і аднаўлення навакольнага асяроддзя.

**Артыкул 55.**

Ахова прыроднага асяроддзя – абавязак кожнага.

# 16.1. ДЗЕЙНАСЦЬ ПА АХОВЕ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

(дадатковыя заняткі разлічаны на 45 хвілін)

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- аб некаторых праблемах, звязаных са станам навакольнага асяроддзя ў Беларусі;
- аб правах грамадзян на доступ да экалагічнай інфармацыі, аб магчымасцях удзелу ў вырашэнні пытанняў, звязаных з навакольным асяроддзем і аб магчымасцях абароны сваіх правоў у судовых і іншых інстанцыях;
- аб асноўных палажэннях Орхускай канвенцыі 1998 года і асобных нацыянальных заканадаўчых актах, у якіх утрымліваюцца гарантыі правоў чалавека на дзейнасць па ахове навакольнага асяроддзя.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- самастойна шукаць у Орхускай канвенцыі інфармацыю, якая тычыцца стану навакольнага асяроддзя, удзелу ў вырашэнні пытанняў, звязаных са станам навакольнага асяроддзя і магчымасцямі абароны сваіх правоў;
- аргументаваць сваю пазіцыю адносна магчымасці ўдзелу ў вырашэнні важных для аховы навакольнага асяроддзя пытанняў і доступу да экалагічнай інфармацыі.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да гарантый доступу да экалагічнай інфармацыі і гарантый удзелу ў вырашэнні важных для аховы навакольнага асяроддзя пытанняў як да падставовых элементаў забеспячэння грамадзянінам права на чыстае асяроддзе.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі — 3 хв.
2. Прадстаўленне тэмы і мэтаў заняткаў — 1 хв.
3. Абмеркаванне асноўных палажэнняў Орхускай канвенцыі — 15 хв.
4. Выпрацоўка плану: што мы можам зрабіць для паляпшэння стану навакольнага асяроддзя — 20 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 6 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (3 хв.).**
Прапануйце ўдзельнікам выказацца па тэме: «Што я ведаю аб чарнобыльскай праблеме і забруджаных тэрыторыях?»

Далейшую працу на занятках можна пабудаваць на абмеркаванні розных аспектаў праблем, звязаных з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС.

Калі заняткі праводзяцца адразу пасля папярэдніх, можна ўвязаць іх паміж сабой. Для гэтага трэба спыніцца на адной ці некалькіх праблемах, якія абмяркоўваліся ўдзельнікамі мінулы раз.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Асноўная мэта гэтай часткі заняткаў заключаецца ў пагружэнні ўдзельнікаў у тэму праз узгадванне праблем, звязаных са станам навакольнага асяроддзя. Атрыманую інфармацыю можна будзе выкарыстаць падчас правядзення наступных частак гэтага занятку.**
**Дадаткова варта паглядзець апісанне грамадскіх кампаній з дадатку да дапаможніка «Адстойванне і пашырэнне правоў чалавека праз грамадскі ўдзел».**

**2. Прадстаўце тэму і чаканыя вынікі заняткаў (1 хв.).**

**3. Абмяркуйце асноўныя палажэнні Орхускай канвенцыі (15 хв.).**
На падставе дадатковага матэрыялу і тэксту Орхускай канвенцыі, пададзенай у канцы дапаможніка, распавядзіце пра мэты Орхускай канвенцыі, асаблівасці і тры асноўныя правамоцтвы, якія гэтая канвенцыя дае грамадзянам.

**4. Выпрацуйце план: што грамадзяне самі могуць зрабіць для паляпшэння стану навакольнага асяроддзя (20 хв.).**
Аб'яднайце ўдзельнікаў у тры малыя групы. Кожнай групе дайце частку Орхускай канвенцыі (групы павінны атрымаць розныя часткі канвенцыі). Для падрыхтоўкі раздаткаў

выкарыстайце тэкст Орхускай канвенцыі, пададзены ў канцы дапаможніка. Першы раздатак павінен утрымліваць інфармацыю аб атрыманні экалагічнай інфармацыі (арт. 4—5 Орхускай канвенцыі), другі раздатак — аб праве на ўдзел у вырашэнні пытанняў, звязаных з экалагічна важнымі рашэннямі (арт. 6—8 Орхускай канвенцыі), трэці — аб праве на доступ да правасуддзя па пытаннях, якія тычацца навакольнага асяроддзя (арт. 9 Орхускай канвенцыі).

На падставе гэтага матэрыялу ўдзельнікі кожнай групы павінны напісаць план дзеянняў — як мінімум чатыры дзеянні, якія можна зрабіць па вырашэнні той праблемы, якая была абрана ў пачатку заняткаў. Напрыклад, калі была абраная праблема, звязаная з забруджаннем глебы радыенуклідамі ў выніку чарнобыльскай аварыі, то першая група павінна будзе напісаць кароткі план таго, што трэба зрабіць для атрымання нейкай інфармацыі, напрыклад, аб узроўні радыяцыі, аб магчымасці весці гаспадарчую дзейнасць і г. д. Другая група напіша план таго, куды і як можна звярнуцца ў дзяржаўныя органы для таго, каб паўплываць на рашэнні адносна гэтай праблемы. Трэцяя група напіша, як і дзе можна абскардзіць рашэнні органаў улады, звязаныя з гэтай праблемай.

**5. Падагульніце заняткі (6 хв.).**
Для падсумавання можна задаць наступныя пытанні:
- Ці трэба ўсім грамадзянам ведаць поўную і праўдзівую інфармацыю аб стане навакольнага асяроддзя? Чаму?
- Ці мелі вы асабісты досвед пошуку інфармацыі, якая тычылася экалагічных праблем? Падзяліцеся сваім альбо вядомым вам досведам у гэтай галіне.
- Як можна знайсці праўдзівую экалагічную інфармацыю?
- Як і дзе можна дзейнічаць для аховы навакольнага асяроддзя (у вашым горадзе / вёсцы?) Патлумачце свой адказ.

Дадатковая інфармацыя

## СУТНАСЦЬ І ЗНАЧЭННЕ ОРХУСКАЙ КАНВЕНЦЫІ

Права грамадзян удзельнічаць у прыняцці рашэнняў па так званых экалагічна істотных праблемах замацавана ў Канвенцыі Еўрапейскай Эканамічнай Камісіі ААН «Аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў прыняцці рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях, якія тычацца навакольнага асяроддзя», якая была прынята 25 чэрвеня 1998 г. на 4-й Канферэнцыі міністраў «Навакольнае асяроддзе для Еўропы» у г. Орхус у Даніі (таму Канвенцыя называецца Орхускай).

Беларусь — адна з краін, якія падпісалі і ратыфікавалі гэтую Канвенцыю. Нашай краінай Канвенцыя была падпісана 16 снежня 1998 г. , а 30 кастрычніка 2001 г. Канвенцыя ўступіла ў сілу і з гэтага часу з’яўляецца абавязковай для выканання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Асаблівая роля Орхускай Канвенцыі заключаецца ў тым, што грамадзяне становяцца асновай механізму абароны экалагічных правоў. Грамадзяне атрымалі рэальную магчымасць бараніць свае экалагічныя правы, а таксама навакольнае асяроддзе праз тры падставовыя механізмы:
1) Магчымасць атрымліваць інфармацыю аб стане навакольнага асяроддзя, магчымых зменах стану навакольнага асяроддзя ў выніку пабудовы нейкіх аб’ектаў (прадпрыемстваў, электрастанцый, будынкаў, дарог і г. д.). Пры гэтым дзяржаўныя органы абавязваюцца стварыць умовы для свабоднага доступу да такой інфармацыі. Гэта азначае, напрыклад, што ў законах асобных краін павінны быць прадугледжаны такія механізмы перадачы экалагічнай інфармацыі, якія б стваралі магчымасць свабоднага доступу да інфармацыі грамадзянам. Гэта прадугледжваюць арт. арт. 4—5 Орхускай Канвенцыі.
2) Права на ўдзел у вырашэнні пытанняў, звязаных з экалагічна важнымі рашэннямі (арт. арт. 6—8 Орхускай Канвенцыі).
3) Права на доступ да правасуддзя па пытаннях, якія тычацца навакольнага асяроддзя (арт. 9 Орхускай Канвенцыі).

Істотным пытаннем з’яўляецца акрэсленне паняцця *экалагічная інфармацыя*. Гэтае паняцце розніцца ў беларускім заканадаўстве і міжнародных дакументах, у прыватнасці, Орхускай канвенцыі. Паняцце *экалагічная інфармацыя* ўпершыню было ўведзена ў заканадаўства Беларусі ў Законе «Аб інфарматызацыі» 1995 г. У ім падкрэслівалася, што «не можа быць абмежаваны доступ да дакументаванай інфармацыі [у тым ліку]...экалагічнай» Аднак само паняцце *экалагічная інфармацыя* ў гэтым дакуменце не раскрывалася.

У адпаведнасці з п. 3 арт. 2 Орхускай Канвенцыі пад экалагічнай інфармацыяй разумеюць любую інфармацыю ў пісьмовай, аўдыёвізуальнай, электроннай ці іншай матэрыяльнай форме, якая тычыцца:

- стану прыродных аб’ектаў (паветра, вада, глеба, ландшафты, біялагічная разнастайнасць і г. д.),
- з’яваў (энергія, шум, выпраменьванні),
- дзейнасці ці захадаў у галіне навакольнага асяроддзя (адміністрацыйнага, палітычнага характару, нарматыўных актаў, планаў, праграм і г. д.),
- стану здароўя і бяспекі людзей, умоў іх жыцця, стану аб’ектаў культуры, будынкаў і пабудоваў (у той ступені, у якой на іх можа ўплываць навакольнае асяроддзе).

Такім чынам, экалагічнай у адпаведнасці з нормамі Орхускай Канвенцыі прызнаецца не толькі інфармацыя аб прыродным асяроддзі і яго асобных элементах: вадзе, глебе і г. д., забруджанні навакольнага асяроддзя, стану здароўя людзей, але і інфармацыя пра дзейнасць у самым шырокім сэнсе гэтага слова, якая можа паўплываць на стан навакольнага асяроддзя. Больш поўную інфармацыю глядзі ў матэрыялах наступных заняткаў, а таксама ў тэксце Орхускай канвенцыі, якая пададзена ў канцы дапаможніка.

Права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджанне інфармацыі, якая тычыцца навакольнага асяроддзя, замацавана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у арт. 34.

# 17. ПРАВА НА МЕДЫЦЫНСКАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- гарантыі нацыянальнага заканадаўства, якія тычацца права на мінімальнае медыцынскае абслугоўванне;
- некаторыя праблемы, звязаныя з забеспячэннем права на якаснае і бяспечнае медыцынскае абслугоўванне;
- пра права на бясплатнае медыцынскае абслугоўванне.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- выказваць свае меркаванні адносна мінімальных гарантый на медыцынскае абслугоўванне, якія прадстаўляе беларуская дзяржава;
- выказвацца па праблемах, звязаных з якасным і бяспечным медыцынскім абслугоўваннем, а таксама па праблемах, звязаных з захаваннем прынцыпу бясплатнасці медыцынскага абслугоўвання.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да бясплатнага, даступнага медыцынскага абслугоўвання як да пазітыўнага абавязальніцтва, якое ўзяла на сябе дзяржава.

**План заняткаў у фармаце 45 хв.**

1. Факусаванне ўвагі — 2 хв.
2. Абвяшчэнне тэмы і чаканых вынікаў заняткаў — 1 хв.
3. Разгляд выпадкаў, звязаных з правам на медыцынскае абслугоўванне — 5 хв.
4. Праца над казусамі з выкарыстаннем нацыянальнага заканадаўства — 15 хв.
5. Прэзентацыя вынікаў працы груп і абмеркаванне сітуацый з медыцынскім абслугоўваннем у Беларусі на прыкладзе казусаў — 18 хв.
6. Падагульненне заняткаў — 4 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (2 хв.).**
Звярніцеся да ўдзельнікаў заняткаў з просьбай прывесці прыклады вядомых ім выпадкаў парушэння правоў асобы ў шпіталі.

У выпадку, калі навучэнцы будуць мець праблемы з такога кшталту прыкладамі, можна самім назваць вядомае вам парушэнне альбо адзін з прыкладаў, пададзеных ў дадатковым матэрыяле.

**2. Пасля таго, як удзельнікі назавуць некалькі прыкладаў, агучце тэму і чаканыя вынікі заняткаў (1 хв.).**

**3. Разгледзьце выпадкі, звязаныя з правам на медыцынскае абслугоўванне (5 хв.).**
Аб'яднайце ўдзельнікаў у групы і раздайце дзвюм групам апісанне выпадку № 1, а дзвюм іншым — выпадку № 2. Папрасіце групы азнаёміцца з тэкстамі і агучыць асноўныя факты аднаго і другога выпадкаў.

**ВЫПАДАК 1**

Шаснаццацігадовы Сяргей, хворы на алергію, знаходзіўся ў гарадскім шпіталі. Увечары (каля 19.00) яму пачала балець галава. Малады чалавек звярнуўся да дзяжурнай медсястры з просьбай даць якіясьці лекі. Медсястра адмовілася, спаслаўшыся на нормы, згодна з якімі яна не можа самастойна даваць лекі, пакуль доктар не прызначаць курс лячэння. Медсястра папрасіла пачакаць дзяжурнага доктара-тэрапеўта. На працягу ночы галава не пераставала балець, але дзяжурнага лекара медсястра так і не знайшла. Пры гэтым яна так і не давала ніякіх лекаў, каб зменшыць боль. Раніцай галава перастала балець, але хлопец кепска сябе адчуваў.
- Ці былі ў гэтым выпадку парушаны правы пацыента? Калі так, то ў чым гэта праявілася?
- Ці можна назваць дадзены выпадак парушэннем правоў чалавека? Чаму?

**ВЫПАДАК 2**

Алеся, вучаніца сярэдняй школы, зімой застудзіла вуха. Пастаўлены лекарам дыягназ (гаймарыт) азначаў, што ёй неабходна зрабіць аперацыю. Лекар сказаў Алесі, што яе бацькі павінны набыць кропельніцу, раствор для прамывання і катэтар, бо без гэтага ён не можа зрабіць аперацыю.

- Ці быў у гэтым выпадку парушаны прынцып бясплатнасці аказання медыцынскай дапамогі? Патлумачце свой адказ.
- Ці можна назваць дадзены выпадак парушэннем правоў чалавека? Чаму?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Пастарайцеся, каб навучэнцы аднастайна зразумелі факты выпадкаў.**
**Сутнасць выпадку № 1 зводзіцца да парушэння права на атрыманне якаснага і бяспечнага медыцынскага абслугоўвання. У азначаным выпадку шпіталь абавязаны аказаць дапамогу хвораму ў выглядзе якаснага лячэння. У дадзеным выпадку дзяжурны доктар парушыў права на аказанне якаснай медыцынскай дапамогі хвораму ў шпіталі. У маладога чалавека, хворага на алергію, пачала балець галава. Шпіталь і дзяжурны доктар для таго і існуюць, каб вызначыць прычыну болю, паставіць дыягназ і прызначыць лячэнне, у выніку якога хворы будзе пачуваць сябе лепш. Медсястра сапраўды не мае права самастойна даваць лекі хворым, калі яны не выпісаны лекарам. Дзеянні медсястры можна разглядаць як парушэнне толькі ў выпадку, калі будзе даказана, што яна не шукала доктара, які на самой справе знаходзіўся па свайм працоўным месцы.**

**Праблема ў гэтым выпадку заключаецца ў суаднясенні фактаў і паказчыкаў бяспечнага медыцынскага абслугоўвання. Праблема яшчэ больш глыбокая, паколькі крытэры ці паказчыкі бяспечнага ці якаснага медыцынскага абслугоўвання не прадстаўляюцца для кліентаў. У гэтым выпадку пытанне аб якасці медыцынскай дапамогі вырашаецца толькі пасля правядзення медыцынскай экспертызы, што робіць саму працэдуру ацэнкі дзейнасці лекара ці шпіталя надзвычай складанай і дарагой. Праблемай з'яўляецца адсутнасць незалежнай структуры, якая можа рабіць экспертызы, няўвага з боку медыцынскага персаналу, няякаснае выкананне ім сваіх службовых абавязкаў.**

**Сутнасць выпадку № 2 зводзіцца да парушэння права на атрыманне бясплатнага медыцынскага абслугоўвання. Праблема ў дадзеным выпадку заключаецца ў суаднясенні нормаў права, якія вызначаюць платныя паслугі, з нормамі права, якія даюць гарантыі мінімальнага гарантаванага дзяржавай медыцынскага абслугоўвання. Няведанне заканадаўчай базы, а таксама магчымыя супярэчнасці паміж нормамі права ствараюць умовы, калі чалавек дакладна не ведае, павінен ён плаціць, ці гэтая паслуга ўваходзіць у пералік мінімальных гарантый, аплачваных дзяржавай.**

Аналіз і вызначэнне гэтых фактаў нам неабходны для далейшай працы, калі ўдзельнікі атрымаюць раздатак 17.1 і будуць супастаўляць факты з патрабаваннямі нацыянальнага заканадаўства.

### 4. Стварыце ўмовы для працы над выпадкамі з выкарыстаннем нацыянальнага заканадаўства (15 хв.).

Раздайце групам раздаткі 17.1 і 17.2 і папрасіце іх, выкарыстоўваючы раздаткі, адказаць на пытанні ў канцы апісання выпадку.

### 5. Арганізуйце прэзентацыі вынікаў працы груп і абмяркуйце сітуацыі з медыцынскім абслугоўваннем у Беларусі на прыкладзе казусаў (18 хв.).

Папрасіце спачатку прадставіць вынікі працы ўсіх груп па першым, а потым па другім выпадку. Правядзіце абмеркаванне па пазначаных у апісанні выпадкаў пытаннях.

### 6. Падагульніце заняткі (4 хв.).

У час падагульнення пастаўце наступныя пытанні:

- Пра якія выпадкі парушэння правоў чалавека на медыцынскае абслугоўванне вялася гаворка на занятках?
- Якія нацыянальныя і міжнародныя дакументы гарантуюць права на медыцынскае абслугоўванне?
- Якія праблемы, звязаныя з мінімальнымі гарантыямі на медыцынскае абслугоўванне, можна назваць? У чым прычыны гэтых праблем?
- Ці трэба ў заканадаўстве ўсталёўваць у якасці мінімальнага сацыяльнага стандарту якасць аказання медыцынскіх паслуг? Патлумачце сваю пазіцыю.

## ПРАВА НА БЯСПЛАТНАЕ, ЯКАСНАЕ І БЯСПЕЧНАЕ МЕДЫЦЫНСКАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ

Права на медыцынскі догляд вынікае з абавязку дзяржавы ў забеспячэнні годнага існавання чалавека. Права на медыцынскі догляд адзначана ў міжнародных дакументах. Напрыклад, арт. 25 Дэкларацыі правоў чалавека адзначае, што «кожны чалавек мае права на такі жыццёвы ўзровень, уключаючы харч, адзенне, жыллё, медыцынскі догляд і неабходнае сацыяльнае абслугоўванне, які неабходны для падтрымання здароўя і дабрабыту яго самога і яго сям'і». Арт. 12 Міжнароднага пакта аб сацыяльных, эканамічных і культурных правах прызнае «права кожнага на найвышэйшы дасягальны ўзровень фізічнага і псіхічнага здароўя», а для дасягнення гэтага ў падпункце d) прадугледжвае, між іншым, стварэнне «ўмоў, якія забяспечаць патрэбнае медыцынскае абслугоўванне і медыцынскі догляд у выпадку хваробы». Разам з тым гэты самы пакт адзначае ў артыкуле 2.1, што «кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта ў індывідуальным парадку і праз міжнародную дапамогу і супрацоўніцтва, у прыватнасці, у эканамічнай і тэхнічнай галінах, абавязуецца ў поўнай меры наяўных рэсурсаў рабіць крокі да паступовага поўнага выканання правоў, прызнаных у дадзеным Пакце, усімі належнымі сродкамі, уключна, у прыватнасці, з прыняццем заканадаўчых мер». Гэта азначае, што кожная дзяржава абавязалася — праз некаторы час і пры наяўнасці адпаведных рэсурсаў, дастатковых для выканання гэтых абавязальніцтваў, — цалкам выканаць дадзеныя абавязальніцтвы. Такім чынам, паводле міжнародных нормаў у галіне правоў чалавека, права на медыцынскае абслугоўванне (і асабліва бясплатнае) — гэта бясспрэчны абавязак дзяржавы. Але міжнародная супольнасць прызнае магчымасць поўнага выканання краінай гэтага абавязку праз некаторы тэрмін, які залежыць ад наяўных рэсурсаў.

Беларускае заканадаўства вызначае дадатковыя гарантыі ўключна з правам на бясплатнае, даступнае, якаснае і бяспечнае медыцынскае абслугоўванне.

### КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 45.**

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на ахову здароўя, уключаючы бясплатнае лячэнне ў дзяржаўных установах аховы здароўя.
Дзяржава стварае ўмовы даступнага для ўсіх грамадзян медыцынскага абслугоўвання.
Права грамадзян Рэспублікі Беларусь на ахову здароўя забяспечваецца таксама развіццём фізічнай культуры і спорту, мерамі па аздараўленню навакольнага асяроддзя, магчымасцю карыстання аздараўленчымі ўстановамі, удасканальваннем аховы працы».

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя» дае наступныя тлумачэнні асноўным паняццям, звязаным з аховай здароўя:
**здароўе** — стан поўнага фізічнага, духоўнага і сацыяльнага дабрабыту людзей, а не толькі адсутнасць хвароб і фізічных дэфектаў;
**медыцынскія работнікі** — асобы, якія займаюць ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку пасады дактароў, правізараў, сярэдняга медыцынскага, фармацэўтычнага і малодшага медыцынскага персаналу;
**медыцынская дапамога** — комплекс медыцынскіх мерапрыемстваў па захаванні і ўмацаванні здароўя людзей, які ўключае прафілактыку, дыягностыку, лячэнне, рэабілітацыю, пратэзаванне;
**пацыент** — асоба, якая звярнулася па медыцынскую дапамогу, або якая атрымлівае медыцынскую дапамогу ці знаходзіцца пад медыцынскім наглядам;
медыцынская дзейнасць — прафесійная дзейнасць па аказанні медыцынскай дапамогі, правядзенню медыцынскай экспертызы і іх арганізацыі, якая ажыццяўляецца юрыдычнымі і фізічнымі асобамі ў парадку, што вызначаецца заканадаўствам;

Згодна з арт. 4 дадзенага закона «Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права на даступнае медыцынскае абслугоўванне, якое забяспечваецца:
- прадстаўленнем бясплатнай медыцынскай дапамогі на аснове дзяржаўных мінімальных стандартаў у галіне аховы здароўя ў дзяржаўных установах аховы здароўя;
- прадстаўленнем медыцынскай дапамогі ў дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя, недзяржаўных арганізацыях аховы здароўя і ў індывідуальных прадпрымальнікаў, якія здзяйсняюць у устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку медыцынскую

дзейнасць, за кошт уласных сродкаў, сродкаў юрыдычных асоб і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- даступнасцю лекавых сродкаў;
- здзяйсненнем мер па санітарна-эпідэмічнаму дабрабыту насельніцтва».

Згодна з арт. 1 Закона «Аб дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартах», дзяржаўны мінімальны сацыяльны стандарт — гэта мінімальны ўзровень дзяржаўных гарантый сацыяльнай абароны, які забяспечвае задавальненне асноўных патрэб чалавека, што выражаецца ў нормах прадстаўлення бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг. Мінімальны сацыяльны стандарт у галіне аховы здароўя вызначаецца Пастановай Савета Міністраў Беларусі ад 18 чэрвеня 2002 г. № 963 і акрэслівае пералік паслуг, што згодна з фінансаваннем, якое ўдакладняецца кожны год, дзяржава гарантуе грамадзянам на бязвыплатнай аснове. Гэтыя паслугі пералічаны ў Дадатку да гэтай Пастановы. Бясплатныя і даступныя медыцынскія паслугі фінансуюцца за кошт рэспубліканскага, мясцовага бюджэтаў і пазабюджэтных фондаў. У стандартах не гаворыцца аб якасці гэтых паслуг. Якасць, як вынікае з апісання спосабу фінансавання, можа залежаць ад выдаткаванага на кожны канкрэтны год фінансавання.

Адсутнасць дакладнай рэгламентацыі якасці і звязанай з якасцю бяспекі аказання паслуг, а таксама магчымасць падмены медыцынскіх паслуг, якія павінны аказвацца на бязвыплатнай аснове, платнымі, патрабуе ад пацыента добрага ведання нарматыўнага матэрыялу і пільнасці, для таго каб яго правы не былі парушаны. У гэтых умовах асаблівае значэнне набывае ўменне правільна, адэкватна рэагаваць на парушэнні, якія могуць адбывацца ў шпіталі. У арт. 41-42 закона «Аб ахове здароўя» вызначаюцца правы і абавязкі пацыента, а ў арт. 50-52 – правы і абавязкі медыцынскіх (фармацэўтычных) і іншых медыцынскіх работнікаў (гл. артыкулы закона ў інтэрнэце: http://www.pravo.by/WEBNPA/text.asp?RN=V19302435 )

У мэтах абароны правоў пацыентаў згодна з арт. 48 могуць стварацца камітэты ці камісіі, якія разглядаюць пытанні парушэння этычных ці дэанталагічных норм.

Згодна з арт. 43 медыцынскія ўстановы абавязаны стварыць умовы для свабоднага знаёмства з правіламі  ўнутранага распарадку арганізацыі аховы здароўя. Пацыент падчас аказання яму медыцынскай дапамогі ў стацыянарных умовах павінен быць азнаёмлены з правіламі ўнутранага распарадку для пацыентаў. Факт азнаямлення уносіцца ў медыцынскую дакументацыю.

**РАЗДАТАК № 17.1.**

## МІЖНАРОДНЫЯ СТАНДАРТЫ АДНОСНА ПРАВА НА МЕДЫЦЫНСКАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ І НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ПРАВАВЫЯ НОРМЫ Ў ГАЛІНЕ АКАЗАННЯ МЕДЫЦЫНСКАЙ ДАПАМОГІ

### МІЖНАРОДНЫ ПАКТ АБ САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВАХ

**Артыкул 12**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць права кожнага на найвышэйшы дасягальны ўзровень фізічнага і псіхічнага здароўя.
2. Захады, якія мусяць прымацца дзяржавамі-ўдзельніцамі дадзенага Пакта на дасягненне поўнага выканання гэтага права, павінны ўключаць крокі, неабходныя для:
   (a) зніжэння паказчыкаў нараджальнасці мёртвых дзяцей, дзіцячай смяротнасці і для здаровага развіцця дзіцяці;
   (b) паляпшэння ўсіх аспектаў гігіены навакольнага асяроддзя і гігіены працы ў прамысловасці;
   (c) прадухілення, лячэння і кантролю за эпідэмічнымі, эндэмічнымі, прафесійнымі ды іншымі хваробамі;
   (d) стварэння ўмоў, якія забяспечаць патрэбнае медыцынскае абслугоўванне і медыцынскі нагляд у выпадку хваробы.

### ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ АХОВЕ ЗДАРОЎЯ»

**Артыкул 41. Правы пацыентаў**

Пацыент мае права на:

- атрыманне медыцынскай дапамогі;
- выбар лекара і арганізацыі аховы здароўя;
- удзел у выбары метадаў аказання медыцынскай дапамогі;
- знаходжанне ў арганізацыі аховы здароўя ва ўмовах, якія адпавядаюць санітарна-гігіенічным і супрацьэпідэмічнага патрабаванням і дазваляюць рэалізаваць права на бяспеку і абарону асабістай годнасці;
- паважлівае і гуманнае стаўленне з боку работнікаў аховы здароўя;
- атрыманне ў даступнай форме інфармацыі аб стане ўласнага здароўя, прымяняемых метадах аказання медыцынскай дапамогі, а таксама аб кваліфікацыі лекара, іншых медыцынскіх работнікаў, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у аказанні яму медыцынскай дапамогі;
- выбар асоб, якім можа быць паведамлена інфармацыя аб стане яго здароўя;
- адмову ад аказання медыцынскай дапамогі, у тым ліку медыцынскага ўмяшання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Законам;
- палягчэнне болю, звязанага з захворваннем і (або) медыцынскім умяшаннем, усімі метадамі аказання медыцынскай дапамогі з улікам лячэбна-дыягнастычных магчымасцяў арганізацыі аховы здароўя;
- рэалізацыю іншых правоў у адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.
- Пры аказанні медыцынскай дапамогі ў стацыянарных умовах пацыент мае права на допуск да яго святара, а таксама на прадастаўленне ўмоў для адпраўлення рэлігійных абрадаў, калі гэта не парушае правілаў унутранага распарадку для пацыентаў, санітарна-гігіенічных і проціэпідэмічных патрабаванняў.
- Прадастаўленне пацыенту указаных у гэтым артыкуле правоў не можа ажыццяўляцца ў шкоду здароўю іншых пацыентаў і парушаць іх правы і свабоды.

**Артыкул 51. Абавязкі медыцынскіх (фармацэўтычных) работнікаў**

Медыцынскія (фармацэўтычныя) работнікі абавязаны:

- кваліфікавана выконваць свае службовыя абавязкі;
- захоўваць урачэбную таямніцу;
- паважліва і гуманна адносіцца да пацыентаў, выконваць іх правы;
- выконваць прынцыпы медыцынскай этыкі і дэанталогіі;
- павышаць узровень прафесійных ведаў;
- выконваць іншыя абавязкі, прадугледжаныя гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.
- Медыцынскія (фармацэўтычныя) работнікі абавязаны таксама аказваць хуткую (неадкладную) медыцынскую дапамогу ў межах сваіх магчымасцяў (...).

**КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Артыкул 161. Неаказанне дапамогі хвораму**

Неаказанне дапамогі хвораму без уважлівай прычыны асобай, якая займаецца медыцынскай практыкай, альбо іншай асобай, абавязаным яе аказваць у адпаведнасці з законам ці спецыяльным правілам, караецца штрафам ці пазбаўленнем права займацца вызначанай дзейнасцю, ці абмежаваннем свабоды на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 162. Неадпаведнае выкананне прафесійных абавязкаў медыцынскім супрацоўнікам**

1. Неадпаведнае выкананне прафесійных абавязкаў медыцынскім супрацоўнікам, якое прывяло да прычынення пацыенту па неасцярожнасці цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання, караецца штрафам альбо пазбаўленнем права займаць адпаведныя пасады ці займацца вызначанай дзейнасцю, альбо выпраўленчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, альбо абмежаваннем свабоды на той самы тэрмін. (...)

**РАЗДАТАК № 17.2.**

## ПРАВАВЫЯ НОРМЫ, ЯКІЯ ВЫЗНАЧАЮЦЬ МЕДЫЦЫНСКІЯ ПАСЛУГІ, ШТО ПРАДАСТАЎЛЯЮЦЦА БЯСПЛАТНА

**Дадатку да Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 18.07.2002 № 963**

1. **Бясплатная першасная медыцынска-санітарная дапамога (прадастаўляецца ў наступных выпадках):**

1.1. дыягностыка і прызначэнне лячэння, якія ладзяцца ўчастковымі ўрачамі (тэрапеўты, педыятры, акушэры-гінеколагі і г. д.) і ўрачамі агульнай практыкі ў амбулаторных умовах, а таксама дома ў выпадках немагчымасці хворага з'явіцца на прыём ці пагрозы здароўю і жыццю самога хворага ці акружаючых;

1.2. паслугі ўрачоў-спецыялістаў, што аказваюцца паводле вызначанага парадку на накіраванне ўчастковых дактароў ці дактароў агульнай практыкі ва ўстановах аховы здароўя, у тым ліку абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў;

1.3. дыягнастычныя паслугі — клінічныя, інструментальныя і лабараторныя метады даследаванняў, метады прамянёвай дыягностыкі па накіраванні ўчастковых дактароў, дактароў агульнай практыкі і дактароў—спецыялістаў; (...)

1.6. проціэпідэмічныя мерапрыемствы:

1.6.1. вакцынапрактыка, што ладзіцца згодна з Нацыянальным календаром прафілактычных прышчэпак;

1.6.2. выяўленне хворых на інфекцыйныя хваробы і апавяшчэнне органаў і ўстаноў дзяржаўнага санітарнага нагляду;

1.8. лабараторнае забеспячэнне нагляднай і проціэпідэмічнай дзейнасці; (...)

1.11. накіраванне на шпіталізацыю пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў згодна са стандартамі, крытэрамі і парадкам шпіталізацыі, што вызначаюцца Міністэрствам аховы здароўя.

2. **Бясплатная хуткая медыцынская дапамога па наступных паказаннях:**

2.1. унутраныя і вонкавыя крывацёкі, што пагражаюць жыццю;

2.2. неадкладныя станы ў кардыялогіі — інфаркт міякарда, нестабільная стэнакардыя, ацёк лёгкіх, арытмія сэрца і інш.;

2.3. прыступы бранхіяльнай астмы, іншыя захворванні, што суправаджаюцца праявамі вострай дыхальнай недастатковасці;

2.4. вострыя захворванні страўнікава-кішачнага тракту — востры апендыцыт і г. д.; (...)

2.9. псіхічныя расстройствы грамадзяніна, якія абумоўліваюць: непасрэдную небяспеку для яго і (ці) акружаючых; ягоную бездапаможнасць...;

2.10. траўмы — вострыя чэрапнамазгавыя і спіннамазгавыя, пазваночніка, вывіхі і падвывіхі, пераломы костак, суставаў, траўмы мышц, траўматычны шок, апёкавая хвароба, сіндром сціскання, электрычная траўма, механічная асфіксія, цеплавы ўдар...;

2.11. стаматалагічныя захворванні — вострыя станы (абсцэс, востры зубны боль);

2.12. вострыя захворванні і траўмы вачэй, у тым ліку траплянне іншародных целаў;

2.13. вострыя захворванні вуха, горла, носу, небяспечныя для жыцця, у тым ліку траплянне іншародных целаў;

2.14. вострыя атручванні;

2.15. гнойна-запаленчыя захворванні ўсіх лакалізацый, якія патрабуюць тэрміновага ўмяшальніцтва;

2.16. вострыя станы, звязаныя з цяжарнасцю, роды; (...)

3.2. дзецям да 18 гадоў пры захворваннях;

3.3. хворым пры вострых і абвастрэннях хранічных захворванняў, калі ёсць паказанні для шпіталізацыі...;

3.5. хворым, якія падлягаюць планавым хірургічным умяшальніцтвам, пры наяўнасці паказанняў для шпіталізацыі.

# 18. ПРАВА НА АДУКАЦЫЮ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- гарантыі міжнароднага і нацыянальнага заканадаўства адносна права на адукацыю;
- праблемы, якія існуюць у сувязі з ажыццяўленнем права на адукацыю.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- выказваць сваё меркаванне аб аднясенні права на адукацыю да катэгорыі правоў чалавека;
- тлумачыць, хто і як павінен забяспечыць чалавеку рэалізацыю права на адукацыю.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да адукацыі як да асновы годнага існавання чалавека.

**План заняткаў у фармаце 45 хв.**

1. Факусаванне ўвагі — 4 хв.
2. Аб'яўленне тэмы і чаканых вынікаў — 1 хв.
3. Знаёмства з міжнародным і нацыянальным заканадаўствам: індывідуальная праца, праца ў групах і дыскусія — 35 хв.
4. Падагульненне вынікаў заняткаў — 5 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (4 хв.).**

У выпадку, калі папярэдне праводзіліся заняткі па паняцці «правы чалавека» і ўдзельнікі знаёмыя з прыкметамі правоў чалавека (гл. заняткі «Што такое правы чалавека»), для факусавання ўвагі можна задаць два наступныя пытанні:

- Назавіце прыкметы правоў чалавека.
- Ці адносіцца права на адукацыю да катэгорыі правоў чалавека? Чаму?

У выпадку, калі заняткі па прыкметах правоў чалавека не праводзіліся, можна коратка патлумачыць прыкметы правоў чалавека, а пазней задаць другое пытанне.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Дадзеная частка патрэбна для таго, каб засяродзіць увагу ўдзельнікаў не толькі на праве на адукацыю, але і на сувязі гэтага права з катэгорыяй правоў чалавека. Дэманстрацыя такой сувязі нам неабходная для таго, каб у далейшых частках заняткаў удзельнікі ў час самастойнай і групавой працы пастаянна думалі пра права на адукацыю як катэгорыю правоў чалавека.**

**2. Прадстаўце тэму і чаканыя вынікі заняткаў (1 хв.).**

**Тлумачальная інфармацыя**

**Задача заняткаў заключаецца не ў тым, каб паразмаўляць пра тое, ці выконваюцца мінімальныя патрабаванні міжнароднага права і як міжнародныя нормы адлюстраваны ў нацыянальным заканадаўстве. Сучасныя нормы беларускага заканадаўства адпавядаюць міжнародным нормам у дадзенай галіне. Мэта заняткаў — абмеркаваць, чаму адукацыя з'яўляецца істотным правам чалавека і якія дадатковыя мінімальныя патрабаванні ў бліжэйшы час, магчыма, будуць запатрабаваны. Праз гэтыя два аспекты прапануецца разгледзець саму катэгорыю правоў чалавека — права на адукацыю.**

**3. Азнаёмце ўдзельнікаў з міжнародным і нацыянальным заканадаўствам аб роўным доступе да адукацыі (35 хв.).**

Раздайце кожнаму ўдзельніку раздатак 18.1. За вызначаны час (10 хв.) удзельнікі павінны самастойна азнаёміцца са зместам раздатка і напісаць тры найбольш важныя, на іх думку, абавязкі дзяржавы, якія павінны быць замацаваны ў міжнародных і нацыянальных нормах дадаткова да абавязкаў, ужо акрэсленых у дакументах (напрыклад, да прынцыпаў бясплатнасці і роўнага доступу да адукацыі), для забеспячэння рэалізацыі права на адукацыю.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Гэтая частка павінна спрыяць самастойнай працы ўдзельнікаў над дадатковымі абавязкамі дзяржавы па забеспячэнні рэалізацыі права на адукацыю. Звярніце ўвагу, што асноўнай мэтай працы ўдзельнікаў павінна быць не вызначэнне тых абавязкаў, якія ўжо замацаваны, а тых, якія могуць паспрыяць лепшай рэалізацыі права на адукацыю ў будучым.**

**У выпадку, калі ўдзельнікі на здольны самастойна выпрацаваць палажэнні, можна прывесці наступныя прыклады абавязкаў:**
- **гарантаваць права навучэнцаў самастойна выбіраць да 20% прадметаў (і адпаведна — выкладчыкаў) у старшых класах сярэдняй школы па свайму жаданню;**
- **увесці абавязковы курс азнаямлення навучэнцаў з сучаснымі сродкамі камунікацыі, напрыклад з інтэрнэтам альбо абавязковы курс па правах чалавека;**
- **стварыць умовы для інтэграцыі дзяцей з інваліднасцю ў супольнасць праз інтэграваную (сумесную) сістэму навучання і г. д.**

Далейшая праца будуецца пры дапамозе метаду 1х2х4. Папрасіце ўдзельнікаў аб’яднацца ў пары і на падставе наяўных шасці прапаноў (у кожнага будуць па тры самастойна выпраца-ваныя прапановы) абмеркаваць і вызначыць сярод іх толькі тры найбольш важныя для забеспячэння права на адукацыю ў будучым. На выкананне дадзенай часткі трэба 8 хвілін.

Затым аб’яднайце ўдзельнікаў у чацвёркі, якія на працягу 8 хвілін таксама павінны абгаварыць, вызначыць і запісаць толькі тры найбольш важныя прапановы.

Прадстаўленне вынікаў працы груп спалучыце з абмеркаваннем вынікаў працы пры дапамозе дыскусіі. Дыскусію можна арганізаваць з дапамогай метаду «Акварыум». Для гэтага папрасіце па адным добраахвотніку з кожнай чацвёркі ўзяць удзел у дыскусіі. Астатнія ўдзельнікі павінны адзначаць найлепшыя аргументы.

Для правядзення кіраванай дыскусіі можна задаць наступныя пытанні:
- Ці павінны ставіцца патрабаванні да дзяржавы з мэтай забеспячэння якаснай і даступнай (бясплатнай) адукацыі? Якія? Патлумачце сваё меркаванне.
- Ці звязаны пытанні бясплатнай адукацыі і роўнага доступу да адукацыі?
- Ці існуе ў Беларусі роўны доступ да адукацыі?
- Хто павінен быць адказным за забеспячэнне права на атрыманне якаснай адукацыі: дзяржава, навучэнец, бацькі навучэнца, настаўнікі і школа? Чаму?
- Ці можна разглядаць права на атрыманне адукацыі як катэгорыю правоў чалавека? Чаму?

Задача тых, хто не будзе ўдзельнічаць у абмеркаванні, заключаецца ў вызначэнні найбольш моцных аргументаў прадстаўнікоў чацвёрак.

Пасля правядзення дыскусіі падсумуйце выказванні пры ўдзеле ўсіх удзельнікаў, дзе асаблівую ўвагу надайце ацэнцы удзельнікамі таго, што яны пачулі падчас акварыума.

**4. Падагульніце вынікі заняткаў (5 хв.).**
Для падсумавання можна задаць наступныя пытанні:
- Ці можа кожны ахвотны свабодна паступіць у любую сярэднюю школу? Якія ўмовы выстаўляюцца да школьнікаў асобнымі школамі? Ці з’яўляюцца гэтыя ўмовы справядлівымі? Ці не парушаюць яны прынцыпу роўнага доступу да адукацыі? Ці дае працэдура паступлення ў ВНУ гарантаваныя роўныя правы для ўсіх?
- Ці ведаеце вы прыклады парушэнняў правоў чалавека падчас навучальнага працэсу?
- Што вы самі можаце зрабіць для таго, каб удасканаліць існуючую сістэму адукацыі ў Беларусі?

**Дадатковая інфармацыя**

## АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПРАВЕ ЧАЛАВЕКА НА АДУКАЦЫЮ

Паняцце *правоў чалавека* — гэта катэгорыя, якая знаходзіцца ў пастаянным руху і змяненні. Тое самае адбываецца і з правам на адукацыю. Эканамічныя і сацыяльныя ўмовы сучаснасці ўсё большую ролю, значэнне і адказнасць ва ўсіх сферах адносін пачынаюць надаваць чалавеку, які змяняе рэчаіснасць пры дапамозе новых тэхналогій, адкрыццяў, вынаходніцтваў. З гэтага вынікае асаблівая роля адукацыі як асноўнага спосабу надзялення чалавека патрэбнымі ведамі і навыкамі, з дапамогай якіх ён здольны дзейнічаць і браць на сябе адказнасць за вынікі сваёй дзейнасці.

Павышэнне ролі і значэння адукацыі адбываецца і на побытавым узроўні. Яшчэ не так даўно, у першай палове XX ст., даволі вялікая частка насельніцтва не ўмела чытаць і пісаць. Такая сітуацыя разглядалася як норма. Сёння асоба, якая не ўмее чытаць і пісаць, не будзе здольная ствараць нармальныя ўмовы для сваёй жыццядзейнасці. Сёння нормай лічыцца, што ўсе здольныя навучыцца чытаць і пісаць. Мінімальныя патрабаванні да ступені адукацыі чалавека імкліва ўзрастаюць як у свеце, так і ў Беларусі.

Існуючыя міжнародныя дакументы па правах чалавека: арт. 26 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, арт. 13 і 14 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, арт. 2 Пратакола № 1 Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, прынцып 7 Дэкларацыі правоў дзіцяці, арт. 29 Канвенцыі аб правах дзіцяці, а разам з імі і нацыянальнае заканадаўства ў якасці асноўных, хоць і не адзіных, патрабаванняў да дзяржавы ў сферы адукацыі вызначаюць стварэнне ў ідэале бясплатнай і даступнай сістэмы навучання. Бясплатнасць і даступнасць разглядаюцца як асноўныя крытэры патрабаванняў, але разам са зменамі навакольных умоў, заўтра, магчыма, да гэтых патрабаванняў дададуцца нейкія іншыя, без якіх немагчыма будзе ўявіць існаванне чалавека. Напрыклад, у якасці абавязковых могуць быць уведзены мінімальныя патрабаванні да ўзроўню ці якасці адукацыі, дзе будуць улічвацца патрэбы асобы і грамадства.

Для падрыхтоўкі па дадзенай тэме можна звяртацца дадаткова да заняткаў «Што такое правы чалавека», «Правы чалавека ў сучасным свеце», а таксама да наступных дакументаў: Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, Канвенцыі аб правах дзіцяці, Канвенцыі аб правах інвалідаў, дакументаў АБСЕ.

**РАЗДАТАК № 18.1.**

## МІЖНАРОДНЫЯ І НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ ПРАВА ДЗІЦЯЦІ НА АДУКАЦЫЮ

### УСЕАГУЛЬНАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

**Арт. 26.**

1. Кожны чалавек мае права на адукацыю. Адукацыя павінна быць бясплатнай, прынамсі ў тым, што датычыць пачатковай і агульнай адукацыі. Пачатковая адукацыя павінна быць абавязковай. Тэхнічная і прафесійная адукацыя павінна быць агульнадаступнай і вышэйшая адукацыя павінна быць аднолькава даступнай для ўсіх на падставе здольнасцей кожнага.
2. Адукацыя павінна быць накіравана на поўнае развіццё чалавечай асобы і на ўзмацненне шанавання правоў чалавека і асноўных свабод. Адукацыя павінна спрыяць узаемаразуменню, цярпімасці і сяброўству паміж усімі народамі, расавымі або рэлігійнымі групамі і павінна спрыяць дзейнасці Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па падтрыманні міру.
   Бацькі маюць права прыярытэту ў выбары віду адукацыі для сваіх дзяцей.

### КАНВЕНЦЫЯ АБ ПРАВАХ ДЗІЦЯЦІ

**Арт. 28.**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права дзіцяці на адукацыю, і з мэтай дасягнення паступовага выканання гэтага права на аснове роўных магчымасцяў яны, у прыватнасці :

(a) уводзяць для ўсіх абавязковую пачатковую адукацыю на бясплатнай аснове;
(b) заахвочваюць развіццё розных формаў сярэдняй адукацыі, як агульнай так і прафесійнай, робяць яе даступнай для кожнага дзіцяці і прымаюць належныя меры, як, напрыклад, увядзенне бясплатнай адукацыі і забеспячэнне пры патрэбе фінансавай дапамогі;
(c) усімі магчымымі сродкамі робяць вышэйшую адукацыю даступнай усім на аснове здольнасцяў кожнага чалавека;
(d) забяспечваюць даступнасць інфармацыі і матэрыялаў у галіне адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі для ўсіх дзяцей;
(e) прымаюць меры па заахвочванні рэгулярнага наведвання школ і зніжэнні колькасці вучняў, якія не сканчаюць адукацыі.

### КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 49. Кожны мае права на адукацыю.**
Гарантуюцца даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.
Сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя даступная для ўсіх у адпаведнасці са здольнасцямі кожнага. Кожны можа на конкурснай аснове бясплатна атрымаць адпаведную адукацыю ў дзяржаўных навучальных установах.

### ЗАКОН «АБ АДУКАЦЫІ» РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 3. Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь мае права на атрыманне адукацыі.**
Абмежаванні правоў на атрыманне адукацыі могуць устанаўлівацца толькі законам.
Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на атрыманне бясплатнай агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і на конкурснай аснове бясплатнай сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ва ўстановах адукацыі.

# 19. ПРАВЫ АСОБ З ІНВАЛІДНАСЦЮ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- у якіх міжнародных дакументах утрымліваюцца гарантыі правоў асоб з інваліднасцю;
- асобныя праблемы людзей з інваліднасцю і магчымыя шляхі іх вырашэння;
- у якія дзяржаўныя органы можна звяртацца для вырашэння праблем асоб з інваліднасцю;
- у якія грамадскія аб'яднанні можна звяртацца па дапамогу асобам з інваліднасцю.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- тлумачыць неабходнасць забеспячэння правоў асоб з інваліднасцю;
- звяртацца ў асобныя дзяржаўныя і грамадскія структуры для вырашэння праблем асоб з інваліднасцю;
- разглядаць і прапаноўваць асобныя спосабы і шляхі вырашэння праблем асоб з інваліднасцю.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- з павагай да правоў асоб з інваліднасцю.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі — 4 хв.
2. Абвяшчэнне тэмы і чаканых вынікаў заняткаў — 1 хв.
3. Як забяспечыць правы асоб з інваліднасцю. Дыскусія — 35 хв.
4. Падагульненне заняткаў — 5 хв;

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў (4 хв.).**

Працытуйце наступнае выказванне:

**ВЫКАЗВАННЕ**

«Некалі, выпадкова сустрэўшыся з асобай з абмежаванымі фізічнымі і / альбо псіхічнымі магчымасцямі, напрыклад, з хворым на цэрэбральны параліч, я, як правіла, альбо спрабаваў адвесці вочы, альбо паказаць, што я не гляжу на гэтага чалавека. І толькі калі быў пэўны, што мяне не бачаць, я кідаў цікаўныя позіркі на гэтую асобу. Але толькі цяпер, калі я сам сяджу ў інвалідная калясцы, я разумею, што калі людзі паспешліва адводзяць ад мяне вочы, яны проста не хочуць, проста баяцца бачыць асобу з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і яе праблемы. Да мяне гэтыя людзі ставяцца абыякава».

Затым задайце наступнае пытанне: ці адпавядаюць гэтыя словы сапраўднаму стаўленню ў нашым грамадстве да людзей інваліднасцю? Пракаментуйце гэтыя словы.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Факусаванне прапануецца правесці праз своеасаблівае правакаванне ўдзельнікаў да акрэслення свайго стаўлення да асоб з інваліднасцю.
Мэта гэтай часткі не ў тым, каб высветліць асабістае стаўленне ўдзельнікаў і іх рэальныя паводзіны ў дачыненнях з такімі асобамі, а ў засяроджанні ўвагі на самой праблеме стаўлення грамадства да людзей з інваліднасцю.**

**2. Абвясціце тэму і чаканыя вынікі заняткаў (1 хв.).**

**3. Пры дапамозе метаду «Дыскусія» арганізуйце абмеркаванне пытання, як забяспечыць правы асоб з інваліднасцю (35 хв.).**

Раздайце раздатак 19.1 і папрасіце ўдзельнікаў азнаёміцца з яго зместам.

Пасля самастойнага знаёмства з тэкстам задайце наступныя пытанні на ўдакладненне:
- Ці ведаеце вы асабіста кагосьці з асоб з абмежаванымі магчымасцямі? Раскажыце крыху пра гэтых знаёмых, калі яны ёсць.

- У чым, на вашу думку, заключаюцца сацыяльныя і фізічныя бар’еры для такіх людзей? Патлумачце на прыкладах.
- У чым, на вашу думку, заключаецца стварэнне роўных умоў для людзей з інваліднасцю? Як прадастаўленне роўных магчымасцяў звязана з сацыяльнымі і фізічнымі бар’ерамі?
- Чаму трэба дапамагаць асобам з абмежаванымі магчымасцямі?
- Што гэтыя людзі самі могуць зрабіць для вырашэння сваіх праблем?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Асноўная задача гэтай часткі заключаецца ў тым, каб упэўніцца, што ўдзельнікі аднастайна і поўна зразумелі інфармацыю з раздаткаў, якая ім будзе патрэбная падчас далейшай працы.**

Аб’яднайце ўдзельнікаў у 4 групы. Кожная група атрымае заданне, якое будзе звязана з праблемамі толькі асобнай групы людзей з інваліднасцю: асобы з асаблівасцямі псіхічнага развіцця, асобы з абмежаваннямі зроку, асобы з абмежаваннямі слыху і мовы, асобы з абмежаванымі магчымасцямі руху.

Кожная група атрымае ватман, на якім павінна будзе для сваёй спецыфічнай групы асоб пералічыць: 1) асноўныя праблемы (бар’еры), з якімі сутыкаецца гэтая група, 2) асноўныя прапановы па тым, як можна вырашыць гэтыя праблемы (зняць бар’еры сацыяльныя і фізічныя).

Пасля таго як групы скончаць працу, можна папрасіць памяняцца ватманамі. Наступным заданнем будзе дапісаць да напрацовак папярэдняй групы тыя палажэнні, якія, на думку групы, з’яўляюцца патрэбнымі альбо на якія папярэдняя група не звярнула ўвагу. Абмен ватманамі варта працягваць, пакуль групы не атрымаюць свой ватман з дапрацоўкамі ад іншых груп.

Пасля атрымання сваіх ватманаў групы знаёмяцца з дапаўненнямі і выпрацоўваюць сваё стаўленне да гэтых дапаўненняў.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Асноўнай задачай гэтай часткі з’яўляецца разгляд праблем і шляхоў іх вырашэння, якія паўстаюць у розных груп асоб з абмежаванымі магчымасцямі. У выніку працы ўдзельнікі ўсіх груп самастойна азнаёмяцца з матэрыяламі, якія тычацца такіх асоб.**

Пачніце дыскусію з кароткай прэзентацыі вынікаў працы кожнай групы і каментароў да гэтай працы з боку іншых груп. Пасля гэтага дыскусію можна арганізаваць вакол наступных пытанняў:
- Якія спецыфічныя праблемы ці бар’еры існуюць у асоб з інваліднасцю?
- Якія ёсць шляхі вырашэння гэтых праблем? Дзеля чаго іх трэба вырашаць?
- Як самі людзі з інваліднасцю могуць уплываць на вырашэнне сваіх праблем?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Асноўнае абмеркаванне тут павінна будавацца вакол тых пытанняў, з якімі групы працавалі. Настаўнік / адукатар, грунтуючыся на дадатковай інфармацыі, таксама можа каментаваць і вытлумачваць пазіцыі, агучаныя групамі.**

**4. Падагульненне заняткаў (5 хв.).**

У час падагульнення можна задаць наступныя пытанні:
- Як часта вы бачыце асоб з інваліднасцю на вуліцах і ў іншых публічных месцах? Як вы лічыце, чаму іх так рэдка можна сустрэць?
- Хто павінен удзельнічаць у вырашэнні праблем асоб з абмежаванымі магчымасцямі: дзяржава, сям’я такой асобы, яна сама, грамадства? Патлумачце свой адказ.
- Які з тэрмінаў у адносінах да асоб з інваліднасцю вам падаецца менш дыскрымінацыйным: асобы з інваліднасцю ці інваліды? Патлумачце сваю пазіцыю.

## АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ АБ АСОБАХ З ІНВАЛІДНАСЦЮ І ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАХ, АДКАЗНЫХ ЗА ДАПАМОГУ ІМ

Заканадаўства Беларусі ў адносінах да асоб з абмежаванымі магчымасцямі ўжывае тэрмін *інвалід*. Тэрмін *інвалід* паходзіць з французскай мовы і азначае «той, хто адслужыў, няздольны да далейшай службы з прычыны раненняў». У гэтым сэнсе інвалід — гэта асоба, якая больш не здольная прыносіць карысць грамадству. У заходніх краінах, а таксама грамадскімі аб'яднаннямі на тэрыторыі Беларусі ужываецца іншы тэрмін — *асоба з абмежаванымі фізічнымі і / альбо псіхічнымі магчымасцямі альбо асоба з інваліднасцю*. Тэрмін *асоба з інваліднасцю* падкрэслівае важнасць асобы, а не ўказанне на пэўны недахоп.

Асобай з інваліднасцю згодна з законам «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь» прызнаецца асоба, якая ў сувязі з абмежаваннямі жыццядзейнасці ў выніку наяўнасці фізічных ці разумовых недахопаў мае патрэбу ў сацыяльнай дапамозе і абароне. Абмежаванне жыццядзейнасці выражаецца ў поўнай ці частковай страце ім здольнасці ці магчымасці ажыццяўляць самаабслугоўванне, перамяшчэнне, арыентацыю, кантроль за сваімі паводзінамі, а таксама займацца працоўнай дзейнасцю.

Гэта вельмі вялікая колькасць людзей. У Беларусі болей за 500 тысяч асоб з інваліднасцю. Прычым толькі за 2002—2006 гг. колькасць асоб з інваліднасцю пабольшала на 32 тысячы чалавек. 2,6 мільёна грамадзян Беларусі медыкі адносяць да групы фізічна саслабелых асоб. Толькі 20% грамадскіх аб'ектаў прыстасаваныя для асоб з абмежаванымі магчымасцям.

Правы гэтай катэгорыі людзей у Беларусі вызначаюцца згодна з Законам «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь» ад 11 лістапада 1991 г.. Гэты закон акрэслівае дзяржаўную палітыку Беларусі ў адносінах да асоб з інваліднасцю і ў якасці асноўнай мэты мае сацыяльную абарону, забеспячэнне роўнасці і паўнавартага ўдзелу ў жыцці грамадства.

У краінах Заходняй Еўропы проста на вуліцы можна сустрэць шмат асоб з інваліднасцю. Гэта не азначае, што ў заходніх краінах больш такіх людзей. Проста для гэтых людзей грамадства і дзяржава стварылі ўмовы, каб яны не адчувалі сябе адрынутымі грамадствам. Больш за тое, грамадства спрабуе выкарыстаць патэнцыял гэтых асоб і дзеля гэтага стварае ўмовы, зручныя для жыцця, камунікацыі, самастойнага, без выкарыстання дадатковай дапамогі абслугоўвання сябе. Такі падыход дазваляе асобам з інваліднасцю займацца вырашэннем сваіх праблем, зарабляць, вучыцца, жыць паўнавартасным жыццём. У Беларусі людзі з інваліднасцю часта знаходзяцца па-за полем зроку грамадства. Сярод прычын гэтага можна назваць і адсутнасць пандусаў, і высокія бардзюры як перашкоды на дарозе, вузкія праезды праз турнікеты ў крамах, аўтобусах, метро. Для людзей з інваліднасцю створаныя спецыяльныя школы, якія, па сутнасці, часта нагадваюць своеасаблівае гета, дзе гэтыя людзі страчваюць навыкі і магчымасці сацыялізацыі і выбудоўвання кантактаў з іншымі людзьмі.

Правы і палажэнні, звязаныя з роўнымі магчымасцямі і роўным доступам асоб з інваліднасцю, утрымліваюцца ў розных міжнародных дакументах ААН. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека пацвярджае правы ўсіх людзей без ніякіх выключэнняў, у тым ліку тых, якія вынікаюць з калецтва, на заключэнне шлюбу, валоданне ўласнасцю, роўны доступ да грамадскага абслугоўвання, сацыяльнага забеспячэння эканамічных, сацыяльных і культурных правоў.

У Беларусі праблемамі асоб з інваліднасцю займаюцца грамадскія аб'яднанні, такія як «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам», «Розныя — роўныя», «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў» і іншыя. Акрамя таго, праблемамі грамадзян з інваліднасцю займаюцца дзяржаўныя органы.

Згодна з беларускім заканадаўствам асноўным дзяржаўным органам, адказным за выкананне правоў асоб з інваліднасцю, з'яўляецца міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. Адной са сфер адказнасці гэтага міністэрства з'яўляецца стварэнне гэтак званага безбар'ернага асяроддзя і забеспячэнне інвалідам свабоднага доступу да аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. З мэтай вырашэння гэтай задачы Міністэрствам распрацавана і рэалізуецца Дзяржаўная праграма аб безбар'ерным асяроддзі на 2007—2010 гг. (Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 красавіка 2007 г. № 424). Згодна з электронным рэсурсам: http://www.mintrud.gov.by/ru/gsp/gsp ад 20.06.2007.

Артыкул 3 Канвенцыі аб правах асоб з інваліднасцю (па-руску канвенцыя афіцыйна перакладзеная як Конвенция о правах инвалидов), якая ўступіла ў сілу ў маі 2008 г. і да якой Беларусь пакуль не далучылася (тэкст гл. у дадатку дапаможніка), вызначае агульныя прынцыпы вырашэння праблем асоб з інваліднасцю:
Прынцыпамі дадзенай Канвенцыі з'яўляюцца:
(a) павага да годнасці, уласцівай чалавечай асобе, асабістай незалежнасці і самастойнасці, уключна са свабодай рабіць свой уласны выбар;
(b) недыскрымінацыя;
(c) усебаковы і дзейсны ўдзел і далучэнне да грамадства;
(d) шанаванне асаблівасцяў інвалідаў і прыняцце інвалідаў як часткі людской разнастайнасці і часткі чалавецтва;
(e) роўнасць магчымасцяў;
(f) даступнасць;
(g) роўнасць мужчын і жанчын;
(h) шанаванне здольнасцяў дзяцей-інвалідаў і шанаванне права дзяцей-інвалідаў захоўваць сваю індывідуальнасць.

Артыкул 4 Канвенцыі вызначае абавязальніцтвы, якія ўскладзеныя на дзяржаву па забеспячэнні правоў асоб з інваліднасцю (гл. вытрымкі з тэксту Канвенцыі ў канцы дапаможніка).

Да каго і як звяртацца, калі вы жадаеце дапамагчы грамадзянам, якія вырашаюць праблемы асоб з інваліднасцю? Звяртайцеся, напрыклад, у грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам», якое месціцца па адрасе: Беларусь, г. Мінск, вул. Сердзіча, 9, 220082, па тэлефоне: (017) 255-63-88 ці (017) 256-73-90 або праз электронную пошту: E-mail: info@belapdi.org. Дадатковую інфармацыю пра арганізацыю шукайце ў Інтэрнэце на старонцы:
www.belapdi.org/index.html
Аддзяленні гэтай арганізацыі ёсць у многіх гарадах нашай краіны.

Акрамя грамадскіх аб'яднанняў, ёсць магчымасць звяртацца ў дзяржаўныя органы. Звяртацца можна ў пісьмовай ці вуснай форме. Прыём грамадзян па пытаннях, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі міністэрства працы і сацыяльнай абароны, ажыццяўляецца штодзённа з 10.00 да 13.00 і 14.00 да 18.00, у суботу з 9.00 да 13.00 у каб. 116, тэл. (017) 222-49-24. Прыём грамадзян праводзіць міністр, яго намеснікі, кіраўнікі структурных падраздзяленняў ці іх намеснікі па папярэднім запісе адзін раз у месяц у адпаведнасці з раскладам. Запісацца можна па наступных тэлефонах: тэл. прыёмнай (017) 206-38-84, тэл. прэс-службы (017) 222-49-30; Адрас міністэрства: 220004, Мінск, пр. Пераможцаў, 23, каб. 2; E-mail: mail@mintrud.gov.by.

**РАЗДАТАК № 19.1.**

**СТАЎЛЕННЕ ДА АСОБ З ІНВАЛІДНАСЦЮ**

**Асобы з інваліднасцю** — гэта людзі, якія маюць любое абмежаванне ці адсутнасць здольнасці ажыццяўляць тую ці іншую дзейнасць такім чынам ці ў такіх межах, як гэта лічыцца нармальным для чалавека (згодна з Міжнароднай класіфікацыяй дэфектаў, інваліднасці і непрацаздольнасці Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, Жэнева, 1980).

Асобы з інваліднасцю не ўяўляюць сабой аднароднай групы. Напрыклад, псіхічна хворыя ці асобы з асаблівасцямі псіхічнага развіцця, асобы з дэфектамі зроку, слыху, мовы, асобы з абмежаваннямі руху сутыкаюцца з бар'ерамі рознага характару: сацыяльнымі і фізічнымі, якія патрабуюць розных шляхоў пераадолення. У выніку гэтых бар'ераў такія людзі, як правіла, ізалююцца ад супольнасці.

Адна з мэтаў Сусветнай праграмы дзеянняў адносна інвалідаў, заключаецца ў рэалізацыі мэтаў «роўнасці» і «поўнага ўдзелу» ў сацыяльным жыцці. Гэта азначае стварэнне для іх такіх самых умоў, што і для ўсяго насельніцтва.

У свеце жыве 500 мільёнаў асоб з інваліднасцю, з іх у Беларусі — болей за 500 тысяч. Сярод іх амаль 30 тысяч дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў. Толькі за 2002—2006 гг. колькасць інвалідаў пабольшала на 32 тысячы чалавек. 2,6 мільёна грамадзян Беларусі медыкі адносяць да групы фізічна саслабелых асоб. Гэтыя людзі павінны карыстацца тымі ж правамі і магчымасцямі, што і ўсе іншыя людзі. У выніку сутыкнення з сацыяльнымі і фізічнымі бар'ерамі такія людзі пазбаўляюцца магчымасці карыстацца сферамі жыцця, даступнымі для іншых грамадзян. Адзін са шляхоў вырашэння праблемы — стварэнне роўных магчымасцяў. Гэта азначае, што жыллёвыя ўмовы, транспарт, службы аховы здароўя, спорт, адукацыя робяцца даступнымі для такіх людзей нароўні з іншымі. Асобы з інваліднасцю часта пазбаўлены магчымасцяў, якія зазвычай маюцца ў супольнасці, напрыклад, напрыклад, ім часта недаступныя сямейнае жыццё, адукацыя, праца, жыллё, грамадская дзейнасць, інтымныя і палавыя адносіны і г. д. Грамадства павінна прызнаць факт, што, нягледзячы на прафілактычныя захады, заўсёды будуць існаваць людзі з абмежаванымі магчымасцямі, і грамадства павінна выяўляць і знішчаць бар'еры, якія перашкаджаюць поўнаму іх удзелу ў жыцці грамадства. Сучаснае стаўленне да людзей з абмежаваннямі з'яўляецца, напэўна, самым вялікім бар'ерам, які перашкаджае іх удзелу ў жыцці грамадства.

Раздатак падрыхтаваны на падставе Сусветнай праграмы дзеянняў ААН у адносінах да асоб з інваліднасцю.

# 20. АКТЫЎНЫ ГРАМАДЗЯНІН

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- хто такі актыўны грамадзянін;
- як грамадская актыўнасць спрыяе забеспячэнню правоў чалавека;
- як розныя формы грамадскай актыўнасці звязаныя з правамі чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- звязваць актыўную грамадзянскую пазіцыю з некаторымі элементамі, якія спрыяюць забеспячэнню правоў чалавека;
- разглядаць актыўную грамадзянскую пазіцыю як механізм абароны, развіцця і пашырэння правоў чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да актыўнай пазіцыі грамадзяніна як да асновы забеспячэння правоў чалавека.

**План заняткаў:**

1. Знаёмства з тэмай і чаканымі вынікамі заняткаў — 1 хв.
2 Абмеркаванне прыкладаў праяўлення грамадскай актыўнасці — 6 хв.
3. Як грамадская актыўнасць спрыяе захаванню і ўкараненню правоў чалавека — 10 хв.
4. Даследаванне праблем і шляхоў іх вырашэння — 20 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 8 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў, азнаёмце ўдзельнікаў з тэмай і чаканымі вынікамі (1 хв.).**

**2. Абмяркуйце прыклады праяўлення грамадскай актыўнасці (6 хв.).**
Папрасіце ўдзельнікаў прывесці прыклады грамадскай актыўнасці. Можна выкарыстаць і пададзеныя ніжэй прыклады.
а) Школьнікі напісалі калектыўны ліст у газету са скаргай на выпілоўванне дрэваў вакол школы падчас правядзення рамонту.
б) Школьнікі ўзялі ўдзел у фармаванні органаў школьнага вучнёўскага самакіравання.
в) Сябры па двары арганізавалі ініцыятыўную групу і дамагліся ад мясцовых уладаў пабудовы футбольнай пляцоўкі.

Папрасіце ўдзельнікаў каротка пракаментаваць кожны асобна прадстаўлены выпадак.
Задайце наступныя пытанні:
- Чаму яны лічаць гэтыя прыклады грамадскай актыўнасцю?
- Чаму людзі пачынаюць дзейнічаць? Хто ці што іх «прымушае» дзейнічаць?
- Якіх вынікаў чакаюць людзі? Што ў выніку дзейнасці павінна выйсці?

Асноўны прынцып, які можна ўмоўна назваць прынцыпам актыўнага грамадзяніна і якім можна кіравацца ў дадзеным выпадку — адказнасць чалавека за тое, што адбываецца ў жыцці мясцовай супольнасці, грамадства, дзяржавы і ўдзел у гэтым жыцці.

**3. Стварыце ўмовы для абмеркавання пытання: як грамадская актыўнасць спрыяе захаванню і ўкараненню правоў чалавека? (10 хв.).**
Раздайце ўдзельнікам раздатачны матэрыял 20.1. Пасля таго, як яны індывідуальна пазнаёмяцца з тэкстам, арганізуйце яго абмеркаванне з ўсёй групай.

Можна задаць наступныя пытанні (памятаючы прыклады, разгледжаныя вышэй):
- Якія формы грамадскай актыўнасці падаюцца вам найбольш эфектыўнымі? (Напрыклад, для вырашэння праблем, азначаных вышэй?)Чаму?
- Як формы грамадскай актыўнасці звязаныя з правамі чалавека?

**4. Арганізуйце «даследаванне» мясцовых праблем і шляхоў іх вырашэння (20 хв.).**
Аб'яднайце ўдзельнікаў у групы па 5 чалавек. Кожная група атрымае наступнае заданне:

а) вызначыць адну праблему мікраараёна, дзе знаходзіцца школа ці дзе пражываюць удзельнікі, так ці інакш звязаную з правамі чалавека (права на чыстае навакольнае асяроддзе, на адпачынак, правы асоб з інваліднасцю і г. д.);
б) вызначыць, як гэтую праблему можна вырашыць (праз грамадскую актыўнасць);
в) вызначыць чаканыя вынікі вырашэння праблемы.

Прадстаўленне і абмеркаванне вынікаў працы груп.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Гэтая частка заняткаў з'яўляецца асноўнай і заключаецца, з аднаго боку, у стварэнні ўмоў для акрэслення нейкага кола сацыяльна важных мясцовых праблем, якія патрабуюць вырашэння, з другога боку — у стварэнні ўмоў для абмеркавання магчымасцяў вырашэння гэтых праблем.**

Гэта павінна паспрыяць разуменню актыўнага грамадзяніна як асобы, якая не толькі разумее існуючыя праблемы (у тым ліку ў галіне правоў чалавека), але і стараецца актыўна вырашаць гэтыя праблемы асабістымі намаганнямі ці з прыцягненнем да гэтага іншых людзей.

**5. Падагульніце заняткі (8 хв.).**
У час падсумавання можна задаць наступныя пытанні:
- Якога чалавека можна назваць актыўным грамадзянінам? Ці можаце вы прывесці прыклад такой асобы? Чаму вы лічыце гэтую асобу актыўным грамадзянінам?
- Ці можна вас назваць актыўнымі грамадзянамі? Чаму? Што трэба было б зрабіць для таго, каб стаць актыўным грамадзянінам?
- Якім чынам актыўнасць грамадзян спрыяе забеспячэнню правоў чалавека і развіццю дэмакратыі?

**Тлумачальная інфармацыя**

**У выпадку, калі ўдзельнікам цяжка прывесці прыклад актыўнага грамадзяніна, прывядзіце свае прыклады і папрасіце ўдзельнікаў патлумачыць, чаму гэтых людзей называюць актыўнымі. Для гэтага варта назваць асоб, якія будуць вядомыя навучэнцам у межах школьнай праграмы, напрыклад — Гандзі.**

**Дадатковая інфармацыя**

## АКТЫЎНЫ ГРАМАДЗЯНІН У ПРАВААБАРОНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Без актыўнага грамадзяніна, без яго ўдзелу ў абмеркаванні праблем супольнасці, без прадстаўлення рознабаковай інфармацыі, без абмеркавання праблем, ініцыяванага грамадзянамі, не можа адбывацца ні пашырэнне правоў чалавека, ні тым больш іх абарона.

Актыўны грамадзянін — аснова ўсіх гэтых элементаў. Толькі актыўны грамадзянін матываваны на актыўнае адстойванне і абарону парушаных правоў і свабод чалавека нават у тых момантах, калі сітуацыя, на першы погляд, выглядае безнадзейна. Актыўны грамадзянін, урэшце, і ёсць асноўным элементам і рухавіком працэсу развіцця правоў чалавека. Менавіта актыўны грамадзянін, як правіла, выступае ініцыятарам разгляду ўзаемаадносін паміж асобай і прадстаўнікамі ўлады, прыцягвае ўвагу да вострых праблем на нацыянальным і міжнародным узроўнях, што часта спрыяе фармаванню новых поглядаў, новага стаўлення ў тым ліку да розных аспектаў правоў чалавека, фармаванню новых нормаў нацыянальнага і міжнароднага права ў галіне правоў чалавека, новых падыходаў да разумення правоў чалавека. Актыўных людзей, якія ўстаюць на абарону правоў чалавека, называюць праваабаронцамі.

Згодна з арт. 1 Дэкларацыі аб правах і адказнасці асоб, груп ці грамадскіх органаў у распаўсюдзе ці абароне ўсеагульна прызнаных правоў і асноўных свабод чалавека (Дэкларацыі аб праваабаронцах, тэкст гл. у дадатку) кожны чалавек мае права, індывідуальна ці сумесна з іншымі, імкнуцца абараняць і здзяйсняць правы чалавека і асноўныя свабоды на нацыянальным і міжнародным узроўнях. Згодна з п. 13.5 Выніковага дакумента Венскай сустрэчы 1989 г. НБСЕ (Трэцяя сустрэча ў межах наступных крокаў, Вена 1989 г.) дзяржавы павінны шанаваць права сваіх грамадзян самастойна ці супольна з іншымі рабіць унёсак у развіццё і абарону правоў чалавека і асноўных свабод. А ў п. 13.7 і 13.8 дзяржавы-ўдзельніцы АБСЕ ўзялі на сябе абавязальніцтвы не пераследаваць асоб, якія абараняюць парушаныя правы і свабоды чалавека.
Арсенал законных спосабаў дзейнасці актыўнага грамадзяніна даволі шырокі. Актыўны грамадзянін можа ініцыяваць абмеркаванне важных пытанняў, напрыклад, у сродках

масавай інфармацыі (нацыянальных і мясцовых газетах, на мясцовым радыё, у інтэрнэце і г. д.) і выказваць свой пункт гледжання па праблемах правоў чалавека і парушэннях, якія лічыць істотнымі. Такая дзейнасць робіць праблемы грамадства адкрытымі і публічнымі. Актыўны грамадзянін можа мабілізаваць людзей да ўдзелу ў адстойванні сваіх правоў, ствараць грамадскія аб'яднанні і ініцыятывы, якія будуць актыўна ўдзельнічаць у абароне правоў чалавека праз арганізацыю, напрыклад, тэхнічнай, маральнай, псіхалагічнай і прававой дапамогі пацярпелым ці пашыраць гэтыя правы праз асветніцкую і адукацыйную дзейнасць у галіне правоў чалавека праз распрацоўку і распаўсюджанне інфармацыі аб стане правоў чалавека ў рэгіёне, краіне, праз распрацоўку метадычных матэрыялаў. Урэшце, актыўны грамадзянін можа выступаць у якасці праваабаронцы, законнага прадстаўніка і г. д. у працэсе абароны парушаных правоў і свабод у судах, адміністрацыйных органах, у пракуратуры і г. д., можа займацца маніторынгам выпадкаў парушэнняў правоў чалавека. Прыклады актыўнага ўдзелу грамадзяніна ў абароне і пашырэнні правоў чалавека, а таксама больш поўную інфармацыю аб магчымасцях грамадскага ўдзелу глядзі ў дапаможніку «Адстойванне і пашырэнне правоў чалавека праз грамадскі ўдзел».

Пра асноўныя паўнамоцтвы і магчымыя шляхі дзейнасці актыўнага грамадзяніна глядзі падрабязней Дэкларацыю ААН аб праваабаронцах, змешчаную ў канцы дапаможніка, а таксама заняткі: «Чалавек і дзяржава», «Міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека», «Нацыянальныя механізмы абароны правоў чалавека», «Дзейнасць па ахове навакольнага асяроддзя» і «Актыўны грамадзянін».

**РАЗДАТАК № 20.1.**

**ФОРМЫ ГРАМАДСКАЙ АКТЫЎНАСЦІ**
**(СПОСАБЫ ДЗЕЙНАСЦІ, ПРАЗ ЯКІЯ МОЖА РЭАЛІЗАВАЦЦА АКТЫЎНЫ ГРАМАДЗЯНІН)**

У дэмакратычнай краіне кожны грамадзянін мае права выказваць свае ўласныя меркаванні адносна жыцця грамадства, правоў чалавека і актыўна адстойваць іх усімі законнымі метадамі. У такой краіне існуюць спецыяльныя механізмы, пры дапамозе якіх грамадзяне могуць дамагацца ад улады прыняцця патрэбных ім рашэнняў.

1. Удзел у выбарах дэпутатаў, правядзенні рэферэндумаў азначае, што кожны грамадзянін мае права ўдзельнічаць у кіраванні сваёй краінай ці ўплываць на дзяржаўнае кіраванне праз удзел у выбарах. Грамадзянін можа сам вылучаць сваю кандыдатуру ў якасці дэпутата — прадстаўніка інтарэсаў грамадзян, галасаваць за прадстаўніка сваіх інтарэсаў у Парламенце (альбо мясцовых органах самакіравання), удзельнічаць у выбарчай кампаніі кандыдата, праграму якога падзяляе, удзельнічаць у працы выбарчай камісіі, якая арганізуе выбары, альбо дзейнічаць у якасці назіральніка на выбарах.

2. Удзел у арганізацыі і правядзенні сходаў азначае, што кожны грамадзянін мае права свабодна збірацца з іншымі людзьмі для таго, каб абмяркоўваць любыя праблемы і выказваць свае меркаванні.

3. Удзел у стварэнні і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў і ініцыятыў азначае, што кожны грамадзянін мае права аб'ядноўвацца з іншымі людзьмі ў арганізацыі ці ініцыятывы для таго, каб вырашаць свае праблемы, праблемы грамадства, дзяржавы законнымі спосабамі.

4. Удзел у абмеркаванні сацыяльна важных пытанняў, звязаных з правамі чалавека, у сродках масавай інфармацыі азначае, што кожны грамадзянін мае права прадставіць з дапамогай СМІ свой пункт гледжання адносна той альбо іншай праблемы, шляхоў вырашэння гэтай праблемы. СМІ павінны прадстаўляць розныя пункты гледжання, каб кожны грамадзянін самастойна мог прыняць рашэнне, як яму ставіцца да той ці іншай праблемы. Сродкі масавай інфармацыі — гэта месца, дзе кожны грамадзянін можа выказваць свае меркаванні і тлумачыць дзяржаве і грамадству, што, з яго пункту гледжання, трэба рабіць і чаму.

5. Удзел у аднаўленні парушаных правоў ці папярэджанні парушэнняў праз законныя механізмы зваротаў і скаргаў — гэта магчымасць карыстацца незалежнымі і справядлівымі механізмамі абароны сваіх інтарэсаў пры ўмове, што асоба лічыць, што парушаны яе правы і інтарэсы ці правы іншых людзей. Працэдуры ўключаюць у сябе адміністрацыйнае разбіральніцтва на падставе звароту да вышэйстаячага начальства (у выпадку, калі падначаленыя парушылі правы грамадзяніна), звароты ў пракуратуру, суды і міжнародныя органы па правах чалавека.

# 21. ДЭМАКРАТЫЯ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- што такое дэмакратыя;
- асноўныя прынцыпы дэмакратыі.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- адрозніваць дэмакратычны лад ад недэмакратычнага;
- звязваць дэмакратычны лад з правамі чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да дэмакратыі як да працэсу, які стварае ўмовы для актыўнага ўдзелу грамадзян у жыцці краіны, сваёй мясцовасці.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі, знаёмства з тэмай і чаканымі вынікамі заняткаў — 5 хв.
2. Мадэляванне ідэальнай дэмакратычнай дзяржавы — 15 хв.
3. Абмеркаванне прынцыпаў дэмакратыі — 10 хв.
4. Абмеркаванне асобных пытанняў, якія тычацца дэмакратычнай дзяржавы — 10 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 5 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў, азнаёмце з тэмай і чаканымі вынікамі (5 хв.).**

На падставе падручнікаў гісторыі Беларусі за 9—11 класы, па якіх вучыліся ўдзельнікі, вусна прадстаўце апісанне трох гістарычных прыкладаў арганізацыі кіравання (Афіны альбо Полацкае веча, Германія 30-х, СССР, нейкую краіну Заходняй Еўропы).
- Ці можна назваць гэтыя прыклады прыкладамі дэмакратычнага ладу? Чаму?
- Якую краіну можна, на вашу думку, назваць дэмакратычнай?
- Патлумачце, што на гэтых занятках вы будзеце размаўляць пра дэмакратыю, прынцыпы дэмакратыі, умовы, неабходныя для яе існавання.

**2. Змадэлюйце ідэальную дэмакратычную дзяржаву (15 хв.).**

Аб'яднайце ўдзельнікаў заняткаў у некалькі груп па 5—7 чалавек. Папрасіце кожную групу на працягу 15 хв. змадэляваць на ватманах сваю ідэальную дэмакратычную дзяржаву. Прычым мадэляванне азначае, што ўдзельнікі на падставе сваёй творчасці самі павінны выбраць форму выяўлення: мастацкую ў выглядзе малюнка, апісальніцкую ў выглядзе тэксту, схематычную ці любую іншую. Але абавязкова ў гэтым выяўленні павінны быць адлюстраваны:
- сістэма прыняцця рашэнняў і кіравання і месца ў гэтай сістэме людзей,
- правы і абавязкі людзей і ўлады,
- сістэма вырашэння канфліктаў.

У час прэзентацыі вынікаў працы груп вызначце разам з удзельнікамі асноўныя ўмовы (прынцыпы), неабходныя для існавання дэмакратыі.

**3. Абмяркуйце прынцыпы дэмакратыі (10 хв.).**

Выдайце ўдзельнікам раздатачны матэрыял 21.1 і прапануйце абмеркаваць у групах яго змест, каб параўнаць яго з вынікамі папярэдняй працы. Пасля гэтага папрасіце ўдзельнікаў пракаментаваць вынікі гэтага параўнання.

У час гэтага абмеркавання сфакусуйце ўвагу на асноўных прынцыпах *дэмакратыі*, а таксама паспрабуйце акрэсліць разам з удзельнікамі паняцце дэмакратыі. Для паспяховай працы ў гэтай частцы можна карыстацца: раздаткам 21.1, матэрыяламі заняткаў «Што такое правы чалавека», «Чалавек і дзяржава», «Свабодныя і справядлівыя выбары», «Актыўны грамадзянін», а таксама дакументамі АБСЕ ў канцы дапаможніка.

**4. Абмяркуйце асобныя пытанні, якія тычацца дэмакратычнай дзяржавы (10 хв.).**

Правесці дыскусію можна з дапамогай метаду «Займі пазіцыю» (гл. гл. раздзел IV). Выкарыстайце для гэтага наступныя выказванні:

- Калі дзяржава сапраўды з'яўляецца дэмакратычнай, гэта аўтаматычна азначае, што там шануюцца і не парушаюцца правы чалавека.
- Любую краіну, дзе адбываюцца выбары, можна назваць дэмакратычнай.
- Актыўны ўдзел грамадзян у дзяржаўным жыцці неабавязкова ў тых краінах, дзе прадстаўнікі ўлады дзейнічаюць у інтарэсах народа.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Дадзеная частка з'яўляецца цэнтральнай часткай занятку. У сувязі з гэтым вельмі важна, наколькі глыбока удзельнікі будуць абмяркоўваць азначаныя выказванні. Настаўніку варта пры дапамозе дадатковых пытанняў падтрымліваць дыскусію і старацца ў роўнай ступені прадстаўляць магчымасць выказваць розныя меркаванні.**

**5. Падагульніце вынікі заняткаў (5 хв.).**
Арганізуйце падсумаванне з дапамогай наступных пытанняў:
- Ці маеце вы магчымасць удзельнічаць у развіцці дэмакратыі ў Беларусі? Якім чынам? Што вы можаце зрабіць для таго, каб Беларусь называлася дэмакратычнай дзяржавай?
- Ці толькі ў дэмакратычнай краіне магчымае захаванне правоў чалавека? Чаму вы так лічыце?

**Дадатковая інфармацыя**

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ДЭМАКРАТЫІ І ЯЕ СУВЯЗІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА

**Дэмакратыя** — тэрмін, які паходзіць ад двух старажытнагрэчаскіх слоў: дэмас і кратас, што азначаюць «народ» і «ўлада». Гэта форма кіравання дзяржавай ці палітычная сістэма, пры якой улада ажыццяўляецца праз прамое народаўладдзе (прамая дэмакратыя) альбо праз прадстаўнікоў, якія выбіраюцца народам (прадстаўнічая дэмакратыя) (паводле http://ru.wikipedia.org/wiki/Демократия).

Першапачатковай формай дэмакратыі была прамая дэмакратыя ў невялікіх гарадах-дзяржавах Старажытнай Грэцыі і на беларускіх землях у IX—XII стст. Гэтыя формы дэмакратыі грунтаваліся на праве землеўласнікаў прымаць рашэнні, агульнаабавязковыя для ўсіх, хто жыў на тэрыторыі дзяржавы. Пазней у Беларусі гэтая форма была выціснута манархічнымі формамі праўлення. У сучаснасці толькі Швейцарыя мае сістэму, нечым падобную да прамой дэмакратыі, адаптаванай да сённяшніх умоў. Гэта сістэма грунтуецца на прыняцці даволі шырокай колькасці рашэнняў шляхам рэферэндумаў.

Найбольш пашыранымі сёння з'яўляюцца формы заходнееўрапейскай прадстаўнічай дэмакратыі. Яе асноўнымі тэарэтыкамі былі Джон Лок (1632—1704), Мантэск'ё (1689—1755), Жан Жак Русо (1712—1778). Сутнасць дадзенай формы дэмакратыі заключаецца ў часовым дэлегаванні людзьмі сваіх паўнамоцтваў прадстаўнікам, якія, зыходзячы з інтарэсаў выбарцаў, бяруць удзел у кіраванні дзяржавай. Для дзейнасці такой палітычнай сістэмы вялікую ролю і значэнне маюць выбары і механізмы кантролю дзейнасці абраных грамадствам прадстаўнікоў (дэпутатаў).

У дэмакратычных дзяржавах прынцыпы дэмакратыі, як правіла, становяцца часткай Канстытуцыі і практыкі. Нягледзячы на тое, што культура, традыцыі любога народа адрозніваюцца, няма ніводнай, у тым ліку дэмакратычнай, дзяржавы, абсалютна падобнай да нейкай іншай. Людзі ў дэмакратычных дзяржавах прытрымліваюцца прынцыпаў, замацаваных у канстытуцыі і законах. І чакаюць ад сваіх урадаў падобнага стаўлення ў дачыненні да сябе. Дзякуючы ажыццяўленню гэтых прынцыпаў і існуе дэмакратычны лад, нягледзячы на ўсю сваю складанасць.

Без арганізацыі выбараў немагчыма сфармаваць прадстаўніцтва людзей у мясцовых і вышэйшых органах улады. Без удзелу ў працэсе арганізацыі, правядзення і кантролю за выбарамі немагчыма быць упэўненым, што інтарэсы людзей будуць улічаны падчас прыняцця рашэнняў дзяржаўнымі органамі ўлады. Без падзелу ўладаў немагчыма кантраляваць дзейнасць вышэйшых органаў улады. Без увядзення прынцыпу законнасці немагчыма ўстанавіць кантроль над дзейнасцю дзяржаўных органаў.

Прынцыпы дэмакратычнай дзяржавы і правы чалавека звязаны паміж сабой. Гэтыя сувязі вынікаюць з асаблівага характару права ў чалавека – як адносін паміж асобай і дзяржавай, а значыць, і неабходнасці мець магчымасць кантраляваць дзяржаву і ўплываць на яе для таго, каб яна не ўмешвалася ў гарантаваныя нам свабоды і стварала магчымасці для рэалізацыі правоў чалавека.

Дэмакратыя не сама сабою абараняе правы чалавека, а стварае рэальныя ўмовы, якія дазваляюць укараняць прынцыпы правоў чалавека ў заканадаўства, пашыраць іх праз сферу адукацыі. Дэмакратыя стварае таксама магчымасці праз спецыяльны механізм абароны на нацыянальным узроўні адстойваць правы чалавека. Іншымі словамі, дэмакратыя толькі стварае ўмовы для забеспячэння правоў чалавека. Астатняе залежыць ад таго, ці захоча, ці будзе грамадзянін дастаткова матываваны і здольны выкарыстаць гэтыя магчымасці і механізмы для забеспячэння правоў чалавека.

У сучаснасці разам з развіццём чалавечага патэнцыялу і тэхнічнага прагрэсу (інтэрнэту і іншых сродкаў камунікацыі), усё большы інтарэс выклікаюць формы непасрэднай дэмакратыі, якія тэхнічна можна ажыццявіць у сучасных умовах (напрыклад, пры дапамозе Інтэрнэта).

## РАЗДАТАК № 21.1.

### АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ДЭМАКРАТЫІ

| Прынцып | Сутнасць прынцыпу |
|---|---|
| 1. Прынцып падзелу дзяржаўнай улады | Прынцып падзелу ўлад азначае, што ў краіне ўлада складаецца з выканаўчай (прэзідэнт ці прэм'ер-міністр), заканадаўчай (парламент) і судовай (суд). Гэты прынцып азначае, што ні прадстаўнікі выканаўчай, ні прадстаўнікі заканадаўчай улады не могуць канцэнтраваць усю ўладу ў сваіх руках. Любы з вышэйшых органаў улады можа прымаць рашэнні толькі пасля яго ўзгаднення з іншым органам. Канфлікты вырашаюцца праз суд, на падставе закона. Разам з падзелам улад грамадству не толькі прасцей кантраляваць яе дзейнасць, але сама ўлада дзейнічае эфектыўней і вымушана звяртацца да волі народа. |
| 2. Прынцып выбарнасці дзяржаўных органаў улады і кантроль за выбарамі | Гэты прынцып азначае, што дзяржаўныя інстытуты фармуюцца праз галасаванне грамадзян і залежаць ад грамадзян. Тыя органы, якія фармуюцца шляхам прызначэння, — падкантрольныя грамадзянам праз спецыяльнае заканадаўства, якое дазваляе людзям звяртацца ў дзяржаўныя органы і ацэньваць іх работу. Існаванне сістэмы органаў, заснаванай на выбарах, азначае, што заўсёды існуюць тыя, хто перамог, і тыя, хто быў пераможаны. У гэтых умовах надзвычай важна мець дастатковую палітычную культуру, для таго каб прызнаць сваё паражэнне, інакш уся сістэма не зможа функцыянаваць. Для таго каб грамадства было ўпэўнена ў справядлівасці выбараў і ў перамозе канкрэтных асоб, усталёўваецца кантроль грамадства за выбарамі праз удзел грамадзян у выбарчых камісіях, якія арганізуюць выбары, незалежнае назіранне грамадзян за выбарамі і запрашэнне замежных назіральнікаў. |
| 3. Прынцып законнасці (вяршэнства закона) | Прынцып вяршэнства закона азначае, што любыя прадстаўнікі дзяржавы, незалежна ад таго, якія пасады яны займаюць, павінны дзейнічаць толькі ў тых межах, якія вызначаны законам. Гэта азначае, што яны не могуць дзейнічаць так, як ім захочацца, што яны кантралююцца грамадзянамі праз кантроль над фармаваннем заканадаўства і кантроль за выкананнем імі заканадаўства. Ён азначае, што ўсе працэдуры, механізмы, установы дзейнічаюць толькі на падставе закона, працуюць не на падставе волі нейкай асобы ці некалькіх асоб, але згодна з вядомымі, справядлівымі і законнымі працэдурамі. Гэтыя працэдуры, механізмы могуць змяняцца толькі законным шляхам, а іх прыняцце ці змяненне залежыць ад волі грамадзян. |
| 4.Прынцып недыскрымінацыі | Прынцып азначае, што кожны грамадзянін, незалежна ад таго, займае ён дзяржаўную пасаду ці не, незалежна ад свайго эканамічнага становішча, веравызнання, полу і іншых прыкмет, разглядаецца заканадаўствам і дзяржавай як роўны іншым. Усе грамадзяне маюць аднолькавыя магчымасці і роўныя перад законам, а іх дзейнасць ацэньваецца па аднолькавых крытэрах. |
| 5. Прынцып удзелу грамадзян у дзейнасці дзяржавы | Гэты прынцып азначае, што дзяржавай ствараюцца ўмовы і магчымасці для таго, каб грамадзяне бралі ўдзел у грамадскім і дзяржаўным жыцці праз фармаванне дзейнасці дзяржавы, кантроль за ёю і магчымасці выказваць сваё меркаванне і настойваць на яго прыняцці. Калі грамадзяне не будуць актыўнымі і не будуць кантраляваць дзяржавы, то дзяржава пачне кантраляваць іх. |

# 22. ДЭМАКРАТЫЯ Ў ШКОЛЕ. ШКОЛЬНАЕ САМАКІРАВАННЕ

(заняткі разлічаны на 45 хв.).

**Чаканыя вынікі.**

- **У выніку заняткаў вучні будуць ведаць:**
- у чым заключаецца сутнасць школьнага (вучнёўскага) самакіравання;
- асноўныя прынцыпы школьнага (вучнёўскага) самакіравання;
- як школьнае (вучнёўскае) самакіраванне звязана з дэмакратыяй і правамі чалавека.

- **У выніку заняткаў вучні будуць здольныя:**
- звязваць школьнае (вучнёўскае) самакіраванне з праявай сацыяльнай актыўнасці школьнікаў;
- звязваць школьнае (вучнёўскае) самакіраванне з дэмакратыяй і правамі чалавека;
- планаваць першыя крокі для таго, каб арганізаваць школьнае (вучнёўскае) самакіраванне ў класе ці школе.

- **У выніку заняткаў вучні будуць ставіцца:**
- да школьнага (вучнёўскага) самакіравання як да праявы актыўнага ўдзелу грамадзян у жыцці краіны, сваёй мясцовасці.

**План заняткаў:**

1. Факусаванне ўвагі, знаёмства з тэмай і чаканымі вынікамі — 4 хв.
2. Знаёмства з прыкладам школьнага (вучнёўскага) самакіравання — 18 хв.
3. Азнаямленне з сутнасцю самакіравання — 12 хв.
4. Абмеркаванне асаблівасцяў школьнага (вучнёўскага) самакіравання — 8 хв.
5. Падагульненне заняткаў — 3 хв.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ:

**1. Засяродзьце ўвагу ўдзельнікаў на тэме заняткаў, прадстаўце тэму і чаканыя вынікі (4 хв.).**
Для факусавання ўвагі можна задаць наступнае пытанне:
- Хто ў вашай школе павінен прымаць рашэнні па арганізацыі жыцця школы? Чаму?

**Тлумачальная інфармацыя**

**Навучэнцы, як правіла, называюць адміністрацыю школы ці настаўнікаў. У гэтым выпадку варта запытаць у вучняў, з чаго складаецца жыццё школы. Гэта не толькі працэс навучання і заняткі, але і выхаваўчыя мерапрыемствы, вольны час навучэнцаў, дзейнасць на перапынках, кантакты з адміністрацыяй, бытавыя пытанні, інфармаванне аб мерапрыемствах, якія адбываюцца і арганізуюцца класам, вечарыны, ранішнікі, канцэрты, дыскатэкі і г. д.**

**Паспрабуйце выйсці на гэтыя мерапрыемствы для таго, каб паказаць, што ў школе вядзецца дзейнасць і па-за навучальным працэсам. Жыццё школы — гэта ўсе сукупныя ўмовы, у якіх знаходзіцца навучэнец на працягу 11 гадоў свайго жыцця.**

Пасля гэтага вытлумачэння можна задаць пытанне: ці ўсё з пералічанага вышэй павінна кантраляваць і вызначаць адміністрацыя школы? У якіх сферах жыцця школы навучэнцы могуць браць удзел побач з адміністрацыяй, настаўнікамі, бацькамі?

Пасля абмеркавання гэтага пытання прадстаўце тэму і чаканыя вынікі заняткаў.

**2. Стварыце ўмовы для знаёмства з прыкладам вучнёўскага самакіравання (18 хв.).**
Прапануйце навучэнцам самастойна азнаёміцца з паняццем і механізмамі школьнага (вучнёўскага) самакіравання. Для гэтага раздайце кожнаму ўдзельніку раздатак 22.1. Удзельнікі павінны будуць выканаць наступныя заданні:
а) прачытаць тэкст, складзены на падставе даследавання школьнага (вучнёўскага) самакіравання ў гімназіі г. Ляхавічы Брэсцкай вобласці;
б) акрэсліць для сябе, што такое школьнае (вучнёўскае) самакіраванне на прыкладзе, з якім яны азнаёміліся;
в) вызначыць, у чым праяўляецца школьнае (вучнёўскае) самакіраванне.

**Тлумачальная інфармацыя**

**У выпадку, калі ў вашай школе дзейнічае школьнае самакіраванне, для занятку варта выкарыстаць прыклады і матэрыялы гэтага канкрэтнага самакіравання. У гэтым выпадку ўсе далейшыя дзеянні варта суаднесці з усімі наступнымі часткамі заняткаў.**

Арганізуйце прадстаўленне вынікаў выкананых заданняў і абмеркаванне атрыманай інфармацыі. Для каментавання адказаў выкарыстоўвайце інфармацыю з дадатковага матэрыялу.

**3. Арганізуйце працэс засваення і азнаямлення з сутнасцю самакіравання (12 хв.).**

Папрасіце ўдзельнікаў самастойна аб'яднацца ў групы па інтарэсах. У гэтых групах удзельнікі павінны будуць вызначыць дзве асноўныя сферы, у рашэннях па якіх навучэнцы маглі б браць удзел.

Гэта азначае, што ўдзельнікі ў групах павінны акрэсліць, якую дзейнасць яны здольны былі б выконваць самастойна: напрыклад, арганізоўваць вольны час на перапынках, арганізоўваць вечары сустрэч, дыскатэкі, інфармаванне навучэнцаў аб дзейнасці адміністрацыі і г. д. Падрабязней пра некаторыя прыклады сфер дзейнасці самакіравання ў школе глядзі дадатковую інфармацыю і раздатак 22.1.

**Тлумачальная інфармацыя**

**Гэтую частку заняткаў і падзел на групы прапануецца правесці такім чынам, каб паказаць сутнасць самакіравання, у прыватнасці, тое, што кожны сам павінен свядома браць адказнасць за ўсё, што робіць. Самастойны падзел на групы выявіць і прадэманструе складанасці самаарганізацыі. Як правіла, удзельнікі губляюць шмат часу на тое, каб вызначыцца, хто будзе ў якой групе. Простая, здавалася б, дзейнасць, якая грунтуецца на асабістай адказнасці кожнага з удзельнікаў, можа прывесці ў выніку да зрыву заняткаў, калі будзе надзвычай неарганізаванай. Пры магчымасці акрамя змястоўных вынікаў працы па сферах, у якіх могуць браць удзел вучні, падагульніць трэба і тое, як яны аб'ядноўваліся ў групы, колькі часу гэта заняло. Такім чынам можна разгледзець некаторыя складанасці, якія вынікаюць з самакіравання, цяжкасці, звязаныя з дысцыплінай кожнага з удзельнікаў самакіравання.**

У выпадку, калі вы зацікаўлены пакінуць як мага больш часу на самую працу, аб'яднайце ўдзельнікаў у групы самі.

Калі вы слаба ведаеце ўдзельнікаў альбо ўдзельнікамі з'яўляюцца асобы, якія нядаўна пазнаёміліся паміж сабой — адразу самастойна аб'ядноўвайце ўдзельнікаў у групы.

Арганізуйце прэзентацыю працы груп.

**4. Абмяркуйце асаблівасці школьнага (вучнёўскага) самакіравання (15 хв.).**

Абмеркаванне асаблівасцяў школьнага (вучнёўскага) самакіравання можна правесці пры дапамозе метаду «Кантынуум». Для гэтага можна выкарыстаць наступныя выказванні:
- Прыклад самакіравання ў Ляхавіцкай школе — гэта выключэнне з правілаў. Стварыць падобнае ў нашай школе нерэальна.
- Школьнае (вучнёўскае) самакіраванне ў Беларусі мае магчымасці рэальна функцыянаваць.
- Вучні могуць удзельнічаць у вырашэнні пытанняў жыцця школы разам з адміністрацыяй школы, настаўнікамі і бацькамі.

**5. Падагульніце заняткі (3 хв.).**

Падсумаванне можна правесці з дапамогай наступных пытанняў:
- Ці трэба спрабаваць рабіць школьнае (вучнёўскае) самакіраванне? Для чаго трэба яго арганізоўваць?
- Што рабіць, калі настаўнікі ці адміністрацыя школы не захочуць стварыць самакіраванне?
- Як школьнае (вучнёўскае) самакіраванне звязана з правамі чалавека?

**Дадатковая інфармацыя**

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ШКОЛЬНАГА САМАКІРАВАННЯ

Самакіраванне азначае, што школьнікі (а ў некаторых выпадках школьнікі і іх бацькі) бяруць на сябе адказнасць за самастойнае вырашэнне кола пытанняў, якія тычацца непасрэдна вучняў і арганізуюць рэальную фінансавую, нарматыўную і арганізацыйную, выканаўчую і кантралюючую дзейнасць.

**Школьнае самакіраванне** — гэта арганізацыя вучняў школы, створаная вучнямі. Дзейнасць школьнага (вучнёўскага) самакіравання скіраваная найперш на вучняў. Яго сябром аўтаматычна робіцца кожны навучэнец школы.

Для таго каб школьнікі здольны былі ўдзельнічаць у жыцці школы, у працэсе навучання і выхавання, адміністрацыя школы і настаўнікі перадаюць частку паўнамоцтваў па вырашэнні асобных пытанняў вучнёўскаму самакіраванню. Як правіла, гэта паўнамоцтвы ў тых сферах, якія датычаць школьнай моладзі, напрыклад, арганізацыя адпачынку і свабоднага часу.

Для таго каб школьнае (вучнёўскае) самакіраванне адбылося, неабходна, як мінімум, некалькі рэчаў:

1) Матываванасць на актыўную дзейнасць з боку навучэнцаў, жаданне самастойна вырашаць цікавыя для сябе праблемы.
2) Дакладна акрэсленыя паўнамоцтвы (пералік пытанняў, якія можа вырашаць самакіраванне), як правіла, замацоўваюцца ў спецыяльным дакуменце — правілах самакіравання, статуце самакіравання ці статуце школы.
3) Структура самакіравання, якая складаецца з прадстаўнічых, выканаўчых і кантрольных органаў і ў фармаванні якіх абавязкова бяруць удзел самі вучні. Структура, парадак фармавання, ратацыі кадраў, паўнамоцтвы апісваюцца ў дакументах (статуце).
4) Вылучаныя матэрыяльна-тэхнічныя сродкі, якія дазваляюць вырашаць пытанні ў межах выдзеленай і замацаванай дакументамі кампетэнцыі самакіравання.

Самакіраванне рэгламентуецца статутам школы і нормамі, якія прымаюцца самакіраваннем у межах сваёй кампетэнцыі.

Кіруюць гэтым аб’яднаннем падлеткі, якія штогод абіраюцца на свае пасады іншымі вучнямі школы падчас усеагульных выбараў. Удзельнікі самакіравання самі вырашаюць, чым яно будзе займацца, самі плануюць сваю працу і рэалізуюць свае планы. Гэтая арганізацыя — паўнапраўны складнік школьнага самакіравання, прадстаўляе і абараняе іх інтарэсы перад школьнай адміністрацыяй і мясцовым упраўленнем адукацыі. Паўнейшую інфармацыю пра школьнае і вучнёўскае самакіраванне можна знайсці на інтэрнэт-старонках: http://nastaunik.info; http://dzietki.org/article/cms_view_article.php?aid=190&sid=81b4d274ced9f8d9327a559e57cc6aae

Па сваёй структуры школьнае (вучнёўскае) самакіраванне з’яўляецца класічнай дэмакратычнай арганізацыяй. На чале яе стаяць рада (заканадаўчая ўлада), кіраўніцтва (выканаўчая ўлада) і рэвізійная камісія (судовая ўлада). Кіруючыя органы могуць мець розныя назвы ў залежнасці ад традыцый школы. Гэта, а таксама склад, спосаб абрання і тэрмін дзеяння вызначае Статут школьнага (вучнёўскага) самакіравання, які прымаецца на агульным сходзе самакіравання і зацвярджаецца школьнай адміністрацыяй. Як і ў іншых арганізацый, органы самакіравання фіксуюць свае рашэнні, вядуць пратаколы і г. д.

Школьнае (вучнёўскае) самакіраванне — гэта самая звычайная арганізацыя, якая мае такую ж будову, як і любая іншая, у тым ліку і дзяржава. Ад таго, наколькі добра будзе яна пабудавана, наколькі дакладна і падрабязна распісаныя паўнамоцтвы і абавязкі яе членаў, ад таго, наколькі добра яны іх будуць разумець, залежыць дзеяздольнасць усёй арганізацыі: або школьнае (вучнёўскае) самакіраванне будзе працаваць самастойна, выступаючы з ініцыятывамі, займаючы сваю нішу ў школе, або яно стане чарговай спробай выканання папяровага загаду, не будзе мець ніякай магчымасці працаваць без сталага падштурхоўвання з боку дарослых.

**Чым можа займацца школьнае (вучнёўскае) самакіраванне.**

1) **Ахова навакольнага асяроддзя** (арганізацыя экалагічнай асветы для малодшых школьнікаў; высаджванне дрэў, кустоў і кветак, работа па добраўпарадкаванні паркаў прыборка тэрыторыі вакол школы ды інш.)

2) **Арганізацыя вольнага часу вучняў** (вечарыны, дыскатэкі, спартыўныя спаборніцтвы, літаратурныя і паэтычныя конкурсы ды інш.)

3) **Супрацоўніцтва з настаўнікамі, бацькамі і адміністрацыяй школы** (віншаванні святочнымі паштоўкамі настаўнікаў у Дзень нараджэння, запрашэнні бацькоў на школьныя святы і мерапрыемствы, заахвочванне бацькоў да актыўнага ўдзелу ў працы бацькоўскай рады, запрашэнне адміністрацыі на мерапрыемствы самакіравання, узгадненне планаў працы самакіравання з адміністрацыяй ды інш.)

4) **Дабрачынная праца** (дабрачынная праца ў дзіцячых дамах, садках, пошук адрасатаў, якім патрэбна дапамога ды інш.) і г. д.

Школьнае (вучнёўскае) самакіраванне можа быць арганізавана ў асобным класе, некалькіх класах альбо ў школе. Гэта звязана з тым, што асноўная ініцыятыва па стварэнні і дзейнасці школьнага (вучнёўскага) самакіравання павінна сыходзіць ад навучэнцаў.

У гэтым матэрыяле пазначаны толькі агульнае апісанне структуры і магчымыя сферы дзейнасці школьнага (вучнёўскага) самакіравання, якое можа быць арганізавана на ўзроўні школы ці нават класа. Калі ў настаўніка ці адукатара ёсць асабісты досвед працы ў самакіраванні або ён знаёмы з прыкладамі школьнага (вучнёўскага) самакіравання, то варта прыводзіць тыя прыклады, якія вядомыя і больш блізкія ўдзельнікам.
Па дадатковую інфармацыю раім звяртацца на сайт http://nastaunik.info/civil/school/ (унізе на старонцы ёсць спасылка на публікацыю «Вучнёўскае самакіраванне. Дапаможнік для лідэраў» Максіма Чарняўскага)

**РАЗДАТАК № 22.1.**

## ПРЫКЛАД ШКОЛЬНАГА (ВУЧНЁЎСКАГА) САМАКІРАВАННЯ ЛЯХАВІЦКАЙ ГІМНАЗІІ

Штогод напрыканцы верасня ў Ляхавіцкай гімназіі адбываецца лінейка для старшакласнікаў (8—11 класы), на якой распавядаюць, што значыць вучнёўскае самакіраванне і як яно дзейнічае ў Ляхавіцкай гімназіі.

Рада старшакласнікаў збіраецца не радзей чым раз на месяц. Гэты орган ажыццяўляе кантроль за выкарыстаннем матэрыяльных рэсурсаў самакіравання, вядзе работу па прыцягненні дадатковых фінансавых сродкаў, выкарыстоўваючы разнастайныя крыніцы іх паступлення. На першым пасля абрання паседжанні рада старшакласнікаў абірае са свайго складу старшыняў цэнтраў самакіравання. Цэнтры самакіравання спрыяюць прыцягненню большай колькасці вучняў да сістэматычнай працы ў вучнёўскім самакіраванні. Цэнтры могуць мець сваіх кансультантаў з ліку бацькоў ці настаўнікаў.

Прававы цэнтр забяспечвае распрацоўку ўнутрышкольных дакументаў, законаў гімназіі, якія рэгламентуюць распарадак функцыянавання гімназіі, органаў самакіравання, правы і абавязкі членаў калектыву і сочыць за іх выкананнем, абараняе правы вучняў, супрацоўнічае з сацыяльным педагогам, класнымі кіраўнікамі. Так, прынятыя палажэнне аб дзяжурстве па гімназіі, кодэкс паводзін на вечарыне, функцыянальныя абавязкі гімназістаў у арганізацыі вучнёўскага самакіравання і інш.

Прэс-цэнтр адказвае за выданне школьных насценгазет. Насценгазеты выдаюцца звычайна да школьных урачыстасцяў, мерапрыемстваў, датаў. Цэнтр выконвае функцыю інфармавання вучняў і прыцягнення іх да ўдзелу ў той ці іншай імпрэзе. Так, напрыклад, у 2000/2001 навучальным годзе былі выдадзены газеты да дня прафілактыкі СНІДу, Дня настаўніка, Дня святога Валянціна, Дня абаронцаў Айчыны, 8 Сакавіка.

Дыска-цэнтр адказвае за арганізацыю дыскатэк. Сюды ўваходзіць адказнасць за падтрыманне дыскатэчнай апаратуры ў належным стане і выкарыстанне яе, падбор музычнай і стварэнне забаўляльнай праграмы, падтрыманне парадку, аздабленне залы, запрашэнне гасцей, непасрэдна правядзенне. Дыска-цэнтр вызначае колькасць запрашэнняў на дыскатэку і друкуе іх. Кожны гімназіст можа запрасіць на дыскатэку свайго сябра з іншай школы, але адказнасць за яго паводзіны кладзецца на таго, хто запрасіў. Падбіраецца музычны рэпертуар дыскатэкі.

Цэнтр «Парадак» адказвае за захаванне і падтрыманне парадку ў гімназіі. На пачатку навучальнага году ён распрацоўвае план дзяжурстваў класаў па паверхах і памяшканнях і даводзіць яго да ведама старастаў класаў.
Фінансавы цэнтр адказвае за размеркаванне, выкарыстанне матэрыяльна-фінансавых сродкаў вучнёўскага самакіравання і кантроль за імі.
Сярод вучняў рэгулярна праводзяцца апытанні ў форме анкетавання, якія паказваюць узровень іх інфармаванасці пра справы самакіравання, даюць магчымасць нават самым сціплым выказаць свае пажаданні і прапановы ў пісьмовым выглядзе, што, у сваю чаргу, дае магчымасць улічыць іх найбольш поўна. Анкета паказвае, якія змены, на думку навучэнцаў, неабходна правесці, хто працуе эфектыўна, а хто не.

Паводле курсавой працы студэнткі 3 курса БДПУ Сідун Крысціны Уладзіміраўны «Развіццё вучнёўскага самакіравання ў сучаснай школе»: http://dzietki.org/article/cms_view_article.php?aid=190&sid=81b4d274ced9f8d9327a559e57cc6aae

# ЧАСТКА IV. АПІСАННЕ МЕТАДАЎ ПРАЦЫ ПА НАВУЧАННІ ПРАВАМ ЧАЛАВЕКА

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА КЛАСІФІКАЦЫІ МЕТАДАЎ

Існуе даволі значная колькасць разнастайных класіфікацый метадаў навучання. Гэтыя класіфікацыі праведзены тэарэтыкамі і практыкамі з розных прычынаў і робяць акцэнт на розныя асаблівасці метадаў, спрабуючы ў іх знайсці нешта супольнае і асаблівае. У дадзеным дапаможніку мы зыходзім з неабходнасці дапамагчы настаўніку ці адукатару выкарыстоўваць на занятках метады не паасобку, а ў спалучэнні. Таму ў дапаможніку мы прапануем класіфікацыю, якая будзе грунтавацца на ролі, якую выконваюць асобныя метады ў тэхналогіі арганізацыі і правядзенні гэтых заняткаў. Наша класіфікацыя павінна дапамагчы настаўніку ці адукатару правільна выбіраць метады для дасягнення мэтаў, якія стаяць перад асобнымі заняткамі нашага дапаможніка.

З нашага пункту гледжання, актыўная пазіцыя маладых людзей у справе пашырэння правоў чалавека, а таксама абароны парушаных правоў і свабод, з’яўляецца асновай правоў чалавека, яе рухавіком. Стратэгія, абраная дадзеным дапаможнікам, самім працэсам навучання накіравана на фармаванне актыўнасці, на развіццё асобы і стварэнне ўмоў, калі ўдзельнік не проста запамінае інфармацыю, якую атрымлівае ад настаўніка ці адукатара, а «перажывае» і «засвойвае» яе, што спрыяе фармаванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў галіне правоў чалавека. З гэтай прычыны аснову ўсіх заняткаў дапаможніка складаюць метады працы ў малых групах. З нашага пункту гледжання, менавіта гэтыя метады дазваляюць зрабіць асноўнымі суб’ектамі навучальнага працэсу саміх удзельнікаў, падкрэсліць ролю і значэнне асобы ў задавальненні як сваіх уласных інтарэсаў, так і ў вырашэнні праблем, звязаных з правамі чалавека. Дзякуючы гэтым метадам навучэнцы могуць звяртацца да свайго асабістага досведу, самастойна ацэньваць новую інфармацыю праз прызму свайго досведу, а таксама праз прызму досведу іншых удзельнікаў. Гэтыя метады дазваляюць перакласці максімум працы і адказнасці на ўдзельнікаў, што дапаможа змадэляваць умовы, дзе дзейнасць і яе вынікі будуць залежаць збольшага ад актыўнай і мэтанакіраванай самастойнай ці арганізаванай працы ў групе. Правілы арганізацыі індывідуальнай і групавой працы — аснова ўсіх метадаў, якія выкарыстоўваюцца ў дадзеным дапаможніку, таму ў першую групу мы паставілі правілы па арганізацыі працы ў малых групах.

Заняткі пабудаваны такім чынам, што іх цэнтральную частку складае па-асабліваму арганізаваная дзейнасць па атрыманні новай інфармацыі, фармаванні і замацаванні падыходаў, ведаў і досведу ў галіне правоў чалавека, што павінна паспрыяць актыўнаму праяўленню асобы ў выпадку парушэнняў правоў чалавека. Паколькі яна, з аднаго боку, будзе ўсведамляць праблему ці парушэнне, неабходнасць і патрэбу рэагаваць на праблему ці парушэнне, а таксама мець неабходныя навыкі гэтых дзеянняў. Такім чынам, цэнтральную частку кожных заняткаў складаюць два ўзаемазвязаныя блокі: уклад новай інфармацыі і практычная частка — арганізацыя дзейнасці па фармаванні досведу ўдзельніка. Зварот да асабістага досведу ўдзельнікаў дапаўняецца новай інфармацыяй, якая тычыцца катэгорыі правоў чалавека. Новая альбо дадатковая інфармацыя па правах чалавека неабходна для таго, каб ствараць умовы, пры якіх удзельнікі, выпрацоўваючы свае ўласныя падыходы і фармуючы ўменні і навыкі, грунтаваліся б не толькі на сваіх уяўленнях (што правільна, а што не), але і ўлічвалі існуючую ў галіне правоў чалавека тэорыю і практыку. Паколькі наша мэта — ствараць умовы для павышэння ролі самога навучэнца ў працэсе навучання правам чалавека, мы аб’ядналі ў катэгорыю прыўнясення новай інфармацыі метады, якія збольшага перакладаюць адказнасць за знаёмства з гэтым матэрыялам на саміх удзельнікаў. Класічным прыкладам метадаў, на падставе якіх перадаецца новая інфармацыя, з’яўляецца лекцыя. Мы пастараліся максімальна адысці ад гэтага традыцыйнага спосабу перадачы ведаў, выкарыстаўшы толькі падчас адных заняткаў міні-лекцыю. Лекцыі ў дадзеным дапаможніку прапануецца замяняць самастойным знаёмствам (індывідуальна, у парах, у тройках, у групах) з матэрыялам (праз розныя метады арганізацыі працы ўдзельнікаў) — з тэкстамі раздаткаў, міжнароднымі нормамі і нацыянальным заканадаўствам у галіне правоў чалавека. Метады самастойнага знаёмства з новай інфармацыяй па правах чалавека аб’яднаны ў асобную групу метадаў.

Уменне выказваць і аргументаваць сваё меркаванне, уменне і жаданне слухаць думкі іншых, параўноўваць і выкарыстоўваць іх, плюралізм, талерантнасць — гэта катэгорыі, якія з’яўляюцца, з нашага пункту гледжання, неад’емнай часткай правоў чалавека. Фармаванне гэтых якасцяў — адна з нашых мэтаў, якая дасягаецца не толькі зместам і тэмамі для абмеркаванняў, але і працэсам навучання. Асновай заняткаў дадзенага дапаможніка

з’яўляецца арганізацыя навучальнай працы ўдзельнікаў, падчас якой яны змогуць звярнуцца да свайго асабістага досведу, а таксама атрымаюць новы практычны досвед, новыя пункты гледжання, будуць мець магчымасць абмяркоўваць і аргументаваць сваё стаўленне да той ці іншай з’явы правоў чалавека, аналізаваць і асэнсоўваць вынікі абмеркаванняў з іншымі ўдзельнікамі, удзельнічаць у абмеркаваннях, выпрацоўваць сваю ўласную аргументаваную пазіцыю, улічваючы меркаванні і аргументы іншых. З нашага пункту гледжання, дыскусіі адыгрываюць значную ролю ў дасягненні такіх вынікаў. Таму асобную групу метадаў складуць розныя формы дыскусіі і арганізацыі практычнай працы.

Аднак мала толькі ўсведамляць парушэнні правоў чалавека — трэба ўмець выпраўляць сітуацыю. Таму важным аспектам з’яўляецца фармаванне ў актыўнага грамадзяніна спосабаў паводзінаў, калі ён здольны прадпрымаць актыўныя дзеянні па аднаўленні парушаных правоў і па недапушчэнні парушэнняў. Усе заняткі пабудаваны такім чынам, што ўдзельнікі павінны самастойна дзейнічаць. У практычных занятках асноўны ўхіл робіцца на фармаванне практычных уменняў ці навыкаў паводзінаў. Таму асобную катэгорыю метадаў складаюць метады па арганізацыі практычных уменняў і навыкаў.

Рэфлексіўнае стаўленне да навакольнага свету — важны кампанент актыўнай асобы і правоў чалавека. Катэгорыя правоў чалавека знаходзіцца ў працэсе пастаяннага фармавання. Гэта азначае, што дзякуючы рэфлексіі адносінаў, свайго стаўлення да асобных катэгорый яна з’яўляецца важным кампанентам правоў чалавека. Усе заняткі дадзенага дапаможніка пабудаваны такім чынам, што пасля правядзення любой часткі праходзіць рэфлексія-падсумаванне. Без падсумавання само практыкаванне не мае ніякага практычнага значэння. Спосаб арганізацыі заняткаў накіраваны на фармаванне рэфлексіўных здольнасцей удзельнікаў. Як правіла, рэфлексія праводзіцца ў форме дыскусіі, таму мы не вылучалі гэтыя метады ў асобную катэгорыю.

Такім чынам, мы вылучылі чатыры асноўныя катэгорыі метадаў, якія выкарыстоўваюцца ў занятках дапаможніка.

1. Спосабы арганізацыі працы ў малых групах, працы ў парах, індывідуальнай працы.
2. Спосабы арганізацыі працы па данясенні дадатковай інфармацыі па правах чалавека.
3. Спосабы арганізацыі абмеркаванняў і дыскусій.
4. Спосабы арганізацыі працы, накіраванай на фармаванне ўменняў і навыкаў, абмеркаванне новай інфармацыі і яе замацаванне.

Гэтая класіфікацыя — даволі ўмоўная. Мэта нашай класіфікацыі — дапамагчы настаўніку ці адукатару карыстацца дадзеным дапаможнікам.

У гэты дадатак да дапаможніка не ўключаны метады, якія ствараюць асаблівую працоўную атмасферу і абслугоўваюць асноўныя метады, напрыклад, дапамагаюць выйсці з роляў альбо стварыць працоўную ці, наадварот, разняволеную атмасферу. Коратка апішам некаторыя з такіх груп метадаў.

**Метады «ламання лёду» (ice breakers)**
Спецыяльныя практыкаванні для таго, каб стварыць атмасферу даверу, «разагрэць» групу на пачатку заняткаў, дапамагчы людзям пераадолець скутасць. Пры дапамозе гэтых метадаў ствараецца працоўная атмасфера, неабходная для выкарыстання актыўных і інтэрактыўных метадаў.

**«Размінкі» («энэрджайзэры»)**
Практыкаванні з мэтай стварэння кароткіх перапынкаў для адпачынку ці пераключэння ўвагі, накіраваныя на тое, каб падняць «энергію групы».

**Метады вываду з роляў**
Актыўныя і інтэрактыўныя метады пабудаваны на ўзаемадзеянні, таму могуць прыводзіць да ўзнікнення канфліктных сітуацый. Вывад з канфліктных сітуацый — неабходная частка для працягу нармальнай эфектыўнай працы групы.

**Метады аб’яднання ў групы**
Гэта метады, якія дазваляюць аб’ядноўваць удзельнікаў у групы для арганізацыі ўзаемадзеяння ў навучальным працэсе.

**Метады прэзентацыі вынікаў працы**
Метады накіраваны на арганізацыю працэсу прадстаўлення для абмеркавання вынікаў індывідуальнай ці групавой працы.

**Метады апытанняў і анкетаванняў**
Выкарыстоўваюцца ў якасці міні-даследаванняў на працягу заняткаў і могуць прымяняцца ў працэсе ацэньвання.

Мы не ставілі на мэце разгледзець максімальную колькасць метадаў. Падчас падрыхтоўкі заняткаў аўтар імкнуўся выкарыстаць найбольш простыя метады, для таго каб самі заняткі і тэмы не былі складанымі. Аўтар зыходзіў з таго, што настаўнікі і адукатары маюць практычны досвед выкарыстання актыўных і інтэрактыўных метадаў.

# АПІСАННЕ МЕТАДАЎ ДАПАМОЖНІКА

## 1. АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў МАЛЫХ ГРУПАХ, ПРАЦЫ Ў ПАРАХ, ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ ПРАЦЫ

**У дадзенай катэгорыі апісаны спосаб арганізацыі працы ў малой групе, прыведзены некаторыя варыянты арганізацыі працы ў малой групе, а таксама асобныя метады, якія дазваляюць павысіць эфектыўнасць правядзення працы ў групах і падсумавання.**

### 1.1. ПРАЦА МАЛЫХ ГРУП

**Мэта**: стварыць умовы для атрымання і абмену досведам праз узаемадзеянне ўдзельнікаў. Заняткі ў невялікіх групах дазваляюць удзельнікам выпрацаваць навыкі супрацоўніцтва, камунікацыі, працы ў камандзе і іншыя важныя навыкі ў адносінах паміж людзьмі. Акрамя таго, такая арганізацыя заняткаў дапаможа ўдзельнікам навучыцца вырашаць паміж сабой узніклыя непаразуменні.

А. Фармаванне малых груп. Настаўнік фармуе малыя групы па 3—7 чалавек.
Б. Фармулёўка задання (групам). Настаўнік тлумачыць групам, якім павінен быць канчатковы вынік іх працы. У залежнасці ад мэты дадзенага этапу сустрэчы ўсім групам можа быць дадзена адно і тое ж заданне альбо розныя.
В. Праца малых груп. Удзельнікі працуюць у малых групах на працягу адведзенага настаўнікам часу.
Г. Прэзентацыя працы груп. Малыя групы прэзентуюць вынікі сваёй працы. Удзельнікі іншых груп могуць задаваць пытанні на ўдакладненне і разуменне.
Д. Абмеркаванне вынікаў працы груп. Вынікі працы груп больш структураваныя і ўзгодненыя. Менавіта яны зараз з’яўляюцца прадметам агульнага абмеркавання.

Усе пяць этапаў і складаюць метад працы ў малых групах. Правядзенне працы ў групах без падсумавання (абмеркавання) не мае сэнсу.

### 1.2. 1x2x4

**Мэта**: арганізаваць працу па абмеркаванні пэўнага кола пытанняў ці праблем, пачынаючы ад індывідуальнай і канчаючы працай у малой групе. Дадзены метад дазваляе паглыбіць удзельнікаў у праблематыку і якасна прапрацаваць праблемы. Пры гэтым метад дазваляе пачуць меркаванні і аргументы іншых удзельнікаў. Дадзены метад разглядаецца ў дапаможніку ў якасці адной з формаў арганізацыі працы ў малой групе.

А. Дайце ўдзельнікам заданне выпрацаваць нейкую колькасць адказаў на пытанне, праблем, сітуацый і г. д. Пасля тлумачэння задання навучэнцам даецца кароткі прамежак часу для таго, каб падумаць і занатаваць магчымыя адказы ці рашэнні самастойна.
Б. Аб’яднайце ўдзельнікаў па парах і папрасіце іх абмеркаваць свае ідэі з іншымі навучэнцамі. Яны павінны дасягнуць згоды ці кансэнсусу адносна адказу ці рашэння. Можна, напрыклад, даць заданне абмеркаваць выпрацаваныя індывідуальна праблемы, сітуацыі, аргументы і вызначыць сярод абмеркаваных нейкую пэўную колькасць і г. д.
В. Аб’яднайце пары ў чацвёркі і дайце тое самае заданне, якое яны выконвалі ў парах.
Г. Пасля выканання практыкавання ў чацвёрках прапануйце, каб кожная з іх абмянялася адказамі і аргументацыяй з усімі ўдзельнікамі.
Д. На падставе атрыманых прэзентацый вынікаў працы правядзіце дыскусію ў агульнай групе.

### 1.3. КОЖНЫ ПА ЧАРЗЕ

**Мэта**: з дапамогай гэтага метаду вы зможаце эфектыўна арганізоўваць прэзентацыі вынікаў працы груп. Калі вы выкарыстоўваеце на занятках метад «Праца ў малых групах» і у выніку іх працы павінен атрымацца спіс ідэй (варыянтаў рашэння), то для прэзентацыі такіх вынікаў можна выкарыстаць метад «Кожны па чарзе». Дадзены метад з’яўляецца дапаможным спосабам, накіраваным на арганізацыю і правядзенне прэзентацый працы груп.

А. Папрасіце кожную групу па чарзе прадставіць па адным пункце з іх спісаў альбо прывесці адзін з выпрацаваных аргументаў, прыкладаў ці інш.
Б. Кожную наступную групу прасіце называць той варыянт іх рашэнняў, які не быў яшчэ названы. Апытанне па коле працягваецца, пакуль усе ідэі не будуць прадстаўлены.

Метад дазваляе кожнай групе абмяняцца з усімі вынікамі сваёй працы, пазбегнуць сітуацыі, калі першая група, якая выступае, прадстаўляе ўсю інфармацыю. Дазваляе пазбягаць паўтораў і эканоміць час.

## 1.4. БУРА ПРАПАНОЎ

**Мэта**: арганізаваць эфектыўны спосаб калектыўнага абмеркавання, пошуку рашэнняў, што адбываецца шляхам вольнага выказвання меркаванняў усіх удзельнікаў. Асноўная мэта метаду — гэта прапанаванне як мага большай колькасці варыянтаў рашэння пастаўленай задачы. Бура прапаноў з'яўляецца дастатковым метадам для абслугоўвання задачаў, якія стаяць перад працай у групе.

А. Запішыце на аркушы паперы праблему (пытанне), для якой неабходна знайсці рашэнні (адказы). Інструкцыя павінна быць кароткай, канкрэтнай і стымулюючай.
Б. Патлумачце, чаму праблема (пытанне) актуальная для групы.
В. Патлумачце асноўныя правілы буры прапаноў:
- Прымаюцца любыя ідэі. Не дапускаюцца ніякія абмеркаванні альбо ацэнкі.
- Кожная ідэя запісваецца ў такім выглядзе, у якім была прапанавана. Не дапускаюцца перафразаванне, абагульненне ці інтэрпрэтацыя, якія змяняюць сэнс прапановы.
- Асноўная мэта — атрымаць як мага большую колькасць ідэй. Пра якасць размова пойдзе далей.
- Заахвочваецца і прымаецца развіццё ўжо прапанаваных ідэй.
- Ідэі, супрацьлеглыя ўжо прапанаваным, таксама прымаюцца і заахвочваюцца.
- Усталёўваюцца і строга захоўваюцца часовыя межы. Калі час скончыўся, генерацыя ідэй заканчваецца.

Г. Запішыце ідэі на ватмане ці дошцы ў такім выглядзе, у якім яны былі прапанаваны. Для паскарэння працэсу (асабліва калі група вялікая) ідэі могуць запісвацца двума ўдзельнікамі.
Д. Удзельнікі ўдакладняюць запісаныя ідэі, задаюць пытанні, якія тычацца тлумачэння нейкай ідэі, і толькі аўтар ідэі дае гэтае тлумачэнне.
Е. Удзельнікам прапануецца ацаніць ідэі. Можна ажыццяўляць працэс ацэнкі ў цэлай групе альбо ў малых падгрупах. Вызначаюцца найбольш перспектыўныя ідэі і робяцца спробы дасягнення кансэнсусу.
Ж. Настаўнік ці адукатар павінен абагуліць прапановы і зрабіць высновы, неабходныя для далейшай працы.

## 2. СПОСАБЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ ПА ДАНЯСЕННІ ДАДАТКОВАЙ ІНФАРМАЦЫІ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

У гэтую катэгорыю ўваходзяць наступны методыкі.

**Выступленні (міні-лекцыі, паведамленні, дапаўненні)**. Удзельнікі ў працэсе паведамлення выконваюць ролю слухачоў. Слухаць будзе лягчэй, калі вядучы на працягу выступлення звяртаецца да ўдзельнікаў з пытаннямі, просіць іх даць зваротную сувязь.

**Выкарыстанне матэрыялаў для самастойнага чытання** Удзельнікам прапануецца самастойна прачытаць нейкі матэрыял, каб абмеркаваць прачытанае альбо выкарыстаць новую інфармацыю неяк інакш.

**Дэманстрацыя**
Адукатар дэманструе некаторыя тэхнікі альбо прыёмы, якімі варта авалодаць. Часцей за ўсё, пасля дэманстрацыі ўдзельнікам прапануецца патрэніравацца ў выкарыстанні таго ці іншага прыёму.

### 2.1. КОЖНЫ ВУЧЫЦЬ КОЖНАГА

**Мэта**: перадаваць (даносіць) новую кароткую інфармацыю ў галіне правоў чалавека.

А. Падрыхтуйце карткі з кароткімі выказваннямі, прыкметамі альбо з кароткай інфармацыяй. Інфармацыя павінна быць яснай і сціслай па форме (1—3 сказы).
Б. Раздайце вучням па адной картцы на аснове выпадковага выбару (можна папрасіць іх проста выцягнуць картку). Кожны ўдзельнік павінен атрымаць адну картку з інфармацыяй, якой будзе дзяліцца з іншымі ўдзельнікамі практыкавання (калі ўдзельнікаў больш, чым асобных інфармацый, раздайце карткі так, каб два ці тры вучні атрымалі адну і тую ж інфармацыю для навучання).
В. Дайце нейкі час для таго, каб вучні маглі азнаёміцца з інфармацыяй на картцы.
Г. Патлумачце ўдзельнікам правілы правядзення практыкавання. Кожны ўдзельнік павінен перадаць інфармацыю з карткі на словах як мага большай колькасці ўдзельнікаў, а таксама выслухаць і запомніць інфармацыю ад іншых удзельнікаў. Гэта практыкаванне, у час выканання якога ўдзельнікі павінны перамяшчацца па класе, сустракацца адзін з адным, разыходзіцца і зноў сустракацца.
Д. Па заканчэнні часу на выкананне практыкавання рассадзіце ўдзельнікаў на месцы і прапануйце ім падзяліцца з калегамі, што новага і ад каго яны даведаліся за гэты час. Правядзіце падсумаванне таго, што з новай інфармацыі ўдзельнікі запомнілі. Настаўнік ці адукатар павінен дапаўняць і выпраўляць пры неабходнасці выказванні ўдзельнікаў.

### 2.2. КОЖНЫ ВУЧЫЦЬ ГРУПУ

**Мэта**: метад накіраваны на самастойнае азнаямленне ўдзельнікаў з часткамі тэксту і самастойную перадачу зместу гэтага тэксту іншым удзельнікам, якія з ім не знаёміліся. Методыка заахвочвае ўдзельнікаў дапамагаць адзін аднаму вучыцца і адначасова ўзмацняе навучальны эфект праз выкладанне інфармацыі адзін для аднаго.

А. Раздайце ўдзельнікам індывідуальна раздатак з тэкстам, з якім трэба самастойна азнаёміцца. Варыянтаў раздаткаў з рознымі тэкстамі можа быць ад двух да пяці. Кожны ўдзельнік чытае атрыманы варыянт тэксту самастойна, пасля чаго самастойна абдумвае, якім чынам найлепш перадаць асноўны сэнс яго варыянта ўдзельнікам, якія не знаёміліся з яго тэкстам.
Б. Удзельнікі могуць аб’ядноўвацца ў пары, тройкі, чацвёркі ці пяцёркі ў залежнасці ад колькасці варыянтаў раздаткаў з тэкстамі. Іншымі словамі, калі варыянтаў раздаткаў толькі два, то першую пару ўтварае адзін удзельнік, які знаёміўся з адным раздаткам, і ўдзельнік, які знаёміўся з другім раздаткам. Падобным чынам фармуюцца іншыя пары. Калі раздаткаў тры, то падобным чынам утвараюцца тройкі і г. д. Групы ствараюцца такім чынам, каб удзельнікі, якія знаёміліся з рознымі варыянтамі тэксту, сфармавалі адну асобную групу. Задача ўдзельнікаў зараз — як мага больш зразумела пераказаць змест засвоенага тэксту. Дазваляецца карыстацца тэкстамі і іншымі матэрыяламі.
В. Абмяркуйце змест, з якім працавалі групы праз агульнае абмеркаванне. Звярніце асаблівую ўвагу на найбольш важныя часткі зместу кожнага раздатку.

Дадзены метад блізкі да метаду «Ажурная піла», але з’яўляецца спрошчанай яго версіяй і дазваляе невялікія памерам матэрыялы абмяркоўваць за больш кароткі час. Асаблівую ўвагу пры выкарыстанні дадзенага метаду трэба звяртаць на агульнае падсумаванне варыянтаў раздаткаў з тэкстамі.

## 2.3. АЖУРНАЯ ПІЛА

**Мэта**: метад накіраваны на самастойнае азнаямленне ўдзельнікаў з часткамі тэксту і самастойную перадачу зместу гэтага тэксту іншым. Метад з'яўляецца эфектыўным інструментам, які можа замяніць начытванне лекцый у тых выпадках, калі пачатковая інфармацыя (асабліва калі яе аб'ём даволі вялікі) павінна быць данесена да ўдзельнікаў перад правядзеннем нейкага віду дзейнасці на занятках. Методыка заахвочвае ўдзельнікаў дапамагаць адзін аднаму вучыцца і адначасова ўзмацняе навучальны эфект праз выкладанне інфармацыі адзін для аднаго.

А. Аб'яднайце ўдзельнікаў у групы для працы над раздаткам, матэрыялам артыкула альбо часткай кнігі. Кожны ўдзельнік групы чытае атрыманы тэкст, пасля чаго ў групе адбываецца абмеркаванне сутнасці тэксту, а таксама таго, якім чынам найлепш перадаць асноўны сэнс тэксту прадстаўнікам іншых груп.
Б. Прадстаўнікі розных груп, якія вывучалі розныя часткі тэксту, сустракаюцца ў новых групах (у іх склад уваходзіць па адным прадстаўніку ад кожнай з груп, якія працавалі на папярэднім этапе). Задача ўдзельнікаў зараз — як мага больш зразумела перадаць іншым засвоеныя са сваіх тэкстаў веды.
В. Удзельнікі вяртаюцца ў свае першапачатковыя групы і распавядаюць прадстаўнікам сваёй групы пра тое, што яны засвоілі з аповедаў прадстаўнікоў іншых груп. Пры гэтым кожны чалавек можа па-свойму інтэрпрэтаваць альбо дапаўняць аповед любога іншага прадстаўніка групы.
Г. Абмяркуйце змест, з якім працавалі групы праз агульнае абмеркаванне. Звярніце асаблівую ўвагу на найбольш важныя часткі зместу.

## 3. СПОСАБЫ АРГАНІЗАЦЫІ АБМЕРКАВАННЯЎ І ДЫСКУСІЙ

**У дадзенай частцы сабраныя розныя спосабы арганізацыі дыскусіі, а таксама асобныя метады, якія дазваляюць арганізаваць дыскусію.**

### 3.1. ДЫСКУСІЯ

**Мэта**: узаемадзеянне двух і больш людзей, аб'яднаных тэмай, якая ўяўляе для іх інтарэс. Дыскусія можа быць структураванай (разгортвацца па загадзя падрыхтаваным сцэнары) альбо *паўструктураванай* (у гэтым выпадку настаўнік толькі задае кірунак дыскусіі). Дыскусія патрабуе ад настаўніка ці адукатара пэўных навыкаў. У час дыскусіі вядучы:
- задае ўдзельнікам пытанні,
- дае слова,
- стымулюе актыўнасць удзельнікаў,
- заклікае выказвацца як мага больш зразумела, расстаўляць акцэнты,
- абагульняе выказванні,
- дапаўняе дыскусію новымі аспектамі ў плане зместу,
- завяршае дыскусію, падсумоўваючы важныя вынікі.

Час дыскусіі павінен быць дакладна вызначаны, — напрыклад, 30 хвілін.

**Паўструктураваная дыскусія**
Паўструктураваная дыскусія — гэта дыскусія, пры падрыхтоўцы да якой вызначаюцца толькі некаторыя пытанні, а ўсе астатнія вынікаюць з самой дыскусіі. Рэкамендуецца пры гэтым падрыхтаваць спіс тэм і асноўных пытанняў, але не апытальнік. Паўструктураваную дыскусію можна выкарыстоўваць для выяўлення праблем, іх прычын, меркаванняў, стасункаў удзельнікаў.

А. Патлумачце ўдзельнікам мэту сустрэчы (напрыклад, даведацца пра сутнасць таго альбо іншага пытання ад удзельнікаў). Перад тым, як перайсці непасрэдна да пытанняў, спашліцеся на ўжо існуючыя меркаванні па дадзеным пытанні.
Б. Праводзьце размову ў нефармальнай абстаноўцы, накіроўвайце дыскусію пытаннямі.
В. Будзьце адкрытымі да любых адказаў, нават самых нечаканых.
Г. Асцярожна падводзьце ўдзельнікаў да пытанняў, якія могуць моцна зачапіць іх пачуцці.
Д. Пры патрэбе можна пісьмова фіксаваць ход дыскусіі. Гэта можа рабіць адзін з удзельнікаў.
Е. Будзьце ўважлівымі да невербальных фактараў (рухі, позіркі, міміка, эмоцыі і г. д.).
Ё. Пазбягайце пытанняў, якія «наводзяць» на адказы.
Ж. Пазбягайце закрытых пытанняў (на якія можна адказаць «так» альбо «не»).
З. Групавыя дыскусіі павінны доўжыцца не больш за дзве гадзіны.
І. Майце пад рукамі спіс тэм і асноўных пытанняў, каб час ад часу спраўджваць з імі дыскусію.

### 3.2. ФОРУМ

**Мэта**: арганізаваць пісьмовую дыскусію, у якой будуць задзейнічаны ўсе ўдзельнікі навучальнага мерапрыемства.

**Матэрыялы:**
- развешаныя на сценах змацаваныя між сабой у выглядзе стужкі ватманы,
- падрыхтаваныя пытанні ці выказванні, якія будуць выносіцца на абмеркаванне ў час дыскусіі (звычайна 2—4 пытанні).
  Колькасць стужак з ватману павінна адпавядаць колькасці пытанняў, якія будуць абмяркоўвацца. Развешваць стужкі трэба такім чынам, каб да іх адначасова маглі падысці некалькі чалавек.

А. Азнаёмце ўдзельнікаў з правіламі правядзення пісьмовай дыскусіі.
  - Пісьмовая дыскусія будзе праходзіць па правілах, блізкіх да правядзення абмеркаванняў на інтэрнэт-форумах.
  - Удзельнікі не маюць права выказвацца ўголас, а павінны запісваць свае ўласныя меркаванні на лістах-ватманах.
  - Кожнае сваё меркаванне трэба пачынаць з пазначэння нік-імя (падобна да імёнаў, якія існуюць на інтэрнэт-форумах, але гэта могуць быць проста імёны ўдзельнікаў).
  - Кожны з удзельнікаў мае права выказвацца адносна зададзеных пытанняў, а таксама пісьмова каментаваць выказванні іншых удзельнікаў.
  - Кожны ўдзельнік павінен як мінімум адзін раз выказацца па кожным з вызначаных для дыскусіі пытанняў, выказванняў ці даць як мінімум па адным каментары на выказванні іншых удзельнікаў.
  - Максімум выказванняў па адным пытанні ці выказванні не вызначаецца.

Б. Абвясціце аб пачатку дыскусіі. Настаўнік ці адукатар павінен пільнаваць, як адбываецца пісьмовая дыскусія, і, калі неабходна, можа карэктаваць яе ход праз свае ўласныя каментары, праз задаванне дадатковых пытанняў, якія не будуць адводзіць дыскусію ў бок.
В. Кожны з удзельнікаў свабодна ходзіць ад адной стужкі-форуму да другой па чарзе, чытае выказванні па праблеме папярэдніх удзельнікаў і робіць уласныя каментары.
Г. Пасля сканчэння пісьмовай дыскусіі разам з усімі ўдзельнікамі падсумуйце сказанае па кожным з пытанняў, вызначаных на форуме.

## 3.3. КАНЦЭНТРЫЧНЫЯ КОЛЫ

**Мэта**: арганізаваць кароткія дыскусіі ў парах, накіраваныя на ўключэнне ўсіх удзельнікаў заняткаў у абмеркаванне пытанняў, якім прысвечаная дыскусія.

**Матэрыялы:**
- расстаўленыя ў два колы (унутранае і знешняе) насупраць адно аднаго крэслы (па колькасці ўдзельнікаў).
- падрыхтаваныя пытанні, якія будуць выносіцца на абмеркаванне ў час дыскусіі (звычайна 4—8 пытанняў).

А. Аб'яднайце ўдзельнікаў у дзве групы. Адна з гэтых груп сядзе на крэслы ва ўнутраным коле. Прадстаўнікі другой групы зоймуць месца ў знешнім коле крэслаў такім чынам, каб апынуцца насупраць удзельнікаў першай групы.
Б. Агучце першае з падрыхтаваных пытанняў і прапануйце абмеркаваць яго ў парах (людзям, якія сядзяць насупраць адзін аднаго). На абмеркаванне пытання даецца 1—3 хв.
В. Калі абмеркаванне скончыцца, прадстаўнікі знешняга кола па камандзе трэнера перасоўваюцца на адно крэсла ў правы бок. Унутранае кола застаецца на месцы. Агучце і прапануйце абмеркаваць у новых парах наступнае пытанне.
Г. Абмеркаванне працягваецца па такой самай схеме да таго моманту, пакуль не будуць абмеркаваныя ўсе падрыхтаваныя пытанні (у прынцыпе, прадстаўнікі знешняга кола могуць у канцы вярнуцца на свае першапачатковыя месцы).
Д. Папрасіце ўдзельнікаў заняць месцы ў агульным коле (поўнай групе). Правядзіце падсумаванне тых пытанняў і пачутых на іх адказаў.

## 3.4. ЧАТЫРЫ КРЭСЛЫ

**Мэта**: арганізаваць дыскусію, у якой адначасова могуць прымаць удзел не больш як чатыры ўдзельнікі.

**Матэрыялы:**
- пастаўленыя ў цэнтры памяшкання чатыры крэслы.
- падрыхтаваныя для дыскусіі пытанні (звычайна 1—3).

А. Абвясціце ўдзельнікам, што зараз будзе адбывацца дыскусія, прысвечаная таму альбо іншаму пытанню (напрыклад, пытанню пра неабходнасць забароны смяротнага пакарання). Прапануйце чатыром удзельнікам, якія хацелі б выказаць сваё стаўленне да гэтага пытання, заняць месцы на чатырох крэслах у цэнтры залы. Іншыя ўдзельнікі могуць сядзець у коле вакол гэтых крэслаў.
Б. Патлумачце, што тыя, хто сядзіць на чатырох крэслах, будуць пакідаць іх, як толькі выкажуць сваю пазіцыю. На вольнае месца можа сесці любы з удзельнікаў знешняга кола, які хоча выказаць сваю пазіцыю. Дыскусія спыняецца толькі ў тым выпадку, калі ў цэнтры застаецца менш за два чалавекі.
В. Падсумуйце праведзеную дыскусію і яе вынікі.

## 3.5. ЗАЙМІ ПАЗІЦЫЮ

**Мэта**: стварыць умовы для дыскусіі, пры якіх удзельнікі займаюць дакладна акрэсленыя пазіцыі па пытанні дыскусіі.

А. Падрыхтуйце чатыры лісты А4 з надпісамі «ЗА», «Больш ЗА, чым СУПРАЦЬ», «СУПРАЦЬ», «Больш СУПРАЦЬ, чым ЗА». Лісты з гэтымі надпісамі развешваюцца ў чатырох кутах памяшкання, дзе праходзяць заняткі. Важна, каб у памяшканні было дастаткова месца для таго, каб удзельнікі маглі пры патрэбе вольна пераходзіць з аднаго кута ў другі. Загадзя падрыхтуйце контраверсійныя тэзісы (контраверсійныя — значыць, супярэчлівыя, на якія абавязкова будуць розныя пункты гледжання).
Б. Азнаёмце ўдзельнікаў з правіламі правядзення метаду.
В. Агучце тэзіс. Кожны ўдзельнік у залежнасці ад сваіх перакананняў займае адну з чатырох магчымых пазіцый.

Г. Групы ўдзельнікаў, якія занялі адну і тую ж пазіцыю, па чарзе прыводзяць аргументы на сваю карысць. Задача ўдзельнікаў — аргументавана выказаць сваю пазіцыю і заахвоціць прыняць яе іншых удзельнікаў.
Д. Пасля таго, як выкажуцца ўсе групы, настаўнік або адукатар пытае, ці не змяніў хто сваю пазіцыю, і, калі гэта так, дазваляе гэтым удзельнікам перайсці ў групу, аргументы якой былі для іх пераканаўчымі.
Е. Калі хтосьці з удзельнікаў змяняе сваю пазіцыю, варта папрасіць яго аргументаваць сваё рашэнне. Калі ж ніхто не змяняе пазіцыі, то можа альбо працягваць дыскусію па дадзеным тэзісе, альбо прапанаваць новыя тэзісы.
Ё. Падсумуйце пазіцыі, аргументы і прыклады, якія выказваліся ўдзельнікамі падчас правядзення метаду.

## 3.6. КАНТЫНУУМ

**Мэта**: стварыць умовы для дыскусіі, пры якіх удзельнікі займаюць дакладна акрэсленыя пазіцыі па пытанні дыскусіі. Дадзены метад з'яўляецца блізкім па сутнасці да метаду «Займі пазіцыю», адным з яго магчымых варыянтаў.

А. Падрыхтуйце на падлозе дастаткова доўгую паласу, лінію, якую можна зрабіць, напрыклад, пры дапамозе скотча, альбо адзначаючы толькі тры асноўныя кропкі: 100% «ЗА», 0% «Не вызначыўся», 100% «СУПРАЦЬ». Важна, каб у памяшканні было дастаткова месца для таго, каб удзельнікі маглі пры патрэбе вольна пераходзіць з аднаго кута ў другі. Загадзя падрыхтуйце контраверсійныя тэзісы (тэзісы, на якія абавязкова будуць розныя пункты гледжання).
Б. Азнаёмце ўдзельнікаў з правіламі правядзення метаду. Патлумачце, што кожны ўдзельнік, займаючы пазіцыю па тэзісе, здольны будзе заняць такую пазіцыю, якая будзе вагацца ад 100% «ЗА» да 100% «СУПРАЦЬ».
В. Агучце тэзіс. Кожны ўдзельнік у залежнасці ад сваіх перакананняў займае адну з магчымых пазіцый. Напрыклад, «20% ЗА агучаны тэзіс, таму, што...», ці «70% СУПРАЦЬ, таму што...»
Г. Удзельнікі па чарзе прыводзяць аргументы на сваю карысць. Задача ўдзельнікаў — аргументавана выказаць сваю пазіцыю і заахвоціць іншых удзельнікаў прыняць яе.
Д. Пасля таго як выкажуцца ўсе ўдзельнікі, можна запытаць, ці не змяніў хто сваю пазіцыю і, калі гэта так, дазволіць гэтым удзельнікам перайсці да таго чалавека, аргументы якога былі для іх пераканаўчымі, альбо заняць іншае месца.
Е. Калі хтосьці з удзельнікаў змяняе пазіцыю, варта папрасіць яго аргументаваць сваё рашэнне. Калі ж ніхто не змяняе пазіцыі, ён можа альбо працягваць дыскусію па дадзеным тэзісе, альбо прапанаваць новыя тэзісы.
Ё. Падсумуйце пазіцыі, аргументы і прыклады, якія выказваліся ўдзельнікамі падчас правядзення метаду.

## 3.7. ГАЛЕРЭЯ

**Мэта**: дазваляе абмеркаваць у малых групах некалькі пытанняў адначасова. Пры гэтым кожная група атрымлівае магчымасць зрабіць свой унёсак у абмеркаванне ўсіх пытанняў.

А. Фармулёўка задання. Сфармулюйце заданні для групы.
Б. Аб'яднанне ўдзельнікаў у групы. Аб'яднайце ўдзельнікаў у малыя групы (3—7 чалавек), колькасць якіх адпавядае колькасці пытанняў для абмеркавання.
В. Удакладненне задання. Удакладніце заданне для кожнай малой групы, раздайце групам маркеры і паперу для запісаў.
Г. Праца малых груп над выкананнем свайго задання. Праца над пісьмовым выкананнем свайго задання ў кожнай групе доўжыцца звычайна 10—15 хв.
Д. Пераход да выканання заданняў іншых груп. Кожная малая група пераходзіць па коле на месца суседняй малой групы, не забіраючы з сабой свайго аркуша паперы са зробленымі запісамі. (Другі варыянт — група застаецца на сваім месцы, перадаючы суседзям аркуш са сваімі запісамі.) Атрымаўшы новы аркуш з новым заданнем, група вывучае напрацоўкі, зробленыя папярэдняй малой групай, адзначаючы пры гэтым пытальнікамі незразумелыя для сябе пункты і дадаючы свае прапановы. Праз 5—10 хв. групы зноў мяняюцца месцамі, пераходзячы па коле да напрацовак іншых груп.
Е. Падрыхтоўка да прэзентацыі. Пераходы па коле ад задачы да задачы сканчаюцца вяртаннем кожнай малой групы да сваіх першапачатковых напрацовак. На гэтым этапе групы вывучаюць ідэі, дапісаныя іншымі групамі, і рыхтуюцца да прэзентацыі.
Ё. Прэзентацыя вынікаў працы. Кожная група па чарзе прэзентуе напрацоўкі, зафіксаваныя на іх аркушах паперы. Прадстаўнікі іншых груп каментуюць і ўдакладняюць пры патрэбе сэнс пачутага.
Ж. Абмеркаванне вынікаў працы. Абмяркуйце вынікі працы і каментары груп.

## 3.8. РЭФЛЕКСІЙНАЕ КОЛА

**Мэта**: падсумаванне атрыманага ў выніку ўзаемадзеяння досведу і замацаванне атрыманых удзельнікамі ведаў.

А. Удзельнікі сядзяць на крэслах, расстаўленых па коле. Па чарзе задайце пытанні, на якія адказваюць альбо ўсе ўдзельнікі, альбо толькі тыя з іх, хто жадае выказацца.
Б. Звычайна пытанні задаюць у наступнай паслядоўнасці:
- Як вы сябе адчувалі ў час правядзення практыкавання?
- З якіх асноўных этапаў складалася практыкаванне?
- Што новага даведаліся?
- Што новага навучыліся рабіць?
- Што ў дадзеным практыкаванні было для вас самым карысным?
- Што было самым складаным, што засталося незразумелым?
- Як вы можаце выкарыстаць атрыманы досвед у сваёй дзейнасці?

## 3.9. СВАБОДНЫ МІКРАФОН

**Мэта**: стварыць умовы, у якіх удзельнікі падчас дыскусіі выказваліся б па чарзе.

А. Растлумачце ўдзельнікам правілы: выказвацца можа толькі асоба, якая трымае ў руках «мікрафон», астатнія слухаюць выступленне і чакаюць сваёй чаргі. Ролю «мікрафона» можа іграць, напрыклад, маркер, які па чарзе перадаецца альбо настаўнікам ці трэнерам, альбо самімі ўдзельнікамі. Пажадана, каб права выказацца атрымалі ўсе ўдзельнікі.
Б. Задайце пытанне і перадайце «мікрафон» аднаму з удзельнікаў. Выслухайце ўсе выказванні, пасля чаго можна задаваць наступнае пытанне групе.
В. Падсумуйце выказванні групы.

## 3.10. ОКСФАРДСКІЯ ДЭБАТЫ

**Удзельнікі дэбатаў:**
Маршалак,
Сакратар;
каманда, якая адстойвае тэзу,
каманда, якая адстойвае антытэзу,
нейтральная каманда (нейтральны бок), якая ў практыцы Оксфардскіх дэбатаў носіць назву «балота», тых, хто не вызначыўся.

Правілы правядзення дэбатаў
А. Удзел у дэбатах бяруць дзве каманды: тэзы і антытэзы. Каманда, якая адстойвае тэзу, сядае праваруч ад Маршалка, а каманда, якая аспрэчвае тэзу, — леваруч.
Б. Кожная каманда складаецца з чатырох чалавек. Ролі ў камандах размяркоўваюцца наступным чынам: 1-ы прамоўца на працягу 5 хвілін прадстаўляе тэзу/антытэзу — абвяшчае пазіцыю сваёй каманды. 2-і прамоўца на працягу чатырох хвілін прыводзіць аргументы на карысць пазіцыі сваёй каманды. 3-і прамоўца прыводзіць на працягу чатырох хвілін контраргументы ў дачыненні да таго, што пачуў у час выступленняў першых двух нумароў каманды-саперніцы. 4-ы прамоўца на працягу пяці хвілін падсумоўвае вынікі дэбатаў з пункту гледжання сваёй каманды.
В. Каманды выступаюць па чарзе: першым выступае №1 каманды, якая адстойвае тэзу, затым — №1 каманды антытэзы і г. д.
Г. Працэсам правядзення дэбатаў кіруе Маршалак. Маршалак абвяшчае пра пачатак дэбатаў, вызначае, на якім этапе пасля заканчэння адведзенага часу спыніць выступленне, сочыць за парадкам у зале і за выкананнем правілаў правядзення дэбатаў.
Д. Усе выступленні ў час дэбатаў пачынаюцца са звароту да Маршалка «Спадар Маршалак...»
Е. За рэгламентам у час дэбатаў сочыць Сакратар, які паказвае прамоўцу, Маршалку і Нейтральнай камандзе (нейтральнаму боку) карткі з колькасцю хвілін, якія застаюцца ў прамоўцаў да канца выступлення. Сакратар таксама арганізоўвае працэс галасавання пасля сканчэння дэбатаў.
Ё. Удзельнікі дэбатаў, якія не ўваходзяць у склад каманд тэзы і антытэзы, з'яўляюцца нейтральнай камандай ці нейтральным бокам. Менавіта яны на падставе вынікаў дэбатаў павінны будуць заняць пазіцыю адной з каманд-удзельніц дэбатаў.
Ж. Прадстаўнікі нейтральнага боку ў кожны момант дэбатаў могуць падняцца са свайго месца і звярнуцца да Маршалка з наступнымі словамі: «Спадар Маршалак, маю пытанне», альбо «Спадар Маршалак, маю каментар». Рашэнне пра тое, даваць слова прадстаўнікам нейтральнага боку ці не, прымае прамоўца, які выступае ў гэты момант. Прамоўца можа адказаць: «Так, калі ласка», што будзе азначаць згоду на задаванне пытання альбо на каментар, альбо адказаць: «Не, дзякуй», што азначае адмову ў перарыванні свайго

выступлення. Прамоўца мае права таксама ў любы момант спыніць пытанне альбо каментар з нейтральнага боку. Час, які займаюць пытанні альбо каментары, улічваецца ў час, адведзены прамоўцам на выступленне.
3. Пасля сканчэння выступленняў прамоўцаў з боку абодвух каманд пачынаюцца выступленні з удзелам прадстаўнікоў нейтральнага боку, якія па чарзе на працягу адной хвіліны могуць выказацца на карысць тэзы ці антытэзы. Гэтыя выступленні адбываюцца да таго моманту, пакуль будуць ахвотныя выступіць, альбо да спынення выступленняў Маршалкам.
I. Пасля сканчэння дэбатаў сярод удзельнікаў нейтральнай каманды (нейтральнага боку) адбываецца галасаванне. Кожны з прадстаўнікоў нейтральнай каманды павінен аддаць свой голас на карысць каманды, якая, з яго ўласнага пункту гледжання, лепш адстойвала сваю пазіцыю і выглядала ў час дэбатаў больш пераканаўча. Спосаб правядзення галасавання вызначаюць Маршалак і Сакратар.
К. Дэбаты прадугледжваюць урачыстасць строяў ва ўдзельнікаў.
Л. Правядзіце падсумаванне дэбатаў разам з усімі ўдзельнікамі.

## 3.11. PRES (АРГУМЕНТАЦЫЯ ЎЛАСНАЙ ПАЗІЦЫІ)

**Мэта**: стварыць умовы для кароткага, аргументаванага выступлення ўдзельніка.
PRES-метад — гэта спосаб арганізацыі працы падчас абмеркавання. Метад PRES прадугледжвае лаканічную і вельмі эфектыўную схему прэзентацыі ўласнай пазіцыі ў дачыненні да той альбо іншай з'явы. У дадзеным дапаможніку гэты метад выкарыстоўваецца пры правядзенні дыскусій.

**PRES** — гэта абрэвіятура, дзе кожнай загалоўнай літары адпавядае назва кроку ў практыкаванні, пры паслядоўным выкананні якога атрымліваецца завершаная схема пабудовы аргументацыі ўласнай пазіцыі.

P oint of view — пункт гледжання
R eason — аргумент
E xample — прыклад
S ummary — падсумаванне

А Сфармулюйце тэзіс. Тэзіс павінен быць контраверсійным і даваць магчымасць вызначыць сваё стаўленне да праблемы. Напрыклад: «Аборты ў нашай краіне неабходна забараніць заканадаўча».
Б. Патлумачце ўдзельнікам, што сваё стаўленне да тэзіса яны павінны будуць выказаць па схеме PRES. Для гэтага напішыце элементы, па якіх павінна будавацца прэзентацыя, на дошцы альбо на паперы, каб удзельнікі маглі іх бачыць.
В. Прадэманструйце на прыкладзе, як павінна выглядаць іх выступленне згодна са схемай. Напрыклад:
- Я лічу, што аборты ў нашай краіне неабходна забараніць (пункт гледжання).
- Таму што аборты — гэта ўзаконенае забойства (аргумент).
- Забойствы забароненыя законам (прыклад).
- Таму я лічу, што аборты неабходна забараніць (падсумаванне).
Г. Патлумачце ўдзельнікам, што яны не могуць перапыняць адзін аднаго і неабгрунтавана крытыкаваць пункт гледжання выступоўцы. Кожны можа выказацца, але толькі прытрымліваючыся схемы PRES.
Д. У час правядзення практыкавання ствараецца база для дыскусіі, дзе выказваюцца ярка акрэсленыя пункты гледжання на пэўную праблему.

## 3.12. АКВАРЫУМ

**Мэта**: стварыць умовы для атрымання досведу праз удзел альбо назіранне за паводзінамі ўдзельнікаў з наступным абменам і абмеркаваннем атрыманага досведа. Дадзены метад дазваляе стварыць працоўныя ўмовы для вялікай групы ўдзельнікаў. Прычым нейкая частка гэтай групы будзе займацца дасягненнем канкрэтных навучальных задач, а другая, як правіла, большая па колькасці — сачыць, ацэньваць ці выконваць іншыя заданні, звязаныя з назіраннем за ўдзельнікамі ўзаемадзеяння. Дадзены метад дазваляе з выкарыстаннем часткі групы атрымліваць досвед працы альбо трансляваць новую інфармацыю для ўдзельнікаў групы. Сам метад носіць назву «Акварыум» дзякуючы аналогіі з акварыумнымі рыбкамі, якіх мы можам назіраць за шклом.

А. Фармаванне групы асноўнай (група ўзаемадзеяння) і назіральнай групы. Настаўнік фармуе дзве групы. Як правіла, асноўная група — меншая па колькасці ўдзельнікаў.
Б. Фармулёўка задання (групам). Як правіла, меншая група атрымлівае канкрэтнае заданне, напрыклад, абмеркаваць пытанне, знайсці рашэнне, правесці сустрэчу,

зрабіць нешта. Удзельнікі назіральнай групы атрымліваюць аднолькавае альбо розныя заданні, звязаныя з назіраннем працэсаў альбо вызначэннем найбольш моцных аргументаў, альбо адсочваннем зместу абмеркавання ці дзеяння, якія будуць адбывацца ў асноўнай групе падчас узаемадзеяння. Напрыклад, вызначыць ролю кожнага з удзельнікаў асноўнай групы, назваць некалькі найбольш моцных аргументаў, вылучыць асноўны сэнс дыскусіі ці іншыя заданні.

В. Праца груп. Удзельнікі асноўнай і назіральнай груп выконваюць пастаўленыя перад імі заданні на працягу адведзенага часу.

Г. Абмеркаванне вынікаў працы груп. Вынікі працы груп абмяркоўваюцца, як правіла, спачатку з удзельнікамі асноўнай групы, а пазней выслухоўваюцца каментар назіральнай групы і ідзе агульнае абмеркаванне.

Усе чатыры этапы складаюць метад «Акварыум». Правядзенне працы ў групах без падсумавання (абмеркавання) не мае сэнсу.

# 4. СПОСАБЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ, НАКІРАВАНАЙ НА ФАРМАВАННЕ ЎМЕННЯЎ І НАВЫКАЎ, АБМЕРКАВАННЕ НОВАЙ ІНФАРМАЦЫІ І ЯЕ ЗАМАЦАВАННЕ

**У дадзеным раздзеле сабраны заняткі, якія дазваляюць абмеркаваць і замацаваць атрыманую новую інфармацыю, а таксама атрымаць практычны досвед ці ўменні і навыкі.**

## 4.1. АНАЛІЗ КАЗУСАЎ

**Мэта**: выпрацаваць навыкі крытычнага мыслення, навучыць пазнаваць і дзейнічаць у акрэсленых сітуацыях. Пры гэтым ставіцца задача не толькі навучыць удзельнікаў прымаць да ўвагі заканадаўства пры вырашэнні асобных прыватных праблем, але і даць ім магчымасць развіваць уласныя ідэі і рабіць высновы.

У юрыдычнай тэхніцы казусам прынята называць а) выпадак, выпадковае дзеянне, якое мае ўсе знешнія прыкметы злачынства, але якое не змяшчае элемента віны і таму не падлягае пакаранню; б) складаную і заблытаную справу, на якую цяжка ці немагчыма даць адназначны адказ.

А. Падрыхтуйце казус для аналізу. Для разбору казусаў можна выкарыстоўваць сітуацыі розных фармаў: юрыдычныя казусы, заснаваныя на рэальных пісьмовых рашэннях судоў ці міжнародных органаў па правах чалавека; штучна распрацаваныя казусы са змяшэннем некалькіх канфліктаў ці дылемаў; рэальныя жыццёвыя сітуацыі, выбраныя з газетных паведамленняў, часопісаў, кніг, кінафільмаў і іншых крыніц. Асноўнае патрабаванне да сітуацыі, якую вы плануеце выкарыстаць у якасці казусу: яна не павінна мець адзінага прававога рашэння (нават калі сітуацыя ўжо вырашана нейкім адным з магчымых спосабаў, прадстаўленае рашэнне не з’яўляецца адзіным), і вынікі яе аналізу могуць быць рознымі ў залежнасці ад аргументаў і падыходу, які вучні будуць выкарыстоўваць для гэтага.

Б. Азнаямленне з падрыхтаваным казусам. Гэта можа адбывацца ў пісьмовай, аўдыё- ці візуальнай форме. Можна прапанаваць удзельнікам проста прачытаць выпадак, напісаны на дошцы ці ў падручніку, можна паказаць ім урывак з фільма, можна прадэманстраваць загадзя падрыхтаваную сцэнку ды інш.

В. Пракантралюйце, наколькі поўна і аднолькава ўдзельнікі зразумелі сутнасць прапанаванай сітуацыі да таго, як пачнецца абмеркаванне праблемы. Гэта дапаможа высветліць памылкі і прабелы ў разуменні і падмацуе працу, якая будзе пазней праводзіцца ў групах. Лепш гэта зрабіць з дапамогай пастаноўкі серыі пытанняў:
- Што здарылася ў дадзеным выпадку?
- Хто быў задзейнічаны ў сітуацыі?
- Якія матывы кіравалі ўдзельнікамі сітуацыі, чаму яны дзейнічалі менавіта такім чынам?
- Якія з фактаў, прадстаўленых у сітуацыі, былі важнымі?
- Якія з тых фактаў, пра якія вы хацелі б даведацца, не былі знойдзены?

Г. Пасля дакладнага разбору сутнасці справы ўдзельнікі маюць распачаць аналіз і абмеркаванне тых аргументаў, якія могуць быць паднятыя «за» ці «супраць» кожнага з пунктаў гледжання. Для гэтай працы вучняў лепш падзяліць на невялікія групы (магчымы падзел на групы па стаўленні да прапанаванага ў казусе рашэння праблемы. Напрыклад, «згодныя з рашэннем», «не згодныя з рашэннем», «маюць сваё меркаванне»), каб у іх была большая магчымасць выказацца. Прапануйце ўдзельнікам у ходзе абмеркавання закрануць наступныя пытанні:
- Якія аргументы гавораць на карысць, а якія — супраць дадзенага пункту гледжання?
- Якія з аргументаў з’яўляюцца найбольш пераканаўчымі? Якія найменш упэўніваюць? Чаму?
- Ці ёсць якіясьці альтэрнатывы вырашэння дадзенай сітуацыі?
  Пры абмеркаванні важна спрыяць стварэнню клімату зычлівага стаўлення і талерантнасці, павагі да чужога меркавання. Растлумачце ўдзельнікам, што важна выслухаць кожны пункт гледжання, абдумаць і ацаніць яго.

Д. Пасля заканчэння працы ў групах папрасіце ўдзельнікаў прэзентаваць вынікі іх працы. Рашэнне — гэта адказ на падзею, што ляжыць у аснове любога казусу.
- Калі вучні выносяць рашэнне, як у выпадку судовых спраў, папрасіце іх даць ацэнку: згодны яны з рашэннем ці не? Што азначае прынятае рашэнне для ўдзельнікаў выпадку? Для грамадства? Для правоў чалавека?
- Калі рашэнне не было прапанавана ў казусе, вы можаце спытаць у вучняў, што яны вырашылі і чаму. Пасля таго, як вучні распавядуць пра свае ўласныя заключэнні, вы можаце расказаць ім сапраўдны вынік ці прысуд, які ўжо быў прыняты па гэтай справе. Тады ўдзельнікі будуць мець магчымасць параўнаць свае ўласныя рашэнні з сапраўдным рашэннем суда ці міжнароднага органа.

## 4.2. РАЗЫГРЫВАННЕ РОЛЯЎ І МАДЭЛЯВАННЕ СІТУАЦЫЙ

**Мэта**: стварыць умовы, пры якіх удзельнікі адчуваюць, думаюць і/ці дзейнічаюць, як іншыя людзі, і «разыгрываюць» пэўную праблему ці сітуацыю. Мадэляванне сітуацыі адрозніваецца тым, што ўдзельнікі рэагуюць на спецыфічную праблему ў зададзенай сітуацыі — напрыклад, навучальны судовы працэс ці абмеркаванне заканадаўства.

А. Папярэдняе планаванне і падрыхтоўка да заняткаў настаўніка ці адукатара. Прадумайце сітуацыю, якая павінна будзе разыгрывацца на занятках. Лепш, калі ролі кожнага з удзельнікаў будуць прапісаны асобна. Як варыянт, можна не даваць распісанай па ролях сітуацыі, а даць вучням магчымасць імправізацыі і пасля абмеркаваць, чаму быў выбраны менавіта такі варыянт паводзінаў.
Б. Вытлумачце ўдзельнікам правілы і дайце час на падрыхтоўку, магчыма, рэпетыцыю прапанаванай сітуацыі.
В. Заахвоцьце клас да ўважлівага стаўлення да выканання роляў. Гэта можна зрабіць з дапамогай пастаноўкі дадатковых заданняў для класа: знайсці памылкі ў тым, якім чынам дзейнічаюць «акцёры»; здагадацца, пра што жадаюць расказаць сваім выступленнем вучні і г. д.
Г. Выведзіце ўдзельнікаў з роляў.
Д. Падрабязна абмяркуйце і падагульніце заняткі. Трэба памятаць аб тым, што на занятках вучні выступаюць у пэўных ролях не для таго, каб пацешыцца самім, пацешыць клас і настаўніка. Разыгрыванне роляў і мадэляванне сітуацый — досыць моцная методыка, якая дапамагае на практыцы паглядзець, чаму навучыліся вучні ці атрымаць эмацыйную падставу для правядзення абмеркавання сур'ёзных прававых і грамадскіх пытанняў. Таксама яна дае магчымасць вучням патрэніравацца ва ўжыванні на практыцы атрыманых ведаў.

## 4.3. КАЛАЖ

**Мэта**: стварыць умовы для звяртання да досведу ўдзельнікаў, да паглыбленай творчай перапрацоўкі матэрыялаў, дазваляе абмеркаваць і прэзентаваць у творчай форме сваё бачанне сутнасці тых альбо іншых паняццяў, з'яваў, пытанняў.

**Матэрыялы:**
- некалькі ілюстраваных часопісаў і газет (на кожную групу — па некалькі асобнікаў),
- ватман для кожнай групы,
- клей і нажніцы для кожнай групы,
- маркеры.

А. Высветліце, ці разумеюць удзельнікі, што такое калаж. Пры неабходнасці патлумачце, што калаж — гэта кампазіцыя, якая ствараецца з дапамогай ілюстрацый, кавалкаў тэксту, малюнкаў для таго, каб адлюстраваць сваё бачанне канкрэтнага пытання.
Б. Аб'яднайце ўдзельнікаў у групы і патлумачце, што кожная з груп будзе на працягу вызначанага часу ствараць калаж (напрыклад, на тэму «Правы чалавека»). Упэўніўшыся, што заданне зразумелае, раздайце матэрыялы, неабходныя для падрыхтоўкі калажа.
В. Кожная група прэзентуе свой калаж, адказвае на магчымыя пытанні, каментуе іх.
Г. Падсумуйце вынікі працы, абмеркавання і каментароў груп.

## 4.4. ТРЫЯДА

**Мэта**: у час правядзення такога практыкавання вучні атрымаюць спрошчанае ўяўленне пра тое, як прымаюцца судовыя рашэнні. Пры гэтым увесь клас мае магчымасць актыўна паўдзельнічаць у дзеяннях суда. Да таго ж, практыкаванне дазваляе правесці судовае разбіральніцтва нават калі ў наяўнасці невялікая колькасць удзельнікаў.

А. Падрыхтуйце выпадак, звязаны з правамі чалавека, па якім будзе праводзіцца абмеркаванне ў форме судовага разбіральніцтва. Можна падрыхтаваць вытрымкі з заканадаўства, на падставе якіх вучні змогуць прымаць рашэнні. Вы можаце запрасіць на заняткі пракурора, адваката ці суддзю для таго, каб яны пракаментавалі, што будзе адбывацца на занятках.
Б. Раздайце вучням выпадак для азнаямлення з фактамі. Дайце ім час на чытанне і разуменне сэнсу справы.
В. Аб'яднайце ўдзельнікаў у тры (прыблізна) роўныя групы: суддзі, прадстаўнікі пакрыўджанага боку (істцы) і прадстаўнікі вінаватага боку (адказчыкі). Як варыянт падзелу: суддзі, адвакаты, пракуроры.
Г. Дайце заданне для працы ў групах: а) суддзі павінны за адведзены час вывучыць абставіны справы і падрыхтаваць пытанні, якія яны б хацелі задаць «істцам» і

«адказчыкам» для дакладнейшага высвятлення абставінаў справы і вынясення рашэння.
б) істцы (пракуроры) павінны, прааналізаваўшы прапанаваную сітуацыю і заканадаўства, знайсці палажэнні, якія б падтрымлівалі іх судовую пазіцыю і патрабаванні.
в) адказчыкі (адвакаты) на падставе фактаў, выкладзеных у выпадку, і заканадаўства, павінны выпрацаваць аргументы, якія б сведчылі на карысць іх пазіцыі і даказвалі невінаватасць.
Пастарайцеся так арганізаваць прастору, на якой будуць працаваць удзельнікі, каб групы не перашкаджалі адна адной у час групавой працы.
Д.Судовае разбіральніцтва па гэтай методыцы праводзіцца наступным чынам.
- Пасля заканчэння часу на групавую працу аб'яднайце ўдзельнікаў у тройкі так, каб у кожную ўваходзіў адзін суддзя, адзін ісцец (пракурор) і адзін адказчык (адвакат). Аб'яднаць удзельнікаў у групы будзе лягчэй, калі вы выдасце ім значкі, па якіх можна вызначыць, хто суддзя, хто адказчык, хто ісцец.
- Растлумачце правілы правядзення судовых слуханняў:
  а) паважліва ставіцца да суддзі;
  б) спачатку выступае ісцец (ці пракурор) і адказвае на пытанні суддзі, потым адказчык (ці адвакат) і таксама адказвае на пытанні суддзі; в) удзельнікі не павінны перапыняць адзін аднаго; г) суддзя можа дазволіць кароткі абмен думкамі паміж бакамі.
- Суддзя на падставе прыведзеных бакамі аргументаў і заканадаўства выносіць і паведамляе рашэнне, аргументуючы яго. Можна папрасіць суддзяў не прамаўляць рашэння ў сваёй групе, а прапанаваць суддзям усіх груп, якія самастойна працавалі на занятках, паведаміць свае рашэнні ў супольнай групе.
Е. Падвядзіце вынікі практыкавання. Пачніце з таго, што папрасіце суддзяў расказаць аб прынятых рашэннях і іх абгрунтаванні. Абмяркуйце з вучнямі факты і аргументы, якія былі прадстаўленыя на судовых разбіральніцтвах. Ацаніце разам з удзельнікамі моцныя і слабыя бакі разбіральніцтваў, у якіх яны бралі ўдзел.

## 4.5. МЕТАД МАЙСТЭРНІ

**Мэта**: стварыць умовы для выяўлення і згрупавання праблем альбо ідэяў па вырашэнні гэтых праблем.

А. Вылучэнне ідэяў. Спачатку ўдзельнікі індывідуальна (альбо пасля абмеркавання ў малых групах) на картках фіксуюць свае ідэі па вырашэнні той альбо іншай праблемы. Далей гэтыя карткі ў адвольным парадку размяшчаюцца перад удзельнікамі сустрэчы.
Б. Сістэматызацыя ідэяў. Удзельнікі знаёмяцца з меркаваннямі і аналізуюць іх, пры гэтым выказваючы думкі пра ступень блізкасці ідэі да той альбо іншай пары альбо групы меркаванняў. Трэнер сістэматызуе карткі ў адпаведнасці з думкамі ўдзельнікаў, кожны раз імкнучыся дасягнуць агульнай згоды на той альбо іншы варыянт сістэматызацыі.
В. Наданне назваў згрупаваным ідэям. Удзельнікі абмяркоўваюць, на аснове якіх крытэраў адбылася сістэматызацыя ў групы, а затым даюць назву той альбо іншай групе. Гэтым самым удзельнікі фактычна фармулююць магчымыя накірункі (стратэгіі) дзейнасці па вырашэнні праблемы.

# МІЖНАРОДНЫЯ ДАКУМЕНТЫ І ІНШЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

## УСЕАГУЛЬНАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Абвешчана 10 снежня 1948 г.

### ПРЭАМБУЛА

Беручы пад увагу, што прызнанне годнасці, уласцівай усім членам чалавечай сям'і, і іх роўных і неад'емных правоў з'яўляецца асновай свабоды, справядлівасці і ўсеагульнага міру;

беручы пад увагу, што непавага і пагарда да правоў чалавека прывялі да варварскіх актаў, якія абураюць сумленне чалавецтва, і што стварэнне такога свету, у якім людзі будуць мець свабоду слова і перакананняў і будуць свабодныя ад страху і галечы, абвешчана як высокае імкненне людзей;

беручы пад увагу, што неабходна, каб правы чалавека ахоўваліся вяршэнствам закону з мэтай забеспячэння таго, каб чалавек не быў змушаны ўжываць, у якасці апошняга сродку, паўстання супраць тыраніі і прыгнёту;

беручы пад увагу, што неабходна спрыяць развіццю сяброўскіх адносін паміж народамі;

беручы пад увагу, што народы Аб'яднаных Нацый пацвердзілі ў Статуце сваю веру ў асноўныя правы чалавека, у годнасць і вартасць чалавечай асобы і ў раўнапраўе мужчын і жанчын і вырашылі спрыяць сацыяльнаму прагрэсу і паляпшэнню ўмоваў жыцця пры большай свабодзе;

беручы пад увагу, што дзяржавы-члены абавязаліся спрыяць, у супрацоўніцтве з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый, усеагульнаму шанаванню і выкананню правоў чалавека і асноўных свабод;

беручы пад увагу, што ўсеагульнае разуменне характару гэтых правоў і свабод мае велізарнае значэнне для поўнага выканання гэтага абавязацельства:

### ГЕНЕРАЛЬНАЯ АСАМБЛЕЯ

абвяшчае

гэтую Ўсеагульную дэкларацыю правоў чалавека ў якасці задачы, да выканання якой павінны імкнуцца ўсе народы і ўсе дзяржавы з тым, каб кожны чалавек і кожны орган грамадства, увесь час маючы на ўвазе гэту Дэкларацыю, імкнуліся шляхам асветы і адукацыі спрыяць шанаванню гэтых правоў і свабодаў і забеспячэнню, шляхам нацыянальных і міжнародных прагрэсіўных мерапрыемстваў, усеагульнага і эфектыўнага прызнання і ажыццяўлення іх як сярод народаў дзяржаваў-членаў Арганізацыі, так і сярод народаў тэрыторый, што знаходзяцца пад іх юрысдыкцыяй.

**Артыкул 1.**

Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны надзелены розумам і сумленнем і павінны ставіцца адзін да аднаго ў духу братэрства.

**Артыкул 2.**

Кожны чалавек павінен мець усе правы і ўсе свабоды, абвешчаныя гэтай Дэкларацыяй, незалежна, напрыклад, ад расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных або іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, маёмаснага, саслоўнага або іншага становішча.

Апрача таго, не павінна рабіцца ніякага адрознення на аснове палітычнага, прававога або міжнароднага статусу краіны або тэрыторыі, да якой чалавек належыць, незалежна ад таго, ці з'яўляецца гэта тэрыторыя незалежнай, падапечнай, несамакіраванай, або як-небудзь інакш абмежаванай у сваім суверэнітэце.

**Артыкул 3.**

Кожны чалавек мае права на жыццё, на свабоду і на асабістую недатыкальнасць.

**Артыкул 4.**

Ніхто не павінен утрымлівацца ў рабстве або ў паднявольным стане; рабства і гандаль рабамі забараняюцца ва ўсіх іх формах.

**Артыкул 5.**

Нікога не павінны катаваць, ні з кім не павінны абыходзіцца і нікога не павінны караць жорстка, бесчалавечна або прыніжальна для годнасці.

**Артыкул 6.**

Кожны чалавек, дзе б ён ні знаходзіўся, мае права на прызнанне яго правасуб'ектнасці.

**Артыкул 7**

Усе людзі роўныя перад законам і маюць права, без усякага адрознення, на роўную абарону закона. Усе людзі маюць права на роўную абарону ад якой-кольвек дыскрымінацыі, што парушае гэту Дэкларацыю, і ад якога-кольвек падбухторвання да такой дыскрымінацыі.

**Артыкул 8**

Кожны чалавек мае права на дзейснае аднаўленне ў правах кампетэнтнымі нацыянальнымі судамі ў выпадках парушэння яго асноўных правоў, якія дадзены яму канстытуцыяй або законам.

**Артыкул 9**

Нікога не павінны адвольна арыштоўваць, затрымліваць або выганяць.

**Артыкул 10**

Кожны чалавек, для вызначэння яго правоў і абавязкаў і для ўстанаўлення абгрунтаванасці прад'яўленага яму крымінальнага абвінавачання, мае права, на падставе поўнай роўнасці, на тое, каб яго справа была разгледжана публічна і з захаваннем усіх патрабаванняў справядлівасці незалежным і бесстаронні судом.

**Артыкул 11**

1. Кожны чалавек, якога абвінавачваюць у злачынстве, мае права лічыцца невінаватым да таго часу, пакуль яго вінаватасць не будзе ўстаноўлена законным парадкам шляхам публічнага судовага разбору, пры якім яму забяспечваюцца ўсе магчымасці для абароны.
2. Ніхто не можа быць асуджаны за злачынства на падставе ўчынення якога-небудзь дзеяння або за бяздзеянне, якія ў час іх учынення не з'яўляліся злачынствам паводле нацыянальных законаў або паводле міжнароднага права. Не можа таксама накладацца пакаранне цяжэйшае за тое, якое магло быць ужыта ў той час, калі злачынства было учынена.

**Артыкул 12**

Ні ў чыё асабістае і сямейнае жыццё не павінны адвольна ўмешвацца, не павінны адвольна замахвацца на недатыкальнасць жылля, тайну карэспандэнцыі або на гонар і рэпутацыю. Кожны чалавек мае права на абарону закона ад такога ўмяшання або такіх замахаў.

**Артыкул 13**

1. Кожны чалавек мае права свабодна перамяшчацца і выбіраць сабе месцапражыванне ў межах кожнай дзяржавы.
2. Кожны чалавек мае права пакідаць любую краіну, уключаючы сваю ўласную, і вяртацца ў сваю краіну.

**Артыкул 14**

1. Кожны чалавек мае права шукаць прытулку ад пераследавання ў іншых краінах і карыстацца гэтым прытулкам.
2. Гэтае права не можа быць выкарыстана ў выпадку пераследавання за ўчыненне непалітычнага злачынства або дзеяння, што супярэчыць мэтам і прынцыпам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Артыкул 15**

1. Кожны чалавек мае права на грамадзянства.
2. Ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены свайго грамадзянства або права змяніць сваё грамадзянства.

**Артыкул 16**

1. Мужчыны і жанчыны, якія дасягнулі паўналецця, маюць права без усякіх абмежаванняў, незалежна ад расы, нацыянальнасці або рэлігіі, браць шлюб і засноўваць сям'ю. Яны карыстаюцца аднолькавымі правамі ў адносінах узяцця шлюбу, у час знаходжання ў шлюбе і ў час яго скасавання.
2. Шлюб можа быць заключаны толькі пры свабоднай і поўнай згодзе абодвух бакоў, што бяруць шлюб.
3. Сям'я з'яўляецца натуральнай і асноўнай ячэйкай грамадства і мае права на абарону з боку грамадства і дзяржавы.

**Артыкул 17**

1. Кожны чалавек мае права валодаць маёмасцю як аднаасобна, так і супольна з іншымі.
2. Ніхто не павінен быць адвольна пазбаўлены сваёй маёмасці.

**Артыкул 18**

Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэтае права ўключае свабоду мяняць сваю рэлігію або перакананні і свабоду спавядаць сваю рэлігію або перакананні як аднаасобна, так і разам з іншымі, публічным або прыватным парадкам у вучэнні, практыцы, спавяданні і выкананні рэлігійных і рытуальных абрадаў.

**Артыкул 19**

Кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў і на іх свабоднае выражэнне; гэтае права ўключае свабоду беспарашкодна прытрымлівацца сваіх перакананняў і свабоду

шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі сродкамі і незалежна ад дзяржаўных межаў.

**Артыкул 20**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду мірных сходаў і аб'яднанняў.
2. Ніхто не павінен прымушацца да ўступлення ў якоесьці аб'яднанне.

**Артыкул 21**

1. Кожны чалавек мае права браць удзел у кіраванні сваёй краінай непасрэдна або пры дапамозе свабодна выбраных прадстаўнікоў.
2. Кожны чалавек мае права роўнага доступу да дзяржаўнай службы ў сваёй краіне.
3. Воля народа павінна быць асновай улады ўрада; гэтая воля павінна выяўляцца ў час перыядычных і справядлівых выбараў, якія павінны праводзіцца пры ўсеагульным і роўным выбарчым праве, шляхам тайнага галасавання або пры дапамозе іншых раўназначных формаў, што забяспечваюць свабоду галасавання.

**Артыкул 22**

Кожны чалавек як член грамадства мае права на сацыяльнае забеспячэнне і на ажыццяўленне неабходных для падтрымання яго годнасці і для свабоднага развіцця яго асобы правоў у эканамічнай, сацыяльнай і культурнай галінах праз нацыянальныя намаганні і міжнароднае супрацоўніцтва і ў адпаведнасці са структурай і рэсурсамі кожнай дзяржавы.

**Артыкул 23**

1. Кожны чалавек мае права на працу, на свабодны выбар работы, на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы і на абарону ад беспрацоўя.
2. Кожны чалавек, без ніякай дыскрымінацыі, мае права на роўную аплату за роўную працу.
3. Кожны, хто працуе, мае права на справядлівую і здавальняючую ўзнагароду, якая забяспечвае вартае чалавека існаванне для яго самога і яго сям'і, і дапаўняецца, пры неабходнасці, іншымі сродкамі сацыяльнага забеспячэння.
4. Кожны чалавек мае права ствараць прафесійныя саюзы і ўступаць у прафесійныя саюзы для абароны сваіх інтарэсаў.

**Артыкул 24**

Кожны чалавек мае права на адпачынак і вольны час, уключаючы права на разумнае абмежаванне працоўнага дня і на перыядычны аплачваны водпуск.

**Артыкул 25**

1. Кожны чалавек мае права на такі жыццёвы ўзровень, уключаючы харчаванне, адзенне, жыллё, медыцынскі догляд і неабходнае сацыяльнае абслугоўванне, які неабходны для падтрымання здароўя і дабрабыту яго самога і яго сям'і, і права на забеспячэнне на выпадак беспрацоўя, хваробы, інваліднасці, удоўства, надыходу старасці або іншага выпадку страты сродкаў да існавання па незалежных ад яго акалічнасцях.
2. Мацярынства і дзяцінства маюць права на асаблівую апеку і дапамогу. Усе дзеці, якія нарадзіліся ў шлюбе або па-за шлюбам, павінны карыстацца аднолькавай сацыяльнай абаронай.

**Артыкул 26**

1. Кожны чалавек мае права на адукацыю. Адукацыя павінна быць бясплатнай, прынамсі ў тым, што датычыць пачатковай і агульнай адукацыі. Пачатковая адукацыя павінна быць абавязковай. Тэхнічная і прафесійная адукацыя павінна быць агульнадаступнай і вышэйшая адукацыя павінна быць аднолькава даступнай для ўсіх на падставе здольнасцей кожнага.
2. Адукацыя павінна быць накіравана на поўнае развіццё чалавечай асобы і на ўзмацненне шанавання правоў чалавека і асноўных свабод. Адукацыя павінна спрыяць узаемаразуменню, цярпімасці і сяброўству паміж усімі народамі, расавымі або рэлігійнымі групамі і павінна спрыяць дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па падтрыманні міру.
3. Бацькі маюць права прыярытэту ў выбары віду адукацыі для сваіх дзяцей.

**Артыкул 27**

1. Кожны чалавек мае права свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці грамадства, цешыцца мастацтвам, удзельнічаць у навуковым прагрэсе і карыстацца яго дабротамі.
2. Кожны чалавек мае права на абарону сваіх маральных і матэрыяльных інтарэсаў, што з'яўляюцца вынікам навуковых, літаратурных або мастацкіх працаў, аўтарам якіх ён ёсць.

**Артыкул 28**

Кожны чалавек мае права на сацыяльны і міжнародны парадак, пры якім правы і свабоды, выкладзеныя ў гэтай Дэкларацыі, могуць быць цалкам ажыццёўлены.

**Артыкул 29**

1. Кожны чалавек мае абавязкі перад грамадствам, у якім толькі і магчыма свабоднае і поўнае развіццё яго асобы.
2. Пры ажыццяўленні сваіх правоў і свабод кожны чалавек павінен спазнаць толькі такія абмежаванні, якія ўстаноўлены законам выключна з мэтай забеспячэння належнага прызнання і шанавання правоў і свабод іншых і задавальнення справядлівых патрабаванняў маралі, грамадскага парадку і агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве.
3. Ажыццяўленне гэтых правоў і свабод ні ў якім разе не павінна супярэчыць мэтам і прынцыпам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Артыкул 30**

Нішто ў гэтай Дэкларацыі не можа быць вытлумачана як прадастаўленне якой-небудзь дзяржаве, групе асоб або асобным людзям права займацца якой-небудзь дзейнасцю або ўчыняць дзеянні, накіраваныя на знішчэнне правоў і свабод, што выкладзены ў гэтай Дэкларацыі.

# МІЖНАРОДНЫ ПАКТ АБ ГРАМАДЗЯНСКІХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАВАХ

Прыняты і адкрыты для падпісання, ратыфікацыі, далучэння рэзалюцыяй 2200А (XXI) Генеральнай Асамблеі ААН ад 16 снежня 1966 г. Уступіў у сілу 23 сакавіка 1976 г. Ратыфікаваны Беларуссю 19 сакавіка 1968 г. *(вытрымкі)*

**ПРЭАМБУЛА**

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта,

беручы пад увагу, што, паводле прынцыпаў, абвешчаных у Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, прызнанне годнасці, уласцівай усім членам чалавечай сям'і і іх роўных і неад'емных правоў з'яўляецца асновай свабоды, справядлівасці і міру ва ўсім свеце,

прызнаючы, што гэтыя правы вынікаюць з годнасці, уласцівай чалавечай асобе,

прызнаючы, што ў адпаведнасці з Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека, ідэал вольнага чалавека, які карыстаецца грамадзянскай і палітычнай свабодай, і свабода ад страху і нядолі могуць быць дасягнутыя толькі калі будуць створаныя такія ўмовы, пры якіх кожны зможа карыстацца сваімі грамадзянскімі і палітычнымі, а таксама эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі правамі,

беручы пад увагу, што паводле Статута ААН дзяржавы абавязаныя заахвочваць усеагульнае шанаванне і выкананне правоў і свабод чалавека,

усведамляючы, што асоба са сваімі абавязкамі перад іншымі асобамі і перад супольнасцю, да якой яна належыць, мусіць дамагацца пашырэння і выканання правоў, прызнаных у дадзеным Пакце,

пагаджаюцца на наступныя артыкулы:

**ЧАСТКА I**

**Артыкул I**

1. Усе народы маюць права на самавызначэнне. На падставе гэтага права яны вольна вызначаюць свой палітычны статус і вольна забяспечваюць сваё эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё.
2. Усе народы могуць вольна распараджацца сваімі прыроднымі багаццямі і рэсурсамі ў сваіх мэтах, без шкоды для абавязкаў, якія вынікаюць з міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва, заснаванага на ўзаемнай выгадзе, і з міжнароднага права. Ніякі народ не можа быць пазбаўлены ўласных сродкаў існавання.
3. Усе дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта, уключна з тымі, якія адказваюць за кіраванне несамакіраванымі і падапечнымі тэрыторыямі, у адпаведнасці з умовамі Статута ААН павінны заахвочваць выкананне права на самавызначэнне і павінны паважаць гэтае права.

**ЧАСТКА II**

**Артыкул 2**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта бярэ на сябе адказнасць шанаваць і забяспечваць правы, прызнаныя ў дадзеным Пакце, усіх асоб на сваёй тэрыторыі ці пад сваёй юрысдыкцыяй, не зважаючы ні на якія адрозненні, такія як расавая прыналежнасць, колер скуры, пол, мова, рэлігія, палітычныя ці іншыя перакананні, нацыянальнае ці сацыяльнае паходжанне, маёмасны статус, статус паводле нараджэння ці іншы статус.
2. Калі гэта ўжо не прадугледжана існымі заканадаўчымі ці іншымі захадамі, кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта абавязуецца зрабіць неабходныя крокі ў адпаведнасці са сваімі канстытуцыйнымі працэдурамі і палажэннямі дадзенага Пакта, каб прыняць такія заканадаўчыя ці іншыя захады, якія могуць быць неабходнымі для ажыццяўлення правоў, прызнаваных у дадзеным Пакце.
3. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта абавязуецца:

(a) забяспечваць любой асобе, чые правы ці свабоды, прызнаваныя ў дадзеным Пакце, парушаныя, дзейсны сродак прававой абароны, нават калі парушэнне было ўчынена афіцыйнымі асобамі.

(b) забяспечваць, каб права на прававую абарону любой асобы, якая патрабуе такой абароны, вызначалася кампетэнтнымі судовымі, выканаўчымі ці заканадаўчымі ўладамі ці іншым кампетэнтным органам, прадугледжаным прававой сістэмай дзяржавы, і ўдасканальваць магчымасці прававой абароны;

(c) забяспечваць ужыванне кампетэнтнымі ўладамі сродкаў прававой абароны, калі такія сродкі існуюць.

**Артыкул 3**

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта абавязваюцца забяспечваць роўнае для мужчын і жанчын права карыстання ўсімі грамадзянскімі ды палітычнымі правамі, прадугледжанымі ў дадзеным Пакце.

**Артыкул 4**

1. У час надзвычайнай сітуацыі ў краіне, калі існаванне нацыі трапляе пад пагрозу і пра якую абвяшчаецца афіцыйна, дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта могуць прымаць захады ў адыход ад сваіх абавязальніцтваў у рамках дадзенага Пакта да той ступені, якая дакладна адпавядае вастрыні сітуацыі, пры ўмове, што такія захады не супярэчаць іншым абавязальніцтвам міжнароднага заканадаўства і не цягнуць за сабой дыскрымінацыі выключна на аснове расы, колеру, скуры, полу, мовы, рэлігіі ці сацыяльнага паходжання.
2. Гэтае палажэнне не можа быць падставай для якіхсьці адступленняў ад артыкулаў 6, 7, 8 (пункты 1 і 2), 11, 15, 16 і 18.
3. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта, якая выкарыстоўвае права на адступленне ад палажэнняў Пакта, мусіць неадкладна паінфармаваць астатнія дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта пра палажэнні, ад якіх яна адступіла, і аб прычынах, якія выклікалі такое рашэнне, праз пасярэдніцтва Генеральнага сакратара ААН. Праз таго ж пасярэдніка дзяржава павінна паведаміць дату, калі дзеянне адступленняў спыняецца.

**Артыкул 5**

1. Ніводзін пункт дадзенага Пакта не можа тлумачыцца як той, што дае права якойсьці дзяржаве, якойсьці групе ці якойсьці асобе прадпрымаць дзеянні ці рабіць любы ўчынак, скіраваны на скасаванне любога з правоў ці свабод, прызнаных у дадзеным Пакце, ці на абмежаванне памянёных правоў ці свабод у большай ступені, чым прадугледжана ў дадзеным Пакце.
2. Ніякія абмежаванні ці адступленні ад асноўных правоў чалавека, прызнаваных ці існуючых у любой дзяржаве-ўдзельніцы дадзенага Пакта, згодна з законам, канвенцыямі, правіламі ці звычаямі не дапускаюцца на падставе таго, што дадзены Пакт не прызнае такіх правоў ці яны прызнаюцца ў ім у меншай ступені.

**ЧАСТКА III**

**Артыкул 6**

1. Права на жыццё ёсць неад'емным правам кожнага чалавека. Гэтае права ахоўваецца законам. Ніхто не можа быць пазбаўлены жыцця адвольна.
2. У краінах, дзе смяротнае пакаранне не было скасаванае, смяротны прысуд можа выносіцца толькі за найбольш цяжкія злачынствы ў адпаведнасці з законам, дзеючым на момант учынення злачынства, і калі закон не супярэчыць пастановам дадзенага Пакта і Канвенцыі па прадухіленні злачынства генацыду і пакаранні за яго. Гэтае пакаранне здзяйсняецца толькі ў выкананне канчатковага прысуду, вынесенага кампетэнтным судом.
3. Калі пазбаўленне жыцця складае злачынства генацыду, згодна з Пактам мяркуецца, што нічога ў гэтым артыкуле не дае права дзяржавам-удзельніцам дадзенага Пакта адступіцца ў якой-небудзь форме ад любога абавязальніцтва, прынятага паводле Канвенцыі па прадухіленні злачынства генацыду і пакаранні за яго.
4. Кожны прысуджаны да смяротнага пакарання мае права прасіць памілавання ці змякчэння прысуду. Амністыя, памілаванне ці змякчэнне прысуду могуць ужывацца ва ўсіх выпадках.
5. Прысуд смяротнага пакарання не выносіцца за злачынствы, учыненыя асобамі да васемнаццаці гадоў, і не прыводзіцца ў выкананне дачыненні да цяжарных жанчын.
6. Нічога ў гэтым артыкуле не можа стаць падставай, каб адтэрмінаваць ці прадухіліць скасаванне смяротнага пакарання якой-небудзь з дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта.

**Артыкул 7**

Нікога не павінны катаваць, ні з кім не павінны абыходзіцца і нікога не павінны караць жорстка, бесчалавечна ці прыніжальна для годнасці. У прыватнасці, ніводная асоба без яе свабоднай згоды не можа стаць аб'ектам медыцынскіх ці навуковых эксперыментаў.

**Артыкул 8**

1. Ніхто не павінен утрымлівацца ў рабстве; рабства і гандаль рабамі забараняюцца ва ўсіх праявах.
2. Ніхто не павінен утрымлівацца ў паднявольным стане.
3. (a) Ні ад каго нельга патрабаваць выканання прымусовай ці абавязковай працы;
   (b) у краінах, дзе пакараннем за злачынства можа прызначацца пазбаўленне волі,

спалучанае з катаржнымі працамі, пункт 3 (а) не лічыцца перашкодай для выканання катаржных прац па прысудзе кампетэнтнага суда, які прызначыў такое пакаранне ;
(c) у гэтым пункце пад тэрмін прымусовая ці абавязковая праца не падпадаюць:
(i) любая праца ці павіннасць, не згаданая ў падпункце (b), якую, як правіла, павінна выконваць асоба, якая адбывае зняволенне паводле законнага рашэння суда, ці асоба, умоўна вызваленая са зняволення;
(ii) любая служба вайсковага характару і — у краінах, дзе дапускуецца адмова ад вайсковай службы па пэўных матывах, — любая служба, якая прадугледжваецца заканадаўствам для асоб, якія адмаўляюцца ад вайсковай службы па такіх матываў;
(iii) любая служба, якой вымагаюць абставіны надзвычайнага становішча ці бедства, што пагражае жыццю ці дабрабыту супольнасці;
(iv) любая праца ці служба, якая ўваходзіць у звычайныя грамадскія абавязкі.

**Артыкул 9**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду і асабістую недатыкальнасць. Ніхто не можа быць арыштаваны ці затрымальны адвольна. Ніхто не можа быць пазбаўлены свабоды іначай як на такіх падставах і згодна з такімі працэдурамі, якія ўстаноўлены законам.
2. Кожнага арыштаванага пры арышце павінны паінфармаваць аб прычынах арышту, яму неадкладна павінны паведаміць прад'яўленае яму абвінавачанне.
3. Кожны арыштаваны ці затрыманы па крымінальным абвінавачванні мусіць быць неадкладна даставлены да суддзі ці іншай службовай асобы, якая паводле закону мае права ажыццяўляць судовую ўладу, і мае права на судовае разбіральніцтва ў разумны тэрмін альбо на вызваленне. Зняволенне асоб, якія чакаюць судовага разбіральніцтва, не мусіць быць агульным правілам, аднак вызваленне можа ўжывацца ў залежнасці ад гарантый яўкі на суд, на любую стадыю судовага разбіральніцтва і, пры неабходнасці, яўкі для выканання прысуду.
4. Кожная асоба, пазбаўленая волі праз арышт ці затрыманне, мае права на разгляд сваёй справы ў судзе з той мэтай, каб суд неадкладна устанавіў законнасць затрымання і вырашыў вызваліць асобу, калі затрыманне было незаконным.
5. Кожны, хто быў ахвярай незаконнага арышту ці затрымання, мае права ў судовым парадку патрабаваць кампенсацыю.

**Артыкул 10**

1. Любая пазбаўленая волі асоба мае права на гуманнае абыходжанне і шанаванне годнасці, уласцівай чалавеку.
2. (a) Абвінавачаныя, за выключэннем надзвычайных абставін, мусяць утрымлівацца асобна ад тых, у адносінах да каго быў вынесены прысуд, і ім надаецца асобны рэжым, які адпавядае іх статусу неасуджаных асоб;
(b) абвінавачаныя непаўналетнія ўтрымліваюцца асобна ад паўналетніх вязняў і даставляюцца ў суд як найхутчэй дзеля вынясення прысуду.
3. Пенітэнцыярная сістэма павінна ставіць за галоўную мэту выпраўленне і сацыяльную рэабілітацыю вязняў. Непаўналетнія зняволеныя аддзяляюцца ад дарослых, і ім надаецца рэжым, адпаведны іх ўзросту і прававому статусу.

**Артыкул 11**

Ніхто не можа быць пазбаўлены волі толькі на той падставе, што ён не ў стане выканаць якоесьці дамоўнае абавязальніцтва.

**Артыкул 12**

1. Кожны чалавек, які законна знаходзіцца на тэрыторыі якойсьці дзяржавы, мае права на свабоду перамяшчэння і свабодны выбар месца жыхарства ў межах тэрыторыі дзяржавы.
2. Кожны чалавек мае права свабодна пакідаць любую краіну, уключна са сваёй уласнай.
3. Памянёныя вышэй правы не могуць быць прадметам якіх-небудзь абмежаванняў, акрамя выпадкаў, калі яны прадугледжаныя законам, неабходныя для абароны нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя ці маральнасці насельніцтва, ці правоў і свабод іншых людзей і калі яны не супярэчаць правам, прызнаным у дадзеным Пакце.
4. Нікога нельга адвольна пазбаўляць права на ўезд у сваю краіну.

**Артыкул 13**

Замежнік, які законна знаходзіцца на тэрыторыі дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта, можа быць высланы толькі ў мэтах выканання рашэння, прынятага паводле закона, і, калі іншага не вымагаюць імператыўныя меркаванні нацыянальнай бяспекі, ён мае права прывесці довады супраць сваёй высылкі і мае права на перагляд сваёй справы кампетэнтным органам улады, асобай ці асобамі, спецыяльна прызначанымі дзеля гэтай мэты кампетэнтнымі органамі ўлады, а таксама права быць прадстаўленым перад гэтым органам асобаю ці асобамі.

**Артыкул 14**

11. Усе асобы роўныя перад судамі і трыбуналамі. Кожны мае права пры разглядзе любога крымінальнага абвінавачання супраць сябе, ці пры вызначэнні сваіх правоў ці абавязкаў у нейкім грамадзянскім працэсе, на справядлівы і публічны разбор справы кампетэнтным, незалежным і бесстароннім судом, створаным на аснове закона. Прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі і грамадскасці могуць не дапускацца да судовага разбіральніцтва ці да пэўнай яго часткі з прычынаў маральнасці, грамадскага парадку ці нацыянальнай бяспекі ў дэмакратычным грамадстве ці калі гэтага патрабуюць інтарэсы прыватнага жыцця бакоў альбо — у строга неабходнай меры паводле рашэння суда — у адмысловых выпадках, калі розгалас можа шкодзіць інтарэсам правасуддзя; аднак любое судовае рашэнне па выніках разгляду крымінальнай ці іншай справы ў судзе мусіць абвяшчацца публічна, акрамя тых выпадкаў, калі адваротнага патрабуюць інтарэсы непаўналетніх асоб ці калі судовае разбіральніцтва датычыць шлюбных спрэчак ці пытання апякунства над дзецьмі.
2. Кожны абвінавачваны ва ўчыненні крымінальнага злачынства мае права лічыцца невінаватым, пакуль яго віна не будзе даказаная ў адпаведнасці з законам.
3. Пры прад'яўленні крымінальнага абвінавачання кожны мае права на наступныя мінімальныя гарантыі на аснове поўнай роўнасці:
(a) быць неадкладна і падрабязна паінфармаваным аб характары і прычынах абвінавачання супраць яго на мове, якую ён разумее;
(b) мець дастатковы час і магчымасці для падрыхтоўкі абароны, а таксама на зносіны з абаронцам паводле свайго выбару;
(c) быць судзімым без неапраўданай затрымкі;
(d) быць судзімым у сваёй прысутнасці і магчы абараняць сябе асабіста ці праз абранага сабой абаронцу; быць паінфармаваным пра такое права, калі абаронцы ў яго няма; а таксама мець абаронцу ў любым выпадку, калі таго патрабуюць інтарэсы правасуддзя, і бясплатна, калі няма магчымасці аплаціць абарону;
(e) дапытваць сведкаў, што сведчаць супраць яго, ці мець права, каб іх дапыталі, а таксама мець права на выклік і допыт сваіх сведкаў ад свайго імя на тых самых умовах, на якіх сведкі выступаюць супраць яго;
(f) карыстацца бясплатнай дапамогай перакладчыка, калі ён не разумее ці не размаўляе на мове, на якой вядзецца разбіральніцтва ў судзе;
(g) не быць прымушаным сведчыць супраць сябе ці прызнаваць сваю віну.
4. Адносна непаўналетніх судовы працэс мусіць быць такім, каб улічваўся ўзрост падсудных і мэта спрыяння іх перавыхаванню.
5. Кожны асуджаны за злачынства мае права на перагляд судовага прысуду ў судзе вышэйшай інстанцыі паводле закона.
6. Калі асоба ў выніку канчатковай пастановы суда была прызнана вінаватай ва ўчыненні крымінальнага злачынства і калі пазней гэты прысуд быў скасаваны ці асоба была памілаваная на падставе новых ці наноў выяўленых фактаў, якія катэгарычна пацвярджаюць, што адбылася судовая памылка, тая асоба, якая была пакараная ў выніку такога прысуду, павінна атрымаць кампенсацыю паводле закона, калі толькі не будзе даказана, што згаданая невядомая акалічнасць была ў свой час не адкрытая выключна ці часткова па віне гэтай асобы.
7. Нікога нельга паўторна судзіць ці караць за злачынства, за якое ён ужо канчаткова асуджаны ці апраўданы паводле закона і крымінальна-працэсуальнага права кожнай краіны.

**Артыкул 15**

1. Нікога нельга прызнаць вінаватым у крымінальным злачынстве на падставе якога-небудзь дзеяння ці бяздзеяння, якое не лічылася крымінальным злачынствам паводле нацыянальнага ці міжнароднага заканадаўства ў той час, калі яно ўчынялася. Адпаведна таксама не можа накладацца пакаранне, цяжэйшае за тое, што адпавядала закону ў час, калі ўчынілася крымінальнае злачынства. Калі пасля ўчынення злачынства законам змяншаецца пакаранне за дадзенае злачынства, на асобу, асуджаную за гэта злачынства, накладваецца меншае пакаранне.
2. Нічога ў гэтым артыкуле не перашкаджае адданню пад суд і пакаранню любой асобы за якое-небудзь дзеянне ці бяздзеянне, якое ў момант учынення лічылася крымінальным злачынствам паводле ўсеагульных прынцыпаў права, прызнаных міжнароднай супольнасцю.

**Артыкул 16**

Кожны чалавек, дзе б ён ні знаходзіўся, мае права на прызнанне яго правасуб'ектнасці.

**Артыкул 17**

1. Ніхто не можа зазнаваць адвольнае ці незаконнае ўмяшальніцтва ў яго прыватнае ці сямейнае жыццё, жытло ці тайну ліставання, а таксама незаконныя замахі на свае гонар і рэпутацыю.
2. Кожны чалавек мае права на абарону закона ад такога ўмяшальніцтва ці замахаў.

**Артыкул 18**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі. Гэтае права ўключае свабоду мець ці прымаць рэлігію ці перакананні на свой выбар, а таксама свабоду аднаасобна ці супольна з іншымі, публічна ці паасобку, вызнаваць сваю рэлігію ці перакананні ў вучэнні, практыцы, спавяданні і выкананні рэлігійных і рытуальных абрадаў. .
2. Ніхто не можа зазнаваць гвалт, які б абмяжоўваў свабоду мець ці прымаць рэлігію ці перакананні на свой выбар.
3. Свабода вызнання сваёй рэлігіі ці перакананняў можа быць абмежаваная толькі ў выпадках, вызначаных законам, неабходных для аховы грамадскай бяспекі, парадку, здароўя ці маральных звычаяў, як і асноўных правоў і свабод іншых людзей.
4. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта абавязуюцца паважаць свабоду бацькоў і, у адпаведных выпадках, законных апекуноў забяспечваць рэлігійнае і маральнае выхаванне сваіх дзяцей згодна са сваімі перакананнямі.

**Артыкул 19**

1. Кожны чалавек мае права бесперашкодна прытрымлівацца сваіх меркаванняў.
2. Кожны чалавек мае права на свабоду выражэння; гэтае права ўключае свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць усякага кшталту інфармацыю ды ідэі, не зважаючы на дзяржаўныя межы, як вусна, так і на пісьме ці ў друку, у выглядзе мастацкіх твораў ці іншым спосабам на свой выбар.
3. Карыстанне правамі, пазначанымі ў пункце 2 гэтага артыкула, накладае асаблівыя абавязкі і адказнасць. Таму яно можа пэўным чынам абмяжоўвацца, але такія абмежаванні павінны быць усталяваныя законам і неабходнымі:

(a) для шанавання правоў і рэпутацыі іншых асоб;
(b) для аховы нацыянальнай бяспекі ці грамадскага парадку ці здароўя насельніцтва і яго маральных звычаяў.

**Артыкул 20**

1. Любая прапаганда вайны павінна быць забароненая законам.
2. Любыя выступы ў падтрымку нацыянальнай, расавай ці рэлігійнай нянавісці, якія з’яўляюцца падбухторваннем да дыскрымінацыі, варожасці ці гвалту, павінны быць забароненыя законам.

**Артыкул 21**

Прызнаецца права на мірныя сходы. На карыстанне гэтым правам не могуць накладвацца ніякія абмежаванні, акрамя ўстаноўленых згодна з законам і неабходных у дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай ці грамадскай бяспекі, грамадскага парадку, аховы здароўя ці маральных звычаяў грамадскасці ці аховы правоў і свабод іншых людзей.

**Артыкул 22**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду аб’яднанняў з астатнімі, уключна з правам ствараць і далучацца да прафесійных саюзаў з мэтай абароны сваіх інтарэсаў.
2. На карыстанне гэтым правам не могуць накладвацца ніякія абмежаванні, акрамя ўстаноўленых згодна з законам і неабходных у дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах дзяржаўнай ці грамадскай бяспекі, грамадскага парадку, аховы здароўя ці маральных звычаяў насельніцтва і правоў і свабод іншых людзей. Гэты артыкул не забараняе накладання законных абмежаванняў на карыстанне гэтым правам у дачыненні да асоб, якія ўваходзяць у склад узброеных сіл і паліцыі.
3. Нічога ў гэтым артыкуле не дае права дзяржавам-удзельніцам Канвенцыі Міжнароднай арганізацыі працы 1948 г. аб свабодзе аб’яднанняў і абароне права на арганізацыю прымаць заканадаўчыя акты на шкоду гарантыям, забяспечаным гэтай Канвенцыяй, ці ўжываць закон такім чынам, які быў бы на шкоду гэтым гарантыям.

**Артыкул 23**

1. Сям’я — гэта натуральная і асноўная ячэйка грамадства і мае права на абарону з боку грамадства і дзяржавы.
2. Для мужчын і жанчын шлюбнага ўзросту прызнаецца права на шлюб і стварэнне сям’і.
3. Шлюб не можа быць заключаны без свабоднай і поўнай згоды людзей, што бяруць гэты шлюб.
4. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта павінны рабіць належныя крокі для забеспячэння роўнасці правоў і абавязкаў партнёраў у шлюбе адносна шлюбу падчас сумеснага жыцця і падчас скасавання шлюбу. У выпадку скасавання шлюбу павінна забяспечвацца абавязковая абарона ўсіх дзяцей.

**Артыкул 24**

1. Кожнае дзіця — незалежна ад расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага статусу ці статусу паводле нараджэння — мае права на такія захады па сваёй абароне, якіх патрабуе яго статус непаўналетняга, з боку сям'і, грамадства і дзяржавы.
2. Кожнае дзіця павінна быць зарэгістраванае неадкладна пасля нараджэння і павінна мець імя.
3. Кожнае дзіця мае права на атрыманне грамадзянства.

**Артыкул 25**

Кожны грамадзянін павінен мець права і магчымасць, не зважаючы на адрозненні, пазначаныя ў артыкуле 2, і без неабгрунтаваных абмежаванняў:

(a) браць удзел у дзяржаўных справах як непасрэдна, так і праз свабодна абраных прадстаўнікоў;
(b) галасаваць і быць абраным на справядлівых перыядычных выбарах, якія праводзяцца на аснове ўсеагульнага і роўнага выбарчага права, таямніцы галасавання, пры гарантаваным свабодным выяўленні волі выбарцаў;
(c) мець доступ да дзяржаўнай службы ў сваёй дзяржаве на агульных умовах роўнасці.

**Артыкул 26**

Усе людзі роўныя перад законам і без усякай дыскрымінацыі маюць права на абарону закона. У гэтых адносінах закон павінен забараняць любую дыскрымінацыю і гарантаваць усім асобам роўную і дзейсную абарону супраць дыскрымінацыі на любой падставе: расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых поглядаў, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага статусу, статусу паводле нараджэння ці іншага статусу.

**Артыкул 27**

У краінах, дзе існуюць этнічныя, рэлігійныя ці моўныя меншасці, асобам, якія належаць да такіх меншасцяў, не можа быць адмоўлена ў праве супольна з іншымі членамі іх групы карыстацца сваёй культурай, вызнаваць сваю рэлігію і выконваць свае абрады ці карыстацца сваёй мовай.

## ЧАСТКА IV

**Артыкул 28**

1. Ствараецца Камітэт па правах чалавека (далей у гэтым Пакце — Камітэт). Ён складаецца з 18 членаў і выконвае функцыі, распісаныя ніжэй.
2. Камітэт складаецца з грамадзян дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта, якія будуць людзьмі высокіх маральных якасцяў і прызнанымі спецыялістамі ў галіне правоў чалавека, прычым прымаецца да ўвагі карыснасць удзелу ў Камітэце асоб з юрыдычным досведам.
3. Члены Камітэта абіраюцца і працуюць у асабістай якасці.

**Артыкул 29**

1. Члены Камітэта абіраюцца шляхам таемнага галасавання са спісу асоб, якія адпавядаюць якасцям, пазначаным ў артыкуле 28, і вылучаныя з гэтай мэтай дзяржавамі-ўдзельніцамі дадзенага Пакта.
2. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта можа вылучыць не больш як дзве асобы. Гэтыя асобы мусяць быць грамадзянамі краіны, што іх вылучае.
3. Кожная асоба мае права на паўторнае вылучэнне.

**Артыкул 30**

1. Першыя выбары праводзяцца не пазней чым праз шэсць месяцаў пасля ўступлення ў сілу дадзенага Пакта.
2. Не менш як за чатыры месяцы да дня чарговых выбараў у Камітэт, калі гэта не выбары дзеля запаўнення вакансіі, абвешчаныя згодна з артыкулам 34, Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый звяртаецца з пісьмовым запрашэннем да дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта вылучыць цягам трох месяцаў свае кандыдатуры ў члены Камітэта.
3. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый рыхтуе ў алфавітным парадку спіс кандыдатаў у члены Камітэта, пазначаючы, якая дзяржава-ўдзельніца вылучыла таго ці іншага кандыдата, і дасылае яго ўсім дзяржавам-удзельніцам дадзенага Пакта не пазней чым за месяц да дня чарговых выбараў.
4. Выбары членаў Камітэта адбываюцца на паседжанні дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта, скліканым Генеральным сакратаром Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, у Штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. На гэтым паседжанні, дзе кворум складаюць дзве траціны дзяржаў-удзельніц, асобай, абранай у Камітэт, будзе лічыцца той кандыдат, які набраў найбольшую колькасць галасоў і абсалютную большасць галасоў прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц, што прысутнічалі і бралі ўдзел у галасаванні.

**Артыкул 31**

1. У Камітэт не можа ўваходзіць больш як адзін прадстаўнік ад кожнай дзяржавы-ўдзельніцы.
2. На выбарах у Камітэт бярэцца да ўвагі справядлівае геаграфічнае размеркаванне кандыдатаў і прадстаўніцтва розных формаў цывілізацыі і асноўных юрыдычных сістэм.

**Артыкул 32**

1. Члены Камітэта абіраюцца на тэрмін чатыры гады. Яны маюць права на пераабранне, калі іх паўторна вылучаюць. Аднак тэрмін паўнамоцтваў дзевяці членаў, абраных на першых выбарах, выцякае напрыканцы двухгадовага перыяду; неадкладна пасля першых выбараў імёны гэтых дзевяці членаў вызначаюцца лёсаваннем, якое праводзіцца Старшынёй паседжання, пра якое згадваецца ў артыкуле 30, пункт 4.
2. Пасля сканчэння тэрміну паўнамоцтваў Камітэта выбары праводзяцца згодна з папярэднімі артыкуламі гэтай часткі дадзенага Пакта.

**Артыкул 33**

1. Калі паводле аднагалоснага рашэння іншых членаў член Камітэта перастае выконваць свае функцыі з якой-небудзь прычыны, акрамя часовай адсутнасці, Старшыня Камітэта паведамляе пра гэта Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, які абвяшчае пасаду гэтага члена вакантнай.
2. У выпадку смерці ці адмовы ад пасады члена Камітэта, Старшыня неадкладна паведамляе пра гэта Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, які абвяшчае гэтую пасаду вакантнай ад дня смерці ці ад таго дня, калі адмова набывае сілу.

**Артыкул 34**

1. Калі згодна з артыкулам 33 абвяшчаецца вакансія і калі тэрмін паўнамоцтваў члена, якога замяняюць, не сканчаецца цягам шасці месяцаў пасля абвяшчэння вакансіі, Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый паведамляе кожнай дзяржаве-ўдзельніцы дадзенага Пакта, што тыя цягам двух месяцаў могуць вылучыць сваіх кандыдатаў згодна з артыкулам 29, каб запоўніць вакансію.
2. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый рыхтуе ў алфавітным парадку спіс вылучаных кандыдатур і прадстаўляе яго дзяржавам-удзельніцам гэтага Пакта. Выбары для запаўнення вакансіі ладзяцца потым згодна з адпаведнымі пастановамі гэтай часткі дадзенага Пакта.
3. Член Камітэта, абраны для запаўнення вакансіі, абвешчанай паводле артыкула 33, займае сваю пасаду цягам рэшты тэрміну паўнамоцтваў члена, які вызваліў сваё месца ў Камітэце згодна з пастановамі памянёнага артыкула.

**Артыкул 35**

Члены Камітэта атрымліваюць аплату пасля ўхвалы Генеральнай Асамблеяй са сродкаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый паводле парадку і умоў, прынятых Генеральнай Асамблеяй, улічваючы важнасць абавязкаў Камітэта.

**Артыкул 36**

Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый забяспечвае Камітэт неабходным персаналам і сродкамі для эфектыўнага функцыянавання Камітэта ў адпаведнасці з дадзеным Пактам.

**Артыкул 37**

1. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый склікае першае паседжанне Камітэта ў Штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
2. Пасля першага паседжання Камітэт склікаецца ў тэрміны, акрэсленыя ў працэдурных правілах Камітэта.
3. Камітэт звычайна збіраецца ў Штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ці ў Аддзяленні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Жэневе.

**Артыкул 38**

Перад афіцыйным прыняццем на сябе абавязкаў кожны член Камітэта робіць урачыстую заяву на адкрытым паседжанні, абяцаючы выконваць свае функцыі бесстаронна і сумленна.

**Артыкул 39**

1. Камітэт абірае служачых на тэрмін два гады. Яны маюць права на пераабранне.
2. Камітэт сам усталёўвае свае працэдурныя правілы, але паміж іншым у правілы мусяць уваходзіць наступныя палажэнні:

(a) дванаццаць членаў складаюць кворум;
(b) рашэнні Камітэта ўхвальваюцца большасцю галасоў прысутных членаў.

**Артыкул 40**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта бяруць на сябе абавязак прадстаўляць справаздачы аб прынятых мерах для выканання правоў, прызнаных у дадзеным Пакце, і аб дасягненнях у выкананні гэтых правоў:
(a) на працягу аднаго году пасля ўступлення ў сілу дадзенага Пакта ў дачыненні да дзяржаў-удзельніц;
(b) надалей, калі таго запатрабуе Камітэт.
2. Усе справаздачы прадстаўляюцца Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, які адпраўляе іх на разгляд у Камітэт. У справаздачах мусяць акрэслівацца фактары і складанасці, калі такія будуць, якія ўплываюць на выкананне дадзенага Пакта.
3. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб’яднаных Нацый пасля кансультацый з Камітэтам можа накіраваць у спецыялізаваныя ўстановы копіі тых частак справаздач, якія могуць падпадаць пад сферу кампетэнцыі адпаведных устаноў.
4. Камітэт вывучае справаздачы, прадстаўленыя дзяржавамі-ўдзельніцамі дадзенага Пакта. Ён перадае свае справаздачы і агульныя заўвагі, якія палічыць неабходнымі, дзяржавам-удзельніцам. Камітэт таксама можа перадаваць гэтыя заўвагі разам з копіямі справаздачаў, якія ён атрымаў ад дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта, у Эканамічную і Сацыяльную Раду.
5. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта могуць прадстаўляць у Камітэт свае меркаванні пра любыя заўвагі, якія могуць быць зробленыя паводле пункта 4 гэтага артыкула.

**Артыкул 41**

1. Згодна з гэтым артыкулам дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта можа ў любы час абвесціць, што яна прызнае кампетэнцыю Камітэта атрымліваць і разглядаць паведамленні, якія грунтуюцца на заяве дзяржавы-ўдзельніцы аб невыкананні іншай дзяржавай-удзельніцай сваіх абавязальніцтваў паводле дадзенага Пакта. Паведамленні, прадугледжаныя ў гэтым артыкуле, могуць прымацца і разглядацца толькі ў тым выпадку, калі яны прадстаўленыя дзяржавай-удзельніцай, якая зрабіла заяву аб прызнанні ў адносінах да сябе кампетэнцыі Камітэта. Камітэт не прымае паведамленняў ад дзяржаў-удзельніц, калі яны не рабілі такой заявы. Паведамленні, атрыманыя паводле гэтага артыкула, разглядаюцца згодна з наступнай працэдурай:
(a) калі дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта лічыць, што іншая дзяржава-ўдзельніца не выконвае пастаноў дадзенага Пакта, то яна можа давесці гэтую справу ў выглядзе пісьмовага паведамлення да ведама той дзяржавы-ўдзельніцы. Цягам трох месяцаў пасля атрымання паведамлення дзяржава-атрымальнік мусіць адправіць дзяржаве, якая прыслала ёй паведамленне, тлумачэнне ці іншае тлумачальнае пацверджанне ў выглядзе пісьмовага паведамлення, якое мусіць утрымліваць, калі гэта магчыма і дарэчна, спасылку на ўнутрыдзяржаўныя працэдуры і захады, якія ўжо выкананыя, чакаюць выканання альбо могуць быць прынятыя ў гэтай справе;
(b) калі справа не вырашаецца задавальненнем абедзвюх зацікаўленых дзяржаў-удзельніц цягам шасці месяцаў пасля атрымання першага паведамлення дзяржавай-атрымальніцай, кожная з гэтых дзяржаў мае права перадаць справу ў Камітэт, паінфармаваўшы пра гэта Камітэт і другую дзяржаву;
(c) Камітэт займаецца перададзенай яму справай, толькі калі высвятляе, што ўсе магчымыя ўнутрыдзяржаўныя прававыя захады былі ўжытыя і вычарпаныя ў гэтай справе згодна з агульнапрызнанымі прынцыпамі міжнароднага права. Гэтае правіла не дзейнічае ў выпадках, калі ўжыванне прававых сродкаў неапраўдана зацягваецца;
(d) Камітэт разглядае паведамленні, прадугледжаныя гэтым артыкулам, на закрытых паседжаннях;
(e) выконваючы палажэнні падпункта (c), Камітэт прапануе свае добрыя паслугі зацікаўленым дзяржавам-удзельніцам з мэтай прыязнага вырашэння справы на аснове павагі да правоў чалавека і асноўных свабод, прызнаных у дадзеным Пакце;
(f) у любой справе, перададзенай у Камітэт, Камітэт можа заклікаць зацікаўленыя дзяржавы-ўдзельніцы, памянёныя ў падпункце (d), перадаць яму любую інфармацыю, што датычыць справы;
(g) зацікаўленыя дзяржавы-ўдзельніцы, памянёныя ў падпункце (b), маюць права быць прадстаўленымі, калі справа разглядаецца ў Камітэце, і выяўляць сваю пазіцыю вусна ці пісьмова;
(h) Камітэт на працягу дванаццаці месяцаў ад дня атрымання паведамлення, зробленага паводле падпункта (b), прадстаўляе на разгляд справаздачу:
   (i) калі згода паводле ўмоў падпункта (e) дасягнутая, Камітэт у сваёй справаздачы абмяжоўваецца кароткім выкладам фактаў і дасягнутага вырашэння;

(ii) калі згода паводле ўмоў падпункта (e) не дасягнутая, Камітэт у сваёй справаздачы абмяжоўваецца кароткім выкладам фактаў; пісьмовыя довады і запіс вусных довадаў, прадстаўленых зацікаўленымі дзяржавамі-ўдзельніцамі, прыкладаецца да справаздачы. Па кожным пытанні справаздача адпраўляецца зацікаўленым дзяржавам-удзельніцам.

2. Палажэнні дадзенага артыкула набываюць моц, калі дзесяць дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта зробяць заявы, памянёныя ў пункце 1 гэтага артыкула. Такія заявы дэпаніруюцца дзяржавамі-ўдзельніцамі ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, які дасылае асобнікі гэтых заяў іншым дзяржавам-удзельніцам. Заява можа быць адкліканая у любы момант, праз паведамленне пра гэта Генеральнаму сакратару. Такое адкліканне не перашкаджае разгляду якога-небудзь пытання, якое з'яўляецца прадметам перададзенага паводле гэтага артыкула паведамлення; пасля таго як Генеральны сакратар атрымлівае апавяшчэнне пра адкліканне заявы паведамленні ад дзяржавы-ўдзельніцы надалей не прымаюцца, хіба толькі калі дзяржава-ўдзельніца робіць новую заяву.

**Артыкул 42**

1. (a) Калі якоесьці пытанне, перададзенае на разгляд у Камітэт паводле артыкула 41, не вырашаецца да задавальнення зацікаўленых дзяржаў-удзельніц, Камітэт можа з папярэдняй згоды зацікаўленых дзяржаў-удзельніц прызначыць спецыяльную Замірэнчую Камсію (далей у дакуменце — Камісію). Камісія прадастаўляе свае добрыя паслугі з мэтай прыязнага вырашэння пытання на аснове павагі да палажэнняў дадзенага Пакта;

(b) Камісія складаецца з пяці чалавек, прымальных для зацікаўленых дзяржаў-удзельніц. Калі зацікаўленыя дзяржавы-ўдзельніцы цягам трох месяцаў не дасягаюць пагаднення па ўсім складзе Камісіі ці па яго частцы, то члены Камісіі, па якіх не было дасягнутае пагадненне, абіраюцца шляхам таемнага галасавання большасцю Камітэта ў дзве траціны яго складу з ліку членаў Камітэта.

2. Члены камісіі працуюць у асабістай якасці. Яны не павінны быць грамадзянамі зацікаўленых дзяржаў-удзельніц ці дзяржавы, якая не ўдзельнічае ў дадзеным Пакце, ці дзяржавы-ўдзельніцы, якая не зрабіла заявы паводле артыкула 41.
3. Камісія сама выбірае свайго Старшыню і ўхваляе свае працэдурныя правілы.
4. Паседжанні Камісіі звычайна адбываюцца ў Штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ці ў Аддзяленні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Жэневе. Аднак яны могуць ладзіцца і ў тых іншых месцах, якія вызначыць камісія, пракансультаваўшыся з Генеральным сакратаром Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і з зацікаўленымі дзяржавамі-ўдзельніцамі.
5. Сакратарыят, які ствараецца паводле артыкула 36, таксама абслугоўвае працу камісіі, прызначанай паводле гэтага артыкула.
6. Звесткі, атрыманыя і разгледжаныя Камітэтам, перадаюцца ў распараджэнне Камісіі, і Камісія можа звярнуцца да зацікаўленых дзяржаў-удзельніц з просьбай даць іншую неабходную ў гэтым пытанні інфармацыю.
7. Калі Камісія цалкам разгледзела пытанне, але ў любым выпадку не пазней за дванаццаць месяцаў пасля перадачы ёй гэтага пытання, яна прадстаўляе Старшыні Камітэта справаздачу для накіравання яго зацікаўленым дзяржавам-удзельніцам:

(a) калі Камісія не можа скончыць разгляд пытання цягам дванаццаці месяцаў, яна абмяжоўваецца ў сваёй справаздачы кароткім апісаннем стану разгляду пытання;

(b) калі дасягаецца прыязнае вырашэнне пытання на аснове павагі да правоў чалавека, прызнаных у дадзеным Пакце, Камісія абмяжоўваецца ў сваёй справаздачы кароткім пералікам фактаў і дасягнутага рашэння;

(c) калі не дасягаецца рашэнне на ўмовах, памянёных у падпункце (b), тады справаздача Камісіі ўключае ў сябе заключэнні па пытаннях фактычнага характару, якія адносяцца да спрэчкі зацікаўленых дзяржаў-удзельніц, а таксама свае погляды на магчымасці прыязнага вырашэння пытання. Да гэтай справаздачы таксама дадаюцца пісьмовыя паведамленні і запіс вусных паведамленняў, зробленых зацікаўленымі дзяржавамі-ўдзельніцамі;

(d) калі справаздача Камісіі прадстаўляецца на разгляд паводле падпункта (c), зацікаўленыя дзяржавы-ўдзельніцы цягам трох месяцаў па атрыманні справаздачы паведамляюць Старшыні Камітэта, ці прымаюць яны змест справаздачы, падрыхтаванай Камісіяй.

8. Палажэнні гэтага артыкула не прымяншаюць абавязкаў Камітэта, прадугледжаных у артыкуле 41.
9. Зацікаўленыя дзяржавы-ўдзельніцы пароўну пакрываюць выдаткі членаў Камісіі згодна з каштарысам, які прадстаўляецца Генеральным сакратаром Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

10. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый упаўнаважаны пакрываць выдаткі членаў Камісіі, калі неабходна, да моманту іх кампенсацыі зацікаўленымі дзяржавамі-ўдзельніцамі паводле пункта 9 гэтага артыкула.

**Артыкул 43**

Члены Камітэта і спецыяльных замірэнчых камісіяў, якія могуць ствараццa паводле артыкула 42, маюць права на льготы, прывілеі і імунітэт экспертаў, якія працуюць на даручэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, як гэта прадугледжваецца ў адпаведных раздзелах Канвенцыі аб прывілеях і імунітэтах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Артыкул 44**

Палажэнні пра выкананне дадзенага Пакта ўжываюцца без перашкоды для працэдур, існуючых у галіне правоў чалавека, забяспечаных устаноўчымі актамі і канвенцыямі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і спецыялізаваных устаноў ці паводле іх, і не замінаюць дзяржавам-удзельніцам дадзенага Пакта звяртацца да іншых працэдур вырашэння спрэчак згодна з агульнымі ці адмысловымі міжнароднымі пагадненнямі, якія паміж імі дзейнічаюць.

**Артыкул 45**

Камітэт прадстаўляе на разгляд Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый праз Эканамічную і Сацыяльную Раду штогадовую справаздачу аб сваёй дзейнасці.

**ЧАСТКА V**

**Артыкул 46**

Нічога ў дадзеным Пакце нельга трактаваць як прымяншэнне палажэнняў Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і статутаў спецыялізаваных устаноў, якія вызначаюць адпаведную адказнасць розных органаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і спецыялізаваных устаноў, якія маюць дачыненне да спраў якія разглядаюцца ў дадзеным Пакце.

**Артыкул 47**

Нічога ў дадзеным Пакце не можа трактавацца як прымяншэнне неад'емнага права ўсіх народаў карыстацца і ў поўнай і свабоднай меры выкарыстоўваць і распараджацца сваімі прыроднымі багаццямі і рэсурсамі.

**ЧАСТКА VI**

**Артыкул 48**

1. Дадзены Пакт адкрыты да падпісання любой дзяржавай-членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ці членам любой спецыялізаванай установы, любой дзяржавай, якая падпісала Статут Міжнароднага Суда і любой іншай дзяржавай, запрошанай Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый да ўдзелу ў дадзеным Пакце.
2. Дадзены Пакт падлягае ратыфікацыі. Дакументы ратыфікацыі дэпаніруюцца ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
3. Да дадзенага Пакта можа далучацца любая дзяржава, згаданая ў пункце 1 гэтага артыкула.
4. Далучэнне ажыццяўляецца дэпанаваннем дакумента аб далучэнні ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
5. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый паведамляе ўсім дзяржавам, якія падпісалі дадзены Пакт ці далучыліся да яго, пра дэпанаванне ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.

**Артыкул 49**

1. Дадзены Пакт уступае ў сілу праз тры месяцы ад дня дэпанавання ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый трыццаць пятай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.
2. Для кожнай дзяржавы, якая ратыфікуе дадзены пакт ці далучаецца да яго пасля дэпанавання трыццаць пятай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні, дадзены Пакт уступае ў сілу праз тры месяцы ад дня дэпанавання сваёй ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.

**Артыкул 50**

Пастановы дадзенага Пакта распаўсюджваюцца на ўсе суб'екты федэратыўных дзяржаў без усякіх абмежаванняў ці выключэнняў.

**Артыкул 51**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта можа прапаноўваць змены і накіроўваць іх Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Па гэтым факце Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый паведамляе аб прапанаваных зменах усім дзяржавам-ўдзельніцам дадзенага Пакта з просьбай паведаміць яму пра іх згоду на правядзенне канферэнцыі дзяржаў-удзельніц, на якой павінны разглядацца прапановы і ладзіцца па іх галасаванне. У выпадку, калі не

менш за адну траціну дзяржаў-удзельніц ухваляе такую канферэнцыю, Генеральны сакратар склікае канферэнцыю пад эгідай Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Любыя змены, ухваленыя большасцю прысутных дзяржаў-удзельніц і галасаваннем на канферэнцыі, перадаюцца на ўхваленне ў Генеральную Асамблею Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

2. Змены ўступаюць у сілу, калі яны ўхваляюцца Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб’яднаных Нацый і прымаюцца дзвюма трацінамі дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта ў адпаведнасці з іх канстытуцыйнымі працэдурамі.
3. Калі змены ўступаюць у сілу, яны становяцца абавязковымі для ўсіх дзяржаў-удзельніц, якія іх ухвалілі, у той час як астатнія дзяржавы-ўдзельніцы абавязаныя пастановамі дадзенага Пакта і ўсімі ранейшымі зменамі, якія яны ўхвалілі.

**Артыкул 52**

Незалежна ад паведамленняў, зробленых паводле артыкула 48, пункт 5, Генеральны сакратар Арганізацыі Аб’яднаных Нацый інфармуе дзяржавы, згаданыя ў пункце 1 таго самага артыкула, пра любыя наступныя дэталі:

(a) падпісанні, ратыфікацыі і далучэнні паводле артыкула 48;
(b) дату ўступлення ў сілу дадзенага Пакта паводле артыкула 49 і дату ўступлення ў сілу любых зменаў паводле артыкула 51.

**Артыкул 53**

1. Дадзены Пакт, кітайскі, англійскі, французскі, рускі і іспанскі варыянты тэкстаў якога ў роўнай ступені маюць сілу арыгінала, падлягае дэпанаванню ў архівах Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.
2. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб’яднаных Нацый адпраўляе завераныя асобнікі дадзенага Пакта ўсім дзяржавам, указаным у артыкуле 48.

# ФАКУЛЬТАТЫЎНЫ ПРАТАКОЛ ДА МІЖНАРОДНАГА ПАКТА АБ ГРАМАДЗЯНСКІХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАВАХ

Прыняты рэзалюцыяй 2200 A (XXI) Генеральнай Асамблеі ААН ад 16 снежня 1966 г. Уступіў у сілу 23 сакавіка 1976 г. Уступіў у сілу для Беларусі 30 студзеня 1992 г.

**Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пратакола,**

беручы пад увагу, што дзеля далейшага дасягнення мэтаў Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (далей у дакуменце — Пакт) і выканання палажэнняў Пакта, будзе мэтазгодна даць права Камітэту па правах чалавека (далей у дакуменце — Камітэт), заснаванаму на аснове часткі IV Пакта, атрымліваць і разглядаць, як гэта абумоўлена ў дадзеным Пратаколе, паведамленні ад асоб, якія сцвярджаюць, што яны сталіся ахвярамі парушэнняў якога-небудзь з правоў, акрэсленых у Пакце,

пагадзіліся пра наступнае:

**Артыкул 1**

Дзяржава-ўдзельніца Пакта, якая становіцца ўдзельніцай дадзенага Пратакола, прызнае за Камітэтам кампетэнцыю атрымліваць і разглядаць паведамленні ад асоб, што падпадаюць пад яе юрысдыкцыю, якія сцвярджаюць, што яны сталі ахвярамі парушэння гэтай дзяржавай якогасьці права, акрэсленага ў Пакце. Камітэт не прымае паведамленняў, калі яны датычаць дзяржавы-ўдзельніцы Пакта, якая не ўдзельнічае ў дадзеным Пратаколе.

**Артыкул 2**

Пры ўмове выканання пастаноў артыкула 1, асобы, якія сцвярджаюць, што якіясьці іх правы, пералічаныя ў Пакце, парушаныя і што яны вычарпалі ўсе наяўныя ўнутрыдзяржаўныя прававыя сродкі, могуць адправіць пісьмовае паведамленне на разгляд Камітэта.

**Артыкул 3**

Камітэт лічыць непрымальным любое паведамленне паводле дадзенага Пратакола, якое прыйшло ад ананімнай асобы, ці калі ён лічыць такое паведамленне злоўжываннем правам на падачу паведамлення, ці калі яно несумяшчальнае з пастановамі Пакта.

**Артыкул 4**

1. Пры ўмовах выканання пастаноў артыкула 3 Камітэт прадстаўляе ўсе паведамленні, дасланыя яму паводле Пратакола, да ўвагі дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пратакола, якая, як сцвярджаецца, парушае якое-небудзь палажэнне Пакта.
2. Цягам шасці месяцаў дзяржава-атрымальнік мусіць адправіць у Камітэт пісьмовыя тлумачэнні ці заявы, якія тлумачаць пытанне і дзе пералічваюцца захады, калі такія ёсць, якія маглі быць зробленыя дадзенай дзяржавай.

**Артыкул 5**

1. Камітэт разглядае паведамленні, атрыманыя паводле дадзенага Пратакола, з улікам усіх пісьмовых звестак, перададзеных зацікаўленымі асобай і дзяржавай-удзельніцай.
2. Камітэт не разглядае паведамлення, пакуль не вызначыць, што:

(a) гэтая самая справа не разглядаецца паводле іншай працэдуры міжнароднага разбіральніцтва ці ўрэгулявання;

(b) асоба вычарпала ўсе магчымыя сродкі прававой абароны ў сваёй дзяржаве. Гэтае правіла не дзейнічае ў тых выпадках, калі ўжыванне прававой абароны неапраўдана зацягваецца.

3. Камітэт ладзіць закрытыя паседжанні, на якіх разглядаюцца паведамленні, прадугледжаныя дадзеным Пратаколам.
4. Камітэт пераказвае свае меркаванні зацікаўленай дзяржаве-ўдзельніцы і асобе.

**Артыкул 6**

Камітэт уключае ў штогадовы даклад, прадугледжаны артыкулам 45 Пакта, справаздачу па выніках сваёй дзейнасці згодна з дадзеным Пратаколам.

**Артыкул 7**

Да дасягнення мэтаў рэзалюцыі 1514 (XV), ухваленай Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб’яднаных Нацый 14 снежня 1960 г. датычна Дэкларацыі аб наданні незалежнасці каланіяльным краінам і народам, палажэнні дадзенага Пратакола ніякім чынам не абмяжоўваюць права падачы петыцый, дадзенае гэтым народам Статутам Арганізацыі Аб’яднаных Нацый ды іншымі міжнароднымі канвенцыямі і дакументамі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый і яе спецыялізаванымі ўстановамі.

**Артыкул 8**

1. Дадзены Пратакол адкрыты да падпісання кожнай дзяржавай, якая падпісала Пакт.
2. Дадзены Пратакол падлягае ратыфікацыі кожнай дзяржавай, якая ратыфікавала ці далучылася да Пакта. Ратыфікацыйныя граматы дэпануюцца ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
3. Дадзены Пратакол адкрыты для далучэння іншых дзяржаў, якія ратыфікавалі Пакт ці далучыліся да яго.
4. Далучэнне ажыццяўляецца дэпанаваннем дакумента аб далучэнні ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
5. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый інфармуе ўсе дзяржавы, якія падпісалі дадзены Пратакол ці далучыліся да яго, пра дэпанаванне кожнай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.

**Артыкул 9**

1. Пры ўмове ўступлення ў сілу Пакта дадзены пратакол уступае ў сілу праз тры месяцы ад даты дэпанавання ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый дзесятай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.
2. Для кожнай дзяржавы, якая ратыфікуе дадзены Пратакол ці далучаецца да яго пасля дэпанавання дзесятай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні, дадзены Пратакол уступае ў сілу праз тры месяцы ад даты дэпанавання сваёй уласнай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.

**Артыкул 10**

Палажэнні дадзенага Пратакола распаўсюджваюцца на ўсіх суб'ектаў федэратыўных дзяржаў без усякіх абмежаванняў ці выключэнняў.

**Артыкул 11**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пратакола можа прапанаваць папраўкі і скіраваць іх Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Пасля гэтага Генеральны сакратар адпраўляе ўсе прапанаваныя папраўкі дзяржавам-удзельніцам дадзенага Пратакола з просьбай паведаміць яму, ці ўхваляюць яны скліканне канферэнцыі дзяржаў-удзельніц з мэтай разгляду прапаноў і галасавання па іх. Калі не менш за адну траціну дзяржаў-удзельніц ухваляюць правядзенне канферэнцыі, Генеральны сакратар склікае канферэнцыю пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Любыя папраўкі, ухваленыя большасцю прысутных дзяржаў-удзельніц, якія бралі ўдзел у галасаванні, адпраўляюцца на ўхваленне ў Генеральную Асамблею Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
2. Папраўкі ўступаюць у сілу, калі яны ўхваляюцца Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і прымаюцца дзвюма трацінамі дзяржаў-удзельніц дадзенага Пратакола згодна з іх канстытуцыйнымі працэдурамі.
3. Калі папраўкі ўступаюць у сілу, яны робяцца абавязковымі для ўсіх дзяржаў-удзельніц, якія іх прынялі, у той час як астатнія дзяржавы-ўдзельніцы прытрымліваюцца пастаноў дадзенага Пратакола і ранейшых прынятых імі паправак.

**Артыкул 12**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца можа дэнансаваць дадзены Пратакол, пісьмова паінфармаваўшы пра гэта Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Дэнансацыя ўступае ў сілу праз тры месяцы пасля атрымання паведамлення Генеральным сакратаром.
2. Дэнансацыя не перашкаджае надалей выконваць умовы дадзенага Пратакола адносна кожнага паведамлення, адпраўленага згодна з артыкулам 2, да дня ўступлення дэнансацыі ў сілу.

**Артыкул 13**

Незалежна ад паведамленняў, адпраўленых згодна з артыкулам 8, пункт 5 дадзенага Пратакола, Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый інфармуе ўсе дзяржавы, памянёныя ў артыкуле 48, пункт 1 Пакта, пра наступнае:

(a) падпісанні, ратыфікацыі і далучэнні згодна з артыкулам 8;
(b) дату ўступлення ў сілу дадзенага Пратакола згодна з артыкулам 9 і дату ўступлення ў сілу ўсіх зменаў згодна з артыкулам 11;
(c) дэнансацыі згодна з атрыкулам 12.

**Артыкул 14**

1. Дадзены Пратакол, кітайскі, англійскі, французскі, рускі і іспанскі тэксты якога ў роўнай ступені маюць сілу арыгінала, падлягае дэпанаванню ў архівах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
2. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый адпраўляе завераныя асобнікі дадзенага Пратакола ўсім дзяржавам, указаным у артыкуле 48 Пакта.

## РАШЭННЕ ПА БЕЛАРУСІ КАМІТЭТА ААН ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

## ПАВЕДАМЛЕННЕ №1022/2001, УЛАДЗІМІР ВЯЛІЧКІН СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ

### КАМІТЭТ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

### ВОСЕМДЗЕСЯТ ПЯТАЕ ПАСЕДЖАННЕ

### 17 КАСТРЫЧНІКА — 3 ЛІСТАПАДА 2005 г.

**Меркаванні Камітэта па правах чалавека згодна з артыкулам 5, пунктам 4 Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах**

Пададзена: спадаром Уладзімірам Вялічкіным (не прадстаўлены адвакатам)
Меркаваная ахвяра: аўтар
Дзяржава-ўдзельніца: Беларусь
Дата паведамлення: 9 мая 2001 г. (першае паведамленне)
Камітэт па правах чалавека, заснаваны паводле артыкула 28 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах,
Паседжанне 20 кастрычніка 2005 г.
Закончыўшы разгляд паведамлення № 1022/2001, прадстаўленага на разгляд Камітэта па правах чалавека Уладзімірам Вялічкіным паводле Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах,
Прыняўшы да ўвагі ўсе пісьмовыя звесткі, перададзеныя ў Камітэт аўтарам паведамлення і дзяржавай-удзельніцай,
Пастанаўляе пра наступнае:

**Меркаванні згодна з артыкулам 5, пунктам 4 Факультатыўнага пратакола**
1. Аўтарам паведамлення выступае спадар Уладзімір Вялічкін, грамадзянін Беларусі 1960 года нараджэння. Ён сцвярджае, што стаў у Беларусі ахвярай парушэння правоў, названых у артыкуле 19, пункце 2 Пакта. Ён не прадстаўлены адвакатам.

**Акалічнасці справы**
2.1 Аўтар сцвярджае, што ён — праваабаронца з горада Брэста (Беларусь). 23 лістапада 2000 г. у гарадскі выканаўчы камітэт горада Брэста ён падаў заяўку на мітынг, запланаваны на 10 снежня 2000 г. каля грамадскай бібліятэкі імя Пушкіна ў цэнтры горада Брэста з удзелам 10 чалавек, прысвечаны 52-й гадавіне падпісання Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (УДПЧ).

2.2 4 снежня 2000 г. старшыня Выканаўчага камітэта горада Брэста не задаволіў яго заяўкі на мітынг у цэнтры Брэста, але дазволіў мітынг на стадыёне «Будаўнік». Камітэт абгрунтаваў сваё рашэнне на папярэднім рашэнні выканкаму ад 12 кастрычніка 1998 г., паводле якога ўсе мітынгі мусяць ладзіцца на стадыёне і дзе стадыён быў абвешчаны як «пастаяннае месца» для правядзення мітынгаў і сходаў.

2.3 Аб адзінаццатай гадзіне дня 10 снежня 2000 г. (нядзеля) аўтар стаў перад ЦУМам у цэнтры г. Брэста і пачаў раздаваць брашуры з УДПЧ, каб «нагадаць жыхарам горада пра гэтую дату і пра іх правы». З ім былі яшчэ чатыры чалавекі, якія трымалі плакаты і якія таксама, паводле слоў аўтара, распаўсюджвалі тэкст Дэкларацыі. Аўтар сцвярджае, што ён дзейнічаў згодна з артыкулам 34 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. (1)

2.4 Каля 12.30 да аўтара нібыта падышоў супрацоўнік міліцыі, назваўся ўчастковым інспектарам і папрасіў яго спыніць распаўсюджванне ўлётак і пакінуць тое месца. Аўтар адмовіўся, спасылаючыся на артыкул 34 Канстытуцыі. Неўзабаве да яго падышоў іншы чалавек і, назваўшы сябе кіраўніком Ленінскага раённага аддзелу міліцыі г. Брэста, папрасіў аўтара спыніць распаўсюджванне брашур. Ён патлумачыў, што аўтар ладзіў несанкцыянаваны мітынг ( «пікет»), і папрасіў яго пакінуць тое месца.

2.5 Калі аўтар чарговы раз адмовіўся пакінуць тое месца, пад’ехала міліцэйская машына, і супрацоўнік міліцыі папрасіў яго сесці ў машыну. Ён падпарадкаваўся, і каля 12.50 яго даставілі ў Ленінскі раённы аддзел міліцыі, дзе абвінавацілі ў двух адміністрацыйных правапарушэннях паводле артыкулаў 166 і 167 Кодэкса Рэспублікі Беларусі аб адміністрацыйных правапарушэннях (парушэнне парадку праз арганізацыю і правядзенне сходаў, мітынгаў, вулічных парадаў і дэманстарцый і непадпарадкаванне законным распараджэнням ці патрабаванням

супрацоўнікаў міліцыі пры выкананні імі абавязкаў ці грамадскага абавязку па ахове грамадскага парадку). Яго памясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання і пратрымалі там да 11-й гадзіны раніцы наступнага дня, 11 снежня 2000 г., пасля чаго прывезлі ў Ленінскі раённы суд горада Брэста. Паводле слоў аўтара, разгляд яго справы пачаўся а 2-й гадзіне дня, але з прычыны парушэнняў працэдуры затрымання (як сцвярджае аўтар, пры арышце яму не паведамілі пра яго правы) суддзя запатрабаваў вызваліць і вярнуў абвінаваўчы акт у аддзяленне міліцыі. Паводле слоў аўтара, яго такім чынам незаконна пазбавілі волі на 25 гадзін.

2.6 15 студзеня 2001 г. Ленінскі раённы суд горада Брэста пастанавіў аштрафаваць аўтара сумай у эквіваленце 20 мінімальных заробкаў (72 000 беларускіх рублёў) па абвінавачанні ў «правядзенні мітынгу ў месцы, не санкцыянаваным Брэсцкім гарадскім выканаўчым камітэтам», што з'яўляецца парушэннем умоваў артыкула 11, часткі 1 Закону аб сходах, мітынгах, вулічных шэсцях, дэманстрацыях і пікетах (Закон аб сходах).

2.7 Аўтар сцвярджае, што яго дзеянні не ўтрымлівалі адміністрацыйнага правапарушэння. Ён спасылаецца на артыкул 2 Закона аб сходах, які дае азначэнне пікета. Паводле гэтага закона, пікетам лічыцца «публічнае выяўленне грамадзянінам ці групай грамадзян грамадска-палітычных, калектыўных, асабістых ды іншых інтарэсаў ці пратэста, у тым ліку праз галадоўкі, па якіх-небудзь праблемах з выкарыстаннем ці без выкарыстання плакатаў, транспарантаў і іншых сродкаў». Ён сцвярджае, што 10 снежня 2000 г. ён не выказваў сваіх асабістых поглядаў ні па якім пытанні, але проста распаўсюджваў 53 асобнікі УДПЧ. Паводле слоў аўтара, беларускае заканадаўства не прадугледжвае атрыманне дазволу з боку ўладаў на распаўсюджванне друкаванай інфармацыі з выходнымі звесткамі, накшталт брашур з УДПЧ, якія ён распаўсюджваў.

2.8 Больш за тое, спадар Вялічкін тлумачыць, што паколькі ён не парушаў Закону аб сходах, то лічыць незаконнымі патрабаванні міліцыі спыніць распаўсюджванне брашур і пакінуць месца. Да таго ж, паводле яго словаў, артыкул 166 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжвае адказнасць толькі ў выпадку непадпарадкавання законным распараджэнням ці патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі.

2.9. У нявызначаны дзень аўтар падаў апеляцыю супраць пастановы Ленінскага раённага суда ад 15 студзеня 2001 г. у Брэсцкі абласны суд. 13 лютага 2001 г. Брэсцкі абласны суд падтрымаў пастанову гарадскога раённага суда аштрафаваць аўтара. Пасля чаго аўтар падаў апеляцыю ў Вярхоўны суд (дата не вызначаная). 3 красавіка 2001 г. Вярхоўны суд адхіліў яго апеляцыю.

**Скарга**

3. Аўтар сцвярджае, што ён стаў ахвярай невыканання яго права на распаўсюджванне інфармацыі, што з'яўляецца парушэннем артыкула 19, пункта 2 Пакта і артыкула 34 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**Заўвагі дзяржавы-ўдзельніцы і каментарыі аўтара**

4.1 У вербальнай ноце ад 6 лютага 2002 г. дзяржава-ўдзельніца адзначае, што Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь ўчыніў праверку справы аўтара паведамлення. Яна нагадвае, што ў лістападзе 2000 года аўтар накіраваў у Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт заяўку на правядзенне мітынгу каля грамадскай бібліятэкі імя Пушкіна, каб адзначыць пяцьдзесят другую гадавіну падпісання УДПЧ. 4 снежня 2000 г. Брэсцкі гарадскі савет даў аўтару дазвол на правядзенне мітынгу на стадыёне «Будаўнік»; гэтае рашэнне грунтавалася на папярэднім рашэнні Гарадскога савета (ад 15 снежня 1998 г.).

4.2 Не зважаючы на гэта, 10 снежня 2000 г. у парушэнне пастановы гарадской адміністрацыі спадар Вялічкін незаконна наладзіў мітынг ( «пікет») на адной з галоўных вуліц горада Брэста (на праспекце Машэрава). Ён адмовіўся выканаць шматлікія патрабаванні супрацоўнікаў міліцыі спыніць мітынг. Гэтыя абставіны былі падмацаваныя ў судзе паказаннямі сведкаў і фатаграфіямі мітынгу.

4.3 Зважаючы на вышэйапісаныя факты, нацыянальныя суды правільна ацанілі, што дзеянні аўтара ўтрымлівалі элементы адміністрацыйнага правапарушэння паводле артыкула 167-1 (парушэнне ўсталяванага парадку арганізацыі ці правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання) і 166 (непадпарадкаванне законным распараджэнням ці патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі пры выкананні імі абавязкаў ці грамадскага абавязку па ахове грамадскага парадку) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (КаАП) Рэспублікі Беларусь.

5.1 У лісце ад 13 сакавіка 2002 г. аўтар не згаджаецца з пунктам гледжання дзяржавы-ўдзельніцы, паводле якога ён арганізаваў незаконны мітынг і не падпарадкоўваўся загадам супрацоўнікаў міліцыі. Ён паўтарае, што яго дзеянні не ўтрымлівалі ў сабе элементаў адміністрацыйнага правапарушэння паводле артыкула 167-1 КаАП, і спасылаецца на азначэнне мітынгу ( «пікета») у артыкуле 2 Закону аб сходах.

5.2 Аўтар тлумачыць, што ён не быў арганізатарам мітынгу каля Цэнтральнага універсальнага магазіна горада Брэста 10 снежня 2000 г. Ён сцвярджае, што калі яму адмовілі ў праве арганізаваць мітынг ля грамадскай бібліятэкі імя Пушкіна, ён адмовіўся ад ідэі, што адпавядала рашэнню Брэсцкага выканаўчага камітэта; ён тлумачыць, што вырашыў не арганізоўваць пікет на стадыёне «Будаўнік» з той прычыны, што праз адсутнасць наведнікаў і месца правядзення пікет «не дасягне сваёй мэты». Нягледзячы на гэта, 10 снежня 2000 г., жадаючы нагадаць сваім суграмадзянам пра адметную дату падпісання УДПЧ і пра іх правы, аб 11-й гадзіне ён распаўсюджваў брашуры з тэкстам УДПЧ сярод мінакоў. Пры гэтым ён не парушаў грамадскага парадку і не ствараў якойсьці пагрозы здароўю ці жыццю іншых людзей. Урэшце, ён паўтарае, што стаў ахвярай парушэння яго права распаўсюджваць інфармацыю, абвешчанае ў артыкуле 19, пункце 2 Пакта.

__Даследаванне і разгляд справы Камітэтам__
**Разгляд скаргі на прадмет яе дапушчальнасці**
6.1 Перад разглядам любой заявы, што ўтрымліваецца ў паведамленні, Камітэт па правах чалавека згодна з правілам нумар 93 працэдурных правілаў мусіць вызначыць, ці дапушчальнае паведамленне да разгляду паводле Факультатыўнага пратакола да Пакта.

6.2 Камітэт адзначае, што гэтае самае пытанне не разглядаецца паводле іншай працэдуры міжнароднага разбіральніцтва ці ўрэгулявання і што ўсе магчымыя сродкі прававой абароны ў сваёй дзяржаве вычарпаныя. Камітэт мяркуе, што ўмовы, прадугледжаныя пунктамі 2 (a) і (b) артыкула 5 Факультатыўнага пратакола, выкананыя.

6.3 Камітэт мяркуе, што аўтар дастаткова абгрунтаваў сваю заяву паводле артыкула 19, пункта 2 з мэтай дапушчэння яе да разгляду. Камітэт пастанаўляе, што паведамленне дапушчальнае і пераходзіць да разгляду пытання па сутнасці.

**Разгляд скаргі па сутнасці**
7.1 Камітэт па правах чалавека разгледзеў дадзенае паведамленне з улікам усіх звестак, перададзеных яму, згодна з патрабаваннем артыкула 5, пункта 1 Факультатыўнага пратакола.

7.2 Аўтар сцвярджае, што яго права на свабоду распаўсюджвання інфармацыі паводле артыкула 19, пункта 2 было парушанае, бо, калі ён распаўсюджваў брашуры з тэкстам УДПЧ у цэнтры горада Брэста 10 снежня 2000 г., яго аршытавалі і пасля прысудзілі яму штраф у памеры 20 мінімальных заработных плат. Дзяржава-ўдзельніца дала адказ, што аўтар парушыў палажэнні Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях, бо Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт прызначыў іншае месца для правядзення мітынгу; што аўтар тым не менш арганізаваў мітынг у цэнтры горада і адмовіўся падпарадкавацца загадам супрацоўнікаў міліцыі. З матэрыялаў, прадстаўленых на разгляд у Камітэт, вынікае, што дзеянні аўтара кваліфікаваліся судом як «удзел у несанкцыянаваным мітынгу», але не як «распаўсюджванне інфармацыі». З пункту гледжання Камітэта вышэйзгаданы ўчынак уладаў, не зважаючы на яго юрыдычную кваліфікацыю, фактычна прыраўноўваецца да абмежавання правоў аўтара, забяспечаных у артыкуле 19, пункце 2 Пакта.

7.3 Камітэт нагадвае, што артыкул 19 Пакта дапускае абмежаванні толькі калі яны адпавядаюць закону і неабходныя (a) для павагі правоў і рэпутацыі іншых; і (b) для абароны дзяржаўнай бяспекі ці грамадскага парадку ці аховы здароўя ці маральных звычаяў насельніцтва. Далей Камітэт нагадвае, што права на свабоду выражэння мае найвышэйшую важнасць у любым дэмакратычным грамадстве і што ўсе абмежаванні карыстання гэтым правам мусяць адпавядаць высокім патрабаванням правамернасці. (2) У дадзеным выпадку, аднак, дзяржава-ўдзельніца не спаслалася на канкрэтныя абгрунтаванні, якія б апраўдвалі абмежаванні, накладзеныя на дзеянні аўтара, — якія незалежна ад таго, праходзілі яны ў кантэксце мітынгу ці не, без усякіх сумневаў не ўяўлялі пагрозы грамадскаму парадку, — былі неабходныя ў межах артыкула 19, пункта 3 Пакта.

8. Камітэт па правах чалавека, дзейнічаючы згодна з артыкулам 5, пунктам 4 Факультатыўнага пратакола да Пакта, прытрымліваецца меркавання, што выкладзеныя на яго разгляд факты сведчаць пра парушэнне артыкула 19, пункта 2 Пакта.

9. У адпаведнасці з артыкулам 2, пунктам 3 (a) Пакта дзяржава-ўдзельніца абавязаная забяспечыць спадару Вялічкіну дзейсны сродак прававой абароны, уключна з кампенсацыяй сумы не меншай за дадзеную суму штрафу і пакрыць усе судовыя выдаткі, сплачаныя аўтарам. Дзяржава-ўдзельніца абавязаная прыняць захады для прадухілення падобных парушэнняў у будучыні.

10. Беручы пад увагу, што, далучаючыся да Факультатыўнага пратакола, дзяржава-ўдзельніца тым самым прызнае кампетэнцыю Камітэта вызначаць, ці ёсць парушэнні Пакта, а таксама прызнае, што згодна з артыкулам 2 Пакта дзяржава бярэ на сябе абавязак забяспечваць правы, прызнаныя ў Пакце, усім асобам на яе тэрыторыі ці пад яе юрысдыкцыяй, а таксама забяспечыць эфектыўны сродак судовай абароны, які таксама мае іскавую сілу, калі фіксуецца парушэнне права; Камітэт выказвае просьбу да дзяржавы-ўдзельніцы цягам 90 дзён атрымаць ад яе звесткі пра захады, прынятыя з мэтай ажыццяўлення меркаванняў Камітэта.

___________________________

(...)

У разглядзе дадзенага паведамлення бралі ўдзел наступныя члены Камітэта: сп. Абдэльфата Амор (Abdelfattah Amor), сп. Прафулахандра Натварлал Бхагваці (Prafullachandra Natwarlal Bhagwati), сп-ня Крысцін Шанэ (Christine Chanet), сп. Марыс Глеле Аханханзо (Maurice Glèlè Ahanhanzo), сп. Эдвін Джонсан (Edwin Johnson), сп. Вальтэр Кэлін (Walter Kälin), сп. Ахмед Таўфік Халіль (Ahmed Tawfik Khalil), сп. Райсамер Лалах (Rajsoomer Lallah), сп. Майкл О'Флаерці (Michael O'Flaherty), сп-ня Элізабет Палм (Elisabeth Palm), сп. Рафаэль Рывас Пасада (Rafael Rivas Posada), Сэр Найджэл Родлі (Sir Nigel Rodley), сп. Айван Шырэр (Ivan Shearer), сп. Хіпіліта Салары-Ірыгоен (Hipylito Solari-Yrigoyen), сп-ня Рут Вэджвуд (Ruth Wedgwood) і сп. Раман Верушэўскі (Roman Wieruszewski.

Тэкст асаблівага меркавання, падпісаны членам Камітэта сп-няй Рут Вэджвуд, прыкладаецца да дадзенага дакумента.

**ДАДАТАК**

**Асабістае меркаванне члена Камітэта сп-ні Рут Вэджвуд**

Гарадскія ўлады беларускага горада Брэста арыштавалі маладога праваабаронцу Уладзіміра Вялічкіна за правядзенне несанкцыянаванага «мітынгу» перад універсальным магазінам. Мітынг уяўляў сабой распаўсюджванне асобнікаў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека сярод суграмадзянаў, якія праходзілі побач па тратуарах. Былі яшчэ іншыя чатыры асобы, якія таксама распаўсюджвалі дэкларацыі і трымалі плакаты.

Камітэт прыйшоў да высновы, што такія дзеянні з боку Беларусі была неабгрунтаваным умяшаннем у права аўтара на «свабоду выражэння» і яго права на «распаўсюджванне інфармацыі», гарантаванае артыкулам 19(2) Міжнароднага пакта аб палітычных і грамадзянскіх правах.

Але ў дадатак было яшчэ адно парушэнне артыкула 21 Пакта, а менавіта парушэнне права аўтара на мірныя сходы. Кожная дзяржава можа накладваць абгрунтаваныя абмежаванні на публічныя сходы ў інтарэсах грамадскай бяспекі і грамадскага парадку, а таксама дзеля абароны правоў і свабод астатніх. Беларускі бок не паруліўся прапанаваць якіх-небудзь тлумачэнняў наконт катэгарычнай забароны брэсцкімі ўладамі публічных пратэстаў і сходаў, нават невялікіх, у раёне цэнтра горада.

Спярша аўтар папрасіў дазвол на сход побач з публічнай бібліятэкай імя Пушкіна. Але гарадскія ўлады настаялі, што месца пратэстаў, дэманстрацый і пікетавання мусіць абмяжоўвацца спартыўным стадыёнам, размешчаным далёка ад цэнтра. Адназначна дзяржава не мае правамернага інтарэсу ў забароне публічных сходаў, толькі каб абмежаваць іх уплыў.
[подпіс] сп-ня Рут Вэджвуд

**Заўвагі**

1. Артыкул 34 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь сцвярджае наступнае:

«(1) Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя.

(2) Дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, службовыя асобы абавязаны даць грамадзяніну Рэспублікі Беларусь магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі, якія закранаюць яго правы і законныя інтарэсы».

2. Гл. між іншым Паведамленне № 574/1994, Кім супраць Рэспублікі Карэя, меркаванні ад 3 лістапада 1998 г.; Паведамленне № 628/1995 г., Парк супраць Рэспублікі Карэя, меркаванні ад 20 кастрычніка 1998 г., і Паведамленне № 780/1997, Уладзімір Лапцэвіч супраць Беларусі, меркаванні прынятыя 20 сакавіка 2000 г., пункт 8.2.

## РАШЭННЕ КАМІТЭТА ААН ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

## ПАВЕДАМЛЕННЕ № 526/1993, МАЙКЛ І БРАЯН ХІЛ СУПРАЦЬ ІСПАНІІ

Даклад Камітэта па правах чалавека, том II, GAOR, пяцьдзесят другая сесія, Дадатак № 40, (A/52/40).

<u>Дата паведамлення</u>: 1 кастрычніка 1992 г.
<u>Меркаванні прынятыя</u>: 2 красавіка 1997 г.

**<u>Меркаванні ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 5 Факультатыўнага пратакола.</u>**
Аўтарамі паведамлення з'яўляюцца Майкл Хіл, 1952 г. нараджэння, і Браян Хіл, 1963 г. нараджэння, брытанскія грамадзяне, якія пражываюць у Хэрэфордшыры, Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі. Яны сцвярджаюць, што яны ахвяры парушэння Іспаніяй артыкулаў 9 і 10, а таксама пунктаў 1 і 2 і падпунктаў (b) і (e) пункта 3 артыкула 14 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Майкл Хіл таксама спасылаецца на падпункт (d) пункта 3 артыкула 14 Пакта. Пакт уступіў у сілу для Іспаніі 27 жніўня 1977 г., а Факультатыўны пратакол – 25 красавіка 1985 г..

**<u>Факты, пададзеныя аўтарамі</u>**
2.1. Аўтары валодалі будаўнічай фірмай у Чэлтэнхеме, Злучанае Каралеўства, якая была абвешчана банкрутам у час утрымання аўтараў пад вартай у Іспаніі. У ліпені 1985 г. яны выправіліся ў Іспанію на адпачынак. Паліцыя Гандыі арыштавала іх 16 ліпеня 1985 г. па падазрэнні ў падпале аднаго з бараў у Гандыі; гэтае абвінавачванне браты адхілялі ад моманту свайго арышту, цвердзячы, што перабывалі ў бары да 2 гадз. 30 хвіл. ночы, але не вярталіся а 4-й ночы, каб падпаліць памяшканне бара.

2.2. У паліцэйскім пастарунку браты прасілі супрацоўнікаў паліцыі дазволіць ім звязацца з брытанскім консульствам, з тым каб скарыстацца дапамогай консульскага прадстаўніка, які мог зрабіць ім спрыянне ў якасці незалежнага перакладчыка. Просьба была адхіленая, і для выканання перакладу ў часе допыту, які выконваўся ў адсутнасць адваката, была выклікана маладая недасведчаная студэнтка-перакладчыца. Аўтары заяўляюць, што не змаглі належным чынам адказваць на пытанні, бо не гаварылі па-іспанску, а перакладчыца слаба валодала англійскаю моваю. (...)

2.3. Аўтары таксама заяўляюць, што ў часе так званага прад'яўлення для апазнання з удзелам аўтараў, якім надзелі кайданкі, і двух паліцыянтаў у форме была праведзеная вочная стаўка з чалавекам, які нібыта быў сведкам. Сведка, які спачатку не мог апісаць тых, хто здзейсніў злачынства, урэшце паказаў на аўтараў паведамлення.

2.4. Яны таксама скардзяцца, што іх новы аўтафургон, ацэнены на 2,5 млн песетаў, а таксама ўсе іх грошы і іх асабістыя рэчы паліцыя сканфіскавала і не вярнула ім.

2.5. 19 ліпеня 1985 г. аўтарам афіцыйна прад'явілі абвінавачванне ў падпале і нанясенні шкоды прыватнай уласнасці. (...)

2.6. 20 ліпеня 1985 г. іх даставілі да магістрата (Гандыя № 1), які расследаваў справу, і яны падалі заяву, у якой яны адмаўлялі сваю датычнасць да азначанага злачынства.

2.7. Пасля перабывання пад арыштам у паліцыі на працягу 10 дзён, з якіх 5 дзён, па іх сцвярджэнні, яны заставаліся без ежы і толькі атрымлівалі цёплую ваду для піцця, аўтараў перавялі ў турму ў Валенсіі.
(...)

2.9. Па сканчэнні папярэдняга слухання аўтараў паінфармавалі, што судовы працэс пачнецца ў лістападзе 1985 г.. Аднак суд адклалі нібыта на той падставе, што не знойдзены некаторыя дакументы. 26 лістапада 1985 г. аўтараў выклікалі ў суд для падпісання некаторых папераў, пасля чаго суддзя сказаў ім, што звяжацца з іх адвакатам, каб прызначыць новую дату правядзення працэсу. 10 снежня 1985 г. аўтары паведамілі прызначанаму для іх адвакату, што больш не патрабуюць ягоных паслуг, бо іх не задавальняла, як ён вядзе справу.
(...)

3.2. З дапамогай двух другіх зняволеных, якія валодалі дзвюма мовамі, аўтары падрыхтаваліся да самастойнай абароны. Яны вырашылі, што Майкл будзе сам абараняць сябе ў судзе, а Браян даручыць абарону адвакату, для якога яны падрыхтавалі ўсе неабходныя матэрыялы.

3.3. 17 лістапада 1986 г. аўтараў судзілі ў Вярхоўным судзе правінцыі Валенсія. З дапамогай перакладчыка Майкл Хіл паведаміў суддзі пра свой намер абараняць сябе самастойна ў адпаведнасці з падпунктам (с) пункта 3 артыкула 6 Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод. Суддзя спытаўся яго, ці ён размаўляе на іспанскай мове і ці ён юрыст. Пачуўшы адмоўны адказ, суддзя загадаў яму сесці на месца і замаўчаць.

3.4. Доказы абвінавачвання грунтаваліся выключна на паказаннях сведкі, што нібыта меўся, які ў часе папярэдняга расследавання пацвердзіў, што бачыў аўтараў яшчэ да здарэння і што іх фургон быў прыпаркаваны перад ягоным домам. Каля 4-й гадзіны ночы ён бачыў двух маладзёнаў, падобных да аўтараў, якія кінулі бутэльку з запальнай сумессю ў бар і з'ехалі на шэрым аўтафургоне. (...) Аўтары цвердзяць, што паказанні, дадзеныя сведкам на папярэднім расследаванні, супярэчлівыя (...) і што ў ходзе працэсу сведка не мог апазнаць іх. Суддзя тройчы прапаноўваў яму ўважліва ўгледзецца ў падсудзімых, і кожны раз сведка казаў, што ён «не можа ўспомніць маладых людзей», што «ён стары чалавек» і што «ўсё гэта адбылося 16 месяцаў таму». (...)

3.5. (...) Пасля разгляду справы па сутнасці, які доўжыўся не больш за 40 хвілін, аўтараў (...) прыгаварылі да 6 гадоў і аднаго дня турэмнага зняволення і выплаты 1 935 000 песетаў у пакрыццё шкоды, нанесенай уласніку бара.
(...)

3.9. 6 ліпеня 1988 г. аўтары (...) хадайнічалі ў судзе першай інстанцыі пра сваё вызваленне згодна з артыкулам 504 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, які прадугледжвае, што зняволенага могуць вызваліць да вынясення рашэння па ягонай апеляцыі, калі ён ці яна адбылі палову прысуджанага тэрміну. 14 ліпеня 1988 г. аўтараў вызвалілі з-пад варты і яны вярнуліся ў Злучанае Каралеўства, паведаміўшы іспанскім уладам свой адрас у Злучаным Каралеўстве і паінфармаваўшы іх пра намер давесці справу да канца.

3.10. 17 жніўня 1988 г. аўтары звярнуліся са скаргай (...) у Канстытуцыйны суд. Нарэшце, у красавіку (...) 1990 г. ім паведамілі праз брытанскае пасольства ў Мадрыдзе, што Канстытуцыйны суд пастанавіў адмовіць у разглядзе апеляцыі. (...)

**Факты, пададзеныя аўтарамі**

4.1. Аўтары, што заяўляюць пра сваю невінаватасць, выражаюць абурэнне судовай і бюракратычнай сістэмай Іспаніі. На іх думку, яны, хутчэй за ўсё, сталі ахвярай круцельства, здзейсненага ўладальнікам бара, у якога былі прычыны зладзіць пажар. Яны сцвярджаюць, што працэдура прад'яўлення для апазнання не адпавядала патрабаванням закона. Яны скардзяцца, што суддзя не ўмяшаўся ў слуханне справы, калі стала ясна, што прызначаны судом адвакат не абараняе іх належным чынам. Акрамя таго, адмовіўшы Майклу Хілу ў магчымасці ажыццяўляць права на абарону ўласнымі сіламі і ў выкліку сведкі абароны, суддзя парушыў прынцып раўнапраўя бакоў. Сцвярджаецца, што выкарыстанне следчым аддзелам паліцыі і суддзёй звестак пра мінулую судзімасць Майкла сведчыць пра неправамернае і ўпярэджанае стаўленне не толькі да Майкла, але і да Браяна Хіла.

4.2. Што тычыцца пункта 2 артыкула 14, то аўтары сцвярджаюць, што гэты прынцып быў парушаны да, падчас і пасля судовага працэсу: да суда – паколькі судовыя органы неаднойчы адмаўлялі ў вызваленні пад заставу; падчас працэсу – калі суддзя сказаў Майклу Хілу, што ў яго будзе магчымасць абараняць сябе і выклікаць сведку абароны пры падачы апеляцыйнай скаргі; і адразу пасля слухання справы – да агалошвання вердыкту, калі прызначаны адвакат пачаў перамовы з бацькам абвінавачваных пра падачу апеляцыі.

4.3. Аўтары сцвярджаюць, што адсутнасць усялякай дапамогі іспанскіх уладаў у вырашэнні працэсуальных пытанняў, у выніку чаго яны самі былі вымушаныя перакладаць кожны дакумент пры дапамозе іншых зняволеных, якія валодалі абедзвюма мовамі; адсутнасць у турме інфармацыі пра іспанскае заканадаўства і адсутнасць кваліфікаваных перакладчыкаў падчас допыту ў паліцыі і папярэдняга слухання – усё гэта разам з неадпаведным вядзеннем абароны прызначаным ім адвакатам складае парушэнне падпункта (b) пункта 3 артыкула 14 Пакта.

4.4. Падпункт (d) пункта 3 артыкула 14, як сцвярджаецца, парушаны ў справе Майкла Хіла, бо ў працэсе судовага разбіральніцтва яму двойчы было адмоўлена ў праве абароняць сябе асабіста. Значыць, быў парушаны і падпункт (у) пункта 3 артыкула 14, паколькі яму таксама было адмоўлена ў праве дапытваць ад імя брата сведку, які чакаў выкліку па-за залай суда.
(...)

7.4. Камітэт мяркуе, што заявы, зробленыя паводле артыкула 14, былі дастаткова абгрунтаванымі з пункту гледжання прымальнасці і, адпаведна, павінны быць разгледжаны па сутнасці. Факты, прадстаўленыя Камітэту, таксама выклікаюць пытанні, звязаныя з артыкуламі 9 і 10 (гл.пункты 2.3 і 2.7).

8. 22 сакавіка 1995 г. Камітэт па правах чалавека вынес рашэнне аб прымальнасці паведамлення.

**Заўвагі дзяржавы-ўдзельніцы**

9.1. У сваёй заўвазе ад 9 лістапада 1995 г. дзяржава-ўдзельніца спасылаецца на свае зробленыя раней заўвагі і ўжо пададзеныя дакументы і зноў сцвярджае, што скарга неабгрунтаваная. У сваім прадстаўленні ад 30 мая 1996 г. дзяржава-ўдзельніца настойвае на тым, што зварот трэба прызнаць непрымальным з прычыны злоўжывання правам на зварот. Яна мяркуе, што аўтары былі ўмоўна вызваленыя 14 ліпеня 1988 г. пры ўмове, што яны будуць з'яўляцца ў прыёмную суда правінцыі Валенсія першы дзень кожнага месяца. Замест гэтага браты Хіл пакінулі Іспанію і вярнуліся ў Англію. Праз парушэнне імі ўмоваў вызвалення і іспанскага заканадаўства яны губляюць права скардзіцца на тое, што Іспанія не выконвае сваіх абавязальніцтваў па міжнародным праве.
(...)

**Разгляд справы па сутнасці**

11. Камітэт пра правах чалавека разгледзеў гэтае паведамленне ў святле ўсёй інфармацыі, прадстаўленай яму бакамі, як прадугледжана пунктам 1 артыкула 5 Факультатыўнага пратакола.

12.1. Адносна сцвярджэння дзяржавы-ўдзельніцы, што справа павінна быць прызнана непрымальнай праз злоўжыванне правам на зварот, паколькі аўтары не выканалі ўмоваў свайго вызвалення ў парушэнне іспанскага заканадаўства, Камітэт лічыць, што аўтары не страцілі права на зварот са скаргай у адпаведнасці з Факультатыўным пратаколам толькі таму, што выйшлі з-пад юрысдыкцыі дзяржавы-ўдзельніцы, якой яны выказваюць прэтэнзіі, парушыўшы тым самым умовы свайго вызвалення.
(...)

12.3. У сувязі з пунктам 3 артыкула 9 Пакта, паводле якога ўтрыманне пад вартай асобаў, што чакаюць суда, не павінна быць агульным правілам, аўтары скардзяцца, што ім не была дадзеная магчымасць вызвалення пад заставу і, паколькі яны не маглі вярнуцца ў Злучанае Каралеўства, іх будаўнічая фірма была абвешчана банкрутам. Камітэт пацвярджае сваё папярэдняе заключэнне, што ўтрыманне пад вартай да суда павінна быць выняткам і неабходна вызваляць пад заставу, акрамя сітуацый, калі ёсць верагоднасць таго, што абвінавачваны схаваецца ад правасуддзя альбо знішчыць доказы, паўплывае на сведак альбо апынецца па-за юрысдыкцыяй краіны-ўдзельніцы. Сам сабою той факт, што абвінавачваны быў замежнікам, не азначае магчымасці трымаць яго пад вартай да суда толькі на гэтай падставе. Дзяржава-ўдзельніца сапраўды сцвярджае, што былі важкія прычыны баяцца, што аўтары пакінуць іспанскую тэрыторыю ў выпадку вызвалення пад заставу. Аднак яна не падала ніякай інфармацыі адносна таго, на чым грунтуецца гэтая боязь і чаму нельга было вырашыць праблему ўстанаўленнем адпаведнай сумы заставы альбо іншай умовы вызвалення. Адно толькі меркаванне дзяржавы-ўдзельніцы, што замежнік можа апынуцца па-за яе юрысдыкцыяй ў выпадку вызвалення пад заставу, не апраўдвае невыканання палажэння, прадугледжанага ў пункце 3 артыкула 9 Пакта. З улікам гэтага Камітэт вырашыў, што права на вызваленне пад заставу адносна аўтараў было парушанае.
12.4. Аўтары былі арыштаваны 15 ліпеня 1985 г., і ім было прад'яўлена афіцыйнае абвінавачванне 19 ліпеня 1985 г.. Суд над імі не пачынаўся да лістапада 1986 г., а іх апеляцыя не разглядалася да ліпеня 1988 г.. Такая затрымка толькі ў нязначнай ступені можа быць апраўданая рашэннем аўтараў памяняць адвакатаў. Дзяржава-ўдзельніца сцвярджае, што пратэрміноўка была выклікана «складанымі абставінамі справы», але не падала ніякай інфармацыі, што паказвала на такія складанасці. Разгледзеўшы ўсю наяўную інфармацыю, Камітэт не ўстанавіў, што менавіта ў гэтай справе можа лічыцца складаным. Адзіны відавочца

падзеяў быў сведкам, які даваў паказанні на слуханні ў ліпені 1985 г., і нішто не сведчыць пра неабходнасць правядзення якога іншага дадатковага расследавання па заканчэнні слухання. З улікам гэтага Камітэт вырашыў, што дзяржава-ўдзельніца парушыла права аўтараў на судовае разбіральніцтва без неабгрунтаванай затрымкі, прадугледжанае ў падпункце (c) пункта 3 артыкула 14.

13. Што тычыцца сцвярджэнняў аўтараў адносна абыходжання з імі падчас зняволення, у прыватнасці, на працягу першых 10 дзён, калі яны былі пад вартай у паліцэйскім пастарунку (пункт 2.7), Камітэт адзначае, што інфармацыя і дакументы, пададзеныя дзяржавай-удзельніцай, не абвяргаюць сцвярджэння аўтараў, што яны не атрымлівалі ніякай ежы на працягу першых пяці дзён пасля затрымання паліцыяй. Камітэт прыйшоў да высновы, што такое абыходжанне парушае артыкул 10 Пакта.
(...)

14.2. Камітэт нагадвае, што Майкл Хіл настойвае на тым, што хацеў абараняць сябе асабіста з дапамогай перакладчыка і што суд адмовіў яму ў гэтай просьбе. Дзяржава-ўдзельніца заяўляе ў адказ, што пратаколы слуханняў не адлюстроўваюць гэтай просьбы і што Іспанія прызнала права на «самаабарону» ў адпаведнасці з Пактам і Еўрапейскай канвенцыяй аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, але што «такая абарона павінна ажыццяўляцца прафесійным адвакатам, паслугі якога аплачваюцца дзяржавай у выпадку неабходнасці», з чаго вынікае, што заканадаўства Іспаніі не дазваляе падсуднаму абараняць сябе асабіста, як гэта прадугледжана ў Пакце. Камітэт, адпаведна, прыйшоў да высновы, што права Майкла Хіла на абарону самога сябе не было выканана, што супярэчыць падпункту (d) пункта 3 артыкула 14 Пакта.

14.3. Далей, Камітэт адзначае, што апеляцыя аўтараў не была адпаведным чынам разгледжана Апеляцыйным судом, як таго патрабуе артыкул 876 іспанскага Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, паколькі адсутнічаў адвакат, абавязаны падаць абгрунтаванні для апеляцыі. Значыць, прадугледжанае Пактам права аўтараў на перагляд рашэння аб іх асуджэнні і прысуду было парушанае, што супярэчыць пункту 5 артыкула 14 Пакта.
(...)

15. Камітэт пра правах чалавека, дзейнічаючы ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 5 Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта пра грамадзянскія і палітычныя правы, вырашыў, што пададзеныя факты сведчаць пра парушэнні пункта 3 артыкула 9; артыкула 10 і падпункта (c) пункта 3 і пункта 5 артыкула 14 Пакта ў адносінах як Майкла Хіла, так і Браяна Хіла, а таксама падпункта (d) пункта 3 артыкула 14 у адносінах толькі Майкла Хіла.
16. У адпаведнасці з падпунктам (a) пункта 3 артыкула 2 Пакта аўтары маюць права на эфектыўны сродак праваой абароны і выплату кампенсацыі. (...)

# ДРУГІ ФАКУЛЬТАТЫЎНЫ ПРАТАКОЛ ДА МІЖНАРОДНАГА ПАКТА АБ ГРАМАДЗЯНСКІХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАВАХ, СКІРАВАНЫ НА СКАСАВАННЕ СМЯРОТНАГА ПАКАРАННЯ

Прыняты рэзалюцыяй 44/128 Генеральнай Асамблеі ААН ад 15 снежня 1989 г. Уступіў у сілу 11 ліпеня 1991 г. Беларусь не далучылася да пратакола

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пратакола,

мяркуючы, што скасаванне смяротнага пакарання спрыяе ўмацаванню чалавечай годнасці і развіццю правоў чалавека,

спасылаючыся на артыкул 3 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, ухваленай 10 снежня 1948 г., і артыкул 6 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, ухваленага 16 снежня 1966 г.,

адзначаючы, што фармулёўка артыкула 6 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах адносна скасавання смяротнага пакарання з'яўляецца моцным указаннем на пажаданасць скасавання смяротнага пакарання,

перакананыя, што ўсе захады па скасаванні смяротнай кары павінны лічыцца поспехам у забеспячэнні права на жыццё,

жадаючы гэтым узяць на сябе міжнародныя абавязальніцтвы па скасаванні смяротнага пакарання,

пагадзіліся пра наступнае:

**Артыкул 1**

1. Ніводная асоба пад юрысдыкцыяй дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага пратакола не можа быць пакараная смерцю.
2. Кожная дзяржава-ўдзельніца зробіць усе неабходныя захады, каб скасаваць смяротнае пакаранне ў рамках сваёй юрысдыкцыі.

**Артыкул 2**

1. Да дадзенага Пратакола не дапускаецца ніякіх агаворак, акрамя агаворак, зробленых у час ратыфікацыі ці далучэння да Пратакола, якія прадугледжваюць смяротнае пакаранне ў час вайны згодна з прысудам за найбольш цяжкія злачынствы ваеннага характару, учыненыя падчас вайны.
2. Дзяржава-ўдзельніца, робячы такую агаворку падчас ратыфікацыі ці далучэння да пратакола, інфармуе Генеральнага сакратара пра адпаведныя палажэнні свайго нацыянальнага заканадаўства, якое дзейнічае ў час вайны.
3. Дзяржава-ўдзельніца, якая зрабіла такую агаворку, інфармуе Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый пра пачатак ці канец стану вайны на сваёй тэрыторыі

**Артыкул 3**

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пратакола ўключаюць у свае даклады, якія яны прадстаўляюць у Камітэт па правах чалавека згодна з артыкулам 40 Пакта, інфармацыю пра захады, якія яны зрабілі на выкананне дадзенага Пратакола.

**Артыкул 4**

Што датычыць дзяржаў-удзельніц Пакта, якія зрабілі заяву згодна з артыкулам 41, кампетэнцыя Камітэта па правах чалавека атрымліваць і разглядаць паведамленні, калі дзяржава-ўдзельніца сцвярджае, што іншая дзяржава-ўдзельніца не выконвае сваіх абавязкаў, распаўсюджваецца на палажэнні дадзенага Пратакола, калі толькі зацікаўленая дзяржава-ўдзельніца не заявіць пра адваротнае ў час ратыфікацыі ці далучэння.

**Артыкул 5**

Што датычыць дзяржаў-удзельніц першага Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, ухваленага 16 снежня 1966 г., кампетэнцыя Камітэта па правах чалавека атрымліваць і разглядаць паведамленні ад асоб, якія падпадаюць пад яго юрысдыкцыю, распаўсюджваецца на палажэнні дадзенага Пратакола, калі толькі зацікаўленая дзяржава-ўдзельніца не заявіць пра адваротнае ў час ратыфікацыі ці далучэння.

**Артыкул 6**

1. Палажэнні дадзенага Пратакола ўжываюцца як дадатковыя палажэнні да Пакта.
2. Без шкоды для магчымасці зрабіць агаворку паводле артыкула 2 дадзенага Пратакола, права, гарантаванае ў артыкуле 1, пункце 1 дадзенага Пратакола, не падлягае ніякаму адступленню ад яго згодна з артыкулам 4 Пакта.

**Артыкул 7**

1. Дадзены Пратакол адкрыты да падпісання кожнай дзяржавай, якая падпісала Пакт.
2. Дадзены Пратакол падлягае ратыфікацыі кожнай дзяржавай, якая ратыфікавала Пакт ці далучылася да яго. Ратыфікацыйныя граматы дэпануюцца ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
3. Дадзены Пратакол адкрыты для далучэння кожнай дзяржавы, якая ратыфікавала Пакт ці далучылася да яго.
4. Далучэнне ажыццяўляецца дэпанаваннем дакумента аб далучэнні ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
5. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый інфармуе ўсе дзяржавы, якія падпісалі дадзены Пратакол ці далучыліся да яго, пра дэпанаванне кожнай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.

**Артыкул 8**

1. Дадзены Пратакол уступае ў сілу праз тры месяцы пасля дэпанавання ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый дзесятай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.
2. Для кожнай дзяржавы, якая ратыфікуе дадзены Пратакол ці далучаецца да яго пасля дэпанавання дзесятай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні, дадзены Пратакол уступае ў сілу праз тры месяцы пасля дэпанавання сваёй ратыфікацыйнай гарматы ці дакумента аб далучэнні.

**Артыкул 9**

Палажэнні дадзенага Пратакола распаўсюджваюцца на ўсе суб'екты федэратыўных дзяржаў без усякіх абмежаванняў ці выключэнняў.

**Артыкул 10**

Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый інфармуе дзяржавы-ўдзельніцы, пра якія ідзе гаворка ў артыкуле 48, пункце 1 Пакта, пра наступныя дэталі:

(a) агаворкі, паведамленні і прадстаўленні згодна з артыкулам 2 дадзенага Пратакола;
(b) заявы згодна з артыкуламі 4 ці 5 дадзенага Пратакола;
(c) падпісанні, ратыфікацыі і далучэнні згодна з артыкулам 7 дадзенага Пратакола;
(d) дату ўступлення ў сілу дадзенага Пратакола згодна з яго артыкулам 8.

**Артыкул 11**

1. Дадзены Пратакол, арабскі, кітайскі, англійскі, французскі, рускі і іспанскі тэксты якога ў роўнай ступені маюць сілу арыгінала, падлягае перахоўванню ў архівах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
2. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый адпраўляе завераныя асобнікі дадзенага Пратакола ўсім дзяржавам, указаным у артыкуле 48 Пакта.

# МІЖНАРОДНЫ ПАКТ АБ ЭКАНАМІЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВАХ

Ухвалены і адкрыты да падпісання, ратыфікацыі ці далучэння рэзалюцыяй 2200A (XXI) Генеральнай Асамблеі ад 16 снежня 1966 г. Уступіў у сілу 3 студзеня 1976 г. згодна з артыкулам 27. Уступіў у сілу для Беларусі 3 студзеня 1976 г.

## ПРЭАМБУЛА

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта,

беручы пад увагу, што згодна з прынцыпамі, абвешчанымі ў Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, прызнанне годнасці, уласцівай усім членам чалавечай сям'і і іх роўных і неад'емных правоў ёсць асновай свабоды, справядлівасці і міру ва ўсім свеце,

прызнаючы, што гэтыя правы вынікаюць з годнасці, уласцівай чалавечай асобе,

прызнаючы, што ў адпаведнасці з Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека ідэал вольнае асобы, свабоднае ад страху і нядолі можа быць дасягнуты толькі пры стварэнні такіх умоў, калі ў кожнага ёсць магчымасць карыстацца эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі, а таксама грамадзянскімі і палітычнымі правамі.

беручы пад увагу, што паводле Статута ААН дзяржавы мусяць заахвочваць усеагульнае шанаванне і выкананне правоў і свабод чалавека,

усведамляючы, што асоба са сваімі абавязкамі перад іншымі асобамі і перад супольнасцю, да якой яна належыць, мусіць дамагацца пашырэння і выканання правоў, прызнаных у дадзеным Пакце,

пагаджаюцца пра наступныя артыкулы:

## ЧАСТКА I

### Артыкул 1

1. Усе народы маюць права на самавызначэнне. На падставе гэтага права яны свабодна вызначаюць свой палітычны статус і свабодна забяспечваюць сваё эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё.
2. Усе народы могуць свабодна распараджацца сваімі прыроднымі багаццямі і рэсурсамі ў сваіх мэтах, што ніякім чынам не ўплывае на іх абавязальніцтвы, якія выцякаюць з міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва, заснаванага на ўзаемнай выгадзе, і з міжнароднага права. Ніякі народ ні ў якім разе нельга пазбавіць сваіх уласных сродкаў існавання.
3. Усе дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта, уключна з тымі, якія адказваюць за кіраванне несамакіраванымі і падапечнымі тэрыторыямі, у адпаведнасці з умовамі Статута ААН павінны заахвочваць выкананне права на самавызначэнне і шанаваць гэтае права.

## ЧАСТКА II

### Артыкул 2

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта ў індывідуальным парадку і праз міжнародную дапамогу і супрацоўніцтва, у прыватнасці, у эканамічнай і тэхнічнай галінах, абавязуецца ў поўнай меры наяўных рэсурсаў рабіць крокі да паступовага поўнага выканання правоў, прызнаных у дадзеным Пакце, усімі належнымі сродкамі, уключна, у прыватнасці, з прыняццем заканадаўчых мер.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта абавязуюцца забяспечыць ажыццяўленне правоў, сфармуляваных у дадзеным Пакце, без усякай дыскрымінацыі паводле расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых поглядаў, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага статусу, статусу паводле нараджэння ці іншага статусу.
3. Краіны, што сталі на шлях развіцця, з належным улікам правоў і свабод чалавека і сваёй гаспадаркі могуць вызначаць, наколькі яны будуць забяспечваць эканамічныя правы, прызнаныя ў дадзеным Пакце, асобам, якія не з'яўляюцца грамадзянамі сваёй краіны.

### Артыкул 3

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта бяруць на сябе абавязак забяспечыць мужчынам і жанчынам роўнае карыстанне ўсімі эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі правамі, вызначанымі ў дадзеным Пакце.

### Артыкул 4

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць, што ў ажыццяўленні правоў, якія забяспечваюцца дзяржавай сваім грамадзянам згодна з дадзеным Пактам, дзяржава можа абмяжоўваць гэтыя правы толькі ў ступені, вызначанай законам і толькі да той ступені, да якой гэта сумяшчальна з сутнасцю гэтых правоў і выключна з мэтай спрыяння ўсеагульнаму дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве.

**Артыкул 5**

1. Ніводны пункт дадзенага Пакта не можа тлумачыцца як той, што дае права якой-небудзь дзяржаве, групе ці асобе займацца любой дзейнасцю ці рабіць любы ўчынак, скіраваны на скасаванне любога з правоў ці свабод, прызнаных у дадзеным Пакце, ці на абмежаванне памянёных правоў ці свабод у большай ступені, чым прадугледжана ў дадзеным Пакце.
2. Ніякія абмежаванні ці адступленні ад асноўных правоў чалавека, прызнаных ці наяўных у любой краіне згодна з законам, канвенцыямі, правіламі ці звычаямі, не дапускаюцца на той падставе, што дадзены Пакт не прызнае такіх правоў ці яны ў ім прызнаюцца ў меншай ступені.

**ЧАСТКА III**

**Артыкул 6**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць права на працу, якое ўключае права кожнага на магчымасць зарабіць сродкі сабе на жыццё той працай, якую ён вольна выбірае ці прымае, і бяруцца рабіць належныя крокі, каб забяспечыць гэтае права.
2. Крокі на забеспячэнне поўнага выканання гэтага права дзяржавамі-ўдзельніцамі дадзенага Пакта ўключаюць меры па прафесійна-тэхнічнай падрыхтоўцы і адукацыйныя праграмы, шляхі і метады дасягнення пастаяннага эканамічнага, сацыяльнага ды культурнага развіцця і поўнае і эфектыўнае працаўладкаванне на ўмовах, якія забяспечваюць асобе карыстанне асноўнымі палітычнымі і эканамічнымі свабодамі.

**Артыкул 7**

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць права кожнага чалавека на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы, якія, у прыватнасці, уключаюць:

(a) аплату, якая забяспечвае ўсім працоўным як найменей наступнае:
   (i) справядлівыя заробкі і роўную ўзнагароду за працу роўнай вартасці без аніякіх адрозненняў, у прыватнасці, жанчынам мусяць гарантавацца працоўныя ўмовы не горшыя за ўмовы для мужчын з роўным заробкам за роўную працу;
   (ii) г одныя ўмовы жыцця для іх і іх сем’яў згодна з палажэннямі дадзенага Пакта;

(b) умовы працы, якія адпавядаюць патрабаванням бяспекі і гігіены;

(c) роўныя для кожнага магчымасці павышэння па службе да належнага вышэйшага ўзроўню выключна на падставе працоўнага стажу і кваліфікацыі;

(d) адпачынак, вольны час і разумнае абмежаванне працоўнага дня, перыядычны аплачваны адпачынак, а таксама ўзнагароджванне за працу ў святочныя дні.

**Артыкул 8**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта бяруць на сябе абавязак забяспечваць:

(a) права кожнага чалавека ствараць прафсаюзы і далучацца да іх на свой выбар выключна паводле правілаў адпаведнай арганізацыі, для заахвочвання і абароны сваіх эканамічных і сацыяльных інтарэсаў. На выкананне гэтага права не могуць накладацца ніякія абмежаванні за выключэннем тых, што прадугледжаныя заканадаўствам ці неабходных у дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах дзяржаўнай бяспекі ці грамадскага парадку ці для абароны правоў і свабод іншых людзей;

(b) права прафсаюзаў утвараць нацыянальныя федэрацыі ці канфедэрацыі і права апошніх утвараць ці далучацца да міжнародных прафсаюзных арганізацый;

(c) права прафсаюзаў дзейнічаць свабодна, без усякіх абмежаванняў, акрамя прадугледжаных заканадаўствам ці неабходных у дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах дзяржаўнай бяспекі ці грамадскага парадку ці для абароны правоў і свабод іншых людзей;

(d) права на забастоўку пры ўмове, што яна праводзіцца згодна з заканадаўствам канкрэтнай краіны.

2. Гэты артыкул не перашкаджае абмяжоўваць карыстанне гэтымі правамі асобам, якія ўваходзяць у склад узброеных сіл ці паліцыі, ці прадстаўнікам дзяржаўных органаў.
3. Нічога ў гэтым артыкуле не дае права дзяржавам-удзельніцам Канвенцыі Міжнароднай арганізацыі працы 1948 г., якая датычыцць свабоды асацыяцыі і абароны права на арганізацыю, рабіць заканадаўчыя захады, якія будуць чыніць шкоду гарантыям, забяспечаным гэтым Пактам, ці ўжываць закон такім чынам, каб ён наносіў шкоду гэтым гарантыям.

**Артыкул 9**

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць права кожнага чалавека на сацыяльнае забеспячэнне, уключна з сацыяльным страхаваннем.

**Артыкул 10**

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць, што:

1. Сям’я як натуральная і асноўная ячэйка грамадства мусіць атрымліваць па магчымасці найвялікшую абарону і дапамогу, асабліва ў час яе стварэння і калі яна

адказвае за догляд і выхаванне дзяцей. Шлюб павінен заключацца толькі з вольнай згоды партнёраў.

2. Адмысловая абарона павінна надавацца маці ў разумны перыяд да і пасля нараджэння дзіцяці. У такі перыяд працуючым маці павінны прадстаўляцца аплачаны дэкрэтны адпачынак ці адпачынак з выплатай належнай дапамогі па сацыяльным забеспячэнні.
3. Павінны рабіцца адмысловыя захады па абароне і дапамозе ўсім дзецям і падлеткам, не зважаючы на іх паходжанне ці іншыя акалічнасці. Дзяцей і падлеткаў трэба абараняць ад эканамічнай і сацыяльнай эксплуатацыі. Выкарыстанне дзяцей у працы, шкоднай для іх маральнасці ці здароўя, ці небяспечнай для жыцця, ці працы, што можа перашкодзіць іх нармальнаму развіццю, павінна карацца законам. Дзяржавы таксама павінны ўсталяваць узроставыя рамкі, ніжэй за якія выкарыстанне аплачванай дзіцячай працы павінна забараняцца і карацца законам.

**Артыкул 11**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць права кожнага чалавека на годны ўзровень жыцця яго і яго сям'і, уключна з наяўнасцю адпаведнага харчавання, адзення і жытла, і на пастаяннае паляпшэнне жыццёвых умоў. Дзяржавы-ўдзельніцы бяруцца рабіць адпаведныя крокі, каб забяспечыць выкананне гэтага права, прызнаючы з гэтай мэтай найвышэйшую важнасць міжнароднага супрацоўніцтва, заснаванага на свабоднай згодзе.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта, прызнаючы асноўнае права кожнага на свабоду ад голаду, бяруцца ў індывідуальным парадку і праз міжнароднае супрацоўніцтва выконваць усе неабходныя меры, уключна з правядзеннем адмысловых праграм, каб:

(a) удасканаліць метады вытворчасці, захоўвання і распаўсюджвання прадуктаў харчавання, у поўнай меры выкарыстоўваючы тэхнічныя і навуковыя веды, распаўсюджваючы веды пра прынцыпы харчавання і развіваючы ці рэфармуючы аграрныя сістэмы такім чынам, каб дасягнуць найэфектыўнейшага асваення і выкарыстання прыродных рэсурсаў;
(b) забяспечыць справядлівае размеркаванне сусветных харчовых рэсурсаў паводле патрэб, з увагай да праблем як краін-імпарцёраў, так і краін-экспарцёраў прадуктаў харчавання.

**Артыкул 12**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць права кожнага на найвышэйшы дасягальны ўзровень фізічнага і псіхічнага здароўя.
2. Захады, якія мусяць прымацца дзяржавамі-ўдзельніцамі дадзенага Пакта на дасягненне поўнага выканання гэтага права, павінны ўключаць крокі, неабходныя для:

(a) зніжэння паказчыкаў нараджальнасці мёртвых дзяцей, дзіцячай смяротнасці і для здаровага развіцця дзіцяці;
(b) паляпшэння ўсіх аспектаў гігіены навакольнага асяроддзя і гігіены працы ў прамысловасці;
(c) прадухілення, лячэння і кантролю за эпідэмічнымі, эндэмічнымі, прафесійнымі ды іншымі хваробамі;
(d) стварэння ўмоў, якія забяспечаць патрэбнае медыцынскае абслугоўванне і медыцынскі догляд у выпадку хваробы.

**Артыкул 13**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць права кожнага чалавека на адукацыю. Яны згаджаюцца, што адукацыя мусіць быць скіраваная на ўсебаковае развіццё чалавечай асобы і пачуцця годнасці, а таксама павышаць павагу да правоў чалавека і асноўных свабод. Яны далей згаджаюцца, што адукацыя павінна даваць магчымасць кожнаму чалавеку браць чынны ўдзел у свабодным грамадстве, спрыяць узаемаразуменню, талерантнасці і сяброўству паміж усімі народамі і ўсімі расавымі, этнічнымі ці рэлігійнымі групамі, а таксама спрыяць Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у падтрыманні міру.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць, што з мэтай поўнага дасягнення гэтага права:

(a) пачатковая адукацыя мусіць быць абавязковай і даступнай кожнаму чалавеку бясплатна;
(b) сярэдняя адукацыя ў розных формах, уключна з прафесійна-тэхнічнай сярэдняй адукацыяй, павінна быць адкрытай і даступнай усімі спосабамі і, у прыватнасці, праз паступовае ўвядзенне бясплатнай адукацыі;
(c) вышэйшая адукацыя мусіць быць роўна даступная ўсім на аснове здольнасцяў кожнага чалавека, шляхам прыняцця ўсіх неабходных мер і, у прыватнасці, праз паступовае ўвядзенне бясплатнай адукацыі;
(d) элементарная адукацыя павінна заахвочвацца і інтэнсіфікавацца наколькі можна для людзей, якія яе не атрымалі ці не скончылі поўнага курса пачатковай адукацыі;

(e) павінна ісці актыўнае развіццё школьнай сістэмы на ўсіх узроўнях, павінна быць усталяваная адпаведная сістэма стыпендыяў, а матэрыяльныя ўмовы настаўніцкага складу мусяць пастаянна паляпшацца.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта абавязуюцца паважаць свабоду бацькоў і, у адпаведных выпадках, законных апекуноў выбіраць для сваіх дзяцей іншыя школы, апроч заснаваных дзяржавай, якія адпавядаюць тым мінімальным стандартам адукацыі, што ўсталяваныя ці ўхваленыя дзяржавай, і забяспечваць рэлігійнае і маральнае выхаванне іх дзяцей згодна са сваімі перакананнямі.

4. Ніякая частка гэтага артыкула не можа тлумачыцца як прымяншэнне свабоды асоб ці ўстаноў засноўваць і кіраваць адукацыйнымі ўстановамі пры пастаянна дзеючай умове выканання прынцыпаў, выкладзеных у пункце 1 гэтага артыкула, і патрабавання, што адукацыя, якая прадастаўляецца ў такіх установах, мусіць адпавядаць такім мінімальным стандартам, якія могуць быць усталяваныя дзяржавай.

**Артыкул 14**

Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта, якая падчас далучэння да ліку ўдзельніц не здолела забяспечыць на сваёй метраполіі ці на іншых тэрыторыях пад сваёй юрысдыкцыяй бясплатнай абавязковай пачатковай адукацыі, бярэ на сябе абавязак цягам двух гадоў распрацаваць і ўхваліць падрабязны план дзеянняў для паступовага выканання прынцыпу бясплатнай для ўсіх абавязковай адукацыі цягам разумнага перыяду ў некалькі гадоў, які павінен быць прадугледжаны ў плане.

**Артыкул 15**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць права кожнага:

(a) браць удзел у культурным жыцці;

(b) карыстацца вынікамі навуковага прагрэсу і іх прымянення;

(c) карыстацца вынікамі абароны маральных і матэрыяльных інтарэсаў, якія вынікаюць з розных навуковых, літаратурных ці мастацкіх прадуктаў, аўтарам якіх з’яўляецца асоба.

2. Крокі, якія павінны зрабіць дзяржавы-ўдзельніцы для дасягнення поўнага выканання гэтага права, павінны ўключаць усе захады па захаванні, развіцці і распаўсюджванні навукі і культуры.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта абавязваюцца паважаць свабоду, неабходную для навуковых даследаванняў і творчай дзейнасці.

4. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта прызнаюць карысць, што вынікае з заахвочвання і развіцця міжнародных кантактаў і супрацоўніцтва ў навуковай і культурнай сферах.

## ЧАСТКА IV

**Артыкул 16**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта абавязуюцца згодна з гэтай часткай Пакта прадстаўляць справаздачы аб прынятых мерах і поспехах у выкананні правоў, прызнаных у дадзеным Пакце.

2. (a) Усе справаздачы адпраўляюцца Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, які перадае копіі Эканамічнай і Сацыяльнай Радзе на разгляд у адпаведнасці з палажэннямі дадзенага Пакта;

(b) Генеральны сакратар Арганізацыі Аб’яднаных Нацый таксама перадае ў спецыялізаваныя ўстановы копіі справаздач ці адпаведныя іх часткі ад дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта, якія таксама з’яўляюцца членамі тых спецыялізаваных устаноў, калі гэтыя справаздачы ці іх часткі адносяцца да пытанняў, якія падпадаюць пад мандат згаданых устаноў згодна з іх заснавальнымі дакументамі.

**Артыкул 17**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта дасылаюць свае справаздачы этапамі згодна з праграмай, якая зацвярджаецца Эканамічнай і Сацыяльнай Радай цягам году пасля ўступлення ў сілу дадзенага Пакта, пасля абмеркавання з зацікаўленымі дзяржавамі-ўдзельніцамі і спецыялізаванымі ўстановамі.

2. Справаздачы могуць акрэсліваць фактары і складанасці, якія ўплываюць на выкананне абавязальніцтваў згодна з дадзеным Пактам.

3. Калі належная інфармацыя перасылалася ўжо ў Арганізацыю Аб’яднаных Нацый ці ў іншую спецыялізаваную ўстанову якой-небудзь дзяржавай-удзельніцай, не спатрэбіцца ўзнаўляць гэтыя звесткі — будзе дастаткова дакладнай спасылкі на іх.

**Артыкул 18**

З мэтай выканання сваіх абавязкаў у сферы правоў чалавека і асноўных свабод паводле Статута Арганізацыі Аб’яднаных Нацый Эканамічная і Сацыяльная Рада можа дамаўляцца са спецыялізаванымі ўстановамі, каб яны рыхтавалі даклады ў Раду з інфармацыяй аб прагрэсе адносна выканання палажэнняў дадзенага Пакта,

якія трапляюць у сферу іх дзейнасці. Гэтыя даклады могуць уключаць інфармацыю пра рашэнні і рэкамендацыі аб выкананні, прынятыя іх кампетэнтнымі органамі.

**Артыкул 19**

Эканамічная і Сацыяльная Рада можа адпраўляць у Камісію па правах чалавека на разгляд і для агульных рэкамендацый ці ў належных выпадках да ведама справаздачы, датычныя правоў чалавека, прадстаўленыя дзяржавамі-ўдзельніцамі згодна з артыкуламі 16 і 17, а таксама даклады, датычныя правоў чалавека, прадстаўленыя спецыялізаванымі ўстановамі згодна з артыкулам 18.

**Артыкул 20**

Зацікаўленыя дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта, а таксама спецыялізаваныя агенцтвы могуць дасылаць каментары ў Эканамічную і Сацыяльную Раду адносна агульных рэкамендацыяў згодна з артыкулам 19 ці спасылкі на гэтую агульную рэкамендацыю ў любым дакладзе ў Камісію па правах чалавека ці ў любым іншым дакуменце, на які там робіцца спасылка.

**Артыкул 21**

Час ад часу Эканамічная і Сацыяльная Рада можа накіроўваць у Генеральную Асамблею даклады з рэкамендацыямі агульнага характару і падсумаванне інфармацыі, атрыманай ад дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта і спецыялізаваных устаноў па прынятых захадах і поспехах у дасягненні агульнага выканання правоў, прызнаных у дадзеным Пакце.

**Артыкул 22**

Эканамічная і Сацыяльная Рада можа даводзіць да ўвагі іншых органаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, іх дапаможных органаў і спецыялізаваных устаноў, занятых аказаннем тэхнічнай дапамогі, любыя пытанні, што вынікаюць са справаздач, згаданых у гэтай частцы дадзенага Пакта, якія могуць дапамагаць такім органам у прыняцці рашэнняў, у рамках іх мандату, адносна мэтазгоднасці міжнародных мер, якія могуць паспрыяць паступоваму выкананню дадзенага Пакта.

**Артыкул 23**

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта пагаджаюцца, што міжнародныя дзеянні, скіраваныя на дасягненне правоў, прызнаных у дадзеным Пакце, уключаюць такія метады, як заключэнне канвенцый, ухваленне рэкамендацый, аказанне тэхнічнай дапамогі і правядзенне рэгіянальных нарад і тэхнічных нарад, арганізаваных супольна з зацікаўленымі ўрадамі, з кансультацыйнымі і даследчымі мэтамі.

**Артыкул 24**

Нічога ў дадзеным Пакце не можа трактавацца як прымяншэнне пастаноў Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і статутаў спецыялізаваных устаноў, якія вызначаюць адпаведную адказнасць розных органаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і спецыялізаваных устаноў адносна тых пытанняў, якіх датычыць дадзены Пакт.

**Артыкул 25**

Нічога ў дадзеным Пакце не можа трактавацца як прымяншэнне неад'емнага для ўсіх народаў права карыстацца і ў поўнай і свабоднай меры спажываць свае прыродныя багацці і рэсурсы.

## ЧАСТКА V

**Артыкул 26**

1. Дадзены Пакт адкрыты да падпісання кожнай дзяржавай-членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ці членам любой спецыялізаванай установы, любой дзяржавай-падпісантам Статута Міжнароднага Суда і любой іншай дзяржавай, запрошанай Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый да ўдзелу ў дадзеным Пакце.
2. Дадзены Пакт падлягае ратыфікацыі. Дакументы ратыфікацыі дэпануюцца ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
3. Да дадзенага Пакта можа далучацца любая дзяржава, памянёная ў пункце 1 гэтага артыкула.
4. Далучэнне ажыццяўляецца дэпанаваннем дакумента аб далучэнні ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
5. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый інфармуе ўсе дзяржавы, якія падпісалі дадзены Пакт ці далучыліся да яго, пра дэпанаванне ратыфікацыйных граматаў ці дакументаў аб далучэнні.

**Артыкул 27**

1. Дадзены Пакт уступае ў сілу праз тры месяцы ад дня дэпанавання ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый трыццаць пятай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.

---

[1] У адаведнасці з рзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН 60/251 ад 3 красавіка 2006 замест Камісіі па правах чалавека была створаная Рада па правах чалавека, якая ўзяла на сябе паўнамоцтвы Камісіі адносна дадзнага Пакта. Далей ў тэксце Пакта застаюцца спасылкі на Камісію а правах члавека. [Заўвага перакладчыка.]

2. Для кожнай дзяржавы, якая ратыфікуе дадзены Пакт ці далучаецца да яго пасля дэпаніравання трыццаць пятай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні, дадзены Пакт уступае ў сілу праз тры месяцы ад дня дэпанавання сваёй ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.

**Артыкул 28**

Пастановы дадзенага Пакта распаўсюджваюцца на ўсе суб’екты федэратыўных дзяржаў без усякіх абмежаванняў ці выключэнняў.

**Артыкул 29**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенага Пакта можа прапаноўваць папраўкі і накіроўваць іх Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Па факце атрымання прапановы папраўкі Генеральны сакратар Арганізацыі Аб’яднаных Нацый інфармуе аб прапанаваных папраўках ўсе дзяржавы-ўдзельніцы дадзенага Пакта з просьбай паведаміць яму пра іх згоду на канферэнцыю дзяржаў-удзельніц, на якой павінны разглядацца прапановы і адбывацца галасаванне па іх. У выпадку, калі не менш за адну трацiну дзяржаў-удзельніц ухваляюць такую канферэнцыю, Генеральны сакратар склікае канферэнцыю пад эгідай Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Кожная папраўка, ухваленая большасцю прысутных дзяржаў-удзельніц і галасаваннем на канферэнцыі, перадаецца на ўхваленне ў Генеральную Асамблею Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.
2. Папраўкі ўступаюць у сілу, калі іх ухваляе Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб’яднаных Нацый і яны прымаюцца дзвюма трацінамі дзяржаў-удзельніц дадзенага Пакта ў адпаведнасці з іх канстытуцыйнымі працэдурамі.
3. Калі папраўкі ўступаюць у сілу, яны становяцца абавязковымі для ўсіх дзяржаў-удзельніц, якія іх ухвалілі, у той час як для іншых дзяржаў-удзельніц абавязковымі з’яўляюцца пастановы дадзенага Пакта і ўсе папраўкі, якія яны ўхвалілі раней.

**Артыкул 30**

Незалежна ад паведамленняў, зробленых паводле артыкула 26, пункта 5, Генеральны сакратар Арганізацыі Аб’яднаных Нацый інфармуе дзяржавы, згаданыя ў пункце 1 таго ж артыкула, пра наступныя дэталі:

(a) падпісанні, ратыфікацыі і далучэнні паводле артыкула 26;
(b) дату ўступлення ў сілу дадзенага Пакта паводле артыкула 27 і дату ўступлення ў сілу любых паправак паводле артыкула 29.

**Артыкул 31**

1. Дадзены Пакт, кітайскі, англійскі, французскі, рускі і іспанскі тэксты якога ў роўнай ступені маюць сілу арыгінала, падлягае дэпанаванню ў архівах Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.
2. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб’яднаных Нацый адпраўляе завераныя копіі дадзенага Пакта ўсім дзяржавам, указаным у артыкуле 26.

# КАНВЕНЦЫЯ АБ ЛІКВІДАЦЫІ ЎСІХ ФОРМАЎ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ Ў АДНОСІНАХ ДА ЖАНЧЫН

Ухваленая і адкрытая да падпісання, ратыфікацыі і далучэння рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі 34/180 ад 18 снежня 1979. Уступіла ў сілу 3 верасня 1981 г. (таксама для Беларусі).

---

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенай Канвенцыі,

прымаючы да ведама, што Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый пацвярджае веру ў асноўныя правы чалавека, у годнасць і вартасць чалавечай асобы і ў роўнасць правоў мужчын і жанчын,

прымаючы да ведама, што Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека сцвярджае прынцып недапушчальнасці дыскрымінацыі і абвяшчае, што ўсе людзі нараджаюцца вольнымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах і што кожны надзяляецца ўсімі правамі і свабодамі, сфармуляванымі ў Дэкларацыі, без усякага кшталту адрозненняў, уключна з адрозненнем паводле полу,

прымаючы да ведама, што дзяржавы-ўдзельніцы Міжнародных пактаў аб правах чалавека абавязаныя забяспечваць роўныя правы мужчын і жанчын на карыстанне ўсімі эканамічнымі, сацыяльнымі, культурнымі, грамадзянскімі і палітычнымі правамі,

беручы пад увагу міжнародныя канвенцыі, падпісаныя пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і спецыялізаваных устаноў, якія заахвочваюць роўнасць правоў мужчын і жанчын,

прымаючы да ведама таксама рэзалюцыі, дэкларацыі і рэкамендацыі, ухваленыя Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і спецыялізаванымі установамі, якія заахвочваюць роўнасць правоў мужчын і жанчын,

маючы, аднак, заклапочанасць, што, не зважаючы на наяўнасць гэтых інструментаў, да гэтай пары існуе распаўсюджаная дыскрымінацыя ў адносінах да жанчын,

нагадваючы, што дыскрымінацыя ў адносінах да жанчын парушае прынцыпы роўнасці правоў і шанавання чалавечай годнасці, выступае перашкодай на шляху ўдзелу жанчын нароўні з мужчынамі ў палітычным, сацыяльным, эканамічным і культурным жыцці ў сваіх краінах, стрымлівае рост грамадскага і сямейнага дабрабыту і ўскладняе поўнае раскрыццё патэнцыялу жанчын у іх служэнні сваім краінам і чалавецтву,

маючы заклапочанасць, што ва ўмовах галечы жанчыны маюць найменшы доступ да харчавання, аховы здароўя, адукацыі, прафесійнай падрыхтоўкі і магчымасцяў працаўладкавання ды іншых патрэб,

маючы перакананне, што ўсталяванне новага міжнароднага эканамічнага парадку, заснаванага на роўнасці і справядлівасці, будзе значна спрыяць роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі,

падкрэсліваючы, што выкараненне апартэіду, усіх формаў расізму, расавай дыскрымінацыі, каланіялізму, неакаланіялізму, агрэсіі, замежнай акупацыі, панавання і ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы дзяржаў з'яўляецца неабходнай умовай поўнага карыстання правамі мужчынамі і жанчынамі,

пацвярджаючы, што ўмацаванне міжнароднага міру і бяспекі, паслабленне міжнароднай напружанасці, узаемнае супрацоўніцтва паміж усімі дзяржавамі незалежна ад іх сацыяльных і эканамічных сістэм, усеагульнае і поўнае раззбраенне і, у прыватнасці, атамнае раззбраенне пад строгім і дзейсным міжнародным кантролем, пацвярджэнне прынцыпаў справядлівасці, роўнасці і ўзаемнай выгады ў адносінах паміж краінамі і рэалізацыя права народаў пад чужынскім ці каланіяльным панаваннем і замежнай акупацыяй на самавызначэнне і незалежнасць, а таксама павага да нацыянальнага суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці заахвоцяць сацыяльны прагрэс і развіццё і, як вынік, паспрыяюць дасягненню поўнай роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі,

маючы перакананне, што поўнае і суцэльнае развіццё якой-небудзь краіны, сусветны дабрабыт і справа міру патрабуюць максімальнага ўдзелу жанчын нароўні з мужчынамі ва ўсіх сферах,

памятаючы пра вялікі ўнёсак жанчын у дабрабыт сям'і, у развіццё грамадства, які пакуль належным чынам не прызнаны, сацыяльную значнасць мацярынства і ролю абодвух бацькоў у сям'і і ў выхаванні дзяцей; ведаючы, што роля жанчыны ў справе працягу роду не павінна быць падставай для дыскрымінацыі і што выхаванне дзяцей патрабуе супольнай адказнасці мужчыны і жанчыны і грамадства наогул,

ведаючы, што для дасягнення поўнай роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі патрабуецца перамена традыцыйнай ролі мужчын, а таксама ролі жанчын у грамадстве і ў сям'і ,

маючы рашучасць выканаць прынцыпы, выкладзеныя ў Дэкларацыі аб ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, і для гэтай мэты прыняць меры, патрэбныя для ліквідацыі такой дыскрымінацыі ва ўсіх яе формах і праявах,

пагадзіліся пра наступнае:

**ЧАСТКА I**

**Артыкул 1**

Для мэтаў дадзенай Канвенцыі тэрмін дыскрымінацыя ў адносінах да жанчын значыць усякае адрозненне, выключэнне ці абмежаванне на падставе полу, што мае вынікам ці мэтай прымяншэнне ці скасаванне прызнання, карыстання ці ажыццяўлення жанчынамі, незалежна ад іх сямейнага статусу, на аснове роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі, правоў чалавека і асноўных свабод у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, культурнай, грамадскай ці якой іншай сферы.

**Артыкул 2**

Дзяржавы-ўдзельніцы асуджаюць дыскрымінацыю ў адносінах да жанчын ва ўсіх яе формах, згаджаюцца праводзіць палітыку ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын усімі адпаведнымі спосабамі і неадкладна і з гэтай мэтай абавязуюцца:

(a) увасобіць прынцып роўнасці мужчын і жанчын у сваіх нацыянальных канстытуцыях і іншым адпаведным заканадаўстве, калі ён яшчэ не ўведзены, каб праз заканадаўства ці іншыя належныя меры забяспечыць практычнае выкананне гэтага прынцыпу;

(b) прыняць належныя заканадаўчыя і іншыя меры, уключна з санкцыямі, дзе гэта неабходна, якія забараняюць любую дыскрымінацыю ў адносінах да жанчын;

(c) усталяваць прававую абарону правоў жанчын на роўнай аснове з мужчынамі і забяспечыць з дапамогай кампетэнтных нацыянальных судоў і іншых дзяржаўных устаноў эфектыўную абарону жанчын ад любых актаў дыскрымінацыі;

(d) устрымлівацца ад учынення любых дыскрымінацыйных актаў ці дзеянняў у адносінах да жанчын і забяспечваць выкананне гэтага абавязку органамі дзяржаўнай улады і дзяржаўнымі ўстановамі;

(e) прыняць належныя меры па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын з боку любой асобы, арганізацыі ці прадпрыемства;

(f) прыняць усе належныя меры, уключна з заканадаўчымі, для змянення ці скасавання існуючых законаў, пастаноў, звычаяў і практык, якія з'яўляюцца дыскрымінацыйнымі ў адносінах да жанчын;

(g) скасаваць усе палажэнні крымінальнага заканадаўства, дыскрымінацыйныя ў адносінах да жанчын.

**Артыкул 3**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць ва ўсіх сферах, уключна з палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай і культурнай, усе належныя меры, уключна з заканадаўчымі, каб забяспечыць усебаковае развіццё і прагрэс жанчын, з тым каб гарантаваць ім ажыццяўленне правоў чалавека і карыстанне імі і асноўнымі свабодамі на аснове роўнасці з мужчынамі.

**Артыкул 4**

1. Прыняцце дзяржавамі-ўдзельніцамі часовых адмысловых мер для паскарэння ўсталявання фактычнай роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі не лічыцца дыскрымінацыяй у азначэнні дадзенай Канвенцыі, але ні ў якім разе не павінна прывесці да захавання няроўных ці асобных стандартаў; гэтыя меры мусяць быць спыненыя, калі дасягаюцца мэты роўнасці магчымасцяў і раўнапраўнага абыходжання.
2. Прыняцце дзяржавамі-ўдзельніцамі адмысловых мер, уключна са змешчанымі ў дадзенай Канвенцыі, скіраваных на абарону мацярынства, не лічыцца дыскрымінацыяй.

**Артыкул 5**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры з мэтай:

(a) змяніць сацыяльныя і культурныя мадэлі паводзін мужчын і жанчын з мэтай дасягнення выкаранення забабонаў і звычаёвых ды ўсіх іншых практык, заснаваных на ідэі непаўнавартасці ці перавагі аднаго з палоў ці стэрэатыпнасці роляў мужчын і жанчын;

(b) забяспечыць, каб выхаванне ў сям'і ўключала ў сябе слушнае разуменне мацярынства як сацыяльнай функцыі і прызнанне супольнай адказнасці мужчын і жанчын у выхаванні і развіцці сваіх дзяцей пры ўмове, што інтарэсы дзяцей пераважаюць ва ўсіх выпадках.

**Артыкул 6**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры, уключна з заканадаўчымі, каб пакласці канец усім формам гандлю жанчынамі і эксплуатацыі прастытуцыі жанчын.

## ЧАСТКА II

**Артыкул 7**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры для ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын у палітычным і грамадскім жыцці краіны і, у прыватнасці, забяспечваюць жанчынам нароўні з мужчынамі права:

(a) галасаваць на выбарах і публічных рэферэндумах і права абірацца ва ўсе публічна выбіраныя органы;
(b) браць удзел у фармуляванні дзяржаўнай палітыкі і яе ажыццяўленні, а таксама займаць пасады ў дзяржаўных установах і выконваць усе публічныя функцыі на ўсіх узроўнях дзяржаўнага кіравання;
(c) браць удзел у няўрадавых арганізацыях і асацыяцыях, якія займаюцца праблемамі публічнага і палітычнага жыцця ў краіне.

**Артыкул 8**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры па забеспячэнні жанчынам нароўні з мужчынамі і без усякай дыскрымінацыі магчымасці прадстаўляць свае ўрады на міжнародным узроўні і браць удзел у працы міжнародных арганізацый.

**Артыкул 9**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы даюць жанчынам роўныя з мужчынамі правы на набыццё, змену ці захаванне грамадзянства. Яны, у прыватнасці, забяспечваюць, каб ні ўзяцце шлюбу з замежнікам, ні змена грамадзянства мужам падчас шлюбу не змяніла аўтаматычна грамадзянства жонкі, не зрабіла яе асобай без грамадзянства ці не прымусіла яе ўзяць грамадзянства мужа.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы даюць жанчынам роўныя з мужчынамі правы адносна грамадзянства сваіх дзяцей.

## ЧАСТКА III

**Артыкул 10**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры для ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, каб забяспечыць ім роўныя з мужчынамі правы ў сферы адукацыі, і, у прыватнасці, забяспечваюць на аснове роўнасці мужчын і жанчын:

(a) аднолькавыя ўмовы пры выбары прафесіі ці спецыяльнасці, пры доступе да навучання і атрымання дыпломаў у адукацыйных установах усіх катэгорыяў як у сельскіх, так і ў гарадскіх мясцовасцях; гэтая роўнасць павінна забяспечвацца ў дашкольнай, сярэдняй, тэхнічнай, спецыяльнай і вышэйшай тэхнічнай адукацыі, а таксама ва ўсіх відах прафесійнай падрыхтоўкі;
(b) доступ да аднолькавых праграм навучання, аднолькавых экзаменаў, выкладчыцкага складу аднолькавай кваліфікацыі, школьных памяшканняў і абсталявання аднолькавай якасці;
(c) ліквідацыю ўсіх стэрэатыпаў пра ролі мужчын і жанчын на ўсіх узроўнях і ва ўсіх формах адукацыі праз заахвочванне сумеснага навучання асоб розных палоў і іншых відаў навучання, якія дапамогуць дасягнуць гэтай мэты і, у прыватнасці праз перагляд падручнікаў і школьных праграм і адаптацыю метадаў выкладання;
(d) аднолькавыя магчымасці ў атрыманні стыпендый і іншых адукацыйных грантаў;
(e) аднолькавыя магчымасці доступу да праграм працягу адукацыі, уключна з праграмамі распаўсюджвання пісьменнасці сярод дарослых і праграмамі функцыянальнай пісьменнасці, асабліва да тых, якія скіраваныя на змяншэнне на самых ранніх стадыях усякага адрыву ў адукацыі паміж мужчынамі і жанчынамі;
(f) зніжэнне колькасці жанчын, якія вымушаныя кінуць школу, а таксама арганізацыю праграм для дзяўчат і жанчын, якія не скончылі школу;
(g) аднолькавыя магчымасці браць актыўны ўдзел у занятках спортам і фізічнай падрыхтоўцы;
(h) доступ да адмысловай адукацыйнай інфармацыі з мэтай спрыяць забеспячэнню здароўя і дабрабыту сем’яў, уключна з інфармацыяй і парадамі пра планаванне сям’і.

**Артыкул 11**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры для ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын у сферы працаўладкавання, каб забяспечыць на аснове роўнасці мужчын і жанчын аднолькавыя правы, у прыватнасці:

(a) права на працу як неад’емнае права кожнай чалавечай асобы;
(b) права на аднолькавыя магчымасці працаўладкавання, уключна з ужываннем аднолькавых крытэраў адбору пры найманні;
(c) права на вольны выбар прафесіі ці роду заняткаў, права на павышэнне па службе, гарантыю занятасці і права карыстання ўсімі льготамі і ўмовамі працы і права на прафесійную падрыхтоўку і перападрыхтоўку, уключна са стажыроўкай, прафесійнай падрыхтоўкай вышэйшага ўзроўню і рэгулярнай перападрыхтоўкай;
(d) права на аднолькавую ўзнагароду за працу, уключна з ільготамі, і права на роўныя ўмовы адносна работы роўнай вартасці, а таксама роўнасць у ацэнцы якасці работы;

(e) права на сацыяльнае забеспячэнне, асабліва ў выпадку выхаду на пенсію, беспрацоўя, хваробы, інваліднасці, па старасці і ў іншых выпадках страты працаздольнасці, а таксама права на аплачаны адпачынак;
(f) права на ахову здароўя і бяспечныя ўмовы працы, уключна з аховай функцыі працягу роду;
2. З мэтай прадухілення дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын на аснове ўзяцця шлюбу ці мацярынства, дзеля забеспячэння жанчынам эфектыўнага права на працу дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры, каб:
(a) забараніць пад пагрозай ужыцця санкцый звальненне з працы з прычыны цяжарнасці ці адпачынку па цяжарнасці і дыскрымінацыю на падставе сямейнага статусу;
(b) увесці аплачаныя дэкрэтныя адпачынкі ці адпачынкі з супастаўнымі сацыяльнымі льготамі без страты былой працы, працоўнага рангу ці сацыяльнай дапамогі;
(c) заахвоціць забеспячэнне неабходных дапаможных сацыяльных паслуг, каб дазволіць бацькам сумяшчаць сямейныя абавязкі з працоўнай дзейнасцю і ўдзелам у грамадскім жыцці, у прыватнасці, праз заахвочванне заснавання і развіцця сеткі ўстаноў, у якіх глядзяць дзяцей;
(d) надаць цяжарным жанчынам адмысловую абарону на тых відах працы, якія лічацца шкоднымі.
3. Заканадаўства ў сферы абароны правоў, згаданых у дадзеным артыкуле, перыядычна разглядаецца ў святле навуковых і спецыяльных ведаў і пераглядаецца, скасоўваецца ці пашыраецца пры неабходнасці.

**Артыкул 12**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе неабходныя меры для ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын у сферы аховы здароўя, каб забеспечыць жанчынам на аснове роўнасці мужчын і жанчын, доступу да медыцынскага абслугоўвання, уключна з тым, што адносіцца да планавання сям'і.
2. Незалежна ад палажэнняў пункта 1 гэтага артыкула дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць жанчынам належныя паслугі, якія адносяцца да цяжарнасці, родаў і ў пасляродавы перыяд, забяспечваючы іх, калі неабходна, бясплатнымі паслугамі, а таксама належным харчаваннем у час цяжарнасці і кармлення.

**Артыкул 13**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе неабходныя меры па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын у іншых сферах эканамічнага і сацыяльнага жыцця, каб забяспечыць іх на аснове роўнасці мужчын і жанчын аднолькавымі правамі, у прыватнасці:
(a) правам на сацыяльную дапамогу сям'і;
(b) правам на банкаўскія пазыкі, крэдытаў пад заставу нерухомасці і іншыя формы грашовых крэдытаў;
(c) правам браць удзел у мерапрыемствах, звязаных з адпачынкам, у занятках спортам і ва ўсіх сферах культурнага жыцця.

**Артыкул 14**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы бяруць да ведама асаблівыя праблемы, з якімі сутыкаюцца сельскія жанчыны, і значную ролю, якую адыгрываюць сельскія жанчыны ў эканамічным дабрабыце сваіх сем'яў, уключна з іх працай у нетаварным сектары гаспадаркі, і прымаюць усе належныя меры па забеспячэнні выканання палажэнняў дадзенай Канвенцыі адносна жанчын у сельскіх мясцовасцях.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын у сельскіх мясцовасцях, каб забяспечыць ім на аснове роўнасці мужчын і жанчын удзел у развіцці сельскіх раёнаў і ў атрыманні карысці ад такога развіцця і, у прыватнасці, забяспечваюць такім жанчынам права:
(a) браць удзел у распрацоўцы і выкананні планаў развіцця на ўсіх узроўнях;
(b) мець доступ да належнага медыцынскага абслугоўвання, уключна з інфармацыяй, кансультацыямі і абслугоўваннем па пытаннях планавання сям'і;
(c) наўпрост карыстацца выгадамі праграм сацыяльнага забеспячэння;
(d) атрымліваць усе віды падрыхтоўкі, фармальнай і нефармальнай адукацыі, уключна з той, што адносіцца да функцыянальнай пісьменнасці, а таксама карыстацца выгадамі ад усіх даступных супольнасці паслуг і кансультацыйных службаў, у прыватнасці, для павышэння ўзроўню іх тэхнічнай падрыхтоўкі;
(e) арганізоўваць групы самадапамогі і кааператывы з мэтай атрымання роўнага доступу да эканамічных магчымасцяў праз працаўладкаванне ці самаўладкаванне;
(f) браць удзел ва ўсіх відах калектыўнай дзейнасці;
(g) мець доступ да сельскагаспадарчых крэдытаў і пазык, сістэмы збыту, адпаведных тэхналогій і да роўнага трактавання ў зямельных і аграрных рэформах, а таксама ў планах перазасялення зямель;
(h) карыстацца належнымі ўмовамі жыцця, асабліва жыллёвымі ўмовамі, санітарнымі паслугамі, электрычнасцю і водазабеспячэннем, транспартам і сродкамі сувязі.

## ЧАСТКА IV

### Артыкул 15

1. Дзяржавы-ўдзельніцы надаюць жанчынам роўнасць з мужчынамі перад законам.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы надаюць жанчынам у грамадзянскіх праваадносінах роўную з мужчынамі правазадольнасць і аднолькавыя з мужчынамі магчымасці карыстацца гэтай правазадольнасцю. У прыватнасці, яны надаюць жанчынам роўныя правы заключаць дамовы і кіраваць маёмасцю, а таксама роўна ставяцца да іх на ўсіх этапах разбіральніцтва ў судах і трыбуналах.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы пагаджаюцца, што кантракты і ўсе іншыя прыватныя дакументы любога кшталту, якія маюць прававым наступствам абмежаванне правазадольнасці жанчын, лічацца несапраўднымі.
4. Дзяржавы-ўдзельніцы надзяляюць мужчын і жанчын аднолькавымі правамі адносна права на свабоднае перамяшчэнне і свабоду выбіраць месца часовага і пастаяннага пражывання.

### Артыкул 16

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын ва ўсіх пытаннях шлюбу і сямейных адносін і ў прыватнасці забяспечваюць, на аснове роўнасці мужчын і жанчын, наступнае:
(a) аднолькавае права на ўзяцце шлюбу;
(b) аднолькавае права на свабодны выбар партнёра для шлюбу толькі з яго/яе свабоднай і поўнай згоды;
(c) аднолькавыя правы і абавязкі у шлюбе і пры разводзе;
(d) аднолькавыя бацькоўскія правы і абавязкі, незалежна ад сямейнага статусу, у пытаннях адносна іх дзяцей; ва ўсіх выпадках інтарэсы дзяцей маюць першачарговае значэнне;
(e) аднолькавыя правы вольна і адказна вырашаць пра колькасць дзяцей і пра часавыя прамежкі паміж іх нараджэннем, а таксама мець доступ да інфармацыі, адукацыі і сродкаў, што дазваляюць выконваць гэтыя правы;
(f) аднолькавыя правы і абавязкі адносна апякунства, папячыцельства, даверыцельства і ўсынаўлення дзяцей ці адносна падобных функцый, калі яны існуюць у нацыянальным заканадаўстве; ва ўсіх выпадках інтарэсы дзяцей маюць першачарговае значэнне;
(g) аднолькавыя асабістыя правы мужа і жонкі, уключна з правам выбіраць сабе прозвішча, прафесію і занятак;
(h) аднолькавыя правы для мужа і жонкі адносна ўладання, набыцця, кіравання, парадкавання, карыстання і адмаўлення ад уласнасці як бясплатна, так і за належную плату.
2. Заручыны і шлюб дзіцяці не маюць юрыдычнай сілы, і прымаюцца ўсе неабходныя меры, уключна з заканадаўчымі, каб вызначыць мінімальны ўзрост для ўзяцця шлюбу і каб увесці абавязковую афіцыйную рэгістрацыю шлюбаў у актах рэгістрацыі грамадзянскага стану.

## ЧАСТКА V

### Артыкул 17

1. З мэтай разгляду поспехаў у галіне выканання дадзенай Канвенцыі засноўваецца Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (далей ў дакуменце — Камітэт), які складаецца на момант уступлення Канвенцыі ў сілу з васямнаццаці чалавек, а пасля ратыфікацыі Канвенцыі трыццаць пятай дзяржавай-удзельніцай ці далучэння да яе трыццаць пятай дзяржавы — з дваццаці трох экспертаў з высокімі маральнымі якасцямі і кампетэнцыяй у сферы, да якой адносіцца дадзеная Канвенцыя. Эксперты абіраюцца дзяржавамі-ўдзельніцамі з ліку сваіх грамадзян і працуюць у асабістай якасці. На выбарах у Камітэт бярэцца да ўвагі справядлівае геаграфічнае размеркаванне членаў, прадстаўніцтва розных формаў цывілізацыі і асноўных юрыдычных сістэм.
2. Члены Камітэта абіраюцца шляхам таемнага галасавання са спісу кандыдатаў, прапанаванага дзяржавамі-ўдзельніцамі. Кожная дзяржава-ўдзельніца можа вылучыць аднаго кандыдата з ліку сваіх грамадзян.
3. Першыя выбары ладзяцца праз шэсць месяцаў пасля ўступлення ў сілу дадзенай Канвенцыі. Не менш як за тры месяцы да дня чарговых выбараў Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый звяртаецца ў лісце да дзяржаў-удзельніц з просьбай вылучыць сваіх кандыдатаў цягам двух месяцаў. Генеральны сакратар рыхтуе ў алфавітным парадку спіс кандыдатаў з прапанаваных на выбары, пазначаючы дзяржаву-ўдзельніцу, якая гэтага кандыдата вылучыла, і адпраўляе спіс дзяржавам-удзельніцам.
4. Выбары членаў Камітэта ладзяцца на паседжанні дзяржаў-удзельніц, скліканым Генеральным сакратаром у Штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. На гэтым паседжанні, дзе дзве траціны прысутных дзяржаў-удзельніц складаюць кворум, у Камітэт абіраюцца асобы, якія набіраюць найбольшую колькасць галасоў і абсалютную

большасць галасоў прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц, якія прысутнічалі на паседжанні і галасавалі.

5. Члены Камітэта абіраюцца на тэрмін чатыры гады. Аднак тэрмін паўнамоцтваў дзевяці членаў, абраных на першым галасаванні, сканчаецца пры канцы двухгадовага перыяду; адразу па першых выбарах імёны гэтых дзевяці членаў выбіраюцца лёсаваннем Старшынёй Камітэта.
6. Абранне пяці дадатковых членаў Камітэта ладзіцца згодна з умовамі пунктаў 2, 3 і 4 гэтага артыкула, пасля ратыфікацыі ці далучэння да канвенцыі трыццаць пятай дзяржавы. Тэрміны паўнамоцтваў двух дадатковых членаў, абраных такім чынам, сканчаюцца пры канцы двухгадовага перыяду, імёны гэтых двух членаў выбіраюцца лёсаваннем Старшынёй Камітэта.
7. Для запаўнення непрадбачаных вакансій дзяржава-ўдзельніца, эксперт ад якой спыніў выкананне сваіх функцый як член Камітэта, прызначае эксперта з ліку сваіх грамадзян пры ўмове ўхвалы Камітэта.
8. Члены Камітэта атрымліваюць аклады, ухваленыя Генеральнай Асамблеяй, са сродкаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый паводле пастаноў і ўмоў, прынятых рашэннем Генеральнай Асамблеі, улічваючы важнасць абавязкаў Камітэта.
9. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый забяспечвае Камітэт неабходным персаналам і сродкамі для эфектыўнага функцыянавання Камітэта паводле дадзенай Канвенцыі.

**Артыкул 18**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязуюцца адпраўляць Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый на разгляд у Камітэтам даклад аб заканадаўчых, судовых, адміністрацыйных ці іншых мерах, якія яны прынялі з мэтай выканання ўмоў дадзенай Канвенцыі, а таксама пра поспехі, зробленыя ў гэтым кірунку:
(a) цягам аднаго году пасля ўступлення ў сілу дадзенай Канвенцыі для адпаведнай дзяржавы;
(b) пасля гэтага прынамсі раз на чатыры гады і надалей, калі таго запатрабуе Камітэт.
2. У дакладзе могуць паказвацца фактары і цяжкасці, якія ўплываюць на ступень выканання абавязальніцтваў паводле дадзенай Канвенцыі.

**Артыкул 19**

1. Камітэт ухваляе свае ўласныя працэдурныя правілы працы.
2. Камітэт абірае сваіх службовых асоб на тэрмін два гады.

**Артыкул 20**

1. Як правіла, Камітэт збіраецца на паседжанні на перыяд не больш за два тыдні штогод, каб разглядаць даклады, дасланыя згодна з артыкулам 18 дадзенай Канвенцыі.
2. Паседжанні Камітэта, як правіла, ладзяцца ў Штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ці ў якім іншым зручным месцы, вызначаным Камітэтам.

**Артыкул 21**

1. Штогод праз Эканамічную і Сацыяльную Раду Камітэт робіць справаздачу перад Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый пра сваю дзейнасць, дзе таксама можа выказваць прапановы і агульныя рэкамендацыі, што грунтуюцца на вывучэнні дакладаў і інфармацыі, атрыманых ад дзяржаў-удзельніц. Такія прапановы і агульныя рэкамендацыі ўключаюцца ў справаздачу Камітэта разам з каментарамі, калі такія ёсць, ад дзяржаў-удзельніц.
2. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый адпраўляе справаздачы Камітэта ў Камісію па становішчы жанчын для яе ведама.

**Артыкул 22**

Спецыялізаваныя ўстановы маюць права быць прадстаўленымі на разглядзе пытанняў аб выкананні тых палажэнняў дадзенай Канвенцыі, якія ўваходзяць у сферу іх дзейнасці. Камітэт можа звяртацца да спецыялізаваных устаноў з просьбай падрыхтаваць даклады аб выкананні Канвенцыі ў сферах, якія ўваходзяць у сферу іх дзейнасці.

**ЧАСТКА VI**

**Артыкул 23**

Нічога ў дадзенай канвенцыі не можа ўплываць на якія-небудзь умовы, больш спрыяльныя для дасягнення роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі, якія могуць утрымлівацца:
(a) у заканадаўстве краіны-ўдзельніцы; ці
(b) у любой іншай міжнароднай канвенцыі, дамове ці пагадненні, якая мае сілу для той дзяржавы.

**Артыкул 24**

Дзяржавы-ўдзельніцы абавязуюцца прыняць усе неабходныя меры на нацыянальным узроўні, скіраваныя на дасягненне поўнага выканання правоў, прызнаных у дадзенай Канвенцыі.

**Артыкул 25**

1. Дадзеная Канвенцыя адкрытая для падпісання ўсімі дзяржавамі.
2. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прызначаецца дэпазітарыем дадзенай Канвенцыі.
3. Дадзеная Канвенцыя падлягае ратыфікацыі. Ратыфікацыйныя граматы дэпануюцца ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
4. Дадзеная Канвенцыя адкрытая для далучэння да яе ўсіх дзяржаў. Далучэнне ажыццяўляецца дэпанаваннем дакумента аб далучэнні ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Артыкул 26**

1. Запыт на перагляд дадзенай Канвенцыі можа рабіць любая дзяржава-ўдзельніца ў любы час праз пісьмовае паведамленне Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
2. Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прымае рашэнне пра меры, якія належыць прыняць адносна такога запыту.

**Артыкул 27**

1. Дадзеная Канвенцыя ўступае ў сілу на трыццаты дзень пасля дэпанавання ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый дваццатай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.
2. Для кожнай дзяржавы, якая ратыфікуе дадзеную Канвенцыю ці далучаецца да яе пасля дэпанавання дваццатай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні, Канвенцыя ўступае ў сілу на трыццаты дзень пасля дэпанавання сваёй уласнай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.

**Артыкул 28**

1. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый атрымлівае і рассылае ўсім дзяржавам тэкст агаворак, зробленых дзяржавамі ў час ратыфікацыі ці далучэння.
2. Не прымаюцца агаворкі, несумяшчальныя з мэтамі і задачамі дадзенай Канвенцыі.
3. Агаворкі могуць быць адкліканыя ў любы час праз паведамленне Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, які затым паведамляе пра гэта ўсім дзяржавам. Такое паведамленне ўступае ў сілу ў дзень атрымання.

**Артыкул 29**

1. Любыя спрэчкі паміж дзвюма ці болей дзяржавамі-ўдзельніцамі адносна інтэрпрэтацыі ці ўжывання дадзенай Канвенцыі, якія не вырашаюцца шляхам перамоў, перадаюцца на арбітражнае разбіральніцтва на просьбу аднаго з бакоў. Калі цягам шасці месяцаў ад дня падачы запыту на арбітражнае разбіральніцтва зацікаўленым бакам не ўдаецца дамовіцца пра арганізацыю арбітражнага разбіральніцтва, любы з бакоў можа перадаць гэтую спрэчку ў Міжнародны Суд, скіраваўшы запыт згодна са Статутам Суда.
2. Кожная дзяржава-ўдзельніца ў момант падпісання ці ратыфікацыі дадзенай Канвенцыі ці далучэння да яе можа абвясціць, што яна не лічыць сябе звязанай абавязальніцтвамі пункта 1 гэтага артыкула. Астатнія дзяржавы-ўдзельніцы не звязаныя абавязальніцтвамі таго пункта адносна кожнай дзяржавы-ўдзельніцы, якая робіць такую агаворку.
3. Кожная дзяржава-ўдзельніца, якая зрабіла агаворку згодна з пунктам 2 гэтага артыкула, можа ў любы момант адклікаць гэтую агаворку, праінфармаваўшы Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Артыкул 30**

Дадзеная Канвенцыя, арабскі, кітайскі, англійскі, французскі, рускі і іспанскі тэксты якой маюць у роўнай ступені сілу арыгінала, падлягае перахоўванню ў архівах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. У СВЕДЧАННЕ ЧАГО ніжэйпадпісаныя, належным чынам на тое ўпаўнаважаныя, падпісалі дадзеную Канвенцыю.

# КАНВЕНЦЫЯ СУПРАЦЬ КАТАВАННЯ ДЫ ІНШЫХ ЖОРСТКІХ, БЕСЧАЛАВЕЧНЫХ ЦІ ПРЫНІЖАЛЬНЫХ ДЛЯ ГОДНАСЦІ ФОРМАЎ АБЫХОДЖАННЯ ЦІ ПАКАРАННЯ

Ухваленая і адкрытая для падпісання, ратыфікацыі і далучэння рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі 39/46 ад 10 снежня 1984 г. Уступленне ў сілу 26 чэрвеня 1987 г. згодна з артыкулам 27 (1).

---

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенай Канвенцыі,

беручы пад увагу, што згодна з прынцыпамі, абвешчанымі ў Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, прызнанне роўных і неад'емных правоў усіх членаў чалавечай сям'і ёсць асновай свабоды, справядлівасці і міру ва ўсім свеце,

прызнаючы, што гэтыя правы вынікаюць з годнасці, уласцівай чалавечай асобе,

беручы пад увагу абавязак дзяржаў паводле Статута, у прыватнасці, паводле артыкула 55, заахвочваць усеагульнае шанаванне і ажыццяўленне правоў чалавека і асноўных свабод,

улічваючы артыкул 5 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і артыкул 7 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, дзе прадугледжваецца, што ніхто не можа быць прадметам катавання ці жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання,

улічваючы таксама Дэкларацыю аб абароне ўсіх асоб ад катавання і іншага жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання, ухваленую Генеральнай Асамблеяй 9 снежня 1975 г.,

жадаючы павысіць эфектыўнасць барацьбы супраць катавання і іншага жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання ва ўсім свеце,

згадзіліся пра наступнае:

## ЧАСТКА I

### Артыкул 1

1. Для мэтаў дадзенай Канвенцыі тэрмін катаванне значыць любое дзеянне, якім чалавеку наўмысна чыніцца моцны боль ці пакуты, фізічныя ці духоўныя, з мэтай здабыць ад яго ці ад трэцяй асобы інфармацыю ці прызнанне, пакараць яго за ўчынак, які ён ці трэцяя асоба ўчынілі або падазраюцца ў такім учынку, ці запалохаць, ці прымусіць яго ці трэцюю асобу, або з іншай прычыны, якая палягае на любога кшталту дыскрымінацыі, калі такі боль ці пакуты ўчыняюцца з падбухторвання ці з ведама, ці маўчалівай згоды службовай асобы або іншай асобы, якая дзейнічае ў афіцыйнай якасці. Гэты тэрмін не ўключае болю ці пакутаў, якія вынікаюць выключна з законных санкцый, калі боль ці пакуты з'яўляюцца неад'емнай часткай гэтых санкцый ці калі выпадкова з іх вынікаюць.
2. Гэты артыкул не чыніць шкоды ніякаму міжнароднаму дакументу ці нацыянальнаму заканадаўству, якія могуць утрымліваць палажэнні больш шырокага ўжытку.

### Артыкул 2

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца прымае эфектыўныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, судовыя ці іншыя меры, каб прадухіліць выпадкі катавання на любой тэрыторыі пад яе юрысдыкцыяй.
2. Ніякія выключныя абставіны: ці гэта ваеннае становішча ў дзяржаве, ці пагроза вайны, унутраная палітычная нестабільнасць ці любое іншае надзвычайнае становішча не могуць служыць апраўданнем катавання.
3. Загад асобы, вышэйшай рангам, ці дзяржаўных улад не можа служыць апраўданнем катавання.

### Артыкул 3

1. Ніводная дзяржава не можа высылаць, вяртаць ці выдаваць якую-небудзь асобу іншай дзяржаве, калі ёсць істотныя падставы меркаваць, што гэтая асоба можа стаць там прадметам катавання.
2. Каб вызначыць, ці існуюць такія падставы, кампетэнтныя ўлады ўлічваюць усе адпаведныя абставіны, уключна, у адпаведных выпадках, з існаваннем у дадзенай дзяржаве пастаяннай практыкі грубых, абуральных і масавых парушэнняў правоў чалавека.

### Артыкул 4

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца забяспечвае, каб усе акты катавання трактаваліся як злачынствы ў крымінальным заканадаўстве. Тое самае адносіцца і да спроб учыніць катаванне, і да любога дзеяння, якое з'яўляецца саўдзелам у катаванні.
2. Кожная дзяржава-ўдзельніца ўводзіць належную кару за такія злачынствы, улічваючы іх цяжкі характар.

### Артыкул 5

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца прымае такія меры, якія будуць неабходныя для ўстанаўлення яе юрысдыкцыі над злачынствамі, пералічанымі ў артыкуле 4, у наступных выпадках:

(a) калі злачынствы ўчыняюцца на любой тэрыторыі пад яе юрысдыкцыяй ці на борце

марскога ці паветранага транспартнага сродку, зарэгістраванага ў дадзенай дзяржаве;
(b) калі меркаваны злачынца з'яўляецца грамадзянінам дадзенай дзяржавы;
(c) калі ахвяра з'яўляецца грамадзянінам дадзенай дзяржавы, калі дзяржава лічыць гэта мэтазгодным.

2. Кожная дзяржава падобным чынам прымае такія меры, якія могуць быць неабходнымі для ўстанаўлення яе юрысдыкцыі над такімі злачынствамі, у выпадках, калі меркаваны злачынца прысутнічае на любой тэрыторыі пад яе юрысдыкцыяй і дзяржава не выдае яго згодна з артыкулам 8 у якую-небудзь дзяржаву, згаданую ў пункце 1 гэтага артыкула.
3. Гэтая Канвенцыя не выключае ажыццяўлення якой-небудзь крымінальнай юрысдыкцыі згодна з нацыянальным заканадаўствам.

**Артыкул 6**

1. Пераканаўшыся пасля разгляду даступных звестак, што абставіны таго патрабуюць, кожная дзяржава-ўдзельніца, на тэрыторыі якой прысутнічае меркаваны злачынца, які падазраецца ва ўчыненні любога са злачынстваў, пералічаных у артыкуле 4, затрымлівае яго ці прымае іншыя законныя меры, якія забяспечваюць яго прысутнасць. Утрыманне пад вартай і іншыя законныя меры мусяць адпавядаць заканадаўству гэтай дзяржавы, але могуць быць працягнутыя толькі на такі час, які спатрэбіцца, каб распачаць крымінальную справу ці працэс экстрадыцыі.
2. Такая дзяржава неадкладна прадпрымае папярэдняе расследаванне фактаў.
3. Кожнай асобе, якая знаходзіцца пад вартай згодна з пунктам 1 гэтага артыкула, неадкладна дапамагаюць усталяваць кантакт з найбліжэйшым адпаведным прадстаўніком дзяржавы, грамадзянінам якой гэтая асоба з'яўляецца, ці, калі гэта асоба без грамадзянства, з прадстаўніком дзяржавы, дзе яна зазвычай жыве.
4. Калі дзяржава згодна з гэтым артыкулам узяла якую-небудзь асобу пад варту, яна неадкладна інфармуе дзяржавы, згаданыя ў артыкуле 5, пункце 1, пра тое, што гэтая асоба знаходзіцца пад вартай, і пра акалічнасці, якія абгрунтоўваюць ўтрыманне яе пад вартай. Дзяржава, якая праводзіць папярэдняе расследаванне, прадугледжанае ў пункце 2 гэтага артыкула, неадкладна паведамляе пра атрыманыя факты згаданым дзяржавам і паведамляе, ці мае яна намер ажыццявіць сваю юрысдыкцыю.

**Артыкул 7**

1. Дзяржава-ўдзельніца, пад юрысдыкцыю якой падпадае тэрыторыя, на якой знаходзіцца асоба, якая, як мяркуецца, учыніла якое-небудзь злачынства, згаданае ў артыкуле 4, ва ўсіх выпадках, прадугледжаных у пункце 5, перадае гэтую справу кампетэнтным уладам з мэтай судовага пераследу, калі не плануецца працэсу экстрадыцыі.
2. Гэтыя дзяржаўныя ўлады выносяць сваё рашэнне такім самым чынам, як гэта робіцца паводле заканадаўства той дзяржавы ў выпадку любога іншага злачынства сур'ёзнага характару. У выпадках, згаданых у артыкуле 5, пункце 2, патрабаванні да доказаў, неабходных для судовага пераследу, і асуджэння, ніякім чынам не могуць быць менш строгія, чым тыя, што ўжываюцца ў адносінах да выпадкаў, апісаных у артыкуле 5, пункце 1.
3. Кожнай асобе, супраць якой распачалася судовая справа ў сувязі з якім-небудзь учыненым злачынствам, згаданым у артыкуле 4, гарантуецца справядлівае абыходжанне на ўсіх стадыях судовага разбіральніцтва.

**Артыкул 8**

1. Злачынствы, згаданыя ў артыкуле 4, лічацца падлягаючымі ўключэнню ў кожную дамову аб экстрадыцыі паміж дзяржавамі-ўдзельніцамі у якасці злачынстваў, якія могуць быць падставай для экстрадыцыі. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязуюцца ўключаць такія злачынствы ў якасці злачынстваў, што даюць падставу для выдачы, у кожную дамову аб экстрадыцыі, якая заключаецца паміж гэтымі дзяржавамі.
2. Калі дзяржава-ўдзельніца атрымлівае запыт на выдачу злачынцы ад іншай дзяржавы, з якой яна не мае дамовы пра выдачу, яна можа лічыць дадзеную Канвенцыю законнай падставай для выдачы адносна такіх злачынстваў. Выдача ажыццяўляецца згодна з астатнімі ўмовамі, прадугледжанымі ў заканадаўстве дзяржавы, да якой робіцца запыт.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы, якія не абумоўліваюць выдачу наяўнасцю дамовы аб экстрадыцыі, будуць лічыць падобныя злачынствы ў якасці маючых падставы для выдачы згодна з умовамі, прадугледжанымі ў заканадаўстве дзяржавы, да якой робіцца запыт.
4. Такія злачынствы, для мэтаў экстрадыцыі паміж дзяржавамі-ўдзельніцамі, трактуюцца як учыненыя не толькі ў месцы, дзе яны адбыліся, але таксама на тэрыторыях дзяржаў, ад якіх патрабуецца ўсталяваць сваю юрысдыкцыю згодна з артыкулам 5, пунктам 1.

**Артыкул 9**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы аказваюць адна адной найбольш поўную дапамогу ў сувязі з крымінальна-працэсуальнымі дзеяннямі адносна якога-небудзь злачынства, згаданага ў артыкуле 4, уключна з перадачай усіх доказаў, якія ёсць у іх распараджэнні, неабходных для судовага разбіральніцтва.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы выконваюць свае абавязкі паводле пункта 1 гэтага артыкула згодна з усімі дамовамі пра ўзаемную прававую дапамогу, якія могуць падпісаныя паміж імі.

**Артыкул 10**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца забяспечвае, каб навучальныя матэрыялы і інфармацыя адносна забароны катавання ў поўнай меры ўключалася ў праграмы падрыхтоўкі персаналу праваахоўных органаў, грамадзянскага ці вайсковага медыцынскага персаналу, службовых і іншых асоб, якія могуць мець дачыненне да ўтрымання пад вартай, допыту ці абыходжання з людзьмі пры арышце , затрыманні ці ў зняволенні.
2. Кожная дзяржава-ўдзельніца ўключае гэтую забарону ў правілы ці інструкцыі, якія датычаць абавязкаў і функцый такіх асоб.

**Артыкул 11**

Кожная дзяржава-ўдзельніца сістэматычна пераглядае правілы, інструкцыі, метады і практыку правядзення допытаў, а таксама ўмовы ўтрымання пад вартай і абыходжання з асобамі, якія трапілі пад любую форму арышту, затрымання ці зняволення на якой-небудзь тэрыторыі пад яе юрысдыкцыяй, з мэтай прадухілення выпадкаў катавання.

**Артыкул 12**

Кожная дзяржава-ўдзельніца пры наяўнасці дастатковых доказаў таго, што акт катавання ўчыніўся на якой-небудзь тэрыторыі пад яе юрысдыкцыяй, забяспечвае, каб яе кампетэнтныя ўлады распачалі неадкладнае і бесстаронняе расследаванне справы.

**Артыкул 13**

Кожная дзяржава-ўдзельніца мусіць забяспечыць кожнай асобе, якая сцвярджае, што яна стала ахвярай катавання на якой-небудзь тэрыторыі пад юрысдыкцыяй гэтай дзяржавы, права на падачу скаргі ў суд і на неадкладны і бесстаронні разгляд яе справы кампетэнтнымі органамі. Мусяць рабіцца крокі, каб забяспечыць абарону скаржніку і сведкам ад любога кепскага абыходжання ці запалохвання як наступстваў скаргі ці дадзеных сведчанняў.

**Артыкул 14**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца мусіць забяспечыць у сваёй прававой сістэме кампенсацыю для ахвяраў катавання і права з іскавай сілай на справядлівае і адпаведнае пакрыццё маральных і матэрыяльных выдаткаў, уключаючы і сродкі для максімальна поўнай рэабілітацыі. У выпадку смерці ахвяры ў выніку акту катавання права на кампенсацыю атрымліваюць яе ўтрыманцы.
2. Нічога ў гэтым артыкуле не можа ўплываць на права ахвяры ці іншых асоб на кампенсацыю, якое можа існаваць у нацыянальным заканадаўстве.

**Артыкул 15**

Кожная дзяржава-ўдзельніца забяспечвае, каб ніякая заява, якая, як даказана, была вынікам катавання, не трактавалася як сведчанне ні ў якім судаводстве, акрамя выпадкаў, калі гэтая заява выкарыстоўваецца супраць асобы, абвінавачанай у катаванні, як сведчанне таго, што гэтая заява была зробленая.

**Артыкул 16**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца абавязуецца прадухіляць на любой тэрыторыі пад сваёй юрысдыкцыяй астатнія акты жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання, якія не падпадаюць пад азначэнне катавання, што ўтрымліваецца ў артыкуле 1, калі такія ўчынкі робяцца з падбухторвання, ці з ведама, ці з маўклівай згоды службовай асобы ці іншай асобы, якая дзейнічае ў афіцыйнай якасці. У прыватнасці абавязальніцтвы, што ўтрымліваюцца ў артыкулах 10, 11, 12 і 13, ужываюцца з заменай спасылак аб катаванні на спасылкі аб іншых формах жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання.
2. Умовы дадзенай Канвенцыі не прымяншаюць палажэнняў усіх астатніх міжнародных дакументаў ці нацыянальных нормаў, якія забараняюць жорсткае, бесчалавечнае ці прыніжальнае для годнасці абыходжанне ці пакаранне ці адносяцца да выдачы злачынцаў ці экстрадыцыі ці выгнання іх з краіны.

## ЧАСТКА II

**Артыкул 17**

1. Засноўваецца Камітэт супраць катаванняў (далей у дакуменце — Камітэт), які будзе выконваць функцыі, пералічаныя далей. Камітэт складаецца з дзесяці экспертаў з высокімі маральнымі якасцямі і прызнанай кампетэнцыяй у галіне правоў чалавека, якія служаць у асабістай якасці. Эксперты абіраюцца дзяржавамі-ўдзельніцамі. Пры выбары Камітэту бярэцца пад увагу справядлівае геаграфічнае размеркаванне і пажаданасць удзелу пэўнай колькасці асоб з прававым досведам.
2. Члены Камітэта абіраюцца шляхам таемнага галасавання са спісу асоб, вылучаных дзяржавамі-ўдзельніцамі. Кожная дзяржава-ўдзельніца можа вылучаць аднаго кандыдата з ліку сваіх грамадзян. Дзяржавы-ўдзельніцы мусяць мець на ўвазе пажаданасць вылучэння асоб, якія таксама ўваходзяць у Камітэт па правах чалавека, заснаваны згодна з Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах, і якія маюць жаданне ўваходзіць у склад Камітэта супраць катаванняў.

3. Выбары членаў Камітэта ладзяцца на паседжаннях дзяржаў-удзельніц, якія раз на два гады склікаюцца Генеральным сакратарам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. На гэтых паседжаннях, дзе дзве трацiны прысутных дзяржаў-удзельніц складаюць кворум, у Камітэт абіраюцца асобы, якія набіраюць найвялікшую колькасць галасоў і абсалютную большасць галасоў ад прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц, якія прысутнічалі на паседжанні і бралі ўдзел у галасаванні.
4. Першыя выбары ладзяцца не пазней чым праз шэсць месяцаў пасля ўступлення ў сілу дадзенай Канвенцыі. Не менш як за чатыры месяцы да чарговых выбараў Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый звяртаецца ў лісце да дзяржаў-удзельніц з просьбай вылучыць свае кандыдатуры цягам трох месяцаў. Генеральны сакратар рыхтуе спіс усіх вылучаных кандыдатаў у алфавітным парадку, указваючы дзяржаву-ўдзельніцу, якая іх вылучыла, і перадае яго дзяржавам-удзельніцам.
5. Члены Камітэта абіраюцца на тэрмін чатыры гады. У выпадку паўторнага вылучэння яны маюць права на чарговае абранне. Аднак тэрмін паўнамоцтваў пяці членаў, абраных на першых выбарах, сканчаецца пры канцы двухгадовага перыяду; адразу пасля першых выбараў імёны гэтых пяці членаў абіраюцца лёсаваннем старшынёй паседжання, згаданага ў пункце 3 гэтага артыкула.
6. Калі член Камітэта памірае, ці пакідае сваю пасаду, ці з якой іншай прычыны болей не можа выконваць свае абавязкі ў Камітэце, дзяржава-ўдзельніца, якая яго вылучыла, прызначае іншага эксперта з ліку сваіх грамадзян, які дапрацоўвае да канца тэрміну паўнамоцтваў пры ўмове ўхвалы гэтага рашэння большасцю дзяржаў-удзельніц. Кандыдатура лічыцца ўхваленай, калі цягам шасці тыдняў палова ці болей дзяржаў-удзельніц не далі адмоўнага адказу пасля паведамлення Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый пра прапанаваную кандыдатуру.
7. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязуюцца пакрываць выдаткі членаў Камітэта падчас выканання імі сваіх абавязкаў.

**Артыкул 18**

1. Камітэт абірае сваіх службовых асоб на тэрмін два гады. Яны могуць пераабірацца.
2. Камітэт сам ухваляе свае працэдурныя правілы, але ў гэтых правілах між іншым мусяць утрымлівацца наступныя ўмовы:
(a) шэсць членаў складаюць кворум;
(b) рашэнні Камітэта прымаюцца большасцю галасоў прысутных членаў.
3. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый забяспечвае Камітэт неабходным персаналам і матэрыяльнымі сродкамі для эфектыўнага функцыянавання Камітэта згодна з дадзенай Канвенцыяй.
4. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый склікае першае паседжанне Камітэта. Пасля першага паседжання Камітэт збіраецца ў тэрміны, прадугледжаныя яго правіламі працэдуры.
5. Дзяржавы-ўдзельніцы нясуць адказнасць за выдаткі ў сувязі з правядзеннем паседжанняў дзяржаў-удзельніц і Камітэта, уключна з пакрыццём выдаткаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый на забеспячэнне, напрыклад, персаналу і арганізацыйныя выдаткі, прапанаваных Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый згодна з пунктам 3 гэтага артыкула.

**Артыкул 19**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы дасылаюць праз Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Камітэт справаздачы пра меры, якія яны прынялі, каб выканаць свае абавязальніцтвы паводле дадзенай Канвенцыі цягам аднаго года пасля ўступлення ў сілу дадзенай Канвенцыі для зацікаўленых дзяржаў-удзельніц. Пасля дзяржавы-ўдзельніцы дасылаюць дадатковыя справаздачы кожныя чатыры гады пра ўсе новыя меры, якія яны прынялі, а таксама такія справаздачы, якія можа запатрабаваць Камітэт.
2. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый перасылае асобнікі справаздачаў усім дзяржавам-удзельніцам.
3. Кожная справаздача разглядаецца Камітэтам, які можа рабіць па справаздачы каментары агульнага характару, якія ён палічыць патрэбнымі, і затым перасылаць гэтыя каментарыі зацікаўленай дзяржаве-удзельніцы. Дзяржава-ўдзельніца можа ў адказ падаць у Камітэт любыя заўвагі, якія палічыць істотнымі.
4. Камітэт можа вырашаць на свой погляд, ці ўключаць тыя ці іншыя каментары, якія ён робіць згодна з пунктам 3 дадзенага артыкула, разам з заўвагамі па іх, атрыманымі ад адпаведнай дзяржавы-ўдзельніцы, у свой штогадовы даклад, які рыхтуецца згодна з артыкулам 24. На патрабаванне адпаведнай дзяржавы-ўдзельніцы Камітэт можа таксама ўключыць у даклад копію справаздачы, зробленай згодна з пунктам 1 гэтага артыкула.

**Артыкул 20**

1. Калі Камітэт атрымлівае верагодную інфармацыю, якая, на яго погляд, утрымлівае абгрунтаваныя звесткі пра сістэматычныя катаванні на тэрыторыі якой-небудзь дзяржавы-ўдзельніцы, Камітэт прапаноўвае гэтай дзяржаве-ўдзельніцы супрацоўнічаць у расследаванні інфармацыі і з гэтай мэтай даць свае заўвагі адносна гэтай інфармацыі.

2. Беручы пад увагу любыя заўвагі, якія магла зрабіць адпаведная дзяржава-ўдзельніца, а таксама любую даступную Камітэту адпаведную інфармацыю, Камітэт можа, калі ён пастановіць што гэта абгрунтавана, прызначыць аднаго ці болей сваіх членаў для правядзення канфідэнцыйнага расследавання і неадкладнай падрыхтоўкі адпаведнага дакладу ў Камітэт.
3. Калі згодна з пунктам 2 гэтага артыкула праводзіцца расследаванне, Камітэт імкнецца наладзіць супрацоўніцтва з адпаведнай дзяржавай-удзельніцай. Са згоды дадзенай дзяржавы-ўдзельніцы такое расследаванне можа ўключаць наведванне яе тэрыторыі.
4. Пасля разгляду вынікаў расследавання, якое ладзілася згодна з пунктам 2 гэтага артыкула членам ці членамі Камітэта, Камітэт адпраўляе гэтыя вынікі адпаведнай дзяржаве-ўдзельніцы разам з усімі каментарыямі ці прапановамі, якія падаюцца мэтазгоднымі ў дадзенай сітуацыі.
5. Уся праца Камітэта, згаданая ў пунктах 1—4 дадзенага артыкула, мае канфідэнцыйны характар і на ўсіх стадыях працы Камітэт імкнецца да супрацоўніцтва з адпаведнай дзяржавай-удзельніцай. Пасля заканчэння працэдуры расследавання згодна з пунктам 2 Камітэт, пракансультаваўшыся з адпаведнай дзяржавай-удзельніцай, можа пастанавіць уключыць выніковую справаздачу паводле вынікаў расследавання ў свой штогадовы даклад згодна з артыкулам 24.

**Артыкул 21**

1. Згодна з гэтым артыкулам любая дзяржава-ўдзельніца дадзенай Канвенцыі можа ў любы час абвясціць, што яна прызнае кампетэнцыю Камітэта атрымліваць і разглядаць паведамленні, у якіх адна дзяржава-ўдзельніца сцвярджае, што іншая дзяржава-ўдзельніца не выконвае сваіх абавязкаў згодна з дадзенай Канвенцыяй. Такія паведамленні адпраўляюцца і разглядаюцца згодна з адпаведнымі працэдурамі, усталяванымі ў гэтым артыкуле, толькі калі такое паведамленне робіць дзяржава-ўдзельніца, якая ўжо абвясціла, што прызнае адносна сябе кампетэнцыю Камітэта. Камітэт не разглядае паведамленні адносна дзяржаў-удзельніц, якія не рабілі падобных заяў. Паведамленні, атрыманыя згодна з гэтым артыкулам, разглядаюцца згодна з наступнай працэдурай:

(a) калі дзяржава-ўдзельніца мяркуе, што іншая дзяржава-ўдзельніца не выконвае пастановаў дадзенай Канвенцыі, яна можа ў форме пісьмовага паведамлення давесці гэтае пытанне да ўвагі названай дзяржавы-ўдзельніцы. Цягам трох месяцаў пасля атрымання паведамлення дзяржава-атрымальнік мусіць прадставіць дзяржаве, якая зрабіла паведамленне тлумачэнне ці іншую пісьмовую заяву, якая высвятляе пытанне. У пісьмовым адказе мусіць утрымлівацца па меры магчымасці і патрэбы спасылка на ўнутраныя працэдуры і меры, якія былі прынятыя, будуць прынятыя ці могуць быць прынятыя ў гэтым пытанні;

(b) калі цягам шасці месяцаў пасля атрымання першага паведамлення дзяржавай-атрымальнікам пытанне паміж дзвюма дзяржавамі-ўдзельніцамі не вырашаецца, кожная дзяржава мае права перадаць дадзенае пытанне ў Камітэт, паінфармаваўшы пра гэта Камітэт і другую дзяржаву-ўдзельніцу;

(c) Камітэт бярэ да разгляду справу, перададзеную яму згодна з гэтым артыкулам, толькі калі пераканаецца, што ўсе ўнутрынацыянальныя меры былі прынятыя і вычарпаныя ў дадзеным пытанні, згодна з усеагульна прызнанымі прынцыпамі міжнароднага права. Гэтае правіла не дзейнічае ў тых выпадках, калі прыняцце мер неапраўдана зацягваецца або наўрад ці зможа эфектыўна дапамагчы асобе, якая стала ахвярай парушэння дадзенай Канвенцыі;

(d) для разгляду атрыманых згодна з дадзеным артыкулам паведамленняў Камітэт ладзіць закрытыя пасяджэнні;

(e) пры ўмове выканання палажэнняў падпункта (c) Камітэт прапануе свае пасярэдніцтва зацікаўленым дзяржавам-удзельніцам з мэтай мірнага вырашэння пытання на аснове шанавання абавязальніцтваў, прадугледжаных у дадзенай Канвенцыі. З гэтай мэтай у адпаведных выпадках Камітэт можа склікаць адмысловую пагаджальную камісію;

(f) па любой перададзенай згодна з гэтым артыкулам справе Камітэт можа звяртацца да зацікаўленых дзяржаў-удзельніц, згаданых у падпункце (b), па любую адпаведную інфармацыю;

(g) зацікаўленыя дзяржавы-ўдзельніцы, згаданыя ў падпункце (b), маюць права быць прадстаўленымі на разглядзе справы ў Камітэце і рабіць вусныя і/ці пісьмовыя прадстаўленні;

(h) цягам дванаццаці месяцаў пасля атрымання паведамлення, згаданага ў падпункце (b), Камітэт рыхтуе справаздачу:

(i) калі дасягаецца вырашэнне пытання згодна з умовамі падпункта (e), Камітэт абмяжоўваецца ў сваёй справаздачы кароткім выкладам фактаў і дасягнутага рашэння;

(ii) калі вырашэнне пытання згодна з умовамі падпункта (e) не дасягаецца, Камітэт абмяжоўваецца ў сваёй справаздачы кароткім выкладам фактаў; пісьмовыя паведамленні і запіс вусных заяваў ад зацікаўленых дзяржаў-удзельніц дадаецца да справаздачы.

Справаздача па любым пытанні адпраўляецца зацікаўленым дзяржавам-удзельніцам.

2. Палажэнні гэтага артыкула ўступаюць у сілу, калі пяць дзяржаў-удзельніц дадзенай Канвенцыі робяць заявы паводле пункта 1 гэтага артыкула. Такія заявы перадаюцца дзяржавамі-ўдзельніцамі на перахоўванне Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, які адпраўляе копіі гэтых паведамленняў астатнім дзяржавам-удзельніцам. Гэтую заяву можна ў любы час адклікаць, паінфармаваўшы пра гэта Генеральнага сакратара. Такое адкліканне не ўплывае на разгляд любога пытання, адпраўленага ў паведамленні згодна з гэтым артыкулам; пасля атрымання паведамлення аб адкліканні заявы ніякія наступныя паведамленні ні ад якой дзяржавы-ўдзельніцы не прымаюцца згодна з гэтым артыкулам да таго моманту, пакуль зацікаўленая дзяржава-ўдзельніца не зробіць новай заявы.

**Артыкул 22**

1. Дзяржава-ўдзельніца дадзенай Канвенцыі згодна з гэтым артыкулам можа ў любы час абвясціць, што яна прызнае кампетэнцыю Камітэта атрымліваць і разглядаць паведамленні ад асоб ці ад імя асоб, што падпадаюць пад яе юрысдыкцыю, якія сцвярджаюць, што яны сталі ахвярамі парушэнняў дзяржавай-удзельніцай умоваў Канвенцыі. Паведамленні, якія датычаць дзяржаў, што не зрабілі такой заявы, не прымаюцца.
2. Камітэт лічыць недапушчальным да разгляду любое ананімнае паведамленне ці паведамленне, якое, на думку Камітэта, будзе злоўжываннем права на падачу такіх паведамленняў ці несумяшчальным з умовамі дадзенай Канвенцыі.
3. Згодна з умовамі пункта 2 Камітэт перадае кожнае паведамленне, адпраўленае яму на разгляд згодна з гэтым артыкулам, да ўвагі дзяржавы-ўдзельніцы дадзенай Канвенцыі, якая зрабіла заяву згодна з пунктам 1 і з'яўляецца меркаваным парушальнікам якіхсьці палажэнняў Канвенцыі. Цягам шасці месяцаў дзяржава-атрымальнік адпраўляе ў Камітэт пісьмовыя тлумачэнні, якія высвятляюць пытанне, а таксама справаздачу пра меры, калі такія ёсць, якія дзяржава-ўдзельніца магла прыняць у дадзеным выпадку.
4. Камітэт разглядае паведамленні, атрыманыя згодна з гэтым артыкулам, улічваючы ўсе звесткі, якія ён атрымаў ад імя асобы і ад зацікаўленай дзяржавы-ўдзельніцы.
5. Камітэт не бярэ да разгляду ніякіх паведамленняў ад асоб згодна з гэтым артыкулам, пакуль не пераканаецца, што:

(a) гэтае ж пытанне не разглядалася і не разглядаецца згодна з іншай працэдурай міжнароднага расследавання ці вырашэння спрэчак;

(b) асоба вычарпала ўсе магчымыя ўнутрыдзяржаўныя сродкі; гэтае правіла не дзейнічае, калі ўжыванне ўнутрыдзяржаўных сродкаў неабгрунтавана зацягваецца або наўрад ці эфектыўна дапаможа асобе, якая стала ахвярай парушэння дадзенай Канвенцыі.

6. Для разгляду паведамленняў згодна з гэтым артыкулам Камітэт склікае закрытае паседжанне.
7. Камітэт накіроўвае свае заўвагі дзяржаве-ўдзельніцы і пацярпелай асобе.
8. Умовы гэтага артыкула ўступаюць у сілу, калі пяць дзяржаў-удзельніц дадзенай Канвенцыі зрабілі заявы згодна з пунктам 1 гэтага артыкула. Такія заявы перадаюцца дзяржавамі-ўдзельніцамі на перахоўванне Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, які адпраўляе іх асобнікі астатнім дзяржавам-удзельніцам. Заява можа быць адкліканая ў любы час пасля паведамлення пра гэта Генеральнаму сакратару.

Такое адкліканне не ўплывае на разгляд любога пытання, ужо адпраўленага ў паведамленні згодна з гэтым артыкулам; пасля атрымання паведамлення аб адкліканні заявы ніякія наступныя паведамленні ад якой-небудзь асобы ці ад яе імя не прымаюцца згодна з гэтым артыкулам да таго моманту, пакуль зацікаўленая дзяржава-ўдзельніца не зробіць новай заявы.

**Артыкул 23**

Члены Камітэта і адмысловай пагаджальнай камісіі, якія могуць прызначацца паводле артыкула 21, пункта 1 (e), маюць права на атрыманне матэрыяльных сродкаў, прывілеяў і статусу недатыкальнасці экспертаў, якія дзейнічаюць па заданні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, што прадугледжана адпаведнымі раздзеламі Канвенцыі аб прывілеях і імунітэтах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Артыкул 24**

Камітэт рыхтуе штогадовую справаздачу па сваёй дзейнасці ў рамках дадзенай Канвенцыі дзяржавам-удзельніцам і Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**ЧАСТКА III**

**Артыкул 25**

1. Дадзеная Канвенцыя адкрытая для падпісання ўсімі дзяржавамі.
2. Дадзеная Канвенцыя падлягае ратыфікацыі. Ратыфікацыйныя граматы дэпануюцца ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

**Артыкул 26**

Дадзеная Канвенцыя адкрытая для далучэння ўсіх дзяржаў. Далучэнне ажыццяўляецца дэпанаваннем дакумента аб далучэнні ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

**Артыкул 27**

1. Дадзеная Канвенцыя ўступае ў сілу на трыццаты дзень ад дня дэпанавання ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб’яднаных Нацый дваццатай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.
2. Для кожнай дзяржавы, якая ратыфікуе дадзеную Канвенцыю ці далучаецца да яе пасля дэпанавання дваццатай ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні, дадзеная Канвенцыя ўступае ў сілу на трыццаты дзень ад дня дэпанавання сваёй ратыфікацыйнай граматы ці дакумента аб далучэнні.

**Артыкул 28**

1. Кожная дзяржава ў час падпісання ці ратыфікацыі дадзенай Канвенцыі ці далучэння да яе можа абвясціць, што яна не прызнае кампетэнцыі Камітэта, прадугледжанай у артыкуле 20.
2. Кожная дзяржава-ўдзельніца, якая зрабіла агаворку згодна з пунктам 1 гэтага артыкула, можа ў любы час адклікаць сваю агаворку, праінфармаваўшы Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

**Артыкул 29**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца дадзенай Канвенцыі можа прапанаваць папраўку і накіраваць яе Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Пасля гэтага Генеральны сакратар адпраўляе прапанаваную папраўку дзяржавам-удзельніцам дадзенай Канвенцыі з просьбай паведаміць яму, ці ўхваляюць яны скліканне канферэнцыі дзяржаў-удзельніц з мэтай разгляду прапаноў і галасавання па іх. Калі цягам чатырох месяцаў не менш за адну трацiну дзяржаў-удзельніц ухваляюць канферэнцыю, Генеральны сакратар склікае канферэнцыю пад эгідай Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Кожная папраўка, ухваленая большасцю прысутных дзяржаў-удзельніц, якія бралі ўдзел у галасаванні, адпраўляецца Генеральным сакратаром на зацверджанне ўсім дзяржавам-удзельніцам.
2. Папраўка, ухваленая згодна з пунктам 1 гэтага артыкула, уступае ў сілу, калі дзве трацiны дзяржаў-удзельніц дадзенай Канвенцыі інфармуюць Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб’яднаных Нацый пра зацвярджэнне папраўкі паводле сваіх адпаведных канстытуцыйных працэдур.
3. Калі папраўкі уступаюць у сілу, яны становяцца абавязковымі для дзяржаў, якія іх ухвалілі, у той час як астатнія дзяржавы-ўдзельніцы лічаць сябе звязанымі абавязальніцтвамі папярэдніх умоў дадзенай Канвенцыі і ранейшых паправак, якія яны ўхвалілі.

**Артыкул 30**

1. Любая спрэчка паміж дзвюма ці болей дзяржавамі-ўдзельніцамі адносна трактавання ці ўжывання дадзенай Канвенцыі пры немагчымасці вырашэння шляхам перамоў скіроўваецца на запатрабаванне адной з зацікаўленых дзяржаў на арбітраж. Калі цягам шасці месяцаў ад просьбы арбітражнага вырашэння пытання удзельнікі спрэчкі не згаджаюцца пра арганізацыю арбітражу, любы з бакоў можа адправіць гэтае пытанне ў Міжнародны Суд з просьбай вырашыць яго згодна са Статутам Суда.
2. Кожная дзяржава ў час падпісання ці ратыфікацыі дадзенай Канвенцыі ці далучэння да яе можа абвясціць, што яна не прызнае сябе абавязанай умовамі пункта 1 гэтага артыкула. Астатнія дзяржавы-ўдзельніцы не будуць абавязанымі ўмовамі пункта 1 гэтага артыкула адносна дзяржаў-удзельніц, якія зрабілі такую агаворку.
3. Любая дзяржава-ўдзельніца, якая зрабіла агаворку згодна з пунктам 2 гэтага артыкула, можа ў любы час адклікаць сваю агаворку, паінфармаваўшы пра гэта Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

**Артыкул 31**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца можа дэнансаваць дадзеную Канвенцыю, пісьмова паведаміўшы пра гэта Генеральнаму сакратару Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Дэнансацыя ўступае ў сілу праз год пасля атрымання паведамлення Генеральным сакратаром.
2. Такая дэнансацыя не вызваляе дзяржаву-ўдзельніцу ад сваіх абавязкаў паводле дадзенай Канвенцыі адносна любога дзеяння ці бяздзеяння, якія адбыліся да дня ўступлення дэнансацыі ў сілу; таксама дэнансацыя ніякім чынам не перашкаджае разгляду кожнага пытання, якое пачало разглядацца Камітэтам да дня ўступлення дэнансацыі ў сілу.
3. Пасля даты ўступлення дэнансацыі ў сілу для пэўнай дзяржавы-ўдзельніцы Камітэт больш не разглядае ніякіх новых пытанняў адносна гэтай дзяржавы.

**Артыкул 32**

Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый інфармуе ўсе дзяржавы-ўдзельніцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якія падпісалі дадзеную Канвенцыю ці далучыліся да яе, пра наступнае:

(a) падпісанні, ратыфікацыі і далучэнні згодна з артыкуламі 25 і 26;

(b) дату ўступлення дадзенай Канвенцыі ў сілу згодна з артыкулам 27 і дату ўступлення ў сілу любых паправак згодна з артыкулам 29;

(c) дэнансацыі згодна з артыкулам 31.

**Артыкул 33**

1. Дадзеная Канвенцыя, арабскі, кітайскі, англійскі, французскі, рускі і іспанскі тэксты якой у роўнай ступені маюць сілу арыгінала, дэпануюцца ў Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
2. Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый адпраўляе завераныя асобнікі дадзенай Канвенцыі ўсім дзяржавам.

# КАНВЕНЦЫЯ АБ ПРАВАХ ДЗІЦЯЦІ

Ухваленая і адкрытая для падпісання, ратыфікацыі і далучэння рэзалюцыяй 44/25 Генеральнай Асамблеі ад 20 лістапада 1989 г. Уступленне ў сілу 2 верасня 1990 г. згодна з артыкулам 49. *(вытрымкі)*

---

## ПРЭАМБУЛА

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенай Канвенцыі,

беручы пад увагу, што згодна з прынцыпамі, абвешчанымі ў Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, прызнанне годнасці, уласцівай усім членам чалавечай сям'і і іх роўных і неад'емных правоў з'яўляецца асновай свабоды, справядлівасці і міру ва ўсім свеце,

памятаючы пра тое, што народы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый пацвердзілі ў Статуце ААН сваю веру ў асноўныя правы чалавека і ў годнасць і каштоўнасць чалавечай асобы, а таксама поўныя рашучасці спрыяць сацыяльнаму прагрэсу і паляпшаць умовы жыцця пры большай свабодзе,

прызнаючы, што ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і ў Міжнародных пактах аб правах чалавека Арганізацыя Аб'яднаных Нацый абвясціла і пацвердзіла, што кожны чалавек мусіць мець усе правы і свабоды, указаныя ў гэтых дакументах, без любога кшталту адрозненняў, такіх, як раса, колер скуры, пол, мова, рэлігія, палітычныя ды іншыя погляды, нацыянальнае ці сацыяльнае паходжанне, маёмаснае, саслоўнае або іншае становішча,

нагадваючы, што ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека Арганізацыя Аб'яднаных Нацый абвясціла, што дзяцінству патрэбныя асаблівыя апека і дапамога,

маючы перакананне, што сям'і як асноўнай ячэйцы грамадства і натуральнаму асяроддзю для росту і дабрабыту ўсіх членаў, асабліва дзяцей, мусіць надавацца любая неабходная абарона і дапамога з той мэтай, каб яна магла цалкам узяць на сябе абавязальніцтвы ў рамках грамадства,

прызнаючы, што для ўсебаковага і гарманічнага развіцця асобы дзіця мусіць расці ў сямейным асяроддзі, у атмасферы шчасця, любові і разумення,

мяркуючы, што дзіця мусіць быць цалкам падрыхтаванае да самастойнага жыцця ў грамадстве, а таксама выхоўвацца ў духу ідэалаў, абвешчаных у Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, асабліва ў духу міру, годнасці, цярпімасці, свабоды, роўнасці і салідарнасці,

беручы пад увагу, што патрэба распаўсюдзіць асаблівы клопат на дзіця акрэслівалася ў Жэнеўскай дэкларацыі аб правах дзіцяці 1924 г. і ў Дэкларацыі аб правах дзіцяці, ухваленай Генеральнай Асамблеяй 20 лістапада 1959 г., і прызнаная ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, у Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах (у прыватнасці, у артыкулах 23 і 24), у Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (у прыватнасці, у артыкуле 10) і ў статутах і адпаведных дакументах спецыялізаваных устаноў і міжнародных арганізацый, якія займаюцца пытаннямі дабрабыту дзяцей,

беручы пад увагу, што «дзіця з прычыны яго разумовай і фізічнай няспеласці мае патрэбу ў асаблівай абароне і клопаце, як да, так і пасля народзінаў», як сказана ў Дэкларацыі правоў дзіцяці,

спасылаючыся на ўмовы Дэкларацыі сацыяльных і прававых прынцыпаў адносна абароны і дабрабыту дзяцей, асабліва пры перадачы дзяцей на выхаванне і ўсынаўленне на нацыянальным і міжнародным узроўнях; Стандартных мінімальных правілаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, што датычаць выканання правасуддзя адносна непаўналетніх (Пекінскія правілы); і Дэкларацыі аб абароне жанчын і дзяцей у надзвычайных умовах і падчас узброеных канфліктаў;

прызнаючы, што ва ўсіх краінах свету ёсць дзеці, якія жывуць у надзвычай цяжкіх умовах і што такім дзецям патрабуецца адмысловая ўвага,

належным чынам улічваючы важнасць традыцый і культурных каштоўнасцяў усіх народаў дзеля абароны і гарманічнага развіцця дзіцяці,

прызнаючы важнасць міжнароднага супрацоўніцтва ў мэтах паляпшэння жыццёвых умоў дзяцей у кожнай краіне, асабліва ў краінах, што сталі на шлях развіцця

пагадзіліся пра наступнае:

## ЧАСТКА I

### Артыкул 1

Для мэтаў дадзенай Канвенцыі дзіцем з'яўляецца кожная чалавечая істота ва ўзросце не большым за 18 гадоў, калі згодна з законам, што ўжываецца ў дачыненні да гэтага дзіцяці, яно не становіцца паўналетнім раней.

**Артыкул 2**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы шануюць і забяспечваюць правы, прадугледжаныя ў дадзенай Канвенцыі, кожнаму дзіцяці, якое знаходзіцца ў межах іх юрысдыкцыі, без усякага кшталту дыскрымінацыі, незалежна ад расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых поглядаў, нацыянальнасці, этнічнага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага стану, стану здароўя і нараджэння, дзіцяці, бацькоў дзіцяці ці яго законных апекуноў ці іншых абставінаў.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры, каб забяспечыць абарону дзіцяці ад усіх формаў дыскрымінацыі ці пакарання на аснове статусу, дзейнасці, выяўленых поглядаў ці веры бацькоў дзіцяці, яго законных апекуноў ці членаў сям'і.

**Артыкул 3**

1. Ва ўсіх дзеяннях адносна дзіцяці, незалежна ад таго, чыняцца яны дзяржаўнымі ці прыватнымі ўстановамі, якія займаюцца пытаннямі сацыяльнага забеспячэння, судамі, адміністрацыйнымі ці заканадаўчымі органамі, першасным заўжды з'яўляецца забеспячэнне інтарэсаў дзіцяці.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць абарону дзіцяці і клопат аб ім, калі гэта неабходна для яго дабрабыту, беручы пад увагу правы і абавязкі ягоных бацькоў, законных апекуноў ці іншых асоб, якія адказваюць за яго паводле закону, і з гэтай мэтай прымаюць усе адпаведныя заканадаўчыя і адміністрацыйныя меры.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб установы, службы і органы, адказныя за клопат аб дзецях ці іх абарону, адпавядалі нормам, усталяваным кампетэнтнымі органамі, асабліва ў сферах бяспекі, аховы здароўя, і з гледзішча колькасці і прыдатнасці свайго персаналу, а таксама кампетэнтнасці нагляду.

**Артыкул 4**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя ды іншыя меры дзеля ажыццяўлення правоў, прызнаных у дадзенай Канвенцыі. Адносна эканамічных, сацыяльных і культурных правоў дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць меры, максімальна выкарыстоўваючы ўласныя даступныя рэсурсы і пры патрэбе міжнароднае супрацоўніцтва.

**Артыкул 5**

Дзяржавы-ўдзельніцы шануюць адказнасць, правы і абавязкі бацькоў ці, у адпаведных выпадках, членаў пашыранай сям'і ці супольнасці, наколькі гэта адпавядае мясцовым звычаям, законных апекуноў ці іншых асоб, якія адказваюць за дзіця паводле закону, належным чынам навучаць дзіця і кіраваць ім у ажыццяўленні яго правоў, прызнаных у дадзенай Канвенцыі, робячы тое ў адпаведнасці з развіццём здольнасцяў дзіцяці.

**Артыкул 6**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што кожнае дзіця мае неад'емнае права на жыццё.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы максімальна забяспечваюць выжыванне і здаровае развіццё дзіцяці.

**Артыкул 7**

1. Дзіця належыць зарэгістраваць адразу пасля нараджэння; таксама дзіця мае права на імя і набыццё грамадзянства ад нараджэння, а таксама, наколькі гэта магчыма, права ведаць сваіх бацькоў і права на іх клопат аб сабе.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць выкананне гэтых правоў згодна са сваім дзяржаўным заканадаўствам і абавязкамі згодна з адпаведнымі міжнароднымі дакументамі ў гэтай сферы, у прыватнасці, у тым выпадку, калі інакш дзіця не мела б грамадзянства.

**Артыкул 8**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца шанаваць права дзіцяці на захаванне сваёй ідэнтычнасці, уключаючы грамадзянства, імя і сямейныя сувязі, як гэта прадугледжваецца законам, не дапускаючы незаконнага ўмяшальніцтва.
2. У тым выпадку, калі дзіця незаконна пазбаўляюць цалкам ці часткова яго ідэнтычнасці, дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць належную дапамогу і абарону дзеля найхутчэйшага яе аднаўлення.

**Артыкул 9**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб дзіця не аддзялялася ад сваіх бацькоў супраць сваёй волі, акрамя тых выпадкаў, калі кампетэнтныя органы, паводле судовай пастановы, пастанаўляюць згодна з адпаведнымі законамі і працэдурамі, што такое аддзяленне неабходнае ў найлепшых інтарэсах дзіцяці. Такое вызначэнне можа быць неабходным у пэўным выпадку, напрыклад, калі бацькі жорстка абыходзяцца з дзіцем ці не дбаюць пра яго, ці калі бацькі жывуць асобна і трэба прыняць рашэнне пра месца жыхарства дзіцяці.
2. Падчас любога разбіральнітцва згодна з пунктам 1 гэтага артыкула ўсім зацікаўленым бакам забяспечваецца магчымасць браць удзел у разбіральніцтве і выкладаць свае погляды.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы шануюць права дзіцяці, якое жыве асобна ад аднаго ці абоіх бацькоў, падтрымліваць рэгулярныя асабістыя адносіны і рэгулярны беспасярэдні кантакт з абоімі бацькамі за выключэннем тых выпадкаў, калі гэта супярэчыць найлепшым інтарэсам дзіцяці.
4. Калі такое раздзяленне вынікае з якога-небудзь дзеяння дзяржавы-ўдзельніцы, напрыклад, затрымання, зняволення, выгнання, дэпартацыі ці смерці (уключна з выпадкамі смерці, якая наступіла з якойсьці прычыны падчас знаходжання асобы пад наглядам дзяржавы) аднаго ці абоіх бацькоў ці дзіцяці, тая дзяржава-ўдзельніца забяспечвае бацькоў, дзіця ці, у адпаведных выпадках, іншага члена сям'і неабходнымі звесткамі на запатрабаванне пра месца, дзе знаходзіцца адсутны член (члены) сям'і, калі падаванне такіх звестак не будзе шкодзіць дабрабыту дзіцяці. Надалей дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб такое патрабаванне не прыводзіла да нядобрых наступстваў для адпаведнай асобы (асоб).

**Артыкул 10**

1. Згодна з абавязкамі дзяржаў-удзельніц паводле артыкула 9, пункта 1 заявы ад дзіцяці ці яго бацькоў на ўезд ці выезд з дзяржавы-ўдзельніцы з мэтай уз'яднання сям'і мусяць разглядацца дзяржавамі-ўдзельніцамі пазітыўным, гуманным і аператыўным чынам. Надалей дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб такія патрабаванні не прыводзілі да небяспечных наступстваў для заяўнікаў і для членаў іх сем'яў.
2. Дзіця, чые бацькі жывуць у розных краінах, мае права рэгулярна падтрымліваць, акрамя выключных выпадкаў, асабістыя зносіны і беспасярэднія кантакты з абоімі бацькамі. З гэтай мэтай і ў адпаведнасці з абавязкамі дзяржаў-удзельніц паводле артыкула 9, пункта 1, дзяржавы-ўдзельніцы шануюць права дзіцяці і яго бацькоў пакідаць любую краіну, уключна з іх уласнай, і вяртацца у сваю краіну. Права пакідаць любую краіну падпадае толькі пад такія абмежаванні, якія прадугледжаны заканадаўствам і якія неабходныя дзеля абароны нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, аховы здароўя насельніцтва ці маральных звычаяў ці правоў і свабод астатніх людзей і якія адпавядаюць астатнім правам, прызнаным у дадзенай Канвенцыі.

**Артыкул 11**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць меры па змаганні з незаконным перамяшчэннем ці невяртаннем дзяцей з-за мяжы.
2. З гэтай мэтай дзяржавы-ўдзельніцы спрыяюць заключэнню двухбаковых ці шматбаковых пагадненняў ці далучэнню да ўжо наяўных пагадненняў.

**Артыкул 12**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць дзіцяці, якое здольнае сфармаваць свае погляды, права на свабоднае выяўленне гэтых поглядаў ва ўсіх пытаннях, якія датычаць дзіцяці, прычым поглядам дзіцяці мусіць надавацца належная ўвага згодна з яго ўзростам і сталасцю.
2. З гэтай мэтай дзіцяці, у прыватнасці, забяспечваецца магчымасць быць заслуханым на любым судовым ці адміністрацыйным разбіральніцтве, якія датычаць гэтага дзіцяці, як наўпрост, так і праз прадстаўніка ці адпаведны орган, у парадку, прадугледжаным працэсуальнымі нормамі нацыянальнага заканадаўства.

**Артыкул 13**

1. Кожнае дзіця мае права на свабоду выказвання; гэтае права ўключае свабоду пошукаў, атрымання і распаўсюджання любога кшталту інфармацыі ды ідэяў, не зважаючы на межы, як у вуснай, так і ў пісьмовай форме ці ў друку, у форме мастацкіх твораў ці з дапамогай іншых сродкаў на выбар дзіцяці.
2. Карыстанне гэтым правам можа быць прадметам пэўных абмежаванняў, але гэта могуць быць толькі неабходныя абмежаванні, а таксама прадугледжаныя законам:
(a) для павагі правоў і рэпутацыі іншых асоб, ці
(b) для абароны нацыянальнай бяспекі ці грамадскага парадку або аховы здароўя насельніцтва ці яго маральных звычаяў.

**Артыкул 14**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы шануюць права дзіцяці на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы шануюць правы і абавязкі бацькоў і, у адпаведных выпадках, законных апекуноў кіраваць дзіцем у ажыццяўленні яго права тым спосабам, які адпавядае развіццю здольнасцяў дзіцяці.
3. Свабода спавядаць рэлігію ці вераванні можа быць прадметам толькі такіх абмежаванняў, якія прадугледжаны ў законе і неабходныя дзеля абароны нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, аховы здароўя ці маральных звычаяў ці асноўных правоў і свабод іншых асоб.

**Артыкул 15**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць правы дзіцяці на свабоду аб'яднанняў і мірных сходаў.
2. На карыстанне гэтымі правамі нельга накладаць ніякіх абмежаванняў, акрамя тых, што адпавядаюць патрабаванням закону і якія неабходныя ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах дзяржаўнай ці грамадскай бяспекі, грамадскага парадку, аховы здароўя насельніцтва ці маральных звычаяў ці абароны правоў і свабод іншых асоб.

**Артыкул 16**

1. Ніякае дзіця не можа быць ахвярай адвольнага ці незаконнага ўмяшальніцтва ў яго асабістае жыццё, сям'ю, дом ці ліставанне, а таксама ахвярай незаконных замахаў на яго гонар ці рэпутацыю.
2. Дзіця мае права на абарону закона ад такога ўмяшальніцтва ці замахаў.

**Артыкул 17**

Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць важную ролю сродкаў масавай інфармацыі і забяспечваюць кожнаму дзіцяці доступ да інфармацыі і матэрыялаў з розных дзяржаўных і міжнародных крыніц, асабліва да тых матэрыялаў, якія скіраваныя на спрыянне яго сацыяльнаму, духоўнаму і маральнаму дабрабыту і фізічнаму і духоўнаму здароўю.

З гэтай мэтай дзяржавы-ўдзельніцы:

(a) заахвочваюць сродкі масавай інфармацыі распаўсюджваць інфармацыю і матэрыялы, якія могуць быць карыснымі для дзяцей у сацыяльным і культурным плане і якія адпавядаюць духу артыкула 29;
(b) заахвочваюць міжнароднае супрацоўніцтва ў вытворчасці, абмене і распаўсюджванні такой інфармацыі і матэрыялаў з розных культурных, нацыянальных і міжнародных крыніц;
(c) заахвочваюць выпуск і распаўсюджванне кніг для дзяцей;
(d) заахвочваюць сродкі масавай інфармацыі надаваць асаблівую ўвагу моўным патрэбам дзіцяці, якое належыць да якойсьці групы меншасцяў ці да карэннага насельніцтва;
(e) заахвочваюць распрацоўку адпаведных прынцыпаў абароны дзіцяці ад інфармацыі і матэрыялаў, якія чыняць шкоду яго дабрабыту, улічваючы пастановы артыкулаў 13 і 18.

**Артыкул 18**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы зробяць усё магчымае, каб забяспечыць прызнанне прынцыпу, што абое бацькоў супольна адказваюць за выхаванне і развіццё свайго дзіцяці. Бацькі ці, у адпаведных выпадках, законныя апекуны нясуць галоўную адказнасць за выхаванне і развіццё дзіцяці. Прадметам іх асноўнага клопату будуць найлепшыя інтарэсы дзіцяці.
2. З мэтай гарантавання і спрыяння правам, прадугледжаным у дадзенай Канвенцыі, дзяржавы-ўдзельніцы аказваюць належную дапамогу бацькам і законным апекунам у выкананні іх выхаваўчых абавязкаў і забяспечваюць развіццё сеткі дзіцячых установаў.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры, каб забяспечыць дзяцей, чые бацькі працуюць, правам на карыстанне прызначанымі для іх службамі і дзіцячымі ўстановамі.

**Артыкул 19**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, сацыяльныя і адукацыйныя меры па абароне дзіцяці ад усіх формаў фізічнага ці псіхалагічнага гвалту, зняваг ці злоўжывання, нядбайнасці ці нядбалага абыходжання, жорсткага абыходжання ці эксплуатацыі, уключна з сексуальным злоўжываннем, з боку бацькоў, законных апекуноў ці якой іншай асобы, якая дбае пра дзіця.
2. Такія меры абароны, пры неабходнасці, мусяць уключаць эфектыўныя працэдуры па ўвядзенні сацыяльных праграм, каб забяспечыць неабходную падтрымку дзіцяці і асобам, якія пра іх дбаюць; а таксама для выканання іншых формаў прадухілення і выяўлення, паведамлення, перадачы на разгляд, расследавання, лячэння і далейшых мер у сувязі з выпадкамі жорсткага абыходжання з дзіцем, згаданымі вышэй, і, пры неабходнасці, для распачынання судовых працэдур.

**Артыкул 20**

1. Дзіця, часова ці стала пазбаўленае свайго сямейнага асяроддзя, альбо калі ў сваіх найпершых інтарэсах яно не можа заставацца ў такім асяроддзі, мае права на адмысловую абарону і дапамогу ад дзяржавы.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы згодна са сваімі дзяржаўнымі заканадаўствамі абавязуюцца забяспечыць альтэрнатыўны від нагляду за такімі дзецьмі.
3. Такія меры, між іншым, могуць уключаць перадачу на выхаванне, «кафала» паводле ісламскага права, усынаўленне ці, калі неабходна, змяшчэнне ў адпаведныя ўстановы па доглядзе дзяцей. Пры разглядзе варыянтаў мер неабходна належным чынам улічваць пажаданасць пераемнасці выхавання дзіцяці, а таксама этнічнае, рэлігійнае, культурнае і моўнае паходжанне дзіцяці.

**Артыкул 21**

Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць і/ці дазваляюць існаванне сістэмы ўсынаўлення і забяспечваюць, каб найлепшыя інтарэсы дзяцей улічваліся спярша, а таксама:

(a) забяспечваюць, каб рашэнне адносна ўсынаўлення дзіцяці прымалася толькі кампетэнтнымі органамі, якія вырашаюць згодна з адпаведным заканадаўствам і працэдурамі, а таксама на аснове ўсёй адпаведнай і дакладнай інфармацыі, што ўсынаўленне ў дадзеным выпадку дазваляецца зыходзячы са статусу дзіцяці адносна бацькоў, сваякоў і законных апекуноў і што пры неабходнасці пазначаныя асобы даюць сваю свядомую згоду на ўсынаўленне на аснове такой кансультацыі, якая можа быць неабходнай;
(b) прызнаюць, што ўсынаўленне ў іншай краіне можа лічыцца альтэрнатыўным спосабам клопату аб дзіцяці, калі дзіця нельга перадаваць на выхаванне ці змяшчаць у сям'ю альбо няма іншага зручнага спосабу дбаць пра гэтае дзіця ў краіне яго паходжання;
(c) забяспечваюць, каб у выпадку ўсынаўлення дзіцяці ў іншай краіне дзейнічалі гарантыі і нормы, параўнальныя з тымі, якія ўжываюцца адносна ўсынаўлення ў краіне паходжання;
(d) прымаюць усе належныя меры з мэтай забеспячэння таго, каб у выпадку ўсынаўлення ў іншай краіне ўладкаванне дзіцяці не прыводзіла да атрымання неапраўданых фінансавых зыскаў асобамі, звязанымі з усынаўленнем;
(e) спрыяюць, дзе магчыма, мэтам дадзенага артыкула з дапамогай заключэння двухбаковых ці шматбаковых дамоўленасцяў ці пагадненняў і імкнуцца на гэтай аснове забяспечыць, каб размяшчэнне дзіцяці ў іншай краіне рабілася кампетэнтнымі ўладамі ці органамі.

**Артыкул 22**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры, каб дзіця, якое хоча атрымаць статус уцекача ці якое мае статус уцекача, як разам са сваімі бацькамі ці з іншай асобай, якая яго суправаджае, так і без гэтых асоб, згодна з адпаведным міжнародным ці ўнутраным правам ці працэдурамі, мела належную абарону і гуманітарную дапамогу з мэтай ажыццяўлення адпаведных правоў, прадугледжаных дадзенай Канвенцыяй і іншымі міжнароднымі дакументамі па правах чалавека ці гуманітарнымі дакументамі, удзельнікамі якіх з'яўляюцца згаданыя дзяржавы.
2. З гэтай мэтай дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, калі лічаць гэта неабходным, падтрымку любых высілкаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ці іншых кампетэнтных міжурадавых ці няўрадавых арганізацый, якія супрацоўнічаюць з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый, з мэтай абароны і дапамогі такому дзіцяці і пошукаў бацькоў ці іншых членаў сям'і любога дзіцяці-ўцекача, каб атрымаць звесткі, неабходныя для яго ці яе ўз'яднання са сваёй сям'ёй. У тых выпадках, калі не ўдаецца знайсці бацькоў ці іншых членаў сям'і, дзіця атрымлівае абарону, прадугледжаную дадзенай Канвенцыяй, як і любое іншае дзіця, часова ці стала пазбаўленае сямейнага асяроддзя з якойсьці прычыны.

**Артыкул 23**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што дзіця з псіхічна ці фізічна абмежаванымі магчымасцямі мусіць весці паўнавартаснае і годнае жыццё ва ўмовах, якія забяспечваюць яго годнасць, надаюць такім дзецям упэўненасці ў сабе і спрыяюць іх актыўнаму ўдзелу ў жыцці супольнасці.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права дзіцяці з абмежаванымі магчымасцямі на адмысловы клопат і спрыяюць і забяспечваюць, пры наяўнасці рэсурсаў, дзіцяці і адказным за апеку над ім асобам, якія маюць на гэта права, запрошаную імі дапамогу, якая адпавядае стану дзіцяці і становішчу бацькоў ці адказных за апекаванне асоб.
3. У прызнанне адмысловых патрэб дзіцяці з абмежаванымі магчымасцямі, дапамога яму згодна з пунктам 2 дадзенага артыкула забяспечваецца бясплатна, калі гэта магчыма, беручы пад увагу фінансавае становішча бацькоў ці іншых асоб, якія дбаюць пра дзіця, і скіроўваецца на забеспячэнне дзіцяці эфектыўным доступам да паслуг адукацыі, прафесійнай падрыхтоўкі, медыцынскіх паслуг, рэабілітацыі здароўя, падрыхтоўкі да працоўнай дзейнасці і сродкаў адпачынку такім чынам, які найлепш спрыяе дасягненню найпаўнейшай сацыяльнай інтэграцыі дзіцяці, а таксама асабістага развіцця, уключаючы яго культурнае і духоўнае развіццё.
4. Дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваюць у духу міжнароднага супрацоўніцтва абмен адпаведнай інфармацыяй у сферы прафілактычнай аховы здароўя і медыцынскага, псіхалагічнага і функцыянальнага лячэння дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, уключаючы распаўсюджванне і доступ да інфармацыі пра метады рэабілітацыі, агульнаадукацыйную і прафесійную падрыхтоўку з мэтай даць магчымасць дзяржавам-удзельніцам палепшыць свае здольнасці і веды і пашырыць свой досвед у гэтых галінах. У гэтым сэнсе асаблівая ўвага мусіць надавацца патрэбам краін, што сталі на шлях развіцця.

**Артыкул 24**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права дзіцяці карыстацца найбольш дасканалымі паслугамі сістэмы аховы здароўя і сродкамі лячэння хвароб і ўзнаўлення здароўя. Дзяржавы-ўдзельніцы імкнуцца да таго, каб ніводнае дзіця не было пазбаўленае права на доступ да такіх паслуг сістэмы аховы здароўя.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы дамагаюцца поўнага выканання гэтага права і, у прыватнасці, прымаюць належныя меры:

(a) для змяншэння ўзроўню смяротнасці немаўлят і дзіцячай смяротнасці;

(b) для забеспячэння неабходнай медыцынскай дапамогі і аховы здароўя ўсіх дзяцей, надаючы першачарговую ўвагу развіццю першаснай медыцынскай дапамогі;

(c) для змагання з хваробамі і недаяданнем, у тым ліку ў рамках першаснай медыцынскай дапамогі; выкарыстоўваючы між іншым даступныя тэхналогіі і забяспечваючы належныя харчовыя прадукты і чыстую пітную ваду, беручы пад увагу небяспеку і рызыку забруджвання навакольнага асяроддзя;

(d) для забеспячэння належнай дапамогі мацяркам падчас цяжарнасці і пасля родаў;

(e) для забеспячэння інфармаванасці ўсіх сегментаў грамадства, асабліва бацькоў і дзяцей, пра здароўе і харчаванне дзяцей, перавагу груднога кармлення, гігіену, навакольнае асяроддзе і прадухіленне няшчасных выпадкаў, а таксама іх доступ да адукацыі і падтрымку ў выкарыстанні такіх ведаў;

(f) для развіцця адукацыйнай работы ў сферы прафілактычнай медыцынскай дапамогі і планавання сям'і.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе эфектыўныя і належныя меры з мэтай выкаранення традыцыйных практык, якія негатыўна ўплываюць на здароўе дзяцей.

4. Дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваюць міжнароднае супрацоўніцтва і спрыяюць яму з мэтай дасягнення паступовай і поўнай рэалізацыі права, прызнанага ў дадзеным артыкуле. У гэтым сэнсе асаблівая ўвага мусіць надавацца патрэбам краін, што сталі на шлях развіцця.

**Артыкул 25**

Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права дзіцяці, змешчанага кампетэнтнымі ўладамі пад апеку з мэтай яго догляду, абароны ці фізічнага ці псіхічнага лекавання, на перыядычную ацэнку лекавання, прызначанага дзіцяці, і ўсіх астатніх умоў, звязаных з такой апекай.

**Артыкул 26**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права кожнага дзіцяці карыстацца дабротамі сістэмы сацыяльнага забеспячэння, уключна з сацыяльным страхаваннем, і прымаюць неабходныя меры дзеля дасягнення поўнага ажыццяўлення гэтага права ў адпаведнасці з іх нацыянальным заканадаўствам.

2. Такія даброты надаюцца, калі гэта неабходна, беручы пад увагу рэсурсы і становішча дзіцяці і асоб, якія за яго адказваюць, а таксама іншыя абставіны адносна атрымання даброты дзіцем ці іншай асобай ад яго імя.

**Артыкул 27**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права кожнага дзіцяці на ўзровень жыцця, адпаведны яго фізічнаму, псіхічнаму, духоўнаму, маральнаму і сацыяльнаму развіццю.

2. Бацькі ці іншыя асобы, якія апякуюцца дзіцем, нясуць асноўную адказнасць за забеспячэнне, згодна са сваімі магчымасцямі і фінансавымі здольнасцямі, жыццёвых умоў, неабходных для развіцця дзіцяці.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы, зважаючы на свае нацыянальныя ўмовы і ў межах даступных рэсурсаў, прымаюць належныя меры, каб дапамагаць бацькам ды іншым асобам, адказным за апеку над дзіцем, ажыццяўляць гэтае права, і пры патрэбе забяспечваюць матэрыяльную дапамогу і падтрымліваюць праграмы, асабліва адносна забеспячэння харчаваннем, вопраткай і жытлом.

4. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры, каб забяспечыць узнаўленне ўтрымання дзіцяці бацькамі ці іншымі асобамі, якія фінансава адказваюць за дзіця, як на тэрыторыі дзяржавы-ўдзельніцы, так і за мяжой. У прыватнасці, калі фінансава адказная за дзіця асоба жыве ў краіне, якая не ўдзельнічае ў дадзенай Канвенцыі, дзяржавы-ўдзельніцы спрыяюць далучэнню да міжнародных пагадненняў ці заключэнню такіх пагадненняў, а таксама дасягненню іншых адпаведных дамоўленасцяў.

**Артыкул 28**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права дзіцяці на адукацыю, і з мэтай дасягнення паступовага выканання гэтага права на аснове роўных магчымасцяў яны, у прыватнасці:

(a) уводзяць для ўсіх абавязковую пачатковую адукацыю на бясплатнай аснове;

(b) заахвочваюць развіццё розных формаў сярэдняй адукацыі, як агульнай, так і прафесійнай, робяць яе даступнай для кожнага дзіцяці і прымаюць належныя меры, як, напрыклад, увядзенне бясплатнай адукацыі і забеспячэнне пры патрэбе фінансавай дапамогі;

(c) усімі магчымымі сродкамі робяць вышэйшую адукацыю даступнай усім на аснове здольнасцяў кожнага чалавека;

(d) забяспечваюць даступнасць інфармацыі і матэрыялаў у галіне адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі для ўсіх дзяцей;
(e) прымаюць меры па заахвочванні рэгулярнага наведвання школ і зніжэнні колькасці вучняў, якія не сканчаюць адукацыі.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры, скіраваныя на забеспячэнне таго, каб школьная дысцыпліна падтрымлівалася з дапамогай метадаў, якія шануюць чалавечую годнасць дзіцяці і адпавядаюць дадзенай Канвенцыі.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваюць і развіваюць міжнароднае супрацоўніцтва ў пытаннях адукацыі, у прыватнасці, з мэтай спрыяць ліквідацыі невуцтва і непісьменнасці ва ўсім свеце і доступу да навуковых і тэхнічных ведаў і сучасных метадаў выкладання. У гэтым сэнсе асаблівая ўвага мусіць надавацца патрэбам краін, што сталі на шлях развіцця.

**Артыкул 29**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы пагаджаюцца, што адукацыя дзіцяці мусіць быць скіраваная на:
(a) развіццё асобы дзіцяці, яго талентаў і разумовых і фізічных здольнасцяў у поўнай меры;
(b) выхаванне пашаны да правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама да прынцыпаў, абвешчаных у Статуце Арганізацыі Аб’яднаных Нацый;
(c) выхаванне пашаны да сваіх бацькоў, культурнай самабытнасці, мовы і каштоўнасцяў, да нацыянальных каштоўнасцяў краіны, у якой гэтае дзіця жыве, да краіны, з якой яно можа паходзіць, і да цывілізацый, адрозных ад ягонай;
(d) падрыхтоўку дзіцяці да адказнага жыцця ў свабодным грамадстве, у духу узаемаразумення, міру, цярпімасці, роўнасці мужчын і жанчын і сяброўства паміж усімі народамі, этнічнымі, нацыянальнымі і рэлігійнымі групамі і асобамі, якія належаць да карэннага насельніцтва;
(e) выхаванне пашаны да навакольнага асяроддзя.
2. Ніякая частка дадзенага артыкула ці артыкула 28 не можа тлумачыцца як абмежаванне свабоды асоб ці органаў ствараць адукацыйныя ўстановы і кіраваць імі пры ўмове заўсёднага выканання прынцыпу, прадугледжанага ў пункце 1 дадзенага артыкула, і пры ўмове выканання патрабаванняў да адукацыі, што даецца ў дадзеных установах, якая мусіць адпавядаць такім мінімальным стандартам, якія могуць быць прадугледжаныя дзяржавай.

**Артыкул 30**

У дзяржавах, дзе жывуць этнічныя, рэлігійныя ці моўныя меншасці ці асобы з ліку карэннага насельніцтва, дзіцяці, якое належыць да такой меншасці ці да карэннага насельніцтва, нельга адмаўляць у праве супольна з астатнімі членамі сваёй групы карыстацца сваёй уласнай культурай, вызнаваць сваю рэлігію і выконваць яе абрады ці карыстацца сваёй мовай.

**Артыкул 31**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права кожнага дзіцяці на адпачынак і вольны час, права ўдзельнічаць у гульнях і забаўляльных мерапрыемствах адпаведна ўзросту дзіцяці і браць вольны ўдзел у культурным жыцці і займацца мастацтвам.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы шануюць і заахвочваюць права дзіцяці на паўнавартны ўдзел у культурным і мастацкім жыцці і заахвочваюць забеспячэнне належных і роўных магчымасцяў для культурнай, мастацкай дзейнасці, для вольнага часу і адпачынку.

**Артыкул 32**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права дзіцяці на абарону ад эканамічнай эксплуатацыі і ад выканання любой працы, якая можа быць небяспечнай ці шкодзіць яго адукацыі ці шкодзіць здароўю ці фізічнаму, псіхічнаму, духоўнаму, маральнаму ці сацыяльнаму развіццю.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць заканадаўчыя, адміністрацыйныя, сацыяльныя і адукацыйныя меры, каб забяспечыць выкананне дадзенага артыкула. З гэтай мэтай, узяўшы пад ўвагу адпаведныя ўмовы іншых міжнародных дакументаў, дзяржавы-ўдзельніцы, у прыватнасці:
(a) вызначаюць мінімальны ўзрост ці мінімальныя ўзросты для найму на працу;
(b) вызначаюць неабходныя патрабаванні да працягласці працоўнага дня і ўмоў працы;
(c) вызначаюць адпаведныя віды пакарання ці іншыя санкцыі, каб забяспечыць эфектыўнае выкананне дадзенага артыкула.

**Артыкул 33**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе неабходныя меры, уключаючы заканадаўчыя, адміністрацыйныя, сацыяльныя і адукацыйныя меры, каб абараніць дзіця ад незаконнага ўжывання наркатычных і псіхатропных рэчываў, як гэта вызначана ў адпаведных міжнародных дамовах, а таксама прадухіліць выкарыстанне дзяцей на незаконнай вытворчасці такіх рэчываў і ў гандлі імі.

**Артыкул 34**

Дзяржавы-ўдзельніцы абараняюць дзіця ад усіх формаў сексуальнай эксплуатацыі і сексуальнага злоўжывання. З гэтымі мэтамі дзяржавы-ўдзельніцы, у прыватнасці, прымаюць усе належныя меры на дзяржаўным, двухбаковым і шматбаковым узроўні, каб прадухіліць:

(a) пабуджэнне ці прымус дзіцяці да ўсякай незаконнай сексуальнай дзейнасці;
(b) выкарыстанне дзяцей у мэтах эксплуатацыі ў прастытуцыі ці іншай незаконнай сексуальнай практыцы;
(c) выкарыстанне дзяцей у мэтах эксплуатацыі ў парнаграфіі і парнаграфічных матэрыялах.

**Артыкул 35**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры на дзяржаўным, двухбаковым і шматбаковым узроўні, каб прадухіліць выкраданне дзяцей, гандаль імі ці кантрабанду іх дзеля якойсьці мэты ў любой форме.

**Артыкул 36**

Дзяржавы-ўдзельніцы абараняюць дзіця ад усіх формаў эксплуатацыі, якая хоць якім чынам перашкаджае дабрабыту дзіцяці.

**Артыкул 37**

Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб:

(a) ніводнае дзіця не было ахвярай катавання ці іншых формаў жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання. Ні смяротнае пакаранне, ні пажыццёвае зняволенне без магчымасці вызвалення не ўжываюцца адносна злачынстваў, учыненых асобамі, маладзейшымі за васямнаццаць гадоў;
(b) ніводнае дзіця не было адвольна ці незаконна пазбаўленае волі. Арышт, затрыманне ці зняволенне дзіцяці мусіць адпавядаць закону і мусіць выкарыстоўвацца як апошняя мера і на максімальна кароткі адпаведны перыяд часу;
(c) з кожным дзіцем, пазбаўленым волі, абыходзіліся гуманна і з павагай да годнасці, уласцівай чалавечай асобе, а таксама такім чынам, які ўлічвае патрэбы асоб яго ўзросту. У прыватнасці, кожнае дзіця, пазбаўленае волі, мусіць утрымлівацца асобна ад дарослых, калі толькі ў інтарэсах дзіцяці не ляжыць адваротнае, а таксама мець права падтрымліваць кантакт са сваёй сям'ёй праз ліставанне і наведванні, за выключэннем надзвычайных абставінаў;
(d) кожнае дзіця, пазбаўленае волі, мела права на неадкладны доступ да прававой ці іншай належнай дапамогі, а таксама на права аспрэчваць законнасць пазбаўлення яго волі перад судом ці іншым кампетэнтным, незалежным і бесстаронні́м органам і на хуткае прыняцце такім органам рашэння адносна любога такога працэсуальнага дзеяння.

**Артыкул 38**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязуюцца шанаваць і выконваць нормы міжнароднага гуманітарнага права, якое ўжываецца адносна іх ва ўзброеных канфліктах і датычыць дзіцяці.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе магчымыя меры для забеспячэння таго, каб асобы, якія не дасягнулі ўзросту пятнаццаці гадоў, не бралі непасрэднага ўдзелу ў ваенных дзеяннях.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы ўстрымліваюцца ад прызыву ў войска любой асобы, якая не дасягнула ўзросту пятнаццаці гадоў. Прызываючы асоб, якія дасягнулі пятнаццаці гадоў, але не дасягнулі ўзросту васямнаццаці гадоў, дзяржавы-ўдзельніцы імкнуцца аддаваць перавагу старэйшым асобам.
4. Згодна са сваімі абавязкамі паводле міжнароднага гуманітарнага права ахоўваць цывільнае насельніцтва ва ўзброеных канфліктах, дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе магчымыя меры для забеспячэння абароны і догляду дзяцей, якіх зачапіў узброены канфлікт.

**Артыкул 39**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры для заахвочвання фізічнага і псіхалагічнага аднаўлення і сацыяльнай рэінтэграцыі дзіцяці, якое стала ахвярай: усякай формы нядбайнага абыходжання, эксплуатацыі ці злоўжывання; катавання ці якой іншай формы жорсткага, нялюдскага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання; ці ўзброенага канфлікту. Такое аднаўленне і рэінтэграцыя мусяць адбывацца ва ўмовах, дзе забяспечваецца ахова здароўя, самапавага і годнасць дзіцяці.

**Артыкул 40**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права кожнага дзіцяці, якое, як лічыцца, парушыла крымінальнае заканадаўства ці абвінавачваецца альбо прызнаецца вінаватым у такім парушэнні, на абыходжанне з ім такім чынам, які спрыяе развіццю ў дзіцяці пачуцця

годнасці і вартасці, умацоўвае шанаванне ім правоў чалавека і асноўных свабод іншых людзей і ўлічвае ўзрост дзіцяці і пажаданасць спрыяць яго рэінтэграцыі і выкананню ім карыснай ролі ў грамадстве.

2. З гэтай мэтай, а таксама ўлічваючы адпаведныя палажэнні міжнародных дакументаў, дзяржавы-ўдзельніцы, у прыватнасці, забяспечваюць наступнае:

(a) ніводнае дзіця не лічыцца парушальнікам, не абвінавачваецца і не прызнаецца вінаватым у парушэнні крымінальнага заканадаўства за дзеянне ці бяздзеянне, якія не былі забароненыя нацыянальным ці міжнародным заканадаўствам на момант учынення;

(b) кожнае дзіця, якое, як лічыцца, парушыла крымінальнае заканадаўства ці абвінавачваецца альбо прызнаецца вінаватым у такім парушэнні, мае наступныя мінімальныя гарантыі:

(i) прэзумпцыя невінаватасці, пакуль яго вінаватасць не будзе даказаная паводле закону;

(ii) неадкладнае і беспасярэдняе інфармаванне яго пра выстаўленыя абвінавачанні і, пры патрэбе, праз яго бацькоў ці законных апекуноў, а таксама права на атрыманне прававой ці іншай неабходнай дапамогі ў падрыхтоўцы і вядзенні сваёй абароны;

(iii) неадкладнае прыняцце рашэння па яго справе кампетэнтным, незалежным і бесстаронні́м органам ці судом падчас справядлівых слуханняў згодна з законам у прысутнасці адваката ці іншай адпаведнай асобы і, калі гэта не супярэчыць найлепшым інтарэсам дзіцяці, у прыватнасці, улічваючы яго ўзрост і становішча, яго бацькоў ці законных апекуноў;

(iv) свабода ад прымусу давання паказанняў ці прызнання сваёй віны; вывучэнне паказанняў сведкі ад абвінавачання самастойна ці пры дапамозе іншых асоб і забеспячэнне роўнага ўдзелу сведкаў з боку абароны і вывучэння іх паказанняў;

(v) калі мяркуецца, што дзіця парушыла крымінальнае заканадаўства, — права на паўторны разгляд, згодна з законам, вышэйшым кампетэнтным, незалежным і бесстаронні́м органам ці судом рашэння па яго справе і ўсіх прынятых адносна яго мер;

(vi) бясплатная дапамога перакладчыка, калі дзіця не разумее мовы, якая выкарыстоўваецца, ці не размаўляе на ёй;

(vii) поўная павага да яго асабістага жыцця на ўсіх этапах разбіральніцтва.

3. Дзяржавы-ўдзельніцы імкнуцца спрыяць усталяванню законаў, працэдур, органаў і установаў, што маюць беспасярэдняе дачыненне да дзяцей, якія, як лічыцца, парушылі крымінальнае заканадаўства ці абвінавачваюцца альбо прызнаюцца вінаватымі ў такім парушэнні і, у прыватнасці:

(a) вызначэнню мінімальнага ўзросту, ніжэй за які дзіця не можа лічыцца дзеяздольным адносна парушэння крымінальнага заканадаўства;

(b) у адпаведных і пажаданых выпадках — меры адносна такіх дзяцей без выкарыстання судовых разбіральніцтваў пры поўным шанаванні правоў чалавека і прававых гарантый.

4. Неабходная наяўнасць такіх мерапрыемстваў, як догляд, пастановы аб апецы і наглядзе, кансультацыі, прызначэнне выпрабавальнага тэрміну, выхаванне, праграмы навучання і прафесійнай падрыхтоўкі і іншыя формы догляду, якія замяняюць догляд ва ўстановах, з мэтай забеспячэння такога абыходжання з дзіцем, якое адпавядала б яго дабрабыту, а таксама яго становішчу і характару злачынства.

**Артыкул 41**

Нічога ў дадзенай Канвенцыі не прымяншае пастаноў, якія ў большай ступені спрыяюць выкананню правоў дзіцяці і якія могуць утрымлівацца ў:

(a) заканадаўстве дзяржавы-ўдзельніцы; ці

(b) міжнародным заканадаўстве, якое дзейнічае адносна дадзенай дзяржавы.

(...)

# КАНВЕНЦЫЯ АБ ПРАВАХ АСОБАЎ З ІНВАЛІДНАСЦЮ

Уступіла ў сілу 3 мая 2008 г. *(вытрымкі)*

---

**ПРЭАМБУЛА**

Дзяржавы-ўдзельніцы дадзенай Канвенцыі,

(a) нагадваючы аб прынцыпах, абвешчаных у Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якія прызнаюць годнасць і вартасць, уласцівыя ўсім членам чалавечай сям'і, і іх роўныя і неад'емныя правы за аснову свабоды, справядлівасці і міру ва ўсім свеце,

(b) прызнаючы, што Арганізацыя Аб'яднаных Нацый ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і ў Міжнародных пактах аб правах чалавека абвясціла і пагадзілася, што кожны чалавек валодае ўсімі правамі і свабодамі, у іх прадугледжанымі, без усякага кшталту адрозненняў,

(c) пацвярджаючы ўсеагульнасць, непадзельнасць, узаемазалежнасць і ўзаемазвязанасць усіх правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама неабходнасць гарантаваць інвалідам поўнае карыстанне імі без дыскрымінацыі,

(d) спасылаючыся на Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнародную канвенцыю аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, Канвенцыю супраць катавання ды іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжальных для годнасці формаў абыходжання ці пакарання, Канвенцыю аб правах дзіцяці і Міжнародную канвенцыю аб абароне правоў усіх працоўных мігрантаў і іх сем'яў,

(e) прызнаючы, што інваліднасць як канцэпцыя змяняецца і што інваліднасць з'яўляецца вынікам узаемадзеяння людзей, якія маюць парушэнні здароўя, і асяродкавых бар'ераў і бар'ераў у адносінах, які замінае іх усебаковаму і дзейснаму ўдзелу ў жыцці грамадства нароўні з усімі астатнімі людзьмі,

(...)

**Артыкул 1. Мэта**

Мэта дадзенай Канвенцыі — заахвочванне, абарона і забеспячэнне ўсебаковага і поўнага ажыццяўлення ўсімі асобамі з інваліднасцю ўсіх правоў чалавека і асноўных свабодаў, а таксама заахвочванне шанавання ўласцівай ім годнасці.

Да асобаў з інваліднасцю адносяцца асобы з устойлівымі фізічнымі, псіхічнымі, разумовымі ці сэнсарнымі парушэннямі, якія ў спалучэнні з рознымі існымі бар'ерамі могуць перашкаджаць усебаковаму і дзейснаму ўдзелу асобаў з інваліднасцю ў жыцці грамадства нароўні з астатнімі людзьмі.

**Артыкул 2. Азначэнні**

Для мэтаў дадзенай Канвенцыі:

зносіны ўключаюць выкарыстанне мовы, тэкстаў, азбукі Брайля, тактыльных зносін, буйнога шрыфту, даступных мультымедыйных сродкаў, а таксама пісьмовых матэрыялаў, аўдыёсродкаў, звычайнай мовы, чытачоў, а таксама ўзмацняльных і альтэрнатыўных метадаў, спосабаў і фарматаў зносін, уключна з інфармацыйна-камунікацыйнай тэхналогіяй;

мова ўключае размоўную мову ці мігі (мову жэстаў) і іншыя формы неразмоўных моваў;

дыскрымінацыя на падставе інваліднасці значыць любое адрозненне, выключэнне ці абмежаванне на падставе інваліднасці, якое мае на мэце ці вынікам прымяншэнне ці адмаўленне прызнання, рэалізацыі ці ажыццяўлення нароўні з астатнімі ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, культурнай, грамадскай ці іншых галінах. Яна ўключае ўсе формы дыскрымінацыі, а таксама адмаўленне ў разумным уладкаванні;

разумнае ўладкаванне значыць унясенне, калі гэта трэба і ў канкрэтным выпадку, неабходных і адпаведных змяненняў, паправак і карэктываў, якія не становяцца несувымерным ці неапраўданым цяжарам, з мэтай забеспячэння рэалізацыі ці ажыццяўлення асобамі з інваліднасцю нароўні з астатнімі правоў чалавека і асноўных свабод;

універсальны дызайн азначае дызайн прадметаў, асяроддзяў, праграм і паслуг, пакліканы зрабіць іх як мага больш прыдатнымі да выкарыстання для ўсіх людзей без неабходнасці адаптацыі ці адмысловага дызайну. Універсальны дызайн не выключае дапаможных прыладаў для пэўных груп асоб, дзе гэта патрабуецца.

**Артыкул 3. Агульныя прынцыпы**

Прынцыпамі дадзенай Канвенцыі з’яўляюцца:

(a) павага да годнасці, уласцівай чалавечай асобе, асабістай незалежнасці і самастойнасці, уключна са свабодай рабіць свой уласны выбар;
(b) недыскрымінацыя;
(c) усебаковы і дзейсны ўдзел і далучэнне да грамадства;
(d) шанаванне асаблівасцяў асобаў з інваліднасцю і прыняцце такіх асобаў як часткі людской разнастайнасці і часткі чалавецтва;
(e) роўнасць магчымасцяў;
(f) даступнасць;
(g) роўнасць мужчын і жанчын;
(h) шанаванне здольнасцяў дзяцей з інваліднасцю і шанаванне права дзяцей з інваліднасцю захоўваць сваю індывідуальнасць.

**Артыкул 4. Агульныя абавязальніцтвы**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць і заахвочваюць усебаковае выкананне правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх асобаў з інваліднасцю без любога кшталту дыскрымінацыі на падставе інваліднасці. З гэтай мэтай дзяржавы-ўдзельніцы абавязуюцца:

(a) прымаць усе належныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя ды іншыя меры для выканання правоў, прызнаных у дадзенай Канвенцыі;
(b) прымаць усе належныя меры, уключна з заканадаўчымі, з мэтай змянення ці адмены наяўных законаў, пастаноў, традыцый і звычаяў, якія ўяўляюць дыскрымінацыю ў адносінах да асобаў з інваліднасцю;
(c) улічваць ва ўсіх стратэгіях і праграмах абарону і заахвочванне правоў чалавека асобаў з інваліднасцю;
(d) устрымлівацца ад усялякіх дзеянняў ці дзейнасці, якія супярэчаць дадзенай Канвенцыі, і забяспечыць, каб органы дзяржаўнай улады і ўстановы дзейнічалі згодна з дадзенай Канвенцыяй;
(e) прымаць усе належныя меры для ліквідацыі дыскрымінацыі на падставе інваліднасці з боку якойсьці асобы, арганізацыі ці прыватнага прадпрыемства;
(f) ладзіць ці заахвочваць даследчыцкую і канструктарскую распрацоўку тавараў, паслуг і абсталявання універсальнага дызайну, які вызначаны ў артыкуле 2 дадзенай Канвенцыі, якія вымагалі б мінімальнай адаптацыі і найменшых коштаў для асаблівых патрэб асобаў з інваліднасцю, заахвочваць іх даступнасць і выкарыстанне, а таксама прасоўваць ідэю універсальнага дызайну ў распрацоўцы стандартаў і кіруючых прынцыпаў;
(g) ладзіць ці заахвочваць даследчыцкую і канструктарскую распрацоўку, а таксама заахвочваць даступнасць і выкарыстанне новых тэхналогій, уключна з інфармацыйнымі і камунікацыйнымі, сродкаў, якія палягчаюць мабільнасць, прыладаў і асістыўных тэхналогій, зручных для асобаў з інваліднасцю, аддаючы перавагу прымальным сваім коштам тэхналогіям;
(h) забяспечваць асобам з інваліднасцю даступную інфармацыю пра сродкі, якія палягчаюць мабільнасць, прылады і асістыўныя тэхналогіі, уключна з новымі тэхналогіямі, а таксама пра іншыя формы дапамогі, дапаможныя паслугі і аб’екты;
(i) заахвочваць падрыхтоўку прафесіяналаў і персаналу, якія працуюць з асобамі з інваліднасцю, у сферы правоў, прызнаных у дадзенай Канвенцыі, каб забяспечыць лепшую дапамогу і паслугі, гарантаваныя гэтымі правамі.

2. Адносна эканамічных, сацыяльных і культурных правоў кожная дзяржава-ўдзельніца прымае меры, максімальна выкарыстоўваючы свае рэсурсы, а таксама, дзе патрабуецца, у рамках міжнароднага супрацоўніцтва з мэтай дасягнення паступовага ўсебаковага выканання гэтых правоў без шкоды абавязальніцтвам, што ўтрымліваюцца ў дадзенай Канвенцыі і якія беспасярэдне ўжываюцца згодна з міжнародным правам.
3. Пры распрацоўцы і ўжыванні заканадаўства і стратэгіяў з мэтай выканання дадзенай Канвенцыі і ў рамках іншых працэсаў прыняцця рашэнняў у пытаннях, што датычаць асобаў з інваліднасцю, дзяржавы-ўдзельніцы шчыльна кансультуюцца і актыўна задзейнічаюць інвалідаў, уключна з дзецьмі з інваліднасцю, праз арганізацыі, што іх прадстаўляюць.
4. Нічога ў дадзенай Канвенцыі не закранае негатыўным чынам якіхсьці пастаноў, якія ў большай ступені спрыяюць рэалізацыі правоў асобаў з інваліднасцю і якія могуць утрымлівацца ў заканадаўстве дзяржавы-ўдзельніцы ці ў нормах міжнароднага права, якія дзейнічаюць у адносінах да дадзенай дзяржавы. Не дапускаецца ніякае абмежаванне ці прымяншэнне любых правоў чалавека і асноўных свабод, прызнаных ці наяўных у якой-небудзь дзяржаве-ўдзельніцы дадзенай Канвенцыі згодна з законам,

канвенцыямі, правіламі ці звычаямі на той падставе, што ў дадзенай Канвенцыі не прызнаюцца такія правы і свабоды ці яны прызнаюцца ў ёй у меншай меры.
5. Умовы дадзенай Канвенцыі распаўсюджваюцца на ўсе суб'екты федэратыўных дзяржаў без абмежаванняў ці выключэнняў.

**Артыкул 5. Роўнасць і недыскрымінацыя**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што ўсе людзі роўныя перад законам і што згодна з законам яны маюць права на роўную абарону закона і роўнае ім карыстанне без усякай дыскрымінацыі.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы забараняюць усе віды дыскрымінацыі на падставе інваліднасці і гарантуюць асобам з інваліднасцю роўную і дзейсную прававую абарону супраць дыскрымінацыі на ўсіх падставах.
3. Каб заахвоціць роўнасць і ліквідаваць дыскрымінацыю, дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры з мэтай забеспячэння разумнага ўладкавання.
4. Асаблівыя меры, неабходныя для паскарэння ці дасягнення фактычнай роўнасці асобаў з інваліднасцю, не лічацца дыскрымінацыйнымі згодна з умовамі дадзенай Канвенцыі.

**Артыкул 6. Жанчыны з інваліднасцю**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што жанчыны і дзяўчаты з інваліднасцю з'яўляюцца ахвярамі шматбаковай дыскрымінацыі, і ў сувязі з гэтым прымаюць меры, каб забяспечыць ім поўнае і роўнае карыстанне ўсімі правамі чалавека і асноўнымі свабодамі.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры, каб забяспечыць усебаковае развіццё, паляпшэнне становішча і пашырэння правоў і магчымасцяў жанчын, каб гарантаваць ім ажыццяўленне і рэалізацыю правоў чалавека і асноўных свабод, прадугледжаных у дадзенай Канвенцыі.

**Артыкул 7. Дзеці з інваліднасцю**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе неабходныя меры, каб забяспечыць дзецям з інваліднасцю ўсебаковае карыстанне правамі чалавека і асноўнымі свабодамі нароўні з астатнімі дзецьмі.
2. У любых дзеяннях у адносінах да дзяцей з інваліднасцю найперш улічваюцца найвышэйшыя інтарэсы дзяцей.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць дзецям з інваліднасцю права вольна выяўляць свае погляды на ўсе пытанні, што іх датычаць, нароўні з астатнімі дзецьмі, дзе такім поглядам надаецца належная важкасць згодна з іх узростам і сталасцю, а таксама права на дапамогу, якая адпавядае інваліднасці і ўзросту, у рэалізацыі гэтага права.

**Артыкул 8. Падвышэнне інфармаванасці**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць неадкладныя, дзейсныя і належныя меры для таго, каб:

(a) павышаць інфармаванасць грамадскасці, у тым ліку і на ўзроўні сям'і, у пытаннях інваліднасці, а таксама выхоўваць павагу да правоў і годнасці асобаў з інваліднасцю;
(b) змагацца са стэрэатыпамі, забабонамі і шкоднымі звычаямі ў адносінах да асобаў з інваліднасцю, у тым ліку на падставе полавай прыналежнасці і ўзросту, ва ўсіх жыццёвых сферах;
(c) прапагандаваць патэнцыял і ўнёсак асобаў з інваліднасцю.

2. Такія меры ўключаюць:

(a) распачынанне і падтрымку эфектыўных грамадска-асветных кампаній, закліканых:
(i) выхоўваць успрымальнасць да правоў асобаў з інваліднасцю;
(ii) заахвочваць пазітыўныя ўяўленні пра асобаў з інваліднасцю і больш глыбокае іх разуменне грамадствам;
(iii) заахвочваць прызнанне ўменняў, вартасцяў і здольнасцяў асобаў з інваліднасцю, а таксама іх унёску на працоўным месцы і рынку працы;
(b) выхаванне на ўсіх узроўнях сістэмы адукацыі, у тым ліку і ва ўсіх дзяцей з ранняга ўзросту, павагі да правоў асобаў з інваліднасцю;
(c) заахвочванне ўсіх органаў масавай інфармацыі да такога паказу асобаў з інваліднасцю, якое адпавядае мэце дадзенай Канвенцыі;
(d) заахвочванне адукацыйных праграм, прысвечаных асобам з інваліднасцю і іх правам.

**Артыкул 9. Даступнасць**

1. Каб даць асобам з інваліднасцю магчымасць жыць незалежна і браць усебаковы ўдзел ва ўсіх аспектах жыцця, дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры, каб забяспечыць асобам з інваліднасцю доступ, нароўні з астатнімі, да фізічнага асяроддзя, транспарту, да інфармацыі і сродкаў сувязі, уключна з інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі і сістэмамі, а таксама да іншых аб'ектаў і паслуг, адкрытых ці даступных для насельніцтва як у гарадской, так і ў сельскай мясцовасці. Гэтыя меры, якія ўключаюць вызначэнне і ліквідацыю перашкод і бар'ераў, што замінаюць даступнасці, мусяць распаўсюджвацца, у прыватнасці, на наступнае:

(a) будынкі, дарогі, транспарт і іншыя ўнутраныя ды вонкавыя аб'екты, уключаючы школы, жылыя памяшканні, медыцынскія ўстановы і працоўныя месцы;

(b) інфармацыйныя, камунікацыйныя і іншыя службы, уключна з электроннымі ды экстранымі службамі.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы таксама прымаюць належныя меры дзеля таго, каб:

(a) распрацоўваць мінімальныя стандарты і прынцыпы, якія прадугледжваюць даступнасць аб'ектаў і паслуг, адкрытых для насельніцтва, уводзіць іх у дзеянне і сачыць за іх выкананнем;

(b) забяспечваць, каб прыватныя прадпрыемствы, якія прапануюць аб'екты ці паслугі, адкрытыя ці даступныя насельніцтву, улічвалі ўсе аспекты іх даступнасці для асобаў з інваліднасцю;

(c) арганізоўваць для ўсіх зацікаўленых бакоў інструктаж па праблемах даступнасці, з якімі сутыкаюцца асобы з інваліднасцю;

(d) абсталёўваць будынкі ды іншыя аб'екты, адкрытыя для насельніцтва, знакамі паводле азбукі Брайля ў лёгкачытанай і зразумелай форме;

(...)

**Артыкул 10. Права на жыццё**

Дзяржавы-ўдзельніцы зноў пацвярджаюць неад'емнае права кожнай чалавечай асобы на жыццё і прымаюць усе неабходныя меры, каб забяспечыць дзейснае яго выкананне для асобаў з інваліднасцю нароўні з астатнімі.

**Артыкул 11. Сітуацыі рызыкі і надзвычайныя гуманітарныя сітуацыі**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць у адпаведнасці са сваімі абавязальніцтвамі па міжнародным праве, уключна з міжнародным гуманітарным правам і міжнародным заканадаўствам па правах чалавека, усе неабходныя меры, каб забяспечыць абарону і бяспеку асобаў з інваліднасцю ў сітуацыях рызыкі, уключна са збройнымі канфліктамі, надзвычайнымі гуманітарнымі сітуацыямі і стыхійнымі бедствамі.

**Артыкул 12. Роўнасць перад законам**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць, што кожная асоба з інваліднасцю, дзе б яна ні перабывала, мае права на прызнанне яе правасуб'ектнасці перад законам.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што асобы з інваліднасцю маюць правinduздольнасць нароўні з астатнімі ва ўсіх жыццёвых аспектах.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры, каб забяспечыць доступ асобам з інваліднасцю да падтрымкі, якая ім можа спатрэбіцца ў выкарыстанні сваёй правaздольнасці.
4. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб усе меры, што адносяцца да рэалізацыі правaздольнасці, прадугледжвалі належныя і дзейсныя гарантыі прадухілення злоўжыванняў згодна з міжнародным заканадаўствам па правах чалавека. Такія гарантыі забяспечваюць, каб меры, якія адносяцца да рэалізацыі праваздольнасці, арыентаваліся на шанаванне правоў, волі і перавагаў асобы, былі свабодныя ад канфлікту інтарэсаў і недарэчнага ўплыву, былі сувымернымі са становішчам гэтай асобы і падладжаныя пад яго, ужываліся цягам як найкарацейшага часу і рэгулярна правяраліся кампетэнтным, незалежным і бесстароннім органам ці судовай інстанцыяй. Гэтыя гарантыі мусяць быць сувымерныя са ступенню, у якой такія меры закранаюць правы і інтарэсы асобы.
5. Улічваючы ўмовы дадзенага артыкула, дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя і дзейсныя меры, каб забяспечыць асобам з інваліднасцю роўнае права валодаць маёмасцю і спадкаваць яе, кіраваць сваімі ўласнымі фінансавымі справамі і мець роўны доступ да банкавых пазык, іпатэчных крэдытаў ці да іншых формаў пазык, і забяспечваюць, каб ніхто адвольна не мог пазбавіць асобу з інваліднасцю яе маёмасці.

**Артыкул 13. Доступ да правасуддзя**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць асобам з інваліднасцю нароўні з астатнімі дзейсны доступ да правасуддзя, у тым ліку прадугледжваючы працэсуальныя і адпаведныя ўзросту карэктывы, каб палегчыць іх эфектыўную ролю як непасрэдных і апасродкаваных удзельнікаў, у тым ліку сведкаў, на ўсіх стадыях юрыдычнага працэсу, уключна са стадыяй расследавання і іншымі стадыямі папярэдняй вытворчасці.
2. Каб спрыяць забеспячэнню асобам з інваліднасцю дзейснага доступу да правасуддзя, дзяржавы-ўдзельніцы спрыяюць належнай падрыхтоўцы асоб, якія працуюць у сферы ажыццяўлення правасуддзя, у тым ліку ў паліцыі і ў сістэме выканання пакаранняў.

**Артыкул 14. Свабода і асабістая недатыкальнасць**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб асобы з інваліднасцю на роўных правах з астатнімі:

(a) карысталіся правам на волю і асабістую недатыкальнасць;

(b) не пазбаўляліся волі незаконна ці адвольна і каб любое пазбаўленне волі адбывалася згодна з законам і наяўнасць інваліднасці ніякім чынам не станавілася падставай для пазбаўлення волі.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб у тым выпадку, калі асобаў з інваліднасцю пазбаўляюць волі на падставе якойсьці працэдуры, ім нароўні з астатнімі даваліся гарантыі згодна з міжнародным заканадаўствам па правах чалавека і з імі абыходзіліся

адпаведна мэтам і прынцыпам дадзенай Канвенцыі, уключна з забеспячэннем ім разумнага ўладкавання.

**Артыкул 15. Свабода ад катавання і жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання**

1. Ніхто не павінен быць прадметам жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання. У прыватнасці, ніхто не павінен быць прадметам медыцынскіх ці навуковых доследаў без сваёй свабоднай згоды.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе дзейсныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, судовыя ці іншыя меры да таго, каб асобы з інваліднасцю, нароўні з астатнімі, не станавіліся ахвярамі катаванняў ці жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання ці пакарання.

**Артыкул 16. Свабода ад эксплуатацыі, гвалту і злоўжыванняў**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, сацыяльныя, асветніцкія ды іншыя меры, каб абараніць асобаў з інваліднасцю, як у іх прыватным жытле, так і па-за ім, ад усіх формаў эксплуатацыі, гвалту і злоўжыванняў, уключна з тымі, што чыняцца на гендэрнай падставе.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы таксама прымаюць усе належныя меры, каб прадухіліць усе формы эксплуатацыі, гвалту і злоўжыванняў, забяспечваючы, у прыватнасці, аказанне дапамогі, што ўлічвае ўзростава-полавую спецыфіку, падтрымкі іх сем'ям і асобам, якія даглядаюць асобаў з інваліднасцю, таксама забяспечваючы іх інфармацыяй і навыкамі таго, як пазбягаць, вызначаць і паведамляць пра выпадкі эксплуатацыі, гвалту ці злоўжыванняў. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб паслугі, якія тычацца абароны асобаў з інваліднасцю, аказваліся з улікам узростава-полавай спецыфікі і фактару інваліднасці.
(...)

**Артыкул 17 Ахова асабістай цэласнасці**

Кожная асоба з інваліднасцю мае права на павагу да яго фізічнай і псіхічнай цэласнасці нароўні з астатнімі.

**Артыкул 18. Свабода перамяшчэння і выбару грамадзянства**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць правы асобаў з інваліднасцю на свабоду перамяшчэння, свабоду выбіраць месца жыхарства і грамадзянства нароўні з астатнімі, уключна з наступнымі гарантыямі:

(a) асобы з інваліднасцю маюць права на атрыманне і змену грамадзянства і не могуць пазбаўляцца грамадзянства адвольна ці на падставе інваліднасці;
(b) асобы з інваліднасцю не пазбаўляюцца на падставе інваліднасці магчымасці атрымліваць, валодаць і карыстацца дакументамі, што пацвярджаюць іх грамадзянства, ці іншымі дакументамі, што пацвярджаюць іх асобу, ці выкарыстоўваць адпаведныя працэдуры, напрыклад, іміграцыйныя, якія могуць быць неабходнымі, каб аблегчыць выкарыстанне права на свабоду перамяшчэння;
(c) асобы з інваліднасцю могуць свабодна пакідаць любую краіну, уключна са сваёй уласнай;
(d) асобы з інваліднасцю не пазбаўляюцца, адвольна ці на падставе інваліднасці, права вольна ўязджаць у сваю краіну.

2. Дзеці з інваліднасцю рэгіструюцца адразу пасля нараджэння і ад нараджэння маюць права на імя і на атрыманне грамадзянства і, наколькі гэта магчыма, права ведаць сваіх бацькоў і права на іх клопат.

**Артыкул 19. Самастойны лад жыцця і ўключанасць у жыццё супольнасці**

Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць роўнае права ўсіх асобаў з інваліднасцю жыць у супольнасці з астатнімі людзьмі пры роўных з іншымі людзьмі варыянтах выбару і прымаюць дзейсныя і належныя меры, каб спрыяць поўнаму выкарыстанню асобамі з інваліднасцю гэтага права і іх поўнаму залучэнню ва ўдзел у жыцці супольнасці, забяспечваючы таксама наступнае:

(a) каб асобы з інваліднасцю мелі магчымасць выбіраць сабе месца жыхарства і тое, дзе і з кім жыць, нароўні з астатнімі і не былі абавязанымі жыць у нейкіх адмысловых жыллёвых умовах;
(b) каб асобы з інваліднасцю мелі доступ да паслуг, якія аказваюцца дома, па месцы жыхарства, ці да іншых дапаможных паслуг, уключна з асабістай дапамогай, неабходнай для падтрымання жыцця ў мясцовай супольнасці і залучэння ў яе, а таксама для недапушчэння ізаляцыі ці аддзялення ад мясцовай супольнасці;
(c) каб паслугі і аб'екты калектыўнага карыстання былі даступнымі асобам з інваліднасцю нароўні з астатнімі і адпавядалі іх патрэбам.

**Артыкул 20. Асабістая мабільнасць**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць дзейсныя меры, каб забяспечыць асобам з інваліднасцю асабістую мабільнасць з максімальна магчымай ступенню іх самастойнасці, у тым ліку шляхам:

(a) спрыянне асабістай мабільнасці асобаў з інваліднасцю зручным для іх спосабам, у зручны для іх час і даступным для іх коштам;
(b) спрыяння доступу асобаў з інваліднасцю да якасных сродкаў, што палягчаюць мабільнасць, прыладаў, асістыўных тэхналогій і паслуг памочнікаў і пасярэднікаў, у тым ліку надаючы ім паслугі па даступным для асобаў з інваліднасцю кошце;
(c) навучання асобаў з інваліднасцю і спецыялістаў, што з імі працуюць, навыкам мабільнасці;
(d) заахвочвання прадпрыемстваў, якія займаюцца вытворчасцю сродкаў, што палягчаюць мабільнасць, прыладаў і асістыўных тэхналогій, да ўліку ўсіх аспектаў мабільнасці асобаў з інваліднасцю.

**Артыкул 21. Свабода выказвання і свабода думкі ды доступу да інфармацыі**

Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры, каб забяспечыць асобам з інваліднасцю магчымасць карыстацца правам на свабоду выказвання і думкі, уключна са свабодай шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю ды погляды нароўні з астатнімі, карыстаючыся ўсімі формамі зносін на свой выбар, прадугледжанымі ў артыкуле 2 дадзенай Канвенцыі, уключна з наступнымі мерамі:
(a) забеспячэнне асобаў з інваліднасцю інфармацыяй, прызначанай для шырокай грамадскасці, у даступных фарматах і з выкарыстаннем тэхналогій, што адпавядаюць розным відам інваліднасці, своечасова і без дадатковай аплаты;
(b) прыманне і спрыянне карыстанню ў афіцыйных зносінах мігамі (моваю жэстаў), азбукай Брайля, узмацняльнымі і альтэрнатыўнымі спосабамі зносін і ўсімі астатнімі даступнымі сродкамі, метадамі і фарматамі зносін на выбар асобаў з інваліднасцю;
(c) пабуджэнне прыватных прадпрыемстваў, якія аказваюць паслугі шырокай грамадскасці, у тым ліку і праз Інтэрнэт, забяспечваць інфармацыю і паслугі ў даступных і прыдатных для асобаў з інваліднасцю фарматах;
(d) заахвочванне сродкаў масавай інфармацыі, уключна з тымі, што перадаюць інфармацыю праз Інтэрнэт, рабіць свае паслугі даступнымі для асобаў з інваліднасцю;
(e) прызнанне і заахвочванне выкарыстання мігаў (мовы жэстаў).

**Артыкул 22. Недатыкальнасць асабістага жыцця**

1. Ніякая асоба з інваліднасцю, дзе б і ў якіх жыллёвых умовах яна ні жыла, не можа быць аб'ектам адвольнага ці незаконнага ўмяшальніцтва ў яго ці яе асабістае, сямейнае жыццё, жытло ці ліставанне ці іншыя віды зносін; альбо прадметам незаконных замахаў на яго ці яе гонар і рэпутацыю. Асобы з інваліднасцю маюць права на абарону закона ад такога ўмяшальніцтва ці замахаў.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы ахоўваюць канфідэнцыйнасць звестак пра асобу, стан здароўя і рэабілітацыі асобаў з інваліднасцю нароўні з астатнімі.

**Артыкул 23. Шанаванне дома і сям'і**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць дзейсныя і належныя меры для ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да асобаў з інваліднасцю ва ўсіх пытаннях, што датычаць узяцця шлюбу, пытанняў сям'і, бацькоўства ці асабістых зносін, нароўні з астатнімі, каб забяспечыць наступнае:
(a) прызнанне права ўсіх асобаў з інваліднасцю, якія дасягнулі шлюбнага ўзросту, на ўзяцце шлюбу і заснаванне сям'і на аснове вольнай і ўзаемнай згоды партнёраў;
(b) прызнанне правоў асобаў з інваліднасцю вольна і адказна вырашаць пра колькасць дзяцей і прамежкі часу паміж іх нараджэннем, а таксама права на доступ да інфармацыі, што адпавядае іх узросту і датычыць планавання сям'і і рэпрадукцыйных паводзін, і забеспячэнне сродкаў, неабходных для карыстання гэтымі правамі;
(c) прызнанне права асобаў з інваліднасцю, уключна з дзецьмі, захоўваць сваю здольнасць да працягу роду нароўні з астатнімі.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць правы і абавязкі асобаў з інваліднасцю адносна апякунства, папячыцельства, даверніцтва, усынаўлення ці ўдачкавання дзяцей ды іншых падобных інстытутаў, калі такія паняцці існуюць у нацыянальным заканадаўстве; ва ўсіх выпадках на першае месца ставяцца інтарэсы дзяцей. Дзяржавы-ўдзельніцы аказваюць асобам з інваліднасцю належную дапамогу ў выкананні іх выхаваўчых абавязкаў.
(...)

**Артыкул 24. Адукацыя**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права асобаў з інваліднасцю на адукацыю. З мэтай рэалізацыі гэтага права без дыскрымінацыі і на падставе роўных магчымасцяў дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць інклюзіўную адукацыю на ўсіх узроўнях і навучанне цягам усяго жыцця, імкнучыся пры гэтым:
(a) да ўсебаковага развіцця чалавечага патэнцыялу і пачуцця годнасці, самапавагі і ўзмацнення павагі да правоў чалавека, асноўных свабод і чалавечай разнастайнасці;
(b) да развіцця асобы, талентаў і творчасці асобаў з інваліднасцю, а таксама як найпаўнейшага развіцця іх разумовых і фізічных здольнасцяў;
(c) даваць магчымасць асобам з інваліднасцю браць дзейсны ўдзел у жыцці свабоднага грамадства.

2. Пры рэалізацыі гэтага права дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць, каб:
(a) асобы з інваліднасцю не выдаляліся з прычыны сваёй інваліднасці з сістэмы агульнай адукацыі, а таксама каб дзеці з інваліднасцю не выдаляліся з сістэмы бясплатнай абавязковай пачатковай адукацыі ці сярэдняй адукацыі на падставе сваёй інваліднасці;
(b) асобы з інваліднасцю мелі доступ да інклюзіўнай, якаснай і бясплатнай пачатковай адукацыі і сярэдняй адукацыі нароўні з астатнімі членамі супольнасці, у якой яны жывуць;
(c) асобам з інваліднасцю забяспечвалася разумнае ўладкаванне з улікам асабістых патрэб;
(d) асобам з інваліднасцю забяспечвалася патрэбная падтрымка ў сістэме агульнай адукацыі, каб аблегчыць іх эфектыўнае навучанне;
(e) асобам з інваліднасцю забяспечваліся эфектыўныя меры па арганізацыі асабістай падтрымкі ў асяроддзі, якое максімальна спрыяе засваенню ведаў і сацыяльнаму развіццю згодна з мэтай поўнай ахопленасці.
(...)

**Артыкул 25. Здароўе**

Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права асобаў з інваліднасцю на найлепшы дасяжны стан здароўя без дыскрымінацыі на падставе інваліднасці. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры, каб забяспечыць асобам з інваліднасцю доступ да медыцынскіх паслуг, якія ўлічваюць гендэрную спецыфіку, уключна з рэабілітацыяй паводле стану здароўя. У прыватнасці, дзяржавы-ўдзельніцы:
(a) забяспечваюць асобаў з інваліднасцю тым самым наборам, якасцю і стандартам бясплатных ці даступных коштам праграм па ахове здароўя, што і іншых асоб, у тым ліку ў галіне сексуальнага і рэпрадукцыйнага здароўя, а таксама праграм па ахове здароўя, якія прапаноўваюцца насельніцтву;
(b) забяспечваюць асобам з інваліднасцю такія медыцынскія паслугі, якія неабходныя асобам з інваліднасцю непасрэдна з прычыны іх інваліднасці, уключна з ранняй дыягностыкай, а ў пэўных выпадках — карэкцыю і паслугі, пакліканыя звесці да мінімуму і прадухіліць далейшае ўзнікненне інваліднасці, у тым ліку сярод дзяцей і пажылых людзей;
(c) арганізуюць гэтыя паслугі ў сферы аховы здароўя максімальна блізка ад месца жыхарства гэтых людзей, уключна з сельскай мясцовасцю;
(d) патрабуюць, каб спецыялісты аховы здароўя забяспечвалі асобаў з інваліднасцю паслугамі той самай якасці, што і астатніх, у тым ліку і на аснове свабоднай і інфармаванай згоды, шляхам, у прыватнасці, павышэння дасведчанасці ў правах чалавека, годнасці, самастойнасці і патрэб асобаў з інваліднасцю праз інфармаванне і прыняцце этычных стандартаў для прыватнай і дзяржаўнай сферы аховы здароўя;
(e) забараняюць дыскрымінацыю ў адносінах да асобаў з інваліднасцю падчас страхавання здароўя і страхавання жыцця, калі такое страхаванне прадугледжваецца нацыянальным заканадаўствам, і гарантуюць, каб страхаванне адбывалася на справядлівай і разумнай аснове;
(f) не дапускаюць дыскрымінацыйнага адмаўлення ў ахове здароўя ці медыцынскіх паслугах і ў атрыманні ежы і вадкасцяў на падставе інваліднасці.

**Артыкул 26. Абілітацыя і рэабілітацыя**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць дзейсныя і належныя меры, у тым ліку і пры падтрымцы з боку іншых асобаў з інваліднасцю, каб даць магчымасць іншым асобам з інваліднасцю дасягнуць і захаваць максімальную незалежнасць, поўныя фізічныя, разумовыя, сацыяльныя і прафесійныя здольнасці, а таксама поўнае залучэнне і ўдзел ва ўсіх жыццёвых аспектах. З гэтай мэтай дзяржавы-ўдзельніцы арганізоўваюць, узмацняюць і пашыраюць комплексныя абілітацыйныя і рэабілітацыйныя праграмы і паслугі, асабліва ў сферах здароўя, працаўладкавання, адукацыі і сацыяльных паслуг такім спосабам, каб гэтыя паслугі і праграмы:
(a) пачыналіся на максімальна ранняй стадыі жыцця і засноўваліся на шматпрофільнай ацэнцы асабістых патрэб і моцных бакоў індывіда;
(b) падтрымлівалі ўдзел і залучэнне ў мясцовую супольнасць і ва ўсе аспекты жыцця грамадства, мелі добраахвотны характар, былі даступнымі асобам з інваліднасцю як мага бліжэй да месца іх жыхарства, уключна з сельскімі мясцовасцямі.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваюць развіццё пачатковага і далейшага навучання спецыялістаў і персаналу, які працуе ў сферы абілітацыйных і рэабілітацыйных паслуг.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваюць даступнасць, веды і выкарыстанне асістыўных прылад і тэхналогій, якія распрацаваныя для асобаў з інваліднасцю і адносяцца да абілітацыі і рэабілітацыі.

**Артыкул 27. Праца і працаўладкаванне**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права асобаў з інваліднасцю на працу нароўні з астатнімі; гэтае права ўключае права на магчымасць зарабляць сабе на жыццё працай, якую асоба з інваліднасцю свабодна абрала ці на якую свабодна пагадзілася ў тых умовах, калі працоўны рынак і вытворчае асяроддзе адкрытыя, інклюзіўныя і даступныя такім асобам. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць і заахвочваюць рэалізацыю права

на працу, уключна і для тых, хто атрымаў інваліднасць падчас працоўнай дзейнасці, прымаючы належныя меры, уключна з заканадаўчымі, каб, у прыватнасці:

(a) забараніць дыскрымінацыю на падставе інваліднасці адносна ўсіх пытанняў, што датычаць формаў працаўладкавання, уключна з умовамі набору, найму на працу ці працаўладкавання, працягу працоўнай дзейнасці, росту кар'еры і бяспечнымі і здаровымі працоўнымі ўмовамі;

(b) абараніць правы асобаў з інваліднасцю на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы нароўні з усімі, уключна з роўнымі магчымасцямі і роўнай аплатай за працу аднолькавай каштоўнасці, на бяспечныя і здаровыя ўмовы працы, уключна з абаронай ад дамаганняў, і на задавальненне скаргаў;

(c) забяспечыць, каб асобы з інваліднасцю маглі выконваць свае правы на працу і на аб'яднанне ў прафсаюзы нароўні з астатнімі;

(…)

**Артыкул 28 . Дастатковы жыццёвы ўзровень і сацыяльная абарона**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права асобаў з інваліднасцю на дастатковы жыццёвы стандарт для іх саміх і іх сем'яў, уключна з дастатковым харчаваннем, адзеннем і жытлом, а таксама на пастаяннае паляпшэнне жыллёвых умоў, і прымаюць адпаведныя меры, каб забяспечыць і заахвоціць выкананне гэтага права без дыскрымінацыі на падставе інваліднасці.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права асобаў з інваліднасцю на сацыяльную абарону і на выкананне гэтага права без дыскрымінацыі на падставе інваліднасці і прымаюць належныя меры, каб забяспечыць і заахвоціць выкананне гэтага права, уключна з наступнымі мерамі:

(a) забеспячэнне роўнага доступу асобаў з інваліднасцю да забеспячэння чыстай вадой і забеспячэнне доступу да належных і даступных паслуг, прыладаў ды іншага кшталту дапамогі для патрэб, звязаных з інваліднасцю;

(b) забеспячэнне доступу асобаў з інваліднасцю, у прыватнасці, жанчын і дзяўчатак, а таксама сталых людзей з інваліднасцю, да праграм сацыяльнай абароны і скарачэння маштабаў беднасці;

(c) забеспячэнне доступу асобаў з інваліднасцю і іх сем'яў, якія жывуць ва ўмовах беднасці, да дапамогі ад дзяржавы з мэтай пакрыцця выдаткаў, звязаных з інваліднасцю, уключна з належным навучаннем, кансультаваннем, фінансавай дапамогай і часовым патранажным доглядам;

(d) забеспячэнне доступу асобаў з інваліднасцю да праграм жыллёвага будаўніцтва;

(e) забеспячэнне роўнага доступу асобаў з інваліднасцю да пенсійнай дапамогі і праграм.

**Артыкул 29 . Удзел у палітычным і грамадскім жыцці**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы гарантуюць асобам з інваліднасцю палітычныя правы і магчымасць карыстацца імі нароўні з астатнімі, а таксама абавязуюцца рабіць наступнае:

(a) забяспечваць, каб асобы з інваліднасцю маглі браць дзейсны і поўны ўдзел у палітычным і грамадскім жыцці нароўні з астатнімі, наўпрост ці праз вольна абраных прадстаўнікоў, у тым ліку права і магчымасць абіраць і быць абранымі, у прыватнасці, праз наступныя меры:

(i) забяспечваць, каб працэдуры, памяшканні і матэрыялы для галасавання былі прыдатнымі, даступнымі і лёгкімі для разумення і карыстання;

(ii) забяспечваць абарону права асобаў з інваліднасцю на ўдзел у таемным галасаванні на выбарах і рэферэндумах без запалохвання, а таксама права асобаў з інваліднасцю абірацца, займаць пасады і выконваць усе грамадскія функцыі на ўсіх узроўнях кіравання — пры спрыянні выкарыстання асістыўных і новых тэхналогій, дзе гэта дарэчы;

(iii) гарантаваць свабоднае выяўленне волі асобаў з інваліднасцю як выбарцаў і з гэтай мэтай, дзе неабходна, дазваляць аказанне ім дапамогі ў галасаванні якойсьці асобай на іх выбар;

(b) актыўна спрыяць развіццю асяроддзя, у якім асобы з інваліднасцю могуць браць эфектыўны і поўны ўдзел у кіраванні дзяржаўнымі справамі без дыскрымінацыі і нароўні з астатнімі, а таксама заахвочваць іх удзел у дзяржаўных справах, уключна праз наступныя меры:

(i) удзел у няўрадавых арганізацыях і аб'яднаннях, якія маюць дачыненне да грамадскага і палітычнага жыцця ў краіне, у тым ліку ў дзейнасці палітычных партыяў і кіраванні імі;

(ii) ствараць арганізацыі асобаў з інваліднасцю і далучацца да іх, каб прадстаўляць такіх асобаў на міжнародным, дзяржаўным, рэгіянальным і мясцовых узроўнях.

**Артыкул 30. Удзел у культурным жыцці, адпачынак, вольны час і заняткі спортам**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права асобаў з інваліднасцю браць удзел нароўні з астатнімі ў культурным жыцці і прымаюць усе належныя меры, каб забяспечыць такім асобам:

(a) доступ да твораў культуры ў прыдатных фарматах;

(b) доступ да тэлевізійных праграм, фільмаў, тэатраў ды іншых культурных мерапрыемстваў у даступных фарматах;
(c) доступ да такіх месцаў культурных мерапрыемстваў, як тэатры, музеі, кінатэатры, бібліятэкі і да турыстычных паслуг і, наколькі гэта магчыма, доступ да помнікаў і месцаў нацыянальнага культурнага значэння.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры, каб даць магчымасць асобам з інваліднасцю развіваць і рэалізоўваць свой творчы, мастацкі ды інтэлектуальны патэнцыял не толькі на сваю карысць, але таксама дзеля ўзбагачэння ўсяго грамадства.
3. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе належныя меры ў адпаведнасці з міжнародным правам, з мэтай забяспечыць, каб законы, якія абараняюць правы інтэлектуальнай уласнасці, не станавіліся неадпаведнымі ці дыскрымінацыйнымі бар'ерамі для доступу асобаў з інваліднасцю да твораў культуры.

(...)

**Артыкул 33. Выкананне на нацыянальным узроўні і маніторынг**

1. Дзяржавы-ўдзельніцы ў адпаведнасці са сваім арганізацыйным ладам прызначаюць ва ўрадзе адну ці некалькі інстанцыяў, якія займаюцца пытаннямі выканання дадзенай Канвенцыі, і належным чынам улічваюць магчымасць заснавання ці прызначэння ва ўрадзе каардынацыйнага механізму для спрыяння адпаведнай працы ў розных сектарах і на розных узроўнях.
2. Дзяржавы-ўдзельніцы згодна са сваім прававым і адміністрацыйным ладам падтрымліваюць, узмацняюць, прызначаюць ці засноўваюць структуру, якая ўключае, дзе гэта дарэчы, адзін ці болей незалежных механізмаў для заахвочвання, аховы і маніторынгу выканання дадзенай Канвенцыі. Падчас прызначэння ці заснавання такіх механізмаў дзяржавы-ўдзельніцы бяруць да ўвагі прынцыпы, што адносяцца да статусу і функцыянавання нацыянальных устаноў па абароне і заахвочванню правоў чалавека.
3. Грамадзянская супольнасць, у прыватнасці, асобы з інваліднасцю і іх прадстаўнічыя арганізацыі, залучаюцца і бяруць усебаковы ўдзел у працэсе маніторынгу.

**Артыкул 34. Камітэт па правах асобаў з інваліднасцю**

1. Утвараецца Камітэт па правах асобаў з інваліднасцю (далей у дакуменце — Камітэт), які выконвае ніжэй прыведзеныя функцыі.
2. На момант уступлення дадзенай Канвенцыі ў сілу Камітэт складаецца з дванаццаці экспертаў. Пасля дадатковых шасцідзесяці ратыфікацый ці далучэнняў да дадзенай Канвенцыі склад Камітэта павялічваецца на шэсць членаў, дасягаючы максімуму — васямнаццаці членаў.

(...)

**Артыкул 35 . Даклады дзяржаў-удзельніц**

1. Кожная дзяржава-ўдзельніца праз Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый падае ў Камітэт усёабдымны даклад пра меры, прынятыя ў мэтах выканання абавязкаў паводле дадзенай Канвенцыі, і аб прагрэсе, зробленым у гэтым кірунку цягам двух гадоў пасля ўступлення дадзенай Канвенцыі ў сілу для адпаведнай дзяржавы-ўдзельніцы.
2. Затым дзяржавы-ўдзельніцы адпраўляюць наступныя даклады не менш чым раз на чатыры гады, а таксама калі пра гэта папросіць Камітэт.
3. Камітэт вызначае рэкамендацыі да зместу дакладаў.
4. Дзяржава-ўдзельніца, якая падала свой першы ўсёабдымны даклад у Камітэт, не павінна ў сваіх наступных дакладах паўтараць пададзеную раней інфармацыю. Падчас падрыхтоўкі дакладаў у Камітэт дзяржавам-удзельніцам прапануецца рабіць гэты працэс адкрытым і празрыстым і максімальна ўлічваць палажэнне артыкулу 4.3 дадзенай Канвенцыі.
5. У дакладах могуць утрымлівацца фактары і цяжкасці, якія ўплываюць на ступень выканання абавязальніцтваў паводле дадзенай Канвенцыі.

(...)

# ДЭКЛАРАЦЫЯ АБ ПРАВЕ І АБАВЯЗКУ АСОБ, ГРУП ЦІ ГРАМАДСКІХ ОРГАНАЎ ЗААХВОЧВАЦЬ І АБАРАНЯЦЬ УСЕАГУЛЬНА ПРЫЗНАНЫЯ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА І АСНОЎНЫЯ СВАБОДЫ (ДЭКЛАРАЦЫЯ ААН АБ ПРАВААБАРОНЦАХ)

Ухваленая рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі 53/144 ад 9 снежня 1998 г.

---

Генеральная Асамблея,

пацвярджаючы важнае значэнне выканання мэтаў і прынцыпаў Статута Арганізацыі Аб’яднаных Нацый для заахвочвання і абароны ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод усіх людзей ва ўсіх краінах свету,

пацвярджаючы важнае значэнне Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і Міжнародных пактаў аб правах чалавека як асноўных элементаў міжнародных высілкаў для спрыяння міжнароднай павазе і выкананню правоў чалавека і асноўных свабод і важнасць дакументаў па правах чалавека, ухваленых у рамках сістэмы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, а таксама на рэгіянальным узроўні,

падкрэсліваючы, што ўсе члены міжнароднай супольнасці мусяць выконваць, супольна з іншымі і паасобку, свой урачысты абавязак заахвочваць шанаванне правоў чалавека і асноўных свабод і спрыяць такому шанаванню без усякага кшталту адрознення, у тым ліку без адрознення на падставе расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых поглядаў, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага стану, нараджэння ці іншага статусу, і прызнаючы асабліва важнае значэнне забеспячэння міжнароднага супрацоўніцтва дзеля выканання гэтага абавязку згодна са Статутам,

прызнаючы важную ролю міжнароднага супрацоўніцтва і каштоўную працу асобных людзей, груп і аб’яднанняў у спрыянні эфектыўнай ліквідацыі любых парушэнняў правоў чалавека і асноўных свабод народаў і асобных людзей, уключна і ў дачыненні да масавых, абуральных ці сістэматычных парушэнняў, такіх, якія вынікаюць з апартэіду, усіх формаў расавай дыскрымінацыі, каланіялізму, замежнага панавання ці акупацыі, агрэсіі ці пагрозаў нацыянальнаму суверэнітэту, нацыянальнаму адзінству ці тэрытарыяльнай цэласнасці, а таксама тых, што вынікаюць з адмовы прызнаваць права народаў на самавызначэнне і права кожнага народа цалкам распараджацца сваім багаццем і прыроднымі рэсурсамі.

прызнаючы ўзаемасувязь паміж мірам у свеце і бяспекай і выкананнем правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама ўсведамляючы, што сітуацыі адсутнасці міру ў свеце і бяспекі не апраўдваюць нешанавання правоў чалавека і асноўных свабод,

ізноў заяўляючы, што ўсе правы чалавека і асноўныя свабоды ўніверсальныя, непадзельныя, узаемазалежныя і ўзаемазвязаныя і мусяць заахвочвацца і ажыццяўляцца на справядлівай і раўнапраўнай аснове, без шкоды для ажыццяўлення аніякага з гэтых правоў і свабод.

падкрэсліваючы, што асноўная адказнасць і абавязак па спрыянні і абароне правоў чалавека і асноўных свабод ляжыць на дзяржаве,

прызнаючы права і абавязак асобных людзей, груп і аб’яднанняў заахвочваць павагу і спрыяць глыбейшаму асэнсаванню правоў чалавека і асноўных свабод на нацыянальным і міжнародным узроўнях,

абвяшчае:

**Артыкул 1**

Кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, заахвочваць і імкнуцца да абароны і забеспячэння правоў чалавека і асноўных свабод на нацыянальным і міжнародным узроўні.

**Артыкул 2**

1. Кожная дзяржава нясе асноўную адказнасць і абавязак абараняць, заахвочваць і забяспечваць усе правы чалавека і асноўныя свабоды, у прыватнасці, прымаючы такія меры, якія могуць быць неабходныя ў стварэнні ўсіх умоў, неабходных у сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай і іншых сферах, а таксама прававых гарантый для забеспячэння таго, каб усе асобы пад яе юрысдыкцыяй, паасобку ці супольна з іншымі, маглі рэальна карыстацца ўсімі гэтымі правамі і свабодамі.
2. Кожная дзяржава прымае такія заканадаўчыя, адміністрацыйныя ды іншыя меры, якія могуць быць неабходныя для забеспячэння таго, каб эфектыўна гарантаваліся ўсе правы і свабоды, памянёныя ў дадзенай Дэкларацыі.

**Артыкул 3**

Унутранае заканадаўства, дапасаванае да Статута Арганізацыі Аб’яднаных Нацый ды іншых міжнародных абавязальніцтваў дзяржавы ў сферы правоў чалавека і асноўных свабод, утварае юрыдычныя рамкі, у якіх выконваюцца і забяспечваюцца правы чалавека ды асноўныя свабоды і ў якіх мусіць праводзіцца ўся дзейнасць, згаданая ў

дадзенай Дэкларацыі, дзеля заахвочвання, абароны і эфектыўнай рэалізацыі гэтых правоў.

**Артыкул 4**

Нічога ў дадзенай Дэкларацыі не можа трактавацца як прымяншэнне ці супярэчнасць мэтам і прынцыпам Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ці як абмежаванне ці адступленне ад палажэнняў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Міжнародных пактаў аб правах чалавека ды іншых міжнародных дакументаў і абавязальніцтваў у гэтай сферы.

**Артыкул 5**

Дзеля заахвочвання і абароны правоў чалавека і асноўных свабод кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, на нацыянальным і міжнародным узроўні:

(a) ладзіць мірныя сустрэчы ці сходы;
(b) утвараць няўрадавыя арганізацыі, асацыяцыі ці групы, далучацца да іх і браць удзел у іх;
(c) мець зносіны з няўрадавымі ці міжурадавымі арганізацыямі.

**Артыкул 6**

Кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі:

(a) ведаць, шукаць, здабываць, атрымліваць і мець у сваім распараджэнні інфармацыю пра ўсе правы чалавека і асноўныя свабоды, уключна з доступам да інфармацыі пра тое, як гэтыя правы і свабоды выконваюцца ў нацыянальным заканадаўстве, судовай ці адміністрацыйнай сістэмах;
(b) вольна публікаваць, перадаваць ці распаўсюджваць сярод астатніх погляды, інфармацыю і веды пра ўсе правы чалавека і асноўныя свабоды, як тое прадугледжваюць дакументы па правах чалавека ды іншыя адпаведныя міжнародныя дакументы;
(c) вывучаць, абмяркоўваць, фармаваць і мець погляды адносна выканання, як у заканадаўстве, так і на практыцы, усіх правоў чалавека і асноўных свабод і, выкарыстоўваючы гэтыя ці іншыя адпаведныя сродкі, прыцягваць увагу грамадскасці да гэтых пытанняў.

**Артыкул 7**

Кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, развіваць і абмяркоўваць новыя ідэі і прынцыпы адносна правоў чалавека і дамагацца іх прызнання.

**Артыкул 8**

1. Кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, мець дзейсны доступ без усякай дыскрымінацыі да ўдзелу ў кіраванні сваёй краінай і вядзення дзяржаўных спраў.
2. Гэта ўключае, у прыватнасці, права, паасобку ці супольна з іншымі, выказваць крытычныя заўвагі і прапановы ў дзяржаўныя органы і ўстановы дзеля паляпшэння іх дзейнасці і прыцягнення ўвагі да любога аспекту іх працы, які можа ўскладняць ці стрымліваць заахвочванне, абарону і рэалізацыю правоў чалавека і асноўных свабод.

**Артыкул 9**

1. Падчас карыстання правамі чалавека і асноўнымі свабодамі, уключна з заахвочваннем і абаронай правоў чалавека, памянёных у дадзенай Дэкларацыі, кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, карыстацца эфектыўнай прававой дапамогай і правам на абарону ў выпадку парушэння гэтых правоў.
2. З гэтай мэтай кожны чалавек, чые правы ці свабоды, як мяркуецца, парушаныя, мае права як асабіста, так і праз законна ўпаўнаважанага прадстаўніка, скіраваць скаргу ў незалежны, бесстаронні і кампетэнтны судовы ці іншы орган, створаны на падставе закону, разлічваць на яе неадкладны разгляд гэтым органам цягам публічнага разбіральніцтва і атрымаць ад такога органа ў адпаведнасці з законам рашэнне, якое прадугледжвае меры па выпраўленні становішча, уключна з належнай кампенсацыяй у выпадку парушэння правоў ці свабод гэтага чалавека, а таксама права на прымусовае выкананне гэтага рашэння ці пастановы без неапраўданай затрымкі.
3. З гэтай самай мэтай кожны чалавек, паасобку ці супольна з іншымі, мае права, у прыватнасці:

(a) падаваць скаргі ці іншыя адпаведныя звароты на палітыку і дзеянні асобных службовых асоб і дзяржаўных органаў адносна парушэння правоў чалавека і асноўных свабод, у кампетэнтныя нацыянальныя судовыя, адміністрацыйныя ці заканадаўчыя органы ці якія іншыя кампетэнтныя органы, прадугледжаныя юрыдычнай сістэмай дзяржавы, якія павінны вынесці рашэнне па скарзе без неапраўданай затрымкі;
(b) прысутнічаць на публічных слуханнях, разбіральніцтвах і судовых працэсах з мэтай фармаваць сваё меркаванне пра іх адпаведнасць нацыянальнаму заканадаўству і адпаведным міжнародным абавязальніцтвам;
(c) прапаноўваць і аказваць прафесійную прававую дапамогу ці іншыя адпаведныя кансультацыі і дапамогу ў справе абароны правоў чалавека і асноўных свабод.

4. З гэтай самай мэтай і згодна з адпаведнымі міжнароднымі дамовамі і працэдурамі кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, на бесперашкодны доступ

да міжнародных органаў, якія валодаюць агульнай ці спецыяльнай кампетэнцыяй атрымліваць і разглядаць паведамленні па пытаннях правоў чалавека і асноўных свабод.

5. Дзяржава ладзіць неадкладнае і бесстаронняе расследаванне ці забяспечвае правядзенне расследавання кожны раз, калі ёсць разумныя падставы меркаваць, што на любой тэрыторыі пад яе юрысдыкцыяй адбылося парушэнне правоў чалавека ці асноўных свабод.

**Артыкул 10**

Ніхто не павінен удзельнічаць, шляхам дзеяння ці шляхам бяздзеяння ў сітуацыях, калі патрэбнае дзеянне, у парушэнні правоў чалавека і асноўных свабод і нікога нельга нейкім чынам караць ці пераследаваць за адмову ад удзелу ў гэтым.

**Артыкул 11**

Кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, законна займацца сваёй дзейнасцю ці працаваць па прафесіі. Кожны чалавек, які ў сваёй прафесійнай дзейнасці можа ўплываць на чалавечую годнасць, правы чалавека і асноўныя свабоды іншых людзей, мусіць шанаваць гэтыя правы і свабоды і пільнавацца адпаведных нацыянальных і міжнародных стандартаў паводзін ці этыкі, якія звязаныя з родам заняткаў ці прафесіяй.

**Артыкул 12**

1. Кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, браць удзел у мірнай дзейнасці, скіраванай супраць парушэння правоў чалавека і асноўных свабод.
2. Дзяржава прымае ўсе неабходныя меры, каб праз кампетэнтныя органы забяспечыць абарону кожнага чалавека, паасобку ці супольна з іншымі ад усякага гвалту, пагрозаў, помсты, негатыўнай дыскрымінацыі de facto ці de jure, ціску ці любых іншых адвольных дзеянняў у сувязі з законным выкананнем яго ці яе правоў, памянёных у дадзенай Дэкларацыі.
3. У сувязі з гэтым кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, на эфектыўную абарону згодна з нацыянальным заканадаўствам ў выпадках пратэставых захадаў ці выступаў з выкарыстаннем мірных сродкаў супраць дзейнасці, дзеянняў ці бяздзеяння з боку дзяржавы, вынікам якіх з'яўляюцца парушэнні правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама супраць актаў гвалту, учыненых групамі ці асобнымі людзьмі, якія закранаюць выкананне правоў чалавека і асноўных свабод.

**Артыкул 13**

Кожны чалавек мае права, паасобку ці супольна з іншымі, запытваць, атрымліваць і выкарыстоўваць рэсурсы адмыслова для мэтаў заахвочвання і абароны правоў чалавека і асноўных свабод мірнымі сродкамі згодна з артыкулам 3 дадзенай Дэкларацыі.

**Артыкул 14**

1. Дзяржава нясе адказнасць за прыняцце заканадаўчых, судовых, адміністрацыйных ці іншых мер з мэтай спрыяння разуменню ўсімі асобамі, якія знаходзяцца пад яе юрысдыкцыяй, сваіх грамадзянскіх, палітычных, эканамічных, сацыяльных і культурных правоў.
2. Такія меры, у прыватнасці, уключаюць:

(a) публікацыю і шырокае распаўсюджванне нацыянальных законаў і пастаноў і асноўных адпаведных міжнародных дамоў па правах чалавека;

(b) поўны і роўны доступ да міжнародных дакументаў у сферы правоў чалавека, уключна з перыядычнымі дакладамі, якія рыхтуе дзяржава для органаў, утвораных паводле міжнародных дамоваў па правах чалавека, да якіх далучылася гэтая дзяржава, а таксама да справаздачаў аб абмеркаваннях і да афіцыйных дакладаў гэтых органаў.

3. Дзяржава забяспечвае і падтрымлівае, дзе гэта неабходна, стварэнне і развіццё новых незалежных нацыянальных устаноў у пытаннях заахвочвання і абароны правоў чалавека і асноўных свабод на ўсёй тэрыторыі пад яе юрысдыкцыяй, такіх, як амбудсмены, камісіі па правах чалавека ці іншыя формы нацыянальных устаноў.

**Артыкул 15**

Дзяржава адказвае за заахвочванне і спрыянне выкладанню правоў чалавека і асноўных свабод на ўсіх узроўнях адукацыі і за забеспячэнне таго, каб асобы, якія адказваюць за падрыхтоўку юрыстаў, супрацоўнікаў праваахоўных органаў, вайскоўцаў і дзяржаўных службоўцаў, уключалі адпаведныя элементы выкладання правоў чалавека ў свае навучальныя праграмы.

**Артыкул 16**

Асобы, няўрадавыя арганізацыі і адпаведныя ўстановы адыгрываюць важную ролю ў спрыянні больш глыбокаму разуменню грамадскасцю пытанняў, якія адносяцца да сферы правоў чалавека і асноўных свабод, праз такую дзейнасць, як адукацыя, прафесійная падрыхтоўка і даследаванні ў гэтых сферах у мэтах забеспячэння, у прыватнасці, глыбейшага разумення, цярплівасці, міру і сяброўскіх адносін паміж народамі і ўсімі расавымі і рэлігійнымі групамі, улічваючы розныя асаблівасці, характэрныя для супольнасцяў і калектываў, у якіх яны ажыццяўляюць сваю дзейнасць.

**Артыкул 17**

Пры выкананні правоў і свабод, памянёных у дадзенай Дэкларацыі, кожны чалавек, які дзейнічае паасобку ці супольна з іншымі, можа падпадаць толькі пад такія абмежаванні, якія дапускаюцца адпаведнымі міжнароднымі абавязальніцтвамі і вызначаныя законам выключна ў мэтах забеспячэння належнага прызнання і павагі да правоў і свабод астатніх людзей і задавальнення справядлівых патрабаванняў маральнасці, грамадскага парадку і агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве.

**Артыкул 18**

1. Кожны чалавек мае абавязкі ў сваёй супольнасці і ў адносінах да яе, у рамках якой толькі і магчымае свабоднае і поўнае развіццё асобы.
2. Асобы, групы, установы і няўрадавыя арганізацыі адыгрываюць важную ролю і нясуць адказнасць ў справе абароны дэмакратыі, заахвочвання правоў чалавека і асноўных свабод і спрыяння заахвочванню і развіццю дэмакратычных грамадстваў, інстытуцый і працэсаў.
3. Асобы, групы, установы і няўрадавыя арганізацыі таксама адыгрываюць важную ролю і нясуць адказнасць у справе спрыяння, дзе гэта неабходна, заахвочванню права кожнага чалавека на сацыяльны і міжнародны парадак, у якім цалкам рэалізуюцца правы і свабоды, памянёныя ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і ў іншых дакументах па правах чалавека.

**Артыкул 19**

Ніводнае палажэнне дадзенай Дэкларацыі не можа тлумачыцца як тое, што прадугледжвае права для асобы, групы ці органа грамадства кожнай дзяржавы займацца якойсьці дзейнасцю ці рабіць якіясьці учынкі, скіраваныя на ліквідацыю правоў і свабод, памянёных у дадзенай Дэкларацыі.

**Артыкул 20**

Ніводнае палажэнне дадзенай Дэкларацыі не можа тлумачыцца як тое, што дазваляе дзяржавам падтрымліваць і заахвочваць дзейнасць пэўных асоб, груп асоб, устаноў ці няўрадавых арганізацый, якая супярэчаць палажэнням Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

# КАНВЕНЦЫЯ АБ ДОСТУПЕ ДА ІНФАРМАЦЫІ, УДЗЕЛЕ ГРАМАДСКАСЦІ Ў ПРАЦЭСЕ ПРЫНЯЦЦЯ РАШЭННЯЎ І ДОСТУПЕ ДА ПРАВАСУДДЗЯ Ў ПЫТАННЯХ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ (ОРХУСКАЯ КАНВЕНЦЫЯ),

Распрацаваная ў г. Орхусе (Данія) 25 чэрвеня 1998 г., 38 I.L.M. 517 (1999), уступіла ў сілу 30 кастрычніка 2001 г. *(вытрымкі)*

---

Бакі дадзенай Канвенцыі,

спасылаючыся на прынцып 1 Стакгольмскай дэкларацыі па праблемах навакольнага асяроддзя,

(...)

пацвярджаючы неабходнасць абараняць, захоўваць і паляпшаць стан навакольнага асяроддзя і забяспечваць устойлівае і экалагічна бяспечнае развіццё,

прызнаючы, што адэкватная ахова навакольнага асяроддзя неабходная для забеспячэння дабрабыту чалавецтва і карыстання асноўнымі правамі чалавека, уключна з самім правам на жыццё,

прызнаючы таксама, што кожны чалавек мае права на жыццё ў асяроддзі, спрыяльным для яго здароўя і дабрабыту, а таксама абавязак як паасобку, так і супольна з іншымі ахоўваць і паляпшаць навакольнае асяроддзе на карысць цяперашніх і будучых пакаленняў,

мяркуючы, што для магчымасці адстойваць гэтае права і выконваць гэты абавязак грамадзяне мусяць мець доступ да інфармацыі, мець права браць удзел у працэсе прыняцця рашэнняў і мець доступ да правасуддзя ў пытаннях навакольнага асяроддзя, і ў гэтых адносінах прызнаючы, што грамадзянам можа спатрэбіцца дапамога для выканання іх правоў,

прызнаючы, што ў пытаннях навакольнага асяроддзя паляпшэнне доступу да інфармацыі і грамадскага ўдзелу у працэсе прыняцця рашэнняў значна удасканальваюць якасць выканання рашэнняў, спрыяюць грамадскай інфармаванасці ў пытаннях навакольнага асяроддзя, даюць магчымасць грамадскасці выяўляць сваю занепакоенасць, а органам дзяржаўнай улады — належным чынам улічваць такія інтарэсы,

імкнучыся такім чынам паляпшаць падсправаздачнасць і празрыстасць працэсу прыняцця рашэнняў і ўзмацняць грамадскую падтрымку рашэнняў адносна навакольнага асяроддзя,

прызнаючы пажаданасць празрыстасці ва ўсіх галінах дзяржаўнага кіравання і прапаноўваючы заканадаўчым органам выконваць прынцыпы гэтай Канвенцыі ў сваёй працы,

прызнаючы таксама, што грамадскасць мае патрэбу ў інфармаванасці аб працэдурах удзелу ў працэсе прыняцця рашэнняў наконт пытанняў навакольнага асяроддзя, мець да іх доступ і ведаць, як імі карыстацца,

прызнаючы далей важнае значэнне адпаведных роляў, якія могуць адыгрываць у ахове навакольнага асяроддзя асобныя грамадзяне, няўрадавыя арганізацыі і прыватны сектар,

выказваючы жаданне спрыяць экалагічнай асвеце ў мэтах лепшага разумення працэсаў, звязаных з навакольным асяроддзем і ўстойлівым развіццём, і заахвочваць шырокае інфармаванне грамадскасці аб рашэннях, што ўплываюць на навакольнае асяроддзе і ўстойлівае развіццё, і яе ўдзел у працэсе прыняцця такіх рашэнняў,

зазначаючы ў сувязі з гэтым важнае значэнне выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі і электронных ці іншых сродкаў сувязі, якія з'явяцца ў будучыні,

прызнаючы важнае значэнне поўнага ўліку экалагічных пытанняў у працэсе прыняцця дзяржаўных рашэнняў і неабходнасць, што вынікае адсюль, каб дзяржаўныя органы валодалі дакладнай, усебаковай і сучаснай экалагічнай інфармацыяй,

мяркуючы, што дзяржаўныя органы валодаюць экалагічнай інфармацыяй у інтарэсах грамадскасці,

выказваючы заклапочанасць з мэтай, каб эфектыўныя судовыя механізмы былі даступныя грамадскасці, уключна з арганізацыямі, дзеля забеспячэння абароны яе законных інтарэсаў і выканання закону,

(...)

дамовіліся пра наступнае:

**Артыкул 1. Мэта**

Дзеля таго каб спрыяць абароне права кожнага чалавека цяперашняга ці будучых пакаленняў жыць у навакольным асяроддзі, спрыяльным для яго здароўя і дабрабыту, кожная краіна-бок Канвенцыі гарантуе правы доступу да інфармацыі, удзелу грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў і доступу да правасуддзя ў пытаннях навакольнага асяроддзя ў адпаведнасці з палажэннямі дадзенай Канвенцыі.

**Артыкул 2. Азначэнні**

Для мэтаў дадзенай Канвенцыі,

1. Бок азначае, калі дадзены тэкст не ўтрымлівае іншага ўказання, удзельніка дадзенай Канвенцыі;
2. Дзяржаўны орган азначае:

(a) дзяржаўнае кіраўніцтва на нацыянальным, рэгіянальным і іншым узроўні;
(b) фізічныя ці юрыдычныя асобы, якія выконваюць дзяржаўныя адміністрацыйныя абавязкі і функцыі згодна з нацыянальным заканадаўствам, уключаючы пэўныя абавязкі, дзейнасць ці паслугі адносна навакольнага асяроддзя;
(c) усякія іншыя фізічныя ці юрыдычныя асобы, якія маюць грамадскія абавязкі ці функцыі ці аказваюць насельніцтву паслугі, звязаныя з навакольным асяроддзем, пад кантролем органа ці асобы, памянёнай у падпунктах (a) ці (b) вышэй;
(d) установы кожнай арганізацыі рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі, памянёныя ў артыкуле 17, якія з'яўляюцца бакамі дадзенай Канвенцыі.

Гэтае азначэнне не ўключае органаў ці ўстаноў, якія дзейнічаюць у судовай ці заканадаўчай якасці;

3. Экалагічная інфармацыя азначае любую інфармацыю ў пісьмовай, аудыёвізуальнай, электроннай ці ў любой іншай матэрыяльнай форме пра:

(a) стан элементаў навакольнага асяроддзя, такіх, як паветра і атмасфера, вада, глеба, зямля, ландшафт і прыродныя аб'екты, біялагічная разнастайнасць і яе кампаненты, уключна з генетычна мадыфікаванымі арганізмамі, а таксама ўзаемадзеянне паміж гэтымі элементамі;
(b) фактары, такія, як рэчывы, энергія, шум і радыяцыя, а таксама дзейнасць і меры, уключна з адміністрацыйнымі рэсурсамі, пагадненні ў сферы навакольнага асяроддзя, стратэгіі, заканадаўства, планы і праграмы, якія ўплываюць ці могуць паўплываць на элементы навакольнага асяроддзя, ахопленыя ў падпункце (a) вышэй, аналіз выдаткаў і вынікаў, іншы эканамічны аналіз і дапушчэнні, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе прыняцця рашэнняў наконт экалагічных пытанняў;
(c) стан здароўя і бяспекі людзей, умовы жыцця людзей, стан культурных аб'ектаў і рукатворных збудаванняў у той ступені, у якой на іх уплывае ці можа ўплываць стан элементаў навакольнага асяроддзя ці — праз гэтыя элементы — фактары, дзейнасць ці меры, памянёныя вышэй у падпункце (b);

4. Грамадскасць азначае адну ці болей чым адну фізічную ці юрыдычную асобу і іх асацыяцыі, арганізацыі ці групы згодна з нацыянальным заканадаўствам ці практыкай;
5. Зацікаўленая грамадскасць азначае грамадскасць, якую чапляе ці можа чапляць працэс прыняцця рашэнняў па экалагічных пытаннях ці якая мае ў гэтым пэўную зацікаўленасць; дзеля мэтаў дадзенага азначэння няўрадавыя арганізацыі, якія спрыяюць ахове навакольнага асяроддзя і адпавядаюць усім патрабаванням нацыянальнага заканадаўства, лічацца зацікаўленым бокам.

**Артыкул 3. Агульныя ўмовы**

1. Кожны бок прымае неабходныя заканадаўчыя, рэгламентацыйныя ды іншыя меры, уключна з мерамі дзеля дасягнення дапасаванасці пастаноў і ўмоў, якія рэгламентуюць парадак выканання палажэнняў дадзенай Канвенцыі датычна інфармацыі, удзелу грамадскасці і доступу да правасуддзя, а таксама належныя меры для забеспячэння іх прымянення, для стварэння і падтрымкі дакладнай, празрыстай і ўзгодненай структуры для выканання ўмоў дадзенай Канвенцыі.
2. Кожны бок імкнецца забяспечыць, каб службовыя асобы і дзяржаўныя органы аказвалі грамадскасці дапамогу і забяспечвалі ёй арыентацыю ў атрыманні доступу да інфармацыі, палягчалі яе ўдзел у працэсе прыняцця рашэнняў і ў атрыманні доступу да правасуддзя ў пытаннях навакольнага асяроддзя.
3. Кожны бок спрыяе экалагічнай асвеце і экалагічнай інфармаванасці сярод грамадскасці, асабліва пра тое, як атрымліваць доступ да інфармацыі, як браць удзел у працэсе прыняцця рашэнняў і як атрымліваць доступ да правасуддзя ў пытаннях навакольнага асяроддзя.
4. Кожны бок забяспечвае належнае прызнанне і падтрымку асацыяцый, арганізацый ці груп, якія спрыяюць ахове навакольнага асяроддзя, і забяспечвае адпаведнасць сваёй нацыянальнай юрыдычнай сістэмы гэтаму абавязальніцтву.
5. Умовы дадзенай Канвенцыі не ўплываюць на права якогасьці з бакоў працягваць выконваць ці ўводзіць меры, якія забяспечваюць шырэйшы доступ да інфармацыі,

большы ўдзел грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў і большы доступ да правасуддзя ў пытаннях навакольнага асяроддзя, чым гэта прадугледжана дадзенай Канвенцыяй.

6. Дадзеная Канвенцыя не вымагае якогасьці адступлення ад наяўных правоў доступу да інфармацыі, удзелу грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў і доступу да правасуддзя ў пытаннях навакольнага асяроддзя.
7. Кожны бок спрыяе прымяненню прынцыпаў дадзенай Канвенцыі ў працэсе прыняцця рашэнняў у экалагічных пытаннях на міжнародным узроўні і ў рамках міжнародных арганізацый у пытаннях, што датычаць навакольнага асяроддзя.
8. Кожны бок забяспечвае, каб асобы, якія ажыццяўляюць свае правы згодна з умовамі дадзенай Канвенцыі, не караліся, не пераследаваліся або не прыцясняліся за сваю дзейнасць. Гэтая ўмова не ўплывае на паўнамоцтвы нацыянальных судоў выносіць пастановы пра пакрыванне разумных сум, звязаных з судовымі выдаткамі.
9. У рамках адпаведных палажэнняў дадзенай Канвенцыі грамадскасць валодае доступам да інфармацыі, мае магчымасць браць удзел у працэсе прыняцця рашэнняў і мае доступ да правасуддзя ў пытаннях навакольнага асяроддзя без дыскрымінацыі на падставе грамадзянства, нацыянальнасці ці месца жыхарства і, калі гэта юрыдычная асоба, без дыскрымінацыі паводле яе зарэгістраванага месцазнаходжання ці фактычнага цэнтра дзейнасці.

**Артыкул 4. Доступ да экалагічнай інфармацыі**

1. Кожны бок забяспечвае, каб пры ўмове выканання наступных пунктаў гэтага артыкула дзяржаўныя органы ў адказ на запыт адносна экалагічнай інфармацыі прадстаўлялі ў рамках нацыянальнага заканадаўства для грамадскасці такую інфармацыю, пры наяўнасці такога запыту і ў адпаведнасці з падпунктам (b) ніжэй, уключна з копіямі дакументацыі, якая ўтрымлівае ці ўключае такую інфармацыю:

(a) без неабходнасці фармуляваць сваю зацікаўленасць;

(b) у запытанай форме, калі толькі:

(i) дзяржаўны орган не мае падставаў падаць яе ў іншай форме, пры гэтым у дадзеным выпадку мусяць быць указаныя прычыны для выкладання інфармацыі ў такой форме; ці

(ii) інфармацыя ўжо не была пададзеная грамадскасці ў іншай форме.

2. Экалагічная інфармацыя, памянёная вышэй ў пункце 1, мусіць прадстаўляцца ў найкарацейшы тэрмін і прынамсі цягам аднаго месяца пасля адпраўкі адпаведнага запыту, калі толькі абсяг і складанасць інфармацыі не вымагае працягу перыяду адказу да двух месяцаў пасля запыту. Заяўніку паведамляюць пра працяг тэрміну адказу і прычыны, што яго выклікалі.

3. Запыт па экалагічную інфармацыю можа быць адхілены, калі:

(a) дзяржаўны орган, да якога скіроўваецца запыт, не валодае дадзенай экалагічнай інфармацыяй;

(b) запыт відавочна неабгрунтаваны ці сфармуляваны занадта агульна; ці

(c) запыт датычыць інфармацыі, якая яшчэ знаходзіцца на этапе падрыхтоўкі, ці ўтрымлівае ўнутранае ліставанне дзяржаўных органаў, калі такое выключэнне прадугледжваецца нацыянальным заканадаўствам ці звычаёвай практыкай, пры гэтым улічваецца зацікаўленасць грамадскасці ў атрыманні такой інфармацыі.

4. Запыт па экалагічную інфармацыю можа быць адхілены, калі прадстаўленне такой інфармацыі негатыўна паўплывае на:

(a) канфідэнцыйнасць работы дзяржаўных органаў, калі такая канфідэнцыйнасць прадугледжваецца нацыянальным заканадаўствам;

(b) міжнародныя адносіны, нацыянальную абарону ці грамадскую бяспеку;

(c) адпраўленне правасуддзя, здольнасць асоб удзельнічаць у справядлівым судовым разбіральніцтве ці магчымасць дзяржаўнага органа ладзіць расследаванне крымінальнага ці адміністратыўнага характару;

(d) канфідэнцыйнасць камерцыйных і прамысловых звестак, калі такая канфідэнцыйнасць ахоўваецца законам з мэтай забеспячэння законных эканамічных інтарэсаў. У гэтых межах звесткі пра выкіды, якія адносяцца да аховы навакольнага асяроддзя, мусяць быць раскрытыя;

(e) правы інтэлектуальнай уласнасці;

(f) канфідэнцыйнасць асабістых звестак ці архіваў, што датычаць фізічнай асобы, калі такая асоба не дае згоды на публічнае раскрыццё інфармацыі згодна з умовамі нацыянальнага заканадаўства;

(g) інтарэсы трэцяга боку, які падаў запытаныя звесткі, калі гэты бок не мае юрыдычнага абавязку паводзіць сябе падобным чынам ці калі на гэты бок не можа быць накладзены такі абавязак, і ў тых выпадках, калі гэты бок не дае згоды на раскрыццё адпаведнага матэрыялу; ці

(h) на навакольнае асяроддзе, да якога адносяцца запытаныя звесткі, напрыклад, на месцы размнажэння рэдкіх відаў.

Вышэйпамянёныя падставы для адмовы тлумачацца абмежавальна з улікам грамадскага інтарэсу ў раскрыцці гэтых звестак і ўлічваючы тое, ці адносяцца гэтыя звесткі да выкідаў у навакольнае асяроддзе.

5. У тым выпадку, калі дзяржаўны орган не валодае запытанай экалагічнай інфармацыяй, гэты дзяржаўны орган у найкарацейшы тэрмін паведамляе заяўніку пра адпаведны іншы дзяржаўны орган, да якога можна звярнуцца з запытам па патрэбную інфармацыю ці сам перанакіроўвае запыт у гэты орган і адпаведна паведамляе пра гэта заяўніку.
6. Кожны бок забяспечвае, каб у тых выпадках, калі інфармацыя не падлягае раскрыццю згодна з пунктам 3 (c) і 4 вышэй, яна магла б быць аддзеленая ад астатняй інфармацыі без шкоды канфідэнцыйнасці інфармацыі, якая не падлягае раскрыццю, адпаведны дзяржаўны орган прадстаўляе астатнюю частку экалагічнай інфармацыі, на якую быў зроблены запыт.
7. Адмова ў запыце мусіць рабіцца ў пісьмовай форме, калі запыт быў зроблены пісьмова ці калі таго патрабуе заяўнік. У адмове мусяць утрымлівацца прычыны адмовы і давацца звесткі пра доступ да працэдуры перагляду прынятага рашэння згодна з артыкулам 9. Адмова мусіць афармляцца ў найкарацейшыя тэрміны і прынамсі цягам месяца, калі складанасць інфармацыі не апраўдвае падаўжэння гэтага перыяду да двух месяцаў пасля падачы запыту. Заяўніка інфармуюць пра кожнае падаўжэнне тэрміну і аб прычынах, якія яго апраўдваюць.
8. Кожны бок можа дазволіць сваім дзяржаўным органам браць плату за інфармацыю, але памер платы не можа перавышаць разумнай сумы. Дзяржаўныя органы, якія маюць намер браць такую плату за інфармацыю, мусяць падрыхтаваць для заяўнікаў тарыфную сетку, у адпаведнасці з якой мусяць спаганяцца зборы, з указаннем абставінаў, паводле якіх зборы могуць прадугледжвацца ці скасоўвацца, і тых выпадкаў, калі інфармацыя выдаецца пры ўмове папярэдняй аплаты гэткіх збораў.

**Артыкул 5. Збор і распаўсюджанне экалагічнай інфармацыі**

1. Кожны бок забяспечвае, каб:

(a) дзяржаўныя органы валодалі і абнаўлялі экалагічную інфармацыю, якая адносіцца да іх дзейнасці;

(b) былі ўтвораныя абавязковыя сістэмы для забеспячэння належнага паступлення ў дзяржаўныя органы інфармацыі пра запланаваную і ўжо наяўную дзейнасць, якая можа значна паўплываць на навакольнае асяроддзе;

(c) у выпадку навіслай пагрозы здароўю чалавека і навакольнаму асяроддзю, выкліканай чалавечай дзейнасцю ці прыроднымі прычынамі, уся інфармацыя, якая магла б дазволіць грамадскасці прыняць меры па прадухіленні ці змяншэнні шкоды, якая можа вынікаць з такой пагрозы і ўтрымліваецца дзяржаўным органам, распаўсюджваецца адразу і неадкладна сярод патэнцыйна закранутых пагрозай членаў грамадскасці.

2. Кожны бок забяспечвае, каб у рамках нацыянальнага заканадаўства працэдуры прадстаўлення экалагічнай інфармацыі дзяржаўнымі органамі былі празрыстымі і каб экалагічная інфармацыя была лёгкадаступнай, у прыватнасці праз:

(a) забеспячэнне дастатковых звестак для грамадскасці пра тып і абсяг экалагічнай інфармацыі, якой валодаюць адпаведныя дзяржаўныя органы, асноўныя ўмовы, паводле якіх такая інфармацыя прадстаўляецца і робіцца даступнай, і аб працэсе яе атрымання;

(b) арганізацыю і ажыццяўленне практычных мер, такіх, як:

(i) забеспячэнне для грамадскасці даступных спісаў, рэестраў ці архіваў;

(ii) патрабаванне ад службовых асоб аказваць падтрымку грамадскасці ў пошуках інфармацыі згодна з дадзенай Канвенцыяй; і

(iii) вылучэнне пунктаў сувязі; і

(c) забеспячэнне бясплатнага доступу да экалагічнай інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў спісах, рэестрах ці архівах, памянёных вышэй у падпункце (b) (i).

3. Кожны бок забяспечвае паступовае павелічэнне экалагічнай інфармацыі ў электронных базах звестак, лёгкадаступных для грамадскасці праз публічныя сеткі сувязі. Інфармацыя, даступная ў гэтай форме, мусіць уключаць:

(a) даклады пра стан навакольнага асяроддзя, памянёныя ніжэй у пункце 4;

(b) тэксты заканадаўчых актаў у пытаннях навакольнага асяроддзя ці тыя, што маюць да іх дачыненне;

(c) у адпаведных выпадках дакументы ў пытаннях палітыкі, планы і праграмы ў сферы навакольнага асяроддзя ці тыя, што маюць да яго дачыненне, а таксама прыродаахоўныя пагадненні; і

(d) іншую інфармацыю ў той ступені, у якой яе наяўнасць аблегчыць прымяненне нацыянальнага заканадаўства у мэтах выканання ўмоў дадзенай Канвенцыі, улічваючы, што такая інфармацыя ўжо існуе ў электроннай форме.

4. Кожны бок рэгулярна, не радзей чым раз на тры ці чатыры гады, публікуе і распаўсюджвае нацыянальны даклад пра стан навакольнага асяроддзя, уключна са звесткамі пра якасць навакольнага асяроддзя і пра нагрузку на яго.

5. Кожны бок у рамках свайго заканадаўства прымае меры дзеля распаўсюджвання, у прыватнасці, наступнага:
(a) заканадаўчых актаў і праграмных дакументаў, як напрыклад, стратэгій, праграмных дакументаў, праграм і планаў дзеяння адносна навакольнага асяроддзя, дакладаў пра ход іх выканання, падрыхтаваных на органамі дзяржаўнага кіравання розных узроўняў;
(b) міжнародных дамоўленасцяў, канвенцый і пагадненняў па пытаннях навакольнага асяроддзя; і
(c) у адпаведных выпадках, іншых значных міжнародных дакументаў па пытаннях навакольнага асяроддзя.
6. Кожны бок заахвочвае прадстаўнікоў, чыя дзейнасць мае значны ўплыў на навакольнае асяроддзе, рэгулярна інфармаваць грамадскасць пра экалагічны ўплыў сваёй дзейнасці і прадукцыі, робячы гэта, у адпаведных выпадках, у рамках выкарыстання добраахвотных сістэм экамаркіроўкі і экалагічнай экспертызы і з дапамогай іншых сродкаў.
7. Кожны бок:
(a) публікуе фактычную інфармацыю і яе аналіз, які ён лічыць адпаведным і важным для распрацоўкі найбольш істотных прапаноў у пытаннях экалагічнай палітыкі;
(b) публікуе ці якім іншым чынам робіць даступнымі наяўныя тлумачальныя матэрыялы пра свае дзелавыя адносіны з грамадскасцю ў пытаннях, якія ўваходзяць у сферу дзеяння дадзенай Канвенцыі; і
(c) прадстаўляе ў належнай форме інфармацыю пра выкананне дзяржаўнымі органамі на ўсіх узроўнях дзяржаўных функцый ці пра выкананне паслуг для насельніцтва, якія адносяцца да навакольнага асяроддзя.
8. Кожны бок распрацоўвае механізмы дзеля забеспячэння грамадскасці дастатковай інфармацыяй аб прадуктах такім чынам, каб даваць магчымасць спажыўцам рабіць свядомы выбар з улікам інтарэсаў навакольнага асяроддзя.
9. Кожны бок прымае меры па паступовым разгортванні, з улікам, у адпаведных выпадках, працэсаў на міжнародным узроўні, узгодненай агульнанацыянальнай сістэмы кадастраў ці рэгістраў забруджвання з выкарыстаннем структураванай, камп'ютарызаванай і даступнай для грамадскасці базы дадзеных, якая складаецца на падставе стандартызаванай сістэмы справаздачнасці. Такая сістэма можа ўключаць звесткі пра паступленне, вылучэнне і перанос у выніку ажыццяўлення пэўных відаў дзейнасці шэрагу рэчываў і прадуктаў, у тым ліку пры выкарыстанні вады, энергіі і рэсурсаў, у розныя сферы навакольнага асяроддзя, а таксама на ўчасткі апрацоўкі і выкіду, якія знаходзяцца ў межах прамысловых аб'ектаў ці за іх межамі.
10. Ніводная ўмова дадзенага артыкула не прымяншае права бакоў адмаўляць у раскрыцці экалагічнай інфармацыі згодна з артыкулам 4, пунктамі 3 і 4.

**Артыкул 6. Удзел грамадскасці ў прыняцці рашэнняў пра пэўныя віды дзейнасці**

1. Кожны бок:
(a) ужывае ўмовы дадзенага артыкула адносна рашэнняў пра мэтазгоднасць дазволу планаваных відаў дзейнасці, пералічаных у дадатку I;
(b) згодна са сваім нацыянальным заканадаўствам таксама ўжывае ўмовы дадзенага артыкула адносна рашэнняў пра планаваныя віды дзейнасці, не пералічаныя ў дадатку I, якія могуць значна паўплываць на навакольнае асяроддзе. З гэтай мэтай бакі вызначаюць, ці падпадае гэты планаваны від дзейнасці пад дадзеныя ўмовы; і
(c) можа вырашаць у кожным канкрэтным выпадку, калі гэта прадугледжана нацыянальным заканадаўствам, не ўжываць умоў дадзенага артыкула адносна планаваных відаў дзейнасці, якія служаць мэтам нацыянальнай абароны, калі бок лічыць, што такое ўжыванне можа негатыўным чынам паўплываць на гэтыя мэты.
2. Зацікаўленая грамадскасць адэкватна, своечасова і эфектыўна інфармуецца, у залежнасці ад абставінаў, шляхам публічнага паведамлення ці індывідуальным парадкам на самым пачатковым этапе працэдуры прыняцця рашэнняў па пытаннях навакольнага асяроддзя, у прыватнасці, пра:
(a) запланаваную дзейнасць і заяўку, па якой будзе прымацца рашэнне;
(b) характар магчымых рашэнняў ці праект рашэння;
(c) дзяржаўны орган, адказны за прыняцце рашэння;
(d) прадугледжаную працэдуру, уключна з тым, якім чынам і калі гэтая інфармацыя можа быць пададзеная:
(i) пра пачатак працэдуры;
(ii) пра магчымасці ўдзелу грамадскасці;
(iii) пра час і месца ўсякага меркаванага публічнага слухання;
(iv) пра наяўнасць дзяржаўнага органа, ад якога можна атрымаць адпаведную інфармацыю, ці пра тое, куды адпаведная інфармацыя была перададзеная для разгляду грамадскасцю;
(v) пра наяўнасць адпаведнага дзяржаўнага органа ці якога іншага афіцыйнага органа,

якім могуць накіроўвацца каментары ці пытанні, а таксама пра расклад, паводле якога могуць накіроўвацца каментары ці пытанні; і

(vi) пра тое, якая экалагічная інфармацыя, што датычыць планаванага віду дзейнасці, маецца ў наяўнасці; і

(e) ахоп дадзенага віду дзейнасці нацыянальнай ці трансгранічнай працэдуры ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе.

3. Працэдуры ўдзелу грамадскасці прадугледжваюць разумныя часавыя рамкі для розных этапаў, якія забяспечваюць дастаткова часу для інфармавання грамадскасці згодна з пунктам 2 вышэй і падрыхтоўкі эфектыўнага ўдзелу грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў аб пытаннях, што датычаць навакольнага асяроддзя.

4. Кожны бок забяспечвае ўдзел грамадскасці на самым раннім этапе, калі адкрытыя ўсе магчымасці для разгляду розных варыянтаў і калі можа быць забяспечаны эфектыўны ўдзел грамадскасці.

5. Кожны бок у адпаведных выпадках заахвочвае патэнцыйных заяўнікаў перад падачай запыту вызначыць зацікаўленую грамадскасць, каб правесці абмеркаванні і забяспечыць інфармацыю адносна мэтаў іх заяўкі.

6. Кожны бок патрабуе ад кампетэнтных дзяржаўных органаў забяспечыць зацікаўленай грамадскасці на яе запатрабаванне, калі гэта патрабуецца нацыянальным заканадаўствам, бясплатны доступ да ўсёй інфармацыі, што датычыць працэсу прыняцця рашэння, згаданага ў гэтым артыкуле, якая даступная на момант правядзення працэдуры ўдзелу грамадскасці, у мэтах яе вывучэння і па меры яе паступлення без шкоды для права бакоў адмаўляць у раскрыцці пэўнай інфармацыі згодна з пунктамі 3 і 4 артыкула

4. Адпаведная інфармацыя мусіць без шкоды ўмовам артыкула 4 уключаць:

(a) апісанне аб’екта, фізічныя і тэхнічныя характарыстыкі прапанаванай дзейнасці, уключна з ацэнкай меркаваных рэштак і выкідаў;

(b) апісанне значнага ўплыву планаванай дзейнасці на навакольнае асяроддзе;

(c) апісанне мер, прадугледжаных для прадухілення і/ці зніжэння ўздзеяння, уключна з выкідамі;

(d) нетэхнічнае рэзюме вышэйпералічанага;

(e) план асноўных альтэрнатыў, разгледжаных заяўнікам; і

(f) згодна з нацыянальным заканадаўствам, асноўныя даклады і рэкамендацыі, скіраваныя ў дзяржаўны орган на момант, калі зацікаўленай грамадскасці будзе падавацца інфармацыя згодна з пунктам 2 вышэй.

7. Працэдуры ўдзелу грамадскасці дазваляюць ёй у пісьмовай форме ці ў неабходных выпадках цягам публічнага слухання, ці разгляду пытання разам з заяўнікам любыя заўвагі, звесткі, аналіз і меркаванні, якія, як яна лічыць, маюць дачыненне да планаванай дзейнасці.

8. Кожны бок забяспечвае, каб у рашэнні належным чынам улічваліся вынікі ўдзелу грамадскасці.

9. Кожны бок забяспечвае, каб пасля прыняцця рашэння дзяржаўным органам грамадскасць была неадкладна інфармаваная пра рашэнне згодна з адпаведнымі працэдурамі. Кожны бок выкладае для грамадскасці тэкст рашэння разам з прычынамі і меркаваннямі, на якіх грунтуецца рашэнне.

10. Кожны бок забяспечвае, каб пры пераглядзе ці абнаўленні дзяржаўным органам умоў правядзення дзейнасці, памянёнай у пункце 1, умовы пунктаў 2—9 дадзенага артыкула ўжываліся mutatis mutandis, а таксама ў тых выпадках, калі гэта мэтазгодна.

11. Кожны бок у рамках свайго нацыянальнага заканадаўства ўжывае ў магчымай ступені і належным чынам умовы гэтага артыкула адносна рашэнняў пра выдачу дазволаў на выкід генетычна мадыфікаваных арганізмаў у навакольнае асяроддзе.

**Артыкул 7. Удзел грамадскасці ў вырашэнні пытанняў адносна планаў, праграм і палітыкі, якія датычаць навакольнага асяроддзя**

Кожны бок прадугледжвае практычныя і/ці іншыя ўмовы для грамадскага ўдзелу ў падрыхтоўцы планаў і праграм адносна навакольнага асяроддзя ў рамках адкрытай і справядлівай структуры, забяспечыўшы для грамадскасці неабходную інфармацыю. У гэтых рамках ужываюцца палажэнні артыкула 6, пункты 3, 4 і 8. Грамадскасць, якая можа браць удзел, вызначаецца адпаведным дзяржаўным органам, улічваючы мэты дадзенай Канвенцыі. Кожны бок, наколькі гэта магчыма, імкнецца забяспечыць магчымасці для ўдзелу грамадскасці ў падрыхтоўцы стратэгіяў, якія адносяцца да навакольнага асяроддзя.

**Артыкул 8. Удзел грамадскасці падчас падрыхтоўкі пастаноў , якія маюць беспасярэднюю выканаўчую сілу, і/ці агульнаўжывальных юрыдычна абавязковых нарматыўных актаў**

Кожны бок імкнецца да спрыяння эфектыўнаму ўдзелу грамадскасці на адпаведным этапе, пакуль застаюцца адкрытымі магчымасці для выбару варыянтаў, у падрыхтоўцы дзяржаўнымі органамі нарматыўных рамак і іншых агульнаўжывальных юрыдычна

абавязковых нормаў, якія могуць значна паўплываць на навакольнае асяроддзе. З гэтай мэтай прымаюцца наступныя меры:

(a) усталёўваюцца тэрміны, дастатковыя для эфектыўнага ўдзелу;

(b) праекты пастаноў публікуюцца ці выдаюцца грамадскасці іншым чынам; і

(c) грамадскасці даецца магчымасць выказаць свае заўвагі беспасярэдне ці праз прадстаўнічыя кансультацыйныя органы.

Вынікі ўдзелу грамадскасці ўлічваюцца ў максімальна магчымай ступені.

**Артыкул 9. Доступ да правасуддзя**

1. Кожны бок у рамках свайго нацыянальнага заканадаўства забяспечвае кожнай асобе, якая лічыць, што яе запыт па інфармацыю згодна з пунктам 4 ігнараваны, несправядліва адхілены, цалкам ці часткова, неадэкватна задаволены ці іншым чынам не разгледжаны згодна з умовамі артыкула, доступ да перагляду працэдуры перад судом ці іншым незалежным і бесстаронім органам, утвораным згодна з законам. У тых выпадках, калі такі перагляд прадугледжаны законам, бок забяспечвае, каб такая асоба мела таксама доступ да прадугледжанай законам хуткай працэдуры, якая не патрабуе платы ці патрабуе мінімальнай платы, для паўторнага разгляду дзяржаўным органам ці разгляду незалежным і бесстаронім органам, які не з’яўляецца судом.
   Канчатковыя рашэнні згодна з дадзеным пунктам 1 будуць абавязковымі для дзяржаўнага органа, які валодае адпаведнай інфармацыяй. Прычыны ўказваюцца ў пісьмовай форме, прынамсі, там, дзе доступ да адпаведнай інфармацыі адхіляецца згодна з дадзеным пунктам.
2. Кожны бок у рамках нацыянальнага заканадаўства забяспечвае, каб прадстаўнікі зацікаўленай грамадскасці,

(a) якія выказваюць дастатковую зацікаўленасць ці

(b) якія сцвярджаюць, што адбылося парушэнне якогасьці права, калі гэтага патрабуюць адміністрацыйныя працэсуальныя нормы адпаведнага боку, мелі доступ да перагляду працэдуры перад судом і/ці іншым незалежным і бесстаронім органам, утвораным паводле закону, каб аспрэчваць законнасць рашэння, дзеяння ці бяздзеяння з матэрыяльнага і працэсуальнага пункту гледжання, пры ўмове выканання пастаноў артыкула 6 і, дзе гэта прадугледжваецца нацыянальным заканадаўствам і не супярэчыць пункту 3 ніжэй, іншых адпаведных умоў дадзенай Канвенцыі.

Наяўнасць дастатковай зацікаўленасці і парушэнне таго ці іншага права вызначаецца на падставе палажэнняў нацыянальнага заканадаўства і ў адпаведнасці з мэтай забеспячэння зацікаўленай грамадскасці шырокага доступу да правасуддзя ў рамках дадзенай Канвенцыі. У сувязі з гэтым для мэты падпункта (a) вышэй дастаткова зацікаўленасці якойсьці няўрадавай арганізацыі, якая адпавядае патрабаванням, памянёным у пункце 5 артыкула 2. Для мэты падпункта (b) вышэй такая арганізацыя таксама мае права заяўляць пра парушэнне сваіх правоў. Палажэнні дадзенага пункта 2 не выключаюць магчымасці выкарыстання працэдуры папярэдняга разгляду ў адміністрацыйным органе і не закранаюць патрабавання аб вычарпанні адміністрацыйных працэдур разгляду да звароту да судовых працэдур разгляду ў тых выпадках, калі такое патрабаванне прадугледжанае ў нацыянальным заканадаўстве.

3. У дадатак і не супярэчачы працэдурам разгляду, памянёным вышэй у пунктах 1 і 2, кожны бок забяспечвае, каб прадстаўнікі грамадскасці, якія адпавядаюць прадугледжаным у яе нацыянальным заканадаўстве крытэрам, калі такія ёсць, валодалі доступам да адміністрацыйных ці судовых працэдур для аспрэчвання дзеянняў ці бяздзеяння прыватных асоб і дзяржаўных органаў, якія парушаюць умовы нацыянальнага заканадаўства, што адносяцца да навакольнага асяроддзя.
4. У дадатак і не супярэчачы пункту 1 вышэй, працэдуры, памянёныя вышэй у пунктах 1, 2 і 3, мусяць забяспечваць адэкватныя і эфектыўныя сродкі прававой абароны, уключна, пры неабходнасці, з судовай забаронай на нейкае дзеянне, і быць справядлівымі, бесстароннімі, своечасовымі і не звязанымі з недасяжна высокімі выдаткамі. Рашэнні, што прымаюцца згодна з дадзеным артыкулам, выносяцца ці пратакалююцца ў пісьмовай форме. Грамадскасць мае доступ да рашэнняў судоў і пры магчымасці іншых органаў.
5. Для павышэння эфектыўнасці палажэнняў дадзенага артыкула кожны бок забяспечвае, каб грамадскасці выдавалася інфармацыя пра доступ да адміністрацыйных і судовых працэдур, і разглядае пытанне стварэння адпаведных механізмаў аказання дапамогі для скасавання ці змяншэння фінансавых ці іншых перашкод для доступу да правасуддзя.

(...)

**Артыкул 13. Дадаткі**

Дадаткі да Канвенцыі з’яўляюцца яе складовай часткай (...)

**Дадатак I. Пералік відаў дзейнасці, памянёных у Артыкуле 6, пункце 1 (a)**

**1. Энергетыка:**
- нафтаперапрацоўчыя і газаперапрацоўчыя заводы;
- установкі для газіфікацыі і звадкавання;
- цеплавыя электрастанцыі ды іншыя ўстаноўкі для спальвання з падведзенай цеплавой магутнасцю 50 мегават (МВт) ці болей;
- коксавыя печы;
- атамныя электрастанцыі ды іншыя атамныя рэактары, уключна з дэмантажам ці вывадам з эксплуатацыі такіх электрастанцыяў ці рэактараў (акрамя даследніцкіх установак для вытворчасці і канверсіі расшчапляльных і ўзнаўляльных матэрыялаў, максімальная магутнасць якіх не перавышае 1 кВт пастаяннай цеплавой нагрузкі);
- установкі для перапрацоўкі апрамененага ядзернага паліва;
- установкі, распрацаваныя:
- для вытворчасці ці ўзбагачэння ядзернага паліва;
- для перапрацоўкі апрамененага ядзернага паліва ці высокарадыеактыўных выкідаў;
- для канчатковага выдалення апрамененага ядзернага паліва;
- выключна для канчатковага выдалення радыеактыўных выкідаў;
- выключна для перахоўвання (запланаванага на больш як 10 гадоў) апрамененага ядзернага паліва ці радыеактыўных выкідаў у іншых месцах за межамі тэрыторыі вытворчага аб'екта.

**2. Вытворчасць і апрацоўка металаў:**
- установкі для абпальвання ці агламерацыі металічных руд (уключна з сульфіднай рудой);
  (…)

**3. Прамысловасць па перапрацоўцы мінеральнай сыравіны:**
- установкі для вытворчасці цэментнага клінкера ў барабанных печах для абпальвання з прадукцыйнай магутнасцю больш за 500 т за дзень ці вапны ў барабанных печах для абпальвання з прадукцыйнай магутнасцю больш за 50 т за дзень ці ў іншых печах з прадукцыйнай магутнасцю болей за 50 т за дзень;
  (…)

**4. Хімічная прамысловасць:** вытворчасць у межах значэння катэгорыяў дзейнасці, якія ўтрымліваюцца ў гэтым пункце, азначае вытворчасць у прамысловых маштабах з дапамогай хімічнай апрацоўкі рэчываў ці груп рэчываў, пералічаных у падпунктах (a) — (g):

(a) хімічныя ўстаноўкі для вытворчасці асноўных арганічных хімічных рэчываў, такіх, як:

a) хімічныя ўстаноўкі для вытворчасці асноўных арганічных хімічных рэчываў, такіх, як:
- i) простыя вуглевадароды (лінейныя або цыклічныя, насычаныя або ненасычаныя, аліфатычныя або араматычныя);
- ii) вуглевадароды з утрыманнем кіслароду, такія, як спірты, альдэгіды, кетоны, карбоновыя кіслоты, складаныя эфіры, ацэтаты, простыя эфіры, перакісы, эпаксідныя смолы;
- iii) сярністыя вуглевадароды;
- iv) азотныя вуглевадароды, такія, як амін, аміды, злучэнні азоту, нітразлучэнні або нітратныя злучэнні, нітрылы, цыянаты, ізацыянаты;
- v) вуглевадароды з утрыманнем фосфару;
- vi) галагенізаваныя вуглевадароды;
- vii) арганаметалічныя злучэнні;
- viii) асноўныя пластычныя матэрыялы (палімеры, сінтэтычныя валокны і валокны на базе цэлюлозы);
- ix) сінтэтычны каўчук;
- x) фарбы і пігменты;
- xi) паверхнева-актыўныя рэчывы;

b) хімічныя ўстаноўкі для вытворчасці асноўных неарганічных рэчываў, такіх, як:
- i) газы, такія, як аміяк, хлор або хлорысты вадарод, фтор або фторысты вадарод, аксід вугляроду, злучэнні серы, аксід азоту, вадарод, дыяксід серы, хлорвокіс вугляроду;
- ii) кіслоты, такія, як хромавая кіслата, фторыставадародная кіслата, фосфарная кіслата, азотная кіслата, хлорыставадародная кіслата, серная кіслата, олеум, сярністая кіслата;
- iii) шчолакі, такія, як гідравокіс амонію, гідравокіс калію, гідравокіс натрыю;
- iv) солі, такія, як хлорысты амоній, хларнаватакіслы калій, вуглякіслы калій, вуглякіслы натрый, пербарат, азотнакіслае срэбра;
- v) неметалы, аксіды металаў або іншыя неарганічныя злучэнні, такія, як карбід кальцыю, крэмній, карбід крэмнію;

c) хімічныя ўстаноўкі для вытворчасці фосфарных, азотных або калійных мінеральных угнаенняў (простых або складаных угнаенняў);
d) хімічныя ўстаноўкі для вытворчасці асноўных прадуктаў для раслінаводства і біяцыдаў;
e) устаноўкі, на якіх выкарыстоўваюцца хімічныя або біялагічныя працэсы для вытворчасці асноўных фармацэўтычных прадуктаў;
f) хімічныя ўстаноўкі для вытворчасці выбуховых рэчываў;
g) хімічныя ўстаноўкі, у якіх хімічныя або біялагічныя працэсы выкарыстоўваюцца для вытворчасці бялковых кармавых дабавак, ферментаў і іншых бялковых рэчываў.

**5. Апрацоўка і выдаленне адкідаў:**
- устаноўкі для спальвання, рэкуперацыі, хімічнай апрацоўкі або пахавання небяспечных адкідаў;
- устаноўкі для спальвання камунальна-бытавых адкідаў з прадукцыйнасцю, якая перавышае 3 т за гадзіну;
- устаноўкі для выдалення бяспечных адкідаў з прадукцыйнасцю, якая перавышае 50 т за дзень;
- сметнікі, на якія надыходзіць больш за 10 т адкідаў за дзень, або з агульнай ёмістасцю, якая перавышае 25 000 т, выключаючы сметнікі інэртных адкідаў.

**6. Устаноўкі для ачысткі сцёкавых вод з прадукцыйнасцю, якая перавышае эквівалент колькасці насельніцтва ў памеры 150 000 чалавек.**

**7. Прамысловыя ўстаноўкі для:**
a) вытворчасці цэлюлозы з драўніны або аналагічных валакністых матэрыялаў;
b) вытворчасці паперы і кардону з вытворчай магутнасцю, што перавышае 20 т у дзень.

**8.** a) Будаўніцтва чыгуначных ліній дальняга злучэння і аэрапортаў з даўжынёй асноўнай узлётна-пасадачнай паласы 2100 м ці большай; b) будаўніцтва аўтамагістраляў і хуткасных дорог;
c) будаўніцтва новых дарог, якія маюць чатыры або больш палосаў руху, ці рэканструкцыя і / або пашырэнне існых дарог, якія маюць дзве ці менш палосаў руху, з мэтай стварэння чатырох або больш палосаў для руху там, дзе такая новая дарога ці рэканструяваны і / або пашыраны ўчастак дарогі будуць мець бесперапынна працягласць 10 км або большую.

**9.** a) Унутраныя водныя шляхі і парты для ўнутранага суднаходства, якія дапускаюць праход суднаў водазмяшчэннем большым за 1350 т;
b) гандлёвыя парты, прычалы для пагрузкі і разгрузкі, звязаныя з берагавымі і вынаснымі партамі (за выключэннем прычалаў паромных пераправаў), якія могуць прымаць судны водазмяшчэннем большым за 1350 т.

**10. Забор падземных водаў або сістэмы штучнага папаўнення падземных водаў са штогадовым аб'ёмам забірання або папаўнення вады, эквівалентным або большым за 10 млн м3.**
(...)

**12. Здабыча нафты і прыроднага газу ў камерцыйных мэтах, пры якой здабываны аб'ём перавышае 500 т у дзень у выпадку нафты і 500 000 м3 у дзень ў выпадку газу.**

**13. Плаціны і іншыя аб'екты, прызначаныя для ўтрымання або пастаяннага захоўвання вады, для якіх новы або дадатковы аб'ём вады, што затрымліваецца ці захоўваецца, перавышае 10 млн м3.**

**14. Трубаправоды для транспартавання газу, нафты або хімічных рэчываў дыяметрам большым за 800 мм і працягласцю большай за 40 км.**

**15. Устаноўкі для інтэнсіўнае гадоўлі птушкі або свіней, разлічаныя на больш чым:**
a) 40 000 месцаў для птушкі;
b) 2 000 месцаў для адкорму падсвінкаў (вагой большай за 30 кг); або
c) 750 месцаў для свінак.

**16. Кар'еры і адкрытая здабыча карысных выкапняў з паверхняй ўчастка, якая перавышае 25 га, або здабыча торфу, пры якой паверхня ўчастка перавышае 150 га.**

**17. Будаўніцтва паветраных ліній электраперадачы з напругай 220 кВ або большай і працягласцю, большай за 15 км.**

**18. Устаноўкі для захоўвання нафты, нафтахімічных або хімічных прадуктаў умяшчальнасцю 200 000 т або большай.**

**19. Іншыя віды дзейнасці:**

- устаноўкі для папярэдняй апрацоўкі (такія аперацыі, як прамыванне, адбельванне, мерсерызацыя) або фарбаванне валакна або тэкстылю, на якіх аб'ём апрацоўваных матэрыялаў перавышае 10 т за дзень;
- устаноўкі для дублення скураў, на якіх аб'ём перапрацоўкі перавышае 12 т апрацаваных прадуктаў за дзень;

a) бойні з магутнасцямі па перапрацоўцы тушаў большымі, чым 50 т за дзень;
b) апрацоўка і перапрацоўка з мэтай вытворчасці харчовых прадуктаў з:
i) жывёльнай сыравіны (акрамя малака) з магутнасцямі па вытворчасці гатовай прадукцыі, большымі за 75 т за дзень;
ii) раслiннай сыравіны з вытворчымі магутнасцямі, большымі за 300 т гатовай прадукцыі за дзень (сярэдні паказчык на квартальнай аснове);
c) апрацоўка і перапрацоўка малака, пры якой колькасць атрыманага малака перавышае 200 т за дзень (сярэдні паказчык на штогадовай аснове);

- устаноўкі для (...) рэцыркуляцыі тушаў хатніх жывёл або адкідаў жывёлагадоўлі з перапрацоўчай магутнасцю большай, чым 10 т за дзень;
- устаноўкі для паверхневай апрацоўкі рэчываў, прадметаў або прадуктаў з выкарыстаннем арганічных растваральнікаў, у прыватнасці, для аздаблення, друку, пакрыцця, абястлушчвання, гідраізалявання, калібравання, афарбоўвання, ачышчэння або прапітвання, з вытворчай магутнасцю большай за 150 кг за гадзіну або большай за 200 т за год;

(...)

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА І ЎСЁАБДЫМНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ БЯСПЕКІ АРГАНІЗАЦЫІ ПА БЯСПЕЦЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВЕ Ў ЕЎРОПЕ (АБСЕ). АБАВЯЗАЛЬНІЦТВЫ ПА АБСЕ [2]

АБСЕ была ўтвораная як арганізацыя па бяспецы. Аднак яна займаецца не толькі пытаннямі ваеннай бяспекі, раззбраення ці памежнымі пытаннямі. Заснаваная на шырокай канцэпцыі бяспекі, арганізацыя займаецца таксама правамі чалавека. АБСЕ лічыць, што бяспека — гэта нешта большае за адсутнасць вайны. Фактычна дзяржавы-ўдзельніцы АБСЕ імкнуліся стварыць усёабдымныя рамкі для міру і стабільнасці ў Еўропе. У Хельсінскім Заключным акце ў якасці аднаго з дзесяці кіраўнічых прынцыпаў прызнаецца павага правоў чалавека і асноўных свабод, уключна са свабодай думкі, сумлення, рэлігіі і перакананняў. Гэта стала нарожным каменем у гісторыі абароны правоў чалавека. Упершыню правы чалавека былі ўключаныя ў якасці дакладна сфармуляванага складовага элемента ў рамкі рэгіянальнай бяспекі на той самай аснове, што і ваенна-палітычныя і эканамічныя пытанні. Такое прызнанне было надалей умацаванае шматлікімі наступнымі дакументамі. Таму сёння дадзены факт можна лічыць адбытым і бессумнеўным. Гэтыя прынцыпы не маюць паміж сабой пэўнай іерархіі, і таму ніякі ўрад не можа сцвярджаць, што спачатку ім неабходна забяспечыць палітычную ці эканамічную бяспеку, а ўжо затым займацца пытаннямі правоў чалавека і дэмакратыі. Паводле тэрміналогіі АБСЕ, тэрмін *чалавечае вымярэнне* выкарыстоўваецца для азначэння набору нормаў і відаў дзейнасці, звязаных з правамі чалавека і дэмакратыяй, а таксама верхавенствам закону, якія разглядаюцца ў АБСЕ як адны з трох вымярэнняў бяспекі, поруч з ваенна-палітычным і эканамічна-экалагічным вымярэннямі. Дадзены тэрмін сведчыць таксама пра тое, што нормы АБСЕ, што адносяцца да чалавечага вымярэння, ахопліваюць больш шырокую сферу, чым традыцыйнае права правоў чалавека.

**«Працэс» АБСЕ**

Ад самага моманту свайго ўтварэння АБСЕ была працэсам. Хельсінскі Заключны акт прадугледжвае правядзенне рэгулярных далейшых канферэнцый і сустрэч. Гэта вельмі важна для разумення рамак правоў чалавека АБСЕ.

Па-першае, гэта значыць, што існуе форум для абмеркавання выканання стандартаў, узгодненых на папярэдніх сустрэчах. Па-другое, гэта дало мажлівасць ўхваліць цэлую серыю паслядоўных дакументаў АБСЕ, якія ўдакладняюць і развіваюць абавязальніцтвы ў сферы чалавечага вымярэння, прынятыя ў папярэдніх дакументах. У выніку АБСЕ стварыла даволі гнуткі і дынамічны нарматворчы працэс у сферы правоў чалавека — працэс, які стаў пастаянным. Сярод новаўвядзенняў, зафіксаваных у апошніх дакументах, можна адзначыць, напрыклад, прызнанне гандлю людзьмі праблемай правоў чалавека, хаця раней яна зазвычай разглядалася ў кантэксце арганізаванай злачыннасці (Венскае паседжанне Рады міністраў 2000 г.). Абавязальніцтвы АБСЕ зазвычай прымаюць форму дакументаў, ухваленых кансенсусам на сустрэчах на найвышэйшым узроўні ці на ўзроўні міністраў дзяржаў-удзельніц АБСЕ. Кожная такая сустрэча ладзіцца ў пэўнай палітычнай атмасферы і кантэксце. Не дзіва, што сустрэчы на найвышэйшым узроўні АБСЕ адыгралі розную ролю ў стварэнні новых абавязальніцтваў. І калі пэўныя сустрэчы, у прыватнасці, на пачатку 1990-х гг., дазволілі распрацаваць шырокі набор важных новых нормаў, то іншыя абмежаваліся нязначнымі змяненнямі і дадаткамі. Гэткі працэсавы падыход прывёў да вялікай колькасці дакументаў АБСЕ. У выніку спецыялістам-практыкам не заўсёды лёгка вызначыць, якія менавіта стандарты ўжываюцца ў канкрэтнай сітуацыі, асабліва ўлічваючы, што ў кожным дакуменце ў той ці іншай ступені ўтрымліваюцца як паўтарэнні, так і навелы. Як галоўны арыенцір, варта мець на ўвазе, што ўсе дакументы ў сукупнасці ўтвараюць нарматыўныя рамкі АБСЕ. Гэта значыць, з прыняццем новых дакументаў ужо наяўныя дакументы не страчваюць сваёй сілы. Дакументы абапіраюцца адзін на адзін і ўтвараюць тое, што можна назваць прававым парадкам АБСЕ. Яны былі ўхваленыя на аснове кансенсусу і такім чынам палітычна абавязковыя для ўсіх дзяржаў-удзельніц АБСЕ. Гэта таксама адносіцца і да наноў прынятых у АБСЕ дзяржаў, якія пры ўступленні абавязаныя прызнаць гэты парадак. У выніку не варта абапірацца на якімсьці адным дакуменце, але неабходна праверыць цэлы шэраг наяўных дакументаў дзеля таго, каб вызначыць фактычны аб'ём абавязальніцтваў па тым ці іншым праве ці асноўнай свабодзе. Часцяком у раней прынятым дакуменце толькі абвяшчаецца агульны прынцып, які пазней атрымлівае развіццё ў наступных дакументах.

**Абавязальніцтвы ў сферы чалавечага вымярэння і плюралістычная дэмакратыя, заснаваная на вяршэнстве закону**

У шэрагу выпадкаў абавязальніцтвы ў сферы чалавечага вымярэння АБСЕ ідуць нашмат

[2] (паводле http://www.osce.org/publications/odihr/2005/09/16237_440_en.pdf)

далей, чым «традыцыйныя», юрыдычна абавязковыя інструменты ў сферы правоў чалавека. У традыцыйных дамовах у сферы правоў чалавека фармулююцца асабістыя (ці калектыўныя) правы, а дзяржава-ўдзельніца абавязуецца выконваць і/ці гарантаваць гэтыя правы. Аднак у большасці выпадкаў парадак выканання гэтых абавязальніцтваў пакідаецца на одум дзяржаваў. Чалавечае вымярэнне АБСЕ ідзе нашмат далей шляхам звязвання правоў чалавека з інстытуцыйнай і палітычнай сістэмай дзяржавы. Па сутнасці, дзяржавы-ўдзельніцы АБСЕ, узяўшы на сябе абавязальніцтвы ў сферы чалавечага вымярэння, пагадзіліся з тым, што плюралістычная дэмакратыя, заснаваная на вяршэнстве закону, уяўляе з сябе адзіную сістэму кіравання, здольную эфектыўна гарантаваць правы чалавека. Гэта тлумачыць, чаму чалавечае вымярэнне АБСЕ было названае агульнаеўрапейскім грамадскім парадкам. Іншымі словамі, АБСЕ — гэта не проста арганізацыя, якая яднае 56 дзяржаў, але супольнасць каштоўнасцяў. Гэтую сувязь адлюстроўвае і актыўная прыхільнасць да вяршэнства закону і сама яго фармулёўка: канцэпцыя, заснаваная на годнасці чалавечай асобы, і сістэма правоў, рэалізаваных праз судова-праўныя структуры.

**Абавязальніцтвы, палітычна абавязковыя да выканання**
Працэс АБСЕ збольшага ўяўляе палітычны працэс, які не стварае юрыдычна абавязковых нормаў і прынцыпаў. Адрозна ад іншых дакументаў, звязаных з правамі чалавека, абавязальніцтвы ў сферы чалавечага вымярэння АБСЕ хутчэй палітычна, чым юрыдычна абавязковыя. Гэта важнае адрозненне, бо яно абмяжоўвае магчымасці выкарыстання прававых механізмаў для выканання стандартаў АБСЕ. Іншымі словамі, выкананне абавязальніцтваў АБСЕ нельга забяспечыць праз суд. Аднак гэта не варта памылкова разумець як сведчанне адсутнасці ў іх абавязковай сілы. Тут трэба праводзіць адрозненне паміж юрыдычна і палітычна, а не паміж абавязковыя і неабавязковыя. Гэта значыць, што абавязальніцтвы па АБСЕ ўяўляюць нешта большае, чым простую дэкларацыю волі ці добрых намераў: гаворка ідзе пра палітычнае абяцанне выконваць гэтыя стандарты. Калі для абмеркавання міжнародных прававых дакументаў зазвычай патрабуецца значны час, перш чым удасца ўзгадніць канчатковы тэкст, а заключныя дакументы з’яўляюцца прадметам ратыфікацыі, то да дакументаў АБСЕ гэта не мае дачынення. Іх палітычная прырода стварае ўнікальную сітуацыю: пасля таго як паміж дзяржавамі быў дасягнуты кансенсус, рашэнні ўступаюць у сілу неадкладна і ў прынцыпе з’яўляюцца абавязковымі для ўсіх дзяржаў-удзельніц АБСЕ (гэтак званы прынцып універсальнасці). Гэта дазваляе АБСЕ аператыўна рэагаваць на новыя патрэбы. Так, калі на пачатку 1990-х пашырыліся выпадкі парушэння правоў чалавека ў адносінах да меншасцяў, АБСЕ першай адрэагавала і распрацавала комплексны набор стандартаў у сферы абароны меншасцяў. Пазней гэтыя палітычныя стандарты паслужылі падставай для юрыдычна абавязковай Рамачнай канвенцыі Рады Еўропы па абароне нацыянальных меншасцяў.

# ЗАКЛЮЧНЫ АКТ НАРАДЫ ПА БЯСПЕЦЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВЕ Ў ЕЎРОПЕ. ХЕЛЬСІНКІ, 1975 г.

*(вытрымкі)*

(...)

Дзяржавы, якія ўдзельнічаюць у Канферэнцыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе...

(...)

Ухвалілі наступнае:

**1. (a) Дэкларацыя прынцыпаў, якімі дзяржавы-ўдзельніцы будуць кіравацца ва ўзаемаадносінах**

Дзяржавы-ўдзельніцы,

пацвярджаючы сваю прыхільнасць да міру, бяспекі і справядлівасці і да працэсу развіцця сяброўскіх адносін і супрацоўніцтва;

пацвярджаючы, што гэтая прыхільнасць, якая адлюстроўвае інтарэс і памкненні народаў, увасабляе для кожнай дзяржавы-ўдзельніцы адказнасць цяпер і ў будучыні, якая павысілася ў выніку досведу мінулага;

пацвярджаючы ў адпаведнасці з іх сяброўствам у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і ў адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый сваю поўную і актыўную падтрымку Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і спрыянне павышэнню яе ролі і эфектыўнасці ва ўмацаванні міру ў свеце, бяспекі і справядлівасці і ў спрыянні вырашэнню міжнародных праблем, а таксама развіццю сяброўскіх адносін і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі.

выражаючы сваю агульную адданасць прынцыпам, выкладзеных ніжэй і якія адпавядаюць Статуту Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а таксама сваю агульную волю дзейнічаць ва ўжыванні гэтых прынцыпаў у адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый;

заяўляюць пра сваю рашучасць шанаваць і ўжываць адносна кожнага з іх з усімі іншымі дзяржавамі-ўдзельніцамі, незалежна ад іх палітычных, эканамічных і сацыяльных сістэм, а таксама іх памеру, геаграфічнага становішча ці ўзроўню эканамічнага развіцця, наступныя прынцыпы, якія ўсе маюць першачарговую важнасць і якімі яны будуць кіравацца ва ўсіх узаемаадносінах:

**I. Суверэнная роўнасць, павага правоў, уласцівых суверэнітэту**

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць шанаваць суверэнную роўнасць і своеасаблівасць, а таксама ўсе правы, уласцівыя суверэнітэту і ахопленыя ім, уключна, у прыватнасці, з правам кожнай дзяржавы на юрыдычную роўнасць, тэрытарыяльную цэласнасць, свабоду і палітычную незалежнасць. Яны таксама будуць шанаваць права адно аднаго вольна выбіраць і развіваць свае палітычныя, сацыяльныя, эканамічныя і культурныя сістэмы, а таксама права ўсталёўваць свае законы і адміністрацыйныя правілы.

У рамках міжнароднага права ўсе дзяржавы-ўдзельніцы маюць роўныя правы і абавязкі. Яны будуць шанаваць права адно аднаго вызначаць і ажыццяўляць на свой погляд адносіны з іншымі дзяржавамі згодна з міжнародным правам і ў духу дадзенай Дэкларацыі. Яны лічаць, што іх межы могуць змяняцца ў адпаведнасці з міжнародным правам, мірным шляхам і па дамоўленасці. Таксама яны маюць права быць ці не быць членамі міжнародных арганізацый, быць ці не быць удзельнікамі двухбаковых ці шматбаковых дамоваў, уключна з правам быць ці не быць членам саюзных дамоваў; яны таксама маюць права на нейтралітэт.

**II. Устрыманне ад ужывання сілы ці пагрозы ўжывання сілы**

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць устрымлівацца ў сваіх узаемадачыненнях, а таксама ў міжнародных адносінах ад ужывання сілы ці пагрозы ўжывання сілы як супраць тэрытарыяльнай цэласнасці ці палітычнай незалежнасці любой дзяржавы, так і любым іншым чынам, несумяшчальным з мэтамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і з дадзенай Дэкларацыяй. Ніякія меркаванні не могуць выкарыстоўвацца для таго, каб абгрунтоўваць зварот да ўжывання сілы ці пагрозы ўжывання сілы ў парушэнне гэтага прынцыпу.

Адпаведна, дзяржавы-ўдзельніцы будуць устрымлівацца ад любых дзеянняў, якія ўяўляюць пагрозу ўжывання сілы або простае ці ўскоснае ўжыванне сілы супраць іншай дзяржавы-ўдзельніцы. Роўным чынам яны будуць устрымлівацца ад якіх-кольвек праяваў сілы з мэтай прымусіць іншую дзяржаву-ўдзельніцу адмовіцца ад поўнага ажыццяўлення яе суверэнных правоў. Роўным чынам яны таксама будуць устрымлівацца ў сваіх узаемадачыненнях ад любых актаў рэпрэсаліяў з дапамогай сілы. Ніякае такое ўжыванне сілы ці пагрозы ўжывання сілы не будзе выкарыстоўвацца як сродак вырашэння спрэчак ці пытанняў, якія могуць спрычыніцца да паўстання спрэчак.

**III. Непарушнасць межаў**
Дзяржавы-ўдзельніцы разглядаюць як непарушныя ўсе межы адно аднаго, так і межы ўсіх дзяржаў у Еўропе, і таму яны будуць устрымлівацца цяпер і ў будучыні ад замахаў на гэтыя межы.
Адпаведна, яны таксама будуць устрымлівацца ад любых патрабаванняў ці дзеянняў, скіраваных на захоп і ўзурпацыю часткі ці ўсяе тэрыторыі якой-небудзь дзяржавы-ўдзельніцы.

**IV. Тэрытарыяльная цэласнасць дзяржаў**
Дзяржавы-ўдзельніцы будуць шанаваць тэрытарыяльную цэласнасць кожнай з дзяржаў-удзельніц. Згодна з гэтым яны будуць устрымлівацца ад любых дзеянняў, несумяшчальных з мэтамі і прынцыпамі Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, супраць тэрытарыяльнай цэласнасці, палітычнай незалежнасці ці адзінства любой дзяржавы-ўдзельніцы і, у прыватнасці, ад любых дзеянняў, якія ўяўляюць ужыванне сілы ці пагрозу ўжывання сілы. Дзяржавы-ўдзельніцы будуць роўным чынам устрымлівацца ад таго, каб ператвараць тэрыторыю адно аднаго ў аб'ект вайсковай акупацыі ці іншых простых ці ўскосных мер ужывання сілы насуперак міжнароднаму праву ці ў аб'ект куплі з дапамогай такіх мер ці пагрозы іх здзяйснення. Ніякая падобная акупацыя ці купля не будуць прызнавацца законнымі.

**V. Мірнае вырашэнне спрэчак**
Дзяржавы-ўдзельніцы будуць вырашаць спрэчкі паміж сабой мірнымі сродкамі такім чынам, каб не ставіць пад пагрозу міжнародны мір, бяспеку і справядлівасць. Яны будуць добрасумленна і ў духу супрацоўніцтва імкнуцца да таго, каб у кароткі тэрмін прыйсці да справядлівага рашэння, заснаванага на міжнародным праве. Для гэтай мэты яны будуць выкарыстоўваць такія сродкі, як перамовы, запыты, пасярэдніцтва, замірэнне, арбітраж, судовае разбіральніцтва ці іншыя мірныя сродкі на свой уласны выбар, уключна з кожнай працэдурай урэгулявання, узгодненай да ўзнікнення спрэчак, у якіх яны былі бакамі. У тым выпадку, калі бакі ў спрэчцы не дасягнуць яе вырашэння шляхам аднаго з вышэйпамянёных мірных сродкаў, яны будуць працягваць шукаць узаемна ўзгодненыя шляхі мірнага вырашэння спрэчкі. Дзяржавы-ўдзельніцы, якія выступаюць бакамі ў спрэчцы паміж імі, як і іншыя дзяржавы-ўдзельніцы, будуць устрымлівацца ад усякіх дзеянняў, якія могуць пагоршыць становішча ў такой ступені, што будзе пастаўленае пад пагрозу падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі, і тым самым яшчэ больш ускладніць мірнае вырашэнне спрэчкі.

**VI. Неўмяшанне ва ўнутраныя справы**
Дзяржавы-ўдзельніцы будуць устрымлівацца ад любога ўмяшання, простага ці ўскоснага, індывідуальнага ці калектыўнага ва ўнутраныя ці замежныя справы, якія ўваходзяць ва ўнутраную кампетэнцыю іншай дзяржавы-ўдзельніцы, незалежна ад іх узаемадачыненняў. Яны будуць, адпаведна, устрымлівацца ад любой формы ўзброенай інтэрвенцыі ці пагрозы такой інтэрвенцыі супраць іншай дзяржавы-ўдзельніцы. Яны будуць таксама пры ўсіх акалічнасцях устрымлівацца ад любога іншага акту вайсковага ці палітычнага, эканамічнага ці іншага прымусу, скіраванага на тое, каб падпарадкаваць сваім уласным інтарэсам выкананне іншай дзяржавай-удзельніцай правоў, уласцівых яе суверэнітэту, і такім чынам забяспечыць сабе перавагі любога кшталту. Адпаведна, яны будуць, у тым ліку, устрымлівацца ад аказання простай ці ўскоснай дапамогі тэрарыстычнай, падрыўной ці іншай дзейнасці, скіраванай на гвалтоўнае скіданне рэжыму ў іншай дзяржавы-ўдзельніцы.

**VII. Павага да правоў чалавека і асноўных свабод, уключна са свабодай думкі, сумлення, рэлігіі ці перакананняў**
Дзяржавы-ўдзельніцы будуць шанаваць правы чалавека і асноўныя свабоды, уключна са свабодай думкі, сумлення, рэлігіі ці перакананняў, для ўсіх, без адрознення расы, мовы, полу ці рэлігіі.
Яны будуць заахвочваць і развіваць эфектыўную рэалізацыю грамадзянскіх, палітычных, эканамічных, сацыяльных, культурных ды іншых правоў і свабод, якія ўсе вынікаюць з годнасці, уласцівай чалавечай асобе, і якія з'яўляюцца істотнымі для яе свабоднага і поўнага развіцця. У гэтых рамках дзяржавы-ўдзельніцы будуць прызнаваць і паважаць свабоду асобы спавядаць, паасобку ці супольна з іншымі, рэлігію ці веру, дзейнічаючы згодна з наказамі свайго сумлення. Дзяржавы-ўдзельніцы, на тэрыторыі якіх ёсць нацыянальныя меншасці, будуць шанаваць права асоб, якія належаць да такіх меншасцяў, на роўнасць перад законам, будуць даваць ім поўную магчымасць фактычнага карыстання правамі чалавека і асноўнымі свабодамі і будуць такім чынам абараняць іх законныя інтарэсы ў гэтай сферы. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць усеагульнае значэнне правоў чалавека і асноўных свабод, павага якіх з'яўляецца істотным фактарам міру, справядлівасці і дабрабыту, неабходным для забеспячэння сяброўскіх адносін і супрацоўніцтва як паміж імі, так і паміж усімі дзяржавамі. Яны будуць пастаянна шанаваць гэтыя правы і свабоды ў сваіх узаемадачыненнях і будуць намагацца, супольна з іншымі ці

паасобку, уключна з супрацоўніцтвам з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый, спрыяць усеагульнаму і эфектыўнаму іх ажыццяўленню. Яны пацвярджаюць права асоб ведаць свае правы і абавязкі ў гэтай сферы і дзейнічаць згодна з імі. У сферы правоў чалавека і асноўных свабод дзяржавы-ўдзельніцы будуць дзейнічаць у адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі Статута ААН і Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Яны будуць таксама выконваць свае абвязкі, як яны прадугледжаны ў міжнародных дэкларацыях і пагадненнях у гэтай сферы, уключна ў тым ліку з Міжнароднымі пактамі па правах чалавека, калі дзяржавы звязаныя такімі абавязальніцтвамі.

**VIII. Роўныя правы і самавызначэнне народаў**

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць шанаваць раўнапраўе народаў і іх права на самавызначэнне, дзейнічаючы пастаянна ў адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі Статута ААН і адпаведнымі нормамі міжнароднага права, уключна з тымі, што адносяцца да тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржаў.
Зыходзячы з прынцыпу раўнапраўя і права народаў на самавызначэнне, усе народы заўсёды маюць права ва ўмовах поўнай свабоды вызначаць, калі і як яны хочуць, свой унутраны і знешні палітычны статус без замежнага ўмяшання і ажыццяўляць уласнае палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё.
Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць усеагульнае значэнне шанавання і эфектыўнай рэалізацыі раўнапраўя і права народаў на самавызначэнне для развіцця сяброўскіх адносін паміж імі, як і паміж усімі дзяржавамі; яны нагадваюць таксама пра важнасць выключэння любой формы парушэння гэтага прынцыпу.

**IX. Супрацоўніцтва паміж дзяржавамі**

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць развіваць сваё супрацоўніцтва адно з адным, як і з усімі дзяржавамі, ва ўсіх сферах у адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі Статута ААН. Развіваючы сваё супрацоўніцтва, дзяржавы-ўдзельніцы будуць надаваць асаблівую ўвагу сферам, вызначаным у рамках Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, прычым кожная з іх будзе рабіць свой унёсак ва ўмовах поўнай роўнасці.
Яны будуць імкнуцца, развіваючы сваё супрацоўніцтва як роўныя, спрыяць узаемаразуменню і даверу, сяброўскім і добрасуседскім дачыненням паміж сабой, міжнароднаму міру, бяспецы і справядлівасці. Яны будуць роўным чынам імкнуцца, развіваючы сваё супрацоўніцтва, павышаць дабрабыт народаў і спрыяць ажыццяўленню іх памкненняў, выкарыстоўваючы, у прыватнасці, выгады, якія выцякаюць з далейшага ўзаемнага азнаямлення і іх прагрэсу і здабыткаў у эканамічнай, навуковай, тэхнічнай, сацыяльнай, культурнай і гуманітарнай сферах. Яны будуць прымаць меры, каб рабіць гэтыя выгады даступнымі для ўсіх; яны будуць улічваць інтарэсы ўсіх у змяншэнні адрозненняў ва ўзроўнях эканамічнага развіцця і, у прыватнасці, інтарэсы развіццёвых краін ва ўсім свеце.
Яны пацвярджаюць, што ўрады, установы, арганізацыі і людзі могуць адыгрываць адпаведную станоўчую ролю ў спрыянні дасягненню гэтых мэтаў супрацоўніцтва.
Яны будуць імкнуцца, пашыраючы сваё супрацоўніцтва, як гэта вызначана вышэй, развіваць цяснейшыя адносіны паміж сабой на лепшай і больш трывалай аснове на карысць народаў.

**X. Добрасумленнае выкананне абавязкаў паводле міжнароднага права**

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць добрасумленна выконваць свае абавязкі паводле міжнароднага права, як абавязкі, што вынікаюць з агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права, так і тыя, што вынікаюць з адпаведных міжнароднаму праву дамоў ці іншых пагадненняў, у якіх яны ўдзельнічаюць. Пры выкананні сваіх суверэнных правоў, уключна з правам утвараць уласныя законы і адміністрацыйныя правілы, яны будуць імкнуцца, каб гэтыя нормы адпавядалі іх абавязальніцтвам паводле міжнароднага права; яны будуць, апроч таго, улічваць належным чынам і выконваць пастановы Заключнага Акту Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.
Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць, што ў выпадку, калі абавязкі членаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый паводле Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый будуць супярэчыць іх абавязкам паводле якойсьці дамовы ці іншага міжнароднага пагаднення, пераважную сілу маюць іх абавязкі паводле Статута ў адпаведнасці з артыкулам 103 Статута ААН.
Усе выкладзеныя вышэй прынцыпы маюць першачарговую важнасць і, адпаведна, яны будуць аднолькава і няўхільна ўжывацца пры інтэрпрэтацыі кожнага з іх з улікам астатніх.
Дзяржавы-ўдзельніцы выказваюць сваю рашучасць цалкам шанаваць і ўжываць гэтыя прынцыпы, як яны выкладзеныя ў дадзенай Дэкларацыі, ва ўсіх аспектах іх узаемадачыненняў і супрацоўніцтва з тым, каб забяспечыць кожнай дзяржаве-ўдзельніцы перавагі, якія вынікаюць з павагі і прымянення гэтых прынцыпаў усімі.
Дзяржавы-ўдзельніцы, улічваючы належным чынам выкладзеныя вышэй прынцыпы і, у прыватнасці, першую фразу дзесятага прынцыпу: «Добрасумленнае выкананне абавязкаў паводле міжнароднага права», — адзначаюць, што дадзеная Дэкларацыя не кранае іх правоў і абавязкаў, як і адпаведных дамоваў ды іншых пагадненняў і дамоўленасцяў.
Дзяржавы-ўдзельніцы выказваюць перакананне ў тым, што шанаванне гэтых прынцыпаў будзе

спрыяць развіццю нармальных і сяброўскіх адносін і прагрэсу супрацоўніцтва паміж імі ва ўсіх сферах. Яны таксама выказваюць перакананне ў тым, што шанаванне гэтых прынцыпаў будзе спрыяць развіццю палітычных кантактаў паміж імі, што, у сваю чаргу, будзе спрыяць лепшаму ўзаемнаму разуменню іх пазіцыяў і поглядаў.
Дзяржавы-ўдзельніцы заяўляюць пра свой намер ажыццяўляць дачыненні з усімі астатнімі дзяржавамі ў духу прынцыпаў, выкладзеных у дадзенай Дэкларацыі.

## ВЫНІКОВЫ ДАКУМЕНТ ВЕНСКАЙ СУСТРЭЧЫ НАРАДЫ ПА БЯСПЕЦЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВЕ Ў ЕЎРОПЕ (НБСЕ) 1989 г. ,

Трэцяя сустрэча ў рамках Хельсінкскай Канферэнцыі *(вытрымкі)*

**(...)**

**(1)** Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць сваю прыхільнасць да ўсіх дзесяці прынцыпаў Заключнага Акту Дэкларацыі, да прынцыпаў, якімі дзяржавы-ўдзельніцы кіруюцца ва ўзаемадачыненнях, а таксама сваю рашучасць шанаваць іх і ужываць іх на практыцы. Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць, што ўсе гэтыя прынцыпы маюць першарадную важнасць і, адпаведна, яны будуць аднолькава і няўхільна ўжывацца пры інтэрпрэтацыі кожнага з іх з улікам астатніх.

**(...)**

**(11)** Яны пацвярджаюць, што будуць шанаваць правы чалавека і асноўныя свабоды, уключна са свабодай думкі, сумлення, рэлігіі ці перакананняў, для ўсіх, без адрознення расы, полу, мовы і рэлігіі. Яны таксама пацвярджаюць усеагульнае значэнне правоў чалавека і асноўных свабод, шанаванне якіх — істотны фактар міру, справядлівасці і бяспекі, неабходных для забеспячэння развіцця сяброўскіх дачыненняў і супрацоўніцтва паміж імі, як і паміж усімі дзяржавамі.

**(12)** Яны выказваюць сваю рашучасць гарантаваць эфектыўнае ажыццяўленне правоў чалавека і асноўных свабод, якія вынікаюць з годнасці, уласцівай чалавечай асобе, і з'яўляюцца істотным фактарам для яе вольнага і поўнага развіцця. Яны прызнаюць, што грамадзянскія, палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя, культурныя ды іншыя правы і свабоды маюць першачарговае значэнне і мусяць рэалізоўвацца ўсімі належнымі спосабамі.

**(13)** У сувязі з гэтым яны будуць

**(13.1)** – удасканальваць свае законы, адміністрацыйныя правілы і палітыку ў сферы грамадзянскіх, палітычных, эканамічных, сацыяльных, культурных ды іншых правоў чалавека і асноўных свабод і ўжываць іх на практыцы, каб гарантаваць эфектыўнае ажыццяўленне гэтых правоў і свабод;

**(...)**

**(13.4)** – эфектыўна забяспечваць права асоб ведаць свае правы і абавязкі ў гэтай сферы і дзейнічаць у адпаведнасці з імі і з гэтай мэтай публікаваць і рабіць даступнымі ўсе законы, адміністрацыйныя правілы і працэдуры, якія адносяцца да правоў чалавека і асноўных свабод;

**(13.5)** – шанаваць права сваіх грамадзян, паасобку ці супольна з іншымі, рабіць актыўны ўнёсак у развіццё і абарону правоў чалавека і асноўных свабод;

**(13.6)** – заахвочваць абмеркаванне ў школах і іншых адукацыйных установах пытанняў развіцця і абароны правоў чалавека і асноўных свабод;

**(13.7)** – забяспечваць у межах сваёй тэрыторыі кожнаму, хто належыць да іх юрысдыкцыі, правы чалавека і асноўныя свабоды без якогасьці адрознення, у тым ліку паводле расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага стану, нараджэння ці іншых абставінаў;

**(13.8)** – забяспечваць, каб ні асоба, якая ажыццяўляе, выказвае намер ці імкнецца ажыццявіць гэтыя правы і свабоды, ні хтосьці з членаў яе сям'і не сталіся ў выніку гэтага прадметам дыскрымінацыі ў якойсьці форме;

**(13.9)** – забяспечваць, каб эфектыўныя сродкі прававой абароны, а таксама поўная інфармацыя пра іх былі даступныя тым, хто заяўляе, што іх правы чалавека і асноўныя свабоды былі парушаныя; яны будуць, у прыватнасці, эфектыўна ўжываць наступныя сродкі прававой абароны:

- права асобы падаваць скаргу ў выканаўчыя, заканадаўчыя, судовыя ці адміністрацыйныя органы;
- права на справядлівае і публічнае разбіральніцтва ў разумныя тэрміны незалежным і бесстаронінм судом, уключна з правам прапаноўваць юрыдычную аргументацыю і быць прадстаўленым адвакатам на свой выбар;
- права быць хутка і афіцыйна інфармаваным пра рашэнне, прынятае па якой-небудзь скарзе, уключна з юрыдычнымі падставамі, на якіх грунтавалася рашэнне. Гэтая інфармацыя будзе падавацца зазвычай у пісьмовай форме і ва ўсякім разе так, каб дазволіць асобе эфектыўна скарыстаць іншыя даступныя сродкі прававой абароны;

**(14)** Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што спрыянне развіццю эканамічных, сацыяльных, культурных правоў, а таксама грамадзянскіх і палітычных правоў мае першараднае значэнне для чалавечай годнасці і для дасягнення законных памкненняў кожнай асобы. Таму яны будуць працягваць свае высілкі з мэтай

паступова забяспечыць поўнае ажыццяўленне эканамічных, сацыяльных і культурных правоў усімі належнымі сродкамі, у прыватнасці, шляхам прыняцця заканадаўчых мер. У сувязі з гэтым яны будуць надаваць асаблівую ўвагу праблемам у сферы працаўладкавання, жытла, сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, адукацыі і культуры.

Яны будуць спрыяць пастаяннаму прагрэсу ў рэалізацыі ўсіх правоў і свабод у сваіх краінах, як і ў развіцці узаемных адносін і адносін з астатнімі дзяржавамі, каб кожны сапраўды карыстаўся ў поўнай меры сваімі эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі правамі, а таксама сваімі грамадзянскімі і палітычнымі правамі.

**(15)** Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць сваю рашучасць забяспечваць мужчынам і жанчынам роўныя правы. Адпаведна яны будуць прымаць усе неабходныя меры, уключна з заканадаўчымі, у мэтах заахвочвання роўна эфектыўнага ўдзелу мужчын і жанчын у палітычным, эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці. Яны разгледзяць магчымасць далучэння да Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, калі яны гэтага яшчэ не зрабілі.

**(16)** З мэтай забяспечыць свабоду асобы спавядаць рэлігію ці веру дзяржавы-ўдзельніцы будуць, сярод іншага:

**(16.1)** – прымаць эфектыўныя меры па прадухіленні і ліквідацыі дыскрымінацыі асоб і аб'яднанняў на падставе рэлігіі ці перакананняў адносна прызнання, ажыццяўлення і карыстання правамі чалавека і асноўнымі свабодамі ва ўсіх сферах грамадзянскага, палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага жыцця, а таксама па забеспячэнні сапраўднай роўнасці паміж вернікамі і атэістамі;

**(16.2)** – спрыяць клімату ўзаемнай цярпімасці і павагі паміж вернікамі розных аб'яднанняў, а таксама паміж вернікамі і атэістамі;

**(16.3)** – даваць паводле запыту суполкам вернікаў, якія вызнаюць ці гатовыя вызнаваць сваю веру ў канстытуцыйных рамках сваіх дзяржаў, прызнанне статусу, прадугледжанага для іх у адпаведных краінах;

**(16.4)** – паважаць права гэтых рэлігійных суполак:

- утвараць і ўтрымліваць вольна даступныя месцы набажэнстваў ці сходаў,
- арганізоўвацца ў адпаведнасці са сваёй уласнай іерархічнай і інстытуцыйнай структурай,
- абіраць, прызначаць і замяняць свой персанал згодна са сваімі адпаведнымі патрабаваннямі і стандартамі, а таксама з усімі вольна дасягнутымі дамоўленасцямі паміж імі і іх дзяржавай,
- запытваць і атрымліваць добраахвотныя фінансавыя ды іншыя ахвяраванні;

**(16.5)** – уступаць у кансультацыі з рэлігійнымі веравызнаннямі, установамі і арганізацыямі з мэтай дасягнення лепшага разумення патрэб рэлігійных свабод;

**(16.6)** – паважаць права кожнай асобы даваць і атрымліваць рэлігійную адукацыю на мове на свой выбар, паасобку ці супольна з іншымі;

**(16.7)** – у сувязі з гэтым паважаць паміж іншым свабоду бацькоў забяспечваць рэлігійнае і маральнае выхаванне сваіх дзяцей у адпаведнасці са сваімі ўласнымі перакананнямі;

**(16.8)** – дазваляць падрыхтоўку рэлігійнага персаналу ў адпаведных установах;

**(16.9)** – паважаць права вернікаў і рэлігійных суполак набываць, валодаць і выкарыстоўваць святыя кнігі, рэлігійныя выданні на мове на свой выбар ды іншыя прадметы і матэрыялы, што адносяцца да вызнавання рэлігіі ці веры;

**(16.10)** – дазваляць рэлігійным веравызнанням, установам і арганізацыям рабіць, імпартаваць і распаўсюджваць рэлігійныя выданні і матэрыялы;

**(16.11)** – з прыхільнасцю разглядаць зацікаўленасць рэлігійных суполак ва ўдзеле ў грамадскім дыялогу, у тым ліку праз сродкі масавай інфармацыі.

**(17)** Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што рэалізацыя вышэйпамянёных правоў, якія адносяцца да свабоды рэлігіі ці перакананняў, можа падпадаць толькі пад такія абмежаванні, якія прадугледжаныя законам і сумяшчальныя з іх абавязкамі паводле міжнароднага права і іх міжнароднымі абавязальніцтвамі. Яны будуць забяспечваць у сваіх законах і адміністрацыйных правілах і пры іх ужыванні поўнае і эфектыўнае ажыццяўленне свабоды думкі, сумлення, рэлігіі ці перакананняў.

**(...)**

**(19)** Яны будуць абараняць і ствараць умовы для заахвочвання этнічнай, культурнай, моўнай і рэлігійнай самабытнасці нацыянальных меншасцяў на сваёй тэрыторыі. Яны будуць шанаваць свабоднае ажыццяўленне правоў асобамі, што належаць да такіх меншасцяў, і забяспечваць іх поўную роўнасць з астатнімі.

**(20)** Дзяржавы-ўдзельніцы будуць цалкам шанаваць права кожнага чалавека:

- на свабоду перамяшчэння і месцажыхарства ў межах кожнай дзяржавы і
- пакідаць любую краіну, уключна са сваёй уласнай, і вяртацца ў сваю краіну.

**(...)**
**(23)** Дзяржавы-ўдзельніцы будуць
**(23.1)** – забяспечваць, каб ніхто не быў аб'ектам адвольнага арышту, утрымання пад вартай і ссылкі;
**(23.2)** – забяспечваць, каб з усімі асобамі, якія ўтрымліваюцца пад вартай ці ў зняволенні, абыходзіліся гуманна і з павагай годнасці, уласцівай чалавечай асобе;
**(23.3)** – выконваць прынятыя Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі, а таксама прыняты ў рамках ААН Кодэкс паводзін службовых асоб па ўтрыманні правапарадку;
**(23.4)** – забараняць катаванні ды іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для чалавечай годнасці абыходжання і пакарання і прымаць эфектыўныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, судовыя ды іншыя меры для прадухілення такой практыкі і пакарання за яе;
**(23.5)** – разглядаць пытанне пра далучэнне да Канвенцыі супраць катавання ды іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжальных для годнасці формаў абыходжання ці пакарання, калі яны гэтага яшчэ не зрабілі;
**(23.6)** – абараняць асоб ад любой псіхіятрычнай ці іншай медыцынскай практыкі, якая парушае правы чалавека і асноўныя свабоды, і прымаць эфектыўныя меры для прадухілення такой практыкі і пакарання за яе.
**(24)** Адносна пытання пра смяротнае пакаранне дзяржавы-ўдзельніцы адзначаюць, што ў шматлікіх з іх смяротнае пакаранне было скасаванае. У дзяржавах-удзельніцах, у якіх смяротнае пакаранне не скасаванае, смяротны прысуд можа быць вынесены толькі за самыя цяжкія злачынствы ў адпаведнасці з законам, які дзейнічаў на момант учынення злачынства, і не насуперак іх міжнародным абавязальніцтвам. Гэтае пытанне будзе заставацца на стадыі разгляду. У сувязі з гэтым дзяржавы-ўдзельніцы будуць супрацоўнічаць у рамках адпаведных міжнародных арганізацый.
**(...)**
**(26)** Яны пацвярджаюць, што ўрады, установы, арганізацыі і асобы могуць адыгрываць адпаведную і пазітыўную ролю ў спрыянні дасягненню мэтаў іх супрацоўніцтва і поўнаму ажыццяўленню Заключнага Акту. З гэтай мэтай яны будуць шанаваць права асоб назіраць за ажыццяўленнем і спрыяць выкананню ўмоў НБСЕ і далучацца з гэтай мэтай да іншых асоб. Яны будуць спрыяць беспасярэднім кантактам і зносінам паміж гэтымі асобамі, арганізацыямі і ўстановамі ў дзяржавах-удзельніцах і паміж імі, а таксама здымаць, калі такія будуць, юрыдычныя і адміністрацыйныя перашкоды, якія не адпавядаюць умовам НБСЕ. Яны таксама будуць прымаць эфектыўныя меры дзеля аблягчэння доступу да інфармацыі аб выкананні ўмоў НБСЕ і садзейнічаць вольнаму выказванню поглядаў наконт гэтых пытанняў.
**(...)**

# ДАКУМЕНТ КАПЕНГАГЕНСКАЙ СУСТРЭЧЫ Ў РАМКАХ КАНФЕРЭНЦЫІ ПА ЧАЛАВЕЧЫМ ВЫМЯРЭННІ НБСЕ, 1990 г.

(вытрымкі)

**(…)**

Дзяржавы-ўдзельніцы выказваюць сваю перакананасць у тым, што поўнае шанаванне правоў чалавека і асноўных свабод і развіццё грамадстваў, заснаваных на плюралістычнай дэмакратыі і вяршэнстве закону, — гэта неабходная ўмова для забеспячэння прагрэсу ў справе стварэння стабільнай сітуацыі трывалага міру, бяспекі, справядлівасці і супрацоўніцтва, якую яны імкнуцца стварыць у Еўропе. Таму яны пацвярджаюць свой абавязак цалкам выконваць усе палажэнні Заключнага Акту ды іншых дакументаў НБСЕ, якія адносяцца да сферы чалавечага вымярэння, і бяруць на сябе абавязак працягваць далей ужо дасягнуты прагрэс.

**(…)**

Каб спрыяць шанаванню правоў чалавека і асноўных свабод і іх ажыццяўленню, развіццю кантактаў паміж людзьмі і рашэнню іншых звязаных з гэтым пытанняў гуманітарнага характару, дзяржавы-ўдзельніцы пагаджаюцца пра наступнае:

**(1)** Дзяржавы-ўдзельніцы выказваюць сваю перакананасць у тым, што абарона і заахвочванне правоў чалавека і асноўных свабод з'яўляюцца адной з асноватворных мэтаў кіравання, і пацвярджаюць, што прызнанне гэтых правоў і свабод ёсць асновай свабоды, справядлівасці і міру.

**(2)** Яны маюць рашучасць падтрымліваць і развіваць прынцыпы справядлівасці, якія ўтвараюць аснову вяршэнства права. Яны мяркуюць, што вяршэнства права азначае не проста фармальную законнасць, якая забяспечвае рэгулярнасць і паслядоўнасць у дасягненні і падтрымцы дэмакратычнага парадку, але і справядлівасць, заснаваную на прызнанні і поўным прыняцці найвышэйшай каштоўнасці чалавечай асобы і гарантаваную ўстановамі, якія ўтвараюць структуры, што забяспечваюць яе поўнае выяўленне.

**(3)** Яны пацвярджаюць, што дэмакратыя з'яўляецца неад'емным элементам вяршэнства права. Яны прызнаюць важнасць плюралізму адносна палітычных арганізацый.

**(…)**

**(6)** Дзяржавы-ўдзельніцы заяўляюць, што воля народа, якая выяўляецца свабодна і справядліва падчас перыядычных і сапраўдных выбараў, з'яўляецца асновай улады і легітымнасці любога ўрада. Дзяржавы-ўдзельніцы адпаведна паважаюць права сваіх грамадзян браць удзел у кіраванні сваёй краінай беспасярэдне ці праз прадстаўнікоў, абіраных імі свабодна цягам справядлівага выбарчага працэсу. Яны прызнаюць сваю адказнасць за абарону і ахову, згодна са сваімі законамі, сваімі абавязкамі паводле міжнароднага права ў сферы правоў чалавека і сваімі міжнароднымі абавязкамі, вольна ўсталяванага шляхам волевыяўлення народа дэмакратычнага парадку ад дзейнасці пэўных асоб, груп ці арганізацый, якія выкарыстоўваюць ці адмаўляюцца адрынуць тэрарызм і гвалт, скіраваных на руйнаванне гэтага парадку ці такога парадку ў іншай дзяржаве-ўдзельніцы.

**(7)** Каб воля народа служыла асновай улады кіраўніцтва, дзяржавы-ўдзельніцы:

(7.1) – ладзяць свабодныя выбары з разумнай перыядычнасцю, як гэта прадугледжана законам;

**(7.2)** – дапускаюць, каб усе мандаты прынамсі ў адной палаце нацыянальнага заканадаўчага органа былі аб'ектам вольнай спаборнасці кандыдатаў на ўсенародных выбарах;

**(7.3)** – гарантуюць дарослым грамадзянам усеагульнае і роўнае выбарчае права;

**(7.4)** – забяспечваюць, каб галасаванне ладзілася таемна ці ўжывалася раўнацэнная працэдура вольнага галасавання і каб падлік галасоў і паведамленні аб выніках былі сумленнымі, а афіцыйныя вынікі публікаваліся;

**(7.5)** – шануюць права грамадзян дамагацца палітычных ці дзяржаўных пасад у асабістай якасці ці ў якасці прадстаўнікоў палітычных партый ці арганізацый без дыскрымінацыі;

**(7.6)** – шануюць права асоб і груп людзей ствараць ва ўмовах поўнай свабоды свае палітычныя партыі ці іншыя палітычныя арганізацыі і даюць такім палітычным партыям і арганізацыям неабходныя прававыя гарантыі, якія дазваляюць ім спаборнічаць адно з адным на аснове роўнасці перад законам і органамі ўлады;

**(7.7)** – забяспечваюць, каб закон і дзяржаўная палітыка дапускалі правядзенне палітычных кампаніяў у атмасферы свабоды і справядлівасці, дзе ніякія адміністрацыйныя дзеянні, гвалт ці запалохванне не ўтрымлівалі б партый і кандыдатаў ад вольнага выяўлення сваіх поглядаў і ацэнак, а таксама не заміналі б выбарцам знаёміцца з імі і абмяркоўваць іх ці галасаваць свабодна, не баючыся пакарання;

**(7.8)** – забяспечваюць, каб не ўтвараліся якіясьці прававыя ці адміністрацыйныя бар'еры для доступу да сродкаў масавай інфармацыі на недыскрымінацыйнай аснове для

ўсіх палітычных груповак і асобных грамадзян, якія хочуць узяць удзел у выбарчым працэсе;

**(7.9)** – забяспечваюць, каб кандыдаты, якія атрымалі неабходную колькасць галасоў, вызначаную законам, належным чынам уступалі на пасаду і маглі заставацца на пасадзе да заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў ці да іх перапынення іншым чынам, які рэгулюецца законам у адпаведнасці з дэмакратычнымі парламенцкімі і канстытуцыйнымі працэдурамі.

**(8)** Дзяржавы-ўдзельніцы мяркуюць, што прысутнасць назіральнікаў, як замежных, так і нацыянальных, можа павысіць аўтарытэтнасць выбарчага працэсу для дзяржаў, дзе ладзяцца выбары. Таму яны запрашаюць назіральнікаў ад іншых дзяржаў-удзельніц НБСЕ і розных адпаведных прыватных устаноў і арганізацый, якія гэтага захочуць, назіраць за ходою іх нацыянальных выбараў у аб'ёме, які дазваляецца законам. Яны таксама будуць імкнуцца спрыяць такому самаму доступу да выбарчых працэсаў, што ладзяцца на ніжэйшым, чым агульнанацыянальны, узроўні. Такія назіральнікі будуць браць на сябе абавязак не ўмешвацца ў выбарчы працэс.

**(9)** Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць, што:

**(9.1)** – кожны чалавек мае права на свабоду выражэння, уключна з правам на камунікацыю. Гэтае права ўключае свабоду прытрымлівацца ўласнага меркавання і атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі без умяшання з боку дзяржаўных уладаў і незалежна ад дзяржаўных межаў.
Выкананне гэтага права можа падпадаць толькі пад такія абмежаванні, якія прадугледжаныя ў законе і адпавядаюць міжнародным стандартам. У прыватнасці, не накладваюцца ніякія абмежаванні на доступ да сродкаў для памнажэння дакументаў усіх відаў і на іх выкарыстанне, пры выкананні, тым не менш, правоў, што датычаць інтэлектуальнай уласнасці, уключна з аўтарскім правам;

**(9.2)** – кожны чалавек мае права на мірныя сходы і дэманстрацыі. Любыя абмежаванні, якія могуць накладацца адносна выканання гэтых правоў, прадугледжваюцца законам і адпавядаюць міжнародным стандартам;

**(9.3)** – гарантуецца права на асацыяцыю. Права ўтвараць і, у залежнасці ад агульнага права прафсаюзу вызначаць склад сваіх членаў, вольна ўступаць у прафсаюз, гарантуецца. Гэтыя правы выключаюць папярэдні кантроль. Свабода асацыяцыі для работнікаў, уключна са свабодай страйкаў, гарантуецца з абмежаваннямі, якія прадугледжаныя законам і адпавядаюць міжнародным стандартам;

**(...)**

**(10)** Пацвярджаючы свой абавязак эфектыўна забяспечваць права кожнай асобы ведаць правы чалавека і асноўныя свабоды і дзейнічаць у адпаведнасці з імі і, паасобку ці супольна з іншымі, рабіць актыўны ўнёсак у іх развіццё і абарону, дзяржавы-ўдзельніцы заяўляюць пра наступныя абавязальніцтвы:

**(10.1)** – шанаваць права кожнага чалавека, паасобку ці супольна з іншымі, запытваць, атрымліваць і перадаваць вольна меркаванні і інфармацыю аб правах чалавека і асноўных свабодах, уключна з правам распаўсюджваць і публікаваць такія меркаванні і інфармацыю;

**(10.2)** – шанаваць правы кожнага чалавека, паасобку ці супольна з іншымі, вывучаць і абмяркоўваць пытанні ажыццяўлення правоў чалавека і асноўных свабод і рыхтаваць ці абмяркоўваць прапановы адносна паляпшэння абароны правоў чалавека і больш дасканалых сродкаў забеспячэння выканання міжнародных стандартаў у сферы правоў чалавека;

**(10.3)** – забяспечваць, каб асобам было дазволена ажыццяўляць права на свабоду аб'яднанняў, уключна з правам утвараць няўрадавыя арганізацыі, далучацца да іх і эфектыўна ўдзельнічаць у іх дзейнасці арганізацый, якія імкнуцца заахвочваць і абараняць правы чалавека і асноўныя свабоды, уключна з прафсаюзамі і групамі па назіранні за выкананнем правоў чалавека;

**(10.4)** – дазваляюць членам такіх груп і арганізацый мець беспярашкодны доступ і падтрымліваць сувязь з падобнымі органамі ў сваіх краінах і за іх межамі і з міжнароднымі арганізацыямі, абменьвацца меркаваннямі, падтрымліваць кантакты і супрацоўнічаць з такімі групамі і арганізацыямі і запытваць, атрымліваць і выкарыстоўваць з мэтай заахвочвання і абароны правоў чалавека і асноўных свабод добраахвотныя фінансавыя ўнёскі з нацыянальных і міжнародных крыніц, як гэта прадугледжана законам.

**(11)** Дзяржавы-ўдзельніцы далей заяўляюць, што ў выпадках, калі, як сцвярджаецца, мелася парушэнне правоў чалавека і асноўных свабод, наяўныя эфектыўныя сродкі прававой абароны ўключаюць

**(11.1)** – права запытваць і атрымліваць адэкватную юрыдычную дапамогу;

**(11.2)** – права запытваць і атрымліваць дапамогу ад іншых у абароне правоў чалавека і асноўных свабод і дапамагаць іншым у абароне правоў чалавека і асноўных свабод;

**(11.3)** – права асоб ці груп, якія дзейнічаюць ад іх імя, падтрымліваць сувязь з міжнароднымі органамі, надзеленымі кампетэнцыяй атрымліваць і разглядаць інфармацыю датычна сцвярджэнняў пра парушэнні правоў чалавека.

**(...)**

**(13)** Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць рашэнне надаваць асаблівую ўвагу прызнанню правоў дзіцяці, яго грамадзянскіх правоў і асабістых свабод, яго эканамічных, сацыяльных і культурных правоў і яго права на абарону ад усіх формаў гвалту і эксплуатацыі. Яны разгледзяць пытанне пра далучэнне, калі яны яшчэ гэтага не зрабілі, да Канвенцыі аб правах дзіцяці, якая была адкрытая для падпісання дзяржавамі 26 студзеня 1990 г. Яны прызнаюць у сваім унутраным заканадаўстве правы дзіцяці, зафіксаваныя ў міжнародных пагадненнях, дзе яны выступаюць бакамі.

**(...)**

**(16)** Дзяржавы-ўдзельніцы

**(16.1)** – пацвярджаюць свае абавязальніцтвы па забароне катавання ды іншых форм жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжальнага для чалавечай годнасці абыходжання ці пакарання, па прыняцці эфектыўных заканадаўчых, адміністрацыйных, судовых ды іншых мераў для прадухілення такой практыкі і пакарання за яе, па абароне асоб ад любой псіхіятрычнай ці іншай медыцынскай практыкі, якая парушае правы чалавека і асноўныя свабоды, і па прыняцці эфектыўных мераў для прадухілення такой практыкі і пакарання за яе;

**(...)**

**(17)** Дзяржавы-ўдзельніцы

**(17.1)** – нагадваюць аб прынятым паводле Заключнага венскага дакумента абавязку пакінуць пытанне пра смяротнае пакаранне на разглядзе і супрацоўнічаць у рамках адпаведных міжнародных арганізацый;

**(17.2)** – нагадваюць у сувязі з гэтым аб прыняцці Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 15 снежня 1989 г. другога Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які мае на мэце скасаванне смяротнага пакарання;

**(17.3)** – адзначаюць абмежаванні і гарантыі адносна ўжывання смяротнага пакарання, якія былі прынятыя міжнароднай супольнасцю, у прыватнасці ў артыкуле 6 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах;

**(17.4)** – адзначаюць палажэнні Шостага Пратакола да Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, якія датычаць скасавання смяротнага пакарання;

**(...)**

**(18)** Дзяржавы-ўдзельніцы

**(18.1)** – адзначаюць, што Камісія па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прызнала права кожнага чалавека адмаўляцца ад службы ў войску паводле перакананняў сумлення;

**(18.2)** – адзначаюць меры, прынятыя ў апошні час шэрагам дзяржаў-удзельніц дзеля таго, каб дазваляць вызваляць ад абавязковай вайсковай службы на падставе адмовы паводле перакананняў сумлення;

**(18.3)** – адзначаюць дзейнасць некаторых няўрадавых арганізацый у сувязі з адмовай ад абавязковай вайсковай службы паводле перакананняў сумлення;

**(18.4)** – згаджаюцца разгледзець пытанне пра ўвядзенне, дзе гэтага яшчэ не было зроблена, розных формаў альтэрнатыўнай службы, якія сумяшчаюцца з матывамі адмовы паводле перакананняў сумлення, прычым такія формы альтэрнатыўнай службы ў прынцыпе не будуць звязаныя са службай у баявых частках ці будуць мець грамадзянскі характар, будуць грамадска карыснымі і не будуць мець характару пакарання;

**(...)**

**(19)** Дзяржавы ўдзельніцы ... будуць

**(19.1)** – імкнуцца выконваць працэдуры ўезду на іх тэрыторыі, уключна з выдачай віз, пашпартным і мытным кантролем, добрасумленна і без неабгрунтаваных затрымак. Там, дзе гэта неабходна, яны будуць скарачаць тэрміны прыняцця рашэнняў пра выдаванне візаў, а таксама спрашчаць працэдуру і скарачаць адміністрацыйныя патрабаванні адносна хадайніцтваў на атрыманне візаў;

**(19.2)** – забяспечваць пры разглядзе хадайніцтваў на атрыманне візаў, каб гэты працэс праходзіў як мага хутчэй дзеля таго, каб, у прыватнасці, належным чынам улічваліся важныя сямейныя, асабістыя і прафесійныя меркаванні, асабліва ў выпадках тэрміновага гуманітарнага характару;

**(...)**

**(23)** Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць выяўленую імі ў венскім Заключным дакуменце перакананасць у тым, што заахвочванне эканамічных, сацыяльных і культурных правоў, а таксама грамадзянскіх і палітычных правоў мае першачарговае

значэнне для чалавечай годнасці і рэалізацыі законных памкненняў кожнага чалавека. (...)

**(...)**

**(30)** Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць, што пытанні, якія адносяцца да нацыянальных меншасцяў, могуць быць вырашаныя задавальняючым чынам толькі ў дэмакратычных палітычных рамках, заснаваных на вяршэнстве закону, ва ўмовах функцыянавання незалежнай судовай сістэмы. Гэтыя рамкі гарантуюць поўнае шанаванне правоў чалавека і асноўных свабод, роўныя правы і становішча ўсіх грамадзян, вольнае выяўленне ўсіх іх законных інтарэсаў і памкненняў, палітычны плюралізм, сацыяльную цярпімасць і выкананне прававых нормаў, што ставяць эфектыўныя перашкоды на шляху злоўжывання дзяржаўнай уладай.
Яны таксама прызнаюць важную ролю няўрадавых арганізацый, уключна з палітычнымі партыямі, прафсаюзамі, арганізацыямі па правах чалавека і рэлігійнымі групамі, у заахвочванні цярпімасці, культурнай разнастайнасці і ў вырашэнні пытанняў, што адносяцца да нацыянальных меншасцяў.

**(...)**

**(31)** Асобы, якія належаць да нацыянальных меншасцяў, маюць права цалкам і эфектыўна ажыццяўляць свае правы чалавека і асноўныя свабоды без якой-небудзь дыскрымінацыі ва ўмовах поўнай роўнасці перад законам.
Дзяржавы-ўдзельніцы прымуць пры неабходнасці адмысловыя меры, каб гарантаваць асобам, што належаць да нацыянальных меншасцяў, поўную роўнасць з астатнімі грамадзянамі ў ажыццяўленні правоў чалавека і асноўных свабод і карыстанні імі.

**(32)** Прыналежнасць асобы да нацыянальнай меншасці — гэта прадмет яе асабістага выбару, і ніякія неспрыяльныя наступствы не могуць узнікаць з ажыццяўлення такога выбару. Асобы, якія належаць да нацыянальных меншасцяў, маюць права вольна выяўляць, захоўваць і развіваць сваю этнічную, культурную, моўную ці рэлігійную самабытнасць і падтрымліваць і развіваць сваю культуру ва ўсіх яе аспектах, не падпадаючы пад якія-небудзь спробы асіміляцыі насуперак сваёй волі. У прыватнасці, яны маюць права:

**(32.1)** – вольна карыстацца сваёй роднай мовай у асабістым і грамадскім жыцці;

**(32.2)** – утвараць і падтрымліваць свае ўласныя адукацыйныя, культурныя і рэлігійныя ўстановы, арганізацыі ці асацыяцыі, якія могуць шукаць добраахвотную фінансавую дапамогу ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам;

**(32.3)** – вызнаваць сваю рэлігію, у тым ліку набываць рэлігійныя матэрыялы, валодаць імі і выкарыстоўваць іх і ажыццяўляць рэлігійную дзейнасць у сферы адукацыі на сваёй роднай мове;

**(32.4)** – усталёўваць і падтрымліваць бесперашкодныя кантакты паміж сабой у межах сваёй краіны, а таксама праз межы з грамадзянамі іншых дзяржаў, з якімі яны маюць супольнае этнічнае ці нацыянальнае паходжанне, культурную спадчыну ці рэлігійныя перакананні;

**(32.5)** – распаўсюджваць інфармацыю, мець да яе доступ і абменьвацца інфармацыяй на сваёй роднай мове;

**(32.6)** – утвараць і падтрымліваць арганізацыі ці асацыяцыі ў межах сваёй дзяржавы і браць удзел у дзейнасці міжнародных няўрадавых арганізацый. Асобы, якія належаць да нацыянальных меншасцяў, могуць выконваць свае правы і карыстацца імі паасобку, а таксама супольна з астатнімі членамі сваёй групы. Для асобы, якая належыць да нацыянальнай меншасці, не можа ўзнікаць ніякіх неспрыяльных наступстваў з прычыны ажыццяўлення ці неажыццяўлення кожнага з такіх правоў.

**(...)**

**(37)** Ніводнае з гэтых абавязальніцтваў не можа тлумачыцца як тое, што дае якое-небудзь права займацца любой дзейнасцю ці ажыццяўляць ўсякае дзеянне насуперак мэтам і прынцыпам Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, іншым абавязкам паводле міжнароднага права ці палажэнняў Заключнага Акту, уключна з прынцыпам тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржаў.

**(...)**

**(40)** Дзяржавы-ўдзельніцы дакладна і недвухсэнсоўна асуджаюць таталітарызм, расавую і этнічную нянавісць, антысемітызм, ксенафобію і дыскрымінацыю ў адносінах да каго заўгодна, а таксама пераслед паводле рэлігійных і ідэалагічных матываў. У сувязі з гэтым яны таксама прызнаюць асаблівыя праблемы цыганоў (ромаў).
Яны заяўляюць пра свой цвёрды намер актывізаваць высілкі на барацьбу з гэтымі з'явамі ва ўсіх формах і таму

**(40.1)** – будуць прымаць эфектыўныя меры, уключна, у адпаведнасці з іх канстытуцыйнымі сістэмамі і міжнароднымі абавязкамі, з прыняццем такіх законаў, якія могуць быць неабходныя для забеспячэння абароны ад усякіх актаў, якія ўяўляюць падбухторванне да гвалту супраць асоб ці груп, заснаванае на

нацыянальнай, расавай, этнічнай ці рэлігійнай дыскрымінацыі, варожасці ці нянавісці, уключна з антысемітызмам;

**(40.2)** – возьмуць на сябе абавязак прыняць належныя і адпаведныя меры для абароны асоб ці груп, якія могуць падпадаць пад пагрозы ці акты дыскрымінацыі, варожасці ці гвалту ў выніку іх расавай, этнічнай, культурнай, моўнай ці рэлігійнай самабытнасці, і для аховы іх уласнасці;

**(40.3)** – будуць прымаць эфектыўныя меры ў адпаведнасці з іх канстытуцыйнымі сістэмамі, на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях для спрыяння ўзаемаразуменню і цярпімасці, асабліва ў сферах адукацыі, культуры і інфармацыі;

**(40.4)** – будуць імкнуцца забяспечваць, каб у рамках задач па адукацыі надавалася асаблівая ўвага праблеме расавых забабонаў і нянавісці і ўмацаванню павагі да розных цывілізацыяў і культураў;

**(40.5)** – будуць прызнаваць права кожнага чалавека на эфектыўныя сродкі прававой абароны і будуць імкнуцца прызнаваць у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам права зацікаўленых асоб і груп выступаць са скаргамі і падтрымліваць скаргі з прычыны актаў дыскрымінацыі, уключна з актамі расізму і ксенафобіі;

**(40.6)** – разгледзяць пытанне пра далучэнне, калі яны яшчэ гэтага не зрабілі, да міжнародных інструментаў, у якіх разглядаецца праблема дыскрымінацыі, і будуць забяспечваць поўнае выкананне ўзятых паводле іх абавязкаў, уключна з абавязкамі, што датычаць падрыхтоўкі перыядычных дакладаў;

**(40.7)** – разгледзяць таксама пытанне аб прызнанні тых міжнародных механізмаў, якія дазваляюць дзяржавам і асобным людзям адпраўляць паведамленні, што датычаць дыскрымінацыі, у міжнародныя органы.

## КАНВЕНЦЫЯ АБ АБАРОНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І АСНОЎНЫХ СВАБОД

**(Еўрапейская канвенцыя аб правах чалавека), 1950 г.**

*(вытрымкі)*

Урады, якія падпісалі дадзеную Канвенцыю, будучы членамі Рады Еўропы,

беручы пад увагу Ўсеагульную дэкларацыю правоў чалавека, абвешчаную Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 10 снежня 1948 г.,

улічваючы, што гэтая Дэкларацыя мае на мэце забяспечыць усеагульнае і эфектыўнае прызнанне і выкананне абвешчаных у ёй правоў;

мяркуючы, што мэта Рады Еўропы — дасягненне большага адзінства паміж яе членамі і што адным са сродкаў дасягнення гэтай мэты з'яўляецца абарона і развіццё правоў чалавека і асноўных свабод,

пацвярджаючы сваю глыбокую прыхільнасць да асноўных свабод, якія з'яўляюцца асновай справядлівасці і міру ва ўсім свеце і выкананне якіх найлепшым чынам забяспечваецца, з аднаго боку, эфектыўным дэмакратычным палітычным рэжымам і, з іншага боку, усеагульным разуменнем і шанаваннем правоў чалавека, да якіх яны прыхільныя;

маючы рашучасць, у якасці ўрадаў еўрапейскіх дзяржаў, якімі кіруе адзінае памкненне і якія маюць супольную спадчыну палітычных традыцый, ідэалаў свабоды і вяршэнства права, рабіць першыя крокі на шляху забеспячэння калектыўнага ажыццяўлення некаторых правоў, выкладзеных ва Ўсеагульнай дэкларацыі,

пагадзіліся пра наступнае:

**Артыкул 1. Абавязак паважаць правы чалавека**

Высокія Дамоўныя Бакі забяспечваюць кожнай асобе пад іх юрысдыкцыяй правы і свабоды, вызначаныя ў раздзеле I дадзенай Канвенцыі.

**РАЗДЗЕЛ I. ПРАВЫ І СВАБОДЫ**

**Артыкул 2. Права на жыццё**

1. Права кожнай асобы на жыццё ахоўваецца законам. Нікога нельга наўмысна пазбавіць жыцця іначай як выкананнем смяротнага прысуду, вынесенага судом за ўчыненне злачынства, адносна якога прадугледжваецца такое пакаранне.
2. Пазбаўленне жыцця не разглядаецца як парушэнне дадзенага артыкула, калі яно з'яўляецца вынікам абсалютна неабходнага ўжывання сілы: a) для абароны любой асобы ад проціпраўнага гвалту; b) для ажыццяўлення законнага затрымання ці прадухілення ўцёкаў асобы, законна ўтрыманай пад вартай; c) для задушэння згодна з законам бунту ці мяцяжу.

**Артыкул 3. Забарона катавання**

Нікога не павінны катаваць, ні з кім не павінны абыходзіцца і нікога не павінны караць бесчалавечна ці прыніжальна для годнасці.

**Артыкул 4. Забарона рабства і прымусовай працы**

1. Ніхто не павінен утрымлівацца ў рабстве ці ў паднявольным стане.
2. Ніхто не павінен прыцягвацца да прымусовай ці абавязковай працы.
3. Для мэтаў дадзенага артыкула тэрмін прымусовая ці абавязковая праца не ўключае ў сябе:

a) любую працу, якую звычайна мусіць выконваць асоба, якая ўтрымліваецца ў зняволенні згодна з палажэннямі артыкула 5 дадзенай Канвенцыі ці ўмоўна вызваленая асоба;

b) усялякую службу вайсковага характару, а ў тых краінах, дзе правамернай прызнаецца адмова ад вайсковай службы на падставе перакананняў, службу, прызначаную замест абавязковай вайсковай службы;

c) усялякую службу, абавязковую ў выпадку надзвычайнага становішча ці бедства, якое пагражае жыццю ці дабрабыту насельніцтва;

d) усялякую працу ці службу, якая з'яўляецца часткай звычайных грамадзянскіх абавязкаў.

**Артыкул 5. Права на волю і асабістую недатыкальнасць**

1. Кожны чалавек мае права на волю і асабістую недатыкальнасць. Нікога нельга пазбавіць волі акрамя як у наступных выпадках і ў такім парадку, які прадугледжваецца законам:

a) законнае ўтрыманне пад вартай асобы, асуджанай кампетэнтным судом;

b) законнае затрыманне ці заключэнне пад варту асобы за невыкананне вынесенага згодна з законам рашэння суда ці з мэтай забеспячэння выканання любога абавязку, прадугледжанага законам;

c) законнае затрыманне ці заключэнне пад варту асобы з мэтай, каб яна з'явілася перад кампетэнтным органам па абгрунтаваным падазрэнні ва ўчыненні правапарушэння ці ў выпадку, калі ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што неабходна прадухіліць учыненне ім правапарушэння ці перашкодзіць асобе схавацца пасля яго ўчынення;

d) заключэнне пад варту непаўналетняй асобы на падставе законнай пастановы, для выхаваўчага нагляду ці яе законнае заключэнне пад варту з той мэтай, каб яна з'явілася перад кампетэнтным органам;

e) законнае заключэнне пад варту асоб з мэтай прадухілення распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў, а таксама законнае заключэнне пад варту псіхічна хворых, алкаголікаў, наркаманаў і бадзягаў;

f) законнае заключэнне пад варту ці затрыманне асобы з мэтай прадухілення яе незаконнага ўезду ў краіну ці асобы, супраць якой прымаюцца меры па яе дэпартацыі ці экстрадыцыі.

2. Кожная арыштаваная асоба неадкладна інфармуецца на зразумелай для яе мове аб прычынах арышту і ўсіх абвінавачаннях супраць яе.

3. Кожная асоба, арыштаваная ці затрыманая згодна з падпунктам (c) пункта 1 дадзенага артыкула, неадкладна дастаўляецца да суддзі ці да іншай службовай асобы, надзеленай згодна з законам судовай уладай, і мае права на судовае разбіральніцтва цягам разумнага тэрміну ці на вызваленне яе да суда. Вызваленне можа быць абумоўленае гарантыямі з'яўлення на суд.

4. Кожны, хто быў пазбаўлены волі ў выніку арышту ці заключэння пад варту, мае права на безадкладны разгляд судом правамернасці яго змяшчэння пад варту і на вызваленне, калі яго змяшчэнне пад варту прызнаецца судом незаконным.

5. Кожны, хто стаў ахвярай арышту ці змяшчэння пад варту ў парушэнне палажэнняў дадзенага артыкула, мае права на кампенсацыю.

**Артыкул 6. Права на справядлівае судовае разбіральніцтва**

1. Кожная асоба ў выпадку спрэчкі пра яе грамадзянскія правы і абавязкі ці пры вылучэнні супраць яе ўсякага крымінальнага абвінавачання мае права на справядлівае публічнае разбіральніцтва справы ў разумны тэрмін незалежным і бесстароннім судом, створаным згодна з законам. Судовае рашэнне абвяшчаецца публічна, аднак прэса і публіка могуць не дапускацца на судовыя паседжанні цягам усяго працэсу ці яго часткі зыходзячы з меркаванняў маралі, грамадскага парадку ці нацыянальнай бяспекі ў дэмакратычным грамадстве, а таксама калі гэтага патрабуюць інтарэсы непаўналетніх ці для абароны прыватнага жыцця бакоў, ці ў строга неабходнай меры, як гэта вырашыць суд, пры пэўных абставінах, калі галоснасць парушала б інтарэсы правасуддзя.

2. Кожная асоба, абвінавачаная ва ўчыненні крымінальнага злачынства, лічыцца невінаватай да той пары, пакуль яе вінаватасць не будзе вызначаная законным парадкам.

3. Кожны чалавек, абвінавачаны ва ўчыненні крымінальнага злачынства, мае як мінімум наступныя правы:

a) быць неадкладна паінфармаваным на зразумелай яму мове пра характар і падставы выстаўленага супраць яго абвінавачання;

b) мець дастатковы час і магчымасці для падрыхтоўкі сваёй абароны;

c) абараняць сябе асабіста ці з дапамогай абранага ім самім абаронцы ці, калі ён не мае дастаткова сродкаў для аплаты паслуг абаронцы, карыстацца паслугамі прызначанага яму абаронцы бясплатна, калі гэтага патрабуюць інтарэсы правасуддзя;

d) дапытваць сведкаў, што выступаюць супраць яго, ці мець права на тое, каб гэтыя сведкі былі дапытаныя, і мець права на выклік і допыт сведкаў з яго боку на тых самых умовах, што і для сведкаў, якія выступаюць супраць яго;

e) карыстацца бясплатнай дапамогай перакладчыка, калі ён не разумее мовы, што выкарыстоўваецца ў судзе, ці не размаўляе на гэтай мове.

**Артыкул 7. Пакаранне выключна на падставе закону**

1. Нікога нельга пакараць за ўчыненне якога-небудзь дзеяння ці за бяздзеянне, якое, паводле дзеючага на момант яго ўчынення нацыянальнага ці міжнароднага права, не было крымінальным злачынствам. Нельга таксама накладаць пакаранне больш цяжкае, чым тое, што ўжывалася ў момант учынення крымінальнага злачынства.

2. Дадзены артыкул не перашкаджае асуджэнню і пакаранню кожнай асобы за ўчыненне якога-небудзь дзеяння ці за бяздзеянне, якое ў момант учынення было крымінальным злачынствам згодна з агульнымі прынцыпамі права, прызнанымі цывілізаванымі краінамі.

**Артыкул 8. Права на шанаванне прыватнага і сямейнага жыцця**

1. Кожны чалавек мае права на шанаванне яго прыватнага і сямейнага жыцця, яго жытла і ліставання.

2. Не дапускаецца ўмяшанне з боку органаў дзяржаўнай улады ў выкананне гэтага права, за выключэннем тых выпадкаў, калі такое ўмяшанне прадугледжанае законам і неабходнае ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку ці эканамічнага дабрабыту краіны, дзеля прадухілення беспарадкаў ці злачынстваў, для аховы здароўя ці маральнасці ці для аховы правоў і свабод іншых людзей.

**Артыкул 9. Свабода думкі, сумлення і рэлігіі**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэтае права ўключае свабоду мяняць сваю рэлігію ці перакананні і свабоду вызнаваць сваю рэлігію ці перакананні як паасобку, так і супольна з іншымі людзьмі, публічна ці прыватным парадкам у набажэнствах, навучанні, адпраўленні рэлігійных культавых абрадаў.
2. Свабода вызнаваць сваю рэлігію ці перакананні падпадае толькі пад абмежаванні, прадугледжаныя законам і неабходныя ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах грамадскай бяспекі, для аховы грамадскага парадку, здароўя ці маральнасці ці для абароны правоў і свабод іншых людзей.

**Артыкул 10. Свабода выражэння думак**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду выражэння думак. Гэтае права ўключае свабоду прытрымлівацца свайго меркавання і свабоду атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі без аніякага ўмяшання з боку органаў дзяржаўнай улады і не зважаючы на межы. Дадзены артыкул не перашкаджае дзяржавам ажыццяўляць ліцэнзаванне радыёвяшчальных, тэлевізійных ці кінематаграфічных прадпрыемстваў.
2. Ажыццяўленне гэтых свабод, якое накладвае абавязкі і адказнасць, можа быць спалучана з такімі фармальнасцямі, умовамі, абмежаваннямі ці санкцыямі, якія прадугледжаныя законам і неабходныя ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, тэрытарыяльнай цэласнасці ці грамадскага парадку, для прадухілення беспарадкаў ці злачынстваў, для аховы здароўя ці маральнасці, для абароны рэпутацыі ці правоў іншых людзей, для прадухілення выдавання інфармацыі, атрыманай канфідэнцыйна, ці для забеспячэння аўтарытэту ці бесстароннасці правасуддзя.

**Артыкул 11. Свабоды сходаў і аб’яднанняў**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду мірных сходаў і на свабоду аб’яднання з іншымі, уключна з правам утвараць прафесійныя саюзы і ўступаць у іх для абароны сваіх інтарэсаў.
2. Выкананне гэтых правоў не падлягае ніякім абмежаванням, акрамя прадугледжаных законам і неабходных у дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай ці грамадскай бяспекі, для прадухілення беспарадкаў ці злачынстваў, для аховы здароўя ці маральнасці, для абароны правоў і свабод іншых людзей. Гэты артыкул не замінае ўвядзенню законных абмежаванняў на ажыццяўленне гэтых правоў асобамі, якія ўваходзяць у склад узброеных сілаў, паліцыі ці адміністрацыйных органаў дзяржавы.

**Артыкул 12. Права на ўзяцце шлюбу**

Мужчыны і жанчыны шлюбнага ўзросту маюць права браць шлюб і ствараць сям’ю згодна з нацыянальным заканадаўствам, якое рэгулюе ажыццяўленне гэтага права.

**Артыкул 13. Права на эфектыўны сродак прававой абароны**

Кожны чалавек, чые правы і свабоды, прызнаныя ў дадзенай Канвенцыі, парушаныя, мае права на эфектыўны сродак прававой абароны ў дзяржаўным органе, нават калі гэтае парушэнне было ўчынена асобамі, якія дзейнічалі ў афіцыйнай якасці.

**Артыкул 14. Забарона дыскрымінацыі**

Карыстанне правамі і свабодамі, прызнанымі ў дадзенай Канвенцыі, мусіць быць забяспечана без аніякай дыскрымінацыі на падставе полу, расы, колеру скуры, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых поглядаў, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, прыналежнасці да нацыянальных меншасцяў, маёмаснага стану, нараджэння ці іншых прыкметаў.

**Артыкул 15. Адступленне ад выканання абавязальніцтваў у надзвычайных сітуацыях**

1. У выпадку вайны ці іншых надзвычайных абставінаў, якія пагражаюць жыццю нацыі, кожны з Высокіх Дамоўных Бакоў можа прымаць меры ў адступленне ад яго абавязальніцтваў паводле дадзенай Канвенцыі толькі ў той ступені, у якой гэта абумоўлена надзвычайнасцю абставінаў, пры ўмове, што такія меры не супярэчаць іншым яго абавязкам паводле міжнароднага права.
2. Гэтае палажэнне не можа служыць падставай для якога-небудзь адступлення ад палажэнняў артыкула 2, за выключэннем выпадкаў гібелі людзей у выніку правамерных ваенных дзеянняў, ці ад палажэнняў артыкула 3, пункта 1 артыкула 4 і артыкула 7.
3. Кожны з Высокіх Дамоўных Бакоў, які выкарыстоўвае гэтае права адступлення, вычарпальным чынам інфармуе Генеральнага сакратара Рады Еўропы аб прынятых ім мерах і прычынах іх прыняцця. Ён таксама інфармуе Генеральнага сакратара Рады Еўропы пра дату спынення дзейнасці такіх мер і ўзнаўлення ажыццяўлення палажэнняў Канвенцыі ў поўнай меры.

**Артыкул 16. Абмежаванні на палітычную дзейнасць замежнікаў**

Нічога ў артыкулах 10, 11 і 14 не можа разглядацца як перашкода для Высокіх Дагаворных Бакоў уводзіць абмежаванні на палітычную дзейнасць замежнікаў.

**Артыкул 17. Забарона злоўжыванняў правамі**

Ніштo ў дадзенай Канвенцыі не можа тлумачыцца як надаванне якой-небудзь дзяржаве, групе асоб ці асобе права займацца любой дзейнасцю ці ўчыняць любыя дзеянні, скіраваныя на скасаванне правоў і свабод, прызнаных у дадзенай Канвенцыі, ці на іх абмежаванне ў большай меры, чым гэта прадугледжваецца ў Канвенцыі.

**Артыкул 18. Межы выкарыстання абмежаванняў адносна правоў**

Абмежаванні, якія дазваляюцца ў дадзенай Канвенцыі адносна ўказаных правоў і свабод, не мусяць ужывацца для іншых мэтаў, чым тыя, для якіх яны былі прадугледжаныя.

## ЕЎРАПЕЙСКІ СУД ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА
## 21.06.2007
## ПРЭС-РЭЛІЗ ПАДРЫХТАВАНЫ САКРАТАРЫЯТАМ СУДА

## РАШЭННЕ ПАЛАТЫ

## БІЦІЕВА І Х. СУПРАЦЬ РАСІІ

**Еўрапейскі суд па правах чалавека сёння паінфармаваў судовую калегію ў пісьмовай форме аб сваім рашэнні ў справе Біціева і Х. супраць Расіі (нумары заяваў 57953/00 і 37392/03).**

Суд пастанаўляе аднагалосна, што:

— адносна забойства Зуры Біціевай, Рамзана Ідуева, Ідрыса Ідуева і Абібакара Біціева адбылося парушэнне артыкула 2 (права на жыццё) Еўрапейскай канвенцыі па правах чалавека;
— адносна няздольнасці правесці эфектыўнае расследаванне абставінаў іх смерці адбылося парушэнне артыкула 2 Канвенцыі;
— адносна меркаваных парушэнняў артыкула 2 адбылося парушэнне артыкула 13 (права на эфектыўную прававую абарону);
— у 2000 г. адносна спадарыні Біціевай адбылося парушэнне артыкула 3 (забарона бесчалавечнага ці прыніжальнага для годнасці абыходжання);
— у 2000 г. адносна спадарыні Біціевай адбылося парушэнне артыкула 5 (права на свабоду і асабістую недатыкальнасць);
— урад Расійскай Федэрацыі не выканаў сваіх абавязкаў паводле артыкула 38 § 1 (a) (расследаванне справы) па забеспячэнні ўсіх неабходных сродкаў для Суда дзеля вырашэння яго задачы па высвятленні фактаў;
— **не было парушэння артыкула 34** (індывідуальныя заявы); і,

пяццю галасамі супраць двух:

— што **не было парушэння артыкула 3** адносна Х.

Паводле артыкула 41 (справядлівае задавальненне) суд прызначыў у якасці пакрыцця нематэрыяльнай страты выплату для Х. у памеры 85 000 еўра (EUR), 10 000 з якіх належыць выплаціць спадарыні Біціевай. Ёй таксама прызначаецца выплата ў памеры EUR 7,876 за грашовыя выдаткі. (Пастанова суда даступная толькі па-англійску.)

### 1. Галоўныя факты

Першы заяўнік, Зура Шараніеўна Біціева (Zura Sharaniyevna Bitiyeva), нарадзілася ў 1948 г. і жыла ў станіцы Каліноўская (Чачня). Яна была актыўным палітычным дзеячом, брала ўдзел у антываенных пратэстах; яе забілі 21 сакавіка 2003 г.

Другі заяўнік, дачка спадарыні Біціевай, Х., нарадзілася ў 1976 г. і цяпер жыве ў Германіі, знайшоўшы там прытулак.

25 студзеня 2000 г. сп-ня Біціева і яе сын Ідрыс Ідуеў (Idris Iduyev) былі затрыманыя і дастаўленыя ў ізалятар часовага ўтрымання ў Чарнакозаве, які, са словаў урада, выкарыстоўваўся як цэнтр прыёму і высвятлення асоб людзей без дакументаў. Сп-ня Біціева сцвярджала, што яна стала ахвярай зняважлівага абыходжання ў час утрымання пад вартай, у прыватнасці, яе не задавальняла адсутнасць ацяплення, перапоўненасць камеры, кепская ежа і гігіена, прыніжэнне яе як жанчыны, да таго ж чачэнскага паходжання; таксама яна сведчыла пра кепскае абыходжанне з астатнімі затрыманымі, уключаючы і яе сына. Яна пакутавала на сур’ёзныя захворванні сэрца, рэспіраторныя і запаленчыя захворванні і сцвярджала, што ёй адмаўлялі ў медыцынскай дапамозе. У падтрымку сваіх сцверджанняў яна выказала ўласную версію абставінаў справы разам са сведчаннямі іншых затрыманых і яе дачкі. Яна таксама спасылалася на іншыя даступныя для грамадскасці звесткі (у прыватнасці, на рэпартажы ў сродках масавай інфармацыі, звесткі ад НА і Еўрапейскага Камітэта па прадухіленні катаванняў) пра недапушчальныя ўмовы ўтрымання ў Чарнакозаве на той момант.

Фізічны стан сп-ні Біціевай імкліва пагаршаўся, і 17 лютага 2000 г. яе перавялі ў шпіталь. Калі яна знаходзілася ў шпіталі, 2 сакавіка ёй выдалі пасведчанне, дзе сцвярджалася, што яе меркаваны ўдзел у незаконных узброеных групоўках быў расследаваны, але доказаў не было знойдзена. Яе выпусцілі 15 сакавіка 2000 г.

Урад сцвярджаў, што сп-ню Біцієву арыштавалі ў адпаведнасці з Указам прэзідэнта, скіраваным на прадухіленне бадзяжніцтва, і які дазваляў затрыманні на тэрмін да дзесяці дзён. Гэты бок перадаў на разгляд некалькі медыцынскіх дакументаў, падрыхтаваных пасля вызвалення сп-ні Біцієвай, якія пацвярджалі, што ў шпіталь яе змясцілі ў цяжкім стане. Гэты бок сцвярджаў, што далейшае расследаванне скаргі было немагчымае праз адсутнасць афіцыйных запісаў і змены персаналу ў ізалятары. Не была даступная ніякая афіцыйная інфармацыя адносна юрыдычнага статусу ізалятара да 8 лютага 2000 г.

Пры затрыманні ні сп-ні Біцієвай, ні яе сыну Ідрысу Ідуеву не было выстаўлена ніякага абвінавачання.

25 красавіка 2000 г. сп-ня Біцієва падала скаргу ў Еўрапейскі суд па правах чалавека.
21 мая 2003 г. сп-ня Біцієва, яе муж Рамзан Ідуеў, іх сын Ідрыс Ідуеў і яе брат Абібакар Віціеў (якія з'яўляюцца для Х. бацькам, братам і дзядзькам адпаведна) былі забітыя ў доме сп-ні Біцієвай у ст. Каліноўская. Х. падала тры заявы, зробленыя сведкамі тых падзеяў: двума суседзямі і яе братам І. (сынам сп-ні Біцієвай), які ў тую ноч быў у іншым доме ў тым самым двары і пазбегнуў увагі забойцаў, схаваўшыся за крэслам.

Згодна з гэтымі заявамі каля 3-й гадзіны раніцы ў тую акругу прыехалі два аўтамабілі УАЗ-45. На іх не мелася рэгістрацыйных нумароў, і яны былі абсталяваныя вялікімі антэнамі. Некалькі чалавек увайшлі ў дом адной з суседак, абудзілі яе, заклеілі рот ліпкай стужкай і запатрабавалі яе пашпарт. Затым, узяўшы з сабой пашпарт, яны з'ехалі. Пазней той пашпарт знайшлі ў доме сп-ні Біцієвай. Каля 3.30 група з 11 чалавек з аўтаматамі АК-7.62 увайшла ў дом сп-ні Біцієвай; колькі астатніх, узброеных гранатамётамі і аўтаматамі, стаялі на вуліцы вакол дома. Усе яны былі апранутыя ў камуфляжную форму, характэрную для атрадаў спецыяльнага прызначэння. На чацвярых з іх былі маскі; на астатніх былі чорныя шлемы байцоў атрадаў спецыяльнага прызначэння. Яны размаўлялі па-руску. Праз некалькі хвілінаў адзін з суседзяў і І. пачулі шэсць ці сем стрэлаў. Затым суседзі пабачылі, як машыны рушылі па шашы да Грознага. І. увайшоў у дом сваёй маці, дзе знайшоў целы сваіх маці, дзядзькі, бацькі і брата з прастрэленымі галовамі, рукі і ногі ў іх былі звязаныя. Адзін з суседзяў дадаў, што на галаве спадара Біцієва быў чорны капюшон.

Праз нейкі час той раніцай жыхары вёскі даведаліся, што падобным чынам забілі яшчэ двух чалавек, верагодна, гэта ўчынілі людзі з той самай групы; таксама яны даведаліся, паводле сведчанняў персаналу дарожнага паста ў той вёсцы, што гэта была ўзброеная група з пропускам спецыяльнай місіі.

26 сакавіка 2003 г. НА «Мемарыял» паведаміла пра забойствы, мяркуючы, што гэта была помста за актыўную прыхільнасць сп-ні Біцієвай па выяўленні злачынстваў, учыненых вайскоўцамі, а таксама за яе скаргу ў Суд.

У той самы дзень пасля забойстваў пачалося расследаванне. Было абследавана месца злачынства і дапытаныя сведкі. Аднак Х. сведчыла, што ўскрыццё целаў не праводзілася і што яе сваякоў пахавалі ў той самы дзень. Падчас расследавання ў лістападзе 2003 г. дачка сп-ні Біцієвай запатрабавала статус пацярпелай; канчаткова ён быў нададзены 15 снежня 2005 г. Злачынцаў так і не вызначылі.

Пасля забойстваў Х. паскардзілася на пераслед. Яна, у прыватнасці, сцвярджала, што ў маі 2004 г. яе спынілі для праверкі дакументаў і дапыталі пра незаконнае валоданне зброяй. Па факце яе скаргі на пераслед правялося следства. Нягледзячы на запэўніванні следчага, што яна абароненая ад далейшых пагрозаў, яна зноў адчула сябе запалоханай з-за характару пытанняў, якія таксама датычылі яе заявы ў суд. Спасылаючыся на кепскую сітуацыю з бяспекай, яна сцвярджае, што ўсякі кантакт з прадстаўнікамі праваахоўных органаў успрымаўся як пагроза.

**2. Судовы працэс і склад Суда**

Заявы ў Еўрапейскі суд па правах чалавека былі пададзеныя 25 красавіка 2000 г. і 21 лістапада 2003 г. адпаведна. Палата пастанавіла сабрацца на слуханні паводле заяваў, і 20 кастрычніка 2005 г. яны былі прызнаныя дапушчальнымі.
Рашэнне было прынята Палатай суда з сямі суддзяў у наступным складзе:

Хрыстас Разакіс (Christos Rozakis) (Грэцыя), Старшыня,
Лукіс Лукаідэс (Loukis Loucaides) (Кіпр),
Ніна Ваіч (Nina Vajić) (Харватыя),
Анатоль Коўлер (Anatoli Kovler) (Расія),

Ханлар Гаджыеў (Khanlar Hajiyev) (Азербайджан),
Дзін Шпільман (Dean Spielmann) (Люксембург),
Сверэ Эрык Ебэнс (Sverre Erik Jebens) (Нарвегія) — суддзі,
а таксама Сёрэн Нільсэн (Søren Nielsen) — сакратар судовага паседжання.

### 3. Падсумаванне судовага рашэння

**Скаргі**
На падставе артыкулаў 3 і 5 сп-ня Біціева скардзілася пра незаконнае ўтрыманне пад вартай і кепскае абыходжанне ў 2000 г. На падставе артыкулаў 2, 3 і 13 дачка сп-ні Біціевай сцвярджала, што яе маці, бацька, брат і дзядзька былі забітыя прадстаўнікамі дзяржавы. Далей яна сцвярджала, што забойства яе маці было помстай за заяву ў Еўрапейскі суд па правах чалавека і што яе саму запалохвалі і дапытвалі пра дэталі яе скаргі ў Суд, парушаючы артыкул 34 (права асобы на хадайніцтва).

**Пастанова Суда**
Суд прызнаў аднагалосна, што Х. як пераемнік першага заяўніка магла працягваць працэс.

**Артыкул 3 адносна сп-ні Біціевай**

Суд адзначыў, што доказы сведчылі пра сур’ёзнае пагаршэнне стану здароўя сп-ні Біціевай у час яе ўтрымання пад вартай. Яе стан відавочна пагоршыўся праз кепскія ўмовы ўтрымання пад вартай, а таксама праз неадпаведны ўзровень медыцынскай дапамогі.

Звесткі, вынайдзеныя Еўрапейскім Камітэтам па прадухіленні катаванняў, пацвердзілі заявы сп-ні Біціевай пра кепскія ўмовы і не аспрэчваліся ўрадам. Апошні ў сваю чаргу не здолеў забяспечыць якіх-небудзь дакументаў адносна яе ўтрымання пад вартай ці атрыманай ёй медыцынскай дапамогі.

Камітэт таксама звярнуў увагу, што на той момант юрыдычны статус Чарнакозава не быў дакладна вызначаны, што зрабіла немагчымым разгляд скаргаў арыштаваных ці медыцынскую дапамогу.

Суд усталяваў, што пагаршэнне стану здароўя сп-ні Біціевай, спалучанае з працягласцю і кепскімі ўмовамі ўтрымання пад вартай, а таксама недахопам належнай медыцынскай дапамогі прычынілі ёй пакуты, што азначае бесчалавечнае ці прыніжальнае для годнасці абыходжанне. Адпаведна, суд аднагалосна адзначыў, што адносна кепскага абыходжання адбылося парушэнне артыкула 3. Далей суд адзначыў, шасцю галасамі супраць аднаго, што ніякіх іншых пытанняў паводле артыкула 3 адносна расследавання яе меркаванняў аб кепскім абыходжанні не ўзнікла.

**Артыкул 5**

Бакі не аспрэчвалі таго факту, што сп-ню Біціеву ўзялі пад варту з яе дому 25 студзеня 2000 г. і выпусцілі 17 лютага 2000 г. Такім чынам, утрыманне яе пад вартай доўжылася 24 дні.

Суд адзначыў, што ўрад не забяспечыў санкцыі пракурора паводле Указу прэзідэнта і не патлумачыў, чаму сп-ню Біціеву ўтрымлівалі пад вартай больш за дзесяць дзён. Насамрэч з пасведчання, выдадзенага 2 сакавіка 2000 г. можна зрабіць выснову, што сапраўднай прычынай яе затрымання было падазрэнне пра яе ўдзел у незаконных узброеных групоўках. Аднак кампетэнтным органам не было выдадзена ніякай пастановы пра яе затрыманне ці вызваленне; гэтае затрыманне не было фармальна звязана з якім-небудзь крымінальным расследаваннем і супраць яе не выстаўлялася абвінавачанняў. За адсутнасцю хоць якіх працэсуальных гарантый Суд можа ахарактарызаваць гэта толькі як адвольнае затрыманне і як поўнае невыкананне патрабаванняў законнасці.

Да таго ж, высветлілася, што юрыдычны статус ізалятара ў Чарнакозава стаў вядомы, у найлепшым выпадку, толькі пасля 8 лютага 2000 г. Суд не знайшоў тлумачэнняў факту, што ў дзяржаве з вяршэнствам закону ізалятар можа існаваць без адказных за яго ўладаў. Суд быў уражаны тым фактам, што, нягледзячы на заклікі Еўрапейскага Камітэта па прадухіленні катаванняў правесці незалежнае расследаванне, нічога не было зроблена, каб вырашыць гэтую сітуацыю беспакаранасці і вызначыць асобы адказных за гэтае злачынства людзей і прыцягнуць іх да адказнасці, забяспечыць кампенсацыю ахвярам і даць гарантыю, што падобная сітуацыя не ўзнікне ў будучыні.

Такім чынам, Суд пастанавіў, што ўтрыманне пад вартай сп-ні Біціевай было несумяшчальнае з асноўнымі аспектамі вяршэнства права і прызнаў, што мела месца парушэнне артыкула 5.

**Артыкул 38 § 1 (а)**

Суд зазначыў, што, нягледзячы на свой запыт да ўрада, урад падрыхтаваў толькі малую частку ад дакументаў расследавання справы. У прыватнасці, падрыхтаваны дакумент не ўтрымліваў ніякіх сведчанняў відавочцаў, судовай і балістычнай экспертызы, абследавання месца злачынства ці інфармацыі адносна магчымага ўдзелу супрацоўнікаў службаў бяспекі ці ўзброеных сілаў. Адпаведна, Суд зрабіў высновы з паводзін урада і аднагалосна пастанавіў, што ўрад не выканаў сваіх абавязкаў, прадугледжаных у артыкуле 38 § 1 (а), паводле якіх ён мусіць забяспечыць Суд усімі неабходнымі сродкамі дзеля высвятлення фактаў справы.

**Артыкул 2**

**Адносна забойства сваякоў Х.**

Суд вызначыў, што ўрад не здолеў забяспечыць ключавыя элементы расследавання, якія маглі б праліць святло на акалічнасці забойстваў, а таксама вызначыў, што недастаткова сцвярджэння, што расследаванне не забяспечыла доказаў таго, што ў забойствах бралі ўдзел прадстаўнікі войскаў спецыяльнага прызначэння. На думку Суда, урад мусіў забяспечыць вычарпальныя тлумачэнні пра падзеі 21 мая 2003.

З іншага боку, сведчанні Х. пацвердзілі меркаванні, што забойствы былі ўчыненыя прадстаўнікамі дзяржавы, пра што асабліва сведчаць: форма вопраткі забойцаў; аўтамабілі, якімі яны карысталіся; той факт, што яны бесперашкодна перамяшчаліся ў каменданцкую гадзіну (са «спецыяльным» пропускам), а таксама метады іх працы, характэрныя для спецыяльных аперацыяў, як, напрыклад, праверка пашпартоў, накрыванне галавы затрыманага капюшонам і неабвержная манера выканання забойстваў.

Пераканаўшыся, што з паводзін урада можна рабіць такія высновы, Суд пастанавіў, што смерць сваякоў Х. можа прыпісвацца дзяржаве і што мела месца парушэнне артыкула 2.

**Адносна расследавання смерці сваякоў Х.**

Суд адзначыў, што падчас расследавання былі прынятыя неабходныя меры, напрыклад, абследаванне месца злачынства і допыт сведкаў. Таксама выйшла, што следства разглядала звесткі пра спецыяльныя аперацыі ў тым раёне і ўдзел вайсковага персаналу і аўтамабіляў.

Аднак, суд сцвердзіў, што расследаванне не ўстанавіла такіх важных дэталяў злачынства, як колькасць злачынцаў, маршрут, якім яны прыехалі і з’ехалі з вёскі, зброя, якой яны карысталіся, паслядоўнасць іх дзеянняў і, што самае важнае, матыву забойстваў. Суд са здзіўленнем адзначыў, што расследаванне, якое доўжылася болей за два з паловай гады, не зрабіла ніякага відавочнага прагрэсу. Мала таго, статус пацярпелай быў нададзены Х. толькі напрыканцы 2005 г. Адзіная інфармацыя, якая перадавалася пацярпелым, адносілася да рашэнняў адтэрмінаваць і ўзнавіць расследаванне.

Такім чынам, Суд пастанавіў, што Расія не выканала свайго абавязку правесці эфектыўнае, неадкладнае і падрабязнае расследаванне забойства сп-ні Біціевай і яе сваякоў. Адпаведна, мела месца парушэнне артыкула 2.

**Артыкул 3 у дачыненні да Х.**

Суд не меў сумненняў, што смерць сваякоў Х. прычыніла ёй глыбокія пакуты, але тым не меней не знайшоў падставы для сцвярджэння асобнага парушэння артыкула 3.

**Артыкул 13**

З улікам таго, што расследаванне забойстваў не было эфектыўным і што ў выніку была падарваная эфектыўнасць усякай іншай прававой абароны, што магла існаваць у такім выпадку, уключна з грамадзянска-прававымі сродкамі судовай абароны, суд пастанавіў, што мела месца парушэнне артыкула 13 у разам з артыкулам 2 Канвенцыі.

**Артыкул 34**

**Нягледзячы на жахлівасць жорсткіх і нерасследаваных забойстваў заяўніка і яе сваякоў, суд не знайшоў фактаў, якія б наўпрост падтрымлівалі меркаванні Х., паводле якіх забойствы былі ўчыненыя ў сувязі з заявамі сп-ні Біціевай у Суд.**

Адносна заяваў Х. пра запалохванні высветлілася, што выпадак у маі 2004 г. адбыўся ў рамках праверачных мерапрыемстваў і не выклікаў якіх-небудзь пытанняў адносна

артыкула 34. Органы дзяржаўнай улады правялі расследаванне гэтага выпадку, і высветлілася, што пытанні пра Суд не мелі галоўнага значэння. Са сцверджанняў заяўніка стала вядома, што яна ўспрымала ўсякі кантакт з праваахоўнымі органамі як небяспечны. Гэта цалкам зразумела, і таму ўлады былі пазбаўленыя моцнай аргументацыі на сваю карысць аб мажлівых намерах правядзення расследавання і забеспячэння бяспекі сп-ні Біціевай.

Адпаведна, Суд не меў дастаткова матэрыялаў, каб зрабіць выснову, што на Х. быў аказаны незаконны ціск, каб пераканаць яе не падаваць заяву ў Суд, і аднагалосна пастанавіў, што парушэння артыкула 34 не было.

Суддзі Лукаідэс і Шпільман выказалі свае асаблівыя меркаванні, якія дадаюцца да пастановы суда.



**Правы чалавека** – асаблівы механізм.
Гэта не толькі адносіны паміж чалавекам і дзяржавай, дакументы і нормы, але і адладжаная сістэма звязаных між сабой і ўзгодненых абмежаванняў, працэдураў, нормаў, стаўленняў, культуры адносінаў паміж людзьмі. Толькі такі механізм можа забяспечыць трывалае захаванне і павагу да правоў чалавека. Але для таго каб гэты механізм працаваў зладжана і быў эфектыўным, неабходны веды, навыкі і ўстойлівае жаданне людзей адстойваць і развіваць правы чалавека. Дапаможнік разглядае правы чалавека як механізм, які знаходзіцца ў нашых руках. Ад кожнай асобы залежыць, ці пачне механізм працаваць.

**Гэты дапаможнік і іншыя адукацыйныя і прававыя матэрыялы вы можаце знайсці ў новым інтэрнэт-рэсурсе для адукатараў, праваабаронцаў і ўсіх актыўных асоб**
**WWW.HRAMADZIANIN.ORG**